ЛЕАНІД МАРАКОЎ

# РЭПРЭСАВАНЫЯ КАТАЛІЦКІЯ ДУХОЎНЫЯ, КАНСЭКРАВАНЫЯ І СВЕЦКІЯ АСОБЫ БЕЛАРУСІ 1917—1964

Мінск
2008

УДК 27(035)
ББК 86.2я2
М 25

Аўтар сардэчна дзякуе за дапамогу ў зборы звестак
пра пакутнікаў біскупу **Антонію Дзям’янку**.

**Маракоў, Л.**
**М 25** Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі (1917—1964) / Леанід Маракоў. — Мінск, 2008. — 776 с.
ISBN ???

Анатацыя

**УДК 27(035)**
**ББК 86.2я2**

ISBN ??

© Дзям’янка А., 2008

На працягу многіх стагоддзяў у Беларусі ўзводзіліся велічныя каталіцкія святыні. Старэйшае пакаленне і людзі ў сярэднім узросце памятаюць большасць з іх у руінах. Святыні разбурылі, перабудавалі і дастасавалі да іншых, нават гаспадарчых мэтаў. Адной з галоўных прычын гэтага сталася палітыка атэізму, якая была ўзведзена савецкай уладай у ранг дзяржаўнай.

Апошнім часам значная колькасць храмаў адноўлена і служыць тым мэтам, дзеля якой яны будаваліся. Сцены большасці сакральных будынкаў зноў напоўніліся галасамі людзей, якія наведваюць святыні з адзінай мэтай — паразмаўляць з Богам.

Кніга Л. Маракова падае кароткія звесткі аб лёсах людзей, якія калісьці маліліся ў гэтых касцёлах. Яны былі ахрышчаны ў святынях, прымалі ўдзел у малітоўных спатканнях або ўзначальвалі набажэнства.

У мінулым стагоддзі, калі вернікі розных канфесій нашай краіны цярпелі ад жудаснага праследу, па-рознаму складаліся лёсы і тых, хто належаў да каталіцкага касцёла. Многія з іх былі рэпрэсаваны, прынялі цярпенне за веру. Значная колькасць католікаў заплаціла за свае рэлігійныя перакананні ўласным жыццём. Сярод каталіцкіх вернікаў былі таксама ахвяры войнаў і ўзброеных канфліктаў. З-за адсутнасці доступу да верагодных крыніц і адпаведных архіўных дакументаў лёс некаторых асоб невядомы.

Праца па зборы інфармацыі пра рэпрэсаваных католікаў Беларусі распачалася яшчэ ў 90-я гг. XX ст. Вынікам згаданых пошукаў стаў шэраг публікацый, сярод якіх можна назваць [...]. У адрозненне ад ранейшых прац даследчыкаў даведнік

Л. Маракова ўключае дадзеныя пра найбольшую колькасць рэпрэсаваных каталікаў (на сённяшні дзень). Спадзяёмся, што гэта праца з'явіцца асновай для даследчыкаў у справе вынясення з нябыту імёнаў і прозвішчаў многіх іншых пацярпелых за веру асоб. Прадстаўленая чытачу кніга з'яўляецца важным этапам у даследаванні гісторыі Каталіцкага Касцёла Беларусі.

Як адбудаваныя святыні з'яўляюцца сведкамі рэлігійнасці нашых продкаў і іх духоўнага яднання з Біскупам Рыма, так і гэта кніга няхай дапамагае сучаснікам лепш уявіць няпросты шлях да Бога нашых папярэднікаў, іх адданасць веры.

*АНТОНІ ДЗЯМ'ЯНКА,*
*Тытулярны біскуп Iesvi, Дапаможны біскуп*
*і Генеральны Вікарый Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі,*
*Генеральны Сакратар Канферэнцыі*
*Каталіцкіх біскупаў Беларусі*

**АБРАНТОВІЧ Фабіян Янавіч** [14.9.1884, в. Вераскава Любчанскай вол. Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. — 2.1.1946, Масква, турма «Бутырка»], рэлігійны і грамадскі дзеяч, святар, публіцыст, філосаф. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў гарадскую школу ў Наваградку (1900), Магілёўскую духоўную семінарыю (1906), Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі (1910). Прыняў сакрамэнт святарства (9.11.1908). Выкладаў асновы рэлігіі ў пецярбургскіх навучальных установах. Працягваў вучобу ў каталіцкім ун-це Лювена (Бельгія, 1912—14). Абараніў доктарскую дысертацыю па філасофіі. Пасля вяртання ў Санкт-Пецярбург (Петраград) — прафесар духоўнай семінарыі. Выкладаў філасофію, сацыялогію і спевы. У 1914—18 выкладчык філасофіі Петраградскай духоўнай акадэміі. Адзін з заснавальнікаў (у маі 1917) бел. хрысціянскага руху. З Л. *Хвецькам* стварыў саюз «Хрысціянская дэмакратычная злучнасць». Адзін з ініцыятараў і арганізатараў правядзення ў Мінску з'езда бел. каталіцкага духавенства (1917). З біскупам Зыгмунтам *Лазінскім* 6.8.1918 адправіў першую бел. Імшу ў Мінску. Сябраваў з **Б. Эпімахам-Шыпілам** (гл.: *Маракоў, Рэпрэсаваныя…*) і **Я. Купалам** (у студз. — лют. 1920 дзяжурыў у мінскім шпіталі каля ложка хворага паэта, падтрымліваў яго духоўна). Актыўна выступаў за ўвядзенне бел. мовы ў набажэнства ў Касцёле і ў духоўных навучальных установах, пра што неаднаразова пісаў на старонках перыядычных бел. рэлігійных выданняў «Kryniса» (1917—20, Петраград — Мінск — Вільня) і «Chryścijanskaja Dumka» (1928—29, Вільня). З 1918 рэктар арганізаванай ім Мінскай духоўнай семінарыі. Выкладаў у ёй і пасля яе эвакуацыі ў 1920 у Наваградак Мінскай губ. (цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл.). У 1921 біскупам З. *Лазінскім* прызначаны выкладчыкам Ніжэйшай духоўнай семінарыі, суддзёй касцёльнага трыбунала, прасінадальным экзаменатарам, цэнзарам рэлігійных кніг, членам адміністрацыйнай рады дыяцэзіі. Выконваў функцыі інспектара кляштараў, з

1924 генеральнага вікарыя часткі Мінскай дыяцэзіі ў тагачаснай Польшчы. У 1925 прызначаны выкладчыкам і экономам духоўнай семінарыі ў Пінску, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1926 у ордэне айцоў марыянаў у Друі Браслаўскага пав. Віленскага ваяв. (цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл.). Склаў першыя (3.8.1927) і вечныя (1930) законныя шлюбы. У 1928 у Рыме прыняў візантыйска-славянскі абрад, прызначаны Апостальскім візітатарам для грэка-каталікаў, ардынарыем для каталікаў у Маньчжурыі з сядзібай у г. Харбін, цяпер Кітай, дзе стварыў Марыянскую ўсх. місію. Арганізаваў і кіраваў агульнаадукацыйным ліцэем, жаночай гімназіяй сясцёр уршулянак і францішканак. З 1931 рэдагаваў і выдаваў філасофска-тэалагічны час. «Католический вестник». У 1934 наведаў Рым, дзе зрабіў справаздачу пра дзейнасць усх. місіі ў Маньчжурыі. Летам 1939 зноў прыехаў у Рым, браў удзел у пасяджэннях генеральнай капітулы згуртавання ксяндзоў-марыянаў. У жн. 1939 наведаў прадстаўніцтва ксяндзоў марыянаў у Варшаве, Вільні, Коўне, Рызе, Друі, Наваградку. На пачатку 2-й сусветнай вайны спрабаваў трапіць з Польшчы, а потым з СССР у Зах. Еўропу. Выехаў у Львоў, дзе сустрэўся з уніяцкім архіепіскапам **А. Шаптыцкім**. 22.10.1939 падчас спробы нелегальнага пераходу савецка-нямецкай дэмаркацыйнай лініі затрыманы нямецкімі памежнікамі і перададзены савецкаму боку. Пад следствам знаходзіўся ў турме НКВД у Львове. Абвінавачаны ў шпіёнстве на карысць Японіі, імкненні далучыць Беларусь да Польшчы, варожым стаўленні да камунізму. Прайшоў праз так званы канвеер, катаваны на допытах. 26.9.1941 Беларускі камітэт, не ведаючы пра арышт А., накіраваў мемарандум Апостальскаму нунцыю ў Берліне. Сутнасць паслання зводзілася да наступнага: беларускі «народ павінен мець сваё духавенства вышэйшай і ніжэйшай ступені і царкоўную мітраполію ў генеральным камісарыяце Беларусі». Абвінавачваўся ў «шпіёнстве на тэрыторыі Кітая на карысць Японіі па загаду Ватыкана». У студз. 1941 пераве-

дзены ў Бутырскую турму Масквы. Асуджаны 23.9.1942 асобай нарадай пры НКВД СССР да 10 гадоў ППЛ. Вінаватым сябе не прызнаў. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны Вярхоўным судом РФ 24.12(ці 10).1992.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Stankievič A.* Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939; *Божым шляхам* (Парыж). 1957. № 76—81; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Царква* (Мінск). 1998. № 1; *ЭГБ*, т. 1; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**АДАМСКІ Фелікс** [14.11.1898, Рэйнаў (*Rheinau*), Швейцарыя — 7.3.1992, Маркавіцы (*Markowice*), Польшча], святар, аблат. Са шматдзетнай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў Жабікове (*Żabikowo*), Польшча. У 1913 паступіў у ніжэйшую духоўную семінарыю аблатаў у Страсбургу, Францыя, якую ў пачатку 1-й сусветнай вайны перанеслі ў Валькенбург (*Valkenburg*), Галандыя. У ліст. 1916 мабілізаваны ў нямецкае войска на ўсх. фронце, дзе служыў па ліст. 1918. Быў паранены. З 5.1.1919 добраахвотнік 2-га пяхотнага палка польскіх паўстанцаў. Зноў паранены. Пад Шубінам (*Szubin*, Польшча) трапіў у палон. 13.3.1920 уцёк і далучыўся да арміі Галера, змагаўся з бальшавікамі. Пасля здачы экзамену сталасці (15.7.1921) пачаў навіцыят у ордэне аблатаў у Маркавіцах, праз год склаў першыя законныя шлюбы. Скончыў філасофскія курсы ў Льеж, Бельгія, тэалагічныя — у новай семінарыі ордэна ў Обры (*Obra*), Польшча. У 1926 прыняў субдыяканат у Познані (*Poznań*), Польшча, у 1927 дыяканат у Люблінцы (*Lubliniec*, Польшча), сакрамэнт святарства (5.6.1927, Катавіцы (*Katowice*, Польшча). З 1927 у Маркавіцах, з 1931 кіраўнік мясцовага навіцыяту. У 1937 зноў у Люблінцы. У жн. 1938 накіраваны ў філіяльны касцёл св.

Яўхіма і Ганны ў в. Агароднікі (Вашкевічы), цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. У пачатку 2-й сусветнай вайны вярнуўся ў Маркавіцы. Арыштаваны гестапа 3.10.1939. Этапаваны праз лагеры ў Шчэгліне (*Szczeglin*) і Заксенгаўзене (*Sachsenhausen*) у Дахаў (*Dachau*). 29.4.1945 вызвалены амерыканскімі войскамі. Змагаўся як капелан у званні капітана ў дывізіі генерала Мачка. 13.6.1946 вярнуўся ў Польшчу. З 1.9.1946 зноў кіраваў навіцыятам у Маркавіцах. У 1947 прызначаны правінцыяльным эканомам, потым кіраўніком у Катавіцах (з 1.10.1947), Обры (з 1.7.1959), Вроцлаве (з 23.6.1964, *Wrocław*), Гожаве Велькапольскім (з 15.6.1967, *Gorzów Wielkopolski*), Польшча. З 1.7.1975 зноў у Маркавіцах, дзе працаваў спавядальнікам.

Кр.: *Prowincjal OMI.*

**АДЛЯНІЦКІ-ПАЧОБУТ Фабіян** [1897 — 4.7(ці 8).1944, Пінск Брэсцкай вобл.], святар, верагодна, брат **Адляніцкага-Пачобута Юрыя**, у 1928—35 пробашча касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзярэчын, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. Скончыў Пінскую (?) духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1921). У 1926—28 вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у Пружанах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1931 пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Шлядзянаў (*Śledzianów*) Бельска-Падляшскага пав. Цеханавецкага дэканата, Польшча. З 1937 у парафіі св. Юзафа ў мяст. Лунінец аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., лунінецкі дэкан. Арыштаваны фашыстамі за дапамогу яўрэям і партызанам. Расстраляны у в. Казлякевічы, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**АЖАРОЎСКІ Юрый** [1912—10.3.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1938). Прызначаны вікарыем, пазней пробашчам касцёла св. Казіміра ў в. Ліпнішкі Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны ў канцы чэрв. 1942 нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, пасаджаны ў Лідскую турму. 10.3.1943 са святарамі Аляксандрам *Аўгусціновічам*, Альфонсам *Бароўскім*, Стэфанам *Дабравольскім*, Вінцэнтам *Лабанам*, Люцыянам *Мрачкоўскім*, Стэфанам *Снягоцкім,* Вінцэнтам *Страснеўскім*, Францішкам *Цыбульскім* вывезены гітлераўцамі ў лес і расстраляны.

*«У Вялікую пятніцу 1943 г., ноччу, жыхары в. Дайнава* (за 10 км ад в. Ліпнішкі. — **Л. М.**) *адкапалі целы расстраляных святароў і, рызыкуючы ўласным жыццём, перавезлі іх у вёску і пахавалі. У 1960-я гг. праведзена эксгумацыя астанкаў, адбылося іх перазахаванне на Лідскіх могілках»* (*Ave Maria*. 2003. № 4 (95).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; http://media.catholic.by*; *Krahel T.,* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998. № 3 (98); *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**АКРЭЙЦЬ Мечыслаў** [1884—25.6.1942], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). Служыў у парафіі Нараджэння НПМ у мяст. Браслаў Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1912 пробашч касцёла св. Юзафа і НПМ у в. Барадзінічы Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н. У 1915 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Супрасль (*Supraśl*) Беластоцкага дэканата, Польшча. Паводле некаторых звестак, служыў у касцёле Насвяцейшай Тройцы ў мяст. Юхновец (*Juchnowiec*), Польшча. З 1926 у парафіі св. Яна Апостала і Евы ў мяст. Кнышын (*Knyszyn*) Віленскай архідыяцэзіі, Польшча. З 1933 пробашч і дэкан касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Браслаў аднайменнага

дэканата. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Трагічная смерць А. акружана арэолам пакутніцтва. 3.6.1942 гітлераўцы сталі знішчаць насельніцтва браслаўскага гета. «Некалькі дзён у мястэчку не сціхала страляніна. Святар знаходзіўся ў касцёле, калі непадалёку раздаліся крыкі і стрэлы. Ён выбег на цвінтар і раптам упаў — у яго трапіла шалёная куля. Акупацыйныя ўлады загадалі абвясціць парафіянам, што ў ксяндза не вытрымала сэрца. Сведкі казалі, што ў апошнія хвіліны жыцця святар паказваў уцекачам, у які бок трэба бегчы».

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Niech ich świadectwo Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**АКУРОЎСКІ Баляслаў Уладзіслававіч** [1887, Кобрын Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. — ?], арганіст, бацька Вацлава *Акуроўскага*. З сям'і польскага службоўца. Да арышту служыў у касцёле Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь Лідскага пав. Віленскай губ., з 1921 Наваградскага ваяв., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 16.9.1944. Асуджаны 3.11.1946 за «антысавецкую агітацыю» да 8 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы.

З Б. Акуроўскім праходзілі па адной справе (№ п-19988; захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.), асуджаныя на той жа тэрмін і пазбаўленне правоў яго жонка, хатняя гаспадыня **Акуроўская Эмілія Антонаўна** (н. у 1893 у Віцебску ў сям'і польскага селяніна) і сын, арганіст таго ж касцёла Вацлаў *Акуроўскі*. Далейшы іх лёс таксама невядомы. Рэабілітаваны 14.1.1994 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**АКУРОЎСКІ Вацлаў Баляслававіч** [1912, Віцебск — ?], арганіст, сын Баляслава і Эміліі *Акуроўскіх*. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Да арышту служыў у касцёле Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь Лідскага пав. Віленскай губ., з 1921 Наваградскага ваяв., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты, гадаваў трое дзяцей. Арыштаваны 4.9.1944. Асуджаны (з бацькам і маці) 3.11.1946 за «антысавецкую агітацыю» да 8 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 14.1.1994 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда. Групавая справа сям'і А. № п-19988 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**АЛДЗІЕЎСКІ** (*Ołdziejwski*) **Адольф** [17.6.1887, в. Вайтахі (*Wojtachy*) Беластоцкага пав. Віленскай губ., цяпер Польшча — 25.6.1941, мяст. Дайліды (*Dojlidy*), Польшча], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (чэрв. 1910). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзятлава Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл., потым у парафіі св. Станіслава ў в. Даўгінава Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1913 вікарый касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Ясянуўка (*Jasionówka*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Падляскае ваяв., Польшча, парафіі Перамянення Пана ў мяст. Перляева (*Perlejewo*), Польшча, адміністратар касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Дзеркаўшчына Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. З 1915 пробашч парафіі св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Ваўкалата Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. З 1924 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Сідра (*Sidra*) Дамбровенскага дэканата Віленскай архідыяцэзіі, Польшча. З 1934 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы і св. Ганны ў в. Турасень (*Turośń*) Беластоцкага дэканата, Польшча. У 1936 пераведзены ў касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Юхновец

(*Juchnowiec*) таго ж дэканата. З 23.12.1936 адміністратар парафіі НПМ у мяст. Дайліды (*Dojlidy*) таго ж дэканата, дзе арганізаваў пабудову новага драўлянага касцёла (1937). 25.6.1941 а 5-й раніцы ў плябанію ўварваліся савецкія салдаты, якія схапілі святара і пацягнулі яго да ракі Бялкі, дзе пасля катаванняў забілі. Гэтак жа чырвонаармейцы забілі і 85-гадовага бацьку святара. Пасля падпалілі касцёл. Па парафіянах, якія спрабавалі спыніць пажар, салдаты адкрылі агонь. Загінула каля 20 чалавек. Святара і яго бацьку пахавалі 28.6.1941 на парафіяльных могілках. 19.11.1994 адбылася ўрачыстае перанясенне парэшткаў святара да адбудаванага праз 50 гадоў пасля пажару касцёла Хрыста Валадара.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941); Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Антоні Леапольдавіч** [11.7.1893—13.4.1940, Катынь], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). У 1919 катэхет Мінскай духоўнай семінарыі. У 1920 падчас польска-савецкай вайны ваенны капелан. З 1925 пробашч армейскай парафіі ў Слоніме Віленскай архідыяцэзіі, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У 1928 служыў у касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Старая Разядранка (*Stara Rozedranka*) Сакольскага дэканата, цяпер Сакольскі пав. Падляшскага ваяв. З 1930 — у Вільні. З 1.11.1930 маёр, ваенны капелан, пробашч парафіяльнага вайсковага касцёла св. Антонія Падуанскага 20-й польскай дывізіі ў Баранавічах Пінскай дыяцэзіі, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Узнагароджаны Срэбраным «Крыжам Заслугі з Мячамі». У верас. 1939

паранены ў нагу, арыштаваны. Пад следствам знаходзіўся ў турмах Старабельска, Масквы, Казельска. Расстраляны.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Madala T.* Polscy księżą katoliccy w więzieniach i łagrach sowieckich od 1918 r. Lublin, 1993; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Марыя Наталля (Моніка) Браніславаўна** [1902—1992, Мілянувек (*Milanówek*, Польшча)], законніца, уршулянка. Са шматдзетнай сям'і чыгуначніка. У 1925 скончыла дзяржаўную семінарыю настаўніц гаспадаркі ў Кракаве (*Kraków*), Польшча. З 1.9.1925 выкладала гаспадарку, методыку і хімію ў педагагічнай семінарыі сясцёр уршулянак у Пневах (*Pniewy*), Польшча. З 5.9.1928 у ордэне уршулянак. Адбыла пастулят і навіцыят. 1.7.1935 склала вечныя законныя шлюбы. З 1.9.1935 кіраўніца місіянерскага дома ў мяст. Любча, цяпер г. п. Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Стварыла садкі для дзяцей, займалася катэхізацыяй у трох бліжэйшых усеагульных школах, дапамагала ў лячэнні хворых. 20.10.1939 законніцы вымушаны пакінуць Любчу і пераехаць у Чорны Бор, Літва. Арыштавана НКВД 14.6.1941. Этапавана на ўсход СССР. Вызвалена 19.1.1942, верагодна, па амністыі для польскіх грамадзян. Паехала ў Янгі-Юль (Узбекістан), дзе знаходзіўся штаб польскага войска. Прынята сястрой-санітаркай у армію генерала У. Андэрса. Накіравана ў Гузар, потым у Тэгеран. У 1942—44 кіраўніца дзіцячага санаторыя для польскіх дзяцей і настаўніца пачатковых школ у Ісфахане (Іран). 1.10.1944 прызначана выхавацелькай дзяўчат, якія выехалі з Персіі ў Новую Зеландыю. Пасля прыбыцця на месца (з групай з 730 дзяцей і 80 чалавек персаналу) працавала ў дзіцячым асяродку ў Пахятуа (*Pahiatua*). У 1946—47 на Айланд Бэй (*Island Bay*) у Велінгтоне. Пасля вяртання ў Польшчу працавала

ў Серадзе (*Sieradz*). З 1.9.1960 кіраўніца законнага дома і адначасова адміністратар дыяцэзіяльнага дома адпачынку для ксяндзоў і клерыкаў у Налэнчаве (*Nałęczów*). У 1962—71 выконвала абавязкі кіраўніцы законнага дома ў Мілянуўку, у 1971—84 у Чэнстахове (*Częstochowa*). Год знаходзілася ў Кельцах (*Kielce*), потым вярнулася ў Мілянувек.

Кр.: *Aleksandrowicz Monika.* Z Lubcza na Antypody. Warszawa, 1998.

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Юзаф Аўксенцевіч** [1869, маёнтак Каханавічы Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — 11.11.1943], святар. Скончыў духоўную семінарыю ў Житоміры, цяпер Украіна. Прыняў сакрамэнт святарства (1893). Прызначаны вікарыем Жытомірскага катэдральнага касцёла. З 1902 пробашч парафіі ў в. Хабнае каля Кіева. З 1914 у касцёле ў Ізяславе Валынскай губ., цяпер Хмяльніцкая вобл., Украіна, потым пробашч парафіі ў Славуце той жа губ. Арыштаваны (1919). Зняволены ў лагеры ў Наваспаскім, пазней пераведзены ў Бутырскую турму Масквы. Вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Латвіяй і СССР (1924). Служыў у Ковелі, цяпер райцэнтр Валынскай вобл., Украіна. З 1927 адміністратар парафіі Паташня, цяпер Вінніцкай (?) вобл., Украіна. З 1930 — у мяст. Нявіркаў (*Niewirków),* цяпер Люблінскае ваяв., Польшча. З 1936 у Забалоцці і Літовіжы, цяпер Валынская вобл., Украіна. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Забіты членамі УПА ў заблоцкім касцёле каля алтара (падчас набажэнства святару зламалі хрыбет).

Кр.: *Madala T.* Polscy księżą katoliccy w więzieniach i łagrach sowieckich od 1918 r. Lublin, 1993; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**АЛЕНДЭР Казімір Альфонсавіч** [1932, в. Гнезна Ваўкавыскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. — ?], званар. Са шматдзетнай сялянскай сям'і. Да арышту служыў у касцёле св. Міхала Арханёла ў роднай вёсцы. Арыштаваны 5.2.1951. Асуджаны 21.4.1951 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.6.1992 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда. Асабовая справа А. № п-14681 захоўваецца з фотаздымкам у архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

6.11.1939 у в. Гнезна за «антысавецкую агітацыю» арыштаваны селянін-аднаасобнік **Алендэр Каятан Міхайлавіч** (н. у 1867 у в. Гнезна), верагодна, сваяк Казіміра Алендэра. Справа спынена. Вызвалены і рэабілітаваны ў перыяд 2—19.3.1940. Далейшы лёс невядомы. Яго асабовая справа № п-5907 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**АЛЯШЧУК Альфонс** [14.12.1902, мяст. Драгічын (*Drohiczyn*), Польшча — 13.7.1942], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1932). У 1933 прызначаны в. а. адміністратара касцёла Перамянення Пана мяст. Новая Мыш Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Адначасова в. а. адміністратара парафіі ў в. Жалезніца Баранавіцкага пав. Пружанскага дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. На 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны 28.4.1939. Пасля верас. 1939 вярнуўся ў парафію. Арыштаваны з іншымі святарамі Пінскай дыяцэзіі 28(ці 29).4.1942 бел. паліцыяй. Пасаджаны ў Баранавіцкую турму. Расстраляны з 17 святарамі і 23 парафіянамі каля в. Калдычэва (15 км ад Баранавічаў) узводам Літоўскага Зондэр.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Niech ich świadectwo Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach*

*1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**АЛЯШЧУК Альфонс-Міхал Юзафавіч** [1912 — ?], капелан, добраахвотнік. Скончыў Пінскую (?) духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Мабілізаваны ў верас. 1939 (?). Арыштаваны. Этапаваны на Усход. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**АНДРЫКА Пётр** [24.4.1901 — ?], святар. Скончыў духоўную семінарыю ў Луцку, цяпер Валынская вобл., Украіна. Прыняў сакрамэнт святарства (1932). Прызначаны прэфектам агульнаадукацыйных школ у Ковель той жа вобл. З 1933 в. а. адміністратара парафіі ў с. Мышакоўка Канатопскага дэканата, цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна. Пазней у касцёле ў в. Хута-Сцяпанская, парафіі ў Тайкуры (Украіна). У 1939 прызваны на ваенную службу. Пасля вяртання пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Моўчадзь Баранавіцкага пав. Наваградскага ваяв., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны НКВД, верагодна, у 1940. Высланы на ўсход СССР. Паводле некаторых звестак, расстраляны.

Кр.: *Madala T.* Polscy księżą katoliccy w więzieniach i łagrach sowieckich od 1918 r. Lublin, 1993; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Niech ich świadectwo Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**АНДРЭКУС Канстанцін Антонавіч** [1870 або 1875, в. Каўколікі Цельшынскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 27.8.1937, Мінск, турма НКВД], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў гімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1902). Прызначаны вікарыем касцёла Перамянення Пана ў Краснаярску,

Расія. У 1905 пераведзены ў парафію ў в. Варкаў (тагачасны паштовы адрас: ст. Прэлі) Дзінабургскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія. У 1906 в. а. адміністратара, з 1910 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Івандар Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. З 1911 душпастыр касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Лазавіца Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н. З пачатку 1920-х адміністратар і дэкан катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. Таксама служыў у капліцы Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Рудня-Шлягіна Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны АДПУ ў 1932. У 1933 Польскім Чырвоным Крыжам унесены ў спіс палітычных вязняў на абмен, але яго прозвішча не аказалася ў спісе 11 абмяняных літоўскіх святароў. Чарговы раз арыштаваны 5.7.1933 у Мінску. Асуджаны калегіяй АДПУ 24.2.1934 за «правядзенне шпіёнска-дыверсійнай працы на карысць буржуазнай Польшчы» і «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» да 10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Па адной справе з А. праходзілі каталіцкія святары Адольф *Крывіцкі*, Мечыслаў *Сабачынскі* і парафіяне: студэнт Барысаўскага рабфака **Аўласаў Адам Антонавіч** (1906), сяляне-аднаасобнікі **Гатоўка Казімір Міхайлавіч** (1890), **Качан Аляксандр Адамавіч** (1887), **Кішкурна Іван Вікенцевіч** (1900), **Шышла Уладзімір Мартынавіч** (1897), калгаснік **Косцік Іосіф Канстанцінавіч** (1911), бухгалтар **Цяхноўскі Антон Францавіч** (н. у 1888), саматужнік **Чачот Эдуард Адольфавіч** (1880).

Зноў арыштаваны ў чэрв. 1937. Абвінавачваўся ў «шпіянажы», як «удзельнік паўстанцкай арганізацыі «ПАВ» і ў «спробе звяржэння савецкай улады». 25.8.1937 прыгавораны (у адзін дзень з больш чым са 100 падследнымі) да ВМП. Расстраляны з каталіцкімі святарамі Пятром *Аўглом*, Янам *Баравіком*, Аляксандрам *Прытулам*, Станіславам *Райко*, Пятром *Януковічам*, Антоніем *Ячэйкам* і інш. (усяго больш за 70 чалавек[1]).

[1] Гл.: Маракоў Л. Ахвяры і карнікі. Мн., 2007.

Па групавой справе № 28053-с (захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны пракуратурай БВА 31.5.1989.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Памятная книжка Могилевской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Репрессированная вера*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *З асабістага архіва У. Васькова*.

**АНОШКА Уладзіслаў-Канстанцін** [22.12.1902, мяст. Мёры Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — 1941], святар. Паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Уступіў у ордэн св. Францішка канвентуальнага (1926). Вучобу працягваў у Львоўскім ун-це, які скончыў са ступенню магістра багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). З 1932 манах-місіянер у Нагасакі, Японія, потым у Познаньскім кляштары, далей ксёндз-прыёр у гвардыянскім Доме францішканцаў у мяст. Ясло (*Jasło*), Польшча. З 1939 у наваствораным гвардзіянскім кляштары ў в. Зачэпічы, цяпер Дзятлаўскі р-н, касцёле ў Слоніме, адміністратар філіяльнага касцёла св. Юзафа ў в. Руда (Яварская), цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. Цікавіўся гісторыяй Касцёла, у Львове апублікаваў на гэтую тэму кнігу. Забіты 24.6.1941 альбо ў кастр. 1941.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**АНТАНОВІЧ Генрык** [? — 23.6.1942], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. 18.2.1939 мабілізаваны, маёр-капелан, пробашч парафіі

Пінскай флатыліі. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны немцамі. Уцёк. Зноў схоплены і адпраўлены ў Заксенгаўзен, потым у лагер Дахаў, Германія. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**АРАНОВІЧ Міхал Міхайлавіч** [3.5(ці 7.8).1907, в. Любішчыцы Царкоўныя або Любішчыцы Зарэчныя Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 30.8.1991, Гродна], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы (1919), Бельскую прыватную гімназію (1926), Віленскую духоўную семінарыю. Вучыўся на аддзяленні тэалогіі Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1932). Прызначаны вікарыем-адміністратарам парафіі св. Антонія Падуанскага ў в. Каменка Гродзенскага пав. і дэканата, цяпер Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. З 1937 пробашч каменскай парафіі. 24.8.1939 прызначаны капеланам 3-га палка лёгкай кавалерыі ў Сувалках, Польшча. Пасля верас. 1939 перайшоў у Літву. 24.9.1939 інтэрнаваны ў Бірштаны, Літва, дзе знаходзіўся да 5.7.1940. Арыштаваны літоўскімі ўладамі. Зняволены. Уцёк з турмы, прыехаў у Вільню. У кастр. 1940 прызначаны вікарыем касцёла Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь аднайменнага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З канца чэрв. 1941 зноў пробашч парафіі ў Каменцы. Са жн. 1948 рэктар касцёла Звеставання НПМ у Гродне. Пасля яго закрыцця ў сак. 1950 вікарый касцёла Адшукання Св. Крыжа ў Гродне. Арыштаваны супрацоўнікамі МДБ 17.2.1951. Абвінавачваўся ў тым, што «ў перыяд польскага буржуазнага ўраду з'яўляўся арганізатарам і кіраўніком антысавецкай рэлігійнай арганізацыі «Акцыя каталіцкая». Служыў капеланам польскай арміі, заклікаў польскіх салдат да барацьбы супраць савецкіх войскаў». У ходзе следства высветлілася, што ў студз. 1950 святар спавядаў удзельніцу польскага падполля **Ліс Сафію**. Яна расказала, што дала прысягу на вернасць

службе Польшчы. Гэтага эпізоду аказалася дастаткова, каб абвінаваціць А. яшчэ ў «сувязях з удзельнікамі арганізацыі АК» і натхненні іх на вядзенне барацьбы супраць савецкай улады. Асуджаны 11.8.1951 асобай нарадай МДБ СССР да 10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Камышовы лагер МДБ Кемераўскай вобл. (пас. Міжрэчча, пас. Ольжарасы). 30.7.1951 пракурор аддзела па Спецсправах МУС СССР пераквαліфікаваў прысуд з арт. 24-63-1 КК БССР (сувязь з бандай, здрада радзіме) на арт. 66 КК БССР (антысавецкая агітацыя). Прыбыў у лагер 4.10.1951. Пераведзены 11.10.1952 у Мінскую ўнутраную турму МДБ. 18.2.1953 справа зноў перагледжана і святар вызвалены. Атрымаў дазвол служыць у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Адэльск, цяпер Гродзенскі р-н, потым у касцёле Адшукання Св. Крыжа ў Гродне. З 1954 гродзенскі дэкан, генеральны вікарый па Гродзенскай акрузе Віленскай архідыяцэзіі на тэрыторыі СССР. Больш за 30 гадоў адзіны каталіцкі святар у Гродне, дзе налічвалася каля 50 тысяч католікаў. Акрамя адкрытай душпастырскай працы, патаемна хрысціў, благаслаўляў шлюбы, праводзіў іншыя сакрамэнты. У 1979 Папа Ян Павел II прызначыў А. ганаровым папскім прэлатам, пазней інфулатам. Рэабілітаваны 30.10.1989 пракурорам Гродзенскай вобл. Асабовая справа А. № п-10547 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

З А. асуджаны святары Б. *Грынявіцкі*, А. *Тамковіч,* парафіяне **Багінь Іван Іванавіч** (н. у 1899), яго сын, студэнт Брэсцкага педагагічнага інстытута **Багінь Станіслаў Іванавіч** (1932), **Багінь Уладзіслава Баляславаўна** (1904), **Багінь Ядвіга Іванаўна** (1895), **Барэйша Марыя Іванаўна** (1904), **Барэйша Уладзіслаў Антонавіч** (1911), **Пацук Валяр'ян Вікенцевіч** (1911).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w*

*golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**АРЛОЎСКІ Казімір** [23.11.1914, мяст. Сапоцкін Аўгустоўскі пав. Сувалкаўскай губ., цяпер г. п. Гродзенскага р-на — 18.5.1987, Гродна], святар. Скончыў гімназію св. Казіміра ў г. Сейны (*Sejny*), Польшча, духоўную семінарыю ў Ломжы (*Łomźa*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (5.11.1939). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Адамавічы Гродзенскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер Гродзенскі р-н. Падчас 2-й сусветнай вайны супрацоўнічаў з АК. У канцы 1944 — пачатку 1945 на год пазбаўлены права выконваць душпастырскія функцыі, але працягваў сваю службу патаемна. Арыштаваны 5.7.1950 у Ломжы. Пад следствам знаходзіўся ў Гродзенскай турме МДБ. Асуджаны 28.12.1950 Гродзенскім абл. судом за «правядзенне антысавецкай агітацыі», «захоўванне антысавецкай літаратуры», «супрацоўніцтва з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Не прызнаў сябе вінаватым. Этапаваны ва Ухта-Іжэмскі лагер МДБ Комі АССР. 28.9.1955 пастановай Вярхоўнага Савета СССР тэрмін зніжаны да 10 гадоў. Вызвалены датэрмінова 8.10.1955. Прыехаў 15.10.1955 у Вільню, потым у Гродна, адтуль у сваю парафію Адамавічы. Дзякуючы намаганням вернікаў 11.6.1956 зарэгістраваны на старым месцы працы, дзе служыў амаль да самай смерці. Апекаваўся вернікамі суседніх парафій. У 1978—84 выконваў абавязкі пробашча парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Тэолін (*Teolin)* Ломжынскай дыяцэзіі, Польшча. 26.11.1984 атрымаў ганаровы тытул папскага прэлата. Памёр у Гродзенскім шпіталі ад сардэчнага прыступу. Пахаваны на парафіяльных могілках у Адамавічах. Рэабілітаваны 22.7.1998 прэзідыумам Вярхоўнага суда Беларусі.

Кр.: *НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 66; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**АРЛОЎСКІ Ян Францавіч** [1887, мяст. Крошын Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — 15.9.1937, Левашоўская пусташ каля Ленінграда, цяпер Санкт-Пецярбург], майстар кантролю на ленінградскай фабрыцы, парафіянін касцёла св. Станіслава ў Ленінградзе, кіраваў гуртком пры парафіі. Арыштаваны ў крас. 1935. Вызвалены ў 1935. Зноў арыштаваны 21.8.1937. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 9.9.1937 да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**АСКРЭТКАВА Вераніка Якубаўна** [1868, в. Каўлычы Рэжыцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — ?]. парафіянка, прыбіральшчыца касцёла св. Кацярыны ў Петраградзе. Арыштавана 12.4.1920. Асуджана ЧК Ленінграда 13.4.1920 да 3 месяцаў прымусовых работ. Зноў арыштавана 13.1.1927 па справе «групы католікаў Ленінграда». Вызвалена 14.3.1927. Справа спынена 13.5.1927. У чарговы раз арыштавана 8.12.1929 па справе «Т. Матулёніса і інш.». Асуджана калегіяй АДПУ 8.9.1930 да 5 гадоў ППЛ (заменена ссылкай у Сібір). У 1935 вярнулася ў Ленінград. У лют. 1941 пазнаёмілася са святаром Паўлам *Хомічам*, удзельнічала ў таемных набажэнствах. Арыштавана 17.7.1942 па справе «П. Хоміча і інш.». Вызвалена 1.9.1942. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**АСТАНЕВІЧ Стэфан** [1892—26.6.1954], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). З 1916 ваенны капелан. З 1924 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў мяст. Лужкі Глыбоцкага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. З 1933 віцэ-дэкан. З 1937 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Празарокі Глыбоцкага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Паводле некаторых звестак, таксама служыў у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Глыбокае аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны ў 1945. Асуджаны за «здраду радзіме» да 25 (?) гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Паводле адных звестак, пасля датэрміновага вызвалення вярнуўся на радзіму, паводле інш. загінуў у зняволенні.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**АСТРАМОВІЧ Аляксандр Сцяпанавіч** [псеўданімы і крыптанім: A. Ziaziula; А. Зязюля; Andrej Ziaziula; Андрэй Зязюля; A.Z.; 26.11(7.12).1878, в. Навасяды Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. — 17.1.1921, мяст. Сянно Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл.], святар, паэт. З бел. сялянскай сям'і. Вучыўся ў Гальшанскім народным (1888—90) і Ашмянскім павятовым (1890—92) вучылішчах. У 1901—03 на вайсковай службе. У 1903—04 спрабаваў паступіць у Віленскую духоўную семінарыю. У 1905 выехаў у Санкт-Пецярбург, вытрымаў іспыты на званне аптэкарскага вучня (студз. 1906). У 1906—11 вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). Падчас вучобы пад уплывам земляка святара А. *Лісоўскага*

далучыўся да бел. культурнага і рэлігійнага руху. Арганізаваў аб’яднанне клірыкаў-беларусаў. З 1909 друкаваўся ў бел. прэсе. У 1912 вікарый парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Ракаў Мінскага пав., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. У 1913—15 рэктар касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Анопаль Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н. У другой палове 1910-х г. служыў у парафіі Нараджэння НПМ у в. Трабы Ашмянскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл., у парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Свержань (Новы Свержань) Мінскага пав. і губ., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл., у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Смілавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл., у касцёле св. Юзафа і НПМ у мяст. Валожын, у парафіі НПМ у мяст. Абольцы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Прыхільнік беларусізацыі рэлігійнага жыцця беларусаў-католікаў. Практыкаваў бел. казанні ў душпастырскай дзейнасці. Быў знаёмы з **Я. Купалам, Я. Коласам**, якія ў 1912 наведалі яго ў Свержані, **М. Багдановічам, Зоськай Верас**. Аўтар зборніка паэзіі «Z rodnaha zahonu» (Вільня, 1914; перавыдаваўся ў 1931). Патрыятычны верш «Słowa praudy ab mowie i doli biełarusa: (Paświačaju biełaruskaj moładzi)» выдадзены асобнай брашурай (1917). Прыхільнік хрысціянска-маралізатарскай паэзіі, яго вершы маюць дыдактычны характар. У асобных творах паэтычна адлюстроўваў працу бел. селяніна. Запісваў і апублікаваў з **А. Грыневічам** бел. народныя песні. Адзін з арганізатараў 1-га з’езда бел. каталіцкіх святароў (Мінск, 6—7.6.1917). Пасля абвяшчэння БНР па даручэнні Народнага сакратарыята арганізаваў рэгіянальныя Рады ў Магілёўскай губ. За нацыянальна-рэлігійную дзейнасць праследаваўся савецкімі ўладамі: некалькі тыдняў знаходзіўся ў турме Віцебскай ЧК. Апошні год жыцця служыў у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Сянно. Пахаваны на мясцовых могілках.

Тв.: *Z rodnaha zahonu: Zbornik wierśaŭ. Wilnia, 1931.*

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Раніца П.* Вясковы лірнік // *Беларус.* 1914. 2 крас.; *Гарэцкі М.* Андрэй Зязюля // Гарэцкі

М. Гісторыя беларускай літаратуры. Вільня, 1920; *Краўцоў М.* Аляксандр Астрамовіч: Кароткі ўспамін // *Беларускі звон*. 1921. 16 снеж.; *Станкевіч А.* Кс. А. Астрамовіч (А. Зязюля) // *Беларуская крыніца*. 1923. 13 студз.; *Сакалінскі А.* [*Станкевіч А*]. У дзясятыя ўгодкі смерці Андрэя Зязюлі // *Шлях моладзі*. 1931. № 1; *Беларуская крыніца*. 1931. 27 лют.; *Божым шляхам* (Лондан). 1951. № 3; 1965. № 2; 1968. № 6 (перадрукі: *Гарбінскі БРД*, с. 269—274); *Саламевіч Я.* Паэт-святар Андрэй Зязюля // *Беларуская мова і літаратура ў школе*. 1991. № 7—8; *БП*, т. 2; *ЭГБ*, т. 3; *BS*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**АЎГЛО Пётр Язэпавіч** [11.5.1861, в. Унгурас Тавянскай воласці Вількамірскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 27.8.1937, Магілёў, турма НКВД], святар. З літоўскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (11.2.1887). 12.10.1887 прызначаны вікарыем, пазней адміністратарам касцёла Унебаўзяцця НПМ у Мсціславе Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., дэкан. З 1896 ці 1897 пробашч смаленскай парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ. У 1898 запрасіў кіраўніка тайнага Таварыства Дачок Найчысцейшага Сэрца НПМ Паўлу **Малецкую**, якая заснавала тры выхаваўчыя пляцоўкі для дзяцей з патаемным навучаннем польскай мове і рэлігіі. Гэта былі: выхаваўча-мануфактурная ўстанова для 90 дзяўчат, выхаваўча-рамесніцкая ўстанова для 32 хлапцоў, а таксама кравецкая, пераплётная і шавецкая майстэрні для 20 чалавек з беднай мясцовай моладзі. У 1906 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Клецк Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Некаторы час служыў у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў Раслаўлі, цяпер Смаленская вобл., Расія. З 1914 без пасады. У 1916—17 пробашч касцёла св. Францішка ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. З 1922 адміністратар касцёла ў Выбаргу, рэктар філіі Беззаганнага Зачацця ў пас. Усць-Іжора, цяпер Ленінградская вобл., Расія, адміністратар парафіі Звеставання НПМ у Петраградзе. Паралельна абслугоўваў кас-

цёлы св. Аляксея і св. Францішка ў Петраградзе, парафію св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Кранштаце, касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў пас. Паргалава, капліцу ў пас. Вырыца, цяпер Ленінградскай вобл., Расія. Арыштаваны ў 1922 і ў 1923 (праходзіў па справе арцыбіскупа Яна *Цепляка* і 14 петраградскіх святароў). Вызвалены. З 6.7.1925 пробашч касцёла св. Барбары і, верагодна, паралельна касцёла св. Антонія Падуанскага, дэкан у Віцебску (замяніў Л. *Бараноўскага*). Паўторна арыштаваны ў 1927. Абвінавачваўся ў «шпіянажы на карысць Польшчы» і «контррэвалюцыйнай агітацыі». Каля 200 дзён правёў у Смаленскай турме АДПУ. Пасля вызвалення — кіруючы Магілёўскім і Мінскім дэканатамі, генеральны вікарый біскупа Б. *Слоскана*, ганаровы канонік Магілёўскай капітулы. 15.3.1930 пасля шматгадзіннага прэсінгу агентаў АДПУ падпісаў (быццам за абяцанне адкрыць зачыненыя касцёлы, а таксама паменшыць падаткі, якія накладаліся на адчыненыя касцёлы і святароў) заяву, у якой адмаўляў інфармацыю пра пераслед у СССР духавенства і вернікаў (заява з'явілася 21.3.1930 у выглядзе інтэрв'ю са святаром у газ. «Рабочий», якая выдавалася ў Магілёве, і 20.3.1930 у маскоўскай «Правде»). Пра гэты факт А. паведаміў у Рым праз Апостальскага Адміністратара ў Маскве біскупа **Пія (Неве)**, якому перадаў звесткі праз спецыяльнага пасланца. У сваім лісце сцвярджаў, што да той заявы ён быў змушаны і падпісаў яе ў стане фізічнай і псіхічнай знясіленасці, што вельмі пра яе шкадуе і просіць у сувязі з гэтым аб звальненні з пасады галоўнага вікарыя ў Магілёве. Яго просьбу не выканалі, пра што яму паведаміў біскуп **Мішэль Д'Эрбіны** з Рыма на адкрытай паштоўцы, падпісанай па-лацінску. Каб прымусіць А. нервавацца, НКВД праводзіла штотыднёвыя вобыскі ў яго кватэры на вул. Камсамольская, д. 4. Адзін з агентаў НКВД паведаміў яму 16.6.1936 пра наступнае рашэнне: *«Вырашылі, што вас ліквідуем, і будзьце ўпэўненыя, што так і станецца. Каб нам не выкарыстоўваць гвалту, ліквідуйцеся самі»*. Зноў арыштаваны 15.6.1937 пасля набажэнства ў капліцы св. Антонія Падуанскага на могілках у Магілёве. Абвінавачваўся

3.7.1937 як «кіраўнік дыверсійна-паўстанцкай групы ПАВ, мэтай якой была арганізацыя ўзброенай барацьбы супраць савецкай улады» і «агент польскай разведкі». Падчас следства пасля катаванняў падпісаў вялікі, відавочна адрэдагаваны следчымі НКВД пратакол, у якім нібыта прызнаў, што з 1917 быў агентам ПАВ у Смаленску, дзе ўдзельнічаў у фармаванні польскіх легіёнаў, а таксама ў Віцебску, Петраградзе, Магілёве, дзе быў нібыта камендантам гэтай арганізацыі, кіруючы вялікай групай агентаў. Прызнаваўся, што на працягу доўгага часу актыўна супрацоўнічаў з польскім падполлем у СССР, якое рыхтавала ўзброенае паўстанне ў Беларусі і мела на мэце далучэнне яе да Польшчы, атрымліваў з-за мяжы вялікія сумы грошай, якія даваў іншым для правядзення шпіёнскай дзейнасці паводле загадаў з Польшчы, Францыі, Ватыкана, Японіі. Абвінавачваў шмат іншых асобаў, якія тады ўжо не жылі: арцыбіскупа Яна *Цепляка*, біскупа Антонія *Малецкага*, біскупа **Пія (Неве)**, які ўжо знаходзіўся ў Францыі, біскупа Баляслава *Слоскана* (з 1933 у Латвіі), арцыбіскупа Эдварда *Ропа*, Магілёўскага Мітрапаліта, які жыў у Польшчы, польскую дыпламатычную пляцоўку ў СССР, шмат святароў мясцовых і тых, якія знаходзіліся ў Польшчы, свецкіх людзей з Беларусі і Польшчы. Прыгавораны тройкай НКВД 25.8.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БВА. Асабовая справа А. № 11787 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; Репрессированная вера*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Литургический календарь*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Канфесіі на Беларусі*; *Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Жертвы политического террора в СССР*; *Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. Мн., 2007.

**АЎГУСЦІНОВІЧ Аляксандр Казіміравіч** [20.5.1890, фальв. Селішча Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. (паводле іншых звестак, Свянцянскага (Завілейскага) пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 10.3.1943, ваколіца Ліды], святар. З бел. сялянскай сям'і. У крас. 1908 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю, аднак з-за недахопу месцаў вучобу пачаў у кастр. 1909. Удзельнічаў у рабоце бел. гуртка. Прыняў сакрамэнт святарства (1913). Пасля сканчэння семінарыі прызначаны вікарыем касцёла св. Рафала Арханёла ў Вільні. З 1918 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Беніца Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл., пазней адміністратар касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Лоск Ашмянскага пав., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 1925 пробашч парафіі св. Станіслава ў в. Даўгінава Вілейскага дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. Гаварыў казанні па-беларуску. Быў прыхільнікам Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Выступіў супраць пагаднення, заключанага ў 1925 паміж Рымам і ўрадам Польшчы. Быў адным з 15 ксяндзоў, якія 19.5.1925 ад імя бел. каталіцкага духавенства выступілі на агульнапольскай канферэнцыі біскупаў з заклікам аб ужыванні бел. мовы ў касцёлах. Падчас 20-годдзя паміж войнамі падтрымліваў ідэю ўжывання бел. мовы ў каталіцкіх духоўных семінарыях у Вільні і Пінску, у касцёльных казаннях. Фінансава падтрымліваў бел. рэлігійную прэсу («Krynica», «Chryścijanskaja Dumka»). З 1931 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Нецеч Лідскага пав. і дэканата, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл., дзе служыў і падчас 2-й сусветнай вайны. У канцы чэрв. 1942 арыштаваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. Пасля 9 месяцаў зняволення ў Лідскім астрозе з групай з дзевяці каталіцкіх святароў і інш. расстраляны (гл. арт.: *Ажароўскі* Ю.).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Krahel T.,* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998. № 3 (98); *Ярмусик, Католический Костел*

*в Белоруссии в годы второй мировой войны*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Żurek W. Salezjańscy męczennicy Wschodu.*

**АЎЛІХ Леапольд** [26.5.1886—24.7.1943], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Падчас вучобы кантактаваў з беларускім асяродкам. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). У 1919—26 адміністратар, пробашч касцёла Божага Цела ў мяст. Давыд-Гарадок Столінскага пав. Лунінецкага дэканата Пінскай дыяцэзіі, цяпер горад Столінскага р-на Брэсцкай вобл. У 1928 служыў у парафіі Перамянення Пана ў мяст. Перляева (*Perlejewo*) Пінскай дыяцэзіі, цяпер Польшча. У 1930—35 душпастыр парафіяльнага касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Крывошын Баранавіцкага пав. Наваградскага ваяв., цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Потым дэкан парафіі Міхала Арханёла (?) у мяст. Івянец аднайменнага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл., пазней пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Камень таго ж р-на, дэкан Івянецкі. З пачаткам 2-й сусветнай вайны ўдзельнічаў у беларусізацыі каталіцкага Касцёла. Расстраляны немцамі з вікарыем Казімірам *Рыбалтоўскім*. Пахаваны пры касцёле ў Камені.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**БАГАТКЕВІЧ Мечыслаў Станіслававіч** [29.10.1904, в. Крыкалы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — 4.3.1942 ці 13.7.1942], святар, брат кс. Станіслава *Багаткевіча*. Скончыў агульнаадукацыйную школу, вучыўся ў гімназіях Будслава, Докшыцаў, Навагрудскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (23.6.1933). Прызначаны прэфектам Ніжэйшай духоўнай семінарыі ў Драгічыне (*Drohiczyn*) Беластоцкага ваяв., Польшча. З 1935 вікарый касцёла св. Юзафа ў Лунінцы аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., прэфект пачатковай школы. У пачатку 2-й сусветнай вайны (верас. 1939) наведаў брата, з 1938 адміністратара новага касцёла Маці Божай Міласэрнасці ў в. Пушкі Браслаўскага дэканата, цяпер Літва. У суседняй парафіі св. Апостала Якуба ў в. Пеліканы Браслаўскага дэканата, цяпер в. Мілюнцы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., не было пробашча, і ён пачаў выконваць яго абавязкі. З канца ліст. 1941 пробашч парафіі Нараджэння НПМ у Дрысе, цяпер райцэнтр Верхнядзвінск Віцебскай вобл. На яго набажэнствах заўсёды было шмат народу. Пропаведзі святара глыбока западалі ў сэрца. Тым, хто жыў у нястачы, ён аказваў магчымую матэрыяльную дапамогу. Перапісваўся з арцыбіскупам Р. *Ялбжыкоўскім*. Актыўная душпастырская дзейнасць святара не падабалася акупантам. Арыштаваны гестапа 16.1.1942 (паводле іншых звестак, 26.6.1942). Пасаджаны ў турму ў Браславе (паводле іншых звестак, у Баранавічах). Расстраляны з ксяндзамі Уладзіславам *Мацьковякам* і Станіславам *Пыртакам* каля в. Беразвечча, цяпер в. Беразвецкі Абруб Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. 13.6.1999 беатыфікаваны Папам Янам Паўлам II у групе 108 Мучанікаў.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**БАГАТКЕВІЧ Станіслаў Станіслававіч** [6.2.1906, в. Крыкалы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — пасля 2003], святар, брат Мечыслава *Багаткевіча*. Скончыў народнае вучылішча (1915), Віленскую духоўную семінарыю, Віленскі ун-т імя Стэфана Баторыя са ступенню магістра тэалогіі (1935). Прыняў сакрамэнт святарства (20.6.1935). Прызначаны вікарыем парафіі св. Ганны ў в. Крынкі Гродзенскага пав. Бераставіцкага дэканата, цяпер Польшча. У 1937 катэхет пры касцёле Нараджэння НПМ у мяст. Відзы Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1938 адміністратар новай парафіі Маці Божай Міласэрнасці ў в. Пушкі Браслаўскага дэканата, цяпер Літва. З канца ліст. 1941 в. а. пробашча (змяніў свайго брата) касцёла св. Апостала Якуба ў в. Пеліканы Браслаўскага дэканата, цяпер в. Мілюнцы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. З ліп. 1948 хаваўся ад агентаў МДБ у сям'і Ракелаў у в. Рымшаны, у сям'і Мілінкевічаў у в. Руда. Арыштаваны МДБ 10.1.1950. Асуджаны 30.3.1950 за «антысавецкую агітацыю» і «здраду радзіме» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў Пясчаны лагер (асоблаг № 8) МДБ Казахскай ССР (Караганда). У 1953 пераведзены ў суседні Сцяпны лагер. Вызвалены 20.6.1956. Вярнуўся ў Пеліканы. Не атрымаўшы рэгістрацыі і дазволу на працу, вымушаны служыць тайна. Адпраўляў св. Імшу ўвечары ці нават позняй ноччу. Парафіяне шукалі для службы розныя памяшканні, ставілі сваіх вартаўнікоў і казалі суседзям, куды і калі з'явіцца, каб скарыстацца з ласкі Божай. Пад пагрозай новага арышту змушаны выехаць у Польшчу. Служыў у касцёле ў Левіне Бжэскім (*Lewin Brzeski*), парафіі Быстшыца (*Bystrzyca*). З 1970 пробашч касцёла ў Чэрніне (*Czernin*) каля Вроцлава (*Wroclaw*).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego*

*w ZSRS; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БАГДАНОВІЧ Каміла Ігнатаўна** [1897, Лепельскі пав. Віцебскай губ. — ?], хатняя гаспадыня, з 1914 парафіянка касцёла св. Францішка ў Санкт-Пецярбургу. З 1930 член парафіяльнай рады. Арыштавана ў ліст. 1937. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**БАЙКА Юзаф [**18.9.1890, в. Малявічы Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Падляшскае ваяв., Польшча — 6.8.1943, в. Налібакі, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл.], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (13.6.1913). Прызначаны вікарыем касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Ельня Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл., потым пераведзены ў парафію св. Міхала Арханёла ў мяст. Поразава Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. Удзельнічаў у рабоце I з'езда Беларускага каталіцкага духавенства ў Мінску (24—25.5.1917). Уваходзіў у Саюз беларускіх ксяндзоў. З 1918 адміністратар касцёла Маці Божай Балеснай у в. Асмола (*Osmoła*), Польшча (паводле іншых звестак, служыў у парафіі Перамянення Пана ў в. Спас, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл.). З 1920 душпастыр парафіі ў мяст. Слядзянаў (*Śledzianów*) Бельскага пав. Гродзенскай губ., з 1921 Беластоцкае ваяв., Польшча. Да сярэдзіны 1920-х побач з казаннямі на польскай мове прапаведаваў і па-беларуску. Фінансава падтрымліваў бел. каталіцкую прэсу ў Польшчы, у тым ліку газ. «Kryniсa» і час. «Chryścijanskaja Dumka». Спрычыніўся да будаўніцтва касцёлаў у Слядзянаве і Налібаках. У 1929 стаў папскім камергерам. З 1933 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ

у в. Налібакі Стаўбцоўскага пав. Івянецкага дэканата, дзе служыў да пачатку 2-й сусветнай вайны. Арыштаваны органамі НКВД 22.10.1939. Абвінавачваўся ў «байкатаванні выбараў» у Народны сход Зах. Беларусі, але хутка быў вызвалены. Летам 1943 затрыманы са сваім вікарыем Ю. *Барадынам* нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў час карнай аперацыі «Герман». Спалены з іншымі жыхарамі Налібакаў у гумне (паводле іншых звестак, расстраляны ў Налібоцкай пушчы).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**БАКІНОЎСКІ Альберт Серафімавіч** [4.2.1897, в. Марозы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. — 29.10.1978, Сыцаў (*Syców*), Польшча], святар. З бел. сялянскай сям'і. У 1915 паступіў у Магілёўскую духоўную каталіцкую семінарыю ў Санкт-Пецярбургу (Петраградзе). Пасля кастрычніцкага перавароту і зачынення семінарыі савецкімі ўладамі працягваў вучобу ў Мінску і ў Вроцлаве. Прыняў сакрамэнт святарства (12.6.1921). Служыў у касцёле Перамянення Пана ў мяст. Новая Мыш Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. У 1922 вікарый парафіі Божага Цела ў мяст. Нясвіж, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1923 адміністратар касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Столін Лунінецкага дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Падтрымліваў бел. часопіс «Chryścijanskaja Dumka», выступаў з казаннямі на бел. мове. З 1928 пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Камянец-Літоўск, цяпер г. Камянец Брэсцкай вобл. У 1933—34 в. а. пробашча касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Пелішча, цяпер Камянецкі р-н Брэсцкай вобл. З 1935 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Шарашова Пружанскага пав. і дэканата, цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны 22.5.1948. Асуджаны 19.7.1948 асобай нарадай МДБ

за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Дубраўны лагер МУС Мардоўскай АССР (п/с ЖХ-385/7). Вызвалены 16.5(ці 20.7).1956. Жыў у Пружанах, райцэнтры Брэсцкай вобл., чакаў дазволу на душпастырскую дзейнасць. 15.3.1957 атрымаў дазвол і пачаў служыць у касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Пелішча. У жн. 1958 выехаў у Польшчу. Служыў пробашчам філіяльнага (парафіі Сыцаў) касцёла ў в. Слізаў (*Ślizow*) Вроцлаўскай архідыяцэзіі. Рэабілітаваны 21.10.1994 прэзідыумам Брэсцкага абл. суда. Асабовая справа Б. № 13349-с захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *БНДЦЭД; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**БАЛАМАНСКІ Антон** [1910, в. Табала Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. — 10.3.1943], парафіянін. Арыштаваны гестапа з пробашчам касцёла св. Мучаніка Юрыя ў в. Беліца Лідскага дэканата (цяпер Лідскі р-н) Стэфанам *Дабравольскім* за арганізацыю шэсця з нагоды асвячэння прыдарожнага крыжа ля роднай вёскі. Пасаджаны ў Лідскую турму. Расстраляны з 9 святарамі.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**БАЛТРАЛІК Ян** [5.4.1902—1982], святар. Скончыў духоўную семінарыю ў Ломжы (*Łomża*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (1926). Паводле некаторых звестак, арыштаваны пасля 1939. У 1950—1960-я пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Сапоцкін Гродзенскага р-на. Паказальная характарыстыка «антыдзяржаўнай» дзейнасці святара, прыведзеная ўпаўнаважаным Савета па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР па Гродзенскай вобл. П. Чыжа ў справаздачы за першае паўгоддзе 1952: *«Поведение ксендза крайне реакционное, по его инициативе в Сопоцкинском районе повсеместно производились «майские моления» возле дорог под открытым небом, а в деревне Доргуни «моления» происходили возле семилетней школы… Дети насильственно обучаются катехизису. Вспышка религии в Сопоцкинском районе не случайна, этому виновен декан Болтралик. Он опирается на свой широкий актив «терциариев», активно действующие костельные комитеты и политическую организацию старой панской Польши «Зеленый штандарт». Это организация, борющаяся за свержение власти и творение всех беззаконностей и актов саботажа против проводимых нами мероприятий, как то: коллективизация сельского хозяйства, заготовки и др. мероприятия… Коллективизация сельского хозяйства в районе проведена только на 26 %. Тормоз в этом, по моему мнению, является только то, что заранее не ликвидированы очаги антисоветской пропаганды, зачинщиком которых является ксёндз и его актив «терциарии», руководство костельных комитетов и «Зеленый штандарт».* 9.5.1962 Б. са святарамі **Б. Гаўрыхоўскім,** С. *Сарокам* і **У. Чарняўскім** падпісаўся пад зваротам да прэзідэнта ЗША **Дж. Кенэдзі** аб спыненні выпрабавання атамнай зброі.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**БАЛЮЛЬ Вінцэнт Вінцэнтавіч** [1874—13(ці 31).8.1944], святар, педагог. Скончыў Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1899). З 1901 катэхет навучальных установ Дзвінска Віцебскай губ., цяпер Даўгаўпілс, Латвія. З 1916 пробашч і дэкан касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. Арыштаваны ў 1919. Вызвалены. У 1921 выехаў у Польшчу. Працаваў катэхетам у мяст. Пясочна (*Piaseczne*) Варшаўскага дэканата. У 1925 — у біскупскім судзе Магілёўскай дыяцэзіі, арганізаваным арцыбіскупам Э. *Ропам* у Варшаве. У 1932—39 адначасова капелан школы для дзяўчат у Хілічках (*Chiliczky*), Польшча. Прэлат і канонік Магілёўскай архідыяцэзіі. Падчас 2-й сусветнай вайны выселены немцамі з дому.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БАНЕВІЧ Казімір Густававіч** [29.1.1905, мяст. Паставы Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — 4.2.1992, Кросна Аджанскае (*Krosno Odrzańskie*), Польшча], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (4.6.1933). Прызначаны вікарыем парафіі Божага Цела і Маці Божай Ружанцовай у в. Гадуцішкі Свянцянскага дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. З 28.4.1939 капелан рэзерву Войска Польскага. У 1940—41 хаваўся ад НКВД у Вільні. З 1944 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у г. Ліда. У 1946—48 генеральны вікарый біскупа Б. *Слоскана*. Арыштаваны 10.7(ці 6).1951. Абвінавачваўся ў тым, што, «з'яўляючыся непрымірымым ворагам Савецкай дзяржавы і як варожа настроены да існуючага

ладу, на працягу шэрагу гадоў, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, сістэматычна праводзіў сярод парафіян антысавецкую агітацыю і прапаганду, накіраваную на выхаванне каталіцкага насельніцтва ў духу нянавісці да Савецкага ўрада і Камуністычнай партыі… Запалохваў парафіян адказнасцю перад рэлігіяй і законам божым, заклікаў сабаціраваць мерапрыемствы савецкага ўрада, не ўступаць у партыю і камсамол». Асуджаны 18.10.1951 да ВМП (заменена на 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў) з канфіскацыяй маёмасці. Прызнаў сябе вінаватым толькі ў захаванні літаратуры «антысавецкага зместу». З 1953 знаходзіўся ў Каргапольскім лагеры МДБ Архангельскай вобл. (больш за 17 000 зняволеных). Двойчы, 11(ці 17).9.1954 і 27.9.1955, справа святара пераглядалася па яго скарзе пракуратурай БССР. Толькі ў другі раз нам. пракурора А. Вярбіцкі палічыў, што «мера пакарання вызначана занадта жорсткая». 30.9.1955 судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР знізіла тэрмін да 10 гадоў. 19.5.1955 пераведзены ва Усольскі лагер МДБ Іркуцкай вобл. (750 зняволеных), а 26.9.1956 — у Дуброўны лагер МДБ Мардоўскай ССР (больш за 8000 зняволеных). Вызвалены 12.9.1957. Вярнуўся ў Ліду. Не атрымаўшы дазволу на душпастырскую дзейнасць, выехаў у Польшчу. Служыў пробашчам парафіі Саколіца (*Sokolica*) Вроцлаўскага дэканата, у філіяльным касцёле ў Лабендніку (*Łabędnik*), парафіі Кросна Аджанскае, дзе і памёр. Рэабілітаваны 17.3.1992 Вярхоўным судом Беларусі. Асабовая справа Б. № п-14944 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Разам з Б. у Лідзе 18.10.1951 прыгаворана за «антысавецкую агітацыю» **Рудкоўская Ніна Васілеўна** (н. у 1924 у в. Богіна, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., у польскай сялянскай сям'і) да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапавана ў адзін з лагераў МДБ Комі АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 27.3.1992 калегіяй Вярхоўнага суда Беларусі. Асабовая справа Р. № п-15263 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр. *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**БАНЬКОЎСКІ Антоні Андрэевіч** [1909, в. Гліннік (*Glinnik*) (Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 23.9.1996], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, ун-т імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Прызначаны катэхетам у школу пры касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Свіслач Ваўкавыскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Праз год вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзятлава Наваградскага пав. Дзятлаўскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У 1938 катэхет і вікарый пры парафіі Маці Божай Ружанцовай у мяст. Ракаў Вілейскага дэканата, цяпер вёска Валожынскага р-на Мінскай вобл. З 1939 у касцёле Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў в. Крамяніца, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл., капелан АК. У пасляваенны час са святарамі Я. *Васілеўскім* і В. *Нуркоўскім* часцей за ўсё згадваўся ў савецкай атэістычнай прапагандзе. Арыштаваны 29.5.1947. Пад следствам знаходзіўся ў Гродне, Мінску. Катаваны на допытах. Абвінавачваўся ў тым, што, *«являясь связным и содержателем связи штаба Волковысского обвода АК, принимал от коменданта обвода приказы о совершении терактов против партийно-советского актива и передавал эти приказы для исполнения коменданту группы «Жондло»; на основании указанных приказов было совершено около 20 терактов»*. Святар прызнаў сябе вінаватым толькі ў тым, што ў яго кватэры са снеж. 1946 існаваў пункт сувязі Ваўкавыскага абвода АК, дзе пакідаліся загады і іншыя дакументы. Асуджаны ў адзін дзень са святаром М. *Малынічам-Малецкім* 3.1.1948 асобай

нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» і «здраду радзіме» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны праз турму ў Кіраве ў Варкуцінскі лагер МДБ Архангельскай вобл. і Комі АССР. 2.7.1955 высланы ў Кастраму. Вызвалены ў 1957. Вярнуўся ў Беларусь. Служыў пробашчам касцёла св. Юрыя ў в. Асава Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. Меў пад апекай таксама парафіі Воранава і Германішкі, Тракелі, Нача, Забалаць Воранаўскага р-на. З крас. 1989 на пенсіі па інваліднасці. Не рэабілітаваны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Жертвы политического террора в СССР*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; З асабістага архіва Л.А.Міхалік.*

**БАРАВЕЦ Францішак** [22.1.1906 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны прэфектам парафіі Жырардаў (*Żyrardów*), Польшча. З 28.4.1939 мабілізаваны, капелан 20-й польскай дывізіі ў Слоніме, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Удзельнічаў у абароне Варшавы. Даты арышту і вызвалення невядомыя.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БАРАВІК Паўліна (Марыя-Фэліцыта)** [30.8.1905, в. Рудна Люблінскага ваяв., Польшча — 1.8.1943], назарэтанка, благаславёная. З сялянскай сям'і. У 1932 у Калішы (*Kalisz*) уступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. У 1935 склала першыя законныя шлюбы і прыняла імя Марыя-Фэліцыта. Прабывала як юніёрка ў законным доме Хрыста Валадара ў Навагрудку. У 1939 энкавэдыстамі выгнана з інш. законніцамі з кляштара. Жыла ў парафіян. Пасля 22.6.1941

вярнулася з законніцамі ў кляштар. Арыштавана немцамі 30/31.7.1943. Расстраляна з інш. сёстрамі назарэтанкамі.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БАРАВІК Ян Антонавіч** [2.6.1877, Коўна, цяпер Каўнас, Літва — 27.8.1937, Мінск, турма НКВД], святар. З сям'і рабочага. Скончыў Магілёўскую Духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Атрымаў дыплом ліцэнзіята тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1903). З 1904 вікарый, з 1906 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Прыдруйск Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Піедруя, Латвія. З 1912 служыў у парафіі Звеставання НПМ у в. Фашчаўка Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. З 1920 — у касцёле св. Міхала Арханёла ў в. Чарэя, цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл., парафіі Нараджэння НПМ у Талачыне Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., з 1928 — у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Сянно Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1933 пробашч касцёла св. Роха на Залатой Горцы ў Мінску. Перад арыштам служыў у касцёле Узвышэння Св. Крыжа (на Кальварыйскіх могілках у Мінску). Арыштаваны 31.5.1937 у Мінску па адрасе: вул. Даўгабродская, д. 28. Падчас следства жорстка катаваны следчым А. М. Гепштэйнам. Асуджаны 25.8.1937 паводле пастановы калегіі НКВД як «кіраўнік Мінскай філіі контррэвалюцыйнай паўстанцкай арганізацыі ПАВ», за «шпіянаж на карысць буржуазнай Польшчы і спробу звяржэння савецкай улады ў БССР» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.4.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа Б. і інш. № 25502-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Hlebowicz,. Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski,*

*Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. Мн., 2007.

**БАРАДЗЮЛЯ Адам Юзафавіч** [1900, в. Козікі Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. — 26.8.1937, Левашова пад Ленінградам], ветэрынар, парафіянін касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Арыштаваны 27.6.1937. Асуджаны 22.8.1937 асобай нарадай НКВД да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**БАРАДЗЮЛЯ Язэп Язэпавіч** [4.9.1893, в. Новае Камачына Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер в. Камачына Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. — 27.9.1983, Рыга], святар. З сялянскай сям'і. Скончыў народную школу, Віцебскае гарадское вучылішча (1912), Магілёўскую духоўную семінарыю ў Петраградзе (1917). Вучыўся ў Петраградскай духоўнай акадэміі да яе ліквідацыі ў 1919. Прыняў сакрамэнт святарства. Арцыбіскупам Э. *Ропам* накіраваны вікарыем касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку. 4.12.1919 прызначаны пробашчам трох касцёлаў Лепельскага дэканата: парафіяльных св. Антонія Падуанскага ў в. Губіна (Камень-Губін), цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл., св. Казіміра і Рафала ў мяст. Бешанковічы таго ж дэканата, цяпер райцэнтр той жа вобл., і касцёла св. Лаўрэнція ў г. п. Ушачы той жа вобл. Арыштаваны 29.12.1926 у губінскім касцёле. Зняволены ў Лепельскую турму АДПУ Віцебскай вобл. 1.1.1927 перавезены ў Мінскую ўнутраную турму АДПУ.

З успамінаў Язэпа Барадзюлі:

*«Каб запалохаць і прымусіць абвінавацiць самога сябе — на пачатку сакавіка выклікалі мяне сярод ночы з адзіночкі з рэчамі. Рэчы загадалі пакінуць у калідоры, а мяне пасадзілі ў двары на грузавік. Чатыры ахоўнікі з вінтоўкамі і адзін*

*камісар павезлі мяне за горад, прыблізна кіламетраў за дзесяць ад Мінска, і ў маладым сасновым лесе загадалі капаць магілу…*

*Я пачаў капаць, але недзе праз паўгадзіны прыехаў чэкіст на матацыкле і загадаў: «Адставіць!» Мяне прывезлі назад, але пасадзілі ўжо ў новую камеру, дзе было сем чалавек. Усе ляжалі на падлозе — ні палкоў, ні тапчанаў там не было».*

Абвінавачваўся ў «выкладанні веравучэння малалетнім» і «выкарыстанні рэлігійнага вучэння з мэтай звяржэння савецкай улады». Асуджаны калегіяй АДПУ 4.3.1927 да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны (праз Оршу — Віцебск — Ленінград — Кем) у Салавецкі лагер АДПУ Комі АССР. Пасля сканчэння тэрміну высланы на 3 гады ў Архангельск. За правядзенне рэлігійных абрадаў высланы далей на Поўнач. Вызвалены летам 1933. Прыехаў у Віцебск. Адміністратарам Магілёўскай дыяцэзіі Пятром *Аўглом* прызначаны пробашчам касцёла св. Антонія і касцёла св. Барбары ў Віцебску. У канцы 1933 пасля адмовы супрацоўнічаць з АДПУ зноў высланы ў Архангельск. У чарговы раз арыштаваны ў маі 1935. Прыгавораны асобай нарадай НКВД да 3 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў адзін з Сібірска-Марыінскіх лагераў. Каля года знаходзіўся ў Марыінскай турме НКВД. У маі 1936 этапаваны ў Дудзінку. У верас. 1937 пераведзены ў штрафны лагпункт. 26.11.1939 асуджаны да 7 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. У маі 1941 як інвалід пераведзены ў Канск, потым у пас. Тугач Краснаярскага краю. Працаваў фельчарам. Вызвалены 15.8.1946. У сувязі з тым што ў Віцебску касцёлаў ужо не было, паехаў у Рыгу. Мітрапалітам **Антоніем Спрынговічам** прызначаны вікарыем касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла або парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Дзвінску (Даўгаўпілсе). У 1947 атрымаў новае прызначэнне — пробашчам касцёла ў в. Пасіна (Латвія). Арыштаваны і 7.11.1949 асуджаны да ссылкі ў Паўн.-Усх. Сібір. Этапаваны (праз Маскву — Свярдлоўск — Новасібірск — Краснаярск — Канск) у с. Абан Краснаярскага краю. Вызвалены ў 1954. Мітрапалітам А. Спрынговічам прызначаны пробашчам парафіі Піедруя (Латвія). У канцы ліп.

1958 упаўнаважаны па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР пазбавіў Б. «спраўкі», і нягледзячы на тое, што праз чатыры гады святар быў рэабілітаваны, дазволу на душпастырскую дзейнасць ён так і не атрымаў. Не мог працаваць і як вандроўны місіянер, бо не дазваляла здароўе, моцна падарванае 25-гадовым знаходжаннем на Поўначы. 13.3.1978, у 85 гадоў, атрымаў дазвол на служэнне ў касцёле св. Альберта ў г. Рыга, Латвія. Быў духоўным кіраўніком вялікай колькасці католікаў сталіцы Латвіі і іншых мясцінаў. Рэабілітаваны па ўсіх справах.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Жарнасек І.,* Язэп Барадзюля. Дваццаць пяць гадоў турмы, лагераў і ссылкі // *Наша вера. 1995. № 1; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР;*

**БАРАДЫН Юзаф** [1911—6(ці 7).8.1943], святар. Скончыў Віленскую (?) духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Служыў вікарыем у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Налібакі Стаўбцоўскага пав. Івянецкага дэканата, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны актыўна ўдзельнічаў у АК на Навагрудчыне. Летам 1943 затрыманы са сваім пробашчам Ю. *Байкам* нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў час карнай аперацыі «Герман». Спалены з іншымі жыхарамі Налібакаў у гумне (паводле іншых звестак, расстраляны ў Налібоцкай пушчы).

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**БАРАНОЎСКІ Леанард Якаўлевіч** [1875, в. Мурашкі Віцебскага пав., цяпер Віцебскі р-н — 12.12.1930], святар. З дваранскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1900). Кандыдат тэалогіі (1901). Прызначаны вікарыем парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Арле, Расія. З 1903 у касцёле св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу. З 1908 пробашч і дэкан касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку. З другой паловы 1914 адміністратар парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Казані, Расія. З 1915 пробашч і дэкан касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. Арыштаваны чэкістамі ў 1919 у Полацку як закладнік. Вызвалены дзякуючы хадайніцтву польскага ўрада. Зноў арыштаваны 4.7.1922. Вызвалены праз 3 тыдні. Працягваў служыць у касцёле св. Антонія. У трэці раз арыштаваны 5.2.1925 у Віцебску па адрасе: Селязнёўскі зав., д. 9. Асуджаны 26.6.1925 калегіяй АДПУ як «агент польскай разведкі» і за «дапамогу нелегальнаму выезду людзей у Польшчу» да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Пасля сканчэння тэрміну 13.7.1928 пастановай асобай нарады АДПУ высланы на 3 гады ў Сібір. Памёр ад тыфу ў в. Тагур Томскай акругі Нарымскага краю. Рэабілітаваны 24.6.1992 пракуратурай БВА. Асабовая справа Б. № 34306 захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

З Б. асуджаны і этапаваны ў Салавецкі лагер і некаторыя парафіяне, сярод якіх **Грыгароўскі Аляксандр Фёдаравіч** (н. у 1880, верагодна, скончыў духоўную семінарыю), забіты 25.7.1925 ахоўнікамі падчас уцёкаў.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Литургический календарь*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей.*

**БАРАНОЎСКІ Пётр Аўгусцінавіч** [21.3.1882, Орша Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — 3.11.1937, ГУЛАГ], святар. З дваранскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1906). Прызначаны вікарыем касцёла Божага Цела ў мяст. Нясвіж Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 9.6.1909 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Чачэрск Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. У 1910 пераведзены ў касцёл св. Станіслава ў Санкт-Пецярбургу. З 1912 вікарый парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Нежыне Гомельскага дэканата (Чарнігаўскай губ.), цяпер Украіна. У 1917 вярнуўся ў нясвіжскі касцёл. З 1922 пробашч парафіі св. Барбары і дэкан у Віцебску. З 1923 адміністратар касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Ромнах Гомельскага дэканата, цяпер Украіна, парафіі Унебаўзяцця НПМ і св. Яна Хрысціцеля ў Чарнігаве, філіяльнага касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Грос-Ведэр, цяпер Латвія. Арыштаваны 26.4.1929. Асуджаны 20.9.1929 калегіяй АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., куды прыбыў этапам 16.10.1929. У 1930 пераведзены на востраў Анзер. У 1932 узяты пад варту. Абвінавачваўся з іншымі святарамі ў стварэнні «антысавецкай групоўкі, якая праводзіла антысавецкую агітацыю, тайна адпраўляла рэлігійныя абрады, здзяйсняла нелегальную сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару пра становішча католікаў у СССР». Следства хадайнічала аб пераводзе Б. у «Яраслаўскі палітізалятар і ўтрыманні асобна ад усіх». Вывезены ў Кем (4-е аддзяленне Салавецкага лагера). Потым зноў вернуты на Салаўкі. 21.2.1937 пераведзены на турэмны рэжым. 9.10.1937 паводле пастановы тройкі УНКВД па Ленінградскай вобл. асуджаны да ВМП. Расстраляны на ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР; Осипова,*

*Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Литургический календарь; З асабістага архіва У.Васькова;* http://kuz1.pstbi,ccas.ru; За веру Христову. Духовенство, монашествующие и миряне Русской Православной Церкви, репрессированные в Северном крае (1918—1951). Биографический справочник. Архангельск, 2006.

**БАРВІЦКІ Чэслаў Войцэхавіч** [10.11.1909, Вільня — 28.9.1992, Ольштын (*Olsztyn*), Польшча], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, Віленскі ун-т імя Стэфана Баторыя са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (20.6.1935). Прызначаны вікарыем і катэхетам касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Нача Радуньскага дэканата, цяпер вёска Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. У 1936—40 катэхет у Вільні. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. У 1944 арцыбіскупам Р. *Ялбжыкоўскім* пасланы са святаром Ю. *Грасевічам* у Бабруйск Магілёўскай вобл. для аднаўлення рэлігійнага жыцця. Са студз. 1945 ці 1946 адміністратар парафіі св. Апостала Юды Тадэвуша ў в. Лучай Надвілейскага дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. Прыкладна ў канцы 1946 святар заявіў, што «не лічыць сябе савецкім грамадзянінам, цалкам адданы свайму вышэйшаму органу ўлады — Папу, якому ён у момант рукапакладання даў клятву быць верным свайму закону і падпарадкавацца толькі Папу Рымскаму». Арыштаваны 21.8.1948. Перавезены ў Полацк. Асуджаны 7.1.1949 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Праз перасыльную турму МДБ у Оршы этапаваны ў Паўночна-Пячорскі лагер МДБ Комі АССР (с. Абезь). 14.11.1951 пераведзены ў Карагандзінскі лагер МДБ Казахскай ССР. Вызвалены 5.6.1956. Жыў у в. Дунілава Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. Дзякуючы намаганням парафіян атрымаў дазвол на душпастырскую дзейнасць у парафіі Лучай, куды вярнуўся ў 1956. У 1958 выехаў у Польшчу, служыў адміністратарам касцёла Звеставання НПМ у Дабжыневе (*Dobrzyniew*) Беластоцкай архідыяцэзіі. У чэрв. 1959 перавёўся ў парафію Рогуж (*Rogóż*)

Варміньскай дыяцэзіі. З 1964 пробашч касцёла ў Млынарах (*Młynary*). З 1967 ганаровы канонік, з 1973 дэкан Дабжынеўскай капітулы. У 1974 прызначаны адміністратарам у Рыхнове (*Rychnowa*). З 1.10.1979 на пенсіі. Рэабілітаваны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**БАРОЎКА Юльян Баніфацавіч** [26.4.1886, в. Лынкішкі Віленскага пав., цяпер Літва — 10.3.1964, в. Рэпля Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). Прызначаны вікарыем касцёла Адшукання Св. Крыжа ў Гродне. У 1915 пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Нарэўка (*Narewka*) Пружанскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча. Прамаўляў казанні пабеларуску. У 1917 за крытыку нямецкага афіцэра арыштаваны акупацыйнымі ўладамі. Зняволены на 3 месяцы ў Беластоцкай турме. У 1920 адміністратар парафіі Звеставання НПМ у мяст. Вішнеў аднайменнага дэканата, цяпер Вішнева Валожынскага р-на Мінскай вобл. З 1922 у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Баруны Ашмянскага пав. і дэканата, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. З 1929 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Забрэжжа Валожынскага пав. Вішнеўскага дэканата, цяпер Валожынскі р-н. З 1934 вікарый касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Вільні. У 1936 зноў у Гродне. Са снеж. 1937 у парафіі НПМ у в. Рэпля Лунінецкага дэканата. Прапагандаваў ідэі асветы для бел. народа, выступаў за развіццё роднай мовы. Падтрымліваў дзейнасць Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, фінансава дапамагаў бел. перыядычным выданням «Krynica» і «Chryścijanskaja Dumka». Падчас 2-й сусветнай вайны і ў першыя пасляваенныя гады жыў у Вільні. Арыштаваны 24.11(ці 12).1948. Асуджаны 26.3.1949 да 25 гадоў

ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены 5(ці 11).3.1955. Вярнуўся ў Беларусь. Жыў у Малынішчах Ашмянскага р-на, потым вярнуўся ў парафію ў в. Рэпля. Атрымаў дазвол на душпастырскую дзейнасць, служыў у касцёле. Рэабілітаваны 28.5.1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**БАРОЎСКІ Альфонс** [1886 ці 1892—10.3.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1910 або 1919). Паводле некаторых звестак, прызначаны вікарыем касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Заблудаў (*Zabłudów*), Польшча. З 1926 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ і св. Роха ў в. Аборак Вішнеўскага дэканата, цяпер у складзе в. Палачаны Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. З 1929 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Трычуўка (*Tryczówka*) Беластоцкага дэканата, Польшча. З 1936 у парафіі св. Станіслава ў в. Ляцк Шчучынскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў маі 1942 як закладнік з іншымі каталіцкімі святарамі, мясцовымі жыхарамі і настаўнікамі (усяго каля 200 чалавек). Зняволены ў Лідскай турме. Расстраляны з 9 іншымі святарамі ў ваколіцы Ліды (гл. арт.: *Ажароўскі* Ю.).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Krahel T.* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998. № 3 (98); *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**БАРТАШЭВІЧ Пётр Я.** [29.6.1914, Вільня — 13.1.1991], святар. Скончыў Віленскую гімназію, духоўную семінарыю,

ун-т імя Стэфана Баторыя са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (16.6.1940). Прызначаны вікарыем касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Кальварыя аднайменнага дэканата, цяпер Літва. У 1942 высланы немцамі ў Зембін, цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. З 1943 у парафіі імя НПМ, Каралевы Польскай у в. Порплішча, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. Таксама абслугоўваў касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Каралеўшчына, цяпер в. Крулеўшчына Докшыцкага р-на. У 1946 падчас рэгістрацыі рэлігійных абшчын прайшлі чуткі, што членаў «дваццаткі», якія падпішуць заяву, вышлюць у Сібір. У размове са святаром вернікі папярэджвалі: «Вы малады і яшчэ не ведаеце парадкаў Савецкага Саюза, а мы ўжо ўпэўніліся, нам расказваюць вернікі ўсходніх абласцей, як было ў іх у 1929 годзе: усе, хто падпісаў заяву, высланы ў Сібір». Арыштаваны 13.10.1948 у Полацку. Асуджаны 21.1.1949 да 25 ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Праз Аршанскую перасыльную турму МДБ этапаваны ў Варкуцінскі лагер Архангельскай вобл. і Комі АССР, потым у Тайшэцкі лагер МДБ Іркуцкай вобл. Вызвалены 1.5.1955. Служыў пробашчам у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Адэльск Гродзенскага р-на. З 13.6.1963 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**БАРТУШАК Юзаф** [1908—13.7.1942 ці ў 1943], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Служыў вікарыем у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Высока-Літоўск Брэсцкага пав. Палескага ваяв., цяпер г.п. Высокае Камянецкага р-на Брэсцкай вобл., адначасова прэфект народных школ. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч касцёла ў в. Заастравечча Нясвіжскага пав. і дэканата, цяпер Клецкі р-н

Мінскай вобл. Арыштаваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі 28.6.1942. Паводле адной версіі, расстраляны ў Баранавічах, цяпер Брэсцкай вобл., паводле інш., у в. Калдычэва (15 км ад Баранавічаў).

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БАРЫЛА Вітольд Пятровіч** [1931, в. Дзеркаўшчына Дзісенскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Да арышту служыў у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 9.8.1951. Асуджаны 14.9.1951 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.6.1989 Вярхоўным судом БССР. Асабовая справа Б. № п-9669 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**БАРЫСОВІЧ Антоні Францавіч** [11.11.1893, Вільня, цяпер Вільнюс, Літва — 6.5.1966], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (8.1.1917). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Санкт-Пецярбургу, пробашчам касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса парафіі Паргалава, цяпер Ленінградская вобл. З 1923 прэфект у Калішы (*Kalisz*) Плоцкай дыяцэзіі, Польшча. З 1926 катэхет, дырэктар гімназіі ў Познані, Польшча. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў адміністратарам касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Падбярэззе Кальварыйскага дэканата, цяпер г. Пабрадэ,Літва. У 1944 пробашч касцёла св. Сымона і

Алены (Чырвоны касцёл). Арыштаваны 24.12.1944 у Мінску па адрасе: пл. Свабоды, д. 19. Асуджаны 2.2.1946 асобай нарадай МДБ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Обскі лагер МДБ Цюменскай вобл. (Саляхард). У 1948 пераведзены ў Паўночна-Пячорскі (былы Запалярны) лагер МДБ Комі АССР. Вызвалены ў снеж. 1949. Вярнуўся ў Мінск. Зноў арыштаваны ў 1951. Высланы ў Акмолінскую вобл. Казахскай ССР. Канчаткова вызвалены пасля ліст. 1953 з забаронай жыць у Беларускай і Літоўскай ССР. З 1954 рэктар капліцы ў Грачанах, Украіна. Таксама абслугоўваў суседнія парафіі. Рэабілітаваны 27.5.1992 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа Б. № 33629-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**БАРЫСЮК Ян Казіміравіч** [1888—1953, ГУЛАГ], святар. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (13.6.1911). У 1916—17 катэхет парафіі ў Камянец-Падольскім, цяпер Хмяльніцкая вобл., Украіна. З 1.6.1919 капелан Войска Польскага. З 1920 — у Вільні. З 1922 капелан вайсковага акруговага шпіталя № 9 у Брэсце, паралельна працаваў у Польскім Чырвоным Крыжы. У 1933 прызначаны пробашчам касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Баранавічах аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., катэхет тутэйшых школ. З 1938 баранавіцкі дэкан, кіруючы Ляхавіцкім дэканатам. Падчас 2-й сусветнай вайны пасля арышту і забойства ў 1942 пробашча касцёла Перамя-

нення Пана ў мяст. Новая Мыш Баранавіцкага пав. і дэканата (цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.) А. *Алешчука* прыняў на сябе яго абавязкі. З 1945 генеральны вікарый Пінскай дыяцэзіі. Арыштаваны ў 1948. Асуджаны асобай нарадай пры МДБ да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ Новасібірскай вобл. (каля 40 000 вязняў). У маі 1950 пераведзены ў Омскі лагер МДБ (2000 вязняў). Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**БЕДНАЖ Мечыславў Янавіч** [25.12.1917, Петраград, Расія — 26.2.1993, Кракаў, Польшча], законнік, езуіт. Прыняў першыя (1923) і вечныя (17.8.1933) законныя шлюбы. Скончыў гімназію езуітаў, вучыўся ў Кракаўскай духоўнай семінарыі (1938). З верас. 1939 жыў у Брэсце. Арыштаваны НКВД 1.1.1940. Асуджаны ў верас. 1940 да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны праз Аршанскую перасыльную турму ў Котласкі (8000 зняволеных), потым ва Ухта-Іжэмскі (20 000 зняволеных) лагеры НКВД Комі АССР. Вызвалены ў кастр. 1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Уступіў у 17-ы пяхотны полк арміі У. Андэрса. Працягваў вучобу ў Бейруце. Прыняў сакрамэнт святарства (1946). У 1947 вярнуўся ў Польшчу. Знаходзіўся ў Кракаўскім законным доме.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**БЕКІШ Вацлаў Янавіч** [1906, в. Кузьмы Юшкоўскай вол. Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. — 22.5.1966, в. Солы, цяпер Смаргонскі р-н

Гродзенскай вобл.], святар, брат **П. Бекіша**[1]. Скончыў гімназію (1928), духоўную семінарыю, тэалагічны ф-т Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны вікарыем парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Сухаволя (*Suchowola)* Дамброўскага дэканата, цяпер Польшча. У 1937 служыў у касцёле св. Станіслава ў мяст. Дамброва (*Dąbrowa*), Польшча. З 1938 вікарый касцёла св. Францішка ў Вільні. З 17.10.1939 пробашч парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Солы Ашмянскага дэканата, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1945 пробашч касцёла Адшукання Св. Крыжа ў в. Жырмуны Лідскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 12.5.1949. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны Маладзечанскім абл. судом 24.8.1949 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Пясчаны (7000 зняволеных), потым Сцяпны (28 000 зняволеных) лагеры МДБ Казахскай ССР. Вызвалены датэрмінова са зняццем судзімасці 20.6(ці 7).1956. Вярнуўся ў Беларусь, некаторы час жыў у в. Асава Воранаўскага р-на. 15.11.1956 зарэгістраваны на старым месцы працы ў Жырмунах. У 1962 адмовіўся падпісаць зварот да Дж. Кенэдзі з патрабаваннем спыніць выпрабоўванне атамнай зброі. Сваю адмову ўпаўнаважанаму па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР па БССР П. Лабусу матываваў тым, што гэты зварот з'яўляецца палітыкай, а ён у палітыку не ўмешваецца. Рэабілітаваны 22.9.1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 114; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego*

---

[1] **Бекіш Павел Янавіч** [1898—9.7.1984], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1921). Працаваў катэхетам. З 1925 вікарый касцёла св. Рафала Арханёла ў Вільні. Арыштаваны ў 1946. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны да ППЛ. Этапаваны ў Пясчаны, потым Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР. Пасля вызвалення вярнуўся ў Вільнюс. Служыў у касцёле Св. Духа.

*represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**БЕЛАВОЛЬСКІ Уладзіслаў** [22.10.1905 — ?], святар. З 28.4.1939 гарнізонны капелан у Кобрыне, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. Арыштаваны НКВД пасля 1939. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БЕЛАГАЛОВЫ Юзаф Мацвеевіч** [11.2.1883, Санкт-Пецярбург — 1928 (?), Масква, турма АДПУ], рэлігійны і грамадскі дзеяч, педагог. З бел. сям'і, верагодна, брат ці сваяк **Францішка Белагаловага** (з 1913 пробашч парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Івянец Мінскага пав., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл.). Вучыўся ў Санкт-Пецярбургу ў прыватнай гімназіі пры касцёле св. Кацярыны і ў 6-й гімназіі. Скончыў духоўную семінарыю (1903) і акадэмію (1907). Кандыдат тэалогіі і магістр кананічнага права. Прыняў сакрамэнт святарства (1906). Працаваў катэхетам у Смаленскай мужчынскай гімназіі, у рэальным вучылішчы. 14.8.1910 прызначаны выкладчыкам духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. За адмову праспяваць «многие лета» расійскаму цару высланы за мяжу. Жыў у Рыме, Інсбруку. З 1913 зноў у Санкт-Пецярбургу, нам. прафесара грамадзянскага і кананічнага права духоўнай акадэміі. Адначасова катэхет у Інстытуце архітэктуры, у Мікалаеўскай школе кавалерыі, у Канстанцінаўскай школе артылерыі. У 1918 прызначаны пробашчам і дэканам парафіі Унебаўзяцця НПМ у Магілёве. в. а. афіцыяла біскупскай курыі ў Мінску. Арыштаваны ЧК, інтэрнаваны ў Смаленск. Пасля вызвалення вярнуўся ў Магілёў (1919). Актыўна выступаў за беларусізацыю рэлігійнага жыцця. Зноў арыштаваны ў снеж. 1921. Неўзабаве вызвалены. У чарговы раз арыштаваны і асобым аддзелам 16-й арміі 18.2.1922 асуджаны за

«шпіянаж на карысць Польшчы» да 5 гадоў ППЛ. У канцы 1922 тэрмін скарочаны да года. Вызвалены датэрмінова. З 1923 адміністратар касцёлаў Унебаўзяцця НПМ і св. Казіміра ў Магілёве. 13.5.1924 выкліканы ў Маскву, дзе на працягу месяца вёў перамовы аб становішчы Рыма-Каталіцкага Касцёла ў СССР. У крас. 1926 зноў выкліканы ў Маскву для сустрэчы з біскупам **Мішэлем Д'Эрбіны**, які прыехаў з Рыма. Яшчэ раз сустракаўся з ім у Магілёве. У чарговы раз арыштаваны 25.8.1926. Абвінавачваўся ў «стварэнні ў Магілёве контррэвалюцыйнай арганізацыі пад назвай «Маладыя філарэты», падтрымцы сярод моладзі польскага патрыятычнага духу і адданасці Касцёлу». Асуджаны 29.11.1926 калегіяй АДПУ да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. У 1928 дастаўлены ў Маскву ў турму на Лубянцы. Забіты «при попытке к бегству». Рэабілітаваны 6.6.1991 пастановай Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Б. № 15184 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Литургический календарь*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*.

**БЕЛІНА-БЕЛІНОВІЧ Ян Эмерыкавіч** [1869, Бабруйск Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — ?], парафіянін, рабочы завода «Чырвоны Кастрычнік» у Сталінградзе. Арыштаваны ў 1930 па справе «групы нямецкіх католікаў». Вызвалены 18.3.1930. Справа спынена. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**БЕРНАТОВІЧ Ігнаці** [1868 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1895). У 1900—1920-я адміністратар і дэкан парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Рагачове Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл., касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Журавічы (Старыя Журавічы), цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл., парафіі езуітаў св. Яна Караля ў в. Блонь, цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Пазней пробашч катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Магілёве. Арыштоўваўся савецкімі ўладамі. Вызвалены. Выехаў у Літву. У 1928 пробашч парафіі Дабужай Панявежскай дыяцэзіі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БЕРНІКОВІЧ Іван Альбертавіч** [1913, в. Люсары Віленскай губ. — ?], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Да арышту служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Паставы Віленскага ваяв., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. (паводле некаторых звестак, таксама служыў у парафіі ў мяст. Варапаева таго ж ваяв., з 1949 г. п. Пастаўскага р-на). Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 7.1.1940 у Варапаева. Асуджаны 25.11.1940 асобай нарадай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю» і як «сацыяльна небяспечны элемент» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Іўдзельскі лагер НКВД Свярдлоўскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Б. № 17189-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**БЕШТА-БАРОЎСКІ Антоні** [9.11.1880, БароўскіяОлькі (*Borowskie Olki*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 15.7.1943], святар. Скончыў Віленскую

духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1904). У пачатку 1910-х г. служыў у касцёле св. Станіслава ў в. Даўгінава Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1915 адміністратар парафіі Божага Провіду ў в. Кужніца (*Kuźnica*), Польшча. З 1919 адміністратар касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Пружаны, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1927 пробашч парафіі Нараджэння НПМ і св. Мікалая ў Бельску Падляскім (*Bielsk Podlaski*) Бельскага дэканата, рэктар філіяльнага касцёла ў в. Орля (*Orla*) Падляшскага пав. Бельскага дэканата, Польшча, бельскі дэкан, пазней генеральны вікарый Пінскай дыяцэзіі. Арыштаваны немцамі і расстраляны ў Лесе Пііцкім (*Les Pilicki*) Бельскага пав.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БІКШЫС Ян Міхайлавіч** [1870—10.3.1918], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства. З 1894 вікарый касцёла Унебаўзяцця НПМ у Люцыне Віцебскай губ., цяпер Латвія. З 1897 вікарый парафіі ў в. Бройдаж Люцынскага пав., цяпер Латвія. З 1900 адміністратар касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Посін Люцынскага пав. З 1913 адміністратар і катэхет парафіі ў в. Ландскрона Люцынскага пав. Забіты бальшавікамі падчас грамадзянскай вайны.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БІЛЬША Франц Міхайлавіч** [24.1.1909, мяст. Свянцяны Віленскай губ., цяпер Літва — 7.5.1981, в. Войстам Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.], святар. Скончыў Свянцянскую гімназію (1928), Віленскую духоўную семінарыю (1934). Адначасова вучыўся ў Віленскім ун-це імя Стэфана Баторыя.

Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны катэхетам парафіі Перамянення Пана ў в. Германавічы Дзісенскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. З 1935 катэхет пры касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка-Заверз Браслаўскага пав. Віленскага ваяв., цяпер в. Слабодка Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. З 1941 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Плюсы Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н. Арыштаваны 22.12.1949. Вывезены ў Полацк. Катаваны падчас следства. Асуджаны асобай нарадай пры МДБ да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў адзін з уральскіх лагераў МДБ. Вызвалены ў чэрв. 1956 са зняццем судзімасці. 22.2.1957 зарэгістраваны пробашчам касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Войстам.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis;* НАРБ, ф. 952, в. 3, с. 7, л. 19; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**БІРНІК Павел Бернардавіч** [30.4.1889—11.8.1919, Гомель], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). 23.11.1912 прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі, куды прыехаў 9.12.1912. З 21.4.1914 служыў у філіяльным касцёле Нараджэння НПМ у в. Люшаў Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Буда-Кашалёўскі р-н Гомельскай вобл., адначасова катэхет. У 1915 пробашч касцёла св. Унебаўзяцця НПМ у в. Асавая Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер вёска Столінскага р-на Брэсцкай вобл. З 1916 у філіяльным касцёле Унебаўзяцця НПМ у мяст. Лунінец Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. 25.2.1919 біскуп Ян *Цепляк* прапанаваў у адсутнасць пробашча гомельскага касцёла і дэкана Антонія *Ячэйкі* выконваць яго абавязкі. Арыштаваны ЧК з парафіянамі **Бальчэўскім Вікенціем** і **Маркоўскім Адамам** у ліп. 1919

як палітычны закладнік па справе Петраградскай ВА. Расстраляны.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Памятная книжка Минской губернии*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; З асабістага архіва У. Васькова.*

**БОБІЧ Ільдэфонс** [псеўданімы і крыптанімы: Пётра Просты; Piotra Prosty; P.P.; P.Pr.; 10(22).1.1890, в. Дзедзіна Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — 28.4.1944, Іўе, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл.], святар, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык. Скончыў Ковенскую гімназію (1909), Віленскую духоўную семінарыю (1911). Сябар бел. гуртка семінарыстаў. З 1912 вучыўся ў *Collegium Germanicum* (Рым), атрымаў ступень доктара філасофіі. Дамогся папскага благаслаўлення часопіса для беларусаў-католікаў «Biełarus». Прыняў сакрамэнт святарства (28.7.1915). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Друя Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1921 катэхет Віленскай беларускай гімназіі. З 1923 пробашч касцёла Перамянення Пана ў в. Германавічы Дзісенскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. З 1930 пробашч і дэкан парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Іўе. Першае апавяданне «Слёзы» надрукаваў 25.1.1907 у «Нашай ніве». Друкаваўся таксама ў «Першым беларускім календары «Нашай нівы», газ. «Biełarus», пазней у зах.-бел. выданнях «Наша думка» і «Беларускія ведамасці». Частка твораў засталася ў рукапісах, асобныя перакладаліся на польскую і ўкраінскую мовы. Выступаў у польскіх рэлігійных час. «Przegląd Homiletyczny», «Nowa Biblioteka Kaznodziejska». Пераклаў на польскую мову працы св. Бернарда з Клерво. Да 1930 актыўна выступаў за шырокае ўвядзенне бел. мовы ў каталіцкае набажэнства. На пачатку 1930-х г. адышоў ад паліт. дзейнасці. Арыштаваны немцамі ў канцы чэрв. — пачатку ліп.

1942 з 16 святарамі Баранавіцкай вобл. Неўзабаве вызвалены з умовай прамаўляць пропаведзі па-беларуску. Пакінуў больш за 200 тэалагічных работ.

Тв.: *Bobič Ild.* Niadzielašnija ewanhielii i nawuki: Try častki. Wilnia, 1912; Na szto biełarusam hazety? Wilna, 1914.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; БП, т. 5; EK, t. 2; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**БОРСУК Вінцэнт Міхайлавіч** [1898 ці 1899, Алішкі (*Oliszki*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 1980], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (чэрв. 1925). Прызначаны вікарыем парафіі Перамянення Пана ў мяст. Вавёрка Лідскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. З чэрв. 1926 служыў у парафіі Нараджэння НПМ у мяст. Відзы Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З чэрв. 1927 служыў у адным з касцёлаў Вільні. З 1928 адміністратар парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Крулеўшчына, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл., касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Зашчэсле (6 км ад Крулеўшчыны). У 1930 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Беніца Ашмянскага пав. і дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. З 1931 у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Лоск, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 1935 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Докшыцы Надвілейскага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1937 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Тургелі (Літва), касцёла св. Антонія Падуанскага ў в. Малая Бераставіца Бераставіцкага дэканата, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. З ліст. 1940 у парафіі Звеставання НПМ у в. Вялікая Бераставіца Бераставіцкага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З чэрв. 1942 пробашч касцёла

Унебаўзяцця НПМ у в. Капцёўка, цяпер Гродзенскі р-н. Арыштаваны 30.6(ці 7).1945. Пад следствам знаходзіўся ў Гродзенскай турме НКВД. Асноўным аргументам у абвінавачанні святара стаў факт пахавання забітага партызанамі ўзімку 1943 паліцэйскага Баляслава Смялоўскага. Паводле паказанняў некаторых сведкаў, якія праходзілі па справе, святар гаварыў пра Смялоўскага як пра «добрага чалавека, які шчыра служыў нямецкай дзяржаве, але ад рук бандытаў-бальшавікоў загінуў». Тады ж святар быццам бы заклікаў «прысутных неадкладна паведамляць у жандармерыю і паліцыю аб з’яўленні партызан у вёсцы і пры магчымасці самім на месцы забіваць бандытаў-бальшавікоў». У абвінаваўчым заключэнні Б. ставілі ў віну «заклікі да насельніцтва весці барацьбу супраць савецкіх партызан і паклёп на Савецкую ўладу». Справу слухалі на закрытым пасяджэнні Гродзенскага абл. суда. Асуджаны 29.10.1946 да 8 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў Каргопальскі лагер МДБ Архангельскай вобл. Пасля вызвалення ў 1948 выехаў у Польшчу. 15.4.1998 пракуратура РБ «не знайшла падстаў для апратэставання судовых пастаноў, якія адбыліся па справе», і пакінула ў сіле вызначэнне калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР ад 12.11.1946.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**БОРЫК Пётр Міхайлавіч** [22.10.1909, в. Свілы Лідскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — 1963], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, Віленскі ун-т імя Стэфана Баторыя са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1937).

Прызначаны вікарыем касцёла св. Юрыя ў мяст. Янаў (*Janów*) Сакольскага пав. Карыцінскага дэканата, Польшча. Да арышту вікарый касцёла Адшукання Св. Крыжа ў Гродне. Арыштаваны ў 1945. Этапаваны ў адзін з лагераў ГУЛАГа. Вызвалены ў 1947. Выехаў у Польшчу. З 1.9.1947 вікарый касцёла Унебаўзяцця НПМ у Беластоку (*Białystok*), Польшча. З 1949 вікарый і катэхет кравецкай і прамысловай дзяржаўных гімназіяў, ліцэя выхавацеляў дзіцячых садкоў. З 31.1.1951 паралельна капелан дзяржаўнага хірургічнага шпіталя. З 1953 пробашч парафіі св. Агнешкі ў в. Гоняндз (*Goniądz*). У 1956 прызначаны пробашчам касцёла ў Старасельцах (*Starosielcy*), але прэзідыум Нацыянальнай рады Беластоцкага ваяводства не зацвердзіў гэтае прызначэнне. З 6.12.1956 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Юхновец (*Juchnowiec*, Польшча). З 23.2.1961 прызначаны членам Адміністрацыйнай рады маёмасці Беластоцкай архідыяцэзіі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**БРЫДАЦКІ Людвіг** [28.8.1894—3.10.1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства. З 1929 вайсковы капелан, адміністратар касцёла ў Ломжы (*Łomża*), Польшча, потым пробашч парафіі св. Казіміра ў Маладзечне, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Мабілізаваны, верагодна, у 86-ы пяхотны полк 19-й польскай дывізіі. Арыштаваны немцамі. Вывезены ў Ротэнбург, потым Заксенгаўзен, Дахаў (Германія), дзе і загінуў.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БРЫЧКОЎСКІ Баляслаў** [1909, в. Міхалёўшчына (ці Міхалінава) Рубяжэвіцкай вол. Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі (або Стаўбцоўскі) р-н Мінскай вобл. — 1942], святар. З сялян-

скай сям'і. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). З 1937 в. а. пробашча касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Крывошын Баранавіцкага пав. Наваградскага ваяв., цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны гестапа ў 1942. Зняволены з іншымі святарамі ў лагеры Калдычэва каля Баранавічаў. Атручаны газам.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БУДЗЬКА Францішак Карлавіч** [23.1.1884—2.1.1920, каля Полацка Віцебскай губ.], святар, культурна-асветніцкі дзеяч, пісьменнік, перакладчык. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Вілейскае павятовае вучылішча (1899), здаў экзамен на званне аптэкарскага вучня пры экзаменацыйнай камісіі Санкт-Пецярбургскай навучальнай акругі (1901). З 1901 вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу, дзе пачаў перакладаць на бел. мову рэлігійныя кнігі. У 1906 працягваў вучобу ў мітрапалітальнай духоўнай акадэміі. У 1907 вымушаны адмовіцца ад далейшай вучобы з-за фінансавага становішча. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). 9.1.1908 прызначаны вікарыем у Полацк у касцёл Маці Божай Ружанцовай. З 1912 душпастыр у Санкт-Пецярбургу, адначасова выкладаў у Сестржанцэвіцкім павятовым вучылішчы пры касцёле св. Станіслава. Матэрыяльна падтрымліваў выданне першай бел. каталіцкай газ. «Biełarus» (Вільня, 1913—15). Пасля 1917 у Полацкім дэканаце. Член арганізацыйнага камітэта і ўдзельнік 1-га з'езда бел. каталіцкага духавенства (Мінск, 24—25.5.1917). Адзін з пачынальнікаў бел. каталіцкага выдавецкага руху. З усталяваннем ва Усх. Беларусі савецкай улады пераследаваўся органамі бяспекі. Памёр ад запалення лёгкіх.

Кр.: *Stankievič A*. Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**БУДКЕВІЧ Канстанцін-Рамуальд Юльянавіч** [9.6.1867, маёнтак Зубры (Жубры) Дзвінскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — 31.3.1923, Масква, турма АДПУ], святар. Са шматдзетнай польскай шляхецкай сям'і. Скончыў 5 класаў Кракаўскай гімназіі, Магілёўскую духоўную семінарыю (1889) і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню кандыдата багаслоўя (1893). Прыняў сакрамэнт святарства (26.9.1893). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Пскове, адначасова катэхет мясцовых школ. З 11.10.1896 вікарый касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску, катэхет. З 8.10.1903 вікарый, з 13.1.1904 нам. пробашча, з 5.9.1905 пробашч касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу. З 16.4.1908 дэкан Санкт-Пецярбургскага дэканата. З 11.5.1910 ганаровы канонік Магілёўскага арцыбіскупа. У 1918 прэлат Маскоўскага арцыбіскупа, генеральны вікарый біскупа Яна *Цепляка*. Са жн. 1922 прафесар тайнай духоўнай семінарыі. Арыштаваны 10.3.1923 па групавой справе каталіцкага духавенства. Вывезены ў Маскву з арцыбіскупам і 14 святарамі. Асуджаны за «контррэвалюцыйную і шпіёнскую дзейнасць» на паказальным судовым працэсе, які прайшоў 21—25.3.1923, да ВМП. Расстраляны ў Сакольніцкай турме АДПУ.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БУЗЫЦКІ Міхал Ігнатавіч** [1862 ці 1864, в. Таранкавічы Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. — 24.12.1937, Віцебск, турма НКВД], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1887). Да 1900 пробашч касцёла св. Антонія Падуанскага ў в. Губіна (Камень-Губін) Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. У 1901—09 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Антушы, цяпер Рагачоўскі р-н

Гомельскай вобл. У 1910 у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў г. Колпіна каля Санкт-Пецярбурга. У 1914 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Непароты Віцебскага пав., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. З 1922 у касцёле Звеставання НПМ у мяст. Гарадок Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны 19.9.1937. Асуджаны 6.12.1937 паводле пастановы калегіі НКВД як «член ПАВ» і за «шпіянаж на карысць Польшчы» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 3.12.1957 трыбуналам БВА.

З Б. па адной справе (№ 4098-п; захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.) праходзілі парафіяне: **Дземянюк-Маргалай Тэафіла Юр'еўна** (н. у 1866), **Корвін-Касакоўская Эўфразія Нікадзімаўна** (1875), **Ласько Казімір Адамавіч** (1884), **Станкевіч Іван Іванавіч** (1873), і віцябляне, выкладчык Віцебскага політэхнічнага тэхнікума **Бамштэйн Ісак Ісакавіч** (1889), хатняя гаспадыня **Клаўз Эма-Эла Эдуардаўна** (1873), возчык Віцебскага півапарнага завода **Насветнікаў Мітрафан Васілевіч** (1902), токар завода «Камінтэрн» **Рагажынскі Якаў Фёдаравіч** (1894), рахункавод фабрыкі «КІМ» **Рудніцкі Мікалай Сілавіч** (1907).

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**БУЙНОЎСКАЯ Галіна Карлаўна** [1899, в. Ямпаль Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. — ?], хатняя гаспадыня, актыўная парафіянка касцёла св. Аляксандра ў Кіеве. Арыштавана ў 1930 па справе «**К. Наскрэнцкага**[1] і інш.». Абвінавачвалася ў «неданясенні

[1] **Наскрэнцкі Казімір Эдмундавіч** [11.6.1878—4.5.1950], святар. Вучыўся на медыцынскім ф-це ў Кіеве, у Житомірскай духоўнай семінарыі, Магілёўскай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1902). Служыў ва Украіне. Арыштаваны 24.7.1929. Асуджаны да ВМП (заменена на 10 гадоў ППЛ). 15.9.1932 выехаў па абмене вязняў у Польшчу. Служыў у Варшаве і каля Варшавы. Падрабязней гл.: Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.

пра контррэвалюцыйнае злачынства». Асуджана 30.7.1930 калегіяй АДПУ да 5 гадоў ППЛ (пазней тэрмін зменшаны да 3 гадоў). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**БУЙНОЎСКІ Вінцэнт** [20.5.1881—11.8(ці 9).1946], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. З 1913 служыў у філіяльным касцёле НПМ у в. Грыбавец Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ЧК у 1921. Неўзабаве вызвалены. Зноў арыштаваны ў 1922 за супраціў канфіскацыі касцёльнай маёмасці. Асуджаны да 5 гадоў ППЛ. У сак. 1923 этапаваны ў Яраслаўль, у крас. 1923 — у Бутырскую турму Масквы. Вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. З другой паловы 1923 адміністратар касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Ілля Віленскага дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. У 1929 адміністратар касцёла НПМ у в. Батурына, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1930 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Бяльмонт Браслаўскага дэканата, цяпер у складзе в. Ахрэмаўцы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии;Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БУЙНОЎСКІ Лявон Міхайлавіч** [16.6.1891, мяст. Альшанка (*Olszanka*), цяпер Польшча — 1943], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). Прызначаны вікарыем

парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Маскве. З ліп. 1921 рэктар капліцы Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Рудня-Шлягіна Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Пазней в. а. пробашча і дэкана касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. У пачатку 1922 арыштаваны ЧК за супрацiў канфіскацыі касцёльнай маёмасці. Вызвалены. 23.4.1922 перайшоў на нелегальнае становішча, хаваўся ў Гомелі пад чужым прозвішчам. Каб дапамагчы 10 арыштаваным у Гомелі парафіянам, прыехаў у маі 1922 у Маскву і перадаў польскаму амбасадару інфармацыю аб рэпрэсіях супраць гомельскіх католікаў. 19.5.1922 у польскай камісіі па рэпатрыяцыі папярэджаны, што павінен быць асцярожным і ў выпадку рэпрэсій выехаць у Польшчу. Арыштаваны ў Мінску ў канцы мая 1922. Вызвалены ў 1924 праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. У 1925—32 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў мяст. Івянец, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл., візітатар школ катэхізацыі Пінскай дыяцэзіі. З 1934 в. а. пробашча парафіяльнага касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Мядзведзічы Баранавіцкага пав., цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл., рэктар філіяльнага (пры парафіі ў Мядзведзічах) касцёла ў в. Сіняўка, цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі 27.6.1942. Зняволены ў Баранавіцкай турме. Паводле адных звестак, расстраляны 13.7.1943 з 14 іншымі святарамі на гарадскіх могілках, паводле іншых — загінуў у нямецкім лагеры ў Калдычэве каля Баранавічаў.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; З асабістага архіва У. Васькова.*

**БУЙЧЫК Віктар Паўлавіч** [1912, мяст. Камаі Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Да арышту

служыў у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Камаі. Арыштаваны 21.2.1941. Асуджаны 28.5.1941 асобай нарадай НКВД як «член паўстанцкай арганізацыі «ПАВ» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Паўночна-чыгуначны лагер НКВД Комі АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Б. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**БУКЛЯРЭВІЧ Міхал Філіпавіч** [12.10.1884, в. Лінгі Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — 27.6.1919, в. Бігосава Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл.], святар, грамадскі дзеяч. Скончыў гарадское 2-класнае вучылішча пры Віленскім настаўніцкім інстытуце (1901). У 1-й Віленскай мужчынскай гімназіі здаў экзамен на званне аптэкарскага вучня. З 1904 вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1908). Служыў у парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Нарэўка (*Narewka*) Пружанскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча. У 1915 і пазней — у касцёле Божага Цела ў мяст. Іказнь Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Займаўся бел. культурна-асветнай дзейнасцю, адкрываў бел. школы. Прымаў удзел у з'ездзе каталіцкага духавенства Дзісенскага дэканата (6—7.8.1918). Падчас ваенных падзей 1919 выступіў супраць савецкіх уладаў, арганізаваў атрад з 300 салдат. Удзельнічаў у баях пад Іказню і інш. Узяў у палон 100 чырвонаармейцаў латышскага паходжання. За антыбальшавіцкую дзейнасць 27.6.1919 асуджаны палявым судом Чырвонай арміі да ВМП. Расстраляны з сястрой Эміліяй. 24.3.1920 урачыста перазахаваны ў мяст. Іказнь.

Кр.: *Памятная книжка Гродненской губернии*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Stankiewicz A*. Rodnaja mowa u światyniach. Wilnia, 1929; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolick-*

*iego w ZSSR*; *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**БУЛО Ян Георгіевіч** [1864, в. Цяльшаны Шавельскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — пасля 1928], святар. З каталіцкай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1887). Да 1902 адміністратар касцёла Святога Духа ў мяст. Ула, цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. У 1910 у парафіі Найсвяцейшай Багародзіцы Ларэтанскай у Арэнбургу, Расія. Перад арыштам пробашч касцёла Нараджэння НПМ у Барысаве Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Арыштаваны 18.7.1922. Асуджаны 31.10.1922 ЧК як «член ПАВ» і за «шпіянаж на карысць Польшчы» да 5 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Пасля вызвалення (1927) выехаў у ЗША. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны трыбуналам БВА 15.4.1991, ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР 14.7.1996. Асабовыя справы Б. № 35141-с і № 36839-с захоўваюцца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БУРАК Марк** [1879—15.7.1943], святар, верагодна, брат К. Бурака[1]. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1902). З 1905 адміністратар парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Мсцібава Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. Дзякуючы намаганням і ахвярнасці святара ў парафіі пабудаваны касцёл

[1] **Бурак Казімір** [1875 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1900). З 1904 і не менш чым да 2-й сусветнай вайны пробашч касцёла св. Апостала Пятра ў в. Вялікія Салечнікі Віленскага пав., цяпер Літва.
Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis.*

(1919). Ганаровы канонік Віленскай архідыяцэзіі. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, уваходзіў у штаб Беластоцкай акругі АК. Расстраляны фашыстамі ў лесе каля мяст. Свіслач, цяпер г. п. Гродзенскай вобл. У 1945 перапахаваны на могілках у Мсцібаве.

Кр.: *Памятная книжка Гродненской губернии*; *Памятная книжка Виленской губернии*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**БУЯР Юзаф** [1882 — лют. 1943], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1908). Да 2-й сусветнай вайны жыў у салезіянскім кляштары Ахвяравання НПМ у Ружаныстоку (*Różanystok*) Дамброўскага дэканата, Польшча. Падчас нямецкай акупацыі в. а. кіраўніка салезіянскай супольнасці ў Кургане Лідскага дэканата. Арыштаваны гестапа летам 1942. Зняволены ў Лідскай турме. У снеж. 1942 з-за цяжкай хваробы пераведзены ў мясцовую бальніцу, дзе і памёр.

Кр.: *Krahel T.,* Rozstrzelani w Lidzie, // *Czas Miłosierdzia*, 1998, № 3; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**БЫДЗАН Тамаш (Фама) Антонавіч** [1879, в. Сінькелі Пустынскай вол. Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Літва — 17.10.1937, Левашова пад Ленінградам], актыўны парафіянін касцёла св. Мікалая ў Лузе Ленінградскай вобл. З рабочай сям'і. Працаваў малодшым кандуктарам Кастрычніцкай чыгункі ў Лузе. Арыштаваны 6.10.1937. Асуджаны асобай нарадай НКВД 12.10.1937 да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**БЯЛІНІС Карл** [1868 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1905). Служыў у парафіі бернардзінцаў у Глуску, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. У 1907—09 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Журавічы (Старыя Журавічы), цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. З 1911 адміністратар парафіі НПМ у в. Харомцы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны. Вызвалены (верагодна, у пачатку 1920-х). Пазней служыў у Літве.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БЯЛІНСКІ** [? — 4.3.1942], святар Мінскай дыяцэзіі. Арыштаваны фашыстамі 18.1.1942. Вывезены ў Браслаў, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Потым перавезены ў Глыбоцкую турму. Расстраляны каля в. Беразвечча, цяпер в. Беразвецкі Абруб Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БЯЛІНСКІ Юзаф** [19.3.1907—1944, Варшава], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Служыў прэфектам, потым пробашчам парафіі ў мяст. Вісла (*Wisła*), Польшча. З 1.1.1938 капелан гарнізона ў Востраве Велькапольскім (*Ostrów Wielkopolski*), Калішы (*Kalisz*), Польшча. Са жн. 1939 у Брэсце. Арыштаваны немцамі. Зняволены ў Варшаве. Загінуў падчас паўстання вязняў.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БЯНЕЦКІ Юзаф Вікенцевіч** [1875, в. Барбароў Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Мазырскі р-н Гомельскай вобл. — 5.12.1937, ГУЛАГ], святар. З бел. сялянскай сям'і.

Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1899). Прызначаны вікарыем касцёла ў г. Жытомір, цяпер Украіна. З 1902 вікарый парафіі св. Ганны ў Маліне Радамышльскага дэканата, Украіна. З 1907 служыў у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў Развабажаве, Украіна. З 1910 пробашч парафіі ў Радамышлі, Украіна. З 1913 дэкан парафіі ва Ушаміры, Украіна. З 1920 у касцёле св. Ігнацыя ў Кіеве. Арыштаваны ў 1921. Вызвалены. З 1922 пробашч касцёла св. Ганны ў мяст. Палоннае Валынскай губ., цяпер Украіна. Арыштаваны 18.1.1930. Пад следствам знаходзіўся ў Шэпетаўскай, Харкаўскай і Кіеўскай турмах АДПУ. Абвінавачваўся па групавой справе каталіцкага духавенства Украінскай ССР. Асуджаны калегіяй АДПУ 18.5.1930 за «правядзенне контррэвалюцыйнай прапаганды» да 5 гадоў ППЛ. 26.5.1930 этапаваны ў Яраслаўскі паліт. ізалятар. У верас. 1933 пераведзены ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 21.1.1935 пасля сканчэння тэрміну асобай нарадай НКВД прыгавораны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Архангельскі край. 15.5.1935 этапаваны ў Марыінскі лагер НКВД Кемераўскай вобл. 23.11.1937 за «антысавецкую агітацыю сярод зняволеных» прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.6.1998.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**БЯРНАЦКАЯ Мар'яна** [1888, Ліпск (*Lipsk*), Польшча — 13.7.1943], парафіянка, паходзіла, верагодна, з грэка-каталіцкай сям'і роду Чакала. У 1908 выйшла замуж за Людвіга Бярнацкага. Маці шасцярых дзяцей, чацвёра з якіх памерлі пры родах. Засталася дачка Леакадзія і сын Станіслаў. Пасля смерці мужа жыла з сынам і нявесткай Ганнай Шыманчыкавай. У пачатку ліп. 1943 прайшлі масавыя арышты жыхароў Ліпска

ў знак помсты за забітага паліцэйскага. У спісы смяротнікаў трапілі сын Б. і яго цяжарная жонка. Б. выпрасіла сабе права пайсці на смерць замест нявесткі. З 49 арыштаванымі перавезена ў Гродзенскую турму. Расстраляна каля в. Навумавічы, цяпер Гродзенскі р-н, з іншымі закладнікамі. Беатыфікавана папам Янам Паўлам ІІ 13.6.1999.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ВАГЕНХЕЙМ (ВАГЕНХАЙМ) Уладзіслаў Антонавіч** [29.7.1875, в. Сялец (?) Слуцкага пав. Мінскай губ. — 11.1941], парафіянін. Да 1889 жыў у Луцку, працаваў на фабрыцы. У 1916 пераехаў у Кіеў, працаваў машыністам. Быў актыўным парафіянінам касцёла св. Аляксандра. З 1923 памочнік прадстаўніка парафіяльнай рады. Накіроўваў шматлікія просьбы аб вызваленні арыштаванага каталіцкага святара **А. Шэнфельда**[1]. Арыштаваны 25.6.1935 па справе «групы католікаў Кіева». Абвінавачваўся ў «аказанні дапамогі міжнароднай буржуазіі» і «ўдзеле ў антысавецкай арганізацыі». Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 14.5.1936 да 5 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Казахскую ССР. Вызвалены ў 1939, але пазбаўлены права жыць у найбуйнейшых гарадах СССР. Жыў у Белай Царкве, Украіна. З кастр. 1941 ў Кіеве. Падчас разбору завалаў на знішчанай святыні быў прыціснуты сцяною і памёр.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**ВАГНЕР Мікалай Станіслававіч** [1903, Санкт-Пецярбург — 8.2.1942, Джамбул, цяпер Казахстан], святар. З сям'і польскага рабочага. Пачаў вучыцца ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу, але, відаць, з-за грамадзянскай вайны пакінуў вучобу і пераехаў у Польшчу. Скончыў місіянерскі інстытут у Любліне, які рыхтаваў святароў для Магілёўскай архідыяцэзіі ў СССР. Прыняў сакрамэнт святарства (1927). Прызначаны вікарыем парафіі Ясяніца (*Jasienica*) Ломжыцкага дэканата, Польшча. З 1930 вікарый і катэхет касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзятлава На-

[1] **Шэнфельд Алаізі Мацвеевіч** [13.4.1872, Саратаўская губ., Расія — 6.4.1938], святар. Скончыў Саратаўскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1895). Служыў на Стаўраполлі, у Сімферопалі, Адэсе, Кіеве і іншых парафіях. Арыштаваны ў 1924, 1932, 1935. Прыгавораны 14.5.1936 да 5 гадоў ППЛ. Загінуў у Карагандзінскім лагеры НКВД Казахскай ССР.

ваградскага пав. Дзятлаўскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1934 адміністратар касцёла Хрыста Валадара ў в. Скрыбаўцы Лідскага пав. і дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 4.5.1937 адміністратар касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Нарэўка (*Narewka*) Бельскага пав. Ваўкавыскага дэканата, цяпер Польшча. Арыштаваны 4.1.1940. Пад следствам знаходзіўся ў турмах у Нарэўцы, Бельску Падляскім (*Bielsk Podlaski*), Брэсце. Асуджаны 1.2.1940 асобай нарадай НКВД за «антысавецкую агітацыю» і як «сацыяльна небяспечны элемент» да 10 гадоў ППЛ. У маі 1940 этапаваны ў Алтайскі край, дзе захварэў на сыпны тыф. Пасля выздараўлення адпраўлены ў брэсцкую турму, верагодна, на дадатковае расследаванне справы. 11.6.1941 этапаваны ў Варкуцінскі лагер НКВД Комі АССР і Архангельскай вобл. Вызвалены 17.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Выехаў у Ташкент, каб уступіць у армію генерала У. Андэрса. Прызначаны в. а. капелана ў цэнтры падрыхтоўкі танкістаў, але па дарозе захварэў і памёр. Рэабілітаваны 10.5.1989 пракурорам Гродзенскай вобл. Асабовая справа в. № 9178 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Жертвы политического террора в СССР; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941)*.

**ВАЙТЫНЯК Чэслаў Валянцінавіч** [8.11.1889, мяст Пушчыкова (*Puszczykowo*) каля Познані, Польшча — 10.4.1940, Калінін-Асташкаў], святар. Скончыў прагімназію ў Пушчыкаве, гімназію ў Познані (*Poznań*). З 1903 сябра Таварыства Тамаша Зана. Вучыўся ў Познаньскай духоўнай семінарыі, пасля ў Гнезне (*Gniezno*). Атрымаў сакрамэнт

святарства (1914). Прызначаны вікарыем касцёла ў Пневах (*Pniewy*) і Костшыні (*Kostrzyń*), Польшча. З кастр. 1915 капелан 7-га грэнадзёрскага палка прускай арміі, дзе служыў да восені 1918. У студз. 1919 добраахвотнік у польскім войску, капелан 15-га уланскага палка, з 1.6.1919 капелан-палкоўнік. У снеж. 1919 пробашч 14-й познаньскай пяхотнай дывізіі, нам. дэкана ў Познані. Прымаў удзел як капелан у паўстанні ў Верхняй Сілезіі, а таксама ў 1919—20 у польска-савецкай вайне, дапамагаў духоўна і медыкаментамі паўстанцам у Косцяне (*Kościan*) і Гурцы Духоўнай (*Górka Duchowna*). У 1921 узнагароджаны «Крыжам за храбрасць». Як капелан прымаў удзел у змаганні на познаньскім фронце, актыўны ўдзельнік бітвы пад Вронкамі (*Wronki*). У пачатку 1922 нам. кіраўніка душпастырскай службы ў Познані. З 1.9.1929 (паводле іншых звестак, з 1931) капелан у Навагрудку. У 1932 дэкан у Брэсце, пробашч брэсцкага гарнізона. У 1933 атрымаў прызначэнне на пасаду віцэ-канцлера Палявой курыі польскага войска, працаваў у біскупскім судзе ў Варшаве. 4.9.1939 атрымаў загад назіраць за частковай эвакуацыяй на Усход і, каб выканаць яго, выехаў у Луцк, да біскупа **Адольфа Шэлёнжка**, дзе застаўся да прыходу савецкіх войскаў. 20.9.1939 пад савецкім канвоем перавезены ў Шэпетоўку, пасля ў Фрыдрыхоўку, дзе 23.9.1939 правёў св. Імшу, сказаўшы пра «дзяўчынку, якая спіць, але прачнецца, бо тая дзяўчынка — гэта Польшча». 28.9.1939 высланы ў Казельск. 1.10.1939 адправіў набажэнства ў «катакомбах». Трэцім этапам 20.10.1939 трапіў у Старабельскі лагер. Палітычны камісар Старабельска Кіршын і камендант палкоўнік Беражкоў накіравалі яго на некалькі дзён у падлагер пры турме на вул. Кірава. Не выключана, што папярэдне вывозіўся ў Казельскі лагер. У вігілійную ноч 24.12.1939 прывезены ў турму на Лубянцы ў Маскве, адкуль у канцы сак. 1940 адпраўлены ў Асташкава. Потым размешчаны ў адной з транзітных турмаў г. Калініна. Расстраляны ва ўнутранай турме НКВД Калініна на світанку. У 1941 біскуп **Юзаф Гаўліна**, не ведаючы пра лёс В., хацёў прызначыць

яго сваім генеральным вікарыем палявога біскупства пры настворанай польскай арміі генерала У. Андэрса.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВАЙЦЭХОВІЧ Эдвард Феліксавіч** [22.1.1884, Абабе (?) Ковенскай губ. — 1935, Мінск, турма НКВД], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). Прызначаны вікарыем у катэдральны касцёл Унебаўзяцця НПМ у Пінску. З 1909 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Журавічы (Старыя Журавічы) Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. У 1922 у філіяльным касцёле ў в. Плашава Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. З 1923 адміністратар катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. У 1929 служыў у касцёле Нараджэння НПМ у мяст. Заслаўе Мінскага р-на і зноў у Плашаве. Высланы з памежнай зоны. З 1930 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 28.6.1934. Асуджаны 3.2.1935 асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Памятная книжка Могилевской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ВАЙЦЭХОЎСКІ Адам** [1902—16.7.1973, пас. Гудагай Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.], святар. Скончыў Вілен-

скую духоўную семінарыю, Віленскі ун-т імя Стэфана Баторыя са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). З 1932 вікарый парафіі Божага Цела і Маці Божай Ружанцовай у в. Гадуцішкі Свянцянскага пав. і дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. У 1934 вікарый касцёла Наведзінаў НПМ у в. Алькенікі Віленскага і Троцкага пав. Троцкага дэканата, Літва. З 1935 пробашч парафіі св. Міхала Арханёла ў в. Бутрыманцы Лідскага пав. Беняконскага дэканата, цяпер в. Бутрыманіс, Літва. З 1936 служыў у касцёле св. Яўхіма ў в. Клюшчаны Свянцянскага пав. Свірскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны супрацоўнічаў з АК. Пасля вайны шэсць гадоў хаваўся ад карных органаў НКВД у сваіх парафіян. У 1957 атрымаў дазвол на душпастырскую дзейнасць, служыў пробашчам касцёла Звеставання НПМ у пас. Гудагай.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis. 1936. Vilnae*, *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ВАЙЦЭХОЎСКІ Эдвард** [1873—1958], святар. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1897). З 1913 адміністратар касцёла св. Міхала Арханёла ці Маці Божай Ружанцовай у мяст. Шумск Віленскага пав., цяпер Літва. У 1915 пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. У 1921—27 пробашч парафіі св. Вінцэнта ў в. Шудзялова (*Szudziałowo*) Сакольскага пав. Бераставіцкага дэканата, Польшча. З 1933 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Дзеркаўшчына Пастаўскага пав. Надвілейскага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Паводле некаторых звестак, арыштаваны бальшавіцкімі ўладамі. Пасля вызвалення пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Канстанцінава (Канстанцінаў Дзісненскі), цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВАЛАДКЕВІЧ Каспар Восіпавіч** [8.2.1891, в. Слабодка Віленскага ці Ашмянскага пав. Віленскай губ. — 20.8.1970], святар, грамадскі дзеяч. У 1909 скончыў гарадское 3-класнае вучылішча ў Ашмянах, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1912 вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1919). Служыў вікарыем парафіі св. Антонія Падуанскага ў мяст. Сакулка (*Sokółka*) Беластоцкага ваяв. (Польшча), касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Васілішкі, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1923 пробашч парафіі Маці Божай Ружанцовай і св. Казіміра ў в. Маева (*Majewo*) Сакульскага пав. і дэканата, Польшча. Прыхільнік Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Распаўсюджваў сярод парафіян бел. выданні. У пачатку ліп. 1923 абвінавачаны польскімі ўладамі ў антыдзяржаўнай дзейнасці. Апраўданы 26.10.1923 акруговым судом у Вільні. З 1929 адміністратар касцёла св. Антонія Падуанскага ў в. Малая Бераставіца Бераставіцкага дэканата, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. З 1934 душпастыр парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Квасоўка Гродзенскага пав. і дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. З 1937 пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Анёлаў Ахоўнікаў у в. Анжадава Віленскага пав. Тургельскага дэканата, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. Паводле некаторых звестак, таксама служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Падборжа Беняконскага дэканата, цяпер Літва. З 1.3.1950 хаваўся ад супрацоўнікаў МУС у парафіян, пераходзіў з аднаго населенага пункта ў другі, спыняўся на некалькі дзён у розных асоб. Дапамагаў сялянам па гаспадарцы: араў, сеяў, малаціў, касіў, склаў некалькі печак. Арыштаваны 28.2.1951 на хут. Антонішкі Тракайскага р-на, Літва. Асуджаны 10.6.1951 Маладзечанскім абл. судом за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў

пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Нарыльскі лагер МДБ Краснаярскага краю. Патаемна служыў для зняволеных католікаў. Пасля вызвалення вярнуўся ў Беларусь. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда Беларусі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ВАЛЕНТЫНОВІЧ Віктар Янавіч** [1869 ці 1870, Ілукста Курляндскай губ., цяпер Латвія — 11.9.1933, Кустанай, Казахстан], святар. З літоўскай шляхецкай сям'і, брат **Я. Валентыновіча**[1]. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1894). У 1898 прызначаны пробашчам касцёла св. Веранікі ў в. Селішча Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. З 1917 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у Мсціславе Магілёўскай губ., дэкан Клімавіцка-Мсціслаўскага дэканата. Пасля 1928 пробашч касцёла св. Казіміра ў Лагойску Мінскай вобл. Арыштаваны 26.8.1930. Асуджаны 3.12.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан з канфіскацыяй маёмасці. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 31.10.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа в. № 28600-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД*; *НАРБ, ІКБР; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Литурги-*

---

[1] **Валентыновіч Ян Янавіч**, святар. У 1900—1910-я пробашч парафіі Стыглава (тагачасны паштовы адрас: ст. Корсаўка) Люцінскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія.

*ческий календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВАЛОЎСКАЯ Казіміра (Марта)** [1879, Люблін, Польшча — 19.12.1942], законніца. У 1900 маці В., заснавальніца Супольнасці Сясцёр Беззаганнага Зачацця, прыняла яе ў свой закон у Язлаўцы, Украіна. У 1909 склала вечныя шлюбы і прыняла імя Марта. Служыла настаяцельніцай законных дамоў у Віраве і Мацееве (Украіна), Слоніме Гродзенскай губ. Развівала апостальскую, дабрачынную і экуменічную дзейнасць. Заснавала дамы для польскіх, украінскіх і рускіх дзяцей. Са жн. 1939 настаяцельніца кляштара бенедыктынак у Слоніме. Падчас нямецкай акупацыі дапамагала пераследаваным фашыстамі партызанам і яўрэям. Арыштавана гестапа 18.12.1942. Расстраляна з сястрой *Наішэўскай* і ксяндзом Адамам *Старкам* у прадмесці Слоніма. Беатыфікавана папам Янам Паўлам II 13.6.1999.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ВАЛЫНЕЦ Вітольд Віктаравіч** [1919, в. Германішкі Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — ?], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. У другой палове 1930-х служыў у касцёле св. Юзафа ў мяст. Ляхавічы аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны 29.10.1940. Асуджаны 3.6.1941 як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны (з прыгаворанымі па гэтай жа справе і на той жа тэрмін парафіянамі **Каладзінскім Уладзіславам Уладзіслававічам** (н. у 1910), **Навіцкім Станіславам Іванавічам** (1912), **Тваркевіч Марыяй Паўлаўнай** (1902), **Хмарай Вітальдам Антонавічам** (1905), братамі **Явароўскімі — Іванам Міхайлавічам** (1915) і **Станіславам Міхайлавічам** (1918), **Ядчак Сафіяй Іванаўнай**

(1900), **Ядчак Янай-Данутай Казіміраўнай** (1923) у Паўночна-Усходні лагер МДБ Хабараўскага краю. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.8.1989 пракуратурай Брэсцкай вобл. Групавая справа в. і інш. № 9715-с з фотаздымкамі захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**ВАЛЬТАСЬ Аркадзь** [1916—1976], законнік, францішканец. У сярэдзіне 1942 арыштаваны з групай каталіцкіх святароў (Эміліянам *Войтахам*, Янам *Крукоўскім,* Тэадорам *Рылам*, Людвікам *Саванеўскім*, Юстынам *Скакоўскім,* Станіславам *Смялоўскім*, Казімірам *Шыпілам,* Альбінам *Ярашэвічам,* францішканцамі Міхалам (Дзянісам) *Клімчаком*, **Тытусам Стшэлевічам**) у Гродне. Праз два месяцы вызвалены. У 1946–75 пробашч касцёла францішканцаў Маці Божай Анёльскай у Гродне.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992.*

**ВАЛЬЧАК Тэафіл-Севярын** [1913 — ?], святар. Уступіў у Закон Супольніцтва кармелітаў босых. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). У 1947 законнік у Вільні, потым вікарый у Лідзе. У 1960 законнік у Закапанэ (*Zakopane*), Польшча. Рэпрэсаваны МДБ. Дата, месца арышту і далейшы лёс невядомыя.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВАНДАЛОЎСКІ Мар'ян Феліксавіч** [1893, в. Каменка Ломжынскага пав. і губ., Польшча — 19.2.1963, Польшча], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1918). Прызначаны вікарыем парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1921 пробашч касцёла Маці Божай Ружан-

цовай у мяст. Пескі Ваўкавыскага дэканата і пав. Гродзенскай губ., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1931 служыў у касцёле НПМ Каралевы Польшчы ў в. Вялікая Рагозніца, цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1933 адміністратар парафіі св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Масты Лунінецкага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны НКВД 11.8.1950. Абвінавачваўся як удзельнік «антысавецкай арганізацыі». Асуджаны 18.11.1950 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Парафіяне пісалі лісты аб невінаватасці святара вышэйшаму кіраўніцтву СССР, але гэта вынікаў не дало. 20.10.1954 трыбунал БВА паменшыў тэрмін да 10 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Пасля датэрміновага вызвалення вярнуўся ў БССР. «Улады працягвалі з падазрэннем і схаванай варожасцю ставіцца да святароў. Упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР па Гродзенскай вобл. П. Чыж пісаў у «Докладной записке» сакратару ЦК КПБ К. Т. Мазураву: *«Обращает внимание тот факт, что возвратившиеся из заключения служители религиозных культов активно проводят работу по усилению религии среди населения… Отдельные из них — ксендзы Мариян Вандоловский, Мечислав Радишевский, Ян Чернецкий, Мяновский пытаются возобновить антисоветскую деятельность»*[1]. Паводле звестак міжнароднага таварыства «Мемарыял» (Масква), В. зноў арыштаваны 25.6.1957 у Мастах. Прыгавораны 14.8.1957 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Пасля датэрміновага вызвалення выехаў у Польшчу. Рэабілітаваны 31.6.1996 Гродзенскім абл. судом.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; Жертвы политического террора в СССР*.

---

[1] Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990. С. 139.

**ВАРАКОМСКІ Антоні-Юзаф (Аўгустаў)** [12.7.1902—26.10.1971], святар. У 1920 салдат 201-га пяхотнага палка. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1927, Ломжа (*Łomża*), Польшча). З 1929 капелан гарнізона ў Ломжы. На 1.10.1930 капітан капелан Войска Польскага. У 1931—33 капелан Лідскага гарнізона. Мабілізаваны як капелан у 1939. З 31.8.1939 у 19-й і 29-й польскіх дывізіях. Арыштаваны. Вызвалены 22.9.1939. З 5.11.1939 у Францыі, з 21.06.1940 у Англіі. Маёр капелан, кавалер ордэна «За ўратаванне сцяга». З 1968 палкоўнік капелан.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВАРАНЕЦКІ Міхал Віктаравіч** [23.12.1908, мяст. Вілейка Віленскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. — 10.6.1998, Гродна], святар. Скончыў Кракаўскі філасофска-тэалагічны інстытут. Прыняў сакрамэнт святарства (16.6.1935). З 1937 капелан гарадской бальніцы ў Львове, цяпер Украіна. З 1945 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Лыскава Ваўкавыскага пав. і дэканата, цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл., потым служыў у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Ружаны Косаўскага дэканата, цяпер Пружанскі р-н, у Брэсце. Арыштаваны 25.5.1949. Абвінавачваўся ў «захоўванні антысавецкай літаратуры» і «антыкалгаснай прапагандзе». Асуджаны 13.7.1949 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР (Джэзказган). Вызвалены 16.6.1956 датэрмінова. Зноў служыў пробашчам касцёла ў Ружанах. З 1968 абслугоўваў касцёл Найсвяцейшай Тройцы і Св. Крыжа ў Косаве, цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1977 у касцёле ў Слоніме Гродзенскай вобл., з 1980 у касцёле св. Міхала Арханёла ў мяст. Поразава Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. З 7.5.1996 генеральны вікарый Гродзенскай дыяцэзіі, духоўны айцец Гродзенскай семінарыі.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ВАРНАС Міхал Ігнатавіч** [1877, в. Шынкуны Ковенскай губ., цяпер Літва — 11.3.1938, Магілёў, турма НКВД], святар. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1900). У 1902—08 пробашч касцёла ў в. Яшмуйжа (тагачасны паштовы адрас: ст. Прэлі) Дзінабургскага пав. Віцебскай губ., цяпер Прэйлі, Латвія. З 1913 вікарый касцёла Унебаўзяцця НПМ пры кляштары дамініканцаў у в. Аглона (тагачасны паштовы адрас: ст. Самерсет) Дзінабургскага пав. З 1923 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Івандар Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. У 1926—28 і, верагодна, пазней пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Лазавіца Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. З 1936 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у Мсціславе Магілёўскай вобл. Арыштаваны 23.8.1937. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 6.12.1937 як «агент буржуазнай Польшчы» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны з шэрагам падследных Магілёўскай турмы НКВД. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 16.1.1989. Асабовая справа В. захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; БНДЦЭД*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВАРХАПОВІЧ Уладзіслаў** [1910—13.7.1942, Баранавічы Брэсцкай вобл.], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). Пасля 1939 (?) вікарый касцёла Звеставання НПМ у Ганцавічах

Лунінецкага дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны гестапа 29.6.1942. Перавезены ў Баранавіцкую турму. Расстраляны. Пахаваны на праваслаўных могілках у Баранавічах (?).

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВАСІЛЕНІ-ПАЖАРСКА Ніна (Роза-Марыя) Юзафаўна** [1891, мяст. Мацясы Пружанскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл. — 1994], дамініканка. Атрымала хатнюю адукацыю. Жыла ў Маскве, працавала швачкай. Перайшла ў каталіцтва, уступіла ў Абрыкосаўскі ордэн сясцёр дамініканак. Арыштавана 8.3.1924. Праходзіла па групавой справе «рускіх каталікаў». Асуджана калегіяй АДПУ 18.5.1924 за «ўкрывальніцтва і спрыянне здзяйсненню контррэвалюцыйнага злачынства» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Табольскі р-н. Вызвалена 9.5.1927 з забаронай жыць у 6 найбуйнейшых гарадах і памежных раёнах СССР. Выехала ў Ромны Палтаўскай вобл. Зноў арыштавана 16.10.1930. Прыгаворана калегіяй АДПУ 28.9.1931 за «правядзенне антысавецкай агітацыі з выкарыстаннем рэлігійных сродкаў» да 3 гадоў ППЛ. Этапавана ў Сібірскі лагер АДПУ Новасібірскай вобл. Вызвалена ў верас. 1932. Жыла ў Арле, працавала ў арцелі «Росписьткань». У чарговы раз арыштавана 29.4.1933. Асуджана калегіяй АДПУ 19.2.1934 за тое самае «злачынства» да 3 гадоў ППЛ. Вызвалена ў чэрв. 1934. Вярнулася ў Арол. Зноў арыштавана ў 1935. Абвінавачвалася ў «сувязях з міжнароднай буржуазіяй». У крас. 1936 прыгаворана да 3 гадоў ППЛ. Этапавана ў Карагандзінскі лагер НКВД Казахскай ССР (с. Далінскае). Выжыла ў зняволенні толькі дзякуючы дапамозе загадчыцы лагернага медыцынскага пункта Люцыі *Давыдзюк.* Вызвалена ў 1939. Пасля жыла ў кляштары ў Малаяраслаўцы Калужскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны трапіла з сёстрамі ў нямецкую акупацыю. У 1945 вярнулася ў Малаяраславец. З 1956 у кляштары ў Мейшаголе, Літва.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**ВАСІЛЕЎСКІ Ян Аляксандравіч** [15(28).6.1885, в. Мудрылава Дзвінскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — 3.10.1948], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і мітрапалітную духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Вучыўся ў Лювенскім ун-це ў Бельгіі. Кандыдат багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (12.3.1909). Да 1913 вікарый фарнага касцёла св. Казіміра ў Магілёве, потым у парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Дзвінску, цяпер Даўгаўпілс, Літва. З 1917 служыў у касцёле св. Кацярыны Александрыйскай у Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, і выкладаў у мужчынскай гімназіі пры касцёле. Арыштаваны 1.5.1919 як закладнік з групай каталіцкіх святароў. Зняволены з арцыбіскупам Э. *Ропам* у турму на вул. Шпалернай. Вызвалены 22.7.1919. У сак. 1920 два тыдні служыў пробашчам касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Архангельску, потым з-за пагрозы арышту 5 месяцаў хаваўся ад бальшавікоў. У 1920 заснаваў Трэці ордэн св. Францішка. У крас. 1921 пасля закрыцця польскіх гімназій стварыў Таварыства каталіцкіх бацькоў і выкладчыкаў. У сак. 1922 епіскапам Я. *Цеплякам* накіраваны ў Мінск для дапамогі парафіянам. Зноў арыштаваны 2.5.1922 са святарамі А. *Лісоўскім* і М. *Тамашэўскім.* Абвінавачваўся ў «супрацівe канфіскацыі касцёльнай маёмасці». 1.6.1922 асуджаны рэвалюцыйным трыбуналам ЧК да 3 гадоў пазбаўлення волі. Пераведзены ў Бутырскую турму Масквы. Вызвалены ў 1923 дзякуючы кіраўніцтву Латвіі. Служыў вікарыем касцёла св. Кацярыны ў Петраградзе. 22.9.1923 выехаў у Латвію. Працаваў вікарыем і катэхетам парафіі дамініканцаў Унебаўзяцця НПМ у Аглоне, пазней у Рызе. З 1925 дырэктар гімназіі ў Аглоне. З 1926 рэктар духоўнай семінарыі ў Пінску, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1933 дырэктар гімназіі ў Драгічыне, канонік Пінскай дыяцэзіі. З 1937 прафесар Пінскай духоўнай семінарыі. Пад-

час 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў пробашчам катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску, генеральным вікарыем Пінскай дыяцэзіі. Дапамагаў яўрэям з гета. Пасля выезду ў Польшчу 13.12.1944 кіраўніка Пінскай дыяцэзіі **Генрыха Гумніцкага** часова выконваў яго абавязкі. Клапаціўся, каб парафіі не заставаліся без пастырскай апекі. У касцёлы, якія пуставалі, прызначаў святароў для абслугоўвання па сумяшчальніцтве. Спрабаваў дамагчыся ад беларускага ўрада стварэння касцёльнай адміністрацыі, выказваўся за неабходнасць стасункаў СССР з Ватыканам. Яго прапановы падтрымалі святары з Мінска Віктар *Шутовіч*, Антоні *Барысовіч* і інш. В. адважна і адкрыта выказваў свае погляды, не хаваў свайго аўтарства кнігі «W szponach Antychrysta?» («У кіпцюрах антыхрыста?»), з абурэннем адкідваў прапановы супрацоўніцтва з карнымі органамі. Са святарамі Антоніем *Банькоўскім* і Вацлавам *Нуркоўскім* найчасцей згадваўся ў савецкай атэістычнай публіцыстыцы як негатыўны прыклад. Арыштаваны 23.8.1945 у Пінску па адрасе: вул. Кіеўская, д. 3. Нягледзячы на просьбы парафіянаў аб вызваленні, правёў 2 гады ў Мінскай турме МДБ. Асуджаны 22.3.1947 з протаіерэем **Фёдарам Валікоўскім** асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Краснаярскі край (с. Казачынскае). Загінуў у зняволенні ад голаду. У жн. 1990 цела эксгумавана і 6.10.1990 перапахавана ў Драгічыне. Рэабілітаваны 20.9.1989 пракуратурай Брэсцкай вобл. Асабовая справа в. № 10067-с захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *БНДЦЭД*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Като-*

*лический Костел в Беларуси в 1945—1990; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**ВАСЮЦЁНАК (ВАСЮЧОНАК) Пётр Юзафавіч** [30.6.1908, в. Новы Пагост Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — 17.10.1978, Беласток (*Białystok*), Польшча], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую гімназію імя Зыгмунта Аўгуста (1928), Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ў Віленскім ун-це імя Стэфана Баторыя. Атрымаў ступень магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны катэхетам касцёла Наведзінаў НПМ у мяст. Новыя Трокі Троцкага дэканата Віленскай архідыяцэзіі, Літва. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў у касцёле св. Апостала Андрэя Баболі ў мяст. Кабыльнікі, цяпер в. Нарач Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Арыштаваны 4.1.1952. Асуджаны 25.3.1952 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Паводле некаторых звестак, этапаваны ў Варкуцінскі лагер МДБ Комі АССР і Архангельскай вобл. 31.1.1955 судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага савета БССР тэрмін пакарання зніжаны да 10 гадоў. Вызвалены 9.5.1956 са зняццем судзімасці. Рэабілітаваны 4.7.1956 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. З 27.1.1957 зноў служыў у Кабыльніцкім касцёле. 16.4.1961 пазбаўлены рэгістрацыі за «грубае парушэнне савецкага заканадаўства аб рэлігійных культах». У 1962 пасля закрыцця касцёла выехаў у Беласток (*Białystok*), Польшча, дзе стаў вікарыем фарнага касцёла Унебаўзяцця НПМ. З лют. 1969 пробашч і дэкан касцёла св. Антонія Падуанскага ў мяст. Сакулка (*Sokółka*), Польшча. Асабовая справа в. № 15917-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 7, л. 7; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w*

*golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*.

**ВАШЧЫНСКІ Пётр** [1896 ці 1895—1950, ГУЛАГ], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1922). З 1930 в. а. пробашча грэка-каталіцкага касцёла ў в. Курачэва (*Kuraczewo*) Бельскага пав. і дэканата, Польшча. З 1935 в. а. пробашча парафіяльнага грэка-каталіцкага касцёла ў в. Збураж Брэсцкага пав. і дэканата, цяпер Маларыцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1939 в. а. пробашча грэка-каталіцкай парафіі св. Юзафа ў в. Альпень Столінскага дэканата, цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў у парафіяльным касцёле Божага Цела ў Давыд-Гарадку, цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны ў 1945 у Пінску той жа вобл. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны, верагодна, у Варкуцінскі лагер МДБ Комі АССР. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ВЕЛЬГАТ Ян** [29.3.1904, в. Бярозаўка (*Brzozówka*) Ломжынскай дыяцэзіі і губ., цяпер Польшча — 22.2.1993, Аўгустова (*Augustowo*), Польшча], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, ун-т імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (21.6.1936). Прызначаны вікарыем касцёла св. Роха ў Беластоку аднайменнага дэканата, Польшча. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч парафіі Перамянення Пана ў в. Задзеўе Надвілейскага дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл., таксама адміністратар касцёла Беззаганнага

Зачацця НПМ і св. Антонія Падуанскага ў мяст. Паставы аднайменнага дэканата, цяпер Віцебскай вобл. У пачатку 1948 адзіны святар у 13 парафіях Пастаўскага дэканата. Арыштаваны 9.2.1949 у Оршы Віцебскай вобл. Вывезены ў Бутырскую турму Масквы. Асуджаны да 10 ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Тайшэцкі лагер МДБ Іркуцкай вобл. У 1954 пераведзены на Урал. Вызвалены 10.11.1955. Дадому вярнуўся інвалідам. У 1958 выехаў у Польшчу. З 4.10.1958 вікарый парафіі св. Ганны ў Штуме (*Sztum*), адміністратар касцёла Унебаўзяцця НПМ у Галінах (*Galiny*), Польшча.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ВЕНАЖЫНДЗІС Ян Алаізіевіч** [1901, в. Павіціне Вількамірскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 14.11.1967, Літва], святар. З літоўскай сялянскай сям'і. Скончыў 3 класы Вількамірскай гімназіі (1914). Падчас 1-й сусветнай вайны працаваў на бацькаўскай гаспадарцы. У 1919 паступіў на тэалагічны ф-т Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1927). Прызначаны вікарыем парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Кальварыя (*Kalwaria*) аднайменнага дэканата, Літва. З 1930 адміністратар касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Аланы Кальварыйскага дэканата, Літва. З 1937 пробашч парафіі св. Ліна ў в. Пеляса Лідскага пав. Радуньскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. У пасляваенны час служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ і св. Юрыя ў мяст. Нача Лідскага, Віленскага і Троцкага пав. Рудзенскага дэканата, цяпер вёска Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. Арыштаваны 15.1.1951. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны асобай нарадай пры МДБ 7.6.1951 да 15 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. 1.9.1951 тэрмін зніжаны да 10 гадоў. Вызвалены ў ліп. 1956 пастано-

вай Вярхоўнага Савета СССР. Вярнуўся на радзіму. 26.9.1956 зарэгістраваны на апошнім месцы службы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 103; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ВЕРАМЕЙ Пётр Казіміравіч** (?) [1890 — ?], парафіянін. З бел. сялянскай сям'і. Да 1917 пераследаваўся ўладамі за пераход у каталіцтва. Арыштаваны каля 1925 па справе «католікаў Беларусі». Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВІЛЬНЕЎЧЫЦ Міхал Вінцэнтавіч** [7.12.1912, в. Дубравіца Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. — 10.5.1997], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (2.3.1937). Прызначаны в. а. вікарыя парафіяльнага касцёла Гайнуўка (*Hajnówka*) Бельска-Падляшскага пав. Бельскага дэканата, Польшча. Арыштаваны з навучэнцамі Свіслацкай гімназіі **Болбатам Іванам, Гайнерам Іосіфам, Майхерам Генрыхам** 11.11.1939 супрацоўнікамі НКВД. Зняволены ў турме ў Свіслачы, потым у Ваўкавыску, Баранавічах, Мінску, Гомелі. 17.9.1940 асуджаны да 7 гадоў ППЛ. 3.10.1940 этапаваны ў Котласкі лагер НКВД Комі АССР. Вызвалены 12.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Служыў капеланам у арміі генерала У. Андэрса. У Іране звольнены з Войска Польскага і накіраваны ў лагер польскіх сірот, які знаходзіўся за 300 км на поўдзень ад Тэгерана. 13.10.1944 з групай сірот паехаў у Новую Зеландыю, куды іх запрасіла кіраўніцтва краіны. Служыў там душпастырам. У 1947 выехаў на вучобу ў Бейрут. Пасля 5 гадоў службы святаром у польскай калоніі ў Ліване

выехаў у Рым. 8.6.1954 атрымаў ступень доктара тэалогіі. Служыў святаром для палякаў у Італіі. У кастр. 1957 вярнуўся ў Польшчу. Працаваў у Драгічынскай духоўнай семінарыі як прафесар тэалогіі і святар. У 1975 атрымаў тытул капелана Яго Святасці. У 1987 узнагароджаны Крыжам *Pro Ecclesia et Pontifice*.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ВІЛЬЧЫНСКІ Чэслаў** [6.1.1928, в. Адамішкі Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. — 24.8.1986, Браслаў], святар. З сялянскай сям'і. У першай палове 1950-х г. асуджаны за дэзерцірства з Савецкай Арміі. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Скончыў Рыжскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1967). Пэўны час улады БССР не падпісвалі В. дазвол на душпастырскую дзейнасць, але дзякуючы шматлікім намаганням вернікаў ён стаў пробашчам касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Браслаў Віцебскай вобл. Пасля прызначэння В. у парафіі ажывілася рэлігійнае жыццё. У 1969 святар ахрысціў 178 дзяцей, абвянчаў 46 пар. На набажэнствах, асабліва ў святы, у касцёле збіралася ад 500 да 1000 чалавек. Пры падтрымцы В. пры касцёле ўтварылася група веруючых жанчын, якія дамагаліся вольнага навучання дзяцей рэлігіі, іх удзелу ў рэлігійных абрадах. Касцёл наведвала шмат дзяцей, падлеткаў, моладзі, што выклікала незадавальненне мясцовых улад і ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР. За гэтыя «парушэнні» заканадаўства аб культах святара не раз штрафавалі і выносілі папярэджанне. У лісце ад 11.6.1970 на імя старшыні Савета па справах рэлігій пры СМ СССР В. А. Кураедава ўпаўнаважаны Савета па справах

рэлігійных культаў пры СНК СССР па БССР Г. Кавалёў прасіў даць згоду на перавод святара ў Лынтупскі касцёл Пастаўскага р-на, спасылаючыся на тое, што «мясцовыя партыйныя і савецкія органы настойліва просяць прыбраць В. з Браслаўскага касцёла». 15.8.1979 падчас свята НПМ касцёл наведалі ўпаўнаважаны Савета па справах рэлігій па Віцебскай вобл. і член гарадской камісіі садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб культах. Гэта выклікала незадавальненне вернікаў. Пасля заканчэння набажэнства ўзбуджаны натоўп літаральна атакаваў нязваных гасцей. Раздаваліся крыкі: «Навошта вы прыйшлі ў касцёл? Навошта чапляецеся да ксяндза? Навошта ўмешваецеся ў касцёльныя справы? Вы перашкаджаеце нам маліцца! За што штрафуеце ксяндза? Чаму забараняеце дзецям прыслужваць ксяндзу падчас Імшы? Мы паедзем скардзіцца ў Маскву». Людзі супакоіліся не хутка. Але вынік быў тым жа. Ксяндза выклікалі ў гарвыканкам, дзе ўказалі на яго «неправамерныя дзеянні».

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*. С. 166, 216, 217.

**ВОЙНА Стэфан Мікалаевіч** [2.9.1885(ці 6), Варшава — 1950], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). Прызначаны катэхетам гімназіі ў Санкт-Пецярбургу, рэктарам капліцы Наведзінаў НПМ; потым вікарыем парафіі Божага Цела ў Нясвіжы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1911 у касцёле св. Антонія Падуанскага ў Баранавічах Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1914 рэктар філіяльнага касцёла Перамянення Пана ў в. Кемешаўцы Барысаўскага дэканата, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. З 1918 прэфект польскіх школ у Маскве. Пазней пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у

Разані, Расія. Некаторы час служыў у касцёле св. Ганны ў Маскве. З 1926 адміністратар парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Рагачове, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл., таксама абслугоўваў касцёл Унебаўзяцця НПМ у Журавічах таго ж Рагачоўска-Быхаўскага дэканата. Двойчы арыштоўваўся. Пасля арышту ў снеж. 1928 пераведзены ў Ленінградскую турму. Вызвалены. З кастр. 1929 пробашч парафіі св. Казіміра ў Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Адначасова служыў у касцёле св. Кацярыны, парафіі Маці Божай Чанстахоўскай на ст. Лігава, касцёла св. Аляксея ў Пецяргофе і св. Станіслава ў Ленінградзе. Арыштаваны 8.5.1931. Абвінавачваўся ва «ўдзеле ў контррэвалюцыйнай арганізацыі» і як «кіраўнік нелегальнымі рэлігійнымі гурткамі моладзі і разведвальнай працай». 7.3.1932 асуджаны тройкай АДПУ на 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. У 1938 пераведзены ў аддзяленне Сібірскага лагера НКВД Новасібірскай вобл. (ст. Яя Томскай чыгункі). Вызвалены 22.7.1939. З 7.4.1940 зноў у зняволенні. Канчаткова вызвалены ў маі 1941. У 1941—43 служыў у касцёле св. Мікалая ў г. Луга Ленінградскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ВОЙНА-АРАНСКІ Пётр** [1904, в. Трабы Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. — 1944], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1932). Прызначаны вікарыем касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Браслаў аднайменнага дэканата Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1934 катэхет школ пры касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Тшцяны (*Trzcianne*) Беластоцкага пав. Кнышынскага дэканата, Польшча. З 1935 вікарый парафіі Звеставання НПМ у Дабжыневе (*Dobrzyniew*)

Беластоцкага пав. і дэканата, Польшча. У 1937 у касцёле св. Вацлава ў Ваўкавыску, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1938 пробашч парафіі св. Ганны ў в. Яшуны Троцкага дэканата, Літва. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў у касцёле Нараджэння НПМ у роднай вёсцы Трабы. Забіты партызанамі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ВОЙТАХ Эміліян** [1912—1981], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1938). Прызначаны вікарыем касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Карыцін (*Korycin*) аднайменнага пав. Кнышынскай дыяцэзіі, Польшча. У сярэдзіне 1942 арыштаваны з групай каталіцкіх святароў (Янам *Крукоўскім,* Тэадорам *Рылам*, Людвікам *Саванеўскім*, Юстынам *Скакоўскім,* Станіславам *Смялоўскім*, Казімірам *Шыпілам,* Альбінам *Ярашэвічам,* францішканцамі Міхалам (Дзянісам) *Клімчаком*, **Тытусам Стшэлевічам** і Аркадзем *Вальтасем*) у Гродне. Праз два месяцы вызвалены. У 1947—58 пробашч езуіцкага фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне, віцэ-дэкан. З 1954 гродзенскі генеральны вікарый, дэкан. У 1958 выехаў у Польшчу.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ВОЛЬСКІ Ян** [1887—15.10.1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). Прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1913 пробашч касцёла бернардынцаў у мяст. Глуск Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1921 пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Сноў, цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. З 1937 пробашч

парафіяльнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне аднайменнага пав. і дэканата, цяпер Брэсцкай вобл., кобрынскі дэкан, ганаровы канонік Пінскай капітулы. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны 9.10.1942 са святаром Уладзіславам *Грабельным*. Абвінавачаны фашыстамі ў дапамозе яўрэям. Расстраляны з імі ў лесе пад Кобрынам.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВОРСЛАЎ Юзаф** [28.8.1886, Віцебская губ. — 1937 (?)], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). З 1913 вікарый парафіі Нараджэння НПМ у Барысаве Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. 27.9.1914 прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі Магілёўскай губ. 26.2.1919 пераведзены ў касцёл св. Антонія Падуанскага ў Віцебску, пазней адміністратар парафіі НПМ у Талачыне Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. У спісах Магілёўскай архідыяцэзіі лічыўся да 1932. Паводле некаторых звестак, у 1937 арыштаваны і расстраляны. Верагодна, рэпрэсаваны і сваякі В.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; З асабістага архіва У. Васькова.*

**ВОРСЛАЎ Ян Юзафавіч** [13.3.1885, в. Кіселеўцы Прыдруйскай вол. Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — 6.10.1937, пас. Левашова Ленінградскай вобл., НКВД], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю

ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Прызначаны вікарыем парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1911 адміністратар касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Волагдзе, Расія. Арыштаваны ў 1919. Абвінавачаны ў шпіянажы. Асуджаны Рэвалюцыйным трыбуналам да ВМП. Каля тысячы супрацоўнікаў мясцовай фабрыкі запатрабавалі ад ЧК яго вызвалення і збіраліся ў выпадку адмовы сілай вызваліць яго. Вызвалены пад падпіску аб нявыездзе. У 1924 рэзідэнт парафіі Вологды без права выканання функцый душпастыра, некаторы час служыў у капліцы Найсвяцейшага Сэрца НПМ у Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. У 1925—26 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Пскове, касцёлаў у г. Дно і г. Востраў, цяпер Пскоўская вобл. Зноў арыштаваны ў Ленінградзе ў 1930 і высланы на 3 гады ў Омск з пазбаўленнем грамадзянскіх правоў на 2 гады. З 1932 у парафіі св. Мікалая ў г. Луга Ленінградскай вобл. У чарговы раз арыштаваны 9.9.1937 у Лузе па адрасе: вул. Маскоўская, д. 13. Зняволены ў Ленінградскай унутранай турме НКВД. Асуджаны 28.9.1937 камісіяй НКВД і пракуратуры СССР за «шпіянаж», «правядзенне антысавецкай агітацыі» і «удзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны ў пас. Левашова каля Ленінграда.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Ленинградский мартиролог*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ВЫЛЯЖЫНСКІ Францыск Францыскавіч** [1879, мяст. Росіца Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — травень 1942 ці пасля 1946], святар. Са шляхецкай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1901). З 1902 вікарый касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Рэчыцы

Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. З 1904 у парафіі св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. З 1905 пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў в. Дзедзілавічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл., адноўленага дзякуючы і яго намаганням, пазней разбуранага бальшавікамі. З 1923 служыў у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Корань таго ж пав., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. З 1930 душпастыр касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Паводле некаторых звестак, у 1933 некаторы час абслугоўваў касцёл езуітаў св. Яна Караля ў в. Блонь, цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 19.3.1934 у Бабруйску па адрасе: вул. М. Горкага, д. 36, кв. 1. Асуджаны 11.4.1934 тройкай НКВД як «член ПАВ» і за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Паўночна-чыгуначны (Пячорскі) лагер НКВД Комі АССР, у 1937 пераведзены ў Карагандзінскі лагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалены ў 1940. Вярнуўся ў Бабруйск цяжка хворым. Працаваў вартаўніком. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў святаром. Паводле адных звестак, загінуў у маі 1942. Паводле іншых, пасля прыходу ў Бабруйск Чырвонай Арміі працягваў служыць у касцёле да 1946, калі ў будынку святыні размясцілі краязнаўчы музей. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракурорам БВА. Асабовая справа в. № 14018 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

23.8.1937 у Бабруйску Магілёўскай вобл. арыштавана хатняя гаспадыня **Выляжынская Ксаверыя Францыскаўна** (н. у 1868 у в. Жулінава Дрысенскага пав.), сястра Францыска Выляжынскага. Асуджана 5.11.1937 тройкай НКВД як «удзельніца контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «шпіянаж» да ВМП і 15.11.1937 расстраляна. Рэабілітавана 10.10.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Яе асабовая справа № 12327 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии*; *Памятная книжка Минской губернии*; *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*;

*БНДЦЭД*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Канфесіі на Беларусі*. *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ВЭБЕР Ян** [1878—29.1.1919], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1901). Служыў у Коўне, цяпер Каўнас, Літва. З 1907 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. Не пазней чым з 1912 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Друя Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1914 пробашч і дэкан фарнага касцёла св. Апостала Андрэя ў Слоніме Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Забіты бальшавікамі падчас польска-савецкай вайны. Пахаваны ля касцёла св. Апостала Андрэя.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ВЯРБІЦКІ Мікалай Мікалаевіч** [1893, в. Сукневічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — 11.3.1938, Архангельская вобл., НКВД], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. Да арышту служыў у касцёле св. Дамініка ў мяст. Хатаевічы, цяпер в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай вобл. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 18.9.1933. Асуджаны (з 50 парафіянамі, большасць з якіх загінулі ў 1937—45 у ГУЛАГУ) 19.12.1933 тройкай АДПУ за «шпіянаж» і «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ва Ухта-Пячорскі лагер АДПУ Комі АССР

(пас. Мадмас). 24.12.1937 узяты пад варту і 5.1.1938 тройкай НКВД Архангельскай вобл. прыгавораны за «антысавецкую прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (групавая, № 12863-с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 12.10.1960 трыбуналам БВА, па другой — 19.5.1989.

Кр.: *Покаяние*; *НАРБ, ІКБР.*

**ВЯРЖБІЦКІ Віктар** [1890—13.7.1942, Баранавічы Брэсцкай вобл.], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1926). Служыў адміністратарам парафіяльнага касцёла Перамянення Пана ў мяст. Новая Мыш Баранавіцкага пав. Наваградскага ваяв., цяпер вёска Баранавіцкага р-на. Паводле некаторых звестак, служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. З 1929 в. а. пробашча парафіі НПМ у в. Палонка Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1936 в. а. пробашча парафіяльнага касцёла св. Юзафа ў в. Вічуўка Пінскага пав. і дэканата, цяпер Украіна. Расстраляны фашыстамі.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВЯРЖБІЦКІ Юзаф Фаміч** [14.8.1887, Мінск — 13.9.1937, ГУЛАГ, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох) Карэльскай АССР], святар. З польскай мяшчанскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1914). Прызначаны вікарыем касцёла св. Юзафа Абранніка ў Оршы Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., катэхет школ. З 1917 пробашч парафіяльнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Тамбове, Расія, дзе ў 1922 стаў сведкам паўстання сялян супраць бальшавіцкай улады. Далей служыў у філіяльным касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Пензе, Расія. З 1924 у касцёле НПМ у Варонежы, Расія. Па-

водле некаторых звестак, з 1927 зноў у Тамбове. Арыштаваны ў лют. 1935 у Харкаве падчас масавых арыштаў католікаў. Асуджаны 8.1.1936 да 8 гадоў ППЛ. 21.3.1936 праз Ленінград этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі лагер НКВД Архангельскай вобл. У лагеры 1.9.1937 узяты пад варту і прыгавораны 2.9.1937 лагернай тройкай пры НКВД Карэльскай АССР за «антысавецкую прапаганду сярод зняволеных» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Па апошняй справе рэабілітаваны пракуратурай Карэльскай АССР 13.4.1989.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR;Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Жертвы политического террора в СССР*.

**ВЯРЖБІЦКІ Ян Дзмітрыевіч** [1899 — ?], святар, верагодна, Пінскай дыяцэзіі. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Служыў у Брэсцкім дэканаце. Арыштаваны і змешчаны ў Брэсцкую турму. Этапаваны ў лагер. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ВЯРСОЦКІ Ян Янавіч** [7(ці 17).1888, мяст. Гальшаны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. — 22.12.1937, Алма-Ата, турма НКВД], рэлігійны і грамадскі дзеяч. З бел. мяшчанскай сям'і. У 1904—08 вучыўся ў Ашмянскім гарадскім 3-класным вучылішчы. 6.4.1909 здаў экзамен на званне аптэкарскага вучня пры экзаменацыйнай камісіі Санкт-Пецярбургскай навучальнай акругі. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Падчас вучобы наведваў культурна-асветны гурток бел. студэнтаў-клерыкаў. Прыняў сакрамэнт святарства (1915).

Прызначаны вікарыем касцёла Узвышэння Св. Крыжа (на Кальварыйскіх могілках) (паводле іншых звестак, касцёла Найсвяцейшай Тройцы) у Мінску. Удзельнік 1-га з'езда беларускага каталіцкага духавенства (Мінск, 24—25.5.1917). Член Саюза ксяндзоў беларусаў. З 1920 адміністратар касцёла св. Юрыя ў фальварку Забелы Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл., а таксама філіяльнага касцёла Нараджэння НПМ у Дрысе Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Верхнядзвінск Віцебскай вобл. Арыштаваны 8.8.1927. Асуджаны 31.10.1927 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Карэльскай АССР. У 1932 узяты пад варту ў лагеры на востраве Анзер. Абвінавачваўся па групавой справе каталіцкага духавенства «ў арганізацыі контррэвалюцыйнай групы, якая вяла антысавецкую агітацыю, тайна рабіла багаслоўскія, рэлігійныя абрады і здзяйсняла нелегальную сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару аб становішчы католікаў у СССР». Следства хадайнічала аб павелічэнні тэрміну пакарання в. да 10 гадоў і ўтрыманні ў ізаляцыі. 27.5.1933 высланы на 3 гады ў Сяміпалацінск Казахскай ССР. У высылцы 7.9.1937 арыштаваны чарговы раз. 11.12.1937 прыгавораны (са святаром Карлам *Лапіновічам* і інш.) за «антысавецкую агітацыю сярод зняволеных» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.8.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа в. захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Литургический календарь*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Stankievič A*. Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей.*

**ВЯРЫГА Юзаф Францавіч** [1866 ці 1867, в. Геранкі (Гяронкі?) Дрысенскага пав. Віцебскай губ. — пасля 1933], святар. З бел. мяшчанскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1891). Служыў вікарыем у касцёлах дамініканцаў Перамянення Пана ў Цверы (1894), парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Табольску (да 1900), касцёле філіяльным св. Ганны ў Екацярынбургу (да 1904), Расія. З 1906 адміністратар, з 1910 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Стараселле Аршанскага пав. Віцебскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. З 1923 в. а. аршанскага дэкана. У пачатку 1930-х адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у Вяліжы Віцебскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія, касцёла св. Антонія ці св. Барбары ў Віцебску. Арыштаваны 28.2.1933 у Віцебску па адрасе: Гарадоцкае шасэ, д. 35. Асуджаны 5.5.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і як арганізатар антысавецкай арганізацыі» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Загінуў на чужыне. Рэабілітаваны 27.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа в. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ВЯЧОРАК Уладзіслаў** [1903—1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Паводле некаторых звестак, служыў вікарыем касцёла Божага Цела ў мяст. Дварэц Слонімскага пав. Дзятлаўскага дэканата, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл., потым у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў в. Параф'янава, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны служыў на Міншчыне. Закатаваны фашыстамі ў 1942. На працягу ліп. — жн. 1942 немцы расстралялі 6 святароў з амаль 50 арыштаваных. Ёсць меркаванне, што святары

загінулі з-за «польскасці», за выкарыстанне ў набажэнствах выраза «Каралева Кароны Польскай» і за парушэнне забароны аб звоне.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**ГАБУЛЬ Саламея Юзафаўна** [1872, Віцебск — ?], хатняя гаспадыня, парафіянка касцёла св. Казіміра ў Ленінградзе. Арыштавана 8.5.1931 па справе «С. *Войны* і інш.». Асуджана 7.3.1932 калегіяй АДПУ да 3 гадоў ссылкі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ГАГАЛІНСКІ Юзаф** [1894—1944 (?), Нясвіж, цяпер райцэнтр Мінскай вобл.], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1922). У 1924—28 пробашч касцёла св. Ганны ў в. Пузічы Салігорскага р-на. У 1926—33 абслугоўваў касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Сейлавічы, цяпер Нясвіжскі р-н. З 1929 пробашч касцёла св. Юзафа ў мяст. Гарадзея Нясвіжскага пав., цяпер таго ж р-на. Расстраляны фашыстамі.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ГАДЛЕЎСКІ Вінцэнт** [Вікенцій Іванавіч; 16.11(або 12).1888, мяст. Поразава Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. — 24.12.1942, Трасцянец пад Мінскам], святар, публіцыст, перакладчык, выдавец, педагог. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1912), Магілёўскую духоўную акадэмію ў Петраградзе (1916). Прыняў сакрамэнт святарства (3.6.1914). Служыў вікарыем катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. Удзельнік 1-га Усебеларускага кангрэса 1917. У 1918 уваходзіў у склад Рады БНР. Адзін з заснавальнікаў і лідэраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Рэдагаваў газ. «Kryniсa» (Мінск, 1918). Выкладаў у Нясвіжскай беларускай семінарыі. З 1924 пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Рудзішкі, цяпер Літва. За актыўную нацыянальна-паліт. дзейнасць арыштаваны польскімі ўладамі 25.6.1925 (зняволены

ў віленскай турме Лукішкі) і 30.9.1925. Асуджаны 1.3.1926 да 2 гадоў пазбаўлення волі (тэрмін заменены штрафам). Зноў арыштаваны ў сак. 1927. Прыгавораны да 2 гадоў зняволення, якія адбыў у Макатоўскай турме ў Варшаве. З 1928 жыў у Вільні, быў капеланам у шпіталі і прэфектам у школе пры кляштары бернардынак. Адзін з заснавальнікаў Беларускага каталіцкага выдавецтва. Пераклаў на бел. мову Новы Запавет (выдадзены ў Вільні ў 1939). У 1936 выйшаў з БХД, заснаваў арганізацыю «Беларускі нацыянальны фронт». Да 1939 выдаваў газ. «Беларускі фронт», у якой выступаў як публіцыст. З пачаткам 2-й сусветнай вайны пераехаў у Каўнас, у 1940 у Варшаву, дзе арганізаваў легальны «Беларускі нацыянальны фронт» як прыкрыццё падпольных антыфашысцкіх структур. Заснавальнік Беларускай незалежнай партыі. У чэрв. 1941 увайшоў у склад створанага ў Берліне Беларускага нацыянальнага цэнтра. Са жн. 1941 у Мінску. Галоўны школьны інспектар пры Генеральным камісарыяце Беларусі, сябра галоўнай рады Беларускай народнай самапомачы, таксама выконваў абавязкі святара. Ініцыяваў стварэнне падпольнай арганізацыі «Беларускі цэнтральны фронт». Спрабаваў выкарыстаць супрацоўніцтва з немцамі для мабілізацыі бел. патрыятычных сіл. Арыштаваны немцамі 24.12.1942. Расстраляны.

Тв.: Публіцыстыка: Патрэба нацыянальнай ідэі // *Спадчына*. 1993, № 2.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Брылеўскі У.* Мае сустрэчы з ксяндзом Вінцэнтам Гадлеўскім // *Беларус* (Нью-Йорк). 1980. № 273; *З[алескі ?]. А.* Ксёндз Гадлеўскі на фоне гістарычных падзеяў // *Бацькаўшчына*. 1965. № 5; *Пануцэвіч В.* Кс. Вінцэсь Гадлеўскі — дзяржаўны муж і правадыр народу // *Беларуская царква* (Чыкага). 1965, № 28 (перадрук: *Спадчына.* 1993. № 3, 5—6); *Пякарскі А*. Сумная гадавіна (Да дзесятай гадавіны арышту і расстрэлу ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага) // *Бацькаўшчына* (Мюнхен). 1952. 25 снеж.; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Процька Т.*. Касцёл у часе II сусветнай вайны // *Наша*

*вера*. 1995. № 1; *ЭГБ*, т. 2; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ГАЙДУК Аляксандр Якаўлевіч** [26.9.1872, Сумялішская вол. Трокскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 1920, Мінск (?), турма ЧК], святар. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1899). З 1904 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Новы Двор, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл., потым у філіяльным касцёле св. Юзафа і св. Антонія Падуанскага ў в. Боцькі Бельскага дэканата, цяпер Польшча. З 1912 адміністратар касцёла Маці Божай Ружанцовай ў мяст. Пескі Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 5.9.1920. Асуджаны тройкай асобага аддзела 15-й арміі 25.9.1920 за «шпіянаж на карысць Польшчы» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны трыбуналам БВА 31.7.1992. Асабовая справа Г. № 34473-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ, ІКБР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

**ГАЙЛЕВІЧ Юзаф Казіміравіч** [26.2.1893, в. Дразды Свянцянскага ці Вілейскага пав. Віленскай губ. — 18.10.1971, Латвія], рэлігійны, грамадскі і культурны дзеяч, педагог. З бел. каталіцкай сям'і. У 1913 паступіў у Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. З-за падзей у Расіі 1917—18 вымушаны перапыніць вучобу. Заняткі прадоўжыў у Мінскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (29.2.1920). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1921 адміністратар парафіі ў мяст. Бальбінава, цяпер

Латвія. У 1934 служыў у касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Рэзекне, Латвія. З 1935 у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Дзвінску (Даўгаўпілс), Латвія, адначасова працаваў катэхетам у бел. школах. Прымаў удзел у культурным і грамадскім жыцці беларусаў Латвіі. Выступаў з казаннямі на бел. мове. Пераследаваўся латышскімі ўладамі. Абвінавачваўся ў планах далучыць Латгалію да Польшчы. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў у адноўленым вернікамі касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Росіца, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. З 1943 зноў у Бальбінаве. Арыштаваны органамі МДБ 10.9.1949. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны 8.4.1950 да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны 4.6.1950 у Мінеральны лагер МДБ Комі АССР. 5.1.1956 пераведзены ў Дубраўны лагер МДБ Мардоўскай АССР. Вызвалены 22.6(ці 24.10).1956. Служыў у касцёле ў мяст. Рундак (Латвія). З 1959 зноў у Бальбінаве, потым у касцёле ў в. Індра, Латвія.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ГАЙЛЮШ Дамінік Ксавер'евіч** [1887, в. Гадуцішкі Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 7.5.1953, ГУЛАГ], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню доктара тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). У 1911—13 вікарый парафіі св. Рафала Арханёла ў Вільні. У 1915 у касцёле Усіх Святых у

Вільні. З 1917 у Віленскім ун-це імя Стэфана Баторыя. З 1928 служыў у касцёле Найсвяцейшага імя Марыі ў в. Жэша, Літва, парафіі св. Міхала Арханёла ў в. Рукойні Тургельскага дэканата, цяпер Літва. З 1932 пробашч і дэкан касцёла Усіх Святых у мяст. Свянцяны аднайменнага дэканата, цяпер Літва. З 1937 пробашч і дэкан касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Беняконі аднайменнага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 8.6.1951. Зняволены ў Гродзенскай турме МДБ. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны Гродзенскім абл. судом 10.11.1951 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны, верагодна, у Тайшэцкі лагер МДБ Іркуцкай вобл. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 25.9.1992 Гродзенскім абл. судом. Асабовая справа Г. № п-14936 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ГАНЦЭВІЧ Іван-Мамерт Станіслававіч** [1885, Вільня, цяпер Вільнюс, Літва — ?], кантар. З сям'і службоўца. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Да арышту служыў у парафіі Сутна (*Sutno*) Семятыцкага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 12.12.1940. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны 12.5.1941 з парафіянамі **Куляўчуком Станіславам Іванавічам** (н. у 1914) і **Янкоўскім Антонам Казіміравічам** (1902) да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Каргапольскі лагер НКВД Архангельскай вобл. Куляўчук С. і Янкоўскі А. этапаваны ў Паўночна-ўсходні лагер НКВД Хабараўскага краю. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Брэсцкай вобл.

15.8.1989. Групавая справа Г. і інш. № 9789-с з фотаздымкамі захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

**ГАРАДЗЕНСКІ Юзаф Міхайлавіч** [25.12.1910, в. Пратасы (*Protasy*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 19.6.2002, Семятычы (*Siemiatycze*), Польшча], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Беластоцкую настаўніцкую семінарыю (1931), Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (27.3.1937). Прызначаны катэхетам біскупскай гімназіі пры касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Драгічын (*Drohiczyn)* Бельска-Падляшскага пав. Драгічынскага дэканата, Польшча. Потым прэфект гімназіі Р. Траўгута, СШ і пачатковых школ у Брэсце. З верас. 1939 вікарый парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Брэсце. З 31.10.1942 пробашч, з 1948 пробашч і дэкан касцёла Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны 2.8.1948 у парку пры кобрынскім касцёле. Зняволены ў Брэсцкай турме МДБ. Асуджаны 13.9.1948 судовай калегіяй па крымінальных справах Брэсцкай вобл. за «антысавецкую агітацыю» і «шпіянаж» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны 8.12.1948 у Варкуцінскі лагер МДБ Комі АССР (у 1948 каля 63 000 зняволеных). Праводзіў патаемныя набажэнствы. Вызвалены 29.4.1955. Вярнуўся ў Кобрын. Дзякуючы намаганням вернікаў 25.5.1955 зарэгістраваны на старым месцы службы ў Кобрынскім касцёле. Зноў арыштаваны 17.3.1958. Абвінавачваўся ў нелегальнай пастырскай службе на кватэрах грамадзян. 26.5.1958 Брэсцкім абл. судом прыгавораны да 5 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў Дубраўны лагер МДБ Мардоўскай АССР (пас. Явас). 12.8(ці 9).1959 пераведзены ў Брэст, 12.10.1959 — у лагер у Ловічы (*Łowicz*), Польшча. Неўзабаве вызвалены. З 1960 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ і св. Станіслава ў мяст. Нараў (*Narew*), Польшча. З 1968 пробашч і дэкан парафіі ў Семятычах.

Ганаровы канонік і ганаровы папскі прэлат. З 1987 на пенсіі. Рэабілітаваны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Жертвы политического террора в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Жертвы политического террора в СССР.*

**ГАРАНСКІ Фелікс Міхайлавіч** [1871, в. Рукшаніцы Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер тэрыторыя Ушацкага р-на Віцебскай вобл. (вёска не існуе). — ?], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. Да арышту служыў у касцёле св. Казіміра і Рафала ў Бешанковічах, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 19.5.1929. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны 19.6.1929 асобай нарадай пры АДПУ да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Далейшы лёс невядомы.

З Г. па адной справе (захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.) асуджаны за тое ж «злачынства», высланы і рэабілітаваны (10.4.1992 пракуратурай Віцебскай вобл.), верагодна, яго жонка **Гаранская Стэфанія Сігізмундаўна** (н. у 1879), дачка **Гаранская Алена Феліксаўна** (1909), арганіст касцёла Ф. *Панцарны,* парафіяне рэжысёр драматычнага гуртка ў Бешаковічах **Пазняк Канстанцін Юльянавіч** (1884), настаўніца **Пазняк Людміла Мікалаеўна**[1] (1898) і шэраг інш.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

**ГАРМАНОЎСКІ (ГЕРМАНОЎСКІ) Антоні** [8.12.1904 — ?], святар. На 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны як капелан 28.4.1939 у 81-ы Гродзенскі пяхотны полк. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

---

[1] Падрабязней гл.: Рэпрэсаваныя…

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ГАРОДКА Стэфан Антонавіч** [студз. 1892, в. Эйшышкі Віленскага пав. — 5.5.1961], святар. Са шматдзетнай сялянскай сям'і. Скончыў Адэскае рэальнае вучылішча імя св. Апосталаў Пятра і Паўла (1904), Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1918). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Забалаць Лідскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1921 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Сабакінцы таго ж дэканата, з 1954 в. Першамайская Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. З 1924 каля 28 гадоў служыў у касцёле св. Міхала Арханёла ў Белагрудзе Лідскага пав. і дэканата, цяпер вёска Лідскага р-на Гродзенскай вобл, дэканам. Арыштаваны 1.2.1952. Асуджаны Гродзенскім абл. судом за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Варкуцінскі лагер МДБ Архангельскай вобл. і Комі АССР. 21.2.1955 тэрмін скарочаны да 10 гадоў і ў кастр. 1955 вызвалены датэрмінова пастановай Вярхоўнага Савета СССР. 8.5.1956 зноў зарэгістраваны пробашчам касцёла ў Белагрудзе. Рэабілітаваны 7.5.1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 39; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ГАЦ (ГАЦА) Пётр (Уладзіслаў) Іванавіч** [18.12.1907, мяст. Казенец (*Kozieniec*), цяпер Польшча — 1941 (?), Мінск, турма НКВД], законнік. З польскай сялянскай сям'і. Склаў першыя законныя шлюбы (1925). Вучыўся ў Галандыі і Францыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1933, Нант, Францыя). У 1930-я г. гвардыян кляштара ў Ломжы (*Łomża*), Польшча. Арыштаваны 23(ці 25).5.1940 з капуцынам **Францам**

**Марцінкоўскім.** Асуджаны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 3.2.1941 як «актыўны ўдзельнік контррэвалюцыйнай паўстанцкай арганізацыі «Польская армія вызвалення» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.12.1992 заключэннем аддзела рэабілітацыі Галоўнага ўпраўлення па нагляду выканання закона Узброеных Сіл СССР. Асабовая справа Г. № 35174-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ГАШЫНСКІ Леанард Антонавіч** [1867, в. Хатаевічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай вобл. — 12.10.1937, Харкаў, турма НКВД], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1893). Прызначаны капеланам арцыбіскупа **С. М. Казлоўскага**. З 1897 катэхет мужчынскай і жаночай гімназій у Мінску. У 1900—02 служыў у касцёле Найсвяцейшай Тройцы (св. Роха). З 1902 адміністратар касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Кранштаце Санкт-Пецярбургскай губ., вайсковы капелан, катэхет Ваенна-марскога інжынернага вучылішча, Ваенна-марской фельчарскай школы, рэальнага вучылішча, мужчынскай і жаночай гімназій. Узнагароджаны ордэнам св. Станіслава 3-й ступені, Залатым Крыжам і знакам «За барацьбу з чумой». З 1920 пробашч касцёла св. Казіміра ў Магілёве. Арыштаваны 3.1.1921. Абвінавачваўся ў «шпіянажы». Вызвалены праз месяц за недастатковасцю доказаў. З 1922 пробашч парафіі св. Мікалая ў г. Луга, цяпер Ленінградскай вобл. З 1928 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у Харкаве, Украіна. У 1935—36 праходзіў па групавой справе каталіцкага духавенства Украіны. Зноў арыштаваны 12.8.1937 у Харкаве па адрасе: вул. Сяргееўская, д. 5, кв. 1. Абвінавачваўся ў «шпіёнскай дзейнасці на карысць буржуазнай Польшчы» і ў «правядзенні антысавецкай

агітацыі». Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 24.9.1937 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.8.1958.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Жертвы политического террора в СССР*.

**ГЕДГАЎТ Антоні** [1878—7.7.1947, в. Невадніца (*Niewodnica*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1908). Прызначаны вікарыем парафіі Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. У 1914 адміністратар касцёла св. Тадэвуша ў в. Вішнева Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1915 адміністратар парафіі Перамянення Пана ў в. Германавічы, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл., пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Рудзішкі Троцкага дэканата, цяпер Літва. Арыштаваны ЧК у 1920. Пасля шасці месяцаў зняволення вярнуўся ў Рудзішкі. У 1924 пераведзены ў касцёл Маці Божай Ружанцовай у в. Дзевянішкі, цяпер Літва. З 1936 пробашч парафіі св. Барталамея ў в. Ротніца Гродзенскага пав. і дэканата, цяпер Літва. Пазней служыў у касцёле св. Антонія ў в. Невадніца (*Nievodnica*), Польшча, дзе і памёр.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ГЕЛЬМЕР Баляслаў Янавіч** [22.1.1897, мяст. Ружаны Пружанскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. — 28.12.1969], святар. З сям'і цесляра польскага паходжання. У 1914—20 працаваў рабочым на Віленскай мэблевай фабрыцы. У 1923 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю, адначасова наведваў Віленскі ун-т імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1929). Прызначаны вікарыем парафіі св. Юзафа ў в. Быцень Слонімскага пав. і дэканата, цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1934 пробашч касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Пескі Ваўкавыскага пав. і дэканата, цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 у парафіі НПМ Анёльскай у в. Даўнары (*Downary*), Польшча. З 1939 капелан Войска Польскага ў Асаўцы, Польшча. У 1943 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Масаляны, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. Некаторы час жыў у Вільні. У 1944 служыў у касцёле Звеставання НПМ у мяст. Гудагай, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. З 1945 у парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Жупраны, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 6.3.1951. Асуджаны 14.6.1951 за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППЛ. Вызвалены ў 1954. Па хадайніцтве Жупранскай рэлігійнай абшчыны католікаў Ашмянскага р-на 3.3.1956 зноў зарэгістраваны настаяцелем жупранскага касцёла. Рэабілітаваны 25.9.1992 Гродзенскім абл. судом. Асабовая справа Г. № п-14940 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; БНДЦЭД; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 23—24; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ГЕРМАНОВІЧ Язэп Станіслававіч** [псеўданімы: Вінцук Адважны, Лявон Ветрагон, Хлопчык з-пад Горадні; крыптанімы: А.В., В.Адв., A.W., W.A. Unuk Wincuk; 4.3.1890, мяст. Гальшаны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гро-

дзенскай вобл. — 28.12.1979, Лондан], каталіцкі святар усх. абраду, марыянін, паэт, публіцыст, перакладчык, грамадскі дзеяч. З бел. рамесніцкай сям'і. Вучыўся ў Гальшанскай пачатковай і Ашмянскай гарадской школах. Прыняў танзуру і ніжэйшае свячэнне (1911). Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1913). Прыняў сакрамэнт святарства (29.6.1913). Прызначаны вікарыем парафіі св. Лаўрэнція ў в. Далістаў (*Dolistów*) Беластоцкага дэканата, цяпер Польшча. Далей вікарый, потым пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Мсцібава Ваўкавыскага пав. і дэканата, цяпер Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. З 1918 адміністратар парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Лапеніца (Вялікая Лапеніца) таго ж пав. і дэканата. З 1921 (?) у касцёле св. Міхала Арханёла ў в. Луконіца Слонімскага пав. і дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл., парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Лужкі Дзісенскага пав. Глыбоцкага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. Уступіў у Таварыства беларускай школы (1921). Арганізаваў адну з бел. школ. Казанні гаварыў на бел. мове, што выклікала незадаволенасць іерархаў. Вымушаны пераехаць у мястэчка Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., дзе 7.8.1924 уступіў у ордэн айцоў марыянаў. Склаў першыя (15.8.1925) і вечныя (12.7.1927) законныя шлюбы. Служыў пробашчам, катэхет мясцовай гімназіі. Празаічныя і паэтычныя творы святара рэгулярна з'яўляліся на старонках перыядычнага друку («Krynica», «Chryścijanskaja Dumka»). У 1931 перайшоў ва ўсходні абрад. З траўня 1932 на місіянерскай рабоце ў г. Харбін, цяпер Кітай, дзе працаваў дырэктарам гімназіі. У канцы 1935 вярнуўся з Харбіна ў Вільню, кіраваў Беларускім марыянскім домам студэнтаў. У 1938 дэпартаваны са студэнтамі ў Цэнтральную Польшчу. У 1939 зноў выехаў у Харбін. Узначаліў ліцэй св. Мікалая. 22.12.1948 арыштаваны (з іншымі святарамі) кітайскай паліцыяй, перададзены савецкім органам бяспекі. Перавезены ў турму НКВД у Чыце, Расія. Асуджаны 28.9.1949 завочна асобай нарадай у Маскве за «антысавецкую агітацыю» і «шпіянаж на карысць Ваты-

кана» да 25 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Тайшэцкі лагер НКВД Іркуцкай вобл. У студз. 1950 пераведзены ў суседні Брацкі лагер. Таемна выконваў святарскія абавязкі. Вызвалены ў ліст. 1954 па амністыі. 27.4.1955 выехаў у Польшчу. 6.10.1956 прызначаны кіраўніком законнага дома ў Грудзёндзы (*Grudziądz*). 28.8.1957 прызначаны духоўным айцом і спавядальнікам клерыкаў-марыянаў ва Улацлаўку (*Włocławek*), Польшча. З 10.3.1959 капелан сясцёр уршулянак у Хілічках (*Chiliczki*). 23.11.1959 выехаў у Рым, 23.2.1960 у Лондан. Удзельнічаў у бел. рэлігійным і культурным жыцці эміграцыі. У 1962—66 дырэктар школы імя св. Кірылы Тураўскага пры асяродку айцоў марыянаў у Лондане. Пра сваё знаходжанне ў лагерах напісаў успаміны «Кітай — Сібір — Масква». Жывыя, яскрава выкладзеныя сведчанні чалавека, які прайшоў праз ГУЛАГ, выклікалі вялікую цікавасць, друкаваліся на бел., італьянскай, польскай, літоўскай і іншых мовах. У эміграцыі рэдагаваў час. «Божым шляхам» (Лондан).

Тв.: *А.В.* Унія на Палессі: Вершаваная дыскусія уніята, праваслаўнага манаха і р.-к. ксяндза. Альбярцін, 1932; *W.A.* Biełaruskija Cymbały (Zbornik wierŝau). Wilnia, 1933; Chłapiec: Powieść. Wilnia, 1935; Na Daloki Uschod. Wilnia, 1937 (пад сваім прозвішчам); *Адважны Вінцук*. Кітай — Сібір — Масква. Мюнхен, 1962.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Ласкоў І.* Шлях пакутніка: Па старонках адной малавядомай кнігі // *Літаратура і мастацтва.* 1990. 9 лют.; *Сачанка Б.* Сняцца сны... С. 12—14; *Станкевіч А.* Аб жыцці і творчасці В.А. (Вінцука Адважнага) // *W.A.* Biełaruskija Cymbały. Wilnia, 1933; *Юрэвіч Л.* Літаратурная спадчына: новы погляд // *Беларус* (Нью-Йорк). 1997. Жнівень; *БП*, т. 1; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; ЭГБ*, т. 1; *БЭ*, т. 1; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**ГЖЭБАЛА Уладзіслаў** [7.12.1889 — ?], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Петраградзе. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). Служыў вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Мсціславе Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў верас. 1939, але з-за перапаўнення турэмнай камеры зняволенымі выстаўлены з яе наглядчыкам. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ГЖЭГОРСКІ Уладзіслаў Міхайлавіч** [10.6.1901, Вестфалія, Германія — 19.8.1977], святар. З польскай сям'і. Уступіў у Кангрэгацыю місіянераў св. Сям'і (1914), накіраваны на навіцыят у Галандыю. У 1919 выехаў у Польшчу. Скончыў Люблінскі місіянерскі інстытут. Прыняў сакрамэнт святарства (1928). Служыў вікарыем касцёла св. Міхала Арханёла ў Ашмянах Віленскага ваяв., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1929 у парафіі св. Юрыя ў мяст. Янаў (*Janów*) Беластоцкага дэканата, Польшча. З 1931 адміністратар касцёла Перамянення Пана ў в. Спас Вілейскага дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1935 у парафіі св. Юрыя ў в. Весялуха Надвілейскага дэканата, існавала да 1977 у Мядзельскім р-не Мінскай вобл. З вясны 1938 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Лапеніца (Вялікая Лапеніца) Ваўкавыскага пав. і дэканата, цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны НКВД у 1940. Этапаваны ў Карагандзінскі лагер НКВД Казахскай ССР. У маі 1942 знаходзіўся ў адным з узбекскіх лагераў НКВД. Вызвалены ў 1943 падчас фармавання 1-й арміі Людовага Войска Польскага генерала З. Берлінга. З 22.7.1944 вайсковы капелан. У ліст. 1945 дэмабілізаваны. Служыў вікарыем парафіі ў мяст. Грылева (*Grylewo*), Польшча. З 1946 адміністратар касцёла ў мяст. Вянглева (*Węglewo*). З 1947 у мяст. Врончын (*Wronczyn*) Гнезненскай дыяцэзіі. З 1952 пробашч парафіі Жарнікі (*Żerniki*), Польшча. З 1.5.1972 на пенсіі.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ГЖЭСЯК Тадэвуш** [1.10.1901, Бярдзічаў, цяпер Жытомірская вобл., Украіна — 13.7.1942, Баранавічы, цяпер Брэсцкай вобл.], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1926). З 1936 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Клецку Нясвіжскага пав. Навагрódскага ваяв., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны знаходзіўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны гестапа за дапамогу яўрэям. Зняволены ў Баранавіцкай турме. Расстраляны. Пахаваны на праваслаўных могілках.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ГЖЭШЧУК Мечыслаў Лявонавіч** [1919, в. Нур (*Nur*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 30.3.1942, ГУЛАГ], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Да арышту служыў у касцёле ў роднай вёсцы. Арыштаваны 17.2.1940. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 19.10.1940 за «правядзенне антысавецкай агітацыі» і «ўдзел у нацыяналістычнай арганізацыі» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Краснаярскі лагер НКВД. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны пракуратурай Гродзенскай вобл. 21.9.1989.

З Г. па адной справе (№ п-12348; захоўваецца з фотаздымкам у архіве УКДБ Гродзенскай вобл.) асуджаны 40 парафіянаў, у асноўным сялян-аднаасобнікаў. Большасць з іх этапаваны ў Архангельскі, Ухта-Пячорскі, Нарыльскі і

іншыя паўночныя лагеры НКВД і ў жн.-ліст. 1941 вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**ГІБОЎСКІ Андрэй Іванавіч** [1890, в. Вялікія Цэслі, цяпер Познанскае ваяв., Польша — ?], актыўны парафіянін. З польскай сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Да арышту стараста касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Баранавічах Брэсцкай вобл. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 26.9.1944. Асуджаны 28.7.1945 асобай нарадай пры НКВД за «супрацоўніцтва з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі і антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 18.2.1993 пракуратурай Брэсцкай вобл. Асабовая справа Г. № 11466-с захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ГІРКАНТ Апалонія Іванаўна** [1880, Мінск (паводле інш. звестак, в. Рылаўшчына Мінскага пав.) — пасля 1935], свецкі каталіцкі дзеяч, педагог. Скончыла жаночую гімнанію ў Пецярбургу. З 1900 працавала хатняй настаўніцай. З 1917 удзельнічала ў бел. нацыянальным руху. Спрычынілася да арганізацыі ў Мінску першых школ з бел. мовай навучання. З 1918 выконвала абавязкі дырэктара школы ў Мінску, дзе праводзіла катэхізацыю дзяцей на бел. мове. Уваходзіла ў бел. рэлігійную арганізацыю «Хрысціянская дэмакратычная злучнасць», дзе супрацоўнічала з ксяндзамі Ф. *Абрантовічам* і А. *Цікотам*. Была членам Рады БНР, Часовага беларускага нацыянальнага камітэта. Вучылася ў Мінскім педагагічным інстытуце, у Беларускім дзяржаўным ун-це, які скончыла, верагодна, у другой палове 1920-х. Была знаёмая з **Я. Купалам**. У 1923—26 працягвала дзейнасць па беларусізацыі Каталіцкага Касцёла ў БССР, заяўляла аб

неабходнасці прызначэння біскупа ў Мінск, прапаноўвала на гэту пасаду Ф. *Абрантовіча* і А. *Станкевіча*. Падчас першага арышту працавала настаўніцай у школе в. Бялынкавічы Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. Арыштавана 26.3.1931. Абвінавачвалася ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці», але 26.7.1931 вызвалена. Выкладала ў школе пры Мінскай лямцавай фабрыцы. Зноў арыштавана 11.8.1933 у Мінску па адрасе: Стаўпецкі зав., д. 6. Праходзіла па адной справе з пробашчам мінскага архікатэдральнага касцёла НПМ Адамам *Пучкаром-Хмялеўскім*, арганістам касцёла Мікалаем *Партасёнкам* і парафіянамі. Асуджана калегіяй АДПУ 19.12.1933 як «член ПАВ» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Вызвалена 10.3.1935. Далейшы лёс невядомы.

З Г. па першай групавой справе (№ 9782; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) праходзілі, асуджаны і рэабілітаваны (26.4.1989) настаўнікі[1]: кінамеханік **Валадкевіч Юры Міхайлавіч** (1908), навучэнец **Папурэнка Цімафей Фаміч** (1913), рамізнік **Солтан Аляксандр Аляксандравіч** (1905), рахункавод **Чайкін Данііл Фокіч** (1898), **Архіпаў Мікалай Дзмітрыевіч** (н. у 1892), **Бурдзілаў Васіль Прохаравіч** (1886), **Дзянішчык Астап Іванавіч** (1888), **Лукашэнка Аляксандр Фядосавіч** (1886), **Маісеенка Фама Андрэевіч** (1892), **Пудоў Ілля Савіч** (1893), **Саўчык Іван Фёдаравіч** (1891), **Шулякоўскі Аляксандр Андрэевіч** (1900). Далейшы іх лёс невядомы.

З Г. па другой групавой справе (№ 9939-с; захоўваецца з фотаздымкам у архіве КДБ Беларусі) праходзілі, асуджаны і рэабілітаваны (30.10.1956) парафіяне: тэхнік-будаўнік Белдзяржбуда **Чаховіч Франц Мацвеевіч** (н. у 1877), яго дачка, сакратарка Мінскага фінансава-эканамічнага тэхнікума **Акуліч-Чаховіч Станіслава Францаўна** (1904), настройшчык музычных інструментаў **Багіна Канстанцін Станіслававіч** (1872), старшы майстар бондарнага цэха мінскай арцелі «Ударнік» **Брэйва Вітольд Канстанцінавіч** (1906), рабочы

[1] Падрабязней гл.: Рэпрэсаваныя…

мінскай ЦЭЦ **Васілёнак Карл Міхайлавіч** (1913), электраманцёр завода імя Мяснікова **Душкевіч Іван Норбертавіч** (1905), хатняя гаспадыня **Камоцкая-Жаўток Станіслава Сямёнаўна** (1902), муляр Мінскага гарадскога жыллёвага саюза **Карчашка Стэфан Стэфанавіч** (1906), памочнік упаўнаважанага мінскага оператрада ГУМ **Касцюк Ілля Пятровіч** (1896), лакіроўшчык трэста «ГУПС» **Лукашэвіч Антон Францавіч** (1882), рабочая мінскага санэвакапрыёмніка **Мурашка Эмілія Рычардаўна** (1902), слесар-вадаправодчык мінскай канторы «Спецсантэхбуда» **Нагорны Адольф Пятровіч** (1871), яго дачка сакратар-машыністка Белпрамбудтрэста **Нагорная Зеферына Адольфаўна** (1908), беспрацоўны **Няміра Станіслаў Баляслававіч** (1908), навучэнцы Мінскага музычнага тэхнікума **Кавалеўскі Гаўрыіл Адамавіч** (1910), **Срэбаловіч-Соўкіна-Мікалаева Рэгіна Чаславаўна** (1903) бондар Дзяржгандальтары **Ясель-Ясень Пётр Міхайлавіч** (1902), **Сяўрук Браніслаў Зянонавіч** (1911). Далейшы іх лёс таксама невядомы.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ГІРСКІ** [? — 1937 (?), НКВД], святар. Верагодна, з украінскай сялянскай сям'і. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (Львоў?). Служыў у касцёле Нараджэння НПМ у мяст. Заслаўе Мінскага дэканата, з 1938 г. п. Мінскага р-на. З 1933 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. Арыштаваны ў чэрв. 1937. Паводле некаторых звестак, праходзіў па «справе ксяндза Пятра *Аўгло* і інш.». Асуджаны тройкай НКВД 25.8.1937 да ВМП (?).

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ГЛАВАЧ Уладзіслаў-Грацыян** [1.1.1915, в. Пшэцішова (*Przeciszowa*), Польшча — 1942 (?)], святар. Уступіў у ордэн

кармелітаў (1932). Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (9.7.1939). Прызначаны вікарыем у Вільню. 2.11.1941 выехаў на службу ў Зах. Беларусь. Паводле некаторых звестак, арыштаваны немцамі і этапаваны ў лагеры Шалтуп і Панявежык. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Praśkiewicz S. Wierni Chrystusowi i Kościołowi.*

**ГЛЯБОВІЧ Генрык** [1904, Гродна — 9.11.1941], святар, педагог, благаслаўлёны. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1927). У Люблінскім каталіцкім ун-це абараніў ступень доктара тэалогіі (1927), ва ун-це ў Рыме — доктара філасофіі (1929). З 1930 прафесар, выкладчык фундаментальнай тэалогіі Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. З 1936 пробашч парафіі Звеставання НПМ у мяст. Новыя Трокі аднайменнага дэканата, цяпер Тракай, Літва. З 1939 прэфект жаночай гімназіі ў Рабцы, Польшча. З верас. 1939 у Вільні. Зрабіў істотны ўнёсак у справу падрыхтоўкі кадраў Віленскага гарнізона. З доктарам **Дабжаньскім** выдаваў падпольны штомесячнік «Jutro Polski» («Заўтра Польшчы»), які выходзіў накладам 300—500 асобнікаў. Супрацоўнічаў з падпольнай арганізацыяй «Народная акцыя». Пасля 20.9.1941 па просьбе арцыбіскупа Р. *Ялбжыкоўскага* выехаў з некаторымі іншымі святарамі (беларусамі Станіславам *Глякоўскім,* **Дзянісам Мальцам,** Казімірам *Рыбалтоўскім* і палякамі **Вітольдам Рорухам,** Антонам *Святаполкам-Мірскім*) з кананічнай місіяй на акупаваную тэрыторыю БССР. Служыў пробашчам у касцёлах св. Дамініка ў в. Хатаевічы, цяпер в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай вобл., Унебаўзяцця НПМ у в. Корань, св. Міхала Арханёла ў в. Акалова таго ж р-на. Увосень 1941 арыштаваны гестапа і расстраляны як польскі агент у лесе каля Барысава. Беатыфікаваны Папам Янам Паўлам ІІ 13.6.1999 у групе 108 Мучанікаў.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Рэпрэс-*

*сированная вера*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Żurek W. Salezjańscy tęczennicy Wschodu.*

**ГЛЯКОЎСКІ Станіслаў** [псеўданімы: Stasiuk z-nad Niemna; Stasila; 2.3.1896, мяст. Поразава Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. — снеж. 1941, Мінск], святар, педагог, рэдактар, выдавец, публіцыст. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў гарадское вучылішча ў Ваўкавыску Гродзенскай губ. (1913), Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (Вільня, 29.5.1921). З 1923 вучыўся ў Пантыфікальным інстытуце, Грыгарыянскім ун-це ў Рыме. Доктар тэалогіі (1927). У тым жа годзе прызначаны вікарыем касцёла св. Вацлава ў Ваўкавыску аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1928 катэхет Віленскай беларускай гімназіі. У 1929 у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Трычуўка (*Tryczówka*), Польшча. З 1933 вікарый парафіі св. Яна Хрысціцеля і Яна Евангеліста ў Вільні. Член Беларускага навуковага таварыства і Беларускага каталіцкага выдавецтва. Выдаваў для дзяцей час. «Пралескі». Публікаваўся ў газ. «Беларуская крыніца», час. «25 Сакавіка» і інш. Садзейнічаў беларусізацыі касцёльнага жыцця, клапаціўся аб развіцці бел. культуры. Пасля 20.9.1941 па просьбе арцыбіскупа Р. *Ялбжыкоўскага* выехаў з некаторымі іншымі святарамі (беларусамі Генрыкам *Глябовічам,* **Дзянісам Мальцам,** Казімірам *Рыбалтоўскім* і палякамі **Вітольдам Рорухам,** Антонам *Святаполкам-Мірскім*) з кананічнай місіяй на акупаваную тэрыторыю БССР. З лістом Віленскага Беларускага Камітэта за подпісам прафесара Вацлава Іваноўскага (гл.: *Маракоў, Рэпрэсаваныя…*) ён меў заданне ўзяць пад апякунства і духоўнае абслугоўванне мясцовых католікаў. Служыў у касцёле св. Сымона і Алены ў Мінску. Арыштаваны 15.12.1941 нямецкай тайнай паліцыяй бяспекі і СД падчас канферэнцыі бел. школьных інспектараў. Расстраляны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis. 1928;Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Берасцень С.* Ксёндз Глякоўскі // Літаратура і мастацтва. 1992. 8 мая; Наша вера (Мінск). 1996. № 4; *ЭГБ*, т. 3; *Garbińsky, Turonak,* Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**ГОЙ Ян** [2.8.1898, в. Клешнякі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. — 1950, ГУЛАГ], святар. Вучыўся ігры на аргане і касцёльным спевам. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Пасля 1-й сусветнай вайны паступіў у Лідскую гімназію, дзе за два гады скончыў 4 класы. З 1921 вучыўся на гімназіяльных курсах духоўнай семінарыі ў Вільні. У 1925—26 пасля здачы экзамену на сталасць вывучаў тэалогію і філасофію. Прыняў сакрамэнт святарства (4.4.1931). Прызначаны рэктарам і катэхетам касцёла св. Андрэя Баболі ў в. Баболева (паміж Дзіснай і Лявонпалем) Мёрскага дэканата. З 2.11.1931 вікарый фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. 18.8.1933 прызначаны вікарыем касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Карыцін (*Korycin*)аднайменнага дэканата, Польшча. З 7.3.1934 (?) у парафіі св. Юрыя ў мяст. Янаў (*Janów*) Беластоцкага і Сакольскага пав. Карыцінскага дэканата. Са студз. 1935 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ і св. Андрэя Баболі ў в. Казловічы Гродзенскага дэканата, цяпер в. Житомля (Жыдомля) Гродзенскага р-на. З 10.5.1937 у парафіі св. Анёлаў-Ахоўнікаў у в. Раготна Слонімскага пав. Дзятлаўскага дэканата, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны НКВД 22.10.1939. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Знаходзіўся пад следствам у турмах НКВД у Слоніме, Баранавічах, Мінску. Асуджаны да ППЛ (тэрмін невядомы). Этапаваны ўлетку 1941, верагодна, у Карагандзінскі лагер НКВД Казахскай ССР. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Hlebowicz,*

*Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ГОЛЯК Валяр'ян Антонавіч** [2(ці 9).12.1881, в. Дашкі Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — 13.5.1948, Вілейка Мінскай вобл.], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства з рук біскупа Э. *Ропа* (1905). Прызначаны вікарыем касцёла св. Біскупа Мікалая ў мяст. Свір аднайменнага дэканата, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. У 1907 пераведзены пробашчам у парафію ў в. Кашадары Ковенскага пав., цяпер Літва. З 1909 пробашч касцёла св. Юрыя ў мяст. Свіранкі Варанянскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. У 1920 зноў у парафіі Свір. З 1928 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў Ашмянах аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл., пазней дэкан парафіі. Арыштаваны 24.4.1948. Адразу пасля арышту святара Ашмянскі касцёл быў зачынены. Абвінавачваўся ў правядзенні «антысавецкай і нацыяналістычнай дзейнасці». Зняволены ў Маладзечанскай, потым у Вілейскай турмах МДБ БССР. Закатаваны падчас следства.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ГОРБА Альбін Янавіч** [1895, Чорная Весь (*Czarna Wieś*) Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча —

19.5.1971, Польшча], святар. З сялянскай сям'і. Скончыў школу ў Беластоку Гродзенскай губ., Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (29.5.1919). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Шыдлавічы (Шыдлоўцы) Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер в. Шылавічы Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. З 9.10.1920 пробашч парафіі Божага Цела і св. мучаніка Юрыя ў мяст. Крамяніца Ваўкавыскага дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. Са жн. 1921 адміністратар касцёла Найсвяцейшага Імя Марыі ў мяст. Вярэйкі таго ж пав., цяпер Ваўкавыскі р-н. Са жн. 1927 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Свіслач Гродзенскага, пазней Ваўкавыскага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл., адначасова катэхет настаўніцкай семінарыі. Пасля прыходу савецкіх войскаў у 1939 пераследаваўся мясцовымі ўладамі, неаднаразова выклікаўся ў НКВД. З мая 1942 і да канца вайны пробашч касцёла Звеставання НПМ у в. Міжэрычы, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. У перыяд нямецкай акупацыі капелан аднаго з фармаванняў АК у Беластоцкай акрузе (псеўданім «Белы»). Касцёл у Міжэрычах з'яўляўся тым цэнтрам, адкуль ішло кіраўніцтва «сікораўцамі» — членамі польскай падпольнай антысавецкай арганізацыі, якая пачала фарміравацца ў вёсцы ўвосень 1939. Яе члены змагаліся і з немцамі, і з бальшавікамі. Выкарыстоўваў ахвяраванні на касцёл, плату за абрады і інш. на патрэбы АК. Выдаваў яўрэям даведкі аб польскім паходжанні. Найбяднейшым дапамагаў прадуктамі і грашыма. Арыштаваны МДБ 11.12.1945. Пад следствам знаходзіўся ў Зэльве, Ваўкавыску, гродзенскай турме МДБ № 1. Як узгадваў пазней святар, настрой быў бадзёры, бо думалі, што «хутка выйдзем… Штодзённа разам прамаўлялі ружанец незалежна ад веравызнання, ці каталік ці праваслаўны, у той час як зняволеныя яўрэі адчытвалі свае малітвы». Некалькі разоў (22.4, 28.6, 18.7.1947) суд адкладваўся з-за адсутнасці сведкаў і адбыўся амаль праз два гады пасля арышту — 18.11.1947. Судовая калегія па крымінальных справах Гродзенскага абл. суда прыгаварыла

за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 8 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. На касацыйную скаргу святара калегія па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР адказала, што «віна асуджанага даказана і злачынства кваліфікавана правільна». Перавезены з Гродна ў Мінск, потым у Ваўкавыск, у пачатку 1948 у Баранавічы, праз некалькі дзён у Брэст. 25.4.1948 дэпартаваны ў Польшчу, куды акрамя Г. выехалі таксама святары Віленскай архідыяцэзіі Вінцэнт *Борсук*, Гедымін *Пілецкі,* Ян *Рамейка,* Пётр *Січак*. Служыў пробашчам у парафіі Душнікі Здруй (*Duszniki Zdrój*) Вроцлаўскай архідыяцэзіі. З 10.6.1955 у касцёле ў в. Гайкаў (*Gajków*), з 3.7.1957 у парафіі ў мяст. Жараў (*Żarów*). 15.8.1963 выехаў на радзіму ў в. Чорная Весь.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ГРАБЕЛЬНЫ Уладзіслаў** [1913, мяст. Нацкова (*Nockowa*) Дэмбіцкага пав., Польшча — 15.10.1942], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1938). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны фашыстамі са святаром Янам *Вольскім* за дапамогу яўрэям. Расстраляны з яўрэямі ў лесе каля Кобрына.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ГРАБОЎСКІ (ВІДЛОК-ГРАБОЎСКІ) Казімір** [1891—7.3.1945], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1915 ці 1919). З 1922 адміністратар касцёла св. Мучаніка Юрыя ў в. Новая Руда Гродзенскага дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. Арыштаваны гестапа 22.4.1943. Зняволены ў Гродзенскай турме, потым у лагеры ў Штутгафе, Германія. Загінуў у зняволенні ад тыфу.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ГРАБОЎСКІ Францішак** [1873—4.2.1921, ЧК], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1905). Прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. З 1909 пробашч парафіі Божага Цела ў мяст. Давыд-Гарадок, цяпер горад Столінскага р-на Брэсцкай вобл. З 30.10.1910 да 13.1.1913 пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Лагішын Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер г. п. Пінскага р-на Брэсцкай вобл. У лют. 1913 высланы ў Краснаярск, дзе ў 1914—15 служыў адміністратарам касцёла Перамянення Пана. З 1917 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ва Уфе, катэхет мужчынскай гімназіі. У 1918 за выступленні «супраць супольных дзеянняў польскіх вайсковых атрадаў з «белай» рускай арміяй» высланы ў пас. Малічэўскі Томскай вобл., дзе служыў у капліцы св. Яна Хрысціцеля. Арыштаваны ЧК. Неўзабаве вызвалены. Праз некаторы час зноў арыштаваны за «антысавецкія выказванні». Расстраляны.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии*; *Литургический календарь; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

**ГРАБОЎСКІ Ян Янавіч** [1912, Вільня — 30.4.1984, Мёры, райцэнтр Віцебскай вобл.], святар. З сям'і стрэлачніка чыгункі. Скончыў Лідскую гімназію імя К. Хадкевіча (1929), Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Прызначаны вікарыем касцёла Наведзінаў НПМ у в. Алькенікі Троцкага дэканата, Літва. У 1938 накіраваны на вучобу ў Рым. У пачатку 2-й сусветнай вайны в. а. вікарыя касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер в. Слабодка Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. У 1942 в. а. вікарыя парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Глыбокае Дзісенскага пав., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1943 у касцёле Імя НПМ, Каралевы Польскай, у в. Порплішча, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. З 1945 у парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Удзела, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. З 1947 у касцёле Перамянення Пана ў в. Германавічы Дзісенскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 18.10.1949. Зняволены ў Глыбокім, потым у Полацку. Асуджаны Полацкім абл. судом да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ва Унжэнскі лагер МДБ Горкаўскай чыгункі (ст. Сухабязводнае). Працаваў на высечцы лесу. Маці святара выгналі з уласнага дома, які потым разабралі. Падчас «хрушчоўскай адлігі» тэрмін зніжаны спачатку да 15 гадоў, а потым адменены. Вызвалены 18.6.1956. Вярнуўся на радзіму. 25.3.1957 зарэгістраваны пробашчам касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Мёры Віцебскай вобл., у якім праслужыў 27 гадоў. Рэабілітаваны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 6, л. 12; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ГРАМЗ Баляслаў** [1.4.1904, в. Кублічы Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. — 8.6.1944], святар. Скончыў ф-т тэалогіі Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). З 1932 вікарый касцёла Усіх Святых у Вільні. З 1934 вучыўся ў Рыме, стыпендыят Фонду нацыянальнай культуры. У 1936 катэхет гімназіі пры касцёле Усіх Святых у Свянцянах аднайменнага дэканата, цяпер Літва. У 1937 у фарным касцёле Унебаўзяцця НПМ у Беластоку (*Białystok*), Польшча. У 1939 у касцёле НПМ у в. Чорны Бор Тургельскага дэканата, Літва. Мабілізаваны 28.4.1939 як капелан 6-га пяхотнага палка 1-й пяхотнай дывізіі. Трапіў у палон; неўзабаве ўцёк. Хаваўся ў сясцёр назарэтанак у Варшаве. 2.8.1941 вярнуўся ў Вільню. Прызначаны пробашчам касцёла Беззаганага Зачацця НПМ у в. Ідолта Браслаўскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл., генеральны вікарый Беларусі. Завяршыў пачатае святаром Станіславам *Эліяшам* будаўніцтва касцёла. Праводзіў таемнае навучанне рэлігіі, хаваў яўрэяў у падвале каля плябаніі. Арыштаваны гестапа 7.6.1944 за сувязь з АК і дапамогу яўрэям. Закатаваны ў в. Латышава, цяпер Ушацкі р-н. Пахаваны ля ідолтаўскага касцёла.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**ГРАСЕВІЧ Юзаф Юзафавіч** [27.11.1903, Варшава — 1.3.2000], святар. З польскай мяшчанскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1935). Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Вільні. У 1936 вучыўся на курсах журналістаў у Кракаве, Польшча. Прызначаны рэдактарам час. Віленскай архідыяцэзіі *«Tygodnik Katolicki»*. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны ў 1941 у Вільні. Пераведзены ў

лагер для інтэрнаваных польскіх святароў у Правінішках і Шалтупях. Вызвалены ў 1944. Вярнуўся ў Вільню. Арцыбіскупам Р. *Ялбжыкоўскім* пасланы са святаром Ч. *Барвіцкім* у Бабруйскі касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ для арганізацыі рэлігійнага жыцця. Праз 3 тыдні адклікaны і прызначаны пробашчам касцёла св. Мучаніка Юрыя ў в. Новая Руда Гродзенскага дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. Арыштаваны 2.11.1951. Зняволены ў Гродзенскай турме МДБ. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны 23.1.1952 ваенным трыбуналам МДБ Гродзенскай вобл. да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Мінеральны лагер МДБ Комі АССР. 8.2.1955 вернікі парафіі Новая Руда паслалі ліст з 13-цю подпісамі Генеральнаму пракурору СССР, у якім пераконвалі, што Г. «не вінаваты, палітычнай дзейнасцю не займаўся». Прасілі «перагледзець справу і вызваліць з заключэння». Прысуд перагледзелі, віна была перакваліфікавана, а тэрмін зніжаны да 10 гадоў ППЛ. 5.7.1955 трыбунал БВА знізіў тэрмін да 7 гадоў пазбаўлення волі і 2 гадоў пазбаўлення правоў. Вызвалены 6.8.1956 са зняццем судзімасці. Вярнуўся ў Беларусь. 5.10.1956 зарэгістраваны на старым месцы службы. У 1963—67 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Канстанцінава (Канстанцінаў Свірскі) Мядзельскага р-на Мінскай вобл. З 1969 пробашч касцёла Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў в. Крамяніца Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. У 1984 са святарамі М. *Арановічам* і А. *Тамковічам* пабываў у Польшчы, прыняў удзел у сустрэчах і абмеркаваннях становішча Касцёла ў Беларусі з польскімі святарамі і Беластоцкім біскупам **Эдвардам Кісялём**.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 114; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Жертвы политического террора в СССР*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ГРАХОЎСКІ Казімір** [1909—1942, Баранавічы, цяпер Брэсцкай вобл.], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939?). Прызначаны вікарыем касцёла св. Андрэя Апостала ў Слоніме, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Па патрабаванні немцаў нейкі час выконваў абавязкі бургамістра Слоніма. Дапамагаў яўрэям: выпісваў ім метрыкі, у якіх указваў іншую нацыянальнасць. У крас. 1942 арыштаваны за дапамогу яўрэям і сувязь з АК. Зняволены ў турме ў Слоніме. Неўзабаве вывезены ў Баранавічы і расстраляны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ГРАШЫС Вінцэнт Вінцэнтавіч** [20.7.1870, в. Таўрогі, цяпер Літва — 2.7.1930, Марыямпаль, Літва], святар, марыянін. Скончыў гімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (3.11.1893). У 1894—1900 вікарый пецярбургскай пракафедры. З 1900 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Бабінавічы, цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. З 1902 душпастыр касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1908 адміністратар касцёла св. Юзафа Абранніка ў Оршы Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., аршанскі дэкан. У крас. 1919 арыштаваны як закладнік. Вызвалены ў ліп. 1921. Вярнуўся ў Таўрогі. У 1925 служыў у касцёле ў Таўрогах Жмудзкай дыяцэзіі, Літва. У 1926 уступіў у ордэн марыянаў. Навіцыят пачаў 3.11.1926 у Марыямпалі. Першыя законныя шлюбы склаў 8.12.1927. Прызначаны кіраўніком новаадчыненага законнага дома ў Вількаміры (Укмярге), Літва. Памёр ад хваробаў, набытых падчас зняволення.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии*; *Памятная книжка Могилевской губернии*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa*

*katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**ГРОДЗІС Ян** [1881—1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1908). З 1916 в. а. пробашча касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1920—21 дырэктар гімназіі ў Нясвіжы, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Арыштаваны немцамі ў 1942. Праз некалькі месяцаў вызвалены. Загінуў пры нявысветленых абставінах.

Кр: *Памятная книжка Минской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ГРОНСКІ Юліян Міхайлавіч** [1877, в. Чэпель (?) Скопшынскай вол. Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — пасля 1939], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1903). Прызначаны вікарыем парафіі Нараджэння НПМ у Барысаве, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1905—06 в. а. адміністратара касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Талачын Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. У 1907—09 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Чачэрск Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. У 1911 рэзідэнт парафіі св. Альберта, з 1912 вікарый касцёла Маці Божай Пакутнай у г. Рыга, Латвія. З 1915 вайсковы капелан пры штабе 5-й арміі. У 1917 рэзідэнт пры капліцы св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Рамні Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. У 1918 арцыбіскупам Эдвардам *Ропам* прызначаны пробашчам Іркуцкай парафіі Унебаўзяцця НПМ, але з-за грамадзянскай вайны прыбыў на месца службы ў

1920. Неўзабаве пераехаў у Томск, дзе служыў у касцёле Маці Божай Ружанцовай. У 1923 у капліцы ў пас. Андрэеўскім, каля Томска, пасля зноў у Томску. З 1.11.1926 адміністратар Апостальскага вікарыята Зах. Сібіры. У пачатку лют. 1929 выязджаў у капліцу Антонія Падуанскага ў каталіцкім пас. Беластоцкі, цяпер Томская вобл., дзе благаславіў шлюбы жыхароў. Арыштаваны АДПУ 25.4.1931 у сваёй кватэры ў Томску па адрасе: вул. Бакуніна, д. 17. Са святаром арыштаваны некалькі чалавек з мясцовай «дваццаткі», у тым ліку арганіст **Станіслаў Бах.** Былі праведзены арышты ў Барнауле, Омску, Новасібірску, пас. Андрэеўскім і Беластоцкім, іншых населеных пунктах, куды наведваўся святар. На допытах ад арыштаваных патрабавалі, каб яны далі паказанні, што ксёндз агітаваў супраць калектывізацыі. Асуджаны калегіяй АДПУ 7.3.1932 за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць, шпіянаж на карысць Польшчы і захоўванне золата» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., куды прыбыў 1.9.1932. Вызвалены дзякуючы намаганням літоўскіх уладаў. 22.1.1933 пакінуў СССР. На пачатку 1934 знаходзіўся ў Рыме, адкуль вярнуўся ў Літву. У 1936—39 служыў у Ковенскай дыяцэзіі як пробашч, у мяст. Панатарай у Жайменскім дэканаце, дзе існаваў філіял парафіі Сясішкі. Пазней віцэ-дэкан у мяст. Кракес, Літва. Рэабілітаваны 6.6.1989 (паводле іншых звестак 11.10.1989).

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Памятная книжка Могилевской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Литургический календарь; Книга памяти томичей; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; З асабістага архіва У. Васькова.*

**ГРЫБОЎСКІ Антоні**[1] [1904—20.10.1943], святар усх. абраду, езуіт. У 1922 уступіў у Таварыства Езуса. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў у грэка-каталіцкай парафіі ў пас. Альбярцін Слонімскага пав., цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл. Арыштаваны і расстраляны фашыстамі.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ГРЫБУЛЬ Гэлена Антонаўна** [1888, Рэжыцкі пав. Віцебскай губ. — ?], хатняя гаспадыня, парафіянка касцёла Звеставання НПМ у Ленінградзе. Арыштавана 14.1.1930 па справе «Т. *Матулёніса* і інш.». Асуджана калегіяй АДПУ 8.9.1930 да 3 гадоў ссылкі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ГРЫЗАН Станіслаў Канстанцінавіч** [1863, в. Слабада Дзвінскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — ?], арганіст. З бел. мяшчанскай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Да арышту служыў у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Росіца Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, гадаваў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 18.3.1933. Абвінавачваўся ў «правядзенні шпіёнскай дзейнасці». 5.6.1933 пастановай Віцебскага аператыўнага сектара (аддзела) АДПУ БССР справа Г.

[1] Не блытаць: **Грыбоўскі Антоні** [1906—1988], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем касцёла св. Станіслава ў мяст. Тапчэва (Topczewo) Бельска-Падляшскага пав. Бранскага дэканата, Польшча. Пасля 2-й сусветнай вайны служыў у Брэсце. У 1960—80-я пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Чарнаўчыцы, цяпер Брэсцкі р-н. (Кр.: Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992.)

(№ 5008-п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) спынена, а ён вызвалены і рэабілітаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ГРЫНЕВІЧ Васіль Пятровіч** [1886, Варшава — 28.1.1931, Масква, Ваганькаўскія могілкі], святар. З польскай мяшчанскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. У 1920-я служыў у БССР. Арыштаваны ў 1928. Асуджаны калегіяй АДПУ да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Сібір. Жыў у с. Тасеева Канскай акругі Усходне-Сібірскага краю, працаваў тэхнікам па будаўніцтве. Арыштаваны 24.9.1930. У студз. 1931 этапаваны ў Бутырскую турму Масквы з мэтай вызвалення праз абмен з Польшчай, але абмен не адбыўся. Асуджаны 23.1.1931 калегіяй АДПУ за «шпіянаж» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны ў студз. 1989.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Жертвы политического террора в СССР.*

**ГРЫНЯВІЦКІ Браніслаў Войцэхавіч** [1887, в. Варона Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 10.6.1964], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1911). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Друя Дзісенскага пав., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1913 у парафіі Усіх Святых у Вільні. З 1915 адміністратар касцёла Звеставання НПМ у в. Мікелеўшчына Гродзенскага пав., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1929 пробашч касцёла Найсвяцейшага Імя Марыі ў в. Вярэйкі Берастаўіцкага дэканата, цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 28.2.1951. Асуджаны 11.8.1951 са святарамі М. *Арановічам*, А. *Тамковічам* і парафіянамі асобай нарадай пры МДБ за «правядзенне антысавецкай агітацыі» і «здрадніцкую дзейнасць у перыяд нямецкай акупацыі» да

10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Азёрны лагер МДБ Іркуцкай вобл. (Тайшэт, Брацк). Вызвалены ў 1956 цяжка хворым. Выехаў у Польшчу. Рэабілітаваны пракуратурай Гродзенскай вобл. 30.6.1993. Асабовая справа Г. № п-18660 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *НАРБ, ІКБР*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ГУДЗЕЙКА Баляслаў Міхайлавіч** [5.8.1894, Вільня — 2.2.1961], святар. З сям'і рабочага. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1914), вучыўся ў Магілёўскай духоўнай акадэміі ў Петраградзе. З 1915 дыякан у святара **Казіміра Пацкевіча** ў касцёле св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Палукня Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва. Прыняў сакрамэнт святарства (лют. 1917, Коўна, цяпер Каўнас, Літва). Прызначаны вікарыем касцёла св. Рафала Арханёла ў Вільні. Неўзабаве пераведзены ў парафію св. Казіміра ў мяст. Маладзечна Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З траўня 1921 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Радашковічы Вілейскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. З 1930 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Луконіца Слонімскага дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. З 1936 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Крупа Лідскага дэканата, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 16.1.1951. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны 25.8.1951 асобай нарадай пры МДБ да 10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Камышоўскі лагер МДБ Кемераўскай вобл. (8000 зняволеных). У 1953 пераведзены ў адзін з лагераў Омскай вобл. З 12.6(ці 7).1953 у Азёрным лагеры МДБ Іркуцкай вобл. Вызвалены 27.7.1956

цяжка хворым. Вярнуўся ў БССР. 5.11.1956 адноўлены на старым месцы працы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 114; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ГУЗ Юзаф (Інацэнт)** [18.3.1890, Львоў, Аўстра-Венгрыя, цяпер Украіна — 6.6.1940], францішканін, благаслаўлёны. Скончыў усеагульную школу і гімназію ў Львове. 25.8.1908 уступіў у ордэн айцоў францішканцаў канвентуальных і прыняў імя Інацэнт. У 1909 першы раз апрануў манаскі габіт, у 1910 склаў першыя законныя шлюбы. У Кракаве атрымаў філасофска-тэалагічную адукацыю, прыняў сакрамэнт святарства (2.6.1914). Служыў у Ганачове, Чыжках, Львове, Галічы (Украіна), Варшаве (*Warszawa*), Радамску (*Radomsk*) (Польшча), Гродне. З 1933 выкладаў спевы ў Ніжэйшай місіянерскай семінарыі ў Непакалянаве (*Niepokalanów*), Польшча), быў віцэ-магістрам клерыкаў і спавядальнікам братоў манаства. У 1936 вярнуўся ў Гродна, служыў у кляштары. Арыштаваны НКВД 21.3.1940. Уцёк з турмы. Падчас пераходу мяжы схоплены немцамі. Зняволены ў Сувалках (*Suwałki*), Польшча, адкуль накіраваны ў лагер у Дзялдаве (*Działdów*), дзе знаходзіўся да 20.5.1940. Пасля перавезены ў Захсенгаўзен (*Sachsenhausen*), Германія. Прыняў мучаніцкую смерць ад накіраванага ў горла моцнага струменя вады. Беатыфікаваны Папам Янам Паўлам II 13.6.1999.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ГУН Анастасія Міхайлаўна** [1884, в. Таўсюлы Лідскага пав. Віленскай губ. — ?], парафіянка, хатняя гаспадыня, жыла

ў Вырыцы пад Ленінградам. Арыштавана ў крас. 1932 па справе «**Пранцкецiса**[1] і інш.». Асуджана калегіяй АДПУ 19.7.1932 да 3 гадоў ППЛ. Этапавана (?). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**ГУРСКІ Станіслаў Язэпавіч** [1909 — пасля 1970-х], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1940?). У пасляваенны час пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст.Ваўкалата Пастаўскага пав. Надвілейскага дэканата, цяпер вёска Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. З сакрэтнага паведамлення ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў па Полацкай вобл. Кячко (прыкладна ў канцы 1946): «Гурскі катэгарычна адмовіўся запоўніць графу аб падданстве СССР, заявіў, што ён прыняў польскае і застаецца верным сваёй дзяржаве». Старшыня Глыбоцкага выканкама В. Асіненка накіраваў зварот упаўнаважанаму Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ БССР П. Лабусу з просьбай «пазбаўлення права служэння ў касцёле ксяндза Ваўкалацкага касцёла за сістэматычнае прыцягненне дзяцей да выканання рэлігійных абрадаў; паездкі па вёсках, у часе якіх той асвячае дамы вернікаў; здзяйсненне рэлігійных шэсцяў вакол касцёла; устанаўленне новых крыжоў у населеных пунктах без дазволу мясцовых органаў улады». У 1953 чатыры святары хаваліся ад арышту, двух з іх — Г. і святара Баляслава *Заёнца* — супрацоўнікі МУС знайшлі.

[1] **Пранцкецiс Аўгусцін Пятровіч** [18(ці 30).8.1886, Ковенская губ. — 1970], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (13.3.1910). Служыў у Палтаве, Прэйлі, Краславе, Дзвінску. З 1916 у Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. Арыштаваны ў 1922, 1923, 1932. Асуджаны да ВМП (заменена на 10 гадоў ППЛ). Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 19.5.1933 перавезены ў Маскву. Вызвалены праз абмен палітзняволенымі паміж СССР і Латвіяй. У канцы 1930-х рэктар у Шальціняй. Падрабязней гл.: *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*.

У 1958—60 фінансавыя органы некалькі разоў змянялі падаходны падатак у бок павелічэння. Абл. фінансавы аддзел разгледзеў скаргу Г. і пацвердзіў «правільнасць налічэння падатка райфінаддзелам. Падатак павялічаны з улікам раней хаваемых прыбыткаў па Ваўкалацкай парафіі, а таксама за касцёл св. Яна Хрысціцеля ў в. Параф'янава, куды святар перыядычна выязджаў у 1958—60 на разавыя служэнні». За няўплату райфінаддзел склаў вопіс маёмасці святара і перадаў справу ў судовыя органы. Народны суд Глыбоцкага р-на пацвердзіў іск раённага фінансавага аддзела. 31.1.1961 абл. суд разгледзеў касацыйную скаргу адказчыка і пакінуў рашэнне народнага суда ў сіле. У канцы снеж. 1960 святара знялі на 6 месяцаў з рэгістрацыі за «парушэнне савецкіх законаў аб культах». У 1970-я служыў у парафіях Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка і св. Станіслава ў в. Далёкія Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ДАБЖЫЦКІ Казімір** [10.3.1900, в. Грабёнка Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — ?], святар. У пачатку 1920-х адзін з семінарыстаў падпольнай духоўнай семінарыі арцыбіскупа Я. *Цепляка* ў Петраградзе. Прыняў сакрамэнт святарства (1923, Мінск?). Паводле некаторых звестак, неўзабаве арыштаваны і асуджаны да пазбаўлення волі. З 1939 вікарый касцёла св. Ганны ў Кракаве, Польшча. Арыштаваны гестапа 6.1.1944. Вызвалены ў крас. 1945. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ДАБРАВОЛЬСКІ Стэфан** [1899—10.3.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1927). Прызначаны вікарыем парафіі Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў мяст. Ракаў Мінскага пав. Вілейскага дэканата, цяпер вёска Валожынскага р-на Мінскай вобл. З 1932 вікарый касцёла св. Тэрэзы ў Вільні. З 1933 душпастыр парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Канстанцінава Глыбоцкага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. З 1937 служыў у касцёле св. Мучаніка Юрыя ў в. Беліца Лідскага дэканата, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны гестапа і расстраляны з 9 іншымі святарамі ў ваколіцы Ліды (гл. арт.: *Ажароўскі* Ю.).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Krahel T.* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998. № 3 (98).

**ДАБУЛЕВІЧ Павел-Чэслаў (Ян-Чэслаў)** [1894 — ?], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). З 1918 вікарый філіі ў в. Рынкаўшчызна Мерачскага дэканата, Літва. З 1921 катэхет і вікарый парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Дзісна Глыбоцкага дэканата Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 1928 катэхет і вікарый касцёла св. Казіміра

ў мяст. Маладзечна Вілейскага дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1934 пробашч парафіі Перамянення Пана ў в. Сакаляны (*Sokolany*) Сакольскага пав. і дэканата, цяпер Польшча. Паводле некаторых звестак, арыштаваны НКВД пасля 1939. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*.

**ДАВЫДЗЮК Люцыя Нарні (Ганна Кірылаўна)** [1900, Кобрын Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. — ?], законніца. Склала першыя законныя шлюбы і прыняла імя Люцыя Нарні. Арыштавана 10.3.1924 у Маскве па групавой справе «рускіх католікаў». Асуджана калегіяй АДПУ 19.5.1924 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Табольск, цяпер Цюменская вобл., Расія. Вызвалена ў 1926 з пазбаўленнем права жыць у вялікіх гарадах. Жыла ў Роўне, Украіна. Паўторна арыштавана ў 1927. Выслана на 3 гады ў Абдорск Уральскай вобл. Пасля вызвалення жыла ў Малаяраслаўцы, потым у Арле, працавала медсястрой у туберкулёзным дыспансеры. У трэці раз арыштавана ў 1935. Асуджана да 3 гадоў ППЛ. Пасля вызвалення жыла ў Калузе, працавала медсястрой у гарадской бальніцы. Зноў арыштавана 30.11.1948 і 17.8.1949 прыгаворана за «актыўную шпіёнскую дзейнасць на карысць Ватыкана» да 10 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Жертвы политического террора в СССР*.

**ДАЛЕЦКІ Міхал** [11.8.1984, в. Абабы Новааляксандраўскага пав. Віленскай губ, цяпер Літва — 31.7.1942, Наваградак, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл.], святар. З каталіцкай сялянскай сям'і. Скончыў кадэцкі корпус імя Аляксандра II, Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу.

Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Служыў вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1911 пробашч парафіі НПМ у в. Старчыцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер пас. Акцябр Салігорскага р-на Мінскай вобл. Паводле некаторых звестак, таксама служыў у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Клецк, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1914 удзельнічаў у кансэкрацыі біскупа **Францішка Карэвіча**. Падтрымліваў рух беларусізацыі. Супрацоўнічаў з час. «Bełarus», фінансава падтрымліваў час. «Krynica», «Bełaruskaja Dumka», гаварыў казанні на бел. мове. У 1919 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішкалдзь Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1924 пробашч парафіі св. Казіміра ў в. Уселюб Наваградскага пав. і дэканата, цяпер Наваградскі р-н. З 1933 у касцёле св. Міхала Арханёла ў Наваградку, наваградскі дэкан, ганаровы канонік Пінскай Капітулы. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Дапамагаў яўрэям, зняволеным у гета. Арыштаваны гестапа 29.6.1942. Расстраляны.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии*; *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ДАМБРОЎСКІ Казімір** [1902—1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1929). З 1933 прэфект школ пры касцёле Унебаўзяцця НПМ у Пружанах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Скончыў Каталіцкі інстытут у Парыжы са ступенню доктара тэалогіі (1939). Прызначаны пробашчам парафіяльнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Дарава Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл., адначасова прафесар Пінскай духоўнай семінарыі. Арыштаваны фашыстамі ў крас. 1942. Атручаны газам у в. Калдычэва, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ДАМІНЯК Юзаф** [30.1.1903—5.8.1942], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1932). Служыў у парафіяльным касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Сейлавічы Нясвіжскага пав. і дэканата, цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. З 1936 в. а. 3-га вікарыя катэдральнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Брэсце, катэхет пачатковай школы. Арыштаваны фашыстамі 28.6.1942. Паводле некаторых звестак, расстраляны каля в. Малева, цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ДАНІЛАЎ Віктар Пятровіч** [н. 20.7.1927, с. Нарское Яраслаўскага р-на і вобл., Расія], рэлігійны дысідэнт, публіцыст. У 1947 паступіў у Яраслаўскі педагагічны інстытут. Арыштаваны 12.6.1948 у Яраслаўлі па адрасе: зав. Народны, д. 6, кв. 8. Абвінавачваўся ў правядзенні антысавецкай агітацыі — крытычна выказваўся пра Сталіна. Асуджаны 21.8.1948 да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Мінеральны лагер (для асабліва небяспечных паліт. злачынцаў) МДБ Комі АССР (пас. Інта). 23.2.1951 за падрыхтоўку ўцёкаў узяты ў лагеры пад варту і 8.5.1951 прыгавораны да 10 гадоў зняволення. Этапаваны ў адзін з лагераў Комі АССР. У зняволенні прыняў каталіцкае веравызнанне. Вызвалены па амністыі (1955). Займаўся місіянерскай дзейнасцю. Са снеж. 1955 узнавіў вучобу на гістарычным ф-це Яраслаўскага педагагічнага інстытута, аднак пасля яго сканчэння не атрымаў дыплом з той прычыны, што з'яўляўся актыўным католікам (пра гэта адміністрацыя інстытута даведалася з даносу). Толькі афіцыйныя звароты Д. у дзяржаўныя ўстановы з заявамі

пра рэлігійную дыскрымінацыю дазволілі яму ва ўмовах паліт. «адлігі» адстаяць свае правы і атрымаць дыплом. Але ўладкавацца па спецыяльнасці ён не змог, працаваў электрамантажнікам. У 1960 пераехаў у Вільнюс, а ў 1967 — у Гродна. У 1970-я атрымаў прапанову вучыцца на святара грэка-каталіцкага абраду. У 1976 у Львове тайна рукапакладзены ў святары Мітрапалітам **Уладзімірам Сцярнюком**. Вярнуўся ў Гродна, пачаў нелегальнае святарскае служэнне. Пісаў рэлігійныя працы для самвыдату. З 1992 легальны ігумен грэка-каталіцкай парафіі ў Гродне.

Тв.: Мой путь к Богу и к Католической Церкви. Полоцк, 1997.

Кр.: *Дзярновіч А*. Віктар Данілаў // *Дэмакратычная апазыцыя*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Жертвы политического террора в СССР*.

**ДАРАШКЕВІЧ Казімір** [1898—1963], святар. Капелан Віленскай архідыяцэзіі. З 1927 адміністратар касцёла ў в. Жыдомля, цяпер Жытомля Гродзенскага р-на. З 1931 (таксама і падчас 2-й сусветнай вайны) пробашч парафіі св. Станіслава ў в. Даўгінава, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. Забіты падчас бандыцкага нападу.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Żurek W. Salezjańscy męczennicy Wschodu.*

**ДАШКЕВІЧ Гвідон Янавіч** [1885, в. Мікулічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. — 13.9.1929, Мінск, турма АДПУ], тэхнічны супрацоўнік касцёла езуітаў св. Яна Караля ў в. Блонь Ігуменскага пав., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. З бел. сялянскай сям'і. Да арышту жыў у в. Зарэчча, цяпер Блоньскага сельсавета. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 14.5.1929. Асуджаны 23.8.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і «шпіянаж» да ВМП. Расстраляны з пробашчам касцёла Я. *Мацыеўскім*.

Рэабілітаваны 9.9.1991 пракуратурай БВА. Групавая справа Д. і інш. (па ёй праходзіла больш за 40 чалавек, усе прыгавораны ад 3 да 10 гадоў зняволення) № 31800-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД*.

**ДАШУТА Юзаф Дамінікавіч** [20.12.1890, мяст. Сакулка (*Sokółka*) Гродзенскай губ., цяпер Падляшскае ваяв., Польшча — 9.9.1966, кляштар у Влацлаўку, Польшча], святар, манах марыянін, грамадскі і культурны дзеяч, педагог. З бел. мяшчанскай сям'і. У 1905—10 вучыўся ў Сакульскім гарадскім 4-класным вучылішчы. У 1911 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Быў сябрам гуртка беларусаў-семінарыстаў. Прыняў сакрамэнт святарства (26.5.1918). Прызначаны вікарыем парафіі Дабжынеў (*Dobrzyniew*) Беластоцкага дэканата, касцёла Звеставання НПМ у мяст. Тракелі, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1921 вучыўся ў Люблінскім каталіцкім ун-це. З 1925 служыў у кляштары ордэна бернардынцаў у Друі, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Пасля навіцыяту выехаў на вучобу ў Рым, дзе праз год абараніў доктарскую дысертацыю па кананічным праве. У канцы 1927 вярнуўся ў Друю. Браў удзел у заходнебел. рэлігійным і культурна-асветным жыцці. Гаварыў казанні і праводзіў катэхізацыю на бел. мове. Пераследаваўся польскімі ўладамі. Дэпартаваны паліцыяй з друйскага кляштара 23.6.1938. Жыў у кляштарах марыянаў у Скуржцы (*Skórzec*) каля Седльцаў (*Siedlce*), Грудзяндзу (*Grudziądz*), Влацлаўку (*Włocławek*), Польшча. Падтрымліваў кантакты з асяродкам марыянаў у Лондане.

Кр.: *Stankiewicz A*. Rodnaja mowa u swiatyniach. Wilnia, 1929; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ДЗЕМЯШКЕВІЧ Антоні Мікалаевіч** [28.7.1891, в. Башарова Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н

Віцебскай вобл. — 3.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], святар. З бел. сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1918). Служыў у капліцы ў Бранску, парафіі Унебаўзяцця НПМ у Харкаве. З 1925 адміністратар парафіі Маці Божай Ружанцовай ва Уладзіміры, касцёла Унебаўзяцця НПМ у Ніжнім Ноўгарадзе, парафіі ў Клязьме Маскоўскага дэканата, касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Казані Самарскага дэканата. Арыштаваны 16.10.1929 у Ніжнім Ноўгарадзе. Асуджаны калегіяй АДПУ 13.3.1930 за «шпіянаж» і «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Паўторна арыштаваны на Салаўках 9.10.1937. Прыгавораны 3.11.1937 тройкай НКВД Ленінградскай вобл. да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Жертвы политического террора в СССР*.

**ДЗМІТРЫЕВА Ядзвіга Серафімаўна** [1894, мяст. Койданава Мінскага пав., цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл. — 4.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], парафіянка. Арыштавана ў 1936 у Маскве. Асуджана асобай нарадай НКВД 10.11.1936 за «спробу здзяйснення тэрарыстычных актаў супраць прадстаўнікоў савецкай улады» і «ўдзел у антысавецкай арганізацыі» да 10 гадоў ППЛ. Этапавана ў Салавецкі лагер НКВД Архангельскай вобл. У 1937 у лагеры ўзята пад варту. Прыгаворана 10.10.1937 лагернай тройкай да ВМП. Расстраляна.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ДЗУДЗЕВІЧ Баляслаў Ігнатавіч** [27.(3 ці 4).1908, мяст. Ракаў Мінскага пав., цяпер вёска Валожынскага р-на Мінскай вобл. — 11.1.1994], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (25.4.1935). Прызначаны прэфектам пачатковых школ пры касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Драгічын (*Drohiczyn*) Бельска-Падляшскага пав. Драгічынскага дэканата, Польшча. Арыштаваны 11.1.1940. Асуджаны 6.8.1940 асобай нарадай як «сацыяльна-небяспечны элемент» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Архангельскую вобл. Вызвалены 31.12.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. З 1942 капелан у арміі генерала **У. Андэрса**. З верас. 1946 жыў у Вялікабрытаніі. Служыў капеланам у Свіндане, Глачэстэры, Оксфардзе, Хаўберы Парку, Валінгфордзе, Берсе. Пасля дэмабілізацыі ў 1949 душпастыр у Свіндане. У жн. 1950 пробашч у Кардзіфе, потым ва ўсім Паўднёвым Уэльсе. З 1.1.1957 пробашч у Волверхамптане, дзе арганізаваў польскую парафію. 1.11.1966 прызначаны пробашчам польскай парафіі ў Брыстолі. З 1972 дэкан Паўдн.-Зах. польскіх парафій у Англіі. У 1979 пасля інфаркту міякарда выйшаў на пенсію. З 1986 жыў у доме апекі англійскіх законніц. Рэабілітаваны 24.8.1989 пракурорам Гродзенскай вобл. Асабовая справа Д. № п-12429 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

26.11.1939 у Ракаве арыштаваны пячнік, бацька траіх дзяцей **Дзудзевіч Іван Ігнатавіч** (н. у 1902 у Ракаве), брат Баляслава Дзудзевіча. 9.7.1940 асуджаны асобай нарадай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 8 гадоў ППЛ і этапаваны ў Паўночна-чыгуначны лагер НКВД Комі АССР. Вызвалены 4.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 13.6.1989. Яго асабовая справа № 26213-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

У лют. 1945 у Ракаве арыштаваны вайсковец тэхнічнай роты № 150 чыгуначнага будаўнічага батальёна **Дзудзевіч Фама Ігнатавіч** (н. у 1906 у Ракаве; падчас арышту жанаты, гадаваў дзіця), брат Баляслава і Івана Дзудзевічаў. Асуджаны 9.10.1946 (з іншымі вайскоўцамі роты **Багдановічам Францам Іосіфавічам** і **Віткоўскім Станіславам Іосіфавічам**) асобай нарадай НКВД як «памагаты нямецкіх акупантаў» і за «антысавецкую агітацыю» да 7 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.1.1993. Групавая справа Ф. Дзудзевіча і іншых № 35106-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis.*

**ДЗЯДУЛЬ Нікадзім Андрэевіч** [1873—1944], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1897). У 1899—1900 вікарый парафіі Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў мяст. Ракаў Мінскага пав., цяпер вёска Валожынскага р-на Мінскай вобл. У 1900—01 служыў у касцёле Маці Божай Ружанцовай у Полацку Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. У 1901—04 зноў служыў у Ракаве. У 1905—06 вікарый касцёла Апекі НПМ у в. Рукшаніцы, цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл., парафіі Божага Цела ў мяст. Нясвіж Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1907—09 адміністратар парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Шклове Магілёўскага пав., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1910 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Пустынь Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія. У 1912—17 душпастыр парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Асвея Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. У 1919 арыштаваны з біскупам Э. *Ропам* і інш. як закладнік. Вызвалены. З 1925 пробашч парафіі Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў мяст.

Марыенгаўзен Люцынскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія, адміністратар касцёла ў мяст. Варнавічы (*Warnowicze*), Польшча. З 1927 душпастыр парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Бяльмонт Браслаўскага дэканата, цяпер у складзе в. Ахрэмаўцы Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. У 1931—32 служыў у касцёле св. Міхала Арханёла ў в. Скрундзі, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1933 у парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Лапеніца (Вялікая Лапеніца), цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. З 1937 на пенсіі.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии*; *Памятная книжка Минской губернии*; *Памятная книжка Могилевской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Synodus archidioecesana vilnensis*; *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ДЗЯМ'ЯН Юзаф** [23.3.1900, в. Краснае Старое (*Krasne Stare*), Польшча — 11.12.1966, Беласток (*Białystok*), Польшча], святар. З сялянскай сям'і. З 1907 вучыўся ў пачатковай школе ў Красным Фальварчным (*Krasne Folwarczne*), пасля ў нелегальнай польскай школе Рафалоўскага ў Беластоку, расійскай гімназіі, вучобу ў якой спыніла 1-я сусветная вайна. Настаўнічаў у роднай вёсцы і Красным Фальварчным. Працягваў вучобу ў польскай рэальнай гімназіі ў Беластоку, пасля яе заканчэння працаваў настаўнікам у школе ў Пашкаўшчызне (*Paszkowszczyzna*) каля Стасілаў (*Stasiły*), Літва (?). У 1923 паступіў на тэалагічны ф-т Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя, але праз два гады спыніў навучанне, паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова некаторы час працаваў у Дзяржаўным архіве пад кіраўніцтвам **Генрыка Лаўмянскага**. Атрымаў магістарскую ступень за працу «Хрыстос і багацце». Прыняў сакрамэнт святарства (28.6.1931). Некалькі месяцаў служыў прэфектам парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Забалаць Васілішскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл., пасля ў касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка

Браслаўскага дэканата, цяпер в. Слабодка Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. У 1932 прызначаны катэхетам касцёла св. Юзафа і НПМ у в. Барадзінічы Мёрскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., адкуль перавёўся ў парафію св. Яна Хрысціцеля ў в. Параф'янава, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. З 1934 у філіяльным касцёле св. Юзафа ў в. Быцень Слонімскага пав. і дэканата, цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. Скончыў пабудову касцёла, плябаніі, капліцы св. Юзафа для уніятаў, для якіх была створана парафія. Пасля прыходу савецкіх войскаў 17.9.1939 вымушаны хавацца. Арыштаваны, зняволены ў турме ў Быцені, потым перавезены ў Слонім. Неўзабаве вызвалены. Выехаў у Вільню, адтуль на Беласточчыну. Да пачатку германа-савецкай вайны знаходзіўся ў Даліставе (*Dolistów*), Польшча, дзе дапамагаў **Яну Пшыбінскаму**, пробашчу касцёла св. Лаўрэнція. У пачатку вайны хаваўся ў Карыціне (*Korycin*), Польшча. З восені 1941 да сярэдзіны 1944 пробашч касцёла ў Чорнай Весі Касцельнай (*Czarna Wieś Kościelna*). Пасля ў парафіі Мышынец (*Myszyniec*) апекаваў касцёл да студз. ці лют. 1945. У ліп. 1945 выехаў у Ольштын (*Olsztyn*), з сак. 1946 прызначаны рэктарам філіяльнага (да парафіі ў Ружанах) касцёла ў в. Шчытна Косаўскага пав. і дэканата, цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. Праз нядоўгі час прызначаны адміністратарам (да 3.2.1947) парафіі ў Млынарах (*Młynary*), Польшча. Праз чатыры гады дэкан парафіі. Служыў таксама ў парафіі Веліслава (*Wielisławo*). У пачатку 1954 прызначаны пробашчам касцёла ў мяст. Вежхавіцы (*Wierzchovice*), Польшча. Праз год у парафіі св. Аўгустына ў Вроцлаве (*Wrocław*), Польшча, пасля зноў вярнуўся ў Вежхавіцы. На пенсіі з 1964. Жыў у Беластоку на тэрыторыі парафіі св. Роха.

Кр.: *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ДЗЯМ'ЯН Юзаф Казіміравіч** [6.2.1888, Віцебскі пав. — 3.11.1937, ГУЛАГ], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Прызначаны вікарыем касцёла св. Юзафа Абранніка ў Оршы Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1914 першы вікарый, потым пробашч касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Неаднаразова затрымліваўся ЧК. Арыштаваны ў 1922 у Полацку з вікарыем парафіі Юзафам *Лук'яніным* і іншымі святарамі за адмову ўдзельнічаць у раскрыванні мошчаў святога Андрэя Баболі. Каля 6 месяцаў зняволены ў віцебскай турме ЧК. У 1925—28 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Сянно Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Чарэя Сенненскага пав. і дэканата, цяпер вёска Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., сенненскі дэкан, пазней генеральны вікарый магілёўскага біскупа Б. *Слоскана*. У 1927 некалькі разоў арыштаваны. З 1929 пробашч парафіі св. Кацярыны Александрыйскай у Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. Зноў арыштаваны 17.6.1930. Асуджаны 2.12.1931 калегіяй АДПУ за «шпіянаж» і «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Яраслаўскую турму АДПУ. 7.3.1932 вывезены ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 9.10.1937 Ленінградскай тройкай НКВД прыгавораны да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ДЗЯШУК Іосіф Антонавіч** [1911, в. Германавічы Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Атрымаў

сярэднюю спецыяльную адукацыю. Да арышту служыў у касцёле св. біскупа Мікалая ў мяст. Свір, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 17.7.1947. Асуджаны 18.11.1947 за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.2.1993 Вярхоўным судом Беларусі. Асабовая справа № 35363-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД*.

**ДМОЎСКІ Міхал Тэафілавіч** [20.9.1873, в. Анджэева (*Andrzejewo*), цяпер Польшча — 13.3.1938, в. Маруна Суха (*Maruna Sucha*), каля Якторава (*Jaktorów*), Польшча], навуковец, прафесар духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1897, Варшава). З 1901 вікарый касцёла св. Аляксандра ў Варшаве. З 1902 у парафіі ў мяст. Лешна (*Leszno*), Польшча. З 1904 адміністратар касцёла ў мяст. Кашэры (*Koszery*). Паводле некаторых звестак, таксама служыў у касцёле ў в. Станіслававa Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н. З 1907 адміністратар парафіі ў в. Орлаў (*Orłów*), Польшча. З 1913 у мяст. Рыдултовы (*Rydułtowy*), Польшча. Падчас 1-й сусветнай вайны служыў капеланам, кантужаны, страціў слых. У 1915 выехаў у Петраград. З 1916 у парафіі св. Баніфацыя ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. У 1919—20 адміністратар капліцы св. Яна Кантыя. Арыштаваны ў 1922, неўзабаве вызвалены. У 1923 паралельна капелан касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Колпіна, філіяльнага касцёла Беззаганнага Зачацця ў пас. Усць-Іжора, капліцы ў пас. Красны Бор каля Ленінграда. У 1924 адміністратар парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ на Васільеўскім востраве. Зноў арыштаваны 17.2.1925. Пад следствам знаходзіўся ў турме на вул. Шпалернай у Ленінградзе. Асуджаны 22.7.1925 да ВМП. Вызвалены 10.2.1926. Дэпартаваны ў мяст. Негарэлае, цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. З 1927 адміністратар парафіі Караля Барамея ў Варшаве. З 1934 капелан касцёла

св. Вінцэнта на могілках Брудна (*Bródno*). З 1936 на пенсіі. Жыў у маёнтку Маруна Суха.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*;

**ДОЎЖЫК Павел** [1871, в. Далістава Ясвільскай вол. Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 1943], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1897). У 1900-я — пачатку 1910-х пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Любін Касцельны (*Lubin Koscielny*) Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча. У 1915 адміністратар і дэкан парафіі Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1919 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл., рэктар філіяльнага касцёла ў в. Рэндвідава (цяпер не існуе). Паводле адной версіі, закатаваны фашыстамі 10.8.1943 у ваколіцах в. Крычаты, цяпер Стаўбцоўскі р-н, паводле іншых арыштаваны 8.8.1943 уласаўцамі падчас аблавы на партызан і расстраляны ў лесе каля в. Янкавічы таго ж р-на.

Кр.: *Памятная книжка Гродненской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ДРАБ Вінцэнт (Вацлаў) Карлавіч** [1889, в. Раманаўцы Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. — 4.8.1955], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1913). Прызначаны вікарыем парафіі св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Гальшаны Ашмянскага дэканата, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. З 1918 вікарый касцёла св. Францішка (бернардзінцаў) у Вільні. З 1921 адміністратар

парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Краснае (Краснае Сяло) Вілейскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. Паралельна абслугоўваў філію ў в. Плябань таго ж дэканата. З 1938 у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Струбніца Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 8.2.1949. Ваенны трыбунал войскаў МУС Гродзенскай вобл. 23.3.1949 на закрытым пасяджэнні разгледзеў справу святара. Д. абвінавачваўся ў «антысавецкай дзейнасці». Падсудны прызнаў сябе вінаватым толькі ў захаванні антысавецкай літаратуры з часоў нямецкай акупацыі. У абвінаваўчым заключэнні «па сукупнасці здзейсненых злачынстваў» святара асудзілі да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Але ўмяшаўся пам. пракурора войскаў МУС БВА, які падаў касацыйны пратэст у ваенны трыбунал войскаў МУС БССР, бо палічыў, што прысуд занадта мяккі. Справу накіравалі на новы разгляд. У выніку суд вынес 15.4.1949 канчатковы прысуд — 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены ў 1954. Вярнуўся ў Струбніцу смяротна хворым. Рэабілітаваны 8.10.1992 Гродзенскім абл. судом. Асабовая справа Д. № п-15353 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Synodus archidioecesana vilnensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ДРАГЕЛЬ Генрык Уладзіслававіч** [1889, в. Дзірнічы Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. — 1.9.1967], святар. Скончыў Віленскую гімназію (1906), Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). Прызначаны ў касцёл св. Юзафа і НПМ у в. Барадзінічы Дзісенскага пав., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1917 адміністратар парафіі св. Антонія Падуанскага ў в. Бабруйшчына, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай

вобл. З 1923 пробашч касцёла Божага Цела ў мяст. Дварэц Слонімскага пав. Дзятлаўскага дэканата, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1930 пробашч філіі Звеставання НПМ у в. Гудагай Ашмянскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. З 1931 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Руднікі, Літва. З 1934 служыў у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Крупа Лідскага дэканата, цяпер в. Крупава Лідскага р-на Гродзенскай вобл. З 1936 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Луконіца Слонімскага пав. і дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны МДБ 19.7.1949 у Слоніме Гродзенскай вобл. Абвінавачваўся ў «супрацоўніцтве з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі». Асуджаны 24.11.1949 да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены ў 1954. Не рэабілітаваны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Synodus archidioecesana vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ДРАЗДОВІЧ Антоні** [1900—23.12.1939], святар. Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства. Служыў пробашчам парафіі св. Казіміра ў в. Новая Вілейка Кальварыйскага дэканата, Літва. Служыў у складзе 29-й пяхотнай дывізіі, удзельнічаў у 2-й сусветнай вайне. Прымаў удзел у другой Тамашоўскай бітве. Арыштаваны ў верас. 1939 перадавым атрадам камдзіва Філатава. Апазнаны як святар з Віленшчыны. Высланы ў Старабельскі лагер НКВД. 23.12.1939 вывезены ў маскоўскую турму НКВД «Лубянка», потым у мінскую ўнутраную турму НКВД, гэтак званую «амерыканку». Забіты ў Курапатах.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ДРАЗДОВІЧ Ігнаці Юльянавіч** [21 ці 29.1.1903—23.12.1939 ці пасля 1947], святар. Скончыў інстытут місіянераў у Любліне, Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). Прызначаны в. а. пробашча касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Шчытнікі (*Szczytniki*) Брэсцкага пав. і дэканата, цяпер Польшча. З 1932 рэктар капліцы ў в. Астрамечава, цяпер Брэсцкі р-н. З 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву. 28.4.1939 мабілізаваны як капелан, капітан. Арыштаваны ў верас. 1939 перадавым атрадам камдзіва Філатава. Асуджаны 17.(4 ці 5).1941 за «актыўную барацьбу супраць рабочага класа і рэвалюцыйнага руху, праяўленыя на адказнай пасадзе пры царскай уладзе ці ў контррэвалюцыйных урадах» да 10 гадоў ППЛ, этапаваны ў Сібірскі лагер НКВД Новасібірскай вобл.; у сак. 1947 пераведзены ў Паўночна-Кузбаскі лагер МДБ Кемераўскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ДРОНІЧ Рамуальд** [1897—1942, мяст. Беразвечча, цяпер в. Беразвецкі Абруб Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1923). З 1927 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Жодзішкі Вілейскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Ваўкалата Пастаўскага пав. Надвілейскага дэканата, цяпер вёска Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Арыштаваны і закатаваны фашыстамі ў ліп. — жн. 1942.

Гл. таксама арт.: *Вячорак* Уладзіслаў.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ДУБЕЛЬ Стэфан** [18.5.1894—23.12.1939], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (?). Прыняў сакрамэнт святарства. Служыў пробашчам касцёла св. Казіміра ў г. Маладзечна Вілейскага дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Капітан, капелан рэзерву. З 1.1.1939 маёр. Мабілізаваны як капелан 28.4.1939. Арыштаваны. Вывезены ў Казельск. Расстраляны.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ДУБРАЎКА Нікадзім Янавіч** [15.3.1904, в. Патапавічы Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл. — 6.7.1979, Лондан], святар. Вучыўся ў сельскагаспадарча-агародніцкай школе ў Магілёўскай губ. Пасля ліквідацыі школы ў 1917 пераехаў у Мінск, дзе скончыў усеагульную школу. Падчас савецка-польскай вайны выехаў на Помор'е (1920), дзе вучыўся ў прагімназіі ў Новым Месце (*Nowe Miasto*), Польшча, праз год пераехаў у Нясвіж, працягваў вучобу ў гімназіі, падпрацоўваў рэпетытарам. Апошні год давучваўся ў гімназіі ў Лунінцы (1925), цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (4.4.1931). Прызначаны катэхетам парафіі св. Біскупа Мікалая ў мяст. Свір аднайменнага дэканата, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. З 1938 адміністратар філіяльнага касцёла св. Губерта ў в. Бакшты Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1.1.1939 маёр, капелан рэзерву, катэхет дзяржаўнай гімназіі ў Ашмянах. 28.4.1939 мабілізаваны як капелан. У верас. 1939 капелан парафіі св. Казіміра ў в. Новая Вілейка Кальварыйскага дэканата, цяпер Літва. 19.9.1939 перайшоў літоўскую мяжу, апынуўся ў лагеры для інтэрнаваных. У канцы снеж. 1939 пераведзены ў лагер у Вілкаміры (Літва), дзе знаходзіўся да ўваходу савецкіх войскаў у Літву ўвесну 1940. З 29.6.1941 у лагеры ў Гразаўцы, Расія. 11.7.1941 пераведзены ў Казельск,

20.8.1941 вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян. Капелан 15-га і 13-га пяхотных палкоў, пробашч 5-й пяхотнай дывізіі II корпуса ген. **У. Андэрса**. Праз Іран, Ірак, Палестыну і Егіпет прыбыў з войскам у Італію, дзе прыняў удзел у бітвах з фашыстамі. Узнагароджаны «Крыжам за адвагу», «Крыжам Заслугі з Мячамі», медалямі. З 6.5.1945 пробашч Базы II Корпусу. У 1946 пасля дэмабілізацыі выехаў у Вялікабрытанію. Працаваў у польскай дыяспары ў Фокслеі і Хэрэфордзе. З 1949 у ЗША, дзе служыў пробашчам у парафіі св. Юзафа ў г. Мантана. З 1952 пробашч касцёла св. Тадэвуша ў Джоліет, штат Ілінойс. У пачатку ліп. 1979 па дарозе ў Польшчу затрымаўся ў Лондане, каб сустрэцца з пляменнікам і сябрамі, але раптоўна памёр.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ДУЛІНЕЦ Антоні** [20.4.1889, в. Мосар Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. — 21.2.1966], святар. З сялянскай сям'і. У 1907 прыехаў у Санкт-Пецярбург, працаваў памочнікам бухгалтара ў ваенным порце, завочна вучыўся. У 1917 здаў экзамен за 4 класы гімназіі. Скончыў духоўную семінарыю ў Кельцах (1926). Прыняў сакрамэнт святарства (1926). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Браньск (*Brańsk*) Бельскага, потым Бранскага дэканата, Польшча. З 1929 пробашч парафіі Марач Пінскай дыяцэзіі, цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. Удзельнік 1-й канферэнцыі, прысвечанай царкоўнай уніі (23—24.4.1930, Пінск). З 1931 да пачатку 2-й сусветнай вайны служыў у парафіяльным касцёле св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Гранне (*Granne*) Бельска-Падляшскага пав. Цеханавецкага дэканата,

Польшча. З 1940 пробашч касцёла Апекі НПМ Ружанцовай у в. Сігневічы Пружанскага дэканата, цяпер Бярозаўскі р-н Брэсцкай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны садзейнічаў беларусізацыі Касцёла. Арыштаваны ў лют. 1949. Асуджаны да 10 (?) гадоў ППЛ. Этапаваны ў адзін з лагераў ГУЛАГу. Вызвалены ў 1954. Зарэгістраваны пробашчам парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Будслаў Вілейскага дэканата, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; Hlebowicz A. Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992. Gdańsk, 1993; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ДЫЯКОЎСКІ Напалеон** [1.7(ці 9).1874, Ашмянскі пав. Віленскай губ. — жн. 1920], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (1903). Прызначаны вікарыем парафіі св. Тэрэзы ў Вільні. У 1905 стварыў аб'яднанне «Устрыманне і праца». Арганізаваў майстэрню і рамесніцкую вучэльню з інтэрнатам для дзяцей з бедных сем'яў. З 1909 пробашч касцёла св. Стэфана ў Вільні, пазней — парафіі Усіх Святых. Падчас польска-савецкай вайны жыў у Гродне. Арыштаваны бальшавікамі ў пачатку жн. 1920. Зняволены ў Гродзенскай турме. Паміж 10 і 15 жн. (паводле іншых звестак, 5 і 6 жн.) 1920 па загадзе начальніка турмы выведзены ноччу з турмы і расстраляны «за спробу ўцёкаў».

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ДЭЙНІС Вінцэнт Вінцэнтавіч** [1880, Рыга — каля 1955, ЗША], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1.3.1903). Прызначаны вікарыем касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Дзвінску Віцебскай губ., цяпер Даўгаўпілс, Літва. З 1905 адміністратар парафіі св. Аўгусціна ў в. Капаткевічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. У снеж. 1908 высланы царскімі ўладамі ў кляштар дамініканцаў у в. Аглона (40 км ад Дзвінска). У 1909 адміністратар парафіі Яна Хрысціцеля ў Ямбургу Санкт-Пецярбургскага дэканата, потым катэхет Рыжскай гімназіі, пробашч парафіі ў мяст. Юр'еў Рыжскага дэканата. З 1912 у філіяльным касцёле Маці Божай Ружанцовай у в. Грос-Ведэр, цяпер Латвія. Некаторы час служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у г. Ромны, Украіна. З 1923 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Пскове, касцёлаў у г. Дно і г. Востраў, цяпер Пскоўскай вобл., Расія. З 1925 рэктар капліцы Беззаганнага Зачацця НПМ у Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. Арыштаваны 5.2.1928. Абвінавачваўся ў «навучанні непаўнагадовых рэлігійным навукам, кіраванні нелегальным кляштарам, зборы сродкаў для дапамогі арыштаваным ксяндзам». Асуджаны калегіяй АДПУ 13.8.1928 да 8 гадоў ППЛ. 25.8.1928 этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. У 1930 з 32 святарамі накіраваны на востраў Анзер. Каля месяца знаходзіўся ў турэмным ізалятары. 9.7.1932 калегіяй АДПУ Ленінградскай ВА абвінавачаны ў «стварэнні (з 7 ксяндзамі) аб'яднання, якое праводзіла антысавецкую агітацыю, здзяйсненні тайных набажэнстваў і рэлігійных абрадаў, падтрымцы таемнага кантакту ў мэтах перадачы за мяжу шпіёнскай інфармацыі пра становішча каталікаў у СССР». Пасля заявы Д. на следстве аб «гатоўнасці аддаць жыццё за свае рэлігійныя перакананні» вывезены як «незвычайна смелы і энергічны кіраўнік групы ксяндзоў» у турму на вул. Шпалернай у Ленінградзе. У чэрв. 1933 пераведзены ў карны ізалятар. 10.8.1933 з ксяндзом Т. *Матулёнісам* этапаваны ў Бутырскую турму Масквы.

Вызвалены 19.10.1933 па абмене 10 ксяндзоў на літоўскіх камуністаў. Аднавіў дзейнасць па зборы матэрыяльнай дапамогі арыштаваным святарам. З 1934 катэхет у г. Талін, Эстонія. У чэрв. 1934 наведаў Вільню, дзе даў вялікае інтэрв'ю для польскай прэсы пра сваё жыццё ў СССР. У 1944 выехаў у Германію. З 1952 жыў у ЗША.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ЕНДРЫСІК (ЯНДРЫСІК) Севярын** [? — 3.10.1942, Дахаў], дамініканец. На 1.5.1936 капелан польскага войска ў званні маёр. З 18.2.1939 пробашч касцёла св. Казіміра ў Маладзечне, цяпер райцэнтр Мінскай вобл., і ў Слоніме, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Мабілізаваны як капелан у 20-ю польскую дывізію. Удзельнічаў у абароне Варшавы. Арыштаваны немцамі. Вывезены ў Хохенштайн, потым у Ротэнбург, Бухенвальд, Дахаў. Загінуў у лагеры.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЕРАНОВІЧ Агата-Галіна Антонаўна** [1915, Магілёў — ?], арганістка. З польскай рабочай сям'і. Да арышту працавала ў магілёўскім касцёле. Арыштавана 23.8.1937. Праходзіла па адной справе (№ 3225; захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) са святарамі Паўлам *Казюнасам*, Адольфам *Кашчыцам,* парафіянамі маляром **Паўловічам Станіславам**, медсястрой **Шадурскай Вільгельмінай**. Асуджана 27.10.1937 тройкай НКВД як «удзельніца ПАВ» і за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 10 гадоў ППЛ. Этапавана, верагодна, у Сібірскі лагер НКВД Новасібірскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 17.12.1957 трыбуналам БВА.

Святары расстраляны з парафіянамі 31.10.1937.

Кр.: *БНДЦЭД*; Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Магілёва. Мн., 1998.

**ЁДАКАС (ЯДОКАС) Міхал (Мечыслаў) Антонавіч** [12.8.1891, Віленская губ. — пасля 1945], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1913 ці 1914). Прызначаны вікарыем касцёла Звеставання НПМ у Санкт-Пецярбургу і катэхетам вайсковых школ. У 1915 пераведзены вікарыем парафіі Унебаўзяцця НПМ у Магілёве. У 1916 памочнік ваеннага капелана ў Маскве. З 1918 вікарый касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла. З 1923 адміністратар парафіі Узвышэння Св. Крыжа ва Уфе, Узвышэння Св. Крыжа ў Сімбірску (цяпер Ульянаўск), Узвышэння Св. Крыжа ў Казані. З 1.9.1926 Апостальскі адміністратар Самарскай дыяцэзіі. Арыштаваны ў снеж. 1926. Неўзабаве вызвалены. Зноў арыштаваны 1.4.1929. Высланы на 3 гады ў Паўночны край, адкуль вызвалены датэрмінова. Са снежн. 1929 зноў служыў ва Уфімскім касцёле. Чарговы раз арыштаваны 22.11.1933. Прыгавораны 15.3.1934 за «шпіянаж» да 10 гадоў ППЛ. 24.5.1934 прыбыў з Уфімскай турмы ва Ухта-Пячорскі лагер НКВД Комі АССР (пас. Чыб'ю, цяпер Ухта). 25.10.1934 пераведзены ў Беламорска-Балтыйскі лагер НКВД Карэльскай АССР. Паводле звестак Польскай амбасады ад 28.6.1938, чарговы раз арыштаваны ў 1937. Вызвалены (1944?). З 1945 пробашч касцёла ў Шыляль (Шыталь), Літва. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ЖАБРОЎСКІ Лявон** [1876 — ?], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1903). Прызначаны вікарыем парафіі св. Тэрэзы ў Вільні. З 1904 прафесар, магістр тэалогіі Віленскай семінарыі, абаронца ў дыяцэзіяльным Біскупскім судзе. Служыў пробашчам парафіі св. Францішка ў Вільні, дэкан. З 1916 у фарным касцёле св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 1927 сінадальны суддзя, візітатар навучання рэлігіі, ганаровы канонік Віленскай дыяцэзіі. Працаваў у камісіі па адбудове касцёлаў, з 1935 у Арцыбіскупскім судзе. З 1939 таемны папскі камергер дыяцэзіі. Арыштаваны ў 1939 ці 1940. Пераведзены ў Мінскую ўнутраную турму НКВД. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЖАБРОЎСКІ Тамаш Ігнатавіч** [18.9.1877, Ашмяны Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — 1950, ГУЛАГ], святар. З польскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (12.6.1907). Служыў вікарыем касцёла Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва. З 1908 адміністратар, потым пробашч парафіі св. Уладзіслава Венгерскага ў в. Суботнікі Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1932 дэкан і пробашч касцёла Звеставання НПМ у в. Вішнева, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны НКВД увосень 1939. Перавезены ў Мінск. Этапаваны ў Котласкі лагер НКВД Архангельскай вобл. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w*

*ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЖАК Ядвіга-Караліна (Марыя-Імэльда)** [29.12.1892, Асвенцім, Польшча — 1.8.1943], законніца. Скончыла настаўніцкую гімназію. У 1911 (ці 1918) уступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. У 1922 склала першыя законныя шлюбы, прыняла імя Марыя-Імэльда ад Езуса Гостыі (*Hostija*). У 1928 у Гродне склала вечныя законныя шлюбы. З 1936 знаходзілася ў кляштары назарэтанак у Наваградку, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У ноч з 17 на 18.7.1943 гестапа арыштавала 120 жыхароў Наваградка, і настаяцельніца і законніцы кляштара прапанавалі сябе замест арыштаваных. Вечарам 31.7.1943 настаяцельніцу і 10 законніц, сярод якіх была і Ж., выклікалі ў акруговы камісарыят і на світанку расстралялі ў ваколіцах горада. 5.3.2000 далучана да ліку благаслаўлёных.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЖАМОЙТУК Язэп-Станіслаў** [(2 ці 12).1.1884 — ?], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Прызначаны вікарыем Мінскага катэдральнага касцёла Імя НПМ. У 1910—11 у касцёле Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў в. Ракаў, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. У 1912 у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Волма, цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. У 1915—18 вікарый касцёла Нараджэння НПМ у Барысаве Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1919 адміністратар касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Ганявічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер у складзе в. Юркавічы Лагойскага р-на Мінскай вобл. Шмат разоў арыштоўваўся. Пасля чарговага выкліку ў мінскае АДПУ абвясціў 8.9.1929

з амбону, што пакідае святарства, і сказаў антырэлігійную прамову (пра гэта напісала мінская польскамоўная газ. «Orka»). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

**ЖАЎНЯРОВІЧ Ігнат Францавіч** [7.11(ці 20.12).1890, Віленская губ. — жн. 1937, в. Далінскае каля Караганды, Казахстан], святар, грамадскі і культурны дзеяч. У 1912 скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. У 1913—14 вучыўся ў мітрапалітальнай духоўнай акадэміі, уваходзіў у культурна-асветны гурток бел. студэнтаў. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). У ліст. 1915 прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Прыдруйск Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Піедруя, Латвія (паводле іншых звестак — парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Смаленску, Расія). 22.12.1915 камандзіраваны як катэхет у парафію Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Рыбінску (цяпер райцэнтр Яраслаўскай вобл., Расія) у дапамогу мясцоваму ксяндзу. Адначасова працаваў катэхетам у навучальных установах горада. З 17.2.1917 пробашч рыбінскага касцёла. Пазней пераведзены ў Магілёўскую архідыяцэзію. Удзельнік 1-га з'езда беларускага каталіцкага духавенства (Мінск, 24—25.5.1917). Член саюза ксяндзоў-беларусаў. З 1921 адміністратар парафіі св. Юзафа Абранніка ў Оршы Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1924 в. а. пробашча касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Маскве. У 1925—28 адміністратар касцёла св. Людвіка ў в. Свяцілавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл., потым служыў у парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Смаленску. Арыштаваны АДПУ 22.11.1929. Асуджаны 10.4.1930 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Канск Краснаярскага краю. 6.11.1930 зноў арыштаваны і прыгавораны да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны

ў Салавецкі лагер НКВД Карэльскай АССР (востраў Анзер), куда прыбыў 5.12.1930. Чарговы раз арыштаваны 9 (ці 5).7.1932 па групавой справе каталіцкага духавенства, абвінавачанага ў «арганізацыі антысавецкай групоўкі, якая праводзіла тайныя набажэнствы сярод зняволеных і здзяйсняла сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару». Следства хадайнічала аб павелічэнні тэрміну да 10 гадоў. У ліп. 1934 вывезены ў Рыбінск. Вызвалены. Са жн. 1934 зноў пробашч рыбінскага касцёла. Арыштаваны ў снеж. 1935 ці ў студз. 1936. Асуджаны 1.2.1936 да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Карагандзінскі лагер НКВД Казахскай ССР. Апошні ліст святара ў Польскі Чырвоны Крыж датаваны 15.1.1937. Польская амбасада атрымала 28.6.1938 інфармацыю, што Ж. памёр у зняволенні.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Stankiewicz A*. Rodnaja mowa u światyniach. Wilnia, 1929; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*.

**ЖАЎНЯРОВІЧ Уладзіслаў Іпалітавіч** [20 (ці 26).12.1885, хут. Свідэршчына Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — 5.10.1937, Вяліж, Смаленская вобл., Расія, турма НКВД], святар. З сям'і бел. службоўца. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. З 1921 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Смаляны Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. З 1926 абслугоўваў і касцёл НПМ у мяст. Абольцы Аршанскага пав., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 26/27.2.1927 у Віцебску. Асуджаны калегіяй

АДПУ 18.4.1927 за «антысавецкую агітацыю» і «выдаванне сакрэтных звестак» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Карэльскай АССР, куды прыбыў 5.12.1927. Зняволенне 8.5.1930 заменена 3-гадовай высылкай. З верас. 1930 знаходзіўся ў в. Прываліхіна Канскага р-на Краснаярскага краю. Вызвалены 3.5.1933. Са студз. 1934 жыў у Арле. У жн. 1934 пераехаў у Вяліж Смаленскай вобл. Паўторна арыштаваны 20.8.1937. Асуджаны 27.9.1937 да ВМП. Расстраляны. Па першай асабовай справе (№ 23393-п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны 10.11.1993 пракуратурай Гродзенскай вобл., па другой (№ 24133-с) рэабілітаваны пракуратурай Смаленскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Жертвы политического террора в СССР*.

**ЖАЎНЯРОЎСКІ Антон Яфімавіч** [1870, Віцебск — ?], парафіянін. Працаваў буфетчыкам Варшаўскага вакзала ў Ленінградзе. Арыштаваны ў крас. 1932 па справе «**Пранцкеціса** і інш.». Вызвалены ў ліп. 1932. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**ЖАЎРЫД Ян Раймундавіч** [28.3.1885 ці 1884, Бабруйск Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. (паводле іншых звестак, в. Краснаполле Рэчыцкага пав. Мінскай губ, цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл.) — 1.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], святар. З бел. шляхецкай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1908). Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія

Падуанскага ў Віцебску. З 1910 служыў у філіяльным (парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Антушы) касцёле Нараджэння НПМ у в. Люшаў Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Буда-Кашалёўскі р-н Гомельскай вобл. З 1912 у капліцы (парафіі ў Петрыкаве) Найсвяцейшага Сэрца Езуса у мяст. Лельчыцы Мазырскага пав. Мінскай губ, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. З 1915 першы вікарый касцёла Найсвяцейшай Тройцы (св. Роха) у Мінску. У 1922 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у Мазыры Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл., касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны 21.4.1928 у Бабруйску. Асуджаны 25.3.1929 калегіяй АДПУ «за шпіянаж» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., куды дастаўлены 4.7.1929. Пазней пераведзены на востраў Анзер. Консульскі дэпартамент МЗС Польшчы ў лісце да прымаса Польшчы ад 20.12.1929, дзе быў пададзены спіс ксяндзоў, якія заставаліся на волі ў БССР, інфармаваў аб арышце святара і яго прысудзе, а таксама пераказваў просьбу ксяндза аб дапамозе і даваў адрас: Салаўкі, 2-е аддзяленне, Камандзіроўка Бялуж’я. У 1932 арыштаваны ў ліку 32 святароў па групавой справе каталіцкага духавенства, абвінавачанага «ў стварэнні контррэвалюцыйнай групоўкі, якая вяла антысавецкую агітацыю, тайна адпраўляла багаслоўскія і рэлігійныя абрады і здзяйсняла нелегальную сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару пра становішча католікаў у СССР». 9.7.1932 следства прыняло рашэнне: да канца тэрміну зняволення трымаць ксяндза на астравах у ізаляцыі ад астатніх святароў. Зноў арыштаваны 14.10.1937. Прыгавораны тройкай НКВД Ленінградскай вобл. да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 6.6.1991 Вярхоўным судом Беларусі. Асабовая справа Ж. № 15026 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Памятная книжка Минской губернии; БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в*

*тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; З асабістага архіва У.Васькова.*

**ЖУК Ян Вінцэнтавіч** [13.2.1897, в. Матукі Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — 23.3.1974, Росаш (*Rossosz*), Польшча], святар. У 1910 з-за цяжкага матэрыяльнага становішча сям'і вымушаны спыніць вучобу ў пачатковай школе ў Мёрах, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., але яго імкненне да адукацыі заўважыў інспектар усеагульных школ Дзісенскага пав. Нячаеў, і хлопца прынялі ў павятовую школу ў Дзісне. Пасля яе заканчэння (1914) паступіў у Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу, але не змог яе скончыць з-за кастрычніцкага перавароту 1917. У 1918 пераехаў у Мінск, дзе скончыў навучанне. Прыняў сакрамэнт святарства (7.3.1920). 8.3.1920 прызначаны вікарыем касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Вілейка аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Неўзабаве накіраваны (як нам. пробашча **Баляслава Шылка (Шылко)**, які захварэў і павінен быў выехаць на лячэнне) у парафію Найсвяцейшай Тройцы ў в. Новы Пагост, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. У 1923 прызначаны пробашчам касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Луконіца Слонімскага дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл., адкуль у 1925 перайшоў у парафію Унебаўзяцця НПМ у в. Дзеркаўшчына, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. У 1927 вярнуўся ў Луконіцу. З 1930 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Судэрва, Літва. У 1935 пераведзены ў касцёл Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Шаркаўшчына, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Увесну 1939 прызначаны пробашчам парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Плюсы, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны ў чэрв. 1940. Этапаваны ў Краснаярскі край. Працаваў у адным з мясцовых калгасаў. З-за хваробы пераведзены на лягчэйшую працу — вартаўніка збожжасховішча. Увосень 1941 пераведзены на больш цяжкую працу, на лесапільню. Праводзіў таемную душпастырскую

дзейнасць. У канцы 1943 этапаваны ў лагер Уст-Порт за 100 км ад Нарыльска. Праз нейкі час працу на лесапільні замянілі лягчэйшай — на фабрыцы кансерваў. Праз 6 гадоў пераведзены ў Канск (Краснаярскі край), дзе зноў працаваў на лесапільні. Праз год пераведзены ў Абан, дзе працаваў у лесе, потым касірам у канторы. 9.12.1955 выехаў у Польшчу. Да 1967 пробашч касцёла ў в. Жэшчынка (*Żeszczynka*), Польшча.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЖУКОЎСКІ Антоні Юзафавіч** [25.2.1885, Барысаў Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. — 12.10.1937, Новасібірск, турма НКВД], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Служыў у парафіі Перамянення Пана ў Благавешчанску, філіяльным касцёле Найсвяцейшага Сэрца НПМ у Барнауле Томскага дэканата, потым пробашч і дэкан парафіі Унебаўзяцця НПМ у Іркуцку. У 1920 арыштаваны як закладнік. Вызвалены праз 8 месяцаў. У 1923 зноў у Барнауле. У першай палове 1925 служыў у капліцы ў с. Пераменаўка Омскага дэканата, потым у касцёле св. Казіміра ў Нованікалаеўску Томскага дэканата. У чэрв. 1925 пробашч іркуцкай парафіі. Зноў арыштаваны 17.8.1926. Асуджаны калегіяй АДПУ ў кастр. 1926 за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Вішэрскі лагер АДПУ Уральскай вобл. 17.8.1928 вызвалены і высланы на 3 гады ў Сыктыўкар. Вызвалены 28.10.1933. У студз. 1934 вярнуўся ў Іркуцкі касцёл. У пачатку ліп. 1937 па просьбах парафіян выехаў у Томск, каб правесці набажэнства. Арыштаваны НКВД 14.7.1937. Пераведзены ў Новасібірскую турму. Падчас следства катаваны, прызнаўся ў «падрыхтоўцы вайсковых паўстанчых аддзелаў». Асуджаны 4.10.1937 як «член контррэвалюцыйнай шпіёнскай

дыверсійна-паўстанцкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.9.1989.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Книга памяти томичей*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР;* Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; www.memo.ru/history/religion/katoliki.htm.

**ЖУРАЎСКІ Караль** [1903—1994, Вроцлаўскае ваяв., Польшча], святар[1]. Прыняў сакрамэнт святарства (1933). Прызначаны в. а. вікарыя парафіяльнага касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Мядзведзічы Баранавіцкага пав. Ляхавіцкага дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1939 вікарый касцёла св. Антонія Падуанскага ў Баранавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., паводле некаторых звестак, таксама абслугоўваў касцёл Божага Цела ў в. Крошын Наваградскага пав., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Збіраў успаміны пра паэта **Паўлюка Багрыма**, зрабіў фотакопіі адпаведных дакументаў. Падрыхтаваў рукапіс па гісторыі мястэчка. Арыштаваны НКВД у 1940. Пасля вайны жыў у Польшчы. У 1988 даслаў у Інстытут літаратуры АН БССР захаваныя ім матэрыялы пра П. Багрыма і свой рукапіс пра гісторыю сям'і паэта.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Янушкевіч Я*. «Зайграй, зайграй, хлопча малы…» // *Культура*. 1992. 26 кастр.; *Яго ж.* «Ледзьве здымкі ўратаваў…» // *ЛіМ*. 1988. 4 ліст.; *Яго ж.* За архіўным парогам. Мн., 2002.

---

[1] Не блытаць: **Жураўскі Караль Міхайлавіч** [1904, в. Суж Кіеўскай губ. — 11.11.1937, ГУЛАГ]. З польскай сям'і. Арыштаваны і 19.9.1937 асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны на ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР. Рэабілітаваны 14.1.1972 прэзідыумам Вярхоўнага суда Карэльскай ССР.

Кр.: *Жертвы политического террора в СССР.*

**ЖЫВІЦКІ Ян Яўстафавіч** [16.5.1884—1974], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). У 1915 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Новы Пагост Дзісенскага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. У тым жа годзе пераведзены вайсковым капеланам у Вільню. З 1931 вайсковы капелан ў Гродне, дэкан. Мабілізаваны 2.9.1939 як капелан. Арыштаваны НКВД пасля 1939.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЖЭЙДЗІС Сігізмунд Мартынавіч** [1898, Вільня, цяпер Вільнюс, Літва — ?], святар. З польскай рабочай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1924). У 1928 вікарый парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Ашмяны, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У 1931—32 у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Докшыцы, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1933 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Прыязнь Свянцянскага пав. і дэканата, цяпер Літва. У 1935 у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Лінгмяны, Літва. У 1940-я пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Сурвілішкі Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 24.12.1947. Асуджаны асобай нарадай пры МДБ 30.10.1948 за «правядзенне антысавецкай агітацыі», «спробу нелегальнага пераходу дзяржаўнай мяжы» і «сувязь з нацыяналістычнай бандай» да 10 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.10.1994 пракуратурай Гродзенскай вобл. Асабовая справа Ж. № п-21401 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; НАРБ, ІКБР.*

**ЖЭМЛА Антоні** [1894—15.12.1942], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). З 1925 адміністратар парафіі Звеставання НПМ у в. Альковічы Вілейскага дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1931 ці 1932 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Касцяневічы Вілейскага пав. і дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. Расстраляны гітлераўцамі падчас набажэнства.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ЗАБАРОЎСКІ Вацлаў Францавіч** [29.4 (ці 26.9).1904, в. Блага Кельцкага пав., Польшча — 14.5.1958, Варшава], святар. 23.8.1921 уступіў у ордэн езуітаў у Старай Весі (*Stara Wieś*), Польшча. Вучыўся ў мясцовай гімназіі, пасля ў Пінску. Прыняў сакрамэнт святарства (24.6.1938, Люблін). Накіраваны ў Калегіум св. Казіміра ў Вільні. З пачатку 2-й сусветнай вайны в. а. адміністратара касцёла св. Станіслава ў в. Казачызна Браслаўскага дэканата, цяпер Літва. З мая 1941 вікарый парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Опса Браслаўскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Ратуючыся ад арышту, перайшоў на нелегальнае становішча. З мая 1942 пробашч касцёла св. Тэрэзы ў в. Урбаны, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Са студз. 1943 капелан партызанскага атрада Арміі Краёвай у Турмонтах. Арыштаваны МДБ 22.12.1950. Перавезены ў Браслаў, пасля ў Полацк Віцебскай вобл. Абвінавачваўся ў «шпіянажы на карысць Ватыкана». Асуджаны 15.3.1951 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. З траўня 1951 у Паўдн.-Кузбаскім лагеры МДБ Кемераўскай вобл. 11.2.1956 тэрмін пакарання зніжаны да 10 гадоў. Вызвалены 30.5.1956 са зняццем судзімасці. Жыў у в. Бяляны (непадалёк ад Урбанаў). 6.3.1958 прыехаў у Варшаву смяротна хворым (лейкемія). Памёр у шпіталі.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЗАБЛУДОЎСКІ Баляслаў Янавіч** [19.4.1907, мяст. Дэнбова (*Dębowo*), Польшча — 25.3.2001, Ёрк, Вялікабрытанія], святар. Скончыў гімназію ў Бельску Падляскім (*Bielsk Podlaski*, Польшча), Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (4.6.1933). Прызначаны вікарыем у парафію

св. Рафала ў Вільні, неўзабаве пераведзены ў касцёл св. Юзафа і НПМ у мяст. Валожын Вішнеўскага дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1934 у парафіі Нараджэння НПМ у мяст. Відзы Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1936 у фарным касцёле св. Францішка ў Гродне, прэфект школ, турэмны капелан. З 2.12.1938 пробашч касцёла св. Апостала Якуба ў в. Пеліканы (Мілюнцы), цяпер Браслаўскі р-н. Пасля прыходу савецкіх войскаў хаваўся на тэрыторыі сваёй парафіі. Арыштаваны 19.9.1939. Уцёк. Жыў у Вільні, потым у Коўне. Зноў арыштаваны вясной 1941. Этапаваны ў Анежскі лагер НКВД Архангельскай вобл. (каля 20 000 зняволеных), куды прыбыў 29.7.1941. У канцы ліп. — пачатку жн. 1941 прайшоў так званы «марш смерці», калі групу з 400 зняволеных без перапынку гналі 19 дзён праз лясы Карэліі на новае месца. Вызвалены 2.12.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. 8.1.1942 уступіў як капелан у армію **У. Андэрса.** У пачатку верас. 1942 выехаў у Іран. У 1943 капелан вайсковага шпіталя. Прымаў удзел у Італьянскай кампаніі 2-га корпуса. Адзначаны «Крыжам Мужных» і «Срэбным Крыжам Заслугі з Мячамі». 12.10.1946 з Польскім войскам прыехаў у Англію. Са снеж. 1948 служыў капеланам польскіх вайскоўцаў і іх сем'яў у Іст Мур Хостал (*East Moor Hostel*), Ёркшыр, дзе пазней з'явілася польская парафія Ёрк. Быў яе пробашчам да 1988. У 1995 узнагароджаны прэзідэнтам Польшчы Л. Валенсам «Рыцарскім Крыжам за заслугі перад Польшчай».

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЗАВІСТОЎСКІ Ян Браніслававіч** [24.6 (ці 7).1894, в. Карабетаўка (Карабітаўка) Уселюбскай вол. Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — 8.6.1967, Браслаў, райцэнтр Віцебскай вобл.], святар. Вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу, дзе ўдзельнічаў у бел. хрысціянскім руху. Фінансава падтрымліваў бел. каталіцкія выданні (газ. «Krynica» і інш.). Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова наведваў ун-т імя Стэфана Баторыя. З 1930 адміністратар касцёла Хрыста Валадара ў в. Лявонпаль Мёрскага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 1937 у парафіі Божага Цела ў мяст. Іказнь таго ж дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, супрацоўнічаў з партызанамі. З 1942 пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Параф'янава Глыбоцкага дэканата, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. Потым у парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Мёры, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., касцёле Нараджэння НПМ у мяст. Відзы, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Адзін з нямногіх, хто прызнаў савецкую ўладу. У 1950 падпісаўся пад Стакгольмскім заклікам у абарону міру і за забарону ядзернай зброі. Арыштаваны 9.2.1951. Асуджаны Полацкім абл. судом 9.9.1951 да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Камышовы лагер (Асоблаг № 10) МДБ Кемераўскай вобл., Расія. Вызвалены 23.6.1954. Вярнуўся на радзіму, зноў служыў у Параф'янаўскім касцёле. Пасля канфлікту з парафіянамі пераехаў у Браслаў.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*.

**ЗАЁНЦ Баляслаў Юзафавіч** [5.10.1913, мяст. Дзяхцінец (*Dziechciniec*), Польшча — 10.3.1984, в. Ідолта, Мёрскі р-н Віцебскай вобл.], святар, марыянін. З сялянскай сям'і. У 1930 скончыў чацвёрты клас ніжэйшай духоўнай семінарыі марыянаў у Скужцы (*Skórzec*), Польшча. 14.8.1930 уступіў у навіцыят марыянскага ордэна ў мяст. Расна, цяпер тэрыторыя Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. (мяст. не існуе). 15.8.1931 склаў першыя законныя шлюбы. Вярнуўся ў Скужэц, дзе скончыў 5-ы клас. У 1932 уступіў у калегіум марыянаў у Бялянах (*Bielany*), каля Варшавы. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Склаў вечныя законныя шлюбы (15.8.1935). Вывучаў філасофію ў Варшаўскай духоўнай семінарыі. З 1937 в. а. выхавацеля гімназіі, у якой навучэнцаў рыхтавалі да ўступлення ў ордэн ювеністаў. 6.9.1939 з клерыкамі пакінуў Бяляны, сыходзячы ад нямецкіх войскаў на ўсход. Праз Скужэц яны паехалі ў Расна, потым у мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. За 30 км да Друі даведаліся, што ў мяст. знаходзяцца савецкія салдаты. Перайшлі літоўскую мяжу ў Дукштах Піярскіх (Літва), далучыліся да літоўскіх марыянаў. З. скончыў тэалагічныя курсы ў Коўне, цяпер Каўнас, Літва, прыняў сакрамэнт святарства (28.10.1942). Верагодна, улетку 1943 прызначаны вікарыем парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1945 ці 1946 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Ідолта. У 1949, калі пачаліся арышты святароў, хаваўся ў Друі, потым на тэрыторыі парафіі Плюсы. У ліп. 1953 вярнуўся ў Ідолту.

Кр.: *Bukowicz J. Świadkowie wiary.* Marianie przesladowani pzez hitleryzm i komunizm. Warszawa, 2001.

**ЗАКРЭЎСКІ Ігнат Феліксавіч** [1902, мяст. Лебедзева Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Працаваў у касцёле Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны, цяпер Ашмянскі р-н

Гродзенскай вобл. Быў жанаты, гадаваў сына. Арыштаваны 24.1.1945. Абвінавачваўся ў прыналежнасці да белапольскай паўстанцкай арганізацыі Армія Краёва. Вызвалены 5.12.1945. Рэабілітаваны. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа З. № п-6577 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ЗАХАРЭЎСКІ Дзяніс Адольфавіч** [1888 ці 1889, в. Маеўка Камянец-Падольскай губ., цяпер Украіна — 2.4.1955, ГУЛАГ], святар. Скончыў 7 класаў гімназіі і духоўную семінарыю ў Коўне, цяпер Каўнас, Літва. Прыняў сакрамэнт святарства (1914). З 1925 пробашч парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Опса Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1935 адміністратар касцёла св. Сымона і Юды Тадэвуша ў в. Лаздуны Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Паводле некаторых звестак, у 1940-я таксама абслугоўваў парафію св. Казіміра ў Маладзечне Мінскай вобл. Арыштаваны 16.6 (ці 17.7).1948. Пасля допытаў у турме МДБ у сваім апошнім слове на «судзе» 15.10.1948 папрасіў літасці: *«Я вінаваты, я каюся ў здзяйсненні злачынства, прашу мяне памілаваць, бо я стары».* Але гэта не паўплывала на канчатковае рашэнне. Асуджаны 25.2.1949 асобай нарадай пры МДБ да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ. Пісаў скаргі ў Вярхоўны суд СССР, Генеральнаму пракурору СССР, але станоўчага адказу не атрымаў. 10.9.1954 Кемераўскі абл. суд на выязным пасяджэнні па справе аб датэрміновым вызваленні інвалідаў адмовіў святару «з прычыны цяжкага злачынства». Толькі 9(ці 19).1.1955 пастановай Вярхоўнага суда БССР смяротна хвораму святару тэрмін пакарання быў зніжаны да 7 гадоў, але неўзабаве ён памёр.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w*

*golgocie Wschodu;Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ЗДАНОВІЧ Эдвард Лукашавіч** [20.11.1878, в. Веранова (*Werenowo*), Польшча — 1950, ГУЛАГ], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). Прызначаны вікарыем у Беластоку (*Białystok*), потым в. а. пробашча парафіі Звеставання НПМ у мяст. Тракелі, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1908 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Няцеча Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. З 1927 адміністратар парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Ельня Лідскага дэканата, цяпер таго ж р-на. Адначасова абслугоўваў філіяльны касцёл св. Яўхіма і Ганны ў в. Агароднікі (Вашкевічы), цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны НКВД пасля 17.9.1939. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Котласкі лагер НКВД Архангельскай вобл. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЗЕЯ Ян** [1.3.1897, мяст. Оссе (*Osse*) Апочненскага пав., Польшча — 19.10.1991, Варшава], святар. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1919, Сандамір (*Sandomierz*). У 1919—20 служыў у Пінскай дыяцэзіі. У 1930 у парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Лагішын, цяпер г. п. Пінскага р-на Брэсцкай вобл. З 1937 у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Янава, цяпер райцэнтр Іванава Брэсцкай вобл. З 1939 абслугоўваў і капліцу (парафіі ў Янаве) у в. Маладава. З сак. 1939 капелан 83-га пяхотнага палка ў Кобрыне.

Арыштаваны немцамі 2.10.1939. Этапаваны ў Модлін (*Modlin*), пасля ў Легіонава (*Legionowo*). Уцёк 30.11.1939. У 1941—44 капелан АК, вярхоўны святар. Удзельнічаў у Варшаўскім паўстанні на Макатове. Зноў арыштаваны немцамі ў 1944. У ліст. 1944 этапаваны на прымусовыя працы ў Фрамборк (*Frombork*), Мастэрдорф (*Mosterdorf*), Штральзунд (*Stralsund*), Барт (*Barth*), Германія. Вызвалены 3.5.1945.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЗІМНАХ Антоні** [1836 — ?], святар. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1864). Да 1914 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Рыконтах, цяпер Літва. З 1914 служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Мейшагола, цяпер Літва. З 1920—21, верагодна, у Мінскім пав. Арыштаваны. Этапаваны ў Яраслаўскі палітычны ізалятар (у 1921 знаходзіўся там са святаром **Т. Г. Скальскім** (1877—1958). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

**ЗОМБАК Антоні Янавіч** [9.1.1899, Гарліцы (*Gorlice*), Польшча — 5.4.1989], законнік. 22.7.1917 у Старай Весі (*Stara Wieś*) уступіў у ордэн езуітаў. У 1926—27 працаваў выхавацелем у Хыраве (*Chyrów*). Прыняў сакрамэнт святарства (22.6.1930). Прызначаны выкладчыкам Віленскай духоўнай семінарыі. З 1931 віцэ-суперыёр Усходняй місіі езуітаў у в. Альбярцін, цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл. З 1937 прафесар папскай духоўнай семінарыі ў Дубне Валынскай вобл. З 1938 суперыёр Малой усходняй семінарыі ў Вільні, дзе знаходзіўся і падчас 2-й сусветнай вайны. 26.3.1942 арыштаваны гестапа. Вызвалены 16.7.1944. Служыў у парафіі ў в. Прычыны Тургельскага

дэканата, цяпер Літва. З 1946 хаваўся ад бальшавіцкіх уладаў. Арыштаваны 12.4.1950. Абвінавачваўся як «агент Ватыкана». Асуджаны 16.12.1950 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР, потым у лагер у Златавусце. 16.8.1954 арыштаваны ў лагеры і перавезены ў турму МУС № 1 у Чалябінску. 9.9.1955 этапаваны ў Азёрны лагер МДБ Іркуцкай вобл., потым пераведзены ў Паўн.-Усходні лагер МДБ Хабараўскага краю. Вызвалены ў 1956. Вярнуўся ў Беларусь. Жыў у святара Ю. *Марсэнгера* ў в. Краснае. Праводзіў душпастырскую працу ў Оршы, Шабунях, Княжыцах і іншых месцах. Зноў арыштаваны 14.9.1957 (з В. *Язевічам*) за надта актыўную, па меркаванні савецкіх уладаў, душпастырскую дзейнасць. Пад следствам знаходзіўся ў Мінскай турме НКВД. Асуджаны як рэцыдывіст да 3 гадоў высылкі. У ліст. 1957 пераведзены ў турму ў Малдавіі. У 1959 дэпартаваны ў Польшчу. Зняволены ў турме ў Яраславе (*Jarosław*), потым у Седльцах (*Siedlce*). Пасля вызвалення жыў у в. Святая Ліпка (*Święta Lipka*), дзе абслугоўваў паломнікаў.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЗУБКОВІЧ Станіслаў Баляслававіч** [28.12.1912, Гродна — 24.6.1941, Трабы, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл.], святар. Бацька рана памёр (2.1.1919), маці з-за матэрыяльных цяжкасцяў аддала сына ў дзіцячы прытулак, але ў 1922 забрала. Вучыўся ва ўсеагульнай школе, у дзяржаўнай гімназіі імя А. Міцкевіча ў Гродне. У 1933 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Як клерык праводзіў вакацыі ў парафіях у Гродне, Жупранах, Гайдах (*Gajdy*), Баброўшчыне. Адначасова вучыўся на тэалагічным ф-це Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Атрымаў ступень магістра багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (18.6.1939). 2.8.1939 прызначаны

вікарыем касцёла Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Пасля трагічнай смерці ў чэрв. 1940 пробашча касцёла Нараджэння НПМ з в. Трабы, святара В. *Радзько*, стаў адміністратарам парафіі. Расстраляны чырвонаармейцамі па дарозе ў касцёл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЗУБЯЛЕВІЧ Апалінары** [1906—1987], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем і катэхетам парафіі св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Беняконі аднайменнага дэканата Віленскай архідыяцэзіі, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны ў 1940 у Вільні. Этапаваны ў Сібірскія лагеры НКВД. Вызвалены ў 1956. Служыў у парафіі Канвелішкі Воранаўскага р-на. Абслугоўваў в. Геранёны і касцёл у в. Суботнікі Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Пахаваны на могілках в. Канвелішкі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЗЯЛІНСКІ Пётр Пятровіч** [1863, в. Трылесіна Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Быхаўскі р-н Магілёўскай вобл. — 18.10.1931, Усць-Кулам, Комі АССР], святар. Скончыў гімназію ў Магілёве, Магілёўскую духоўную семінарыю і мітрапалітную духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1891). Магістр тэалогіі, катэхет Магілёўскай жаночай гімназіі. З 1894 адміністратар катэдральнага касцёла Унебазўяцця НПМ у Магілёве, з 1904 магілёўскі дэкан. Перыядычна служыў у магілёўскай парафіі св. Казіміра, у кас-

цёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Шклове, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., касцёле Звеставання НПМ у в. Фашчаўка, цяпер Шклоўскі р-н. З 1912 адміністратар парафіі Божага Цела ў мяст. Нясвіж, цяпер райцэнтр Мінскай вобл., дэкан. З 1916 у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Маскве, маскоўскі дэкан. Магілёўскі канонік. Арыштаваны 23.3.1923 па групавой справе каталіцкага духавенства на чале з арцыбіскупам Я. *Цеплякам*. Этапаваны ў Бутырскую турму Масквы, дзе знаходзіўся да чэрв. 1923. Збіраліся асудзіць яго да 3 гадоў ссылкі, але пасля ультыматуму МЗС Польшчы вызвалілі з турмы. Зноў арыштаваны 6.3.1924. Асуджаны калегіяй АДПУ да 5 гадоў высылкі на Урал. У 1924 знаходзіўся ў с. Чардынь Пермскай губ. Адмовіўся ад выезду ў Польшчу (1926). Зноў арыштаваны ў Цвяры ў 1927. Прыгавораны да 3 гадоў высылкі ва Усць-Сысольск Паўночнага краю. 15.1.1930 пераведзены ў Краснакакшайск Комі АССР, потым ва Уфу. Вызвалены 30.6.1930. Зноў арыштаваны ў ліст. 1930. У снеж. 1930 этапаваны ў Бутырку. Асуджаны 5.6.1931 асобай нарадай АДПУ да 3 гадоў ссылкі. У сак. 1931 этапаваны ў Ніжні Ноўгарад (Горкі), у турму Чардынь. Потым пераведзены ў Цвер, пасля ў Акшайск. Памёр у высылцы ва Усць-Куламе (145 км на ўсх. ад Сыктыўкара) Комі АССР ад сыпнога тыфу.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЗЯРНЭК** (*Ziarnek*) **Геркуланус** [1877 — ?], манах бернардынец. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1906). З 1925 захавальнік фондаў касцёла ў мяст. Заслаўе Мінскага пав. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ІБЯНСКІ Юзаф Канстанцінавіч** [1870, в. Жамыйткалі (?) Ковенскай губ. — 1930, ГУЛАГ], святар. З літоўскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1897). Служыў вікарыем парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Прэлі Дзінабургскага пав. Віцебскай губ., цяпер Прэйлі, Латвія. З 1900 у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Яраслаўлі. З 1905 вікарый, потым пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Заскоркі Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. З 1911 служыў у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў г. Вятка, Расія. У 1921 пераведзены ў касцёл Унебаўзяцця НПМ у в. Корань Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. З 1923 пробашч касцёла св. Казіміра ў Лагойску Мінскай вобл. Арыштаваны 15.1.1927. Асуджаны 8.4.1927 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Карэльскай АССР. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 21.4.1992 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа І. № 32887-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии*; *НАРБ, ІКБР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ІВАНОЎ-СТАЛБІНСКІ Дамінік Адольфавіч** [22.11.1880 ці 22.5.1883, Санкт-Пецербург — пасля 1932], святар. З польскай шляхецкай сям'і Адольфа Іванова (бацька якога быў сасланы ў Сібір, дзе памяняў прозвішча Сталбінскі на Іваноў) і Марыі (да замужжа Малецкай). Скончыў гімназію, духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Вучыўся ў духоўнай акадэміі, якую праз 2 гады пакінуў з-за пагрозы туберкулёзу. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). Прызначаны вікарыем касцёла Маці Божай Пакутнай (Балеснай) у г. Рыга, Латвія, паралельна працаваў катэхетам. З 1909 вікарый і катэхет ка-

тэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі, прыватных жаночых гімназій Копіш, Абалонскай, Табалевіч-Федароўскай, дзяржаўных мужчынскай, жаночай гімназій, гандлёвай школы. Улетку 1914 удзельнічаў у Эўхарыстычным кангрэсе ў Лурдзе, Францыя. Вяртаючыся, не паспеў да пачатку 1-й сусветнай вайны перасячы расійскую мяжу і на год затрыманы ў Германіі, спачатку зняволены ў турме, потым знаходзіўся пад наглядам паліцыі. Пасля вяртання служыў у гомельскай парафіі, працаваў у гомельскіх польскіх арганізацыях: Таварыстве Дабрачыннасці, чытацкай, харцэрскай, ПВА (паводле аўтабіяграфіі, напісанай у маскоўскай турме 15.6.1923). Арганізоўваў летнікі для дзяцей. Са жн. 1918 віцэ-сакратар Магілёўскай мітрапалітальнай курыі ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. Чытаў апалагетычныя лекцыі для моладзі ў касцёле св. Казіміра. З верас. 1920, пасля зняволення пробашча В. *Івіцкага*, кіраваў парафіяй св. Станіслава. У 1922—23 выкладаў у падпольнай духоўнай семінарыі ў Петраградзе катэхізм, біблейскую археалогію, Святое Пісанне, кананічнае права. Арыштаваны. Абвінавачваўся ў «шпіянажы на карысць Польшчы» і «антысавецкай дзейнасці» на вядомым маскоўскім працэсе чатырнаццаці петраградскіх святароў на чале з арцыбіскупам Я. *Цеплякам.* Асуджаны 25.3.1923 да 3 гадоў ППЛ. Пакаранне адбываў у Ляфортаўскай і Сакальніцкай турмах. Вызвалены ў студз. 1925. Служыў вікарыем касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. 13.8.1926 стаў адным з двух сведкаў канспіратыўнай кансэкрацыі біскупа **Антонія Малецкага** з Ленінграда, якую выканаў за зачыненымі дзвярыма ў касцёле Парыжскай Божай Маці пасланнік Папы біскуп **Мішэль Д'Эрбіні**. З 1926 інспектар падпольнай семінарыі, выкладаў лацінскую мову і філасофію. Зноў арыштаваны 1.2.1927 са святарамі Паўлам *Хомічам* і Янам *Тройгам*. Абвінавачваўся ў арганізацыі духоўнай семінарыі, сувязі з езуітамі і хаванні польскіх шпіёнаў. Да сярэдзіны 1927 зняволены ў турме на вуліцы Шпалернай. 29.6.1927 калегіяй АДПУ Ленінградскай ВА прыгавораны за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ.

У ліст. 1928 этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. і Комі АССР. У лагеры ў І. скралі адзенне і абутак. Консул Польшчы ў Ленінградзе **Хеліядор Штарк** паслаў яму цёплую бялізну і 10 рублёў дапамогі. У чэрв. 1931 высланы ў Анежскі р-н Архангельскай вобл. Зноў арыштаваны вясной 1932. Этапаваны ў Бутырскую турму Масквы. Асуджаны 4.6.1932 да 3 гадоў ППЛ. Дзякуючы абмену вязнямі паміж Польшчай і СССР прыбыў у Польшчу з 17 святарамі 15.9.1932. Далейшы лёс невядомы.

У схеме Магілёўскай архідыяцэзіі ў 1929 памылкова гаворыцца пра трагічную смерць І. ад абмаражэння ў Салавецкім лагеры ў снеж. 1929.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь;* Книга памяти. Мартиролог Католической Церкви в СССР // Серебрянные нити. М., 2000. С. 333; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; З асабістага архіва У. Васькова.*

**ІВАНОЎСКІ Ігнат Маркавіч** [1872, в. Аўсюкава Вазнясенскай вол. Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Расонскі р-н Віцебскай вобл. — ?], парафіянін касцёла св. Казіміра ў Ленінградзе. Арыштаваны 8.5.1931 па справе «С. *Войны* і інш.». Асуджаны калегіяй АДПУ 7.3.1932 да 3 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ІВІЦКІ Вітольд Браніслававіч** [10.5.1884, Вільня — 22.1.1943], святар. Скончыў духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку, цяпер райцэнтр Мінскай вобл.

З 1909 вікарый касцёла Унебаўзяцця НПМ у Мазыры Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. У 1914—15 вучыўся ў Рыме, атрымаў навуковую ступень доктара кананічнага права. У 1918 прызначаны вікарыем, потым пробашчам касцёла св. Станіслава ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург. Арыштаваны 20.9.1920. Этапаваны ў Маскву. Вызвалены дзякуючы абмену вязнямі паміж Расіяй і Польшчай. З 1922 вікарый касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Нягневічы Наваградскага пав. і дэканата, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. З 1926 пробашч і дэкан катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1934 пробашч касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Брэсце. З 1937 член Пінскай катэдральнай капітулы. З 1939 генеральны вікарый біскупа **К. Букрабы**, брэсцкі дэкан, прафесар Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Пінску. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, дапамагаў яўрэям і палітвязням. Арыштаваны фашыстамі. Выконваў святарскія абавязкі сярод вязняў да смерці, не прыняў ад карнікаў прапановы вызвалення. Расстраляны з 38 закладнікамі ў мяст. Янава, цяпер райцэнтр Іванава Брэсцкай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии*; *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ІГНАТАВІЧУС Зянон** [1908—1975], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (?). Выкладаў літургіку ў Ковенскай духоўнай семінарыі. Са снеж. 1941 у Мінску як капелан літоўскай вайсковай фармацыі, якая супрацоўнічала з немцамі. Наведваў парафіі ў Барысаве, Койданаве, Лагойску, Слуцку, Даўгінаве. Па дарозе з апошняга

пункта абрабаваны і моцна збіты. У Мінску знаходзіўся да 1944, адкуль пераехаў у Італію. Потым пераехаў у Бразілію. Пазней працаваў у Рыме ў Папскім літоўскім калегіуме.

Кр.: *Żurek W. Salezjańscy męczennicy Wschodu.*

**ІГНАТОВІЧ Караліна Людвігаўна** [1894, мяст. Чашнікі Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — верас. 1937, Віцебск (?), турма НКВД], актыўная парафіянка. З польскай рабочай сям'і. Член парафіяльнага актыву Віцебскага касцёла св. Барбары. Арыштавана 24.4.1937. Асуджана асобай нарадай НКВД 25.8.1937 як «удзельніца антысавецкай контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляна.

З І. па адной справе (№ 3979-п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) праходзіў, асуджаны і рэабілітаваны (Вярхоўным судом БССР 17.11.1956) вартаўнік касцёла С. *Казела*.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ІЛЬГІН Вінцэнт Адамавіч** [19.1.1886, каля Дзвінску Віцебскай губ., цяпер Латвія — 24.8.1937, Варшава], святар. З польскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу, вучыўся ў духоўнай акадэміі. Удзельнічаў у бел. нацыянальна-рэлігійным руху. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). З 9.6.1910 в. а. пробашча, з 8.7.1910 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Чачэрск Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. З 1919 адміністратар і дэкан касцёла Унебаўзяцця НПМ у Харкаве, цяпер Украіна. Вызначыўся ахвярнай працай у грамадскіх арганізацыях, якія апекаваліся мясцовымі католікамі. У 1924 і, верагодна, пазней апекаваў парафію Унебаўзяцця НПМ і св. Яна Хрысціцеля ў Чарнігаве, Украіна. Пасланнікам папы Пія XI біскупам **Мішэлем Д'Эрбіны** 15.8.1926 прызначаны апостальскім адміністратарам паўдн.

часткі Магілёўскай архідыяцэзіі з рэзідэнцыяй у Харкаве. Арыштаваны 26.10.1926. Абвінавачваўся ў «адпраўленні рэлігійных абрадаў без рэгістрацыі ў ЗАГСе» і «захоўванні замежных газет». Асуджаны 7.1.1927 калегіяй АДПУ да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Пасля сканчэння тэрміну высланы на 3 гады ў Пінегу (250 км на ўсход ад Архангельска). З грузінскімі каталіцкімі святарамі мусіў у студз. 1930 прайсці пешкі 200 км. Прымас Польшчы **А. Глёнд** хадайнічаў аб унясенні І. ў спіс абмену вязняў. З гэтай просьбай да прымаса звяртаўся былы парафіянін і супрацоўнік І. ў Харкаве **Голіч**. У лісце ад 24.11.1929 ён пісаў: *«Вінцэнт Ільгін быў сапраўдным айцом і апекуном сваіх парафіян, не пакінуў іх і ў той час, калі ўсе ўцякалі ў Польшчу. Няма сям'і, якая б не памятала пра яго».* Прыгавораны калегіяй АДПУ Паўночнага Краю 1.1.1933 да 3 гадоў пазбаўлення волі з забаронай пражывання пасля сканчэння тэрміну ў 12 гарадах СССР. У сак. 1933 знаходзіўся ў Пінезе Мурманскай вобл., у жн. 1933 — у Калужскай турме. Пасля пераведзены ў Маскоўскую «Лубянку». Вызвалены 19.10.1933 дзякуючы абмену вязнямі паміж Літвой і СССР. Жыў у Латвіі, потым у Польшчы. У 1936 капелан кляштара Задзіночання сясцёр сям'і Марыі ў Кастоўцы (*Kostowiec*) каля Варшавы. У 1936—37 вікарый парафіі Маці Божай Ларэтанскай у Варшаве. Памёр ад інфаркту. Пакінуў успаміны пра жыццё ў Расіі і СССР.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *З асабістага архіва У.Васькова.*

**ІНГЯЛЕВІЧ Юзаф Міхайлавіч** [1897, Вільня, цяпер Вільнюс, Літва — 30.8.1973], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова

вучыўся ва ун-це Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1924). Прызначаны вікарыем касцёла св. Арханёла Рафала ў Вільні. З 1929 пробашч парафіі св. Юзафа і НПМ у в. Барадзінічы Мёрскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1937 служыў у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Новы Пагост Мёрскага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Таксама абслугоўваў парафію Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Шаркаўшчына Мёрскага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З ліста заг. аддзела прапаганды і агітацыі Мёрскага РК КП(б)Б Мядзведскага да ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР па БССР Уласевічу (ад 2.3.1948): *«Ксёндз Інгелевіч з прыходам Чырвонай Арміі на тэрыторыю Зах. Беларусі падчас богаслужэнняў праводзіў антысавецкую агітацыю сярод вернікаў. У перыяд часовай акупацыі тэрыторыі Мёрскага р-на нямецкімі войскамі меў сувязь з нямецкімі войскамі і сярод насельніцтва праводзіў антысавецкую работу».* Арыштаваны 3.7.1949. Асуджаны 27.9.1949 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Карагандзінскі лагер МДБ Казахскай ССР. Вызвалены 22(ці 11).9.1954. Вярнуўся ў Беларусь. Служыў пробашчам парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Глыбокім Віцебскай вобл. З 1958 адміністратар касцёла ў г. п. Астравец Гродзенскай вобл., генеральны вікарый паўн.-усходняй часткі Віленскай архідыяцэзіі.

У лют. 1966 святар звярнуўся да старшыні Савета па справах рэлігій пры СМ СССР з «Мемарандумам аб становішчы Касцёла ў Беларусі». Прапаноўвалася «выпрацаваць статус Каталіцкага касцёла ў Савецкім Саюзе; не абмяжоўваць духоўнай дзейнасці святара, здзяйсняць прызначэнне святароў на парафіі духоўным, а не свецкім уладам; дазваляць бесперашкодна пераязджаць на Беларусь святарам з Літвы і Латвіі; дапускаць у духоўныя семінарыі кандыдатаў з Беларусі; выдаваць малітоўнікі». Святар выказваў занепакоенасць

«незадавальняючым станам касцёлаў — помнікаў даўніны, дойлідства, гісторыі, беспадстаўным іх закрыцці» і г. д. 22.10.1966 упаўнаважаны па Гродзенскай вобл. Н. Асененка накіраваў упаўнаважанаму па БССР Г. Кавалёву ліст «Аб няправільных дзеяннях пробашча Астравецкага касцёла», у якім выкладаліся «парушэнні», уключаючы і пасланне «Мемарандума». Рабілася выснова: «*Лічу, што Інгелевіч парушае Савецкае заканадаўства аб культах, умешваецца не толькі ў функцыі выканаўчага органа Астравецкага касцёла, актывізуе не толькі ксяндзоў былога Варнянскага дэканата, але і ксяндзоў іншых парафій. У сувязі з гэтым прашу даць дазвол на зняцце І. з рэгістрацыі».* Рэабілітаваны 8.4.1994 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа І. № 23490-п захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*.

**ІСАЕВІЧ Уладзіслаў Ігнатавіч** [1840 — каля 1925], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1863). Служыў адміністратарам і дэканам касцёла Унебаўзяцця НПМ у Мазыры Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл., парафіі Звеставання НПМ у Петрыкаве, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл., касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Ружаны, цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. З 1907 капелан парафіі бернардзінцаў у мяст. Глуск Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1914 на пенсіі. З 1916 вікарый касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Арыштаваны 30.4.1919, калі ўжо быў сляпым (з епіскапам Э. *Ропам*, святарамі

Я. *Васілеўскім*, **А. Зярчанінавым**[1], А. *Рацэвічам-Рочысам*), як закладнік (пасля заняцця Вільні польскімі войскамі і арышту савецкіх агентаў). Знаходзіўся ў турме па вул. Шпалернай. Вызвалены 5.5.1919 «па прычыне цяжкай хваробы і ўзросту». У 1922—23 вікарый парафіі св. Мікалая ў г. Луга Петраградскага дэканата.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

[1] **Зярчанінаў Аляксей Яўграфавіч** [9.3.1848, в. Барысава Княжынскага пав., Ніжагародскай губ., Расія — 23.9.1933, Ніжні Ноўгарад, Расія], святар. З сям'і праваслаўнага святара. Скончыў Ніжагародскую духоўную семінарыю. Ажаніўся (10.9.1871). Рукапалажаны ў праваслаўныя святары. Служыў у царкве ў роднай вёсцы. 9.1.1896 таемна прыняў сакрамэнт святарства. Але мітрапалітам Сымонам Казлоўскім не быў прыняты ў юрысдыкцыю Каталіцкай царквы. З 17.10.1905 жыў у Санкт-Пецярбургу. У 1907 выехаў у Рым, дзе сустрэўся з Папам Рымскім **Піем X.** 29.6.1907 прызначаны нам. мітрапаліта **Андрэя Шаптыцкага**, старшыні католікаў у Расіі. З 21.5.1908 глава місіі для рускіх католікаў. З 1912 вікарый парафіі св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу. 1.5.1919 арыштаваны з мітрапалітам Э. *Ропам* як закладнік. Вызвалены праз месяц. 12.4.1920 зноў арыштаваны па «польскай справе». Вызвалены 18.4.1920. З лют. 1923 прэлат, з сак. 1923 кіраваў паўночнай часткай Экзархата Рускай Грэка-Каталіцкай Царквы. Чарговы раз арыштаваны 19.11.1923. 19.5.1924 асуджаны да 10 гадоў ППЛ (заменена на тры гады высылкі). З 1924 у Екацярынбургу, з 1926 у Табольску. Зноў арыштаваны 28.5.1926. 19.5.1927 вызвалены з пазбаўленнем права жыць у 6 буйных гарадах і памежных абласцях. З 1927 у Смаленску, з 1929 у Ніжнім Ноўгарадзе.

**КАВАЛЬСКІ Тэадор Браніслававіч** [9.11.1915, г. Хэлмж (*Chełmż*), Польшча — 1945?], марыянін. Пачаў навіцыят у Скуржцу (*Skórzec*), Польшча, 14.8.1935. Склаў першыя законныя шлюбы (15.8.1936). У 1936—38 жыў у Бялянах (*Bielany*) пад Варшавай, вывучаў філасофію ў Варшаўскай духоўнай семінарыі. У 1938 пераведзены ў мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Працаваў сакратаром у гімназіі імя Стэфана Баторыя, памочнікам эканома. У 1939 паехаў на вакацыі у кляштар марыянаў у мяст. Расна, цяпер тэрыторыя Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. (мяст. не існуе), дзе знаходзіўся з іншымі клерыкамі і ўцекачамі з Варшавы. Праўдападобна, што святар **Юзаф Яжэньбоўскі**, які вывез частку экспанатаў з гістарычнага музея ў Бялянах, аддаў некаторыя прадметы на захаванне К. Арыштаваны на мяжы, калі вяртаўся з каштоўнасцямі ў Варшаву. Зняволены ў Брэсцкай крэпасці. Уцёк у Бяляны. Прызначаны выхавацелем у інтэрнаце Бялянскай школы. У 1940 вывучаў тэалогію. У пачатку 1944 атрымаў субдыяканскае свячэнне. Падчас варшаўскага паўстання працаваў санітарам. Вывезены немцамі ў Вестфалію ў канцэнтрацыйны ці вайсковы лагер. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Bukowicz J. Świadkowie wiary.* Marianie przesladowani pzez hitleryzm i komunizm. Warszawa, 2001.

**КАВАЛЬЧУК Юзаф** [1894—1955, ГУЛАГ], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1927). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзятлава аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1930 (?) вікарый парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1931 катэхет у Вільні. З 1935 катэхет і рэктар касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Мікалаева Дзісенскага пав. Глыбоцкага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. На 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву 82-га пяхотнага палка ў Брэсце. Мабілізаваны

28.4.1939. З 5.9.1939 прымаў удзел у абароне Модліна (*Modlin*). Арыштаваны ў 1947. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КАЗЕЛА Станіслаў Зянонавіч** [1876, в. Сар'я Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — ?], вартаўнік. З сям'і службоўца. Працаваў у віцебскім касцёле. Быў жанаты, гадаваў сына. Арыштаваны 7.6.1937. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 25.8.1937 за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны.

З К. па адной справе (№ 3979-п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) праходзіла, асуджана і рэабілітавана (Вярхоўным судом БССР 17.11.1956) актыўная парафіянка касцёла К. *Ігнатовіч*.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**КАЗЕРА Караль-Беніямін Андрэевіч** [27.9.1916, мяст. Чатковіцы (*Czatkowice)*, Польшча — 22.4.1989], святар, кармеліт, брат Ф. *Казеры*. З сям'і польскага рабочага. Скончыў ніжэйшую духоўную семінарыю ў Вадавіцах (*Wadowice*), Польшча. Накіраваны дыяканам у Вільню. У 1932 уступіў у Закон кармелітаў босых у Вадавіцах. 16.7.1933 склаў першыя законныя шлюбы. У 1934 накіраваны на філасофскія курсы ў Вільню. З 1936 вывучаў тэалогію ў Кракаве (*Kraków*), Польшча. У 1939 дыякан у Вільні. Прыняў сакрамэнт святарства (31.3.1940). Прызначаны ў парафію св. Тэрэзы ў Вільні. Арыштаваны немцамі 26.3.1942. Зняволены ў віленскай турме «Лукішкі». 27.9.1942 пераведзены ў лагер Шальтупы (*Szaltupie*), дзе знаходзіўся з 30 віленскімі святарамі. Вызвалены пасля 16.7.1944. Вярнуўся ў Вільню. Прызначаны пробашчам касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ,

таксама служыў у парафіі св. Антонія Падуанскага ў мяст. Паставы, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны МДБ 9.2.1949. Асуджаны 10.6.1949 за «антысавецкую прапаганду» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР (каля 20 000 зняволеных). Працаваў у медных шахтах. У 1954 падчас задушэння паўстання вязняў паранены. Вызвалены 5(ці12).12.1955 датэрмінова з-за туберкулёзу. Вярнуўся ў Паставы. Нягледзячы на намаганні вернікаў, рэгістрацыю не атрымаў. У 1958 выехаў у Польшчу. Каля года прабыў у кляштары ў Вадавіцах. З 1959 у Варшаве. З 1966 вікарый касцёла ў мяст. Завоя (*Zawoja*), з 1975 у парафіі Клюшкоўцы (*Kluszkowce*), з 1982 у касцёле ў мяст. Чэрна (*Czerna*) Кракаўскага ваяв. Рэабілітаваны.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS Praśkiewicz S. Wierni Chrystusowi i Kościołowi*.

**КАЗЕРА Францішак (Гжэгаш) Андрэевіч** [12.9.1908, мяст. Чаткавіцы (*Czatkowice)*, Польшча — 10.5.1979, Люблін], кармеліт, брат К. *Казеры*. З сям'і польскага рабочага. Скончыў ніжэйшую духоўную семінарыю ў Вадавіцах (*Wadowice*), Польшча. Уступіў у Закон кармелітаў босых у Вадавіцах (1926). Склаў першыя законныя шлюбы (1927). Накіраваны на вучобу ў Куртрэ (*Courtrai*), Бельгія. 4.8.1930 склаў вечныя законныя шлюбы. Пасля заканчэння 3-га курса тэалагічнага ф-та Кракаўскага ун-та прыняў сакрамэнт святарства (29.6.1933). У Вільні скончыў 4-ы курс, прызначаны пробашчам касцёла св. Тэрэзы. У 1936 пераведзены ў львоўскі кляштар, у 1937 — у кляштар у Вішнёўцы (Валынская вобл.). Працаваў катэхетам у школах у мяст. Замек, Новы Вішнявец, Арлова, Воля Вілсона, Воля Карбутоўска. У 1937 пераведзены ў касцёл кармелітаў у Мядзеле Мінскай вобл. Таксама абслугоўваў парафію св.

Юрыя ў в. Весялуха (існавала да 1977 у Мядзельскім р-не Мінскай вобл.). Арыштаваны 8.2.1949 у Мядзеле. Асуджаны 10.6.1949 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў (заменена на 10 гадоў) з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР (ст. Навагрудная). У 1954 за ўдзел у паўстанні зняволеных пераведзены ў іншы лагер. У 1956 высланы ў Іркуцк. Пасля вызвалення вярнуўся ў Мядзел. Не атрымаўшы рэгістрацыі на душпастырскую дзейнасць, эміграваў у Польшчу (4.4.1958). З Варшавы 14.5.1958 выехаў у Лодзь, дзе служыў у касцёле Перамянення Божага. У верас. 1960 накіраваны ў мяст. Чэрна (*Czerna*) Кракаўскага ваяв. У 1966 вярнуўся ў Лодзь. З кастр. 1972 у люблінскім кляштары. Рэабілітаваны 27.6.1995 Вярхоўным судом Беларусі. Асабовая справа К. № 36566-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Praśkiewicz S. Wierni Chrystusowi i Kościołowi.*

**КАЗІМІРОВІЧ Генрык** [9.6.1896, Варшава — 6.5.1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства. З 1941 пробашч парафіі Тлакіня (*Tłokinia*), Польшча. Арыштаваны 6.10.1941 немцамі. Вывезены ў Канстанцінава, цяпер Мядзельскі р-н (?). З 30.10.1941 знаходзіўся ў лагеры Дахаў, Германія.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КАЗЛОЎСКІ Нікадзім** [1896 — пасля 1941], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1920). Прызначаны вікарыем касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны Ашмянскага дэканата, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. З 1925 пробашч парафіі Нараджэння НПМ у

в. Хоўхлава Маладзечанскага пав. Вішнеўскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл., касцёл св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Гарадок, цяпер Маладзечанскі р-н. З 1934 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Забрэжжа Валожынскага пав. Вішнеўскага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны ў 1940 (?). Этапаваны ў Архангельскі лагер НКВД. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КАЗЛОЎСКІ Юзаф** [1893—13.7.1943], педагог, святар, доктар кананічнага права. Прыняў сакрамэнт святарства (1918). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Драгічыне *(Drohiczyn),* Польшча. З 1932 выкладчык маральнай тэалогіі і педагогікі ў Пінскай духоўнай семінарыі. З 1939 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Свіслач, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Расстраляны фашыстамі з 250 іншымі арыштаванымі ў лесе каля Свіслачы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**КАЗЮНАС Павел Мацвеевіч** [1877 (паводле крымінальнай справы — 1868), в. Вайдагены (?) Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 31.10.1937, Магілёў (?), турма НКВД], святар. З літоўскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1901). З 1904 вікарый, нам. пробашча касцёла Маці Божай Ружанцовай у Томску, Расія. З 1909 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ва Уфе, Расія. Са снеж. 1910 служыў у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Колпіне, Расія. З 1915 пробашч парафіі езуітаў Найсвяцейшай

Тройцы ў в. Загацце Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. З 1924 таксама абслугоўваў касцёл св. Веранікі ў в. Селішча Лепельскага дэканата, цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл., парафію Найсвяцейшай Тройцы ў в. Заскоркі, цяпер Полацкі р-н. З 1928 у касцёле кармелітаў у Чавусах Магілёўскай вобл. У 1928 2 месяцы знаходзіўся пад хатнім арыштам. З мая 1929 8 месяцаў знаходзіўся пад хатнім арыштам. Зноў арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны 22.10.1937 з А. *Кашчыцам* і інш.[1] паводле пастановы калегіі НКВД як «член ПАВ» і за «шпіянаж на карысць Польшчы» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа К. і інш. № 3225 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КАЛАСОЎСКІ Гжэгаж Вінцэнтавіч** [12.3.1909, фальварак Гусінец Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — 4.12.1991], святар. Скончыў пачатковую і 7-гадовую школы, гімназію. Два гады працаваў памочнікам маляра на пабудове Ніжэйшай духоўнай семінарыі ў Драгічыне (*Drohiczyn*), Польшча. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (8.4.1939). 25.4.1939 прызначаны вікарыем парафіі Божага Цела ў мяст. Нясвіж, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Арыштаваны немцамі ў 1942. Вызвалены праз 6 тыдняў з Баранавіцкай турмы, дзякуючы сабранаму вернікамі вялікаму выкупу. У 1944 адрамантаваў падпалены касцёл. У 1945 адмовіўся выехаць на захад, нягледзячы на пагрозы НКВД. Меў у апецы некалькі парафій, у якіх не было душпастыра. Праводзіў душпастырскую працу з моладдзю і

[1] Гл. арт.: Ерановіч Агата-Галіна Антонаўна.

кандыдатамі ў святары. Пераследаваўся савецкімі ўладамі на працягу шэрагу гадоў. У 1990 менаваны прэлатам. Памёр і пахаваны ў Нясвіжы.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КАЛІНСКІ Тамаш Казіміравіч** [20.3.1892, в. Крынкі (*Krynki*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 25.6.1941, в. Міжэрычы, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл.], святар. Скончыў гмінную школу ў Крынках. У 1909 настаўнічаў у в. Русакі (*Rusaki*), дзе год вучыў дзяцей і дарослых. З-за пераследу царскіх уладаў пераехаў у Сасновік (*Sosnowik*) Судзялаўскай гміны, дзе працягваў асветніцкую дзейнасць. У 1911—13 скончыў гарадскую школу ў мяст. Сакулка (*Sokółka*), Польшча. Паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. У жн. 1915 перад уваходам немцаў выехаў у Бабруйск, дзе нейкі час працаваў інструктарам у Цэнтральным грамадзянскім камітэце Каралеўства Польскага. У 1917 пачаў вучобу ў Жытомірскай духоўнай семінарыі, у маі 1918 вярнуўся на радзіму. У тым жа годзе прыняў дыяканскае пасвячэнне. Са снеж. 1918 да мая 1919 служыў у Сідры (*Sidra*). Ствараў у вёсках польскія школы, праводзіў вечаровыя курсы адукацыі для дарослых, прымаў удзел у раззбраенні немцаў (да вясны 1919), вярбоўцы ў польскае войска. Польскія ўлады ацанілі яго дзейнасць памятным «Медалём за вайну», «Срэбным Крыжам Заслугі», «Медалём Незалежнасці». Прыняў сакрамэнт святарства (1919). Служыў вікарыем фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне, адначасова выконваў абавязкі прэфекта жаночай і мужчынскай настаўніцкіх семінарыяў. У 1922 актыўна ўключыўся ў харцэрскую дзейнасць, камендант гродзенскага атрада. З 1923 рэктар касцёла Звеставання НПМ у Гродне.

У 1926 прызначаны пробашчам касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Нарэўка (*Narewka*) Ваўкавыскага дэканата, цяпер Польшча. З 1937 душпастыр парафіі Звеставання НПМ у в. Міжэрычы. У чэрв. 1941 праз Міжэрычы адступалі чырвонаармейцы, якія былі абстраляныя невядомымі са званіцы касцёла. У той жа дзень чырвонаармейцы затрымалі святара касцёла, арганіста **Звяжэвіча** і парафіяніна **Навумчыка** па падазрэнні ў гэтым інцыдэнце, і хаця віна святара не пацвердзілася, яго расстралялі. Пахаваны на прыкасцёльных могілках.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**КАМАРОЎСКАЯ Марыя (Мадлена) Рыгораўна** [1898, Магілёў — 29.1.1934], законніца, настаўніца. З бел. шляхецкай сям'і. Атрымала вышэйшую адукацыю. Прыняла законныя шлюбы, атрымаўшы імя Мадлена. Арыштавана ў Маскве 13.11.1923 па групавой справе «рускіх католікаў». Асуджана 19.5.1924 калегіяй АДПУ да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана на Урал. Вызвалена 9.5.1927 з забаронай права жыць у 6 буйных гарадах СССР і памежных абласцях. Выехала ў Смаленск, потым у Саратаў. Зноў арыштавана 10.4.1931. Прыгаворана 28.10.1931 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Краснадар. Чарговы раз арыштавана ў 1933. Закатавана ў Бутырскай турме Масквы.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР.*

**КАМЕРАС Фелікс Францавіч** [1909, в. Дамскі Варшаўскай губ., Польшча — ?], законнік. З сям'і польскага рабочага.

У 1930-я законнік кляштара ў Ломжы (*Łomża*), Польшча. Арыштаваны 24.5.1940. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД СССР 1.2.1941 як «актыўны ўдзельнік антысавецкай арганізацыі» да 8 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

З К. па адной справе (№ п-9588; захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.) праходзілі, асуджаны і рэабілітаваны (6.6.1989 пракурорам Гродзенскай вобл.): пробашч кляштара Стэфан *Мішкоўскі*, парафіяне **Баброў Яўген Міхайлавіч** (н. у 1906), **Басоўскі Ян Юзафавіч** (1915), **Вуйцік Тадэвуш Станіслававіч** (1918), **Ганевіч Аляксандр Юзафавіч** (1902), **Данішэўскі Уладзіслаў Феліксавіч** (1912), **Кршэўскі Ян Аляксандравіч** (1902), **Кухарскі Раймунд Янавіч** (1914), **Лушынскі Аляксандр Юзафавіч** (1904), **Раманоўскі Вацлаў Станіслававіч** (1904), **Сержпутоўская Наталля Янаўна** (1915), **Стрэнкоўскі Мечыслаў Тэафілавіч** (1899), **Цыбароўскі Стэфан Антонавіч** (1909), **Чарнецкі Збігнеў Юзафавіч** (1908), **Шышко Уладзіслаў Люцыянавіч** (1908).

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР*.

**КАМІНСКІ Баляслаў** [1906—1943, Брэст], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. З 1938 катэхет у Пінску, прэфект Пінскага катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ. У 1941—42 рэктар капліцы ў мяст. Маларыта, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны немцамі, зняволены ў Брэсцкай турме. Расстраляны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КАНІКЕВІЧ Леанард Любінавіч** [1928, Львоў, Украіна — ?], арганіст. Працаваў у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Баранавічах Брэсцкай вобл. Арыштаваны 9.11.1948. Асуджаны ваенным трыбуналам МУС Брэсцкай вобл. як «удзельнік

антысавецкай арганізацыі» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы.

6.4.1940 у Брэсце арыштаваны старшы інжынер «Днепрабуда» **Канікевіч Любін Юзафавіч** (н. у 1890 у Барышы, цяпер Львоўскай вобл., атрымаў вышэйшую адукацыю), бацька Леанарда Канікевіча. 24.12.1940 асобай нарадай МДБ асуджаны як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 8 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.8.1989 пракуратурай Брэсцкай вобл. Асабовая справа № 9809-с захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл.

21.3.1951 у Брэсце па адрасе: вул. Леніна, д. 36 арыштавана маці дваіх дзяцей **Канікевіч Меланія Антонаўна** (н. у 1905 у Бучачах, цяпер Львоўскай вобл., у сям'і польскага рабочага; атрымала сярэднюю спецыяльную адукацыю), маці Леанарда Канікевіча. 9.5.1951 асуджана за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 14.8.1991 прэзідыумам Брэсцкага абл. суда. Асабовая справа № 10443-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД*; *Жертвы политического террора в СССР*.

**КАНТАК Каміль-Стэфан-Януш Янавіч** [15(ці 21).12.1881, в. Любань (*Luboń*), цяпер Польшча — 1.12.1976, Бейрут], святар. З 1898 вучыўся ў Познаньскай духоўнай семінарыі, Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства ў касцёле св. Міхала Арханёла ў в. Гнезна Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. (1904). Скончыў ун-т у Фрайбургу (Германія) са ступенню магістра багаслоўя. З 1909 вікарый катэдральнага касцёла ў Познані (*Poznań*), рэдактар час. «Miesięcznik Koscielny», дырэктар архіва архідыяцэзіі. Пасля сканчэння 1-й сусветнай вайны (1918) член камісіі, якая прымала архівы ад нямецкіх уладаў. Пасля абароны доктарскай дысертацыі ў Празе выехаў у Гданьск, дзе арганізаваў выдавецкае аб'яднанне, рэдагаваў чатыры каталіцкія часопісы. З 1923 рэктар касцёла св. Яцэка ў

Варшаве. З 1926 прафесар Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Пінску, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Аўтар шматлікіх прац па гісторыі Касцёла. 20.9.1939 арыштаваны НКВД і з групай польскіх афіцэраў вывезены ў Казельск. Патрабаваў вызвалення і вяртання ім пашпартоў як нямецкім падданым. 24.12.1939 вывезены ў лагер у Асташкаве. У лют. 1940 этапаваны ў турму НКВД у Маскве, адтуль у лагер для польскіх вязняў у Гразаўцы. Вызвалены ў жн. 1941 па амністыі для польскіх грамадзян. З 25.8.1941 рэферэнт вайскоўцаў, капелан. У жн. 1942 з арміяй генерала **У. Андэрса** пакінуў СССР. Вайсковы капелан у Тэгеране і Багдадзе. Са жн. 1943 служыў у польскіх парафіях у Сірыі і Ліване. Наведаў польскія асяродкі ў Палестыне, Егіпце. З кастр. 1943 в. а. рэктара польскай духоўнай семінарыі ў Бейруце. Выкладаў для семінарыстаў, якія пакінулі СССР з Польскай арміяй. У маі 1945 прызначаны дэканам 6000 палякаў, якія прыбылі з Ірана. Быў гісторыкам Касцёла, вывучаў лёсы францішканскіх ордэнаў у Польшчы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КАНЦЭВІЧ Мікалай** [каля 1880 — пасля 1933], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1906). У 1916—17 вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у Іркуцку, Расія. У 1923—27 адміністратар касцёла кармелітаў у Чавусах Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., таксама абслугоўваў філіяльны (да парафіі Абольцы) касцёл св. Казіміра ў в. Расна, цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны з інш. святарамі ў 1933 у Полацку Віцебскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КАПУСТА Антон Іванавіч** [1871, мяст. Друя Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. — 28.12.1937, Томск, турма НКВД], актыўны парафіянін, вартаўнік касцёла. З бел. сялянскай сям'і. Працаваў у касцёле св. Барбары ў Віцебску. З жонкай Юзэфай Антонаўнай (н. у 1883) гадаваў сыноў Івана, Станіслава. Арыштаваны 8.11.1923 у Віцебску па адрасе: Гарадская шаша, д. 35. Асуджаны з жонкай 22.2.1924 АДПУ за «шпіянаж на карысць буржуазнай Польшчы» і «нелегальны пераход дзяржаўнай мяжы» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы на Урал. 19.11.1927 калегіяй АДПУ дазволена вярнуцца з жонкай у Віцебск. У канцы 1920-х — першай палове 1930-х, верагодна, высланы ў Сібір. Зноў арыштаваны 15.12.1937 у Томску як служыцель культа. Прыгавораны 22.12.1937 за «ўдзел у ПАВ» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (групавая, № 34197-с; захоўваецца з фотаздымкам у архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны пракуратурай БВА 23.7.1992, па другой — пракуратурай Туркестанскай ВА 10.3.1960.

1.10.1937 у Віцебску па адрасе: вул. Гарадоцкая, д. 7 арыштаваны член ВКП(б) **Капуста Станіслаў Антонавіч** (н. у 1907 у мяст. Друя), сын Антона Капусты. 9.11.1937 тройкай НКВД асуджаны з машыністам вадакачкі чыгуначнай ст. Віцебск **Бабашынскім Вікенціем** (1892), яго братам, рабочым «Каапрамонту» **Бабашынскім Іосіфам** (1893), рабочай фабрыкі акуляраў **Барысевіч Франя** (1887), шаўцом **Войнічам Францам** (1888), работніцамі фабрыкі «КІМ» **Гронскай Янінай** (1911), **Закржэўскай Аленай** (1916), **Трахлебавай Надзеяй-Валянцінай** (1911), рабочымі фабрыкі імя Кагановіча **Грудным Уладзіславам** (1896), **Танскім Андрэем** (1891),

**Шахорам Станіславам** (1891), рабочым цагельнага завода **Марковічам Васілём** (1883), настаўніцай СШ **Плескачэўскай-Рыжыкавай Ганнай** (1897), машыністам ст. Віцебск **Рэутам Іосіфам** (1907), рабочым Слясарных майстэрняў воднага транспарту **Русецкім Апалінарыем** (1898), рабочым фабрыкі імя К. Маркса **Жалняроўскім Станіславам** (1886), рабочым (змазчыкам) ст. Віцебск **Старыковічам Іосіфам** (1901), майстрам Інструментальна-мэблевай фабрыкі **Статкевічам Францам** (1911) за «шпіянаж і ўдзел у ПАВ» да ВМП і 9.1.1938 расстраляны ў Віцебскай турме НКВД. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 11.12.1959. Групавая справа С. Капусты і інш. № 8621-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; Книга памяти томичей.*

**КАПУСТА Пётр-Бернард Юзафавіч** [14.3.1886 (ці 1891), в. Залешчына Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер тэрыторыя Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. (вёска спалена фашыстамі падчас 2-й сусветнай вайны) — 1.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). З 1919 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца Дрысенскага пав. Дрыса-Себежскага дэканата, цяпер Верхнядзвінскі р-н, парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Сар'я таго ж р-на, таксама адпраўляў набажэнствы ў касцёле св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. Пазней пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў Мазыры Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. Арыштаваны 25.12.1930. Асуджаны калегіяй АДПУ 23.8.1931 за «правядзенне антысавецкай агітацыі» і як «кіраўнік контррэвалюцыйнай шпіёнскай арганізацыі» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Тройкай НКВД Ленінградскай вобл. прыгавораны 10.10.1937 да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 12975-п; групавая, праходзіла больш за 50 чалавек, сярод якіх былі

святар І. *Шукель*, сакратар касцёльнага камітэта В. *Шадурская*, адвакат **Ян Левандоўскі** (н. у 1892 у Аўстра-Венгрыі), шэраг настаўнікаў 14-й і 15-й польскіх школ, захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны трыбуналам БВА 14.8.1964.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР. Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КАПУСТА Ян Юзафавіч** [13.7.1894, мяст. Дварэц Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. (паводле іншых звестак, в. Вітаў (*Witów*) Келецкага ваяв., Польшча) — 5.2.1964, Лёнд (*Ląd*), Польшча], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў гімназію ў Асвенціме. У 1918 уступіў у ордэн салезіянаў. У жн. 1918 прыняў першыя законныя шлюбы. У 1919—20 вучыўся на курсах філасофіі ў Кракаве. З 1920 праходзіў педагагічную практыку ў Доме апекі св. Юзафа ў Пшэмыслі, Ніжэйшай духоўнай семінарыі ў Дашаве. З 1923 вучыўся ў Асвенціме і ў Салезіянскім міжнародным інстытуце ў Турыне (Італія), дзе прыняў сакрамэнт святарства (8.7.1928). Служыў у асяродках салезіянаў у Вільні (1928—29), Пшэмыслі (1929—30, 1933—35), Варшаве (1930—33), Яраслаўлі (з 1935). З 1937 кіраўнік Салезіянскага аб'яднання, пробашч парафіі Божага Цела ў мяст. Дварэц Дзятлаўскага дэканата. Верагодна, паралельна абслугоўваў касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Наваельня таго ж дэканата. Арыштаваны 27.11.1939. 8 месяцаў зняволены ў Слоніме, 7 — у Мінску. Асуджаны 11.12.1940 асобай нарадай НКВД як «сацыяльна-небяспечны элемент» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў адзін з лагераў Карэльскай АССР. Вызвалены ў жн. 1941 па амністыі для польскіх грамадзянаў. Выехаў

у Бузулук (Узбекскай ССР), дзе пад кіраўніцтвам генерала **У. Андэрса** фармавалася Польская армія. 11.10.1941 зарэгістраваны як капелан. 22.11.1941 накіраваны на працу сярод польскага насельніцтва, дэпартаванага ў Казахскую ССР у 1939—41. З-за ўціску савецкіх уладаў вымушаны выехаць у Каршы (Узбекістан), дзе апекаваў дзіцячы прытулак і шпіталь. 15.8.1942 у Краснаводску (цяпер Туркменбашы, Туркменістан) у апошнюю хвіліну перад адпраўкай Польскай арміі ў Іран праз Каспійскае мора, калі знаходзіўся ўжо на караблі, запатрабаваны НКВД за тое, што даў аплявуху чырвонаармейцу, які зняважыў польскі нацыянальны сімвал. Этапаваны ў Алма-Ату, потым у маскоўскія турмы «Бутыркі», «Лубянку». Прыгавораны 13.1.1943 асобай нарадай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» і «шпіянаж» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Варкуцінскі лагер МДБ Архангельскай вобл. і Комі АССР. У 1948 пераведзены ў Рачны лагер Комі АССР. Вызвалены 10.8.1952. Высланы ў Краснаярск. Канчаткова вызвалены 15.12.1955. Выехаў 30.12.1955 у Польшчу. Служыў у парафіі Плоцка (*Płock*). У 1957—60 у касцёле св. Тэрэзы і касцёле Пераўтварэння Божага ў Лодзі (*Łódź*), у парафіі св. Барбары ў Лёндзе (*Ląd*). Па першай справе (№ 9986; захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.) рэабілітаваны 4.9.1989 пракурорам Гродзенскай вобл., па другой — пракуратурай Туркестанскай ВА 16.1.1991.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга Скорби; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Żurek W. Salezjańscy męczennicy Wschodu; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941); Жертвы политического террора в СССР.*

**КАРАВАЦКІ Браніслаў Казіміравіч** [1902, в. Ставішова Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Мінскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Да арышту працаваў у касцёле св. Апостала Андрэя Баболі ў мяст. Кабыльнікі, ця-

пер в. Нарач Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. Арыштаваны 10.5.1949. Зняволены ў Мінскай турме (п/с УЖ 15/9). Асуджаны 26.7.1949 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў (потым заменены на 5) ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены 4.1.1955. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.12.1993 Вярхоўным судом Беларусі. Асабовая справа К. № 35866-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**КАРАЛЮК Юзаф** [1908, в. Дунілавічы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — 1963], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). Прызначаны вікарыем касцёла св. Казіміра ў мяст. Стоўбцы аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1939 пробашч парафіі св. Станіслава ў мяст. Няміраў (*Niemirów)* Драгічынскага дэканата, Польшча. У верас. 1939 прыехаў у родную вёску. Арыштаваны НКВД ў 1944. Вывезены ў Столін Брэсцкай вобл. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Варкуцінскі лагер МДБ. Вызвалены ў 1956. Выехаў у в. Ландвараў, Літва, дзе атрымаў дазвол на службу.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КАРАМУЦКІ Алаізі** [1908—13.7 (ці 14.8).1942 (?)], святар. Скончыў Пінскую (?) духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). З 1936 вікарый, з 1938 в. а. пробашча парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Івацэвічы, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны немцамі 26.6.1942 за ўдзел у антыфашысцкім руху. Расстраляны з групай івацэвіцкай інтэлігенцыі 13.7 (ці 14.8).1942 у Баранавічах Брэсцкай вобл.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КАРНІЛЮК Аляксандр Аляксандравіч** [1909—15.5.1940, Асташкаў, Смаленская вобл., Расія], святар. Капітан, капелан рэзерву 78-га пяхотнага палка ў Баранавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Мабілізаваны ў верас. 1939 на абарону прыгарада Варшавы — Паўночнай Прагі. Арыштаваны. Этапаваны з савецкімі вязнямі ў Асташкаў. Расстраляны.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КАРНІЦКІ Ян Люцын** [27.1.1908—13.8.1944, Варшава], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем касцёла Апекі св. Юзафа ў в. Рубяжэвічы Стаўбцоўскага пав. і дэканата, цяпер Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. На 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны 28.4.1939. Адміністратар парафіі 79-га Слонімскага пяхотнага палка. З 17.9.1939 капелан 79-га і 80-га польскіх пяхотных палкоў 20-й дывізіі. Арыштаваны. 7.10.1939 вызваліўся (верагодна, уцёк). Капелан часткі АК, якая знаходзілася ў паўночным Любліне. Загінуў падчас Варшаўскага паўстання.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КАРПІНСКІ Фелікс Янавіч** [7.11.1911, в. Смігель Познаньскага пав., Польшча — 12.2.1982], святар. З сям'і польскага рабочага. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Працаваў катэхетам у Вільні і ў Троках, цяпер Тракай, Літва, вікарыем касцёла Звеставання НПМ у пас. Гудагай, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл.,

парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Жупраны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў пробашчам касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Баруны, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 11.11.1944. Зняволены ў Гродзенскай турме НКВД. Асуджаны 16.8.1946 асобай нарадай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ва Унжэнскі лагер МДБ Горкаўскай вобл. (ст. Сухабязводная). Вызвалены 10.11.1949. Вярнуўся ў Беларусь, жыў у Ашмянах. Адмовіўся ад супрацоўніцтва з МДБ. Паводле некаторых звестак, зноў арыштаваны ў 1950. Этапаваны ў Варкуцінскі лагер МДБ. Канчаткова вызвалены ў 1956. З 1972 пробашч касцёла Імя НПМ у в. Мураваная Ашмянка Ашмянскага р-на. Загінуў у аўтамабільнай аварыі і пахаваны на могілках у в. Мураваная Ашмянка. Рэабілітаваны 2.11.1989 пракурорам Гродзенскай вобл. Асабовая справа К. № п-10431 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ, ІКБР*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**КАРПОВІЧ Павел Ксавер'евіч** [1868 — пасля 1931], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1893). Прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. З 1900 пробашч парафіі Звеставання НПМ у в. Фашчаўка Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. З 1902 служыў у касцёле св. Міхаіла Арханёла ў в. Чарэя Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. Паралельна служыў у філіяльным касцёле Унебаўзяцця

НПМ у в. Вародзькаў, цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл. З 1905 в. а. пробашча, потым пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа і св. Казіміра ў Лепелі Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. У 1910-я, верагодна, таксама абслугоўваў касцёл св. Лаўрэнція ў мяст. Ушачы, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны 5.4.1927. Высланы на 3 гады ў Вяцкую вобл. У лісце з высылкі ў Польскі Чырвоны Крыж ад 9.1.1931 пісаў, што захварэў на туберкулёз. Пасля вызвалення вярнуўся ў Беларусь. Жыў у вёсцы каля Магілёва. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии*; *Памятная книжка Минской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КАРЫПСКІ Генрых Янавіч** [1870, мяст. Геранёны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Да арышту працаваў у касцёле св. Антонія (?) у Віцебску. Арыштаваны 23.3.1931. Асуджаны 4.7.1931 асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППЛ (заменены высылкай). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 14.8.1964 трыбуналам БВА. Групавая справа К. і інш. (усяго каля 50 чалавек) № 12975-п захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Гл. таксама арт.: *Капуста* Пётр-Бернард Юзафавіч.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**КАСПЯРОВІЧ Фелікс Браніслававіч** [18.5.1895, Барысаў Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. — 21.7.1950], святар. З польскай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Магілёўскай

духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу, пасля яе зачынення — у Навагрудскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1920). Прызначаны адміністратарам касцёла св. Ганны ў мяст. Койданава Мінскага пав., цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл. Арыштаваны ў 1922 з-за супраціву канфіскацыі касцёльнай маёмасці. Неўзабаве вызвалены. Пераведзены ў парафію Нараджэння НПМ у Барысаве, потым у Мінск. Зноў арыштаваны ў 1927. Вызвалены. Чарговы раз арыштаваны ў 1930 у мяст. Хойнікі, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. Неўзабаве вызвалены. У чарговы раз арыштаваны 25.1.1934. Праходзіў па адной справе (№ 20630-п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) з парафіянінам **Леапольдам Пушкіным** (н. у 1887). Асуджаны калегіяй пры АДПУ 26.2.1934 як «удзельнік антысавецкай шпіёнскай арганізацыі» да 10 гадоў ППЛ. У лют. 1934 этапаваны ў Карагандзінскі лагер НКВД Казахскай ССР. 22.9.1936 пераведзены ва Ухта-Пячорскі, 11.6.1938 у Варкуцінскі лагер НКВД Комі АССР. Пасля сканчэння тэрміну вызвалены. 22.8.1944 высланы ў Архангельскую вобл. Канчаткова вызвалены 13.2.1947. Вярнуўся ў Дзяржынск, дзе зноў арыштаваны і высланы на 3 гады ў Сібір (с. Булаева каля Томска). Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 24.11.1989.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КАЎРЭЦКІ Казімір** [1893—1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1921). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Клецк Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1928 адміністратар касцёла Перамянення Пана ў в. Крэва, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1934 в. а. пробашча парафіі св. Юрыя ў

в. Паланэчка Стаўбцоўскага пав. Сталавіцкага дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны фашыстамі і атручаны газам у лагеры Калдычэва каля Баранавічаў.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**КАЎЧЫНЬСКІ Тэлесфар** [5.1.1884 — ?], святар. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю (?). Прыняў сакрамэнт святарства (1911). Служыў у касцёле ў в. Антушы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. У 1922—25 пробашч парафій у в. Барашы і в. Ражышча Луцкай дыяцэзіі, цяпер Валынская вобл., Украіна, дэкан. З 1926 на Падляшшы. З 1934 пробашч касцёла ў в. Варшавіцэ (*Warszowice*) Пілаўскага дэканата, Польшча. З 1938 без парафіі. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КАХНО Пётр** [1913, г. Ліда Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — ?], навучэнец духоўнай семінарыі. Скончыў школу і гімназію ў Лідзе. Прайшоў вайсковую службу. У 1936 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. У 1939 студэнт 3-га курса. Арыштаваны НКВД. Этапаваны ў адзін з сібірскіх лагераў ГУЛАГа. У 1941 вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян. Трапіў у армію **У. Андэрса.** Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**КАЧКОЎСКІ Лявон Ігнатавіч** [12.4.1906 — пасля 1970], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, ф-т тэалогіі ун-та імя Стафана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства

(26.5.1934). У жн. 1934 прызначаны прэфектам і вікарыем парафіі св. Юзафа і НПМ у мяст. Валожын, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 27.3.1935 вікарый касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок Шчучынскага пав. Лідскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. У студ. 1937 пераведзены ў парафію Адшукання Св. Крыжа ў Гродне. Са студз. 1939 в. а. адміністратара касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Куранец Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. Праз тры месяцы душпастыр філіяльнага касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Крулеўшчына, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. Адначасова з мая 1939 пробашч парафіяльнага касцёла Маці Божай Ружанцовай ў в. Зашчэсле. Арыштаваны ў 1940 ці 1941 у Вільні. Этапаваны ў Сібірскі лагер НКВД. Вызвалены ў 1941 па амністыі для польскіх грамадзян. 5.12.1941 прызначаны капеланам для польскага насельніцтва, вайсковым капеланам 7-й польскай дывізіі. Пакінуў СССР з польскім войскам. З 1947 і не менш чым да 1970-х служыў святаром у ЗША.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**КАЧМАРАК Казімір Андрэевіч** [1909, в. Язовец (?) Навагрудскага пав. Мінскай губ. — ?], арганіст. З польскай шляхецкай сям'і. Працаваў у касцёле Звеставання НПМ у Ганцавічах Брэсцкай вобл. Арыштаваны 9.8.1940. Асуджаны 1.2.1941 за «неданясенне ўладам» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Паўночна-чыгуначны (?) лагер (ст. Саша). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.4.1989 пракуратурай Брэсцкай вобл. Асабовая справа К. № 7889-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**КАШЧЫЦ Адольф Каятанавіч** [1888, в. Казяны Браслаўскі пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. — 17.1.1938, Орша (?), турма НКВД], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1914). З 1917 пробашч парафіі Клявань, цяпер Ровенская вобл., Украіна. У 1920—24 душпастыр касцёла ў мяст. Ружын, цяпер Жытомірская вобл., Украіна. З пачатку 1927 служыў у парафіі Белагародка, Украіна. Двойчы арыштоўваўся на кароткія тэрміны. Чарговы раз арыштаваны ў 1931. Пад следствам знаходзіўся ў турме ў Бярдзічаве, цяпер Жытомірская вобл., Украіна. Асуджаны 5.1.1932 за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Яраслаўскі, потым у Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Вызвалены датэрмінова. З 1935 пробашч касцёла св. Юзафа Абранніка ў Оршы Віцебскай вобл. Арыштаваны 26.9.1937 у Оршы па адрасе: вул. Кірава, д. 25. Асуджаны 22.10.1937 са святаром Паўлам *Казюнасам* і інш. паводле пастановы калегіі НКВД як «агент польскай разведкі, член ПАВ і за антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 13.10.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа К. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КАШЫРА Юрый Тадэвушавіч** [4.4.1904, в. Аляксандрава Віцебскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — 18.2.1943, в. Росіца, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл.], марыянін, грамадскі і культурны дзеяч, благаславёны. З праваслаўнай сялянскай сям'і. Услед за маці 22.10.1922 прыняў каталіцтва. З 1924 у Друйскім кляштары марыянаў. Уступіў у навіцыят (13.6.1925). Скончыў пры кляштары гімназію. Склаў першыя

(2.8.1926) і вечныя (2.8.1929) законныя шлюбы. У маі 1929 атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі. 31.10.1929 накіраваны на філасофскі ф-т Усх. папскага інстытута ў Рыме. Увосень 1931 вярнуўся ў Вільню, працягваў вывучаць тэалогію ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Атрымаў танзуру і ніжэйшае свячэнне (10.3.1932), свячэнні субдыяканата і дыяканата (1934). Прыняў сакрамэнт святарства (20.6.1935). На працягу 1936 прэфект Друйскай гімназіі, суперыёр Беларускага дома марыянаў у Вільні. Прыхільнік Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Польскія ўлады ў канцы чэрв. 1938 перасялілі К. з некаторымі іншымі святарамі ў памежную зону, але К. уцёк, наведваў марыянскія асяродкі Вільні і Варшавы. З верас. 1938 прызначаны кіраўніком кляштару марыянаў у мяст. Расна, цяпер тэрыторыя Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. (мяст. не існуе), рэктарам мясцовага касцёла св. Ганны. З пачаткам 2-й сусветнай вайны кляштар аддалі калгасу, а законнікаў выгналі. К. пераязджаў па марыянскіх асяродках у Скурцы, Марыямпалі, Паташыне, Выталтаве (каля Трокаў), Кальварыі (Польшча). У ліп. 1942 вярнуўся ў Друю. Потым служыў пробашчам касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца. Спалены з каталіцкімі і праваслаўнымі вернікамі падчас нямецкай карнай аперацыі (адхіліў прапанову аб асабістым выратаванні). Беатыфікаваны Ватыканам у 1999.

Кр.: *ЭГБ*, т. 4; *Пялінак Вячаслаў*. Росіцкія мучанікі. Росіца, 1999; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**КАШЭЎСКІ Юзаф Казіміравіч** [1878, в. Саладзеневічы (?) Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — ?], актыўны парафіянін парафіі св. Мікалая ў Кіеве. Арыштаваны ў маі 1937 па справе «**Самбара** і інш.». Абвінавачваўся ў «шпіянажы», «правядзенні антысавецкай

агітацыі» і як «удзельнік антысавецкай арганізацыі». Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**КІВІНСКІ Стэфан Францавіч** [2.9.1902, Віленская губ. — 23.2.1962, Лонгбара (*Longborough)*, Вялікабрытанія], святар. У 1918 паступіў у гарадскую школу ў Вільні, потым у гімназію Сігізмунда Аўгуста, пасля 4-га класа вучыўся ў ліцэйскім класе Віленскай духоўнай семінарыі, паралельна ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (21.4.1929). Прызначаны прэфектам касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Камаі Свянцянскага пав. і дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. Увесну 1930 накіраваны дапамагаць хвораму пробашчу парафіі св. Антонія Падуанскага ў в. Хажова, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. Пасля 5.9.1930 атрымаў прызначэнне ў фарны касцёл св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 25.4.1931 вікарый касцёла Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі, цяпер Літва. 13.7.1933 прызначаны ў філіяльны касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў в. Кір'янаўцы, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл., дзе арганізаваў парафію. З 11.1.1934 пробашч касцёла Маці Божай Міласэрнай у мяст. Нарвілішкі Ашмянскага пав. і дэканата, цяпер Літва (?). 28.4.1939 прызначаны капеланам рэзерву польскага войска ў званні капітана. Са жн. 1939 капелан уланскага палка ў Новай Вілейцы. Арыштаваны. Этапаваны 13.6.(ці 15.7)1940 з інтэрнаванымі грамадзянамі з Літвы ў лагер Казельск-ІІ, 15.7.1940 у Гразавец. Займаўся таемнай душпастырскай дзейнасцю. Вызвалены 2.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. З верас. ці кастр. 1942 капелан 5-й пяхотнай дывізіі, капелан 3-й дывізіі карпацкіх стралкоў на Бліжнім Усходзе. З 1946 жыў у Лонгбара. Служыў у польскіх парафіях. Меў тытул ганаровага каноніка.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР;*

*Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**КІСЕЛЬ Уладзіслаў** [16.4.1894, Вільня — 16.6.1950, ГУЛАГ], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную акадэмію ў Петраградзе са ступенню кандыдата тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). Прызначаны катэхетам фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 1919 капелан Войска Польскага ў званні маёра. З 1921 катэхет гімназіі ў Лідзе, у 1928—29 катэхет у школе пры капліцы Беззанаггана Зачацця НПМ (Ліда-Слабодка). З 1929 вікарый катэдральнага касцёла св. Яна Хрысціцеля і Яна Евангеліста ў Вільні. Падчас 2-й сусветнай вайны капелан АК у Віленскай акрузе. Дапамагаў хаваць яўрэяў. Арыштаваны НКВД 1.10.1944. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай прапаганды» і «распаўсюджванні контррэвалюцыйнай літаратуры». Асуджаны 22.8.1945 ваенным трыбуналам войскаў НКВД да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Карагандзінскі (каля 60 000 зняволеных), з 1948 у Сцяпны лагер (каля 20 000 зняволеных) НКВД Казахскай ССР. Загінуў у лагеры.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Литургический календарь; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КЛАМ Уладзіслаў** [1874—6.8.1920], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1901). Служыў адміністратарам касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Ражанка Лідскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. Потым рэктар Згуртавання Сясцёр Беззаганных у кляштары бернардынцаў у Слоніме, катэхет гімназіі. З 1905 адміністратар парафіі Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў в. Крамяніца Ваўкавыскага дэканата,

цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. У жн. 1920 падчас наступу войск Чырвонай арміі арыштаваны аддзелам літоўскіх добраахвотнікаў пад кіраўніцтвам Міцкевічуса, зняволены ў Ваўкавыскую турму. Уначы выведзены ў лес і расстраляны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**КЛІМОВІЧ (КЛІМКОВІЧ) Ілья Лаўрэнавіч** [1875, в. Старая Грыбаўшчына Сакольскага пав. Беластоцкай губ., цяпер Польшча — ?], святар. З польскай сялянскай сям'і. У асабовай справе адзначана, што меў «сярэднюю адукацыю» і быў «служыцелем рэлігійнага культу». Арыштаваны 28.10.1939 у в. Паўлоч Бельскага пав., Польшча. Асуджаны асобай нарадай НКВД 4.9.1940 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Гродзенскай вобл. 30.10.1989. Асабовая справа К. № п-10307 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**КЛІМЧАК Міхал-Дзяніс** [1907, Львоў, Аўстра-Венгрыя, цяпер Украіна — 15.7.1943], законнік. У 1923 уступіў у ордэн айцоў францішканцаў канвентуальных. Склаў першыя законныя шлюбы (1924). Прыняў сакрамэнт святарства (1931). Служыў у касцёле св. Ганны ў Кракаве, потым у Гродне, дзе ў 1939 менаваны гвардыянам Францішканскага мужчынскага кляштара. Арыштаваны фашыстамі як закладнік 14.7.1943. Забіты з 5 святарамі і вялікай групай мясцовай інтэлігенцыі каля в. Навумавічы, цяпер Баранавіцкі сельсавет Гродзенскага р-на.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**КЛІМЧАК Уладзіслаў Янавіч** [1913, Вамперава каля Мельца (*Mielc*), Польшча — 13.7.1942, Баранавічы], святар. У 1924 паступіў у гімназію імя С. Канарскага ў Мельцы, у 1934 — у Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Служыў у Пінскай дыяцэзіяльнай курыі, пазней у капліцы ў в. Моладава, цяпер Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл., касцёле Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў в. Парэчча, цяпер Гродзенскі р-н. З 1.7.1941 в. а. пробашча касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Лагішын, цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. У студз. 1942 вярнуўся ў Парэчча. Арыштаваны фашыстамі за дапамогу партызанам і яўрэям 26.6.1942 падчас службы ў касцёле. Зняволены ў Брэсцкай, потым у Баранавіцкай турмах. Расстраляны на праваслаўных могілках у Баранавічах з 400 мірнымі жыхарамі, сярод якіх было 17 святароў.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КМІТА Мечыслаў** [1886 — пасля 1939], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). З 1913 адміністратар парафіі Узвышэння Святога Крыжа ў мяст. Халопенічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. Некаторы час служыў у касцёле Адшукання Св. Крыжа ў мяст. Узда, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1922 у парафіі Кельцы (*Kielce*), Польшча. У 1933 адміністратар касцёла Усіх Святых у Вільні. З 1937 пробашч фарнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Беластоку (*Białystok*), Польшча. Паводле касцёльнай справаздачы з Мінска, у 1942 «арыштаваны і загінуў у Расіі».

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КНОБЕЛЬСДОРФ Рычард** [1866 ці 1867—22.8.1920, Беласток], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1889). У 1908 адміністратар парафіі ў Слоніме Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1909 пробашч парафіяльнага касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Жупраны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл., ашмянскі дэкан, потым прэлат, капелан Віленскай самаабароны, якая дзейнічала ў тыле фронту падчас ваеннай кампаніі бальшавікоў у 1920. Падчас пераходу лініі фронту К. выдалі, і ён быў арыштаваны чырвонаармейцамі. Прывязаны да воза, прайшоў пешкі з Ашмянаў да Беластока (каля 270 км), дзе зняволены ў турме. 22.8.1920, пры адыходзе войскаў Чырвонай Арміі пасля паражэння пад Варшавай, таемна вызвалены з турмы жаўнерамі батальёна літоўскіх добраахвотнікаў, якія выразалі яму крыж на плячах, адсеклі палец з прэлацкім пярсцёнкам і жывым закапалі ў зямлю на ўскраіне Беластока. У 1924 цела К. было эксгумавана ў прысутнасці маршала Пілсудскага (стрыечнага брата К.). Святара пахавалі каля могілак касцёла ў Жупранах. У 1928 на магіле К. пастаўлены помнік. Напярэдадні прыходу савецкіх войскаў у верас. 1939 адна з парафіянак зацёрла надпіс на помніку на польскай мове, які нагадваў пра смерць К. ад рук бальшавікоў, дзякуючы чаму помнік захаваўся і быў рэстаўраваны ў 1995, калі група парафіянаў праводзіла мерапрыемствы з нагоды 75-годдзя смерці К.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КНЯЖЫШЧА Мацвей Пятровіч** [1874, в. Бубалёва (?) Віцебскай губ. — 1937, Віцебск, турма НКВД], вартаўнік касцёла. З польскай сялянскай сям'і. Працаваў у касцёле св. Барбары ў Віцебску. Арыштаваны 14.2.1937. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 25.8.1937 за «антысавецкую контррэва-

люцыйную дзейнасць» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 17.11.1956. Групавая справа К. і інш. № 3979-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Таксама гл. арт.: *Ігнатовіч* Караліна Людвігаўна.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**КОЛАС Анэля Лявонаўна** [1900, мяст. Мёры Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — ?], законніца ордэна тэрцыянак-францішканак (з 1928). Жыла ў в. Фашчаўка, цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. У студз. 1932 пераехала ў Ленінград, дзе была парафіянкай касцёла св. Станіслава. У крас. 1932 арыштавана па справе «*Пранцкецiса* і інш.». Асуджана калегіяй АДПУ 19.7.1932 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**КОРНЬ Баляслаў** [1867—23.9.1940], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1890). Служыў у катэдральным касцёле св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста ў Вільні, парафіі Нараджэння НПМ у в. Лебедзева, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл., касцёле св. Уладзіслава Венгерскага ў в. Суботнікі, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл., парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Параф'янава, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл., касцёле св. Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. У 1908—10 у Калузе, Расія. З 1912 служыў у касцёле Усіх Святых у Вільні. З 1913 пробашч парафіі Звеставання НПМ у в. Старыя Трокі, Літва. З 1921 у касцёле св. Міхала Арханёла ў в. Белагруда, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. З 1924 адміністратар парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Сабакінцы Лідскага дэканата, цяпер в. Першамайская Шчучынскага р-на

Гродзенскай вобл. З 1933 пробашч касцёла Звеставання НПМ у в. Мікелеўшчына, цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. Забіты членамі мясцовай прасавецкай групы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**КРАВЕЦ Тэафіл-Фідэль** [12.12.1907—1942 (?)], святар, кармеліт. У 1927 склаў першыя законныя шлюбы ў Кармелі *(Karmel*). Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (29.6.1933). З 1936 вікарый парафіі св. Тэрэзы ў Вільні, з 1940 (?) касцёла ў Вадавіцах (*Wadowice*), Польшча. 2.11.1941 выехаў на службу ў Зах. Беларусь. Па некаторых звестках, арыштаваны немцамі і этапаваны ў лагеры Шалтуп і Панявежыс. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Praśkiewicz S. Wierni Chrystusowi i Kościołowi.*

**КРАПІЎНІЦКІ Юзаф Казіміравіч** [22.3.1882, в. Данюшава Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. — 4.8.1953], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (22.5.1908). Прызначаны ў парафію Найсвяцейшай Тройцы ў в. Лыскава Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. У 1909 царскімі ўладамі пазбаўлены права на душпастырскую дзейнасць. У 1910—11 вікарый касцёла св. Міхала Арханёла ў Ашмянах Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1913 адміністратар парафіі ў Стаўрапалі, Расія. Праводзіў актыўную місіянерскую дзейнасць сярод моладзі і салдат-католікаў царскай арміі. У 1918 быў прадстаўніком польскага ўрада па справах сасланых і ваеннапалонных палякаў на Паўн. Каўказе і ў Крыме, арганізоўваў іх вяртанне ў Польшчу.

Выконваў абавязкі чыноўніка польскага консульства ў Растове-на-Доне па справах мабілізацыі палякаў, якія падлягалі ваеннай службе. У 1919 чатыры разы арыштоўваўся чэкістамі. У чэрв.-ліп. 1920 асуджаны ў Стаўрапалі да расстрэлу, але дзякуючы сувязям сярод савецкіх работнікаў (паводле іншых звестак, нечаканаму нападу «белых» войскаў) яму ўдалося захаваць жыццё. У тым жа годзе вярнуўся ў Польшчу, дзе актыўна ствараў маладзёжныя каталіцкія арганізацыі. З 1924 пробашч парафіі св. Апостала Андрэя Баболі ў мяст. Крывічы Вілейскага пав. і дэканата, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. У ліст. 1939 органы НКВД «выкрылі ў Крывічах антысавецкую контррэвалюцыйную арганізацыю», кіраўніцтва якой прыпісалі К., абгрунтаваўшы гэта канфіскаванымі ў валасным старостве архіўнымі матэрыяламі (біяграфія святара, перапіска Вілейскага павятовага старозства аб узнагароджанні яго «Крыжам Заслугі»). Аднак святару ўдалося пазбегнуць арышту, і падчас 2-й сусветнай вайны ён заставаўся на акупаванай тэрыторыі ў Вільні. Арыштаваны 25.8.1945. Асуджаны 16.1.1946 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 8 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены датэрмінова ў 1948. Выехаў у Польшчу. З канца 1949 пробашч парафіі Глатова (*Głotowo*) Вармінскага дэканата. Рэабілітаваны 19.5.1993 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Асабовая справа К. № 35160-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *БНДЦЭД; Hleowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**КРАСАДОМСКІ Баляслаў Антонавіч** [1880, в. Брусы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай

вобл. (паводле іншых звестак — мяст. Клузіма, цяпер Літва) — 4.1.1967], святар. Скончыў Віленскую гарадскую гімназію (1902), Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Прызначаны вікарыем фарнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Лідзе Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1916 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішчална Лідскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 17.8.1949. Асуджаны 6.10.1949 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ Новасібірскай і Кемераўскай абласцей. Вызвалены 10.8(ці 9).1954 моцна хворым. Вярнуўся ў сваю парафію, дзе намаганнямі вернікаў атрымаў рэгістрацыю на душпастырскую дзейнасць.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, eksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КРАСОЎСКІ Уладзіслаў Адамавіч** [16.6.1907, в. Свецк Велькі (*Świeck Wielki*), цяпер Польшча — 1961], святар. Скончыў гімназію (1926), духоўную семінарыю ў Ломжы (*Łomża*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (8.3.1931). Прызначаны вікарыем парафіі Філіпаў (*Filipów*). З 1933 у касцёле ў в. Нур (*Nur*) Востраў-Мазавецкага пав. У 1935 у парафіі ў мяст. Сейны (*Sejny*), Польшча. З 1936 служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ у мяст. Тэолін (*Teolin*) аднайменнага дэканата Ломжынскай дыяцэзіі. З 1.10.1937 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Галынка Ломжынскай дыяцэзіі, цяпер Гродзенскі р-н. У 1940 у святара канфіскавалі дом, і ён жыў у парафіянаў. Падчас 2-й сусветнай вайны зноў служыў у касцёле. Пасля закрыцця касцёла ў 1946 вымушаны прыняць савецкае грамадзянства. Арыштаваны ў кастр. 1947. Абвінавачваўся ў «прыналежнасці да польскай паўстанцкай арганізацыі і правядзенні сярод насельніцтва антысавецкай агітацыі, накіраванай на зрыў палітычных мерапрыемстваў Са-

вецкай улады». Парафіяне напісалі дзве калектыўныя заявы з просьбай аб вызваленні К., але гэта не дапамагло. 8.3.1948 ваенны трыбунал войскаў МУС Гродзенскай вобл. правёў судовае пасяджэнне, на якім сведкі адмовіліся ад дадзеных раней паказанняў. Толькі на трэцім пасяджэнні 24.3.1948 пракурор вынес вердыкт, што «злачынствы, здзейсненыя падсудным, даказаны». Па касацыйнай скарзе К. ваенны трыбунал войскаў МУС БВА 10.4.1949 пастанавіў: «Прысуд адмяніць, справу накіраваць на даследаванне». У канцы 1949 судовая калегія па крымінальных справах Гродзенскага абл. суда разгледзела справу К. на закрытым пасяджэнні. Асуджаны да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Адбываў пакаранне ў Ангарску Іркуцкай вобл., дзе стаў інвалідам. Неаднаразова звяртаўся ў розныя інстанцыі з просьбамі аб памілаванні. Касцёльны камітэт Галынкаўскага рэлігійнага таварыства таксама слаў просьбы аб памілаванні К. 10.4.1956 прэзідыум Вярхоўнага суда БССР зменшыў тэрмін пакарання да 10 гадоў. Вызвалены ў маі 1956. Вярнуўся на радзіму. 26.9.1956 зарэгістраваны на старым месцы працы. Паводле іншых звестак, служыў у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Забалаць, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1958 пробашч касцёла Перамянення Пана ў в. Селіванаўцы Гродзенскага р-на. Рэабілітаваны.

Кр.: *НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 103; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**КРАЎЧЫК Вацлаў** [27.11.1904, в. Ігнацуўка Баброўска (*Ignacówka Bobrowska*) Казеніцкага пав. — 6 (ці 9).1.1986, Сагінаў, Мічыган, ЗША], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (3.5.1936). З 1937 катэхет, в. а. вікарыя парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Баранавічах аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Брэсц-

кай вобл. Арыштаваны 14.6.1941. Этапаваны ў Старабельск, цяпер Луганскай вобл., Расія, потым у Паўночна-Уральскі лагер НКВД (Ірбіт, Табольск). Патаемна праводзіў душпастырскую працу. Вызвалены 16.1.1942 па амністыі для польскіх грамадзян. Служыў капеланам 2-га корпусу арміі У. Андэрса, з якой пакінуў СССР. З 1947 служыў у дыяцэзіі Сан-Антоніо, ЗША. З 1950 пробашч парафіі НПМ у Сагінаве.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КРУКОЎСКІ Ян Вікенцевіч** [1876, в. Ржавец Пышнянскай вол. Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер не існуе — 1949], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1901 або 1903). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Прыдруйск, цяпер Піедруя, Латвія. З 1906 вікарый катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. З 1908 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Зембін, цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Паводле некаторых звестак, у 1913 служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Быхаве Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1918 прэфект у мяст. Сакулка (*Sokółka*), Польшча. У сярэдзіне 1930-х жыў у Гродне, пенсіянер. Падчас 2-й сусветнай вайны служыў у капліцы пры дзіцячым доме ў Гродне. Арыштаваны гестапа 23.9.1943 з М. *Арановічам*, пробашчам францішканскага касцёла **Цітусам Сцялевічам**, яго вікарыем **Аркадзем Банасекам**. Гестапа вызваліла ў той час толькі М. *Арановіча*. Астатніх дзесяць дзён утрымлівалі ў гродзенскай турме, потым у беластоцкай. Арыштаваны НКВД 13.12.1944. Асуджаны 28.10.1946 Гродзенскім абл. судом за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ. З 29.11.1947 знаходзіўся ў Інцінскім лагеры МДБ Архангельскай вобл., з 9.6.1948 у Карагандзінскім лагеры МДБ Казахскай ССР. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Жертвы политического террора в СССР*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**КРУЛЬ Юзаф Адамавіч** [1905 ці 1906—1944 (?)], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1933). Прызначаны вікарыем парафіі св. Станіслава ў мяст. Дамброва (*Dąbrowa*) аднайменнага дэканата, цяпер Польшча. У 1935 пробашч касцёла Божага Провіду ў мяст. Балінгрудак Кальварыйскага дэканата, Літва. З 1936 пробашч парафіі Маці Божай Вастрабрамскай у в. Язна, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. Паводле адных звестак, арыштаваны ў 1941 пры адступленні Чырвонай Арміі. Этапаваны ў лагер. Памёр у зняволенні. Паводле іншых — загінуў у 1944 у авіяцыйнай катастрофе.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**КРУЛЬ Юзаф Адамавіч** [1866—2.2.1947], святар, магістр тэалогіі, вучоны. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1891). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Санкт-Пецярбургу. Потым вікарый парафіі св. Міхала Арханёла ў в. Чарэя, цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл., касцёл НПМ у мяст. Бобр, цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. З 1898 пробашч і дэкан парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Сянно Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Ганаровы канонік Магілёўскай архідыяцэзіі. Арыштаваны ў 1919 (пасля зняволення біскупа Э. *Ропа* як

адзін з 18 польскіх закладнікаў). Абменены на ваеннапалонных у 1920. З 1921 служыў у парафіі Кельцэ (*Kielce*), пасля адміністратар касцёла ў Потаку (*Potok*) Стопніцкага дэканата, Польшча. З 1926 пробашч парафіі Ляшчыны (*Leszczyny*). З 1930 дэкан у Малагошчы (*Małogoszcz*), Польшча, дзе працаваў і падчас 2-й сусветнай вайны.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КРУПКО Станіслаў Тэафілавіч** [1901, в. Лемін Варшаўскай губ., Польшча — ?], арганіст. З польскай каталіцкай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Працаваў у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў в. Галынка, цяпер Гродзенскі р-н. Быў жанаты, гадаваў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 12.12.1944. Абвінавачваўся ў «сувязі з нямецкай паліцыяй» і «правядзенні антысавецкай агітацыі». Этапаваны ў адзін з лагераў МДБ Комі АССР. Вызвалены 29.9.1946. Рэабілітаваны. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа К. № п-883 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**КРУШЭЛЬНІЦКАЯ Каміла Мікалаеўна** [1892, в. Баранавічы Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. — 27.10.1937, ГУЛАГ], верніца. Падчас вучобы ў Маскве падтрымлівала тайныя кантакты з супольнасцю ордэна дамініканак у доме святара **А. Абрыкосава**. Арыштавана ў ноч 28/29.6.1933 у Маскве па групавой справе «рускіх католікаў». Асуджана 19.2.1934 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Этапавана ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Закахалася ў чалавека, які аказаўся даносчыкам. У 1937 узята ў лагеры пад варту і 9.10.1937 асуджана тройкай да ВМП. Расстраляна.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**КРЫВІЦКІ Адольф Валяр'янавіч** [15.5.1888, в. Храпянева Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. — 9.11.1942, ГУЛАГ, пас. Ветласлян (Ветласян) Ухцінскага р-на, Расія], святар. З польскай мяшчанскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). Служыў у касцёле св. Міхаіла Арханёла ў Наваградку Мінскай губ., цяпер райцэнтр Навагрудак Гродзенскай вобл. З 1915 капелан філіяльнага касцёла ў г. Сумы Харкаўскай губ., цяпер Украіна. Арыштаваны ў ліст. 1922. Вызвалены ў 1923. Служыў ў парафіі Нараджэння НПМ у Барысаве, у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Зембін (20 км ад Барысава), адначасова катэхет, барысаўскі дэкан. Зноў арыштаваны на кароткі тэрмін у 1931. У чарговы раз арыштаваны 5.11.1933. Прывезены ў Мінск. Асуджаны 24.2.1934 з К. *Андрэкусам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Кіраў, цяпер Вятка, Расія. З 2.1.1934 ва Ухта-Пячорскім лагеры НКВД Комі АССР (пас. Чыб'ю, цяпер г. Ухта). Пры раздзяленні лагера пераведзены ў выдзелены асобна Усць-Вымскі лагер (пас. Важаель, п/с № 243). З крас. 1937 у інвалідным лагпункце Ухта-Пячорскага лагера. З 1941 у лагпункце Княжаскі Пагост каля Усць-Поцьмы. Памёр ад крупознай пнеўманіі. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа К. і інш. № 28053-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

29.4.1940 у в. Храпянева арыштаваны селянін-аднаасобнік **Крывіцкі Казімір Валяр'янавіч** (н. у 1883), брат Адольфа Крывіцкага. 4.9.1940 асобай нарадай пры НКВД асуджаны як «сацыяльна-небяспечны элемент» да 8 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.3.1989 пракуратурай Гро-

дзенскай вобл. Яго асабовая справа № п-10201 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КРЫНСКІ Ян Антонавіч** [8.3.1861, Кузніца (*Kuźnica*), цяпер Польшча — 21.9.1939], святар. Са шляхецкай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (4.4.1884). Прызначаны вікарыем фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне, потым вікарый у Вільні, касцёла Унебаўзяцця НПМ і св. Юрыя ў мяст. Нача Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер вёска Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. З 1892 пробашч парафіі св. Міхала Арханёла ў пагосце Белагруда Лідскага пав. і дэканата, цяпер вёска Лідскага р-на Гродзенскай вобл., касцёла св. Станіслава ў в. Даўгінава Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл., парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Лаварышкі Віленскага пав., цяпер Літва, касцёла св. Апостала Юды Тадэвуша ў в. Лучай Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл., і інш. З 1907 пробашч парафіі Унебаўзяцця Пана ў мяст. Страбля (*Strabla*) Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча, адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Юхновец (*Juchnowiec*) Беластоцкага дэканата. З 1919 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Супрасль (*Supraśl*) Беластоцкага дэканата, Польшча. З 1923 адміністратар касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Зэльва, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Забіты членамі мясцовай прасавецкай групоўкі. Пахаваны ў агульнай магіле.

Кр.: *Памятная книжка Гродненской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego*

*na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**КРЫСЯК Пётр** [1871—1919, Ноўгарад (?)], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1895). Паводле адных звестак, служыў у мяст. Сейны (*Sejny*), Польшча. Паводле іншых — у мяст. Сянно Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., потым у касцёле ў Магілёве. У 1913—18 адміністратар парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Рэвелі, цяпер Талін, Эстонія. Арыштаваны ў Ноўгарадзе ў крас. 1919 з 50 палякамі як закладнік. Забіты пасля вызвалення з турмы.

Кр.: *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КУБІК Мечыслаў** [11.1.1900—13.7.1942, Баранавічы, цяпер Брэсцкай вобл.], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). З 1935 вікарый, потым пробашч касцёла Божага Цела ў мяст. Нясвіж, цяпер райцэнтр Мінскай вобл., нясвіжскі дэкан. Арыштаваны гестапа 29.6.1942 за дапамогу яўрэям. Зняволены ў Баранавіцкай турме. Расстраляны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**КУБШ Вільгельм-Францішак Карлавіч** [29.3.1911, мяст. Глівіцы (*Gliwice*), Польшча — 24.7.1978, Еленя Гура (*Jelenia Góra*), Польшча], святар. Са шматдзетнай сям'і чыгуначніка. Скончыў пачатковую школу ў Вадзіславе Слёнскім (*Wodzisław Śląski*), Польшча. Вучыўся ў ніжэйшай духоўнай семінарыі айцоў аблатаў у Люблінцы (*Lubliniec*), Польшча, потым

паступіў у навіцыят ордэна аблатаў місіянераў Марыі Беззаганнай у Маркавіцах (*Markowice*), Польшча. Вывучаў філасофію ў Кробях (*Krobi*), Польшча, тэалогію ў Обры (*Obra*), Польшча. Меў прафесію зубнога тэхніка. Прыняў сакрамэнт святарства (21.6.1936). Працаваў аканомам у духоўнай семінарыі ў Обры. У жн. 1939 прызначаны вікарыем парафіі Перамянення Пана ў Луніне, цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. З пачаткам 2-й сусветнай вайны накіраваны ў касцёл св. Юзафа у мяст. Лунінец, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1941 адміністратар касцёла св. Ганны ў в. Пузічы, цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. У 1942 арыштаваны нямецкай службай бяспекі. Знаходзіўся ў турмах Ганцавічаў (цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл.), Баранавічаў (цяпер райцэнтр той жа вобл.) і інш. Абвінавачаны ў сувязі з партызанамі і настройванні моладзі супраць выезду на працу ў Германію. 2.7.1942 уцёк з турмы. З 15.9.1942 у партызанскай брыгадзе імя У. Леніна (на тэрыторыі сваёй парафіі). Праводзіў святую Імшу для парафіянаў. Пасля стварэння ў СССР 1-й пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі стаў яе капеланам. Атрымаў званне маёра. 9.6.1943 удзельнічаў у 1-м з'ездзе Саюза польскіх патрыётаў, уваходзіў у яго прэзідыум. Рэдагаваў рэлігійны дадатак да час. «Żołnierz Wolności» пад назвай «Bóg i Ojczyzna». Неаднаразова адзначаны вышэйшымі вайсковымі ўзнагародамі. У 1944 дэкан І-й Польскай арміі ў СССР, якая прымала ўдзел у змаганні на тэрыторыі Польшчы. У студз. 1944 з-за канфлікту з генералам Міхалам Ролям-Жымерскім пераехаў у кляштар айцоў аблатаў на св. Крыжы ў Гурах Свентакшыскіх (*Góry Świętokrzyskie*), Польшча. Потым у Познані (*Poznań*), Польшча, місіянер у Гданьску (*Gdańsk*), Польшча, пробашч некалькіх парафій гэтага рэгіёна. У 1957—64 у Лясковіцах (*Laskowice*), Польшча. З 1964 капелан, з 1969 пробашч гарнізоннага касцёла св. Каралевіча Казіміра ў Вроцлаве (*Wrocław*), Польшча. Пасля капелан гарнізона ў Катавіцах (*Katowice*), Польшча. У 1972—77 пробашч гарнізона і парафіі Св. Крыжа ў в. Еленя Гура (*Jelenia Góra*). З 1977 на пенсіі. Пасмяротна адзначаны крыжам *Virtuti Militari* IV класа.

Тв.: *Kubsz W.* Uczestniczyłem w walkach pod Lenino // *Udział kapelanów wojskowych w drugiej wojnie światowej.* Warszawa, 1984.

Кр.: *Niestolik Norbert*. Śląskie groby ludzi Kościoła. Ksiądz Wilhelm Kubsz, kapelan ludowego wojska; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; http:/ pl.wikipedia.org; http://miasta.gazeta.pl*

**КУДАРЭЎСКІ Станіслаў Міхайлавіч** [1888, Гродзенская губ. — вясна 1960], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1911). З 1915 вікарый касцёла НПМ у мяст. Тургелі аднайменнага дэканата Віленскага пав., цяпер Літва. З 1918 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Данюшава Свірскага дэканата Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1929 адміністратар касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Падбярэззе Кальварыйскага дэканата, цяпер г. Пабрадэ, Літва. З 1937 пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны высланы немцамі ў Полацк. Арыштаваны МДБ 22.12.1950. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі і прапагандзе». Асуджаны 15.3.1951 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Праз Бабруйск і Магілёў этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ Кемераўскай і Новасібірскай вобл. Вызвалены з лагера 7.11.1955 інвалідам. Прыехаў у Маладзечна, потым вярнуўся ў Слабодку, дзе працягваў служыць.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**КУЗЬМІЦКІ Вітольд** [1873—15.7.1943], святар, доктар філасофіі. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1901). Да 1915 вікарый фарнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Лідзе Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1915 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Дэмбраў, цяпер в. Дэмбрава Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. З 1927 адміністратар касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Заблудаў (*Zabłudów*) Беластоцкага дэканата, цяпер Польшча. З 1936 пробаш і дэкан парафіі св. Станіслава ў мяст. Дамброва (*Dąbrowa*) Віленскай архідыяцэзіі, цяпер Польшча. Забіты з 5 святарамі і вялікай групай мясцовай інтэлігенцыі каля в. Навумавічы, цяпер Баранавіцкі сельсавет Гродзенскага р-на.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**КУЗЬМІЧ Казімір Пятровіч** [1900, Дзенавішкі (?) Свірскай вол. Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Да арышту служыў у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Нястанішкі Свянцянскага пав., цяпер Літва. Быў жанаты, гадаваў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 28.4.1940. Асуджаны 29.11.1940 асобай нарадай НКВД як «член антысавецкай арганізацыі» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ва Ухта-Іжэмскі лагер НКВД Комі АССР. Вызвалены 1.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 25.12.1989 пракуратурай Мінской вобл. Асабовая справа К. № 28936-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД*.

**КУКАЛОВІЧ (КАКАЛОВІЧ) Ганна (Марыя-Раймунда)** [24.8.1892, в. Барванішкі Віленскага пав., цяпер Літва —

1.8.1943, Наваградак, цяпер райцэнтр Навагрудак Гродзенскай вобл.], назарэтанка. Уступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта (1918), склала першыя законныя шлюбы (Гродна, 1922), прыняла імя Раймунда ад Езуса і Марыі. У 1928 склала вечныя шлюбы. З 1934 у кляштары назарэтанак у Наваградку, працавала на кухні, агародзе, у пральні, гатавала ежу, настаўнічала. Пасля прыходу савецкіх войскаў выгнана з кляштара з іншымі манашкамі, жыла ў парафіянаў. Падчас нямецкай акупацыі вярнулася ў законны дом Хрыста Валадара ў Наваградку. Ноччу 17/18.7.1943, калі гестапа арыштавала 120 жыхароў горада, манашкі ў малітвах да Бога прапанавалі замест арыштаваных сябе. 30.7.1943 з 10 манахінямі і святарамі К. выклікана ў акруговы камісарыят. 1.8.1943 расстраляна ў лесе за 4 км ад горада. 5.3.2000 далічана да ліку благаслаўлёных.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**КУКСЕВІЧ Францішак Янавіч** [12.10.1887, в. Грыбаўшчына (?) Рашанскай вол. Віленскага пав., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. — 25.6.1941], святар. З польскай сялянскай сям'і. Вучыўся ў пачатковай школе, на рамесніцкіх курсах пры Хіміка-тэхнічнай школе, у Віленскай гімназіі. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (3.7.1911). Прызначаны вікарыем парафіі Перамянення Пана ў в. Крэва Ашмянскага пав. і дэканата, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1912 другі вікарый фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 1915 пробашч парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Гожа Гродзенскага дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. З 1916 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Азёры Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі р-н. З 1937 пробашч і дэкан парафіі Унебаўзяцця НПМ у Мёрах аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны 22.6.1941. Зняволены ў турме НКВД № 28 у мяст. Глыбокае

Віцебскай вобл. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі» і як «кіраўнік контррэвалюцыйнай арганізацыі». Паводле некаторых звестак, расстраляны (з больш чым 100 падследнымі) у канцы чэрв. 1941 ахоўнікамі глыбоцкай турмы пры этапаванні вязняў у Віцебск. Рэабілітаваны 29.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа К. захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *БНДЦЭД; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**КУЛЕША Яўген Войцэхавіч** [8.3.1891, Варшава — 30.6.1941], святар, марыянін. Вучыўся ў гімназіі імя Хжаноўскага ў Варшаве, потым у Расіі. Пасля вяртання на радзіму студэнт Ягелонскага ун-та ў Кракаве, вывучаў медыцыну, антрапалогію. 1.11.1915 уступіў у ордэн айцоў марыянаў. Навіцыят праходзіў у Бялянах (*Bielany*) каля Варшавы. Склаў першыя законныя шлюбы (1.11.1916), прыняў сакрамэнт святарства (2.10.1921). Склаў вечныя шлюбы (1.11.1922). Вучыўся ў Фрыбургу, Швейцарыя, атрымаў ступень доктара тэалогіі. Вярнуўся ў Бяляны, адмовіўшыся выкладаць філасофію ў Лонданскай духоўнай семінарыі. Меў праблемы з лёгкімі, што змусіла яго паехаць лячыцца ў Закапанэ (Польшча), потым на захад Еўропы. Пасля вяртання працаваў у школе марыянаў. З 1936 рэктар марыянскага калегіума ў Бялянах. З 1938 дырэктар гімназіі імя Стэфана Баторыя ў мяст. Друя Браслаўскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл, начальнік марыянскага кляштара. Атрымаў прапанову праз год стаць дырэктарам гімназіі ў Браславе, аднак пачалася 2-я сусветная вайна

і школы ў снеж. 1939 апынуліся пад савецкай уладай. З пачаткам нямецка-савецкай вайны кіраваў Грамадзянскім камітэтам. 30.6.1941 у кляштар прыйшлі бальшавікі, якія арыштавалі К. і святароў **Вінцэнта Смалінскага** і **Уладзіслава Бакаляжа**. Апошніх вызвалілі па дарозе, а К. давялі да в. Лупанты і забілі.

Брат святара **Браніслаў Кулеша** стаў капеланам Варшаўскай архідыяцэзіі (1885—1975).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941); Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**КУЛІКОЎСКІ Чэслаў Юзафавіч** [1.2.1907, фальв. Кохава (Кахава) Гродзенскага пав., цяпер тэрыторыя Гродзенскага р-на (фальв. не існуе) — 25.12.1996, Беласток (*Białystok*), Польшча], святар. З мяшчанскай сям'і. Скончыў дзяржаўную гімназію імя Адама Міцкевіча (1927), Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ў Віленскім ун-це імя Стэфана Баторыя. Атрымаў ступень магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (3.6.1933). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі Лідскага пав. Радунскага дэканата, цяпер Літва. З сак. 1936 пробашч парафіі св. Антонія Падуанскага ў в. Бабруйшчына Глыбоцкага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Са жн. 1936 таксама рэктар капліцы ў мяст. Падсвілле, цяпер Глыбоцкі р-н. З 20.5.1939 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Лужкі Дзісенскага пав. Глыбоцкага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. На 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву. У верас. 1939 мабілізаваны ў вайсковую парафію гарнізона ў Беластоку. Пасля захопу горада немцамі (28.9.1939) перайшоў з войскам літоўскую мяжу. Арыштаваны. Этапаваны ў лагер у Калатова, Вількамір, турму ў Коўне. У чэрв.

1940 уцёк у Вільню. Зноў арыштаваны. 12.7.1940 вывезены ў Казельск-II, 2.7.1941 у Гразавец. Вызвалены. Капелан 6-га артылерыйскага палка, эвакуацыйнай базы ў Краснаводску. З арміяй **У. Андэрса** пакінуў СССР і накіраваўся ў Іран. Да ліст. 1942 капелан сібіракоў у Індыі. Потым капелан цяжкай артылерыі II Польскага корпуса, змагаўся пад Монтэ-Касіна, Анконай і Балоньяй, Італія. Скончыў вайсковую службу ў 1948 у званні маёра 2-й танкавай брыгады 2-й Варшаўскай танкавай дывізіі. Адзначаны польскімі, італьянскімі, англійскімі ўзнагародамі: «Крыжам Мужных» за Монтэ-Касіна, «Зоркай» Італіі, «Медалём Абаронцы», «Зоркай за вайну 1939—1945», «Медалём Грыгорыя VI», крыжам *Polonia Restituta*. У пасляваенны час скончыў Грыгарыянскі ун-т у Рыме са ступенню доктара тэалогіі і кананічнага права. У ліст. 1953 выехаў у ЗША, дзе працаваў душпастырам у Даласе (*Dallas*), штат Тэхас, пасля тры гады ў польскай парафіі ў Бафала (*Buffalo*). У верас. 1957 вярнуўся ў Польшчу, атрымаў пасаду выкладчыка кананічнага права ў Беластоцкай духоўнай семінарыі і абаронцы сямейных сувязяў у арцыбіскупскім судзе. У 1958 выехаў у Ольштын (*Olsztyn*), дзе прызначаны канцлерам Біскупскай курыі. Выкладаў таксама ў духоўнай семінарыі, працаваў як дыяцэзіяльны душпастыр юрыстаў. З 1982 на пенсіі, жыў у Беластоку. 6.6.1993 адзначаны «Залатым Медалём Заслугі». Атрымаў вайсковае званне палкоўніка Польскага войска.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**КУНДА Уладзіслаў Ігнатавіч** [12.7.1887, в. Яміны Аўгустоўскага пав. Сувалкаўскай губ., цяпер Польшча — 31.8.1937, ГУЛАГ], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу.

Прыняў сакрамэнт святарства (13.4.1914). Прызначаны вікарыем касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Ноўгарадзе, Расія. У 1915—17 у парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Омску, Расія. З 1922 адміністратар касцёла св. Людвіка ў в. Свацілавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл. З 1924 пробашч парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Самары, Расія, служыў у капліцах Хафенталя, Райнсфельда, касцёле Найсвяцейшай Багародзіцы Ларэтанскай у Арэнбургу, Расія. У 1930 вярнуўся ў Беларусь. Служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Рагачове Гомельскай вобл., катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. Арыштаваны 5.12.1935. Абвінавачваўся як «кіраўнік контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай групоўкі палякаў-католікаў». Асуджаны 20.5.1936 тройкай НКВД да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Цемнікоўскі лагер НКВД Мардоўская АССР. У 1937 абвінавачаны ў «сістэматычнай антысавецкай агітацыі сярод зняволеных». 22.8.1937 тройкай НКВД Мардоўскай АССР прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.7.1989.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Канфесіі на Беларусі; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; Жертвы политического террора в СССР; З асабістага архіва У.Васькова.*

**КУРПІС-ГАРБОЎСКІ (КУПР-ГАРБОЎСКІ) Уладзіслаў Вікенцевіч** [11(ці 14).11.1884, мяст. Янемішкі (Янелішкі) Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 9.6.1976], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (21.5.1909, Коўна, цяпер Каўнас, Літва). Прызначаны вікарыем і катэхетам касцёла ў Слоніме Гродзенскай губ., цяпер

райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1911—12 у парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Солы Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1915 пробашч парафіі Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў в. Шэметава Свірскага дэканата, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. Пасля наступу немцаў пераведзены ў Вільню (1918). Працаваў у дзіцячым доме імя Сэрца Збавіцеля, катэхетам у дзвюх гімназіях. З 1920 зноў у Солах. У ліст. 1939 з-за хваробы выехаў у Вільню. Праз некалькі тыдняў прызначаны пробашчам і нам. дэкана ў парафію Унебаўзяцця НПМ у мяст. Тургелі аднайменнага дэканата, цяпер Літва. Паводле некаторых звестак, з 1944 пробашч і дэкан касцёла св. Мучаніка Юрыя ў в. Варняны аднайменнага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. Пасля 1945, калі савецкія ўлады абклалі вялікім сельскагаспадарчым падаткам духавенства і аднаасобнікаў, святары былі вымушаныя адмаўляцца ад зямлі. К.-Г. пастаянна выклікалі ў розныя савецкія органы і сілавыя структуры «для апрацоўкі». У 1947 ён адмовіўся падпісаць абяцанне не навучаць моладзь рэлігіі. Адкрыта выказваўся супраць манаполіі савецкай дзяржавы і партыі на выхаванне дзяцей. У 1947 16 святароў з Варнянскага і Свірскага дэканатаў прынялі рашэнне аб нерэгістрацыі рэлігійных суполак і касцёлаў. У жн. 1948 К.-Г. запрасілі ў Маладзечанскае ўпраўленне МДБ, дзе ён падпісаў пратакол, у якім заяўляў, што «бачыць неспрыяльнае стаўленне ўлады да Касцёла і вялікія перашкоды ў пастырскай службе ксяндзоў». Вынікам гэтай заявы стала адключэнне святла ў плябаніі ў Варнянах і абкладанне касцёла падаткам у 30 тыс. рублёў. Арыштаваны 1.6.1950. Асуджаны асобай нарадай пры МДБ 29.11.1950 за «правядзенне антысавецкай агітацыі» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Цемнікоўскі, потым Сібірскі лагер МДБ. Вызвалены і рэабілітаваны 27.12.1954. З 24.11.1956 у Беластоку, Польшча. З 1957 пробашч парафіі ў в. Трычуўка (*Tryczówka*) Беластоцкага дэканата. Ганаровы канонік Капітулы Мітрапалітнай у Беластоку. Асабовая справа К.-Г. № 15887-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**КУРЭК Станіслаў Янавіч** [13(ці 20).8(або 10).1908, в. Суткі Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. — 1940], святар. Скончыў дзяржаўную гімназію ў Драгічыне, Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны 1-м вікарыем парафіяльнага касцёла Божага Цела ў Нясвіжы аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1939 у парафіі Звеставання НПМ у мяст. Ганцавічы Лунінецкага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З верас. 1939 капелан 27-га ўласнага палка імя Стэфана Баторыя Наваградскай кавалерыйскай брыгады. Арыштаваны НКВД у Ганцавічах восенню 1939. Зняволены ў турме ў Нясвіжы, потым у Мінску. Асуджаны да ВМП. Адмовіўся падпісаць просьбу аб памілаванні. Расстраляны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**КУЧЫНСКІ Юзаф** [1879—31.7.1942], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1903). З 1910 ваенны капелан. З 1923 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1933 пробашч касцёла св. Казіміра ў в. Уселюб Наваградскага пав. і дэканата, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. У 1937 у касцёле НПМ у в. Чорны Бор, Літва. Арыштаваны гестапа ў

Наваградку 28.6.1942 за дапамогу савецкім ваеннапалонным і яўрэям. Расстраляны ў ваколіцах Наваградка з групай каля 70 чалавек.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**КУЯВА Антоні Мікалаевіч** [10.3.1908, в. Патулін Ванграવецкага пав. Познаньскага ваяв., Польшча — 2.5.1968], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Вангравецкую гімназію, Познаньскі ун-т, Віленскую духоўную семінарыю, філасофскі ф-т Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок Шчучынскага пав. Лідскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1939 вікарый парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Падбярэззе Кальварыйскага дэканата, цяпер г. Пабрадэ, Літва. З 1941 пробашч касцёла Маці Божай Вастрабрамскай у в. Язна, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. У 1943 арыштаваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. Вызвалены праз некалькі месяцаў па просьбах парафіян. З 1944 пробашч касцёла св. Ганны ў в. Мосар, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны МДБ 17.1.1949. Асуджаны 21.5.1949 асобай нарадай МДБ за «здраду радзіме» і «правядзенне антысавецкай агітацыі» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР. Працаваў на медных рудніках. Захварэў на туберкулёз. За адмову працаваць падчас паўстання вязняў 13.2.1954 ізаляваны на 3 месяцы карцэра. Карагандзінскі абл. суд пастанавіў 20.12.1954 часова вызваліць святара з-за хваробы. Канчаткова вызвалены датэрмінова ў канцы 1955. З 1.12.1956 пробашч парафіі св. Апосталаў Сымона і Юды Тадэвуша ў г. п. Воранава Гродзенскай вобл. У 1958 выехаў у Польшчу. Служыў у касцёле ў мяст. Карловіцы (*Karłowice*).

З 1962 пробашч парафіі Рацлавічкі (*Racławiczki*). Памёр ад інфаркту. Рэабілітаваны 18.2.1994 Віцебскім абл. судом. Асабовая справа К. № 23428-п з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 123; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ЛАБАН Вінцэнт** [1898—10.3.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1926). Прызначаны катэхетам і вікарыем (?) парафіі Перамянення Пана ў в. Германавічы Дзісенскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. У 1929 адміністратар касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Ідолта (Ідоўта), цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 1932 пробашч касцёла Божага Цела ў в. Іказнь таго ж дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1937 у парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ Ліда-Слабодка, цяпер Гродзенскай вобл. Арыштаваны гестапа 29.6.1942 з вікарыем касцёла Люцыянам *Мрачкоўскім*. Зняволены ў Лідскай турме. Расстраляны з 9 іншымі святарамі ў ваколіцы Ліды (гл. арт.: *Ажароўскі* Ю.).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Krahel T.,* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998. № 3 (98); *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ЛАЗАР Станіслаў Мацвеевіч** [30.4.1905, мяст. Дамураты (*Domuraty*) Багнаўскай вол. Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 20.12.1988, Брэст], святар. Скончыў Пінскую гімназію, духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., потым у парафіі Міхала Арханёла ў мяст. Івянец аднайменнага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 1937 вікарый парафіяльнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Пружаны аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1938 катэхет у Брэсце. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны немцамі ў 1943. Вызвалены праз паўгода. У 1947 служыў (без рэгістрацыі) у касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Брэсце. Арыштаваны МДБ 28.7.1948. Асуджаны 9.11.1948 ваенным трыбуналам пры МУС Брэсцкай вобл. за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў.

Этапаваны 12.4.1949 у Мінеральны лагер МДБ Комі АССР (каля 25 000 зняволеных). У 1951 пераведзены ва Ухта-Іжэмскі лагер МДБ Комі АССР (каля 35 000 зняволеных). Вызвалены 14.7.1954. З сак. 1955 служыў у капліцы па вул. Светлай у Брэсце. Таемна выкладаў моладзі тэалогію для атрымання святарскага сана. 4.6.1959 пазбаўлены рэгістрацыі на 5 гадоў за «ўдзел моладзі ў св. імшы». Працаваў на чыгунцы і ў іншых мясцінах. З 1964 зноў служыў у касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Брэсце. Рэабілітаваны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Жертвы политического террора в СССР*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ЛАЗІНСКІ Зыгмунд Уладзіслававіч** [5(ці 8).6.1870, в. Барацін Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 26.3.1932, Пінск, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл.], біскуп Мінскі і Пінскі, грамадскі і культурны дзеяч. З польскай сялянскай сям'і. Вучыўся ў гімназіях Варшавы і Санкт-Пецярбурга. З 1889 клерык Магілёўскай мітрапалітнай духоўнай семінарыі, потым студэнт Магілёўскай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (23.6.1895). Працаваў выкладчыкам Святога Пісання і гамілетыкі ў духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. 17.11.1898 з-за канфлікту з расійскімі ўладамі звольнены з работы і высланы на 3 гады ў кляштар дамініканцаў Унебаўзяцця НПМ у в. Аглона, Латвія. У чэрв. 1900 прызначаны вікарыем парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Смаленску, Расія. З 1901 служыў у філіяльным касцёле НПМ у Туле, з 1902 — у Рызе. У 1904 пераведзены ў Мінск, рэктар філіяльнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа на Кальварыйскіх могілках. З 21.4.1905 пробашч катэдральнага касцёла Імя НПМ. З 1906 прафесар

Святога Пісання ў Магілёўскай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу, адначасова выкладаў у духоўнай семінарыі. З 1912 павышаў адукацыю ва ун-тах Італіі (Рым), Германіі, Палесціны. Падчас 1-й сусветнай вайны капелан у лагерах для нямецкіх і аўстра-венгерскіх ваеннапалонных у Цэнтральнай Расіі, Сібіры. У 1917—18 служыў пробашчам касцёла Яна Хрысціцеля ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. 2(ці 12).11.1917 прызначаны біскупам адноўленай Мінскай дыяцэзіі (14.8.1918). Браў удзел у беларусізацыі рэлігійнага жыцця беларусаў-католікаў. 10.10.1918 адчыніў Беларускую каталіцкую семінарыю ў Мінску. Падтрымліваў дзейнасць Хрысціянскай дэмакратычнай злучнасці. У снеж. 1918 з прыходам у Мінск Чырвонай Арміі 5 месяцаў хаваўся ад арышту ў лясах, але не пакідаў кіравання дыяцэзіяй. У жн. 1919 з прыходам Войска Польскага вярнуўся ў Мінск, працягваў служэнне. У пропаведзях рэзка выступаў супраць насаджэння бальшавікамі атэізму і знішчэння культурнай спадчыны. Арыштаваны ЧК 1.8.1920. Дзякуючы намаганням вернікаў праз 10 дзён вызвалены. Зноў арыштаваны 4.9.1920. Утрымліваўся ў Мінску, потым пераведзены ў Смаленск, пазней у Маскву. Праз 11 месяцаў вызвалены ў выніку абмену на ваеннапалонных чырвонаармейцаў. З 1922 жыў у Навагрудку. 2.12.1925 прызначаны біскупам новастворанай Пінскай дыяцэзіі. У 1926—32 служыў у катэдральным касцёле. Выкладаў біблеістыку, матэматыку, гуманітарныя прадметы ў Пінскай духоўнай семінарыі. Заснаваў час. «Miesięcznik Diecezji Pińskiej» (1925—26), «Piński Przegląd Diecezjalny» (1927—32). Пахаваны ў крыпце пінскага катэдральнага касцёла.

Тв.: Chrześcjańska miłość Ojczyzny i praca narodów. Gniezno, 1918; Rozważania majowe dla duchowieństwa. Pińsk, 1927; Pedagogika w pierwszych rozdziałach Pisma Świętego. Pińsk, 1929.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Stankiewicz A*. Rodnaja mowa u swiatyniach. Wilnia, 1929; *Stankievič A*. Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa*

*katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Рэлігія і царква на Беларусі*. Мн., 2001; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; PSB* XVIII; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ЛАТАРЭВІЧ Вінцэнт** [1881 ці 22.4.1886—19.3.1919], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1913). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1915 служыў у парафіі Унебаўзяцця НПМ у Пінску Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., потым пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішкалдзь Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл., парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Расстраляны чырвонаармейцамі ў Мірскім замку Гродзенскай вобл. Пахаваны ў Ішкалдзі.

Кр.: *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Komorowski J.* Kresowym szlakiem: kapliczki, pomniki, groby. Część II — Nowogródczyzna. Bractwo Krzyżowców PTTK Świdnica, seria monograficzna, zeszyt nr 12, kwiecień 2000. S. 12; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Уладзіслаў** [16.9.1869, в. Уждэле Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 1937], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1893). Прызначаны вікарыем парафіі Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў в. Крамяніца Ваўкавыскага дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. З 6.4.1895 больш за 40 гадоў адміністратар, потым пробашч касцёла НПМ у в. Рэпля Лунненскага дэканата, цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл., лунненскі дэкан (1920—27). Падчас

бальшавіцкага наступу ў 1920 арыштаваны, прыгавораны да расстрэлу, аднак пасля заступніцтва парафіян вызвалены.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Юльян** [1871 — ?], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1899). З 1903 і да сярэдзіны 1920-х пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Астрагляды Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Брагінскі р-н Гомельскай вобл. З 1926 і не менш як да 1934 пробашч парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Камень, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ЛАЎЦЭВІЧ Лявон** [27.2.1895—19.2.1981], святар. З сям'і арганіста аднаго з касцёлаў каля Санкт-Пецярбурга, потым Магілёва, які быў забіты бальшавікамі. Скончыў рэальнае вучылішча, вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі. Пасля яе закрыцця перавёўся ў Віленскую духоўную семінарыю, якую скончыў у 1919. Прыняў сакрамэнт святарства. Да 1935 вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Тургелі аднайменнага дэканата Віленскага пав., Літва. У 1936 адміністратар касцёла Маці Божай Вастрабрамскай у в. Язна Глыбоцкага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 1937 у парафіі св. Апосталаў Сымона і Юды Тадэвуша ў мяст. Воранава Беняконскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1940 адміністратар касцёла касцёла Хрыста Валадара ў в. Лявонпаль Мёрскага дэканата, цяпер Мёрскі р-н. Падчас 2-й сусветнай вайны таксама служыў у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер

Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл., парафіі Сар'я, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. З 1944 у касцёле св. Юзафа і НПМ у в. Барадзінічы, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны і асуджаны ў 1950 да ППЛ (тэрмін невядомы). У канцы мая 1950 этапаваны ў адзін з лагераў ГУЛАГу ў Сібіры. У 1954 знаходзіўся на ст. Берыкуль Кемераўскай вобл. Вызвалены ў 1955. Вярнуўся на старое месца службы, але не атрымаў рэгістрацыі. 18.3.1958 пераехаў да пробашча парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Мейшагола Кальварыйскага дэканата (Літва) **Ю. Абрэмскага**. 18.6.1964 атрымаў дазвол на душпастырскую дзейнасць у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Руднікі Троцкага дэканата, цяпер Літва.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЛЕЎШ Антон** [1906—14.11.1942], святар. Вучыўся ў Наваградскай настаўніцкай, потым у Наваградскай ніжэйшай (паводле іншых звестак — Пінскай) духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1938). Прызначаны вікарыем касцёла св. Казіміра ў мяст. Стоўбцы аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны гестапа. Зняволены ў Баранавіцкай турме. Паводле некаторых звестак, атручаны газам у лагеры Калдычэва каля Баранавічаў.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЛЕШЧАНКА Франц Адамавіч** [1904, в. Замосце Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. — ?], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. Да арышту працаваў у касцёле езуітаў св. Барбары ў роднай вёсцы. Арыштаваны АДПУ 16.2.1930. Асуджаны 18.3.1930 як «член антысавецкай арганізацыі» да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны на Далёкі

Усход. Зноў арыштаваны 27.8.1933. Прыгавораны калегіяй АДПУ 20.1.1934 за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Паўночна-Пячорскі лагер НКВД Комі АССР. Вызвалены 5.4.1946. Чарговы раз арыштаваны і 3.9.1949 высланы ў Краснаярскі край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.5.1989 пракуратурай БССР. Асабовыя справы Л. №№ 27213-с, 27937-с захоўваюцца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД*.

**ЛІСЕЦКАЯ Апалінарыя Казіміраўна** [1881, Орша Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — ?], член парафіяльнай рады касцёла Перамянення Пана ў Краснаярску, Расія. Арыштавана 2.7.1935. Абвінавачвалася ў «шпіянажы» і «ва ўдзеле ў антысавецкай арганізацыі». Асуджана 24.7.1936 да 6 гадоў ППЛ. Этапавана ў Сібірскі лагер НКВД Новасібірскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЛІСОЎСКІ Адам Юзафавіч** [6(18).1.1884 або 24.2.1883, в. Карэнды Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. — 9.10.1929, Варшава], святар, перакладчык. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі (1906). Прыняў сакрамэнт святарства (1907). Вучыўся ў Інсбруку (Аўстрыя, 1908—09), Мюнхене (1909—10). Служыў у Мінску вікарыем катэдральнага касцёла Імя НПМ, парафій св. Сымона і Алены і св. Роха. У 1912 капелан філіяльнага касцёла ў Сумах, цяпер Украіна, потым катэхет у школах Масквы. З 1914 пробашч парафіі св. Ганны ў в. Гарадзішча Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. З 1916 (?) душпастыр касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Ігумене Мінскай губ., цяпер райцэнтр Чэрвень Мінскай вобл., ігуменскі дэкан. Да з'езда бел. ксяндзоў у Мінску (1917)

падрыхтаваў рэферат «Беларускі рух і яго адносіны да жыцця касцёльнага, а таксама да акцыі каталіцкай у Беларусі». З 1919 пробашч касцёла Апекі Маці Божай у в. Каралішчавічы Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н, парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Анопаль таго ж пав. У пачатку 1922 адміністратар катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску, мінскі дэкан, генеральны вікарый усх. часткі Мінскай дыяцэзіі. Спрыяў увядзенню бел. мовы ў жыццё Касцёла. Арыштаваны АДПУ 2(ці 31).5.1922 за супраціў канфіскацыі касцёльнай маёмасці. Пад следствам знаходзіўся ў Мінскай турме ЧК з Я. *Васілеўскім*, М. *Тамашэўскім*. Асуджаны 22.5.1922 да ВМП (заменена на 5 гадоў ППЛ). Этапаваны ў 5.3.1923 у Яраслаўскую турму АДПУ, потым у маскоўскую турму «Бутыркі». Вызвалены 28.4.1924 у выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай. Зноў служыў у касцёле ў Гарадзішчы, потым у парафіі св. Андрэя Апостала ў мяст. Вышкі (*Wyszki*) Бельскага дэканата, Польшча. Ганаровы канонік Пінскай капітулы. Пераклаў на бел. мову кнігі Новага Запавета. Пахаваны ў Кляшчэлях Бельскага пав., Польшча.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ЛОБАЧ Катажына Антонаўна** [?, в. Засоўе Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — ?], актыўная парафіянка, дапамагала біскупу А. *Малецкаму*. Арыштавана ў крас. 1932 у Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург па справе «*Пранцкеціса* і інш.». Асуджана калегіяй АДПУ 19.7.1932 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Казахскую ССР. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЛОРЭНЦ (ЛЁРЭНЦ) Францішак** [29.1.1903, Сядліцы (*Siedlice*), Польшча — 3.8.1975], святар. Скончыў Познаньскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1930). На 1.8.1935 капелан у званні палкоўніка. З 1936 па верас. 1939 пробашч Гродзенскага гарнізона, потым пробашч Сувалкаўскай кавалерыйскай брыгады, кавалерыйскай дывізіі «Заза». Арыштаваны. Інтэрнаваны ў Літву, адкуль уцёк у Швецыю. Потым жыў у Францыі, Вялікабрытаніі.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЛУК'ЯНІН Юзаф Станіслававіч** [1888, казарма № 52 чыгункі Дзвінскага пав. Віцебскай губ., цяпер Літва — 3.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], святар. З сям'і служачага чыгункі. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (3.4.1914). Прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., выкладаў Закон Божы ў пачатковых школах горада. З 1915 капелан Дунайскай арміі ў Бесарабскай губ., душпастыр у в. Бялград (?). З 1918 рэктар капліцы Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Рудня-Шлягіна Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. У 1922 вікарый касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку, адміністратар парафіі св. Юзафа у в. Гарбачова-Абітокі (тагачасны паштовы адрас: ст. Неклач) Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер в. Гарбачова Расонскага р-на Віцебскай вобл. Неаднаразова выклікаўся ў ЧК. Арыштаваны 7.8.1922 у Полацку з кс. Юзафам *Дзям'янам* за адмову прысутнічаць пры раскрыванні мошчаў святога Андрэя Баболі. З 12.9.1922 знаходзіўся пад следствам у Віцебскай турме. Вызвалены (дзякуючы хадайніцтву парафіян) 12.10.1922 пад падпіску аб нявыездзе. 4.9.1923 апраўданы Віцебскім губернскім судом. Выехаў у Петраград, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія, выконваў абавязкі душпастыра ў капліцы Занеўская. Лячыўся ад

неўрастэніі. Зноў арыштаваны ў 1925. Вызвалены з-за хваробы. З 16.9.1927 пробашч касцёла кармелітаў у Чавусах, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., пазней у парафіі НПМ у Чэрыкаве, касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Зембін, цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Чарговы раз арыштаваны 20.9.1929 у Чавусах. Абвінавачваўся ў «сістэматычнай антысавецкай агітацыі ў казаннях, настройванні вернікаў супраць савецкай улады, заклікаў да аб'яднання супраць бязбожнікаў». Мелася на ўвазе казанне, прамоўленае Л. у касцёле ў в. Юркавічы (цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл.), якое датычыла адмовы ад святарства ксяндза Язэпа-Станіслава *Жамойтука*. Арышту папярэднічалі публікацыі ў друку (гл.: Кантррэвалюцыйная вылазка юркавіцкага ксяндза Лук'яніна // *Звязда*. 2 кастр. 1929), у якіх Л. абвінавачвалі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці і закліканні да пакарання Я.-С.Жамойтука. Следства з удзелам шматлікіх сведкаў праводзілася ў Магілёве і Мінску. Калегія АДПУ 3.2.1930 вынесла хадайніцтва аб пазасудовым прысудзе. 28.2.1930 пастановай прэзідыума УЦВК хадайніцтва задаволена. 13.3.1930 Л. асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Сызранскі лагер АДПУ Маскоўска-Казанскай чыгункі (ст. Барыш), потым у Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. і Комі АССР, куды прыбыў 16.6.1931. Працуючы ў лагеры спрабаваў наладзіць кантакт з Кансулатам Польшчы, скантактавацца са святарамі, якія знаходзіліся на галоўным востраве Салаўкоў (Савацеўскі ізалятар). Пасля выкрыцця гэтых спробаў становішча святара значна пагоршылася. У 1932 арыштаваны з 32 святарамі па групавой справе каталіцкага духавенства, абвінавачанага ў «стварэнні антысавецкай групоўкі, якая вяла антысавецкую агітацыю, тайна адпраўляла багаслоўскія і рэлігійныя абрады і здзяйсняла нелегальную сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару пра становішча католікаў у СССР». Следства хадайнічала 9.7.1932 аб пераводзе Л. у Яраслаўскі палітізалятар і асобным утрыманні. На Салаўках заставаўся да восені 1937. Пасля вызвалення зноў арыштаваны (9.10.1937). Тройкай УНКВД па Ленінградскай вобл.

прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.8.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа Л. № 12071 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пінскага раёна. Мн., 2003; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; З асабістага архіва У. Васькова.*

**ЛУПІНОВІЧ Карл-Аляксандр Карлавіч** [14.6.1890 ці 14.7.1891, мяст. Докшыцы Барысаўскага пав. Мінскай губ. цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — 22.12.1937 (?), Казахстан, НКВД), святар, грамадскі і культурны дзеяч. З бел. мяшчанскай каталіцкай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1914) у Санкт-Пецярбургу, да 1918 вучыўся ў Мітрапалітальнай духоўнай акадэміі. Член культурна-асветнага гуртка клерыкаў-беларусаў. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). Прызначаны вікарыем у Мінск (1918). Прымаў удзел у беларусізацыі нацыянальна-рэлігійнага жыцця. Арыштаваны бальшавікамі вясной 1919 як закладнік. Абменены на ваеннапалоннага камуніста ці чырвонаармейца. В. а. пробашча касцёла св. Казіміра ў Магілёве. Біскупам Я.*Цеплякам* пераведзены 10.1.1920 вікарыем катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. З мая 1920 капелан капліцы св. Казіміра ў Жлобіне Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл., касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Антушы Рагачоўскага пав., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. У ліп. 1921 прызначаны вікарыем касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Маскве. У 1922—23 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Рэчыцы Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. З 1924 у Маскве, служыў у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла. З 1926 в. а. генеральнага вікарыя

і фактычна з'яўляўся Апостальскім Адміністратарам у Маскве. Арыштаваны АДПУ 20.2.1929. Абвінавачваўся як «падазроны ў шпіянажы і ўдзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі». Быў прымушаны падпісаць заяву аб супрацоўніцтве (пасля вызвалення паведаміў пра гэта біскупу **Пію Неве**). Зноў арыштаваны 15(ці 18).2.1931. Прыгавораны 18.11.1931 калегіяй АДПУ за «шпіянаж» і «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Казахскую ССР (Каркаралінск). Працаваў бухгалтарам у Казахскім геалагічным разведвальным трэсце (Семіпалацінск, Усходне-Казахстанская вобл.). У снеж. 1933 арыштаваны і этапаваны ў Мінск (зноў як падазроны ў правядзенні шпіёнскай дзейнасці). Асуджаны 29.3.1934 да 3 гадоў высылкі. Вернуты ў Казахскую ССР. У чэрв. 1936 узяты ў высылцы пад варту. 9.1.1937 спецыяльнай калегіяй Казахскага аддзялення Вярхоўнага суда РСФСР асуджаны да 10 гадоў ППЛ. З сак. 1937 у Алма-Ацінскім лагеры. Камісія НКВД і пракуратуры СССР 11.12.1937 перагледзела справу і прыгаварыла Л. (з Я. *Вярсоцкім*) за «дапамогу сусветнай буржуазіі і ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 15.10.1959.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Книга Скорби; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *З асабістага архіва У.Васькова.*

**ЛЬВОВА Амілія Казіміраўна** [1893, Вільня — ?], актыўная парафіянка. З сям'і польскага землеўласніка. Працавала ў касцёле св. Космы і Дам'яна ў мяст. Астравец, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Арыштавана 6.9.1944. Асуджана

асобай нарадай пры НКВД 1.9.1945 як «сацыяльна небяспечны элемент» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Этапавана ў Краснаярскі край. Вызвалена 6.9.1949. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана пракуратурай Гродзенскай вобл. 25.10.1994. Асабовая справа Л. № п-21402 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ЛЮБЕЦКІ Аляксандр Юзафавіч** [10.12.1906—1942 (?)], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (?). Прыняў сакрамэнт святарства (1932). З 1934 вікарый касцёла св. Тэрэзы ў Вільні. У 1936—37 пробашч касцёла Перамянення Пана ў в. Спас Вілейскага дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1938 служыў у парафіі Звеставання НПМ у в. Альковічы таго ж дэканата і р-на. Арыштаваны гестапа ў канцы 1942. Верагодна, павешаны гітлераўцамі ў Вілейскай турме.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЛЮБЯНЕЦ Карл** [1866, в. Нача Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — 22.8.1942], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1898). З 1905 інспектар семінарыі, ганаровы канонік Віленскай капітулы, прэлат. З 1935 рэктар філіяльнага касцёла ў в. Плябань, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны в. а. генеральнага вікарыя са спецыяльнымі паўнамоцтвамі для ўсх. (савецкай) часткі Віленскай архідыяцэзіі, дэкан Маладзечанскага дэканата. Арыштаваны гестапа за дапамогу яўрэям і сувязь з АК. Расстраляны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**ЛЯВІЦКІ Мечыслаў Юзафавіч** [1888, Гродна — ?], святар. Скончыў Гродзенскую гімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1913). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Мазыры Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. У 1914 у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. З сак. да ліст. 1917 адміністратар парафіі Перамянення Пана ў Краснаярску, Расія, потым у дабрачынным таварыстве ў Омску. З 1919 у Радзе аб'яднання польскіх арганізацый. Арыштаваны 6.3.1920 з вялікай групай палякаў у Омску як закладнік. Этапаваны 14.4.1921 у маскоўскую турму «Бутыркі». Вызвалены, верагодна, у выніку абмену вязнямі. У 1923—34 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Чарнаўчыцы, цяпер Брэсцкі р-н. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЛЯШЧЭВІЧ Антоні Янавіч** [18(30).9.1890, в. Абрамаўшчына Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. — 17.2.1943, в. Росіца, Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл.], марыянін, місіянер, грамадскі дзеяч. З каталіцкай сялянскай сям'і. У верас. 1902 — жн. 1908 вучыўся ў прыватнай гімназіі пры касцёле св. Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу. Танзуру і ніжэйшае свячэнне атрымаў 14.10.1912, субдыяканат і дыяканат у 1913. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (13.4.1914). Прыняў сакрамэнт святарства. З 17.6.1915 вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у Іркуцку, касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Чыце, Расія, прэфект дзвюх рускіх і адной польскай СШ. 2.8.1917 пераведзены ў касцёл св. Станіслава ў Харбіне, цяпер Кітай. Апекаваў польскую калонію ў філіі парафіі ў Маньчжурыі (866 км ад Харбіна), быў катэхетам СШ, выкладаў лацінскую мову ў рускай гімназіі. У 1920 зноў у Харбіне, дзе выкладаў лацінскую мову ў польскай гімназіі

імя Генрыка Сянкевіча. Служыў пробашчам створанай для палякаў у 1924 парафіі св. Юзафа ў Харбіне. Пабудаваў касцёл, плябанію, арганізаваў школу для бедных дзяцей. У 1937 вырашыў уступіць у ордэн марыянаў. 23.12.1937 патаемна пакінуў Харбін, наведаў Токіо. 23.1.1938 выехаў у Рым, куды прыбыў у сярэдзіне лют. 1938. Зноў пацвердзіў кіраўніцтву жаданне ўступіць у ордэн і прайсці навіцыят. Праз нядоўгі час прыехаў у Польшчу, пасля ў Друю. Аднак з-за складанай палітычнай сітуацыі кіраўніцтва параіла Л. адбыць навіцыят у Скурцы (*Skórzec*) каля Седльцаў (*Siedlce*), Польшча. 13.6.1939 прыняў першыя законныя шлюбы. Са жн. 1939 вёў душпастырскую дзейнасць у Беларусі. Працаваў аканомам Друйскага кляштара марыянаў. З ліст. 1941 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца Магілёўскай архідыяцэзіі, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл., таксама абслугоўваў філіяльны касцёл Нараджэння НПМ у Дрысе, цяпер райцэнтр Верхнядзвінск Віцебскай вобл. У 1943, нягледзячы на папярэджанне аб пагрозе з боку немцаў, застаўся працаваць. Спалены з вернікамі падчас нямецкай карнай акцыі. Беатыфікаваны Папам Янам Паўлам II у 1999.

Гл. таксама арт.: Кашыра Юрый Тадэвушавіч.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *ЭГБ*, т. 4; *Bykowicz J.* Męczennicy z Rosicy. Warszawa, 1993; *Пялінак Вячаслаў*. Росіцкія мучанікі. Росіца, 1999; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; ЭГБ*, т. 4; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; З асабістага архіва І. Жарнасек; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**МАЕЎСКІ Міхал Эразмавіч** [28.4.1870, в. Весялоўка (?), цяпер Украіна — 25.11.1949], святар. У 1889 скончыў рэальную школу ў Пензе, Расія. Вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (18.3.1895). Працаваў прэфектам школ у Гомелі. З 1904 у парафіі св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу, Расія. З 1906 пробашч катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. З верас. 1908 пробашч мінскай парафіі Найсвяцейшай Тройцы. У 1920—23 служыў у касцёле св. Антонія Падуанскага ў Баранавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 4.4.1923 пробашч парафіі Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў в. Ракаў, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 21.4.1931 на пенсіі. Накіраваны на працу ў касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Андрэя Баболі ў в. Мінойты, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл., дзе дапамагаў святару Чэславу *Янкоўскаму*. З прыходам савецкіх уладаў абодва святары пазбаўлены сваёй кватэры і жылі ў парафіяніна **Юзафа Змітровіча** з в. Паддубна, за 4 км ад касцёла. Арыштаваны НКВД у канцы чэрв. 1941 з Ч. *Янкоўскім.* Абвінавачаны ў шпіёнстве на карысць Германіі. Святароў збіраліся расстраляць у Шэйбаках (каля Ліды), але з-за наступу немцаў іх пагналі да в. Пудзіна, дзе зачынілі ў хляве і кінулі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**МАКЕЙ Ігнаці Валянцінавіч** [1918, в. Мікелеўшчына Гродзенскага пав., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Працаваў у касцёле Наведзінаў НПМ у роднай вёсцы. Арыштаваны 3.9.1944. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 21.7.1945 за «сувязь з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Краснаярскі край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Гро-

дзенскай вобл. 26.8.1994. Асабовая справа М. № п-21128 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**МАКНЯ Юзаф** [1.2.1881—3.5.1957, Седльцы (*Siedlce*), Польшча], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1905). Прызначаны вікарыем касцёла св. Ганны ў мяст. Койданава, цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл. З 1906 у парафіі Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў в. Ракаў Мінскага пав., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 1908 адміністратар касцёла св. Людвіка ў в. Свяцілавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл. Некаторы час таксама служыў у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Волма, цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. З 1911 (?) катэхет Смаленскай гімназіі. З 1919 пробашч смаленскага касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ. Арыштаваны ў 1919 з групай святароў як закладнік. Дзякуючы польскаму ўраду вызвалены. Выехаў у Польшчу. У 1923—34 вікарый і катэхет парафіі св. Станіслава ў в. Лукаў (*Łuków*), вікарый седлецкай парафіі. З 1934 катэхет і адвакат біскупскага суда ў Седльцах. З 1945 рэктар касцёла Св. Крыжа, сінадальны суддзя, канонік седлецкай капітулы.

Кр.: *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МАКРЭЦКІ Ян** [1899—3.10.1959], святар, магістр тэалогіі. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1921). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок Шчучынскага пав. Лідскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1926 пробашч парафій Найсвяцейшай Тройцы ў в. Дэмбрава Лідскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н. З 1931 служыў у касцёле Маці Божай Ружанцовай у в. Пескі Ваўкавыскага

дэканата і пав. Гродзенскай губ., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. У 1933 у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Вільні. З 1934 у касцёле св. Антонія Падуанскага ў мяст. Сакулка (*Sokółka*), Польшча. З 1936 вікарый парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Поразава Ваўкавыскага пав. і дэканата, цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. З 1937 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Канстанцінава (Канстанцінаў Дзісненскі) Глыбоцкага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Дзеркаўшчына Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Пасля прыходу Чырвонай Арміі некаторы час хаваўся ў парафіян. Потым служыў у Віленскай архідыяцэзіі на тэрыторыі БССР.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МАЛАЎСКІ Уладзіслаў** [13.3.1890 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства. З 1.1.1919 адміністратар парафіі св. Казіміра ў Маладзечна, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1936 пробашч касцёла св. Пятра і Паўла ў Пружанах аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. У 1939 маёр, капелан. Мабілізаваны ў верас. 1939. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МАЛЕЦ Дзяніс** [1909, в. Лембаўка Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — 1941, Мінск], святар, рэлігійны і грамадскі дзеяч. З бел. каталіцкай сям'і. Вучыўся ў Ніжэйшай духоўнай семінарыі ў Наваградку, якую скончыў у 1931. Падчас вучобы падтрымліваў уніяцкі рух, удзельнічаў у IV і V канферэнцыях у Пінску па справе царкоўнай

уніі. З 1931 вучыўся ў Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Пінску. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). Прызначаны вікарыем парафіі Нараджэння НПМ і св. Мікалая ў Бельску Падляскім (*Belsk-Podlaski*) аднайменнага пав., Польшча. З восені 1938 прэфект пінскіх школ. З 1939 вікарый катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску. Браў удзел у беларусізацыі касцёльнага жыцця. У якасці ганаровага госця прысутнічаў на канферэнцыі школьных інспектараў у Мінску (15.12.1941), дзе выказаў пратэст супраць вострых антыкаталіцкіх акцэнтаў у прамове галоўнага камісара Беларусі В. Кубэ, не ўстаў, калі гучаў нямецкі гімн. Арыштаваны гестапа і расстраляны як польскі агент у канцы 1941.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Мартос А*. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Буэнос-Айрес, 1966 (рэпрынт: Мн., 1990); *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**МАЛЕЦКІ Антоні Юзафавіч** [17.4.1861, Санкт-Пецярбург — 17.1.1935, Варшава], святар. Сын палкоўніка інжынерных войскаў. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1884). Прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску, але не атрымаў дазволу ад царскіх уладаў, якія лічылі сям'ю Малецкіх варожа настроенай да імперыі з-за ўдзелу ў паўстанні 1863. Служыў вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. Праз паўгода, у 1885, дзякуючы хадайніцтву віцебскага губернатара генерала фон Валла, улады пацвердзілі папярэднюю намінацыю на вікарыя мінскай катэдры. У 1886 улады без згоды Мітрапаліта прызначылі на пасаду пробашча катэдры **Вітольда Ваяводскага**, які праводзіў набажэнствы на рускай мове. М. з ведама біскупа не пагадзіўся з гэтым. Пасля

безвыніковага ціску начальніка паліцыі і губернатара, якія патрабавалі аддаць ключы ад катэдры, у маі 1886 М. быў арыштаваны як «непаслухмяны ўладзе ганебны ксёндз». Было загадана выслаць святара пад канвоем у Арэнбург, але дзякуючы парафіянам, якія падкупілі дырэктара аддзела дазнанняў Лагоду, прысуд замянілі на 3 гады ізаляцыі ў кляштары дамініканцаў у в. Аглона Віцебскай губ., цяпер Латвія. Пасля 7 месяцаў, праведзеных у Аглоне, М. атрымаў дазвол заняць пасаду вікарыя ў касцёле св. Станіслава ў Санкт-Пецярбургу. У 1896—1923, 1925—30 таксама абслугоўваў капліцы Найсвяцейшага Сэрца НПМ і Беззаганнага Зачацця НПМ. Адчыніў на вул. Курылаўскай дзіцячы прытулак для 800 хлопчыкаў на ўзор выхаваўчай сістэмы св. Яна Боска з Турына. У Лузе пад Пецярбургам адкрыў рамесніцкую школу, санаторый і першую ў Расіі польскую гімназію. З 1921 М. — рэктар тайнай духоўнай семінарыі ў Петраградзе. Арыштаваны ў сак. 1923. Праходзіў па справе біскупа Я. *Цепляка.* Асуджаны да 3 гадоў зняволення і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў маскоўскую турму Лефортава, пасля ў «папраўчы дом» у Сакольніках, дзе перажыў сардэчны прыступ. Вызвалены ў студз. 1925. Служыў пробашчам парафіі св. Кацярыны Александрыйскай у Ленінградзе. 13.8.1926 патаемна асвечаны папскім пасланнікам М. **Д'Эрбіны** (*M. D'Herbigny*) як біскуп Ленінграда і Апостальскі Адміністратар паўночнай Расіі. Пасля выяўлення гэтага факту за М. сачыла ДПУ. Зноў арыштаваны 4.5.1927. Пад пагрозай дэпартацыі і крымінальнага абвінавачання святару было загадана пераехаць у Вятку. М. папрасіў аб замене Вяткі на Архангельск і падпісаў заяву, у якой абяцаў добраахвотна пакінуць Ленінград. 13.5.1927 выехаў у Архангельск. На наступны дзень дэлегацыя з 8 чалавек з розных парафій прыйшла ў ленінградскі губернскі выканаўчы камітэт з петыцыяй, падпісанай 100 парафіянамі, для высвятлення лёсу біскупа. У петыцыі звярталася ўвага на тое, што М. на працягу 40 гадоў служыў толькі для рабочых і бедных людзей. Начальнік выканкама Камароў і яго

памочнік Лявонаў паказалі заяву святара аб добраахвотным выездзе. Дзякуючы ўмяшальніцтву маскоўскага касцёльнага кіраўніцтва М. вярнуўся ў Ленінград. Як і раней, біскупа пераследавалі частымі рэвізіямі, позвамі ў розныя ўстановы. М. двойчы арганізоўваў у Ленінградзе таемную духоўную семінарыю: у 1926 (дзейнічала з кастр. 1926 да 14.1.1927) і ў 1927 (пратрымалася да 1930). Арыштаваны 20(ці 25).11.1930. Абвінавачаны ў «нелегальных кантактах з іерархамі касцёла, якія знаходзіліся за мяжой, распаўсюджванні антысавецкай літаратуры, арганізацыі нелегальных каталіцкіх семінарый і правядзенні антысавецкай агітацыі падчас казанняў». Прыгавораны калегіяй АДПУ 21.11.1930 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў пас. Дубініна каля Брацка. Вызвалены цяжка хворым. Спрабаваў вярнуцца ў Ленінград. Са снеж. 1933, чакаючы рашэння, жыў у святара А. *Жукоўскага* ў Іркуцку. На пачатку 1934, дзякуючы намаганням кардынала А. **Какоўскага**, атрымаў дазвол на выезд у Польшчу. Супрацоўнікам польскага консульства ў Маскве быў знойдзены на чыгуначным вакзале ў Іркуцку ў цяжкім фізічным і псіхічным стане. Перавезены ў клініку ў Ленінград. Пасля лячэння адмовіўся ад выезду ў Польшчу, лічыў неабходным застацца сярод сваіх вернікаў, але быў вымушаны ехаць у Рым, каб даць Папе справаздачу пра стан дыяцэзіі. 20.4.1934 выехаў у Польшчу, 28.4.1934 ужо быў у Варшаве, дзе неўзабаве памёр. Пахаваны ў катэдральным саборы св. Яна ў Варшаве. У 1961 перапахаваны на могілках Павонзкі. Рэабілітаваны 12.11.1980. Пачалася падрыхтоўка да працэсу беатыфікацыі.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

**МАЛІНОЎСКІ Юзаф**[1] [1907 — кастр. 1942], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны вікарыем фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 1937 служыў у парафіі Маці Божай Каралевы Польскай у в. Тылжа Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Літва. Перад арыштам, верагодна, служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Краснае (Краснае Сяло) Вілейскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны гестапа і закатаваны ў Вілейскай турме.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**МАЛЫНІЧ-МАЛЕЦКІ Мечыслаў Вацлававіч** [19.9.1888, мяст. Бераставіца Гродзенскага пав., цяпер Вялікая Бераставіца, райцэнтр Гродзенскай вобл. — 30.3.1969, Слуцк Мінскай вобл.], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Прызначаны катэхетам касцёла св. Агнешкі ў в. Гонялдз (*Goniądz*) Беластоцкага дэканата, цяпер Польшча. У 1912—14 служыў у Вільні ў архікатэдральным касцёле св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста. У пачатку 1920-х пробашч парафіі НПМ і св. Казіміра ў в. Монькі (*Mońki*) Беластоцкага пав. Кнышынскага дэканата, Польшча, дзе пачаў будоўлю новага касцёла. З 1926 служыў у парафіі св. Станіслава ў в. Высоцк Слонімскага

---

[1] Не блытаць:

**МАЛІНОЎСКІ Юзаф** [1906 — ?], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1933). З 1935 вікарый касцёла Нараджэння НПМ у Браславе аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1937 вікарый парафіі св. Міхала Арханёла ў Ашмянах аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл.

**МАЛІНОЎСКІ Юзаф** [1890 — ?], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1914). З 1918 адміністратар касцёла св. Мучаніка Юрыя ў в. Беліца, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. У 1929—33 пробашч касцёла Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў в. Крамяніца, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis.*

дэканата, цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. З 1930 у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ясянуўка (*Jasionówka*) Беластоцкага пав. Кнышынскага дэканата, Польшча. З 1934 у парафіі Наведзінаў НПМ у в. Новыя Трокі Троцкага дэканата, цяпер Тракай, Літва, і ў в. Старыя Трокі. У 1936 служыў у Вільні. З 1939 пробашч парафіі св. Казіміра ў в. Уселюб Навагрnative Навагрудскага пав. і дэканата, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. У кастр. 1944 Віленскай курыяй прызначаны пробашчам касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку Мінскай вобл., але не атрымаў афіцыйнай «даведкі» Савета па справах рэлігійных культаў. З 1945 пробашч касцёла Звеставання НПМ у мяст. Вялікая Бераставіца Бераставіцкага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Адначасова праводзіў актыўную місіянерскую дзейнасць ва ўсходніх р-нах Беларусі, заклікаў католікаў адстойваць свае правы, патрабаваць адкрыцця касцёлаў. Пад уплывам М.-М. у парафіях Слуцка, Бабруйска, Асіповічаў, Замосця, Цімкавічаў, Капыля, Бабоўні, Койданава, Барысава, Магілёва, Мазыра, Мінска і іншых месцаў створаны групы, якія накіроўвалі дакументы на рэгістрацыю касцёлаў у выканаўчыя органы ўлады. Аднак на шматлікія лісты і тэлеграмы, нават самому І. Сталіну, афіцыйных адказаў не было. У знак пратэсту М.-М. адмовіўся ўдзельнічаць у выбарах у Вярхоўны Савет СССР у крас. 1946. У выніку 26.6.1947 ён быў арыштаваны. Асуджаны 3.1.1948 у адзін дзень з А. *Банькоўскім* асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 7 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Цемнікоўскі лагер МДБ Мардоўскай АССР. Пасля вызвалення (1955) вярнуўся ў Слуцк. Не атрымаўшы дазволу ад савецкіх уладаў, выконваў душпастырскія абавязкі тайна, пераязджаў з вёскі ў вёску, начаваў у вернікаў. Пад уплывам М. у 1955 і 1956 католікі Магілёва і Бабруйска настойліва хадайнічалі аб адкрыцці касцёлаў і рэгістрацыі іх рэлігійных суполак, але кожны раз аблвыканкам адмаўляў. 26.10.1956 святара выклікаў упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў па Магілёўскай вобл. У катэгарычнай форме ён указаў М.-М. на «парушэнне заканадаўства аб рэлігійных культах»,

на што той заявіў, што будзе да канца сваіх дзён праводзіць ускладзеную на яго місію па падтрыманні і прапаведаванні рэлігіі. Упаўнаважаны забараніў святару з'яўляцца ў вобласці і праводзіць рэлігійную дзейнасць. 25.6.1957 каля 70 чалавек з'явіліся на прыём у Савет Міністраў БССР, патрабуючы адчыніць касцёл у Мінску. У 1959, ужо з падарваным здароўем, М.-М. ездзіў па населеных пунктах усходніх абласцей рэспублікі. Адпраўляў набажэнствы, хрысціў і вянчаў, заклікаў католікаў змагацца за свае правы. У 1960-я купіў у Магілёве вялікі драўляны дом для таемнага аб'яднання Сясцёр ад Анёлаў (існаваў да 1991), дзе таемна праводзіў набажэнствы. Рэабілітаваны 4.9.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа М. № 27406-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992. Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**МАНЬТУЖЫК Антоні** [28.5.1905, мяст. Бжуза (*Brzóza*) Кялецкага пав., цяпер Польшча — 15.12.1965, Чэшыр (*Cheshire*), Вялікабрытанія], святар, магістр тэалогіі. З сялянскай сям'і. З 1918 вучыўся ў Казяніцкай гімназіі, скончыў Віленскую гімназію, Віленскую духоўную семінарыю, адначасова ун-т імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (4.4.1931). Прызначаны вікарыем касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Відзы, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Праз тры месяцы пераведзены ў парафію Найсвяцейшай Тройцы ў в. Гервяты Варнянскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. З 19.10.1935 вікарый і катэхет парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Беняконі аднайменнага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 14.7.1936 катэхет касцёла св. Юзафа ў в. Падброддзе Свянцянскага дэканата, цяпер г. Пабрадэ, Літва.

Адначасова дапаможны капелан аддзелаў Корпуса аховы памежжа. На 8.4.1939 капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны ў канцы жн. 1939. Да 26.9.1939 служыў у ваенным шпіталі № 301 у Вільні. З 29.9.1939 зноў у Падброддзі. Арыштаваны 13.12.1939 літоўскай міліцыяй, якая супрацоўнічала з савецкай уладай. Зняволены ў Лукішках. Перавезены ў Вільню, далей у Коўна, потым у лагеры для інтэрнаваных у Калатове, Вількаміры, Вайткушках. Пасля ўваходу савецкіх войскаў у Літву 10.7.1940 этапаваны ў Казельск-2, дзе працаваў санітарам у палявым шпіталі для палякаў. Займаўся таемнай душпастырскай дзейнасцю. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў адзін з лагераў Паўночнай Расіі. Вызвалены 25.8.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Служыў капеланам 13-га пяхотнага палка 5-й дывізіі арміі **У. Андэрса.** У канцы ліп. 1942 пераведзены ў 7-ю дывізію, з якой трапіў у Іран, пасля ў Ірак. Прайшоў італьянскую кампанію. З 1946 у Велікабрытаніі, капелан Вестэрн Команд (*Western Command*). Пасля 1947 пробашч польскай парафіі ў мяст. Дэламер (*Delamere*), дэкан парафіі ў г. Чэшыр. Набыў парафіяльны дом і зямлю пад касцёл у Нортвічы (*Northwich*). Касцёл пабудаваны і асвечаны ў ліп. 1964. Папа **Павел VI** надаў М. годнасць папскага шамбеляна. Узнагароджаны «Залатым Крыжам Заслугі з Мячамі», а таксама «Срэбным крыжам» вайсковага ордэна *Virtuti Militari* 5-га класа.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**МАРДАСЕВІЧ Адэля (Марыя-Стэла)** [14.12.1888, в. Цясноўка Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. — 1.8.1943], законніца. Уступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям’і з Назарэта (1910), склала першыя законныя шлюбы (1913) і прыняла імя Марыя-Стэла.

Склала вечныя законныя шлюбы (Рым, 1921). Служыла настаяцельніцай законнага дома Хрыста Валадара ў Наваградку. Арыштавана гестапа 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі ў ваколіцах Наваградка.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МАРОЗ Ян Антонавіч** [1886, в. Крыцэвічы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. — 29/30.3.1952, ГУЛАГ], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1908). З 1912 вікарый, потым пробашч парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Ражанка Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. У першай палове 1910-х таксама служыў у фарным касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Лідзе, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Арыштаваны 9.2.1949. Асуджаны 30.3.1949 за «антысавецкую арганізацыю» і «актыўную барацьбу супраць савецкай дзяржавы» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вінаватым сябе не прызнаў. Этапаваны ў Дубраўны лагер МДБ Мардоўскай АССР. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 19.10.1993 судовай калегіяй Вярхоўнага суда Беларусі. Асабовая справа М. № п-20483 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *НАРБ, ІКБР*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МАРСЭНГЕР Юзаф Фердынандавіч** [23.3.1902—9.6.1982, в. Солы, Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл.], законнік, святар, магістр тэалогіі. 29.9.1919 уступіў у ордэн езуітаў у Старой Весі (*Stara Wieś*), Польшча. Скончыў Віленскую

духоўную семінарыю. Вывучаў класічную літаратуру ў Віленскім ун-це імя Стэфана Баторыя, тэалогію ў Люблінскім ун-це. Прыняў сакрамэнт святарства (23.6.1935). Застаўся пад савецкай і нямецкай акупацыяй. З другой паловы 1941 служыў у адным з адчыненых касцёлаў Віцебскай вобл., у касцёле Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў в. Ракаў Маладзечанскага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. У 1943 пробашч касцёла Нараджэння НПМ у Браславе аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Мабілізаваны як капітан АК, удзельнічаў у віленскай аперацыі «Вострая Брама». Пасля вясны 1944 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Краснае (Краснае Сяло) Вілейскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. У 1950 падчас масавых арыштаў каталіцкіх святароў у Беларусі хаваўся. Арыштаваны 23.9.1957. Абвінавачваўся са святаром **А. Зомбакам** ва ўдзеле ў арганізацыі петыцый за вяртанне каталіцкаму Касцёлу катэдры ў Мінску. Асуджаны асобай нарадай МДБ да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ (Новасібірск). Вызвалены ў 1959. Вярнуўся на старое месца службы. У студз. 1968 пераведзены ў парафію Маці Божай Ружанцовай у в. Солы Ашмянскага дэканата, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. Падрыхтаваў да святарства **Альберта Марсэнгера**.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**МАРТЫНЭЛІС Баляслаў Дамінікавіч** [13.9(25.9).1895, в. Авіжы Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 28.9.1955, Вялікабрытанія], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (30.5.1920). Прызначаны вікарыем касцёла ў в. Стаклішкі Троцкага пав. Віленскай губ., цяпер Літва. З 20.7.1921

адміністратар касцёла св. Апостала Тадэвуша ў в. Вішнева Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1926 пробашч парафіі св. Апосталаў Сымона і Юды Тадэвуша ў мяст. Воранава Беняконскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1933 адміністратар касцёла св. Ганны ў в. Дукшты Піярскія Кальварыйскага дэканата, цяпер Літва. З 1938 пробашч парафіі Перамянення Пана ў в. Крэва Ашмянскага пав. і дэканата, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 14.5.1939 пробашч касцёла св. біскупа Мікалая ў в. Геранёны, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 10(11).4.1940. Вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян (1941). Служыў капеланам у арміі **У. Андэрса.** Пасля сыходу з савецкай тэрыторыі — рэзервовы капелан 5-й віленскай брыгады. З польскім войскам прыбыў у Вялікабрытанію. Служыў у асяродку польскай эміграцыі. Загінуў пры невядомых абставінах.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**МАРЦІНЯК Ізідор (Сідар) Андрэевіч** [23.4.1898, мяст. Крысцянова (Міхажэва) *(Krystianowo (Michorzewo)*, Польшча — 19.8.1942, в. Барова, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.], салезіянін. Са шматдзетнай мяшчанскай сям'і. У 1905—12 вучыўся ў нямецкай школе ў Міхажэве. З 1.7.1912 вучань купца, потым працаваў у фірме па гандлі жалезам і будаўнічымі матэрыяламі ў Велькапольскім Львуўку (Нойштат) (*Lwówek Wielkopolski (Neustadt*), Польшча. Паралельна вучыўся ў вячэрняй школе. Прызваны ў нямецкае войска 11.11.1916. Падчас ваенных дзеянняў паранены. Вярнуўся на радзіму. У ліст. 1918 са шпіталя накіраваны ў гарнізон у Вітэмбердзе (*Wittemberd*), але да месца не даехаў. З пачатку студз. 1919 змагаўся ў складзе польскага войска. Дэмабілізаваны

12.7.1921 як падафіцэр. Працаваў у фірме па аперацыях са збожжам. За восем месяцаў стаў нам. кіраўніка. Потым служачы ў банкаўскіх аддзяленнях розных гарадоў Польшчы. 1.7.1929 прыняты ў ніжэйшую духоўную семінарыю салезіянаў імя князя Аўгуста Чартарыйскага ў Дашаве (*Daszów*), Польшча. Пачаў навіцыят 12.7.1932 у Чарвіньску (*Czerwińsk*), Польшча. Склаў першыя законныя шлюбы (15.7.1933). З 1933 на курсах у Салезіянскім філасофскім інстытуце. Потым накіраваны на 3-гадовую педагагічную практыку: выхавацелем у інтэрнаце пры рамесніцкай школе, арганізаванай салезіянамі ў Вільні, потым у падобнай установе імя св. Барбары ў Лодзі (*Łódź*), Польшча. Склаў вечныя законныя шлюбы (17.7.1937). Накіраваны на вывучэнне тэалогіі ў Салезіянскі тэалагічны студэнтат у Кракаве (*Kraków*), Польшча. З пачаткам 2-й сусветнай вайны клерыкі гэтай установы пераехалі ў Вільню, каб працягваць вучобу ў духоўнай семінарыі. У пачатку ліп. 1940 працягваў вучобу ў літоўскім салезіянскім асяродку ў Салдуцішкісе. Атрымаў свячэнне субдыяканата і дыяканата (21/22.12.1940, Вільня). Прыняў сакрамэнт святарства (20.4.1941, Вільня). Паводле некаторых звестак, загінуў пад Мінскам з **Янам Павельцам** у ліп. 1942.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Żurek W. Salezjańscy męczennicy Wschodu.*

**МАРЦОНЬ Станіслаў (Мечыслаў) Юзафавіч** [1906—1940], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). З 1933 в. а. адміністратара новага касцёла ў в. Заастравечча Нясвіжскага пав. і дэканата, цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны НКВД у верас. 1939. Вязень лагера ў Казельску Смаленскай вобл. Этапаваны ў Цвер. Расстраляны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski,*

*Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МАРЦЫНКОЎСКАЯ Марыя Міхайлаўна** [1870, Віцебск — ?], актыўная парафіянка. З мяшчанскай сям'і. Да арышту жыла ў Ленінградзе, дапамагала па гаспадарцы святару С. *Войну*. Арыштавана 8.5.1931 па справе «каталіцкага духавенства». Асуджана 7.3.1932 калегіяй АДПУ да 5 гадоў ППЛ (тэрмін заменены на 5 гадоў ссылкі). Этапавана ў Казахскую ССР. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**МАРЦЫНКОЎСКІ Франц Францавіч** [27.5.1909, Варшава — 1941 (?)], законнік. З сям'і польскага рабочага. У 1930 уступіў у ордэн капуцынаў. Вывучаў філасофію і тэалогію ў Ломжы (*Łomża*) і ў Любліне (*Lublin*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (17.7.1937, Люблін). Пасля года ў кляштары ў Любартаве (*Lubartów*), Польшча, пераехаў у мужчынскі кляштар у Ломжы, Польшча. Пад савецкай акупацыяй 1939—40 прымаў удзел у канспіратыўнай працы, капелан арганізацыі «Служба перамозе Польшчы». Арыштаваны 2.7.1940. Перавезены ў Беласток (*Białystok*). Асуджаны 10.2.1941 асобай нарадай як «удзельнік антысавецкай арганізацыі» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў адзін з лагераў Архангельскай вобл. або Комі АССР. Загінуў у зняволенні. Пасмяротна ўганараваны «Залатым Крыжам Заслугі з Мячамі». Рэабілітаваны 15.5.1989 пракуратурай Гродзенскай вобл. Асабовая справа М. № п-9376 захоўваецца ў архіве УКГБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МАРЧЫНЯН (МАРЦІНЯН) Ксаверый** [1878—7.3.1918], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1903). Служыў у капліцы св. Антонія ў с. Крыслаўка Іркуцкай губ., Расія. З 1909 адміністратар парафіі Юзафова Верхнядзвінскага дэканата Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. З 1912 у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ мяст. Неўтэраны (Рогаўка), цяпер Латвія. Забіты бальшавікамі пры алтары ў касцёле.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Литургический календарь; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МАСЕВІЧ Раман** [1887—1943], катэхет, доктар філасофіі, бакалаўр тэалогіі і каталіцкага права. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1914). У 1920 у касцёле св. Юзафа і НПМ у мяст. Валожын, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1922 катэхет у Вільні. З 1935 катэхет пры парафіі св. Юзафа і НПМ у в. Барадзінічы Браслаўскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1937 катэхет пры касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Паставы Надвілейскага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны адміністратар касцёла Нараджэння НПМ у в. Трабы Валожынскага пав. Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Закатаваны партызанамі ў 1943.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МАСКАЛІК Міхал** [18(31).3.1903, мяст. Гарадзея Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер г. п. Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. — 25.9.1965, Гільдэсгайм, Германія], святар, навуковец. З бел. сялянскай сям'і. Падчас 1-й сусветнай вайны

знаходзіўся ў эвакуацыі ў Сібіры, дзе вучыўся ў рускай школе. Пасля вяртання на радзіму працягваў вучобу ў беларускай гімназіі ў Нясвіжы. У 1927—31 вывучаў матэматыку і фізіку ў Віленскім ун-це імя Стэфана Баторыя, з 1932 электратэхніку ў Вышэйшай тэхнічнай школе ў Берліне. Заснаваў «Саюз беларускіх студэнтаў у Нямеччыне» (1933). У 1938 скончыў ф-т тэалогіі ун-та Людвіга Максіміліяна ў Мюнхене, Германія. Прыняў сакрамэнт святарства (17.7.1938). На кароткі час вярнуўся ў Вільню. З 1939 духоўна апекаваў бел. і ўкраінскіх ваеннапалонных польскай арміі ў Мюнхене. У ліп. 1943 зняволены ў лагеры Заксенгаўзен. Вызвалены ў крас. 1944 намаганнямі папскай місіі. З 1945 жыў у Госляры (*Goslar*), Германія. Працягваў пастырскую дзейнасць сярод беларусаў і ўкраінцаў, выкладаў у бел. гімназіі. У 1947—52 кіраўнік Беларускага камітэта перасяленцаў. У 1959 абараніў дысертацыю на ступень доктара славянскай філалогіі «Янка Купала — пясняр беларускага народа» (у 1961 выйшла на нямецкай мове як манаграфія).

7.11.1945 у Нясвіжы Мінскай вобл. арыштаваны дырэктар Нясвіжскага хлебакамбіната **Маскалік Уладзімір Канстанцінавіч** (н. у 1914 у мяст. Гарадзея, атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю), брат або сваяк Міхаіла Маскаліка. 14.1.1946 асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 7 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы яго лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.6.1993 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Асабовая справа М. № 35182-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Janka Kupala. Der Sänger des weissruthenischen Volkstum. München. 1961.

Кр.: *Sakalouski Uladzimir*. Weissruthland und Deutschland: Geistes— und Kulturbeziehungen zwischen 1914 und 1941. Band 1: Bibliographie. Käln; Weimar; Wein, 2000; Ajciec Maskalik doktaram filalohii // *Бацькаўшчына* (Мюнхен). 1959. 6 верас.; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**МАСЮЛЯНІС Адам** [1911—1942], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Прызначаны катэхетам і вікарыем парафіі Перамянення Пана ў в. Германавічы Дзісенскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч касцёла св. Ганны ў в. Мосар Глыбоцкага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны і закатаваны фашыстамі ў лагеры ў мяст. Беразвечча, цяпер вёска Беразвецкі Абруб Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**МАТУЛЁНІС Тэафіл Юр'евіч** [22.6.1873, засценак Кударышкі ці Кудавіскіс (?) Ковенскай губ., цяпер Літва — 20.8.1962], арцыбіскуп. З сялянскай сям'і. Скончыў школу ў Дзвінску (цяпер Даўгаўпілс, Латвія), Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (4.3.1900). Прызначаны вікарыем касцёла НПМ і св. Міхала Арханёла ў в. Варкляны Рэжыцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія. З 1901 пробашч касцёла ў маёнтку Быкава (паштовы адрас; ст. Рэжыца, цяпер Рэзекне, Латвія) Рэжыцка-над-Лубанскага дэканата Віцебскай губ. 30.6.1910 за хрышчэнне дзіцяці ад змешанага каталіцка-праваслаўнага шлюбу пазбаўлены душпастырскага права на 6 месяцаў і накіраваны ў кляштар пры касцёле св. Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу. З 1912 рэктар капліцы ў пас. Аляксандраўскім за Неўскай заставай. З 1914 пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса (Санкт-Пецярбург), які толькі пачаў будавацца. Арыштаваны ў сак. 1923. Праходзіў па групавой справе каталіцкага духавенства на чале з Я. *Цеплякам*. Асуджаны 21—26.3.1923 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Зняволены ў Сакольніцкай і Лефортаўскай турмах Масквы. Вызвалены ў студз. 1926. Вярнуўся ў сваю парафію. Абслугоўваў таксама парафію св.

Баніфацыя ў Ленінградзе і касцёл св. Апосталаў Пятра і Паўла ў г. Колпіна каля Ленінграда. 8.12.1928 прызначаны тытулярным біскупам дыяцэзіі на Таманскім паўвостраве. 24.11.1929 арыштаваны ў Ленінградзе. Абвінавачваўся ў «нелегальнай, праз літоўскага амбасадара, сувязі з асобамі, якія жылі за мяжой СССР» і «кіраўніцтве падпольнай нацыянал-шавіністкай латышскай школай». Прыгавораны 13.9.1930 да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 22.7.1932 арыштаваны ў лагеры. 27.5.1933 асуджаны да года ізалятара. Вызвалены 26.9.1933. Выехаў праз абмен зняволенымі ў Літву (19.10.1933). Займаў розныя пасады ў Каўнаскай дыяцэзіі. Са студз. 1943 кіраваў Кашадарскай дыяцэзіяй. Біскуп спадзяваўся, што акупацыйныя ўлады не стануць перашкаджаць місіянерскай дзейнасці каталіцкага духавенства. Ён накіраваў генеральнаму камісару Вільгельму Кубэ ліст, у якім прасіў дазволіць святарам «вярнуцца ў свае папярэднія месцы духоўнай дзейнасці, вызваленыя ад ярма бязбожнікаў». У адказе ад 9.5.1942 паведамлялася: «Па заслугах ацэньваючы падставы для Вашага хадайніцтва, я пакуль не ў стане дазволіць вам і вашым святарам вяртанне да месца папярэдняй духоўнай дзейнасці». У чарговы раз арыштаваны пасля прыходу савецкіх уладаў 18.12.1946. Асуджаны 27.9.1947 да 7 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ Навасібірскай вобл. (у 1947 каля 40 000 зняволеных), потым пераведзены ва Уладзімірскую вобл. Вызвалены 28.5.1954. Адпраўлены ў дом інвалідаў. 5.5.1956 вярнуўся ў Літву. Звяртаўся да ўладаў з просьбай дазволіць яму кіраваць дыяцэзіяй, але дазволу не атрымаў. Жыў у Шэдуве. Патаемна выконваў біскупскія абавязкі. Папа **Ян XXIII** менаваў яго тытулам арцыбіскупа.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**МАТУСЕВІЧ Чэслаў** [13.5.1913—4.5.1961], святар. Вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі. Адначасова студэнт тэалагічнага ф-та ун-та імя Стэфана Баторыя, атрымаў магістэрскую ступень па тэалогіі за працу «Манаграфія касцёла і парафіі Пшэрасль». Прыняў сакрамэнт святарства (18.6.1939). З 11.8.1939 в. а. пробашча, прэфект парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Празарокі, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Паралельна абслугоўваў касцёл св. Вацлава ў в. Драздоўшчына Надвілейскага дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. (прыязджаў два разы на месяц). Пераследаваўся савецкімі ўладамі, але не пакінуў месца службы. У пачатку вайны абвінавачаны ў абстрэле савецкіх войскаў. Выратаваў хуткі прыход немцаў. Працаваў на тэрыторыі парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Загацце, цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл., у філіяльным касцёле св. Лаўрэнція ў мяст. Ушачы, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., у парафіі Маці Божай Ружанцовай у Полацку, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Заскоркі, цяпер Полацкі р-н. Пасля вайны выехаў у Польшчу. У 1947 вікарый парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Карыцін (*Korycin*), Польшча. З 1948 у Вармінскай дыяцэзіі, дзе ў 1949—53 служыў пробашчам і дэканам у Браневе (*Braniewa*), пасля ў Прабутах (*Prabuty*). У 1959—61 пробашч у Свентайне Алецкім (*Świętajń Olecki*). З 1961 на пенсіі.

Кр.: *Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**МАТУШЭЎСКАЯ Леакадзія (Геліядора)** [1906, мяст. Старая Гута, Польшча — 1.8.1943], назарэтанка, благаслаўлёная. У 1933 уступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. Склала першыя законныя шлюбы (1935). Жыла як юніёрка ў законным доме Хрыста Валадара ў Навагрудку. Арыштавана гестапа 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі ў ваколіцах Навагрудка.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**МАТЫШЧЫК Станіслаў Паўлавіч** [8.11.1909, в. (ст.) Гай Аранскага пав., цяпер Літва (?) (паводле іншых звестак, в. Каменна Нова, цяпер Беластоцкае ваяв., Польшча) — 28.6.1941], святар. З сям'і польскага чыгуначніка, якому даводзілася часта пераязджаць у розныя мясціны Расійскай імперыі. У г. Востраў у 1917 пачаў школьную адукацыю, якую перапыніла вайна і рэвалюцыя. Вярнуўшыся з Расіі ў Польшчу ў 1920, працягваў навучанне ва ўсеагульнай школе ў Дамброве (*Dąbrów*), Польшча. Сям'я пражывала ў Каменнай Новай. Пасля заканчэння гімназіі ў Кобрыне (1930) прайшоў вайсковую службу і паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (11.6.1938). Прызначаны вікарыем, потым пробашчам касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Відзы Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., актыўны ўдзельнік каталіцкага маладзёжнага руху. Арыштаваны 14.9.1940 у Відзах па адрасе: вул. Кірава, д. 7. Пад следствам знаходзіўся ў Вілейскай турме НКВД. Асуджаны 2(або 12).5.1941 асобай нарадай НКВД за «антысавецкую агітацыю» і як «сацыяльна небяспечны элемент» да 8 гадоў ППЛ. Накіраваны ў Паўночна-Усходні лагер НКВД Далёкаўсходняга і Хабараўскага краю. Загінуў падчас эвакуацыі зняволеных з Мінска ў Чэрвень. Рэабілітаваны 12.12.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа М. № 17587-п з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**МАЦВЕЙЧЫК Антоні** [3.11.1889—10.9.1941, в. Моўчадзь, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). Кандыдат кананічнага права. Каплан магілёўскай архідыяцэзіі. У каталогах Віленскай архідыяцэзіі ў 1922—31 капелан Рыжскай дыяцэзіі, пасля зноў Магілёўскай. З 1922 адміністратар парафіі Перамянення Пана ў в. Спас, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1930 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ і св. Роха ў в. Аборак Вішнеўскага дэканата, цяпер у складзе в. Палачаны Маладзечанскага р-на Мінскай вобл., і капліцы ў мяст. Гарадзілава, цяпер Маладзечанскі р-н. У 1937 перайшоў у парафію Хрыста Валадара ў в. Скрыбаўцы, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 адміністратар касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Моўчадзь. З 1939 вымушаны хавацца ад НКВД.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**МАЦКЕВІЧ Антоні** [1892—14.11.1942, в. Калдычэва, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). Прызначаны вікарыем, потым пробашчам касцёла св. біскупа Мікалая ў мяст. Мір Стаўпецкага пав. Сталавіцкага дэканата, цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. У 1920 адміністратар філіяльнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў в. Замошша, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. У 1933—39 служыў у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Сталовічы, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл., дэкан сталавіцкі, сінадальны кансультант Пінскай дыяцэзіі, прэфект школ. Арыштаваны гестапа 27.6.1942. Атручаны газам у лагеры Калдычэва.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis viln-ensis; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na*

*Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МАЦКЕВІЧ Яўгенія-Канізія (Марыя-Казіміра)** [27.11.1903, мяст. Сувалкі (*Suwałki*), цяпер Польшча — 1943], назарэтанка, благаслаўлёная. У 1933 у Варшаве ўступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. У 1936 у Альбана, Італія, склала першыя законныя шлюбы і прыняла імя Марыя-Казіміра. Працавала катэхеткай у Калішскай школе, Польшча. З 1938 жыла як юніёрка ў законным доме Хрыста Валадара ў Наваградку. Арыштавана гестапа 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі ў ваколіцах горада.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МАЦЫЕЎСКІ Баляслаў** [1897—1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1924). Прызначаны катэхетам віленскіх школ. З 1935 пробашч касцёлаў Беззаганнага Зачацця НПМ і св. Антонія Падуанскага ў мяст. Паставы Надвілейскага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны і закатаваны фашыстамі ў лагеры ў мяст. Беразвечча, цяпер у межах райцэнтра Глыбокае Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**МАЦЫЕЎСКІ Палікарп** [1891 — ?], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Петраградзе (?). Прыняў сакрамэнт святарства (1916). Прызначаны вікарыем фарнага касцёла св. Казіміра ў Магілёве. Арыштаваны ў 1929. Асуджаны калегіяй АДПУ да 5 гадоў ППУ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Паводле звестак польскага ўрада, уцёк з лагера. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**МАЦЫЕЎСКІ Юзаф Станіслававіч** [2.1. 1909, в. Мацыевічы Гродзенскага пав., цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. — 1984], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Гродзенскую гімназію (1929), Віленскую духоўную семінарыю (1937). Прызначаны вікарыем парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Гервяты, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. У 1938 пераведзены вікарыем у касцёл Наведзінаў НПМ у в. Алькенікі Троцкага дэканата, цяпер Літва. З 1940 пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Юзафа ў в. Занявічы Гродзенскага р-на. Арыштаваны 20.8.1947. Асуджаны 19.5.1948 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР. Вызвалены датэрмінова 10.1.1956. Вярнуўся на былое месца службы. Рэабілітаваны 28.1.1994 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда. Асабовая справа М. № п-19992 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 123; *БНДЦЭД; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МАЦЫЕЎСКІ Ян Янавіч** [24.10.1897, в. Лаванішчы (?) Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 13.9.1929, Мінск, турма АДПУ], святар. З літоўскай каталіцкай сям'і. У 1914 паступіў у Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу, з 1917 у Мінскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1920). З 1922 адміністратар касцёла Узвышэння Святога Крыжа ў Ігумену Мінскай губ., цяпер райцэнтр Чэрвень Мінскай вобл., пробашч парафіі езуітаў св. Яна Караля ў в. Блонь Ігуменскага пав., цяпер

Пухавіцкі р-н Мінскай вобл., мінскі дэкан. Арыштаваны 14.5.1929 у в. Зарэчча, цяпер Блоньскага сельсавета. Асуджаны з шэрагам парафіянаў 23.8.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і «шпіянаж» да ВМП. Расстраляны з тэхнічным супрацоўнікам касцёла Г. *Дашкевічам*. Рэабілітаваны 9.9.1991 пракуратурай БВА. Групавая справа М. і іншых (па ёй праходзіла больш за 40 чалавек, прыгавораных ад 3 да 10 гадоў зняволення) № 31800-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МАЦЬКОВЯК Уладзіслаў** [1910, в. Сыткі (?) Кобрынскага пав. Гродзенскай губ. — 4.4.1942], святар, благаслаўлёны. Скончыў агульнаадукацыйную школу і гімназію ў Драгічыне, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. У 1933 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю, адначасова вучыўся на тэалагічным аддзяленні Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства з рук арцыбіскупа Р. *Ялбжыкоўскага* (1939). Прызначаны вікарыем, потым пробашчам касцёла Божага Цела ў в. Іказнь Мёрскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 3.12.1941. Зняволены ў турме ў Браславе. Расстраляны немцамі ў лесе Барок каля в. Беразвечча са святарамі С. *Пыртакам* і М. *Багаткевічам.* Месца пахавання застаецца невядомым. Беатыфікаваны Папам Янам Паўлам II 13.6.1999 у групе 108 Мучанікаў.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**МАЧУК Антоні** [1866 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1888). Да 1902 пробашч касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Рэжыца, цяпер Рэзекне, Латвія. Потым служыў у парафіі св. Юзафа Абранніка ў Оршы, райцэнтр Віцебскай вобл. З 1913 адміністратар касцёла НПМ у мяст. Бобр Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны. Этапаваны ў ГУЛАГ у 1931 (?). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**МЕЛЯШЧУК Данута** [? — 19.7.1942], актыўная парафіянка, жонка С. *Мелешчука*, арганіста парафіяльнага касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Св. Крыжа ў мяст. Косава Пінскай дыяцэзіі, цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. Удзельнічала ў стварэнні Саюза каталіцкай моладзі ў сваёй парафіі. Арыштавана гестапа ў ліп. 1942, калі была на апошніх тыднях цяжарнасці. Зняволена ў турме з мужам і першым дзіцем. Расстраляна з мужам і групай заложнікаў.

Кр.: *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**МЕЛЯШЧУК Станіслаў** [? — 19.7.1942], арганіст. Скончыў музычную школу. Працаваў у парафіяльным касцёле Найсвяцейшай Тройцы і Св. Крыжа ў мяст. Косава, цяпер горад Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. Удзельнічаў у стварэнні Саюза каталіцкай моладзі ў сваёй парафіі. Арыштаваны гестапа 29.6.1942. Зняволены ў турме з дзіцем і цяжарнай жонкай. Расстраляны з групай заложнікаў.

Кр.: *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**МЕНЦЁР Тамаш** [1897—1942], святар. У 1936—39 в. а. пробашча філіяльнага касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Навасады, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны ў 1942. Расстраляны фашыстамі на праваслаўных могілках у Баранавічах Брэсцкай вобл.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**МІЛЕВІЧ Леапольд** [1884—1942, мяст. Івянец, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл.], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). У 1909 вікарый касцёла Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў в. Ракаў, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 1913 і не менш чым да 1939 служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Волма Мінскага (з 1921 Валожынскага) пав. Івянецкага дэканата, цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны гестапа. Моцна збіты, неўзабаве памёр.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МІЛКОЎСКІ Сігізмунд** [1889—1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1911). У 1915 вікарый парафіі св. біскупа Мікалая ў мяст. Свір аднайменнага дэканата, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. З 1918 адміністратар касцёла Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў в. Шэметава, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. З 1926 душпастыр парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Шаркаўшчына Мёрскага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1934 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Судэрва Кальварыйскага дэканата, цяпер Літва. З 1937 служыў у парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Гожа Гродзенскага дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. Паводле некаторых звестак, таксама служыў у касцёле Звеставання НПМ у мяст. Вішнева

аднайменнага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны фашыстамі за дапамогу яўрэям. Закатаваны ў турме ў Валожыне Мінскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**МІЛКОЎСКІ Станіслаў Карлавіч** [2.9.1881, засценак Мілковіцы-Стаўкі (каля Драгічына), Польшча — 15.5.1961, в. Дзераўная, Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл.], святар. Скончыў гродзенскую школу, Віленскую духоўную семінарыю (1902), Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Атрымаў ступень магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (18.3.1906). Накіраваны на вучобу ў Фрыбург, Швейцарыя. У студз. 1908 вымушаны вярнуцца з-за недахопу сродкаў. Працаваў у Вільні вікарыем касцёла Усіх Святых (1908—11), прафесарам (1914—26), пракурорам (1925—26) Віленскай духоўнай семінарыі, рэктарам парафіі св. Міхала (1915—22). З 1926 вікарый катэдральнага касцёла св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста. У 1932—34 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Кальварыя Віленскага дэканата, Літва. З 1909 за ўласныя сродкі выдаваў час. «Słowo i Czyn» для таемнага Філарэцкага саюза ў Вільні, кіраваў Каталіцкім таварыствам польскай народнай школы. Прымаў удзел у іншых выхаваўчых свецкіх інстытутах. З 1936 пробашч касцёла св. Барталамея ў Вільні. З мая 1940 пробашч парафіі св. Казіміра ў в. Новая Вілейка, Літва. Дапамагаў яўрэям. У сак. 1942 арыштаваны немцамі і да канца месяца зняволены ў Лукішскай турме ў Вільні. Супрацоўнічаў з АК. У 1946—49 зноў пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Кальварыі. Пазбаўлены рэгістрацыі (да 1951). Жыў у Тракаі і Новай Вілейцы. Дзякуючы намаганням парафіянаў касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная атрымаў дазвол на службу (17.11.1951). На працягу наступных гадоў двойчы пазбаўляўся рэгістрацыі, 10.11.1960 назаўсёды. Ганаровы канонік Віленскай катэдры.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МІЛОСЕК Апалінарый** [16.2.1906 — ?], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Паводле некаторых звестак, служыў у Гродне. На 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны як капелан 28.4.1939. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МІРЖВІНСКІ Уладзіслаў Аляксандравіч** [1880, мяст. Зязголіна (?) Віленскай губ. — 1937 (?)], святар. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1907?). Прызначаны вікарыем парафіі Святога Духа ў мяст. Ула, цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. У 1910 пераведзены ў Томскі касцёл Маці Божай Ружанцовай. Таксама служыў як капелан пры касцёле ў Аляксандраўску, цяпер аляксандраўск-Сахалінскі, Расія. У 1921 прэфект ніжэйшай духоўнай семінарыі ва Уладзівастоку. Пасля яе закрыцця некалькі разоў арыштоўваўся АДПУ. Пасля апошняга арышту 13.1.1932 у Хабараўску асуджаны 4.2.1932 за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. З 1934 знаходзіўся ў с. Тыльск Зах. Сібіры. З сак. 1935 жыў у мяст. Канск (?). Верагодна, у 1937 зноў арыштаваны. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.7.1989 пракуратурай Хабараўскага краю.

Кр.: *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Жертвы политического террора в СССР.*

**МІХАЛІК Францішак Янавіч** [1893 — ?], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. На 1.1.1939 капітан, капелан 80-га пяхотнага палка у Слоніме, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Мабілізаваны як капелан

28.4.1939. У верас. 1939 удзельнічаў у абароне прыгарада Варшавы — Прагі Паўночнай. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МІХАЛКЕВІЧ Казімір-Мікалай Юстынавіч** [1.2.1865, маёнтак Хапенішкі Вілкамірскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 16.2.1940, Вільнюс], святар, магістр тэалогіі (1899). З сям'і ўдзельніка паўстання 1863 года. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (23.10.1888). Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску, потым у парафіі ў в. Варкаў (тагачасны паштовы адрас: ст. Прэлі) Дзінабургскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія. З 1891 пробашч касцёла Божага Прадбачання, св. Лаўрэна і св. Стэфана ў в. Біржаголь таго ж дэканата. З 1896 пробашч, катэхет, вайсковы капелан у парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Кранштаце, цяпер Ленінградская вобл., Расія. З 1902 пробашч і дэкан касцёла Найсвяцейшай Тройцы (св. Роха) у Мінску. Аднавіў польскую мову ў набажэнствах, валодаў таксама літоўскай і латышскай мовамі. Пасля выдалення царскімі ўладамі біскупа Э. *Ропа* (1908) Апостальскі Адміністратар Віленскай дыяцэзіі. Арыштаваны 19/20.6.1918 немцамі, якія занялі Вільню. Перавезены ў Марыя-Лаах (*Maria-Laach*), Германія. Вызвалены ў ліст. 1918. Неўзабаве вярнуўся ў Мінск. Арыштаваны 18.8.1920. Зняволены ў Лубянскай турме Масквы. Дзякуючы хадайніцтву літоўскага ўрада ў снеж. 1920 адпраўлены ў Вільню. З 12.1.1923 тытулярны біскуп і віленскі суфраган. З 1926 генеральны вікарый віленскай архідыяцэзіі.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**МІШКОЎСКІ Стэфан Станіслававіч** [1903, в. Новае Места Варшаўскага ваяв., Польшча — ?], законнік. З сям'і рабочага. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Да арышту законнік Ломжынскага кляштара Беластоцкага ваяв., Польшча. Арыштаваны 10.6.1940. Асуджаны 1.2.1941 асобай нарадай НКВД за «ўдзел у антысавецкай арганізацыі» да 8 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 6.6.1989 пракуратурай Гродзенскай вобл. Групавая справа М. і інш. (усяго не менш за 20 чалавек) № п-9588 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Таксама гл. арт.: *Камерас* Фелікс Францавіч.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Жертвы политического террора в СССР.*

**МОНЧКА Уладзіслаў Ігнатавіч** [1897, в. Зімнадул (*Zimnadół*) Олькушскага пав., цяпер Польшча — 24.2.1982], святар. Скончыў пачатковую школу (1911), Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1929). Прызначаны вікарыем касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Параф'янава Глыбоцкага дэканата, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл., потым служыў у парафіі Нараджэння НПМ у мяст. Браслаў Новааляксандраўскага пав. Ковенскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Дамброва, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1931 пробашч парафіі св. Барбары ў в. Сялявічы Слонімскага пав. і дэканата, цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 пробашч касцёла Хрыста Валадара ў в. Скрыбаўцы Лідскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1945 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Нецеч таго ж дэканата, цяпер Лідскі р-н. Арыштаваны МДБ 1.2.1950. Асуджаны 28.4.1950 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. У 1954 зняволены ў лагеры МДБ у Камсамольску-на-Амуры. Вызвалены ў 1954. Са студз. 1958 пробашч парафіі св. Ганны ў в. Лунна, цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. Рэабілітаваны 23.6.1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МОСКВА-«МАКАР» (ДАМБРОЎСКІ) Юры** [10.11.1910, Цюрых, Швейцарыя — 7.7.1941, Букавіна], законнік. Грузінскага паходжання. 3.10.1930 уступіў у ордэн езуітаў у кляштары ў пас. Альбярцін Слонімскага пав., цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл. Скончыў філасофскі ф-т Кракаўскага ун-та са ступенню магістра (1935), багаслоўскі ф-т Грыгарыянскага ун-та ў Рыме. Прыняў сакрамэнт святарства (26.6.1938). Прафесар і рэктар духоўнай семінарыі ў Дубне. У снеж. 1939 нелегальна прыбыў у Львоўскі кляштар, дзе зарэгістраваўся па фальшывым дакуменце пад «Макар» работнікам нафтавай базы. 15.8(ці 9).1940 арыштаваны венгерскімі памежнікамі пры нелегальным пераходзе мяжы. Зняволены ў турме ў Будапешце. Праз турэмнага капелана перадаў інфармацыю пра сябе венгерскім езуітам і праз 2 месяцы вызвалены. Выехаў у Рым, дзе напісаў рапарт аб становішчы католікаў у СССР, пасля чаго яму было загадана вярнуцца на савецкую тэрыторыю, каб працягнуць душпастырскую дзейнасць. Арыштаваны 29.1.1941 савецкімі памежнымі службамі за нелегальны пераход мяжы, этапаваны ў турму ў Львове, пасля ў Кіеў. Некалькі месяцаў падчас следства ад святара спрабавалі дамагчыся прызнання, што ён завербаваны венгерскімі службамі. М. упарта прытрымліваўся фальшывага прозвішча, мяркуючы, што падчас абвяшчэння прысуду назаве сваё сапраўднае імя і духоўны сан. Не ведаў, што ад зняволеных раней езуітаў **В. Чыжыка** і В. *Новікава* НКВД выцягнула ўсю інфармацыю пра яго. 7.7.1941 асуджаны да ВМП як «вораг народу». Расстраляны ва ўнутранай турме Кіеўскага НКВД.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**МРАЧКОЎСКІ Люцыян** [1909—10.4.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны катэхетам парафіі св. Юрыя ў мяст. Янаў (*Janów*), Польшча. З 1936 вікарый касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Лідзе аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Арыштаваны фашыстамі з В. *Лабанам* 29.6.1942. Зняволены ў Лідскай турме. Расстраляны з 9 іншымі святарамі ў ваколіцы Ліды (гл. арт.: *Ажароўскі* Ю.).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Krahel T.* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998. № 3 (98); *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**МУРОНЬЧЫК Эдвард** [1897—21.10.1942], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1927). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Забалаць Лідскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл., потым у парафіі св. Вацлава ў в. Драздоўшчына, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1932 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Дубрава Вілейскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. Загінуў пры нявысветленых абставінах. Пахаваны каля касцёла ў Дубраве.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**МУСТЭЙКІС Казімір** [1874 — пасля 1940], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1899). У 1901—02 вікарый парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Ландскрона Люцынскага дэканата Віцебскай губ., цяпер Латвія. У 1904 служыў у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Казані, Расія, адначасова катэхет Ноўгарадскага рэальнага вучылішча. У 1906 вікарый парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Табольску, Расія. З 1907 про-

башч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Спаскім Томскага дэканата. З 1909 у пермскай парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ, катэхет рэальнага вучылішча. З 1917 і не менш чым да 1928 адміністратар касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Антушы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл., пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Рагачове, капліцы св. Казіміра ў Жлобіне, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. На падставе сведчання камсамольскага актывіста абвінавачаны ў згвалтаванні маладой кабеты і схіленні яе да аборту. Нягледзячы на пратэсты вернікаў, асуджаны да 4 гадоў зняволення і выплату аліментаў, аб чым паведамлялася ў газетах. Вызвалены датэрмінова. У канцы 1929 — пачатку 1930 адміністратар парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Паўторна арыштаваны, зняволены і на пачатку 1930-х г. прыгавораны да 3 гадоў ППЛ. Праз год вызвалены дзякуючы брату — міністру ва ўрадзе Літвы, і ў 1933 прыехаў у Літву. Напярэдадні выезду вымушаны напісаць заяву аб тым, што не вернецца ў СССР. Служыў капеланам у калоніі для непаўналетніх злачынцаў у Шаўляі. У 1933—39 рэктар публічнай капліцы ў в. Юрдацяй парафіі Скайсгірыс Ковенскай дыяцэзіі.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; З асабістага архіва У. Васькова.*

**МЮКЕРМАН Фрыдрых** [17.8.1883, Бюкенбург (*Bückenburg*) — 2.4.1946, Фларымон (*Florimont*), Швейцарыя], немецкі езуіт, тэолаг, публіцыст, пісьменнік. Прыняў манаства ў 1899. Прыняў сакрамэнт святарства (1914). З 1914 капелан нямецкай арміі, служыў у Чэнстахове (Польшча), Баранавічах, Слоніме.

Вывучаў рэлігійнае жыццё, культуру, польскую мову, творчасць **А. Міцкевіча.** У 1916 дапамог перадаць касцёл св. Казіміра ў Вільні католікам. Застаўся ў Вільні пасля сыходу нямецкай арміі і захопу горада бальшавікамі. Пачаў душпастырскую працу ў касцёле св. Казіміра. Заснаваў Хрысціянскую рабочую лігу (20 000 чалавек). Арыштаваны РККА у лют. 1919 ў Вільні, этапаваны ў Мінск, пад напорам польскага наступлення этапаваны ў турму ў Бабруйску, пасля ў Смаленск, адкуль быў вызвалены у выніку абмену палоннымі паміж Польшчай і Расіяй. 22.11.1919 з арцыбіскупам Э. *Ропам* пераехаў у Варшаву, потым у Германію. Пасля 1932 развіў актыўную антыгітлераўскую дзейнасць. Абвешчаны «ворагам Рэйха № 1». У 1933 вымушаны ўцякаць у Галандыю (пазбаўлены нямецкага грамадзянства), далей у Францыю, дзе хаваўся да 1942. Перасследаваўся гестапа ў розных частках Зах. Еўропы. У апошнія гады нелегальна знаходзіўся ў Швейцарыі. Памёр у бальніцы Фларымон Мантро (*Florimont Montreaux*).

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**МЯНОЎСКІ Ян Пятровіч** [2.7.1904, Беластоцкае ваяв., Польшча — 24.4.1992], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (21.4.1929). Прызначаны вікарыем парафіі св. Міхаіла Арханёла ў мяст. Ашмяны аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 24.6.1931 вікарый фарнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Беластоку, праз год у парафіі Божага Провіду ў в. Кужніца (*Kuźnica*), Польшча. З 1933 у касцёле Маці Божай Вастрабрамскай у в. Язна, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 24.4.1936 пробашч парафіі НПМ Каралевы Польшчы ў в. Вялікая Рагозніца Ваўкавыскага дэканата, цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. 28.4.1939

прызначаны капеланам рэзерву польскага войска ў званні капітана. Мабілізаваны ў жн. 1939 як капелан пяхотнага палка, але па дарозе з Брэста ў Львоў застаўся пад нямецкай акупацыяй. З мая 1947 пасля арышту А. *Банькоўскага* меў пад апекаю парафію Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў в. Крамяніца Ваўкавыскага дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл., касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Зэльва, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл., парафію Унебаўзяцця НПМ у в. Дзярэчын Слонімскага дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны НКВД 20.8.1947. Асуджаны 10.10.1947 да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны праз Оршу, Смаленск, Маскву, Котлас у Інцінскі лагер МДБ Комі АССР. У 1950 пераведзены ў Краснаярскі лагер МДБ. Вызвалены 25.12.1954. Вярнуўся ў Вялікую Рагозніцу. Акрамя служэння ў сваёй парафіі выязджаў у Крамяніцу, Струбніцы, Пескі, Масты і інш. Не атрымаўшы дазволу на душпастырскую дзейнасць у Беларусі, М. спрабаваў уладкавацца на Украіне, але беспаспяхова. У 1958 выехаў у Польшчу.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**НАВАСАДКА Юзаф Вінцэнтавіч** [20.5.1882, в. Тартак (*Rutka-Tartak?*) Сувалкаўскага пав. і губ., цяпер Польшча — 21.1.1965], святар. Скончыў гімназію ў Сувалках (*Suwałki*, 1900), духоўную семінарыю ў Сейнах (*Sejny*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (12.11.1905). Прызначаны вікарыем парафіі Мясткова (*Miastkowa*), Польшча. З 1906 у Люботыні (*Lubotyń*), з 1908 у Высокім Мазавецкім (*Wysokie Mazowieckie*), з 1910 у Дамброве Велькай (*Dąbrowa Wielka*), з 1911 у Ломжы (*Łomża*), з 1914 у в. Саколы (*Sokoły*). З 1922 пробашч касцёла ў Паджылінах (*Podżyliny*) каля Сувалак. З 1933 у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Адамавічы Гродзенскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер Гродзенскі р-н. З 1939 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у мяст. Тэолін (*Teolin)* аднайменнага дэканата Ломжынскай дыяцэзіі. Арыштаваны 18.10.1949. Асуджаны 26.12.1949 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Вызвалены ў 1954. У 1957 выехаў у Польшчу. Рэабілітаваны 21.9.1998.

Кр.: Ordo divini officii ad usum dioecesis Lomzensis pro anno domini 1936. Lomzensis, *1936; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**НАВАЧЫК Войцэх Барталамеевіч** [20.4.1910, Лэнка Велька (*Łęka Wielka*), цяпер Познаньскае ваяв., Польшча — 3.2.1984], святар. З сялянскай сям'і. Бацька загінуў падчас 1-й сусветнай вайны. Скончыў пачатковую школу, малую семінарыю місіянераў-законнікаў (аблатаў) у Люблінцы (*Lubliniec*), Польшча (1932). Уступіў у ордэн законнікаў НПМ (1932). 8.9.1933 склаў першыя законныя шлюбы ў Маркавіцах (*Markowice*), Польшча. З 1933 вучыўся ў духоўнай семінарыі ў Обры (*Obrza*) Познаньскай архідыяцэзіі. Прыняў сакрамэнт святарства (12.6.1938). Прызначаны пробашчам філіяльнага (парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Ельня) касцёла св. Яўхіма і Ганны ў в. Вашкевічы Лідскага пав. і дэканата, цяпер

у складзе в. Агароднікі Лідскага р-на Гродзенскай вобл. Арыштаваны 20.5.1950. Асуджаны Гродзенскім абл. судом 14.8.1950 за «правядзенне антысавецкай агітацыі» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ва Ухта-Вымскі лагер МДБ Комі АССР (каля 20 000 зняволеных). Выжыў дзякуючы дапамозе вернікаў. Вызвалены 27.5.1956 пастановай Вярхоўнага Савета СССР са зняццем судзімасці. 17.7.1956 зарэгістраваны пробашчам фарнага касцёла Перамянення Пана ў Навагрудку Гродзенскай вобл. Таксама абслугоўваў парафію Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзятлава, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Рэабілітаваны 3.6.1998.

Кр.: *НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 66; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**НАВІЦКІ Альберт Ф.** [1914—1962, Літва], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). З 1945 пробашч касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Відзы, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. 18.7.1949 нам. упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР па БССР Луганскі накіраваў зварот да ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР па Гродзенскай вобл. П. Чыжу з просьбай разабрацца з сітуацыяй у касцёле ў Відзах. Прэтэнзіі выклікаў звон а 9-й раніцы і а 9-й увечары: *«Звон в эти часы связан с неприятной для сторонников панской Польши памятью о давно минувших днях одного похода польской шляхты в Москву, когда ставший историческим русский патриот Иван Сусанин завел в непроходимый лес польский отряд, откуда последний не мог выбраться и целиком погиб. Костельный звон в указанные часы, по словам граждан, является якобы памя-*

*тью об этом погибшем на русской земле отряде польских завоевателей и как бы призывным сигналом, обращенным к заведенным в лесную чащу польским захватчикам, на который они могут выбраться из леса. Уполномоченному Совета по делам религиозных культов по Полоцкой обл. тов. Кечко необходимо тщательно и осторожно на месте проверить эти сведения. Т. к. если колокольный звон в эти часы действительно является обозначением описанного сигнала к погибшему польскому отряду, то по своему существу это есть прямое антисоветское действие со стороны служителей католической церкви, поддерживающее среди верующих память о панско-дворянской Польше и разжигающее национальную вражду к русской нации…».* Неўзабаве святара арыштавалі. Этапаваны ў адзін з лагераў ГУЛАГу. Вызвалены ў 1956. Служыў у Літве.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**НАВІЦКІ Данат Гіляравіч** [20.10.1893, Масква — 17.8.1971], святар. З мяшчанскай сям'і. Вучыўся ў Петразаводскім і Петраградскім ун-тах, Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Петраградзе. Пакінуў семінарыю і перайшоў да баптыстаў. Ажаніўся з А. *Бужал*[1]. З 1916 на ваеннай службе ў царскай, по-

[1] **Бужал (Навіцкая) Анатолья Янаўна** [1891, цяпер тэрыторыя Беларусі — 15.4.1975], законніца, жонка *Д. Навіцкага*. З бел. мяшчанскай сям'і. Атрымала вышэйшую адукацыю ў Санкт-Пецярбургу. У 1922 у Маскве ўступіла ў Абрыкосаўскую абшчыну рускіх католікаў усходняга абраду. Арыштавана ў 1924 па справе «контррэвалюцыйнай арганізацыі Хрысціянскага студэнцкага саюза». Вызвалена праз 6 тыдняў. У 1926 уступіла ў Трэці ордэн св. Дамініка пад імём Іасафата. Актыўна дапамагала асуджаным святарам і вернікам, наведала мужа ў Салавецкім лагеры АДПУ, пра які потым падрабязна расказала біскупу *Пію Неве.* Зноў арыштавана 15.2.1931 у Ленінградзе па групавой справе рускіх католікаў. Асуджана 18.8.1931 за «шпіянаж» і «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППЛ. Этапавана ў Яраслаўскі палітычны ізалятар, потым пе-

тым Чырвонай Арміі. Пасля сканчэння грамадзянскай вайны жыў у Маскве, Петраградзе. У 1922 уступіў у Абрыкосаўскую каталіцкую абшчыну. Арыштаваны 16.11.1923 па групавой справе «рускіх католікаў». Асуджаны 19.5.1924 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і «шпіянаж на карысць Польшчы» да 10 гадоў пазбаўлення волі. 17 месяцаў зняволены ў Арлоўскім паліт. ізалятары. 21.9.1925 этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., куды прыбыў 21.11.1925. Тайна прыняў 5.9.1928 з рук біскупа Б. *Слоскана* сакрамэнт святарства (усходняга абраду). 11.7.1929 пераведзены на востраў Анзер. Зноў арыштаваны 5.7.1932 па «справе **Салаўёва** і інш». Пераведзены 22.7.1932 як адзін з «кіраўнікоў антысавецкай групоўкі з 32 каталіцкіх святароў» у Ленінградскую турму АДПУ, пазней у Яраслаўскі паліт. ізалятар. Вызвалены 15.9.1932 у выніку абмену палітвязнямі з Польшчай. Прызначаны пробашчам грэка-каталіцкай парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Тараканы Кобрынскага пав. і дэканата, цяпер в. Субаты Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. У 1939 выехаў у Зялёнку (*Zielonka*) каля Варшавы, дзе служыў капеланам жаночага кляштара. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, удзельнічаў у антыфашысцкім супраціве. З 1948 жыў у Свідзежы (*Świdzerz*), з 1958 у Новай Весі (*Nowa Wieś),* у Ізабеліне (*Izabelin*). Быў актыўным удзельнікам экуменічнага руху. З канца 1940-х выкладаў рускую культуру ў духоўнай семінарыі палацінаў у Алтажаве (*Ołtarzew*) каля Варшавы. Быў рэферэнтам-экспертам па пытаннях усх. храмаў, СССР, экуменізму пры прымасе Польшчы кардынале **С. Вышыньскім.**

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy*

---

раведзена ў Котласкі лагер АДПУ Комі АССР. З 1932 у Бутырскай турме Масквы. 15.9.1932 выехала праз абмен вязнямі ў Польшчу. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

*duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**НАВІЦКІ Юзаф Пятровіч [**1857, в. Загацце Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], арганіст. З сялянскай сям'і. Да арышту служыў у касцёле езуітаў у роднай вёсцы. Арыштаваны АДПУ 10.11.1929. Асуджаны за «сувязь з польскімі разведорганамі» да 3 гадоў зняволення. Далейшы лёс невядомы.

З Н. па адной справе (№ 23098-п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) праходзілі, прыгавораны за тое ж «злачынства», рэабілітаваны (12.8.1993 пракуратурай БВА) яго дачка **Навіцкая Алена Іосіфаўна** (н. у 1885), парафіяне Загаццеўскага касцёла: селянін-аднаасобнік **Андрэйчык Дзмітрый Сідаравіч** (1900), яго жонка **Андрэйчык Ганна Піліпаўна** (1903) і брат, селянін-аднаасобнік **Андрэйчык Сцяпан Сідаравіч** (1909), селянін-аднаасобнік **Валадзько Фелікс Францавіч** (1884), яго жонка, хатняя гаспадыня **Валадзько Стэпаніда Пятроўна** (1889), хатняя гаспадыня **Кацман Элька Герцагаўна** (1859), яе сын ці ўнук, селянін-аднаасобнік **Кацман Абрам Залманавіч** (1906), селянін-аднаасобнік **Сцяпанаў Васіль Аляксеевіч** (1890), яго жонка **Сцяпанава Яніна Іосіфаўна** (1902), смалакур **Дысман Ізраіль Беркавіч** (1883), яго жонка, хатняя гаспадыня **Дысман Неха Лейбаўна** (1889), селянін-аднаасобнік **Загорскі Вікенці Іосіфавіч** (1876), яго жонка **Загорская Марыя Эдуардаўна** (1892), селянін-аднаасобнік **Зубрэвіч Станіслаў Францавіч** (1887), яго жонка **Зубрэвіч Марыя** (1891) і сын **Зубрэвіч Уладзіслаў Станіслававіч** (1911), селянін-аднаасобнік **Кляпец Рыгор Данілавіч** (1892), яго жонка **Кляпец Марыя Несцераўна** (1889) і сястра **Кляпец Надзея Данілаўна** (1904), селянін-аднаасобнік **Мінкевіч Уладзімір Казіміравіч** (1881), яго жонка **Мінкевіч Уладзіслава Клаўдзіеўна** (1893) і сваячка **Мінкевіч Эмілія Гаўрылаўна** (1869), стрэлачнік чыгуначнай станцыі Фарынава **Ражноўскі Антон Іосіфавіч** (1886), яго

сваячка **Ражноўская Браніслава Антонаўна** (1874), ляснік Ветрынскага лясніцтва **Шабан Ануфрый Ісакавіч** (1880), селянін-аднаасобнік **Грабоўскі Іосіф Ігнатавіч** (1863), яго жонка, хатняя гаспадыня **Грабоўская Лізавета Феліксаўна** (1864) і дачка **Грабоўская Марыя Іосіфаўна** (1898), сталяр арцелі «Наперад» **Дэйлідовіч Нікадзім Мітрафанавіч** (1875), яго жонка **Дэйлідовіч Анастасія Іванаўна** (1881) і дачка **Дэйлідовіч Лізавета Нікадзімаўна** (1898), селянін-аднаасобнік **Семенас Павел Фаміч** (1878), яго жонка, хатняя гаспадыня **Семенас Марыя Іванаўна** (1876) і дачка **Семенас Цеся Паўлаўна** (1909). Далейшы іх лёс невядомы.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**НАІШЭЎСКАЯ Багуміла (Марыя-Ева)** [1885, хут. Асянішкі Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. — 19.12.1942], законніца, старэйшая з 11 дзяцей Марыі Андрушкевіч і ўрача-акуліста Казіміра Наішэўскага. Скончыла рускую гімназію ў Туле (1903). Атрымала вышэйшую медыцынскую адукацыю ў Санкт-Пецярбургу (1915). Падчас 1-й сусветнай вайны працавала ўрачом у расійскіх ваенных шпіталях. З 1918 школьны ўрач у Варшаве. Уступіла ў Супольнасць Сясцёр Маці Божай Беззаганнай (1919). Склала першыя законныя шлюбы ў Язлоўцы (*Jazłowcy*) і прыняла імя Марыя-Ева (1919). Працавала ўрачом, выхавацельніцай у гімназіі. З 1939 жыла ў Слоніме, выкладала ў школе сясцёр Маці Божай Беззаганнай. Падчас нямецкай акупацыі працавала ўрачом у Слонімскай бальніцы. 18.12.1942 арыштавана гестапа з настаяцельніцай сястрой К. *Валоўскай* за дапамогу яўрэйскаму насельніцтву і партызанам. Расстраляна з сёстрамі ў прадмесці Слоніма. Беатыфікавана Папам Янам Паўлам II 13.6.1999 у групе 108 Мучанікаў.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**НАРМАНТОВІЧ Вераніка (Верамея)** [1916, в. Верцялішкі Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі р-н — 1.8.1943], назарэтанка, благаслаўлёная. У 1936 у Гродне ўступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. У 1939 склала першыя законныя шлюбы, прыняла імя Верамея. Жыла як юніёрка ў законным доме Хрыста Валадара ў Навагрудку. Арыштавана немцамі 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі назарэтанкамі.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*.

**НАРУШЫС Ян Ігнатавіч** [22.3.1863, мяст. Шыкшне (*Szyksznie*) Расіенскага пав. Ковенскай губ. — 24.1.1939, Вільня], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1892). Прызначаны вікарыем парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Солы Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл., потым накіраваны ў касцёл св. Міхала Арханёла ў Ашмянах Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. За ігнараванне ў набажэнствах малітваў за цара ізаляваны на 14 месяцаў у Гродзенскім францішканскім кляштары. З 1894 вікарый парафіі Наведзінаў НПМ у в. Алькенікі Троцкага дэканата, цяпер Літва, потым пробашч парафіі Звеставання НПМ у в. Залессе (Залессе Сакульскае) (*Zalesie Sokólskie*) Дамброўскага дэканата, Польшча. З 1903 у парафіі Божага Провіду ў в. Кужніца (*Kuźnica*), цяпер Польшча. З 1908 у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Іўе, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У 1915 уцёк з тэрыторыі вайсковых дзеянняў у Віцебск. З 1918 вікарый парафіі Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва. У 1919 арыштаваны бальшавікамі пры наступе на Літву. Зняволены ў Лукішскай турме. Вызвалены польскай арміяй. З 1920 пробашч парафіі св. Юзафа і НПМ у в. Корве (*Korwie*) Кальварыйскага дэканата, Польшча. З 27.1.1928 пробашч

парафіі НПМ у мяст. Цэйкіне Свянцянскага дэканата, цяпер Літва. Пасля выхаду на пенсію пераехаў у Вільню.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР;*

**НЕМАНЦЭВІЧ Антоні** [псеўданімы: а. Антоні, Злучэнец; 8 (ці 9).2.1893, Санкт-Пецярбург — 6.1.1943, Мінск], святар, публіцыст, адзін з найбольш дзейсных ідэолагаў унійнага руху 1-й паловы XX ст. З сям'і Яна Неманцэвіча і Вікторыі (з Рудзевых), перасяленцаў з Сакульскага пав. Гродзенскай губ. Скончыў прыватную гімназію пры касцёле св. Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу, Магілёўскую духоўную семінарыю, Петраградскую духоўную акадэмію са ступенню ліцэнцыята тэалогіі (1918). Быў актыўным членам акадэмічнага Беларускага кола, на адным з пасяджэнняў якога чытаў рэферат, прысвечаны Берасцейскай уніі. Прыняў сакрамэнт святарства (27.9.1915). У 1917—18 адміністратар філіяльнага касцёла НПМ у Гатчыне, рэктар капліцы св. Апостала Пятра ў пас. Сіверскі Петраградскай губ., цяпер Ленінградская вобл., Расія, кіраваў камісіяй па пабудове мясцовага касцёла. У 1918—21 пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Колпіне пад Петраградам, рэктар капліцы ў мяст. Макарава, цяпер Красны Бор. У верас. 1918 прызначаны вікарыем парафіі св. Станіслава ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Выкладаў рэлігію дзецям і моладзі ў касцёлах Пецярбурга і ваколіцаў. Прапагандаваў сярод праваслаўнага насельніцтва Пецярбурга ідэю аб'яднання цэркваў. Пераследаваўся бальшавіцкімі ўладамі за рэлігійную дзейнасць. Арыштаваны 25.5.1919. Правёў у зняволенні 6 месяцаў. 31.5.1921 за пратэсты супраць арышту біскупа Я. *Цепляка* зняволены. Некалькі месяцаў правёў у турме «Красты». Пасля вызвалення вікарый парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Маскве. Зноў арыштаваны ў 1923 за выкладанне асноваў рэлігіі моладзі. Вызвалены 1.2.1925 па абмене

палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. Выехаў у Польшчу, потым на вучобу ў Папскі Усходні Інстытут у Рыме. У 1927 абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Бальшавізм і выхаванне. Сучаснае бальшавіцкае заканадаўства ў Расіі, якое датычыць рэлігійнага і маральнага выхавання моладзі ў святле Божага закона натуральнага і аб'яўленага». Працу пісаў пад кіраўніцтвам французскага езуіта, дарадцы і будучага кіраўніка ватыканскай камісіі «Pro Russia» **Мішэля Д'Эрбіньі.** Некаторы час працаваў у бібліятэцы інстытута асістэнтам прэфекта. У 1928—29 выкладаў гісторыю царквы і ўсх. навукі ў Місіянерскім інстытуце ў Любліне, параўнальную тэалогію на тэалагічным ф-це Люблінскага каталіцкага ун-та, паралельна працаваў школьным прэфектам. 13.9.1929 уступіў у навіцыят усх. місіі ордэна езуітаў у пас. Альбярцін Слонімскага пав., цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл. Пасля сканчэння тэрміну навіцыята (1932) застаўся ў Альбярціне, служыў у грэка-каталіцкім касцёле НПМ. Асаблівую ўвагу прысвячаў дзецям і моладзі. З 1932 рэдактар уніяцкага час. «Да злучэньня» (закрыты ўладамі ў 1937). З 1933 ачольваў місіянерскую пляцоўку езуітаў у в. Сынковічы, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл., дзе служыў пробашчам парафіі Перамянення Пана. З 1934 выкладчык тэалогіі і кананічнага права ў Папскай Усх. семінарыі ў Дубне, цяпер Валынская вобл., Украіна. Адначасова выконваў абавязкі рэктара езуіцкага манаскага дому ў Дубне. Выязджаў з пастырскай дапамогай на неауніяцкія парафіі на Валыні. У 1932, 1935, 1937 удзельнічаў як сакратар у Пінскіх святарскіх уніяцкіх канферэнцыях. У 1932 і 1935 чытаў на іх даклады, прысвечаныя аналізу уніяцкай працы. У 1938 выдаваў у Варшаве час. «Злучэньне» як працяг закрытага польскімі ўладамі «Да злучэньня». З 17.9.1939 узначаліў Беларускі Экзархат Украінскай грэка-каталіцкай мітраполіі. Пасля далучэння зах. тэрыторый Украіны і Беларусі да СССР вярнуўся ў Альбярцін. 17.9.1940 прызначаны Мітрапалітам **А. Шаптыцкім** экзархам створанага ў 1939 Бел. грэка-каталіцкага экзархата. Стварыў Раду экзархата. Увёў бел. мову як афіцыйную мову ў дзейнасці экзархата. Спрабаваў арганізаваць жаночы грэка-каталіцкі

кляштар у Альбярціне. Наведваў з пастырскай місіяй лагеры ваеннапалонных у ваколіцах Слоніма. Ва ўмовах акупацыі наладзіў падрыхтоўку катэхетычнай літаратуры. Дамогся афіцыйнага прызнання сваіх паўнамоцтваў ад акупацыйнай улады. У 1940 і 1942 прымаў удзел у II (1941) і III (1942) Саборах усх. каталіцкіх экзархаў у Львове. Арыштаваны немцамі ў канцы ліп. — пачатку жн. 1942. Перавезены ў Мінск. 30.11.1942 захварэў на сыпны тыф. Пераведзены ў шпіталь вязніцы. Памёр ад сардэчна-сасудзістай недастатковасці, спрычыненай хваробай. Пахаваны 9.1.1943 на Нямецкіх могілках у Мінску.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Synodus archidioecesana vilnensis; НАРБ*, ф. 370, в. 1, с. 2, л. 5; *Мартос А*. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Мн., 1990; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; З асабістага архіва Я.У.Усошына.*

**НОВАК Станіслаў-Леанард** [25.10.1904—1942], святар. Скончыў Пінскую (?) духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1933). З 1935 в. а. пробашча касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Дамачава Брэсцкага пав. і дэканата, цяпер Брэсцкі р-н. Паводле адных звестак, расстраляны гітлераўцамі ў 1942, паводле іншых, атручаны газам 14.11.1942 у лагеры Калдычэва каля Баранавічаў.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**НОВІКАЎ (ХАЛЕВА) Віктар Паўлавіч** [4.10.1905, Казань, Расія — 14.5.1979, Белебей, Урал], законнік. З праваслаўнай мяшчанскай сям'і. У 1917 страціў бацькоў, выхоўваўся ва Уладзівастоку ў сям'і польскага інжынера Францішка Халевы і

прыняў яго прозвішча. У 1923 спрабаваў нелегальна перайсці мяжу з Польшчай. Схоплены савецкімі памежнікамі і асуджаны да 5 месяцаў зняволення. У 1924 пасля вызвалення атрымаў польскае грамадзянства і легальна выехаў у Польшчу да сваякоў прыёмнага бацькі. 21.12.1925 прыняў вечныя шлюбы ў езуіцкім ордэне ў Калішы (*Kalisz*). З 1927 у езуіцкім кляштары ў в. Альбярцін, цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл. Скончыў філасофскі ф-т Кракаўскага ун-та, Грыгарыянскі ун-т у Рыме са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Выехаў у Вільню, служыў у грэка-каталіцкай парафіі. Пасля курсаў па ўсходняй тэалогіі ў Рыме (1937—38) прафесар духоўнай езуіцкай семінарыі ў Дубне, цяпер Валынская вобл., Украіна. Пасля далучэння зах. тэрыторый Украіны і Беларусі выехаў з іншымі святарамі ў Львоў да грэка-каталіцкага Мітрапаліта **А. Шаптыцкага**, які благаславіў іх на таемную місію — выезд на Урал. У 1940 пад прозвішчам Несцераў завербаваўся рабочым і выехаў у Чусавы на Урал (208 км ад Пярмі), дзе кіраваў аўтамабільнай калонай і праводзіў таемную душпастырскую дзейнасць. Год працаваў, каб атрымаць савецкі пашпарт і легальна выехаць у Сібір. 23.6.1941 арыштаваны ў Чусавым. Абвінавачаны як «перакінуты на тэрыторыю СССР агент Ватыкана, які праводзіў антысавецкую дзейнасць, стварaў антысавецкія каталіцкія арганізацыі з заданнем звяржэння савецкага ладу, праводзіў у сваім асяродку антысавецкую, паражэнчую агітацыю, займаўся шпіёнствам супраць СССР на патрэбы разведкі Ватыкана». Падчас следства моцна збіты ў Пермскай турме. У 1941 этапаваны ў маскоўскую турму НКВД. 23.9.1942 асуджаны асобай нарадай НКВД за «шпіянаж» і «правядзенне антысавецкай агітацыі» да 15 гадоў ППЛ. У 1943 этапаваны ў Варкуцінскі лагер НКВД Комі АССР, дзе працаваў у вугальных шахтах. Вызвалены 20.1.1954. Высланы ў Башкірыю ў Белебей (169 км на зах. ад Уфы). Працаваў настаўнікам лацінскай мовы ў медыцынскім вучылішчы. Таемны катэхет і пробашч.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**НУРКОЎСКІ Вацлаў Данілавіч** [1891, Беласток, Польшча — 1953], святар. З сям'і польскага шаўца. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (29.5.1919). Прызначаны вікарыем парафіі св. Тэрэзы ў Вільні. З 1924 пробашч касцёлаў Беззаганнага Зачацця НПМ і св. Антонія Падуанскага ў мяст. Паставы аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1935 служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Лідзе аднайменнага дэканата, цяпер Гродзенская вобл. З 1937 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Забалаць, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. У канцы 1943 арыштаваны нямецкай палявой жандармерыяй як падазроны ў сувязях з польскім падполлем. За адсутнасцю доказаў неўзабаве вызвалены, але пакінуты пад наглядам. Немцам было вядома, што святар дапамагаў хавацца праследаваным. 17.1.1944 гестапаўцы ў чарговы раз акружылі касцёл і плябанію, калі там са святаром знаходзіліся некалькі ўдзельнікаў падполля. Усім удалося ўцячы. Н. больш за месяц хаваўся ў розных вёсках, пакуль не прыйшоў у лют. 1944 у польскі паўстанцкі атрад, які дзейнічаў на Воранаўшчыне і Радуншчыне. Тут ён стаў капеланам. З мая па 19.7.1944 у атрадзе «Паля». 19.7.1944 чырвонаармейцы абкружылі і разграмілі абодва атрады. Шмат байцоў АК трапілі ў палон. Схапілі і Н. У хуткім часе святара адпусцілі, і з 30.7.1944 ён працягваў службу ў забалоцкім касцёле. Арыштаваны НКВД 29.12.1944. Пад следствам знаходзіўся ў Гродзенскай турме НКВД № 1. Абвінавачваўся ў дапамозе АК і здрадніцкай дзейнасці на карысць немцаў. Асуджаны ваенным трыбуналам МУС Гродзенскай вобл. 19.4.1946 за «антысавецкую агітацыю» да 15 гадоў ППЛ і 5

гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Паводле некаторых звестак, этапаваны ў Новасібірскі лагер МДБ, потым пераведзены ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР, дзе і загінуў. Рэабілітаваны 8.10.1992 Гродзенскім абл. судом. Асабовая справа К. № п-15356 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Канфесіі на Беларусі; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**НЭЙМАК Вацлаў** [1882—14.11.1942], святар. Скончыў духоўную семінарыю ў Луцку, цяпер Украіна. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). З 1932 пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Новы Свержань Мінскага пав., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. Быў камергерам Яго святасці, ганаровым канонікам Луцкай капітулы і візітатарам школ Пінскай дыяцэзіі. Арыштаваны гестапа. Атручаны газам у в. Калдычэва, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ОЖАЛ Антоні Вікенцевіч** [1862—17.10.1938], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1887). З 1889 вікарый касцёла св. Юзафа Абранніка ў Оршы Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1894 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Бабінавічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. З 1901 пробашч і дэкан касцёла Узвышэння Св. Крыжа і св. Казіміра ў Лепелі Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1906 у касцёле св. Юрыя ў мяст. Валынцы (Валынец) Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н, касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Росіца, цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл., дэкан Дрыса-Себежскага дэканата. Узнагароджаны ордэнам св. Ганны III ступені. Арыштаваны з арцыбіскупам Э. *Ропам* і іншымі святарамі вясной 1919 як закладнік. Перавезены ў Віцебск. Вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. З 1923 жыў у Літве. У 1928 служыў у парафіі ў мяст. Кейданы, Літва. У 1931 пробашч касцёла ў мяст. Стасюнаі Ковенскага дэканата, Літва. У 1938 душпастыр парафіі ў мяст. Дэлтува ў Вілкамірскім дэканаце, Літва.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ОКАЛА-КУЛАК Уладзіслаў Янавіч** [1890, в. Рэчкі Шчарбінскай вол. Віцебскага пав. — ?], селянін-аднаасобнік, актыўны парафіянін касцёла ў роднай вёсцы. Арыштаваны 11.3.1930. Асуджаны калегіяй АДПУ 26.1.1931 за «антысавецкую агітацыю» і «ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Краснаярскі край. Вызвалены, праводзіў у краі місіянерскую працу, хаваў вандроўных місіянераў. Зноў арыштаваны ў 1945. Прыгаво-

раны асобай нарадай НКВД да 10 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**О'РУРК Эдуард-Аляксандр Уладзіслававіч** [26.10.1876, маёнтак Басіны Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер хут. Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 1943, Рым], святар, сын ірландскага графа. Скончыў Рыжскую Аляксандраўскую гімназію, Рыжскі політэхнічны інстытут са ступенню кандыдата камерцыі (1904), багаслоўскі ф-т Інсбрукскага ун-та. Прыняў сакрамэнт святарства (14.10.1907, Коўна, цяпер Каўнас, Літва). Выкладаў нямецкую мову ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. З 1908 капелан касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Колпіна Санкт-Пецярбургскага дэканата. З ліст. 1910 пробашч касцёла св. Станіслава ў Санкт-Пецярбургу. У маі 1917 па стане здароўя выехаў у адпачынак у Мінск, у чэрв. 1917 падаў прашэнне аб звальненні з пасады пробашча. У жн. таго ж года накіраваны ў Мінск для азнаямлення з магчымасцямі арганізацыі і аднаўлення Мінскай дыяцэзіі, у снеж. 1917 прызначаны генеральным вікарыем у Мінску. 18.9.1918 вызвалены ад пасады пробашча. Папам Бенедыктам XV прызначаны рыжскім біскупам. Прыняў біскупскі сан 15.12.1918 у Віленскім катэдральным саборы св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста. З крас. 1920 займаўся місіянерскай працай у прыбалтыйскіх краінах. 21.4.1922 прызначаны генеральным Апостальскім Адміністратарам Гданьскай дыяцэзіі. Арыштаваны. Вызвалены. У 1939 пасля акупацыі нямецкімі войскамі Гданьска пераехаў у Познань. Памёр у Рыме. З 1972 прах О. захоўваецца ў Гданьскім катэдральным саборы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ПАВЕЛЕЦ Ян Юзафавіч** [16.5.1904, мяст. Вамбжэзьна (*Wąbrzeźno*), Польшча — 1941 ці 1942)], салезіянін. У 1932 скончыў 6 клас гімназіі ў Дашэве (*Daszewo*), Польшча. Прыняты ў навіцыят (16.6.1932), які праходзіў у Чэрвеньску (*Czerwieńsk*), Польшча. У 1933—35 вучыўся ў Салезіянскім філасофскім інстытуце ў Маршалках (*Marszałki*), Польшча. Накіраваны на педагагічную практыку ў Яцёнжк (*Jaciążk*), Польшча. Выконваў абавязкі выхаваацеля ў інтэрнаце, выкладчыка нямецкай мовы, аканома. У 1937 склаў вечныя законныя шлюбы ў Саколаве Падляскім (*Sokołów Podlaski*), Польшча. Паступіў на тэалагічныя курсы у Салезіянскі тэалагічны студэнтат у Кракаве (*Kraków*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (20.4.1941). Прызначаны рэктарам капліцы ў мяст. Падсвілле Глыбоцкага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл., пасля ў парафіі св. Антонія Падуанскага ў в. Бабруйшчына таго ж дэканата, цяпер той жа р-н. Арыштаваны ў сак. ці крас. 1942. Паводле іншай інфармацыі, у пачатку нямецка-савецкай вайны служыў у касцёле ў в. Падстаў (каля Смаленска). Забіты пры невядомых абставінах. Паводле трэцяй версіі, з канца ліп. 1941 (ці з пачатку 1942) з Ісідарам (Сідарам) *Марцінякам* праводзіў душпастырскую працу ў ваколіцах Мінска ў парафіях, якія страцілі сваіх святароў, і загінуў у ліп. 1942.

Кр.: *Żurek W. Salezjańscy męczennicy Wschodu.* Lublin, 2003.

**ПАДВІНСКІ Аляксандр Канстанцінавіч** [1895, в. Забелле Себежскага пав. Віцебскай губ., цяпер Пскоўская вобл., Расія — ?], працаваў тэхнікам на фабрыцы «Электрасіла», парафіянін касцёла Звеставання НПМ у Ленінградзе. Арыштаваны 8.5.1931 па справе «С. *Войны* і інш.». Асуджаны калегіяй АДПУ 7.3.1932 да 3 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ПАДЗЯВА Антоні Габрыэлевіч** [13.6.1912, в. Пярхулева Перабродскай вол. Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — 21.3.1955, Скурэц (*Skórzec*), Польшча], марыянін, брат Тамаша *Падзявы* і **Альфонса Падзявы**[1]**.** Скончыў марыянскую школу у мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., здаў экзамен на сталасць (1932). Уступіў у навіцыят у Друі. Склаў першыя (15.8.1933) і вечныя (15.8.1936) законныя шлюбы. Вывучаў філасофію і тэалогію ва ун-це імя Стэфана Баторыя ў Вільні. Прыняў танзуру і ніжэйшае свячэнне (13—15.3.1937). Пасля высялення польскімі ўладамі марыянаў з Друі і Вільні пераехаў у Бяляны (*Bielany*) каля Варшавы. Паступіў у Варшаўскую духоўную семінарыю. Атрымаў дыяканат (6.9.1939), прыняў сакрамэнт святарства (23.6.1940, Варшава). З верас. 1940 выхавацель у Бялянскім калегіуме. З чэрв. 1943 выхавацель навучальнай установы для хлопчыкаў. Падчас Варшаўскага паўстання вывез выхаванцаў у бяспечнае месца. Вярнуўся з імі ў ліп. 1945. 21.10.1945 установу перавялі ў Глухалазы (*Głuchołazy*), Польшча, пасля ліквідавалі. У 1947 вярнуўся ў Варшаву. Працаваў катэхетам ва ўсеагульных школах. Арыштаваны 27.2.1950. Зняволены ў Варшаўскай турме. Абвінавачаны ў неданясенні аб захаванні зброі адным з вучняў П. і ў падтрымцы членаў нелегальнай арганізацыі. Асуджаны 6.3.1951 да 2 гадоў і 6 месяцаў турмы. Знаходзіўся ў турмах Варшавы, Патуліц (*Potulice,* з 15.5.1951), Каранова (*Koronowe,* з 4.8.1951). Захварэў на сухоты. Вызвалены 22.9.1952. Працаваў катэхетам у касцёле г. Грудзёндз (*Grudziądz*), Польшча. У снеж. 1953 пераехаў у Бяляны. З высяленнем адтуль марыянаў у ліп. 1954 перавезены ў Скурэц.

Кр.: *Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

---

[1] **Падзява Альфонс** — святар грэка-каталіцкага абраду, марыянін. У 1933 выехаў з бацькам у Аргенціну.

**ПАДЗЯВА Тамаш Габрыэлевіч** [6.2.1905, в. Пярхулева Перабродскай вол. Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — 2.10.1975, Лондан], марыянін, тэолаг, місіянер, сацыёлаг, педагог, публіцыст. Брат Антонія *Падзявы* і Альфонса *Падзявы*. З бел. сялянскай сям'і. У 1926 уступіў у навіцыят марыянаў у мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. 7.10.1927 склаў першыя законныя шлюбы. У 1929 скончыў гімназію імя Стэфана Баторыя ў Друі. Прадоўжыў вучобу ў Папскім Грыгарыянскім ун-це ў Рыме. 7.10.1930 склаў вечныя законныя шлюбы. У 1931 атрымаў ступень доктара філасофіі. Прыняў сакрамэнт святарства грэка-каталіцкага абраду (23.12.1934). З верас. 1935 займаўся місіянерскай дзейнасцю ў Харбіне, цяпер Кітай, катэхет ліцэя імя св. Мікалая і жаночых школ. Служыў у касцёле св. Станіслава (1935—48). Выкладаў астраномію ў малой семінарыі. Супрацоўнічаў з харбінскім місіянерскім выданнем «Католический вестник». Арыштаваны 22.12.1948 кітайскімі ўладамі. Перавезены ў Чыту, СССР. Абвінавачаны ў арганізацыі тэрарыстычнай групы ў ліцэі, агітацыі супраць СССР, шпіёнстве на карысць Ватыкана. Асуджаны 28.9.1949 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. У ліст. 1949 этапаваны ў Ангарскі лагер (больш за 40 000 зняволеных) МДБ Іркуцкай вобл. (Брацк). Пасля мая 1953 пераведзены ў новаарганізаваны Варонінскі лагер (больш за 12 000 зняволеных) Томскай вобл. З 1954 у Цюрубай-Нурэ Казахскай ССР. За таемную душпастырскую дзейнасць пераведзены з агульнага рэжыму на строгі. Вызвалены 31.8.1955 у Карагандзе. Дэпартаваны да польска-савецкай мяжы. З 27.9.1955 у Польшчы. Займаўся навуковай і педагагічнай дзейнасцю, працаваў катэхетам у Гетшвальдзе (*Gietrzwald*), дзе знаходзіліся выселеныя з Бялянаў (*Bielany*) клерыкі. У 1957, калі дазволілі вярнуцца ў Бяляны, выкладаў там. Праз год душпастыр у Глухалазах (*Głuchołazy*), адтуль пераведзены ў законны дом у Грудзёндзы (*Grudziądz*). У 1965 знаходзіўся ў Ліхені (*Licheń*), Улацлаўку (*Włocławek*), дзе выконваў абавязкі духоўнага айца і спаведніка клерыкаў. Са студз. 1969 — у Рыме, з верас. — у Лондане, жыў у Доме

марыянаў. Выступаў на старонках бел. рэлігійных выданняў (час. «Божым шляхам» і інш.). Супрацоўнічаў з бел. секцыяй Ватыканскага радыё. Пахаваны на могілках у Лондане.

Кр.: *Божым шляхам* (Лондан). 1975. № 3—4; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**ПАНЦАРНЫ Фёдар Сцяпанавіч** [1871, в. Глінскія Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 25.5.1929 у роднай вёсцы. Асуджаны 19.6.1929 з Ф. *Гаранскім*, старастам і шэрагам актыўных парафіянаў за «шпіянаж» да 3 гадоў ссылкі (хутчэй за ўсё, у Сібір). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.4.1993 пракуратурай БВА.

З П. да 8—10 гадоў ППЛ асуджаны яго сыны **Уладзімір** (н. у 1987) і **Мікалай** (н. у 1900) **Панцарныя**, а таксама сяляне-аднаасобнікі: **Бабака Георгій Мікалаевіч** (н. у 1889), яго сястра **Бабака-Гатоўка Любоў Мікалаеўна** (1902), **Бадэрка Уладзімір Фаміч** (1884), **Блюм Вікенці Сільвестравіч** (1900), **Вільчынскі Альбін Іосіфавіч** (1896), яго брат **Вільчынскі Аляксандр Іосіфавіч** (1895), **Грабоўскі Карл Герасімавіч** (1868), **Ермаловіч Іосіф Антонавіч** (1889), **Жванскі Вікенці Вікенцевіч** (1902), **Ізмайловіч Зянон Паўлавіч** (1881), **Кадушка Раман Андрэевіч** (1899), **Карчэўскі Антон Іванавіч** (1872), **Крукоўскі Усцін Вікенцевіч** (1888), **Лавейка Антон Антонавіч** (1876), **Літвінскі Бенедыкт Данатавіч** (1882), **Мацішэўскі Дзмітры Аляксандравіч** (1890), **Мілевіч Станіслаў Аляксандравіч** (1890), **Мішут Емяльян Іванавіч** (1878), **Трыгарлаў Іван Захаравіч** (1865), **Ясевіч Васіль Іванавіч** (1910), **Ясюкевіч Пётр Нікіфаравіч** (1888), яго брат

**Ясюкевіч Савелій Нікіфаравіч** (1893). Далейшы іх лёс невядомы. Групавая справа сям'і П. і інш. № 23102-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПАРТАСЁНАК Мікалай Ільіч** [1885, Барысаўскі пав. Мінскай губ. — ?], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту служыў у катэдральным касцёле Імя НПМ у Мінску. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 9.8.1933 у Мінску па адрасе: вул. Кальварыйская, д. 10. Асуджаны 19.12.1933 тройкай НКВД як «член ПАВ» да 8 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.10.1956 трыбуналам БВА. Групавая справа П. і інш. № 9939-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Таксама гл. арт.: *Гіркант* Апалонія Іванаўна.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПАТОЦКІ Уладзіслаў Балтазаравіч** [10.8.1878, в. Гонояндз (*Goniądz*), Польшча — 25.1.1983, в. Гонояндз], святар. З 1894 вучыўся ў гімназіі ў Саратаве, Расія. Скончыў Самарскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (7.5.1903, Горы, Грузія). Суправаджаў біскупа Э. *Ропа* ў візітарыях па каталіцкіх парафіях Закаўказзя. Служыў у касцёле св. Юзафа ў Нікалаеве, Украіна, у парафіі Унебаўзяцця НПМ у Адэсе (Украіна). З 1912 пробашч і катэхет катэдральнага касцёла Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў Саратаве, Расія. У 1917 пад ціскам уладаў пераведзены ў парафію св. Юзафа ў пас. Юзаўка, цяпер г. Данецк, Украіна. Са жн. 1921 вікарый і прэфект парафіі св. Францішка ў Вільні. Дапамагаў святару **Лявону Пуцяту** ў касцёле св. Ганны. Паралельна вучыўся ў Віленскім ун-це. З 1927 служыў у парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Вілейцы, цяпер райцэнтр Мінскай вобл., выкладаў у гімназіі імя Г. Сянкевіча, усеагульнай школе, быў турэмным капеланам. Дапамагаў пробашчу і дэкану **Адольфу Снежку-**

**Блоцкаму**. Пераследаваўся НКВД. Пры нямецкай уладзе займаўся таемнай адукацыйнай дзейнасцю. Пасля прыходу савецкіх войскаў у 1944 пераехаў у Вільню. Наведваў парафіі паўн.-усх. часткі Віленскай архідыяцэзіі (ваколіцы Паставаў). У першай палове 1945 з-за пераследу савецкіх уладаў выехаў у Польшчу. Выкладаў у гімназіі і ва ўсеагульнай школе ў Гоняндзе (*Goniądz*). З 31.7.1950 на пенсіі. Ганаровы канонік.

Кр.: *Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ПАЎЛІК Люцыян Юльянавіч** [21.12.1913, в. Вулька-Віснёвска (*Wólka Wiśniowska*) Седлецкага ваяв., Польшча — пасля 2001], марыянін. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў усеагульную школу (1922). Паступіў у 4-ы клас ніжэйшай духоўнай семінарыі марыянаў у Скурцы (*Skórzec*), Польшча. 14.8.1929 уступіў у ордэн марыянаў. Склаў першыя законныя шлюбы (15.8.1930). Вучыўся ў гімназіі ордэна, Варшаўскай духоўнай семінарыі. 15.8.1936 склаў вечныя законныя шлюбы. Працаваў катэхетам у калегіуме марыянаў у Варшаве. З 1938 вучыўся на курсах тэалогіі ў Вільні. Пасля прыходу Чырвонай Арміі ў канцы верас. 1939 накіраваны ў групе клірыкаў у Марыямпаль, Літва, потым у Коўна, цяпер Каўнас, Літва. Падчас 2-й сусветнай вайны працягваў вучобу канспіратыўна, хаваўся ад арышту. Прыняў сакрамэнты субдыяканату (2.4.1944), дыяканату (8.4.1944), святарства (16.4.1944). Прызначаны пробашчам парафіі Маці Божай Шкаплернай у в. Ідолта, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл., потым накіраваны ў парафію Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., з умовайаднавіць спалены касцёл, што і было зроблена за наступныя 4 гады. Са жн. 1949 хаваўся ад МДБ у ваколіцах Друі. Арыштаваны 18.10.1950. Зняволены ў Полацку. Асуджаны 30.12.1950 са святаром Ю. *Францкевічам* асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Праз Оршу этапаваны ў Паўднёва-Кузбаскі ці Сібірскі лагер МДБ

Кемераўскай вобл. У выніку даносу аднаго з вязняў пра тое, што П. збіраецца ўцякаць, пераведзены ў Паўночна-Усходні лагер Магаданскай вобл. Вызвалены 17.5.1956 са зняццем судзімасці. Вярнуўся ў Друю. Нягледзячы на намаганні вернікаў, рэгістрацыі не атрымаў. З 14.2.1957 пробашч касцёла НПМ Ласкавай у в. Задарожжа, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. Абслугоўваў таксама шэраг парафій Віцебскай вобл., якія засталіся без святароў: Перамянення Пана ў в. Германавічы, цяпер Шаркаўшчынскі р-н, Унебаўзяцця НПМ у в. Празарокі, цяпер Глыбоцкі р-н, Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Дзісна, цяпер Мёрскі р-н, св. Міхала Арханёла ў в. Лужкі, цяпер Шаркаўшчынскі р-н, св. Апостала Андрэя Баболі ў мяст. Кабыльнікі, цяпер в. Нарач Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Рэабілітаваны 8.5.1992 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа П. № 22974-п з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 7, л. 7; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**ПАЎЛОВІЧ Казімір** [1887—1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. У 1915 вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Браньск (*Brańsk*) Бельскага, потым Браньскага дэканата, Польшча. У 1919 вікарый касцёла св. Біскупа Мікалая ў мяст. Свір, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. З 1920 пробашч парафіі св. Апостала Андрэя Баболі ў мяст. Кабыльнікі, цяпер в. Нарач Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Загінуў падчас 2-й сусветнай вайны пры невядомых абставінах.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ПАЎЛОВІЧ Ян Юзафавіч** [1877—1937, Тэльшэ], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1901). Служыў вікарыем парафіі Божага Цела ў мяст. Нясвіж, цяпер райцэнтр Мінскай вобл., касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў в. Асуны (тагачасны паштовы адрас ст. Дагда) Сар'янаўскай вол. Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія. З 1904 адміністратар касцёла св. Аўгусціна ў в. Капаткевічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. З 1906 у парафіі НПМ у в. Харомцы, цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобл. З 1910 пробашч філіяльнага касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Крычаве, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. У 1912—13 пробашч філіяльнага касцёла Узвышэння Святога Крыжа ў мяст. Халопенічы, цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. Потым адміністратар парафіі св. Юрыя ў Калузе, Расія, адкуль з 1924 абслугоўваў касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ у Арле, парафію дамініканцаў Перамянення Пана ў Цвяры, касцёл Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў Ржэве, філіяльны касцёл НПМ у Туле, малітоўны дом Беззаганнага Зачацця НПМ у Кастраме. Арыштаваны ў 1926 у Туле. Вывезены ў смаленскую турму АДПУ. Асуджаны калегіяй АДПУ да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер НКВД Архангельскай вобл. Праз год дэпартаваны на 3 гады ў в. Дон пад Усць-Куломам (154 км на усх. ад Сыктыўкара — сталіцы Комі АССР). 31.8.1933 этапаваны ў Бутырскую турму Масквы. Вызвалены з 11 святарамі праз абмен вязнямі з Літвой на станцыі Індра-Бігусава, Латвія. Вярнуўся з падарваным здароўем. Пасля лячэння працаваў у парафіі ў мяст. Крэтынг Тэльшынскай дыяцэзіі.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Памятная книжка Витебской губернии; Каталіцкае духавенства Магілёўскай архідыяцэзіі; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ПАЎЛОЎСКІ Уладзіслаў-Зыгмунт** [1879—13.7.1942 (?)], святар. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1904). З 1928 пробашч касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Столін, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1931 рэктар філіяльнага касцёла св. Антонія Падуанскага (?) у в. Пляшэвічы Нясвіжскага пав. і дэканата, цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. З 1935 в. а. пробашча парафіі Маці Божай Анёльскай у в. Лясная Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Расстраляны фашыстамі ў Баранавічах. Пахаваны на праваслаўных могілках.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ПАЧОПКА Баляслаў Антонавіч** [падпісваў творы: а. Баляслаў; крыптанімы: B.P.; B.P-ko; 1884, Віцебская губ. — 26.12.1940], святар, культурна-асветны дзеяч, журналіст, педагог, публіцыст. З польскай шляхецкай сям'і. У 1905 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю, але праз год пакінуў яе. З 1913 загадчык аддзела рэлігіі газ. «Biełarus» (Вільня). У 1914—15 рэдактар-выдавец. З 1916 дырэктар Свіслацкай настаўніцкай семінарыі, выкладаў бел. і лацінскую мовы. Аўтар падручнікаў па граматыцы бел. мовы. У 1920—26 настаўнік пачатковых школ Ваўкавыскага пав. У 1921 перайшоў з лацінскага абраду ва ўсходні. З 1922 вучыўся завочна ў духоўнай семінарыі ў Львове. Прыняў сакрамэнт святарства (1926). З 17.9.1926 в. а. пробашча парафіі св. Яна Евангеліста і св. Параскевы ў в. Бабровічы Косаўска-Палескага пав. Косаўскага дэканата, цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. Пабудаваў у парафіі ў 1932 новы касцёл. Удзельнік грэка-каталіцкіх канферэнцый у Пінску (1932, 1933). Публікаваўся ў перыядычных выданнях: «Гоман», «Biełaruskaja krynica», «Chryścijanskaja Dumka», «Да злучэння». Супрацоўнічаў з газ. віленскіх краёўцаў «Przegląd Wileński». Памёр пасля збіцця невядомымі.

Тв.: Żyćcio papieža Piusa X. Wilnia, 1914; Čaławiek na wyšyni swajoj hodnaści. Wilnia, 1915; Boh z nami: Biełaruski maliteunik. Wilnia, 1915; Światy Jezafat Kuncewič. Wilnia, 1916; Hramatyka biełaruskaj mowy. Wilnia, 1918; Jak wučyć žyć i wieryć św. Chrystowa Pausiudnaja Carkwa. Wilnia, 1931.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *ЭГБ*, т. 5; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*.

**ПАШКЕВІЧ Вітольд Юзафавіч** [1882, ст. Стругі (Стругі-Чырвоныя) Санкт-Пецярбургскай або Віцебскай губ., цяпер Пскоўская (?) вобл. — 30.6—1.7.1941], святар. З бел. сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1906). З 1908 вікарый касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Клецк Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1910 вікарый касцёла св. Веранікі ў в. Селішча, цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. У 1911—18 пробашч парафіі св. Людвіка ў в. Свяцілавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл. З 1922 рэктар капліцы св. Мікалая ў в. Янатруд (тагачасная паштовая ст. Обаль Полацкага пав. Віцебскай губ.), цяпер тэрыторыя, верагодна, Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. (вёска не існуе). У 1922—25 в. а. генеральнага вікарыя Магілёўскай дыяцэзіі. З 1926 адміністратар касцёла Апекі НПМ у в. Рукшаніцы, цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны восенню 1927. Абвінавачаны 31.1.1928 у «арганізацыі дэманстрацый веруючых за вызваленне біскупа Баляслава *Слоскана* і стварэнні контррэвалюцыйных гурткоў». Вызвалены пад падпіску аб нявыездзе. Зноў арыштаваны 28.1.1930 у Магілёве. Асуджаны 30.5.1930 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. 28.7.1930 да гэтага абвінавачання дададзены артыкул 58-6 КК БССР (шпіянаж) і тэрмін павялічаны да 10 гадоў. 31.7.1931 этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 10.8.1933 пераведзены ў маскоўскую турму «Бутыркі». Вызвалены 26.9.1933

праз абмен вязнямі паміж Латвіяй і СССР. Арыштаваны АДПУ 30.6.1940 у касцёле св. Людвіка ў Краславе. Закатаваны чырвонаармейцамі падчас адступлення. Рэабілітаваны 30.8.1989 пракуратурай БВА.

28.1.1930 у Магілёве арыштавана хатняя гаспадыня **Пашкевіч Соф'я Юзафаўна** (н. у 1877, ст. Стругі (Стругі-Чырвоныя), сястра Вітольда Пашкевіча. 28.7.1930 калегіяй АДПУ асуджана за «ўтойванне контррэвалюцыйнай дзейнасці брата» і «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітавана 31.8.1989 пракуратурай БВА.

Групавая справа сям'і П. і інш. № 12229 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; НАРБ, ІКБР; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ПЕЛЯК (ПЯЛЯК) Эма Аляксандраўна** [1888, Гомель — ?], актыўная парафіянка касцёла св. Казіміра ў Ленінградзе. Арыштавана 8.5.1931 па справе «С. *Войны* і інш.». Асуджана калегіяй АДПУ 7.3.1932 да ссылкі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ПЕТРУШКЕВІЧ Міхал** [1878, в. Камень Мінскай губ. — 8.5.1943], арганіст. Працаваў у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Налібакі, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. Забіты партызанамі.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953*.

**ПІВАВАРСКІ Францішак** [4.10.1909, в. Баркова (*Borkowo)*, Польшча — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны 1-м вікарыем парафіяльнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Баранавічах аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., прэфектам школ. 28.4.1939 мабілізаваны як капелан у 83-і пяхотны полк імя Рамуальда Траўгута 30-й польскай дывізіі. Потым капелан польскай дывізіі. Арыштаваны 4.10.1939 немцамі. Вывезены 5.10.1939 у Дэмблін (*Dęblin*), потым у Радам (*Radom*), Польшча. Уцёк са зняволення пры дапамозе святара **Стшэлецкага**. З 1945 падпалкоўнік, капелан АК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**ПІЛЕЦКІ Гедымін Людвігавіч** [1903—7.12.1967], святар. Скончыў Ашмянскую гімназію (1919), Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (29.5.1929). Прызначаны вікарыем і катэхетам касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Відзы Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1934 пробашч парафіі св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Гарадок, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. З 1938 у Архідыяцэзіяльным каталіцкім інстытуце ў Вільні. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Германішкі, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Актыўна ўдзельнічаў у стварэнні Наваградскай акругі АК, маёр, пазней падпалкоўнік АК (псеўд. «Длугаш»), дэкан Наваградскай акругі. Рэгулярна кантактаваў з атрадамі АК, сустракаўся з капеланамі, дапамагаў у правядзенні душпастырскай працы сярод байцоў. Рэдагаваў афіцыйны орган Наваградскай акругі АК «Swit». Выдаваў падпольны час. для капеланаў

і афіцэраў «Sursum corda». Дапамагаў хавацца яўрэям. Адзначаны 14.7.1944 «Срэбным Крыжам Заслугі» і «Медалём Незалежнасці». Затрымліваўся савецкімі партызанамі. З другой паловы 1944 пробашч касцёла Перамянення Пана ў в. Парудаміна (*Porudomino*) Тургельскага дэканата, цяпер Літва. Арыштаваны НКВД 11.2.1945. Асуджаны 13.8.1945 да ППЛ (тэрмін невядомы). Вызвалены ў 1948. Выехаў у Польшчу. Служыў вікарыем касцёла св. Кацярыны ў Кентшыне (*Kętrzyn*), парафіі ў Ольштыне (*Olsztyn*). Арыштаваны службай бяспекі Польшчы. Вывезены і зняволены ў Лодзі (*Łódz*), Ленчыцах (*Lęczycy*), Польшча. Вызвалены. З 1951 пробашч парафіі Неброва Вельке (*Nebrowo Wielkie*), касцёла ў Барташыцах (*Bartoszyce*), Польшча. З 1954 пробашч касцёла св. Мікалая ў Эльблёнгу (*Elbląg*), Польшча.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ПЛАВІНСКІ Ежы Адамавіч** [1925, Торунь (*Toruń*), Польшча — 6.8.1948, Магілёў, турма МДБ], езуіт. З сям'і польскага службоўца. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Да арышту законнік Віленскага кляштара. Арыштаваны 3.3.1945. Абвінавачваўся ў «нелегальным пераходзе дзяржаўнай мяжы» і ў «прыналежнасці да ордэна езуітаў». Асуджаны асобай нарадай пры НКВД да 10 гадоў ППЛ. Забіты ў турме сакамернікам — некім Цішковым. Рэабілітаваны пракуратурай Мінскай вобл. 30.6.1997. Асабовая справа П. № 20565-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**ПЛОНЬСКІ Юзаф** [? — 15.7.1943], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Служыў пробашчам парафіі Перамянення Пана ў в. Рыгалуўка (*Rygałówka*) Тэолінскага дэканата Ломжынскай дыяцэзіі, Польшча. Забіты з 5 святарамі і вялікай групай мясцовай інтэлігенцыі каля в. Навумавічы, цяпер Гродзенскі р-н.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ПОНЧАК Валянцін** [13.10.1888, Лютарыж — ?], святар. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Працаваў у Пшэмысльскай дыяцэзіі (Польшча), потым у Францыі. У 1919 капелан Войска Польскага ў званні палкоўніка. Потым адміністратар парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Яраслаўлі, Расія, пазней служыў у Гродне, гродзенскі дэкан. Мабілізаваны як капелан у верас. 1939. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ПРАМЯНЕЦКІ Мечыслаў Казіміравіч** [8.12.1894, в. Янава (каля Коўна), Літва — ?], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (30.5.1920). Прызначаны вікарыем парафіі Унебаўзяцця НПМ і св. Юрыя ў в. Нача, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. У 1921—23 у філіяльным касцёле Маці Божай Ружанцовай у в. Дзевянішкі, цяпер Літва. Пасля прэфект гімназіі Вялікага князя Вітаўта ў Вільні. З 1924 у парафіі св. Ліна ў в. Пеляса Радуньскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл., касцёле св. Сымона і Юды Тадэвуша ў в. Лаздуны Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Таксама абслугоўваў філіяльны касцёл св. Губерта ў в. Бакшты Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н. У 1928 у парафіі Найсвяцейшай

Тройцы ў в. Забрэжжа, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 1929 у парафіі НПМ у в. Цэйкіне Свянцянскага пав. і дэканата, цяпер Літва. З 1932 вікарый касцёла Звеставання НПМ у Дабжыневе (*Dobrzyniew*) Беластоцкага пав. і дэканата, Польшча. Неўзабаве пераведзены ў фарны касцёл св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 1935 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Лінгмяны Свянцянскага пав. і дэканата, Літва. З 1936 служыў у філіяльным касцёле св. Міхала Арханёла ў в. Араны Троцкага дэканата, Літва. З 1938 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Гервяты Варнянскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. З 1.7.1939 у касцёле Божага Провіду ў в. Кужніца (*Kuźnica*), Польшча. Арыштаваны НКВД у 1940. Этапаваны ў ГУЛАГ, верагодна, у адзін з лагераў Архангельскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ПРЖАМОЦКІ Хрызагон Цярэнцевіч** [1863, Дрыса Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінск, райцэнтр Віцебскай вобл. — 8(або 10).9.1930, Смаленск, турма НКВД], святар. З сялянскай сям'і. Скончыў прагімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (4.5.1886). Прызначаны вікарыем у Мінск. З 24.11.1888 памочнік інспектара Магілёўскай духоўнай семінарыі. 31.8.1889 ад'юнкт-прафесар біблійнай археалогіі ў семінарыі і акадэміі. З 17.9.1890 катэхет гімназіі, рэальнага вучылішча Гурэвіча, Аляксандраўскага кадэцкага корпуса, інспектар і выкладчык Магілёўскай семінарыі. 17.9.1893 узнагароджаны нагрудным крыжам. З верас. 1893 вікарый касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу, катэхет жаночых гімназій. У снеж. 1893 накіраваны ў Ноўгарадскую парафію

св. апосталаў Пятра і Паўла. З кастр. 1896 пробашч і дэкан парафіі НПМ у Чэрыкаве Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Са снеж. 1899 адміністратар касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Быхаве Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. У 1903—05 і 1909—11 душпастыр касцёла св. Барбары ў Віцебску. У 1905—07 пробашч парафіі Божага Цела ў мяст. Нясвіж Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл., слуцкі дэкан. У 1908 адміністратар касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Дзвінску Віцебскай губ., цяпер Даўгаўпілс, Латвія. Некаторы час служыў у парафіі Святой Сям'і ў в. Ліксна, Літва. 12.12.1911 змяніў на пасадзе в. а. пробашча і дэкана катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі А. *Ячэйку*. 10.11.1912 па ўласнай просьбе пераведзены ў касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў в. Росіца Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. З 1915 пробашч і дэкан касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Омску, Расія. Двойчы пакараны царскімі ўладамі выгнаннем і зняволеннем. З чэрв. 1921 дэкан у Смаленску, Расія. Кіраваў будаўніцтвам касцёла ў Мазальцаве пад Смаленскам, клапаціўся пра кангрэгацыю сясцёр Найчысцейшага Сэрца НПМ у в. Васілеўскае пад Смаленскам. У 1922 актыўна пратэставаў супраць канфіскацыі касцёльных каштоўнасцяў. Арыштаваны 23.2.1922. Праз паўгода справу закрылі. У 1923 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Смаленску. Кожны крок П. адсочваўся АДПУ, таму ў 1925 ён пераехаў у Раслаўль, Смаленская вобл., дзе служыў у мясцовым касцёле св. Яна Хрысціцеля. У 1926 рэктар філіяльнага касцёла НПМ у Туле, Расія. Арыштаваны 29.6.1927. Перавезены для далейшага следства ў Смаленскую турму. Абвінавачваўся ў тым, што «сістэматычна праводзіў антысавецкую агітацыю, выступаючы з казаннямі ў касцёле, выражаў сваё незадавальненне з прычыны выхавання дзяцей у камуністычным духу, згоды на хаджэнне іх у савецкую школу, тэатр, забараняў спяваць рэвалюцыйныя песні, лічачы, што хутка бальшавікоў з пасадаў паздымаюць, бо гэтая ўлада часовая». Адным з най-

вайжнейшых пунктаў абвінавачання П. былі яго рэкамендацыі парафіянам, якія хацелі з'ехаць у Польшчу. На гэтай падставе было сфармулявана абвінавачанне ў тым, што П. з'яўляўся «агентам польскай буржуазнай дзяржавы». Віны П. не прызнаў. Парафіяне з Раслаўля шматразова хадайнічалі за яго вызваленне, пісалі петыцыі аб замене зняволення на хатні арышт. Асуджаны 22.4.1930 Смаленскім абл. судом да 5 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Захварэў, ляжаў у турэмным шпіталі. Медыцынская камісія КПЗ два разы вызначала стан здароўя П. як не сумяшчальны са знаходжаннем у турме, таму суддзя прапанаваў замяніць зняволенне на высылку. Памёр у шпіталі. Дзякуючы старанням Марыі *Камароўскай*, законніцы Абрыкосаўскай абшчыны, якой АДПУ перадало акт аб смерці, цела святара пахавана на каталіцкіх могілках пры катэдральным касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Смаленску.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии*; *Памятная книжка Минской губернии*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *З асабістага архіва У.Васькова.*

**ПРЫТУЛА Аляксандр Францавіч (Фаміч)** [12.11.1879, хут. Кашуба Раманаўскай вол. Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 27.8.1937, Мінск, турма НКВД], святар. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1913). Прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Магілёве. З 1923 адміністратар парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Палтаве, выязны душпастыр у філіяльных касцёлах у Сумах і Крэменчугу, Украіна. У 1926 высланы з Украіны. З 1928 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Курску, Расія. Арыштоўваўся ў першай палове 1930-х г.

Вызвалены. З сак. 1937 жыў у Лагойску Мінскай вобл. без права выконваць душпастырскія абавязкі ў мясцовым касцёле св. Казіміра. Арыштаваны 5.6.1937. Асуджаны 25.8.1937 з шэрагам праваслаўных і рыма-каталіцкіх святароў, парафіянамі паводле пастановы калегіі НКВД як «член ПАВ і за шпіянаж на карысць Польшчы» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.4.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа П. № 24573-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; Репрессированная вера*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. Мн., 2007.

**ПУПІН Пётр Пятровіч** [1912, мяст. Бакшты Ашмянскі пав. Віленскай губ., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. — 9.8.1979, Вільня, Літва], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў Друі, гімназію пры супольнасці марыянаў. З 1929 у дзяржаўнай гімназіі імя Рыгора Пірамовіча ў Дзвінску, цяпер Даўгаўпілс, Латвія. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Прызначаны вікарыем парафіі св. Казіміра ў Маладзечне Вілейскага дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч касцёла св. Антонія Падуанскага ў в. Хажова Вішнеўскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. Капелан АК. Арыштаваны 27.5.1947. Асуджаны 30.1.1948 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Праз Оршу этапаваны ў Обскі лагер МВД Цюменскай вобл. Вызвалены ў 13.5.1955. Служыў пробашчам касцёла Апекі св. Юзафа ў в. Рубяжэвічы Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. З-за недахопу духавенства абслугоўваў некалькі парафій. Каля дзесяці разоў улады пазбаўлялі П. рэгістрацыі ад аднаго да некалькіх месяцаў. З 1974 нелегаль-

на выконваў душпастырскія абавязкі ў капліцы св. Ганны ў в. Ракаў Валожынскага р-на Мінскай вобл. Памёр у шпіталі. Пахаваны на могілках у Рубяжэвічах. Рэабілітаваны 12.9.1995 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа П. № 36706-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; БНДЦЭД*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ПУХАЛА Юзаф (Ахілес)** [1911, в. Косіна, Польшча — 19.7.1943], святар. Скончыў агульнаадукацыйную школу (1924), паступіў у Ніжэйшую духоўную семінарыю айцоў францішканцаў канвентуальных у Львове. У Лагерніках Лодзьскага пав. (Польшча) уступіў у ордэн францішканаў канвентуальных і прыняў імя Ахілес (1927). Склаў вечныя законныя шлюбы (1932). Прыняў сакрамэнт святарства (1936). Прызначаны вікарыем у Гродна. Пазней пераведзены ў касцёл Міхала Арханёла ў мяст. Івянец, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З пачатку 1940 пробашч парафіі св. Юрыя ў в. Пяршаі, цяпер Валожынскі р-н. Падчас масавых арыштаў немцамі мірнага насельніцтва далучыўся з вікарыем К. *Стэмпелем* да групы арыштаваных парафіян. Па сведчанні аднаго з відавочцаў, камендант мясцовай жандармерыі за дзень да пачатку карнай аперацыі прапаноўваў святарам схавацца, але францішканцы адказалі, што не могуць пакінуць сваіх вернікаў у такую хвіліну. Расстраляны ў в. Баравікоўшчына таго ж р-на. Цела святара было спалена, а рэшткі касцей пахаваны ля касцёла ў Пяршаях. Беатыфікаваны Папам Янам Паўлам II 13.6.1999.

Кр : *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ПУЧКАР-ХМЯЛЕЎСКІ Адам Янавіч** [1890 або 24.12.1891, мяст. Івянец Мінскага пав., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. — 1 (ці 2).9.1937 (паводле іншых звестак — 1.9.1938), ваколіца Кемі (?) Карэльскай АССР], святар, грамадскі і культурны дзеяч. З польскай шляхецкай сям'і. Вучыўся ў Мінскім рэальным вучылішчы (1903—11), Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу (1911—16), дзе далучыўся да бел. нацыянальнага руху. Прыняў сакрамэнт святарства (1916). Прызначаны вікарыем касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. У 1920 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у Іркуцку, Расія. Арыштаваны ЧК падчас польска-савецкай вайны 1920. Быў у групе закладнікаў, якую па дамоўленасці паміж польскім і савецкім урадамі рыхтавалі да адпраўкі ў Польшчу. Па заданні касцёльных уладаў застаўся ў Мінску, служыў у касцёле св. Сымона і Алены. У 1926 на з'ездзе каталіцкіх святароў былой Мінскай губ. выступіў з прапановай утварэння каталіцкай дыяцэзіі на чале з бел. біскупам, падпарадкаваным непасрэдна Ватыкану, а не польскай іерархіі. З 1929 пробашч касцёла св. Ганны ў мяст. Койданава (з 1932 Дзяржынск Мінскай вобл.), парафіі Нараджэння НПМ у мяст. Заслаўе (з 1938 г. п. Мінскага р-на), касцёла філіяльнага Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і НПМ у в. Воўчкавічы таго ж р-на. З 16.8.1930 пробашч Мінскага катэдральнага касцёла Імя НПМ. Арыштаваны 26.7(ці 3.8.)1933 у Мінску па адрасе: вул. Даўгабродская, д. 28, кв. 2. Зняволены ў Мінскай унутранай турме АДПУ. Асуджаны 24.2.1934 з А. *Гіркант* і іншымі асобай нарадай АДПУ як «член ПАВ» і «за шпіянаж на карысць Польшчы» да 10 гадоў ППЛ. З 1.4.1934 знаходзіўся ў Дзмітраўскім лагеры АДПУ Маскоўскай вобл. 27.6.1934 пераведзены і ў верас. 1934 этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі (былы Салавецкі) лагер НКВД Карэльскай АССР (Кем). Прыгавораны 11.8.1938 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.10.1956 трыбуналам БВА. Групавая справа П. і інш. № 9939-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Таксама гл. арт.: *Гіркант* Апалонія Іванаўна.

Кр.: *БНДЦЭД; Репрессированная вера*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu;Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Канфесіі на Беларусі.*

**ПЧЫЦКІ Браніслаў Мікалаевіч** [1901 хут. Пекаршчына (каля в. Глінскія) Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], арганіст, селянінаднаасобнік. З польска-бел. мяшчанскай сям'і. Арыштаваны 25.5.1929 у в. Глінскія, цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. Асуджаны 20.6.1929 калегіяй АДПУ за «шпіянаж» да 3 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 30.3.1992. Асабовая справа П. № 22128-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

26.7.1929 калегіяй АДПУ асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі сёстры Б. Пчыцкага — **Пчыцкая Яніна Мікалаеўна** (н. у 1913), **Пчыцкая Марыя Мікалаеўна** (н. у 1909), брат **Пчыцкі Уладзіслаў Мікалаевіч** (н. у 1912), сваячка **Пчыцкая Франя Пятроўна** (н. у 1874). Далейшы іх лёс невядомы. Групавая справа сям'і Пчыцкіх № 23067-п (па якой яны рэабілітаваны пракуратурай БВА 13.8.1993) захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ПЫРТАК Станіслаў** [1913, мяст. Быстрая Падгалянская, Польшча — 1942], святар. Скончыў агульнаадукацыйную школу, гімназію, паступіў у Віленскую духоўную семінарыю, адначасова вучыўся на тэалагічным ф-це Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства з рук арцыбіскупа Р. *Ялбжыкоўскага* (1940). Прызначаны вікарыем парафіі св. Ганны ў в. Дукшты Піярскія Троцкага пав., цяпер

Літва. У верас. 1941 пераведзены ў касцёл Божага Цела ў мяст. Іказнь, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны немцамі 4.12.1941. Зняволены ў турме ў мяст. Глыбокае, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Расстраляны ў лесе Барок каля Беразвечча з У. *Мацьковякам* і М. *Багаткевічам.* Беатыфікаваны Папам Янам Паўлам II 13.6.1999 у групе 108 Мучанікаў.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis;Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ПЯНТКОЎСКІ Вацлаў Янавіч** [21.4.1902, мяст. Ясянуўка (*Jasionówka*) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., Польшча — 2.12.1991], святар, арганізатар нелегальнай духоўнай семінарыі. З польскай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Беластоцкай гімназіі, потым працаваў настаўнікам у школе ў в. Мілавіды, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1925 працаваў і прыватна вучыўся ў Варшаве. У 1926 паступіў у Пінскую духоўную семінарыю. У 1928 накіраваны ў Папскі Лятэранскі ун-т у Рым. Прыняў сакрамэнт святарства (27.9.1931, Пінск). Вярнуўся ў Рым для працягу вучобы і ў 1932 атрымаў ступень доктара тэалогіі. Выконваў абавязкі віцэ-рэктара Пінскай семінарыі. З верас. 1934 в. а. пробашча парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Стараельня Навагрудскага дэканата, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. Потым рэктар касцёла Перамянення Пана ў Навагрудку, капелан сясцёр назарэтанак, прэфект Навагрудскай гімназіі. З 1935 прэфект у Брэсце. У 1937 прызначаны арганізоўваць новую парафію. У Брэсце пабудаваў капліцу па вул. Светлай і заклаў фундамент пад пабудову касцёла. Падчас 2-й сусветнай вайны ў Брэсце. 31.12.1946 прызначаны генеральным вікарыем той часткі Пінскай дыяцэзіі, якая засталася ў межах СССР. Служыў у касцёлах Міхала Арханёла ў мяст. Івянец, св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Камень, св. Юрыя ў в. Пяршаі, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл., парафіі Апекі св. Юзафа ў в. Рубяжэвічы, цяпер Стаўбцоўскі р-н

Мінскай вобл. З 26.2.1948 пробашч парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Мядзведзічы, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны 20.1.1950 у Мядзведзічах. Перавезены ў Баранавіцкую турму, 10.4.1950 у Мінск. Абвінавачваўся ў «закліканні сялян не ўступаць у калгас, шпіёнстве на карысць Ватыкана». Віны не прызнаў. Асуджаны 2.10.1950 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Праз Маскву, Свярдлоўск, Петрапаўлаўск этапаваны ў Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР (ст. Навагрудная). У зняволенні тайна праводзіў службы для вернікаў. З 1954 у лагпункце для хворых. Вызвалены як інвалід 23.5.(ці 6.4.)1956. Вярнуўся ў парафію Мядзведзічы. Зарэгістраваны 4.7.1956 як мясцовы пробашч. Таксама абслугоўваў суседнія парафіі: св. Юзафа ў Ляхавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., св. Яна Хрысціцеля ў в. Крывошын, цяпер Ляхавіцкі р-н, св. Юзафа ў мяст. Лунінец, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., філіяльны (парафіі ў Крывошыне) касцёл у в. Ліпск, цяпер Ляхавіцкі р-н, Звеставання НПМ у Ганцавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. У 1970-х П. арганізаваў без дазволу ўладаў у касцёльным доме семінарыю, выкладаў з іншымі святарамі тэалогію, гісторыю Касцёла, кананічнае права, этыку, замежныя мовы і філасофію. Папам Янам Паўлам II 11.1.1988 быў менаваны інфулатам. Абавязкі Генеральнага Вікарыя выконваў да 1989. Рэабілітаваны пракуратурай Брэсцкай вобл. 23.11.1994. Асабовая справа П. № 13359-с захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл. Аўтар успамінаў.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *БНДЦЭД; Толочко М.* Цветы на могилу священника // *Советская Белоруссия*. 1992. 11 лют.; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Глябовіч А*. Касьцёл у няволі // *Спадчына.* 1994. № 1—2; *Канфесіі на Беларусі [канец XVIII — XX ст.].* Мн., 1998; *Гардзіенка А*. Вацлаў Пянткоўскі // *Дэмакратычная апазыцыя*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ПЯТКЕВІЧ Станіслаў** [1889, мяст. Вілейка Віленскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. — 1943, ГУЛАГ], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Прызначаны вікарыем касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Карыцін (*Korycin*), Польшча. З 1916 ваенны капелан. З 1920 пробашч парафіі Маці Божай Балеснай у в. Асмола (*Osmoła*) Драгічынскага дэканата, Польшча. Пачаў будаваць у парафіі новы касцёл. З 1929 пробашч і дэкан парафіі св. Юзафа ў мяст. Лунінец аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1933 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы і рэктар філіяльнага касцёла Усіх Святых у Драгічыне (*Drohiczyn*), Польшча, візітатар рэлігійнай навукі ў агульных школах Драгічынскага дэканата. З 1937 катэхет у Пінску. З 1938 пробашч касцёла ў Пінску, прэфект брэсцкіх школ. Арыштаваны ў маі 1940. Пад следствам знаходзіўся ў мінскай унутранай турме НКВД. Падчас катаванняў на допытах святару зламалі рэбры. Этапаваны ў Кіраў, потым у Казахскую ССР. Загінуў у зняволенні ад голаду і ранаў.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS;* Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пінска. Мн., 2003.

**ПЯТКЕВІЧ Юзаф Станіслававіч** [1888 (паводле інш. звестак 15.9.1892), мяст. Лепель Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — 2.9.1937, ваколіцы Кемі Карэльскай АССР, ГУЛАГ], святар, грамадскі і культурны дзеяч. З бел. каталіцкай мяшчанскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу (1916), дзе далучыўся да бел. нацыянальнага руху. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). Працягваў вучобу ў духоўнай акадэміі да яе закрыцця савецкімі ўладамі. Быў членам акадэмічнага беларускага кола. З 1920 вікарый

парафіяльнага касцёла св. Ганны ў мяст. Койданава, з 1932 райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл. У 1922—23 рэктар філіяльнага касцёла ў в. Бабоўня Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. З другой паловы 1920-х служыў у парафіі ў в. Сімкавічы, цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл., касцёле Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку, касцёле Адшукання Св. Крыжа ў мяст. Узда, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Падчас арышту пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Капыль. Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны 3.6.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і як член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі лагер АДПУ Архангельскай вобл. і Комі АССР. Паводле некаторых звестак, у сак. 1935 цяжка захварэў, знаходзіўся ў лагерным шпіталі. Узяты пад варту ў сак. 1937. Прыгавораны 2.9.1937 тройкай НКВД за «шпіянаж» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 26931-с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БВА, па другой — 30.11.1989 пракуратурай Карэльскай АССР.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Stankievič A*. Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939; *БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Канфесіі на Беларусі*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Інфармацыя з базы даных Ю. А. Дзмітрыева.*

**РАГЕЛІС Эдуард Антонавіч** [1910, Рыга, Латвія — ?], арганіст. З сям'і службоўца. Да арышту працаваў у касцёле св. Язэпа Абранніка ў Оршы Віцебскай вобл. Арыштаваны 20.3.1933. Асуджаны 4.5.1933 паводле пастановы калегіі АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. № 20612-п захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**РАГІНСКІ Пётр Юр'евіч** [15.11.1896, Санкт-Пецярбург — 9.6.1985, Вялікабрытанія], святар. У 1900 сям'я Р. пераехала ў Вільню. Скончыў 2-ю расійскую ўрадавую гімназію. У 1915 за некалькі месяцаў да экзаменаў на атэстат сталасці выключаны са школы за «нелаяльныя адносіны да расійскага ўрада». Пасля ўваходу ў Вільню немцаў скончыў настаўніцкія курсы, арганізаваныя Адукацыйным камітэтам. Са студз. 1916 выкладаў у пачатковай школе ў маёнтку Гінейцішкі, Літва. У пачатку 1917 вярнуўся ў Вільню. Працягнуў адукацыю ў гімназіі Таварыства настаўнікаў і выхавацеляў. Здаў экзамены на атэстат сталасці. Увосень 1917 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. У 1920 перапыніў вучобу, чатыры месяцы ўдзельнічаў у баях у складзе батальёна наднёманскіх стралкоў. З восені працягваў вучобу ў семінарыі. Адначасова студэнт ф-та тэалогіі ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (22.5.1921). Працягваў вучобу на гуманітарным ф-це Віленскага ун-та, адначасова працаваў катэхетам. У 1923—26 вікарый парафіі Св. Духа ў Вільні. У 1928—31 рэктар філіяльнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў в. Жыровічы Слонімскага дэканата, цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл., прэфект дзяржаўнай сельскагаспадарча-лясной школы. Вярнуўся ў Вільню. Працаваў прэфектам школ, капеланам капліцы Хрыста Добрага Пастыра ў в. Велюцяны, цяпер Літва. З 1937 пробашч парафіі Найсвяцейшага імя Марыі ў в. Жэша Кальварыйскага дэканата, цяпер Літва (?).

Пасля пачатку 2-й сусветнай вайны ў Гродне. Арыштаваны НКВД восенню 1939. Асуджаны да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Пячорскі лагер НКВД Архангельскай вобл. Вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян у 1941. Трапіў у армію **У. Андэрса.** Прызначаны капеланам. У 1942 выехаў у Іран. Працаваў з насельніцтвам у лагерах каля Пахлеві і Тэгерана. У 1944 апошнім транспартам польскіх ураджэнцаў выехаў у Афрыку. Працаваў у Танганьіцы, раёне Марагора, потым у Танжэры. Са снеж. 1948 у Вялікабрытаніі. Служыў у Сейфард Кэмп (*Seighford Camp*), Шобдан Кэмп (*Shobdon Camp*). Пасля дэмабілізацыі ў Кіддэрмінстэры (*Kidderminster*), Варчэстэры (*Worcester*), дзе стварыў для польскай моладзі школу айчынных прадметаў. У Кіддэрмінстэры пабудаваў з парафіянамі новы касцёл (асвечаны 17.7.1961). Папа **Павел VI** менаваў Р. папскім капеланам. Пасля аўтамабільнай аварыі меў праблемы са здароўем. Пасля выхаду на пенсію жыў у Бірмінгеме (*Birmingham*), Вялікабрытанія.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**РАГОЎСКІ Станіслаў** [1911—1978], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Паводле некаторых звестак, рэпрэсаваны НКВД пасля верас. 1939. У 1950-я пробашч касцёла Св. Крыжа ў Баранавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Таксама праводзіў разавыя набажэнствы ў касцёлах, дзе не было ксяндзоў. 14.6.1953 Р. прыехаў у касцёл Перамянення Пана ў мяст. Новая Мыш, цяпер Баранавіцкі р-н. Упаўнаважаны Савета па Справах рэлігійных культаў І. Мурашка паведамляў: *«Ксёндз приехал в 11 часов и начал служение, которое с перерывами длилось до 17 часов… Собравшиеся верующие не могли все поместиться в костеле, и большая часть их находилась*

*во дворе… В этот день в костеле было до 2000 человек… Примерно между 15 и 16 часами перед алтарем собралось около 60 матерей с детьми грудного возраста и до 4 лет, которых ксёндз окропил водой…»* У 1957—58 Р. служыў у касцёле св. Людвіка ў Маскве, потым вярнуўся ў Беларусь.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**РАДЗІШЭЎСКІ Казімір Антонавіч** [7.10.1904, в. Азгінавічы, цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. — 22.9.1978], святар. Скончыў Слонімскую гімназію (1927), Віленскую духоўную семінарыю, ун-т імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1933). Прызначаны вікарыем касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Іўе Вішнеўскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1937 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Плюсы Браслаўскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны служыў у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Шаркаўшчына Мёрскага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны МДБ у 1946. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ. У 1947 этапаваны ў Цемнікоўскі (з ліст. 1948 — Дубраўны) лагер МДБ Мардоўскай вобл. (пас. Явас). Вызвалены ў 1954. Вярнуўся ў Беларусь. Не атрымаў дазволу на душпастырскую дзейнасць на радзіме і спрабаваў знайсці працу ва Украіне, але беспаспяхова. З 1956 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Індура Гродзенскага р-на. У першай палове 1961 на тры месяцы пазбаўлены рэгістрацыі за «прыцягненне да прыслужвання непаўнагадовых». У 1973 прамовіў у пропаведзі: «Касцёл — гэта сіла, супраць якой ніхто не выстаіць». У Велікоднай пропаведзі 26.3.1978 казаў: «Нашыя бацькі, дзяды і прадзеды былі каталікамі, і мы павінны жыць іх верай, іх перакананнямі. Ніколі не забывайце, што вы каталікі, ганарыцеся тым. Быць каталіком — найвышэйшае духоўнае дасягненне чалавека».

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**РАДЗІШЭЎСКІ Мечыслаў Станіслававіч** [12.11.1888, Дзвінск, цяпер Даўгаўпілс, Латвія — 19.11.1975], святар. Скончыў Віленскую гімназію (1908), Віленскую духоўную семінарыю (1913). Прыняў сакрамэнт святарства. Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў мяст. Сакулка (*Sokółka*) аднайменнага дэканата, цяпер Польшча. З 1915 адміністратар парафіі св. Ганны ў мяст. Крынкі Гродзенскага пав. Бераставіцкага дэканата, Польшча. З 1921 у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Масты Лунінецкага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1927 пробашч парафіі св. Ганны ў в. Лунна аднайменнага дэканата, цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны МДБ 2.11.1948. Асуджаны 7.2.1949 да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Дубраўны лагер МДБ Мардоўскай АССР (пас. Явас). Вызвалены ў 1955 па амністыі. Вярнуўся на радзіму. Атрымаў рэгістрацыю на службу ў касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Новы Двор, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. Рэабілітаваны ў 1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*.

**РАДЗЬКО (РОДЗЬКА) Вацлаў Юстынавіч** [1.1.1888, Бабруйск Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — 22.5.1940], святар. Скончыў чатыры класы школы ў Санкт-Пецярбургу, Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (2.7.1910). Да 1914 вікарый фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне, пасля год вікарый касцёла

св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста ў Вільні. З 1915 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Рыконтах, цяпер Літва. У 1919 у касцёле Звеставання НПМ у в. Тракелі, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1920 пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. З 1929 душпастыр парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Старыя Васілішкі Лідскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 адміністратар касцёла Нараджэння НПМ у в. Трабы Валожынскага пав. Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. 22.5.1940 увечары святара падманна выклікалі да «хворай». Праз тры дні яго цела знайшлі ў кустах каля Трабаў, па дарозе на Гальшаны. Паводле некаторых звестак, забіты савецкімі агентамі бяспекі. Пахаваны ля касцёла ў Трабах.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**РАДЗЮК Антоні** [? — 1919 ці 1920], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. З 1913 вікарый у Брэсце. З 1915 вікарый касцёла Св. Духа ў Вільні. З 1919 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Свіслач, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Загінуў падчас польска-савецкай вайны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**РАДКЕВІЧ Стэфан-Анатоль** [2.9.1912, в. Міхнавічы Пінскага пав. Гродзенскай губ. — 29.4.1942], кармеліт. Уступіў у ордэн (1932). Атрымаў сакрамэнт святарства (9.7.1939,

Кракаў). У пачатку 2-й сусветнай вайны з бежанцамі дайшоў да Львова, дзе быў арыштаваны і вывезены ў Расію. Вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян. Служыў капеланам польскага вайсковага шпіталя для хворых на тыфус. Неўзабаве заразіўся і памёр у Керміне, Узбекістан.

Кр.: *Praśkiewicz S. Wierni Chrystusowi i Kościołowi.*

**РАЙКО Станіслаў Міхайлавіч** [1873, Стара-Канстанцінаў, цяпер Кіеўская вобл., Украіна — 27.8.1937, Мінск, турма НКВД], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў духоўную семінарыю ў Жытоміры, цяпер Украіна, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1902). З 1918 пробашч касцёла ў Брусілаве Радамышльскага дэканата, цяпер Жытомірская вобл., Украіна. З 1920 катэхет у Сквіры, цяпер Кіеўская вобл. З 1922 адміністратар парафіі Дрыгаўка Ямпольскага дэканата Луцка-Жытомірскай дыяцэзіі, цяпер Украіна. У 1930-я жыў у БССР. Служыў пробашчам касцёла св. Барбары ў Віцебску, касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Смаляны, цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 13.2.1937. Асуджаны 25.8.1937 з шэрагам праваслаўных і рыма-каталіцкіх святароў, старастам і актыўнымі парафіянамі касцёла і прыхаджанамі царквы паводле пастановы калегіі НКВД за «шпіянаж на карысць Польшчы» да ВМП. Расстраляны са святарамі К. *Андрэкусам* і інш. (усяго больш за 70 чалавек). Рэабілітаваны 16.10.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Паводле некаторых звестак, рэпрэсаваны і некаторыя сваякі і родныя святара.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *БНДЦЭД; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь*; *Книга памяти расстрелянных и погибших в*

*тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. Мн., 2007.

**РАМАНОЎСКІ Вацлаў Станіслававіч** [26.11.1889, маёнтак Катыш Тракайскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 1953 (?)], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (16.6.1913). Прызначаны вікарыем касцёла Наведзінаў НПМ у мяст. Новыя Трокі Троцкага пав. Віленскай губ., цяпер Тракай, Літва. З 1922 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Германішкі Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Выступаў з казаннямі на бел. мове. Фінансава падтрымліваў каталіцкія выданні («Biełarus», «Kryniсa», «Chryścijanskaja Dumka»). З 1936 пробашч касцёла Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў в. Парэчча Гродзенскага дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. У пасляваенны час пад пагрозай закрыцця касцёла прыняў савецкае грамадзянства. Арыштаваны МДБ 5.7(ці 6).1951. Асуджаны 17.10.1951 за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Паводле асабовай справы (№ п-18895; захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.) вызвалены 23.4.1952. Паводле іншых звестак, загінуў каля Оршы пры этапаванні вязняў на ўсход. Рэабілітаваны Вярхоўным судом Беларусі 20.11.1992.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*.

**РАМЕЙКА Ян Юзафавіч** [7.5.1901, в. Подкішы (Падкішы?) Трокскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 5.8.1986], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную

семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (23.6.1927). Прызначаны вікарыем парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Гервяты Варнянскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. З 1929 вікарый касцёла Усіх Святых у Вільні. З 1932 катэхет у Гродне, у фарным касцёле імя Францішка Ксаверыя. З 1934 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Дзісне Глыбоцкага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 1938 у парафіі св. Апостала Юды Тадэвуша ў в. Лучай Пастаўскага пав. Надвілейскага дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны в. а. дэкана. Арыштаваны 7.12.1944. Пад следствам знаходзіўся ў мінскай унутранай турме НКВД-МДБ. Асуджаны 1.4.1946 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую дзейнасць» да 8 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Кіраўскі лагер МДБ. У кастр. 1947 пераведзены ў Варкуцінскі лагер МДБ Архангельскай вобл. і Комі АССР. З 22.9.1948 у Брэсцкай турме. Пасля вызвалення выехаў у Польшчу. Вярнуўся да душпастырскай дзейнасці. З 29.9.1949 пробашч парафіі св. Кацярыны ў Кентшыне (*Kętrzyn*) Вармінскай дыяцэзіі. 27.1.1950 прызначаны вікарыем, потым пробашчам касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Ольштыне (*Olsztyn*) той жа дыяцэзіі. З 2.9.1972 на пенсіі. Рэабілітаваны 26.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; БНДЦЭД; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**РАПЕЙ Юлія (Сергія)** [1900, в. Рагожына Аўгустоўскага пав. Ковенскай губ., цяпер Польшча — 1943], назарэтанка, благаслаўлёная. Уступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта (1922), склала першыя законныя шлюбы і прыняла імя Сергія (1926, Чыкага, ЗША). Склала вечныя

законныя шлюбы (1932, Філадэльфія, ЗША). Падчас 2-й сусветнай вайны жыла ў законным доме Хрыста Валадара ў Наваградку Гродзенскай вобл. Арыштавана гестапа 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі ў ваколіцах Наваградка.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**РАЦЭВІЧ-РОЧЫС Антоні Антонавіч** [1872, Літва — пасля 1939], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1897). Прызначаны вікарыем касцёла ў в. Балоўск Залюцынскага дэканата Віцебскай губ., цяпер Літва. Паводле некаторых звестак, з 1901 служыў у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў мяст. Марыенгаўзен таго ж дэканата. У 1908 у касцёле Святой Сям'і ў в. Ліксна Верхнядзвінскага дэканата Віцебскай губ., цяпер Літва. З 1910 адміністратар парафіі ў в. Рыбінішкі Рэжыцка-над-Лубанскага дэканата Віцебскай губ., цяпер Літва. З 1912 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Быхаве Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1914 пробашч касцёла св. Казіміра, з 1915 — св. Кацярыны ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Адначасова абслугоўваў капліцу ў пас. Вырыца. Арыштаваны 30.4.1919 з біскупам Э. *Ропам* як закладнік. Вызвалены праз 10 дзён. 13.4.1920 зноў арыштаваны. Вызвалены праз 2 месяцы. У 1923 выехаў у Літву. З 1926 вікарый, потым пробашч адной з літоўскіх парафій.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**РАЧЭЎСКІ Юзаф Мацвеевіч** [26.10.1903, в. Слабада Віленскага пав. (?) — 31.10.1939, Гродна, турма НКВД], святар (?). З польскай сялянскай сям'і. У пачатку 2-й сусветнай вайны мабілізаваны (верагодна, як капелан) у Польскую

армію. Арыштаваны 28.9.1939. Абвінавачваўся ў тым, што «ў верас. 1939 прыняў удзел у арганізацыі банды для паўстанцка-дыверсійнай работы ў тыле Чырвонай Арміі на тэрыторыі Зах. Беларусі». Асуджаны ваенным трыбуналам 11-й арміі 20.10.1939 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 13.3.1990. Групавая справа Р. і інш. № 30849-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

З Р. па адной справе праходзіў селянін-аднаасобнік **Гушч Пётр Анджэевіч** (н. 25.12.1915), асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Далейшы яго лёс невядомы.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**РОЕК Станіслаў Каласанціюш** [5.11.1908, в. Грэмбоцін (*Grębocin*), Польшча — 6.10.1996, Ліда, райцэнтр Гродзенскай вобл.], святар, піяр. Уступіў у ордэн піяраў 19.3.1925. Адбыў навіцыят у Кракаве (Польшча). 23.5.1930 экстэрнам здаў экзамен на сталасць у 4-й кракаўскай гімназіі. Навучаўся на філасофска-тэалагічных курсах у Інстытуце тэалогіі ксяндзоў місіянераў. Прыняў сакрамэнт святарства (20.4.1935). Прызначаны прэфектам у канвікце піярскай школы. Адначасова вывучаў польскую філалогію ў Ягелонскім ун-це ў Кракаве. У 1937 прызначаны магістрам тэалагічнага студэнтату, працаваў выхавацелем студэнтаў. У жн. 1939 накіраваны ў калегіум піяраў у Лідзе і касцёл Узвышэння Св. Крыжа. Пасля 2-й сусветнай вайны застаўся ў СССР. З 1.8.1944 да сак. 1948 пробашч парафіі Найсвяцейшага Сэрца Езуса і св. Тэрэзы ў мяст. Шчучын Лідскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Выдалены ўладамі ў Ліду. У 1971 на тры месяцы пазбаўлены рэгістрацыі за прысутнасць у касцёле моладзі. Вернікі сабралі каля 10 тысяч подпісаў, якія вазілі савецкаму кіраўніцтву ў Лідзе, Гродне, Мінску і Маскве, для таго, каб Р. вярнулі рэгістрацыю. Праследаваўся КДБ. У 1970-х на жыццё Р. двойчы быў зроблены замах. Па гэтай прычыне парафіяне арганізавалі яго ахову, якая начавала ў плябаніі да 1991. З 1993 дэкан у Лідзе.

Кр.: *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**РОЙША Альбін** [1882—1942, Косава, цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.], святар. Атрымаў вышэйшую духоўную адукацыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1906). З 1907 вікарый парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1909 у філіяльным касцёле Перамянення Пана ў в. Кемешаўцы, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. З 1915 адміністратар парафіі Божага Цела ў в. Крошын Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. У 1920-я ў касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Сталовічы, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1928 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Ружаны, цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. З 1930 у філіяльным касцёле ў в. Шчытна, цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. З 1933 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы і Св. Крыжа ў Косаве аднайменнага дэканата, косаўскі дэкан. Арыштаваны фашыстамі 29.6.1942 з вялікай групай парафіянаў. Закатаваны.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**РОП Эдвард Юльевіч** [2(15).12.1851, маёнтак Лікона Дынабургскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — 25.7.1939], арцыбіскуп, грамадска-паліт. дзеяч, сын барона **Юлюша фон Ропа** і **Ізабэлы Платэр-Зіберг.** Скончыў ліцэй у Фрайбургу (Германія), гімназію ў Рызе, юрыдычны ф-т Санкт-Пецярбургскага ун-та са ступенню магістра права (1875), Ковенскую духоўную семінарыю (1880), вучыўся ў Інсбрукскім, потым у Фрайбургскім ун-це. Прыняў сакрамэнт святарства з рук біскупа **Мечыслава Леанарда Палулона** (20.7.1886).

З 1889 пробашч, пазней дэкан парафіі Лібава, цяпер Ліепая, Латвія, дзе пабудаваў вялікі храм. Таксама займаўся адукацыяй польскай моладзі. З 1896 канонік. 9.6.1902 прызначаны Тыраспальскім біскупам, 9.11.1903 — Віленскім. Увёў вывучэнне літоўскай мовы ў Віленскай духоўнай семінарыі. Заснавальнік газ. «Nowiny Wileńskie», арганізатар і заснавальнік Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (1906), ад якой у 1906 абраны ў I Дзяржаўную Думу. Уваходзіў у «Кола тэрытарыяльнае» (аб'яднанне польскіх дэпутатаў ад Беларусі, Літвы і Украіны). У кастр. 1907 загадам міністра ўнутраных спраў Расіі адхілены ад кіравання дыяцэзіяй за «польскі нацыяналізм». Каля 10 гадоў жыў пад наглядам паліцыі. У ліп. 1917 прызначаны арцыбіскупам Магілёўскай архідыяцэзіі з рэзідэнцыяй у Петраградзе. У 1918—19 перанёс духоўную акадэмію з Петраграда ў Люблін, Польшча. Арыштаваны 19.4.1919 як закладнік з групай святароў Петраграда. Абвінавачваўся ў «садзейнічанні мяцяжу Пілсудскага». 5.5.1919 пераведзены ў турму на Лубянцы, потым у «Бутыркі» (Масква). 29.5.1919 дзесяць тысяч католікаў прыйшлі ў Петраградзе да будынка ЧК і патрабавалі вызвалення арцыбіскупа, але безвынікова. Вызвалены па хадайніцтве Папы Рымскага. Выехаў у Польшчу. Да 1931 фармальна лічыўся арцыбіскупам Магілёўскім. З 1938 жыў у Познані, дзе і памёр. У 1983 перазахаваны ў Беластоку, дзе знаходзілася адміністрацыя Віленскай архідыяцэзіі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; ЭГБ,* т. 6—1; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**РОСЯК Ежы (Юры) Францыскавіч** [24.4.1914, в. Страбля (*Strabla*) Бельскага пав. Гродзенскай губ., Польшча — 26.8.1987], святар. З 1914 з бацькамі ў эвакуацыі ў Яраслаўлі, Расія. Вярнуўся ў 1921. Пасля заканчэння пачатковай школы

паступіў у гімназію імя Т. Касцюшкі ў Бельску-Падляскім (*Bielsk Podlaski*). З 1936 канцылярыст Бельска-Падляскай павятовай управы. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю (1942). Прыняў сакрамэнт святарства (4.4.1943, Луцк, цяпер Валынская вобл., Украіна). З 1.5.1943 у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Брэсце. Арыштаваны МДБ 2.8.1947. Пад следствам знаходзіўся ў Мінскай турме МДБ. Асуджаны 17.5.1948 за «прыналежнасць да АК» да ВМП (заменена на 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці). Этапаваны ў Нарыльскі лагер МДБ Краснаярскага краю. Вызвалены 10.7.1956. Вярнуўся ў Беларусь. 3.11.1956 атрымаў дазвол на службу ў касцёле св. Юрыя ў в. Паланэчка, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1963 служыў у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Сталовічы Баранавіцкага р-на. З 1979 абслугоўваў і касцёл Узвышэння Св. Крыжа ў Баранавічах, райцэнтры Брэсцкай вобл., парафію Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішкалдзь Баранавіцкага р-на, касцёл у Наваградку, райцэнтры Гродзенскай вобл., парафію св. Біскупа Мікалая ў мяст. Мір Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Загінуў у аўтамабільнай катастрофе.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**РОШАК Эдмунд Т.** [1900—15.7.1943], святар. У 1921 уступіў у Таварыства Езуса. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). З 1937 выкладаў у Езуіцкай калегіі імя св. Станіслава ў Пінску. Арыштаваны з іншымі святарамі 21.9.1939 пасля прыходу савецкіх войскаў у Пінск. 24.9.1939 вызвалены. Пераехаў у Вільню. Служыў пробашчам касцёла Перамянення Пана ў в. Ялоўка (*Jałówka*) Бераставіцкага дэканата, Польшча. Ведаў нямецкую мову і дапамагаў парафіянам у стасунках з

акупацыйнымі ўладамі. Гэтым звярнуў на сябе ўвагу гестапа. 13.7.1943 папярэджаны, у наступны дзень арыштаваны з некалькімі інш. асобамі. Зняволены ў Свіслацкай турме. Расстраляны фашыстамі ў складзе групы з 19 чалавек каля пас. Свіслач, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Sludzy Boży*.

**РУДЗІС Ігнат Юр'евіч** [1870(1875?)—1946 (?), ГУЛАГ], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1895). Прызначаны вікарыем парафіі Маці Божай Ружанцовай у Полацку Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1902 катэхет гімназіі ў Рызе, Латвія. У 1904—05 вікарый касцёла св. Юрыя ў в. Паланэчка, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1906 вікарый касцёла св. Антонія Падуанскага, з 1909 св. Барбары ў Віцебску. Арыштаваны 1.5.1920 за «шпіёнства і ўдзел у контррэвалюцыйнай, тэрарыстычнай арганізацыі ПАВ». Высланы ў распараджэнне асобага аддзела Зах. фронту. Асуджаны 27.9.1920 да зняволення да канца вайны з Польшчай. Вызвалены ў 1921. Выехаў у Літву, дзе заставаўся і падчас 2-й сусветнай вайны. Арыштаваны ў 1945. Прыгавораны ў кастр. 1945 да ППЛ (тэрмін невядомы). Этапаваны ў Варкуцінскі лагер МДБ Комі АССР, дзе неўзабаве памёр.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**РУЛІНСКІ Максімілян** [1899, в. Дзяніскавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Ганцавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — 1951], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Служыў адміністратарам касцёла Узвышэння Св.

Крыжа ў в. Галынка Ломжынскай дыяцэзіі, цяпер Гродзенскі р-н. Арыштаваны 20.11.1945. Этапаваны ў лагер. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Паўторна арыштаваны 5.5.1951. Асуджаны МУС БССР «за антысавецкую агітацыю». Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 21.06.1956.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**РУТКОЎСКІ Баляслаў Юльянавіч** [1897 — ліп. 1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1922). З 1933 в. а. пробашча касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Юшкавічы Баранавіцкага пав. Пружанскага дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны немцамі за праслухоўванне радыё ў 1941. Расстраляны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**РУТКОЎСКІ Браніслаў** [9.7.(ці 14.9.)1905—15.7.1943], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства. Служыў у філіяльным (парафіі ў Крывошыне) касцёле ў в. Ліпск Баранавіцкага пав. Ляхавіцкага дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Забіты з 5 святарамі і вялікай групай мірных жыхароў, пераважна мясцовых інтэлігентаў, каля в. Навумавічы, цяпер Гродзенскі р-н.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**РУТКОЎСКІ Міхал Ісідаравіч** [1.9.1862, Беласток Гродзенскай губ., цяпер Польшча — пасля 1945], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Вучыўся ў Магілёўскай

духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу, але з-за кепскага здароўя ў 1884 спыніў вучобу. Прыняў сакрамэнт святарства (15.11.1884). Паводле некаторых звестак, атрымаў ступень доктара багаслоўя. Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва. З 1886 у філіяльным касцёле св. Міхала Арханёла ў в. Бутрыманцы, цяпер Бутрыманіс, Літва. З траўня 1897 капелан Слонімскага кляштара Гродзенскай губ. З 1905 пробашч касцёла Маці Божай Анёльскай у Гродне. З лют. 1907 у Вільні. Потым пераведзены ў Магілёўскую архідыяцэзію. Са жн. 1911 рэктар капліцы Беззаганнага Зачацця НПМ у Санкт-Пецярбургу, Расія. Са жн. 1912 капелан капліцы ў пас. Мальтыйск, цяпер Ленінградская вобл., Расія. З крас. 1913 служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Разані Маскоўскай губ. З верас. 1917 у касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Яраслаўлі. З кастр. 1918 зноў у Разані. Арыштаваны 27.5.1922. Асуджаны 29.5.1922 да году зняволення. Пакаранне адбываў у лагеры Кароўнікі каля Яраслаўля. Вызвалены ў ліст. 1922. У снеж. 1922 прызначаны ў касцёл Маці Божай Чанстахоўскай у Лігаве, цяпер Ленінградская вобл. Выязджаў таксама служыць у Шлісельбург і Яраслаўль. Быў прафесарам, рэктарам падпольнай духоўнай семінарыі. З сак. 1923 пробашч катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Петраградзе. Знаходзіўся пад следствам. Прыгавораны да года ППЛ. Вызвалены 20.5.1924. З 1926 у Польшчы. З 1928 вікарый касцёла св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста ў Вільні. З 1929 займаў розныя пасады ў курыі і Пінскай семінарыі. Падчас 2-й сусветнай вайны ў Вільні. З 1945 рэктар касцёла св. Станіслава ў Беластоку.

Кр.: *Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

**РЫБАЛТОЎСКІ Казімір** [1909—24.7.1943], святар, грамадскі дзеяч. З бел. каталіцкай сям'і. Скончыў Ніжэйшую духоўную семінарыю ў Навагрудку (1923,) Брэсцкую гімназію

(1929), Пінскую духоўную семінарыю. Зацікавіўся уніяцкім рухам, удзельнічаў у II, III, IV уніяцкіх канферэнцыях (1931—33) у Пінску. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). У 1936 прызначаны вікарыем касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Камень Валожынскага пав. Івянецкага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вол. Паводле некаторых звестак, таксама служыў у парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Івянец аднайменнага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. У жн.-верас. 1941 пераехаў у Мінск. З кс. Дз. *Мальцом* наладжваў душпастырскую дзейнасць. Пасля арышту С. *Глякоўскага* і Дз. *Мальца* выехаў з Мінска ў Камень. Загінуў падчас карнай аперацыі «Герман» летам 1943 г. у Налібоцкай пушчы. Расстраляны немцамі за душпастырскую дзейнасць, якую здзяйсняў у адносінах да мясцовага насельніцтва і жаўнераў АК.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**РЫГАРОВІЧ Уладзіслаў Іосіфавіч** [1909, Зіма Іркуцкай губ., цяпер Іркуцкая вобл., Расія — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Служыў у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў в. Воўпа, цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты, гадаваў сына. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны 26.12.1944. Абвінавачваўся як «удзельнік антысавецкай нацыяналістычнай арганізацыі АК». 18—19.4.1945 вызвалены і рэабілітаваны НКВД Гродзенскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Р. № п-106 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**РЫЖКО Станіслаў Уладзіслававіч** [4.12.1910, Брузы (*Brzóze*) каля Мінска Мазавецкага (*Mińsk Mazowiecki*), цяпер

Польшча — 1.12.1984, г. п. Лагішын, Пінскі р-н Брэсцкай вобл.], святар. Са шматдзетнай сялянскай сям'і. Скончыў брэсцкую гімназію імя Р. Траўгута (1928), Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (31.3.1934). Прызначаны вікарыем парафіі св. Міхала Арханёла ў Наваградку аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1938 пробашч касцёла св. Ганны ў в. Гарадзішча Пінскага пав. і дэканата, цяпер Пінскі р-н, рэктар філіяльнага касцёла бенедыктынак у в. Сошна, цяпер таго ж р-на. З крас. 1939 капелан законнага дома уршулянак у в. Моладава, цяпер Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл. Да 1945 таксама служыў у касцёлах: катэдральным Унебаўзяцця НПМ у Пінску, Звеставання НПМ у Ганцавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл., св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Лагішын, цяпер Пінскі р-н, Найсвяцейшай Тройцы ў в. Бездзеж, цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл., Унебаўзяцця НПМ у в. Асавая, цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл., і інш. Пасля застаўся служыць у БССР, нягледзячы на магчымасць выехаць у Польшчу. Арыштаваны 28.4.1949. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 13.8.1949 за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны праз Ковель, Арол, Маскву, Куйбышаў (Самару), Паўладар у Сцяпны лагер МДБ Казахскай ССР. У ліп. 1953 пераведзены ў Камышоўскі лагер МДБ Омскай вобл. Вызвалены ў 1956. Са студз. 1956 пробашч парафіяльнага касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Лагішын.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS;* Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Пінска. Мн., 2003.

**РЫЛА Тэадор Людвікавіч** [7.12.1884—1950, ГУЛАГ], святар. З сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Пераехаў у Санкт-Пецярбург, працаваў памочнікам аптэкара.

Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). З 14.2.1911 вікарый філіяльнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Харкаве, цяпер Украіна. З 1913 у парафіі Сумы, цяпер Украіна, катэхет Сумскай Аляксандраўскай мужчынскай гімназіі, рэальнага вучылішча, 1-й і 2-й жаночых гімназій, кадэцкага корпуса, Лебедзінскай мужчынскай гімназіі. З 1916 вікарый касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Антушы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл., капліцы св. Казіміра ў Жлобіне, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. З 1917 студэнт мітрапалітнай духоўнай акадэміі ў Петраградзе. У 1919—20 пробашч парафіі Нараджэння НПМ у мяст. Заслаўе Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н. З 1920 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Свіслач, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Таксама служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Бабруйску Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1923 пробашч касцёла св. Ганны ў в. Пузічы, цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. У 1924—25 у парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Пласковічы Нясвіжскага дэканата, цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. У 1928 у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Ідолта, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 1930 у касцёле ў Семятычах (*Siemiatycze*), Польшча, парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Асавая, цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. З 1933 у парафіі св. Антонія ў в. Мількавічы Наваградскага дэканата Мінскай дыяцэзіі, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. З 1935 рэзідэнт пры фарным касцёле св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. У сярэдзіне 1942 арыштаваны з іншымі каталіцкімі святарамі. Пад следствам знаходзіўся ў Гродзенскай турме. Праз два месяцы вызвалены. Зноў арыштаваны ў 1943. Вызвалены. Арыштаваны НКВД 19.12.1944 у Гродне. Абвінавачваўся ў «сувязі з гестапа». Асуджаны 18.5.1945 да 15 ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Загінуў у зняволенні.

Гл. таксама арт.: *Вальтась* Аркадзь.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Процька Т*. Касцёл у часе II сусветнай вайны // *Наша вера*. 1995. № 1; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; http://media.catholic,by; http://slovosnami.narod.ru/history.htm; З асабістага архіва У.Васькова.*

**РЫМКЕВІЧ Рамуальд Браніслававіч** [1915, Вільня — ?], арганіст. З сям'і польскага службоўца. Да арышту працаваў у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Граўжышкі Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. Быў жанаты, меў сына. Арыштаваны 13.12.1944. Абвінавачваўся як «сацыяльна небяспечны элемент». 14.2.1946 вызвалены і рэабілітаваны УНКВД Маладзечанскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Р. № п-6600 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**САБАЛЕЎСКАЯ Ганна Рафалаўна** [1885, мяст. Койданава Мінскага пав., цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл. — ?], законніца. У 1910 у Санкт-Пецярбургу ўступіла ў Трэці ордэн св. Францішка. У 1914—24 прыбіральшчыца ў каталіцкім прытулку. Арыштавана АДПУ 14.1.1927 па справе «групы католікаў Ленінграда». Асуджана калегіяй АДПУ 15.6.1927 да высылкі без права пражываць у 12 вызначаных буйных гарадах і памежных зонах. Выслана ў Кастраму. Вызвалена ў ліст. 1930. Са снеж. 1930 у Яраслаўлі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**САБАЧЫНСКІ Мечыслаў-Фелікс Юзафавіч** [19.11.1886 ці 1884, в. Цыганка (?) Чанстахоўскага (*Częstochowa*) пав., Польшча — пасля 1937], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю ва Улацлаўку (*Włocławek*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). З 1913 вучыўся ў Магілёўскай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу. Пасля кастрычніцкага перавароту 1917 прызначаны ў філіяльны касцёл Нараджэння НПМ у в. Люшаў Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Буда-Кашалёўскі р-н Гомельскай вобл. З ліп. 1921 вікарый парафіі св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. З 1922 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку. Паводле некаторых звестак, таксама апекаваў касцёл езуітаў св. Барбары ў в. Замосце, цяпер Слуцкі р-н. Арыштаваны 10.3.1933 у Слуцку. Асуджаны 24.2.1934 з К. *Андрэкусам* і іншымі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Карагандзінскі лагер НКВД Казахскай ССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа С. і інш. № 28053-с (усяго больш за 10 чалавек) захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; З асабістага архіва У. Васькова.*

**САБУТКА Станіслаў** [1909—1944], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Брэсце, прэфектам агульнаадукацыйных школ. Расстраляны нямецкай жандармерыяй.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**САВАНЕЎСКІ Людвік** [1891 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). У 1919—20 катэхет у Гродзенскім фарным касцёле св. Францішка Ксаверыя. У 1926—31 пробашч у касцёле Звеставання НПМ. Перад 2-й сусветнай вайной рэдактар газеты «Nowe Życie». Верагодна, рэпрэсаваны НКВД пасля 1939.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis.*

**САВІЦКІ Адам Мацеевіч (Майсеевіч?)** [1.11.1887, Замошша Ашмянскага (?) пав. Віленскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. — 20.5.1968, Беласток (*Białystok*), Польшча], святар. Скончыў рускую класічную гімназію, Віленскую духоўную семінарыю, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1911, Коўна, цяпер Каўнас, Літва). З 1912 катэхет у Вільні. З 1917 прафесар Віленскай духоўнай семінарыі. З 1926 канцлер курыі арцыбіскупа Р. *Ялбжыкоўскага*, канонік рымакаталіцкай духоўнай кансісторыі, сінадальны экзаменатар. Узнагароджаны «Афіцэрскім Крыжам Заслугі», «Залатым Крыжам Заслугі». З восені 1939 прадстаўнік арцыбіскупа ў польскім падполлі, дэкан АК Віленскай і Беластоцкай акругі

(псеўд. «Стэмпель»). Адыграў немалую роль у арганізацыі падпольнай барацьбы супраць гітлераўцаў. Арыштаваны гестапа ў 1942. Вывезены (з арцыбіскупам Р. *Ялбжыкоўскім*) у Марыямпаль, Літва. Вызвалены ў 1944. Прыбыў 24.11.1944 у Мінск па даручэнні Р. *Ялбжыкоўскага* і перадаў упаўнаважанаму Савета па рэлігійных культах БССР П. Маславу наступныя прапановы: «1) Дазволіць Мітрапаліту Віленскай епархіі Р. Ялбжыкоўскаму бесперашкодна кіраваць Касцёлам у Беларусі, накіроўваць ксяндзоў на вольныя парафіі; 2) Забараніць прызыў ксяндзоў і іншых свяшчэннаслужыцеляў на службу ў Чырвоную Армію; 3) Не дапускаць выступаў з амбона з пытаннямі, якія датычаць гаспадарча-палітычных кампаній; 4) Спыніць хаджэнне католікаў у нядзельныя дні і падчас богаслужэнняў на розныя заняткі — лекцыі, сходы, суботнікі і г. д.; 5) Перадаць католікам усе раней канфіскаваныя касцёлы і дамы пробашчаў; 6) Вярнуць каталікам усе іх могілкі; 7) Прыняць меры, каб не арыштоўвалі ксяндзоў і іншых служкаў культу». Савецкія органы ўлады не прынялі ніводнай прапановы, але высновы зрабілі. 23(ці 25).1.1945, пасля вобыску арцыбіскупскага палаца, НКВД арыштавала С. разам з Р. Ялбжыкоўскім і змясціла іх у Лукішках. У пачатку 1946 С. этапаваны ў Інцінскі лагер МДБ Комі АССР. Пасля вызвалення ў другой палове 1947 выехаў у мяст. Варняны, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл., да свайго сябра У. *Курпіс-Гарбоўскага*. У 1947 выехаў у Беласток. З 30.8.1947 генеральны вікарый, з 28.8.1955 капітульны вікарый, з 23.11.1962 Апостальскі Адміністратар Віленскай архідыяцэзіі. Выкладаў у Беластоцкай духоўнай семінарыі.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**САВІЦКІ Аляксандр Вікенцевіч** [1881, Ашмяны Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. (паводле іншых звестак, Віцебск) — пасля 1937 (?)], святар, брат Б. *Савіцкага*. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). З 1910 вікарый касцёла ў пас. Клявань Ровенскага дэканата, цяпер Украіна. У 1914—18 адміністратар парафіі ў в. Дамбровіца (цяпер Дубровіцы) Луцкага дэканата, цяпер Украіна. У 1923—24 пробашч касцёлаў у в. Манастырыска і ў в. Пяцігоры Гуманьскага дэканата. Арыштаваны 1.2.1930. Асуджаны 12.5.1930 (?) калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. У верас. 1930 пераведзены (з 30 святарамі) у Яраслаўскі паліт. ізалятар АДПУ. У студз. 1934 этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі лагер НКВД Архангельскай вобл. З 20.7.1937 зняволены ў Салавецкай турме. Верагодна, прыгавораны да ВМП і расстраляны.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**САВІЦКІ Баляслаў Вікенцевіч** [1876 ці 1877, Ашмяны Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. (паводле іншых звестак, Віцебск) — пасля 1935], святар, брат А. *Савіцкага*. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1904). Прызначаны вікарыем касцёла ў Гарадку, цяпер Хмяльніцкай вобл., Украіна. З 1906 у Кіеве. З 1918 пробашч парафіі Манастырыска, цяпер Івана-Франкоўскай вобл., Украіна. У другой палове 1920-х г. пробашч парафій Вербавец, цяпер Цярнопальская вобл., Лучынец, Сніткаў і Тыўраў, цяпер Вінніцкая вобл. У 1928 адміністратар касцёла ў Бярдзічаве, цяпер Жытомірская вобл., Украіна. Арыштаваны 4(ці 20).8.1928. У лют. 1929 вывезены ў Бутырскую турму Масквы. У кастр. 1929 асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. (у канцы 1930 больш за

70 000 зняволеных). У 1931 пераведзены на востраў Анзер. У 1932 узяты пад варту. Абвінавачваўся з іншымі святарамі «ў стварэнні групоўкі, якая праводзіла антысавецкую агітацыю, тайна адпраўляла багаслоўскія і рэлігійныя абрады, здзяйсняла нелегальную сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару пра становішча католікаў у СССР». Следства хадайнічала аб утрыманні С. асобна ад іншых зняволеных. Высланы ў Ленінград, потым у Бутырскую турму. Вызвалены 15.9.1932 праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. Служыў пробашчам і дэканам касцёла ў Сарнах, цяпер Ровенскай вобл., Украіна.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**САК Аляксандр Мікалаевіч** [14.8.1890, в. Сёгда Наваградскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 27.8.1937, Мінск, турма НКВД], святар, паэт. З бел. сялянскай сям'і. Першы муж рэпрэсаванай бел. пісьменніцы **Ядвігі Бяганскай**[1]. Скончыў Пінскую гімназію. Вучыўся ў Санкт-Пецярбургу ў Інстытуце лясной гаспадаркі. У 1913 пасля III курса спыніў вучобу, паступіў у Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу, якую скончыў у 1917. Прыняў сакрамэнт святарства. Прызначаны вікарыем касцёла Звеставання НПМ у в. Фашчаўка, цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. Удзельнік з'езда бел. каталіцкіх святароў у Мінску (24—25.5.1917). З 19.12.1918 жыў у мяст. Сянно Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. У 1919—21 пробашч касцёла св. Людвіка ў в. Свацілавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл., і адміністратар парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Шклове Магілёўскага пав., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Духоўныя ўлады Магілёўскай

[1] Гл.: Маракоў, Рэпрэсаваныя…

архідыяцэзіі ў 1922 і 1924 мелі намер накіраваць С. для службы ў Петраград, але ён папрасіў пакінуць яго ў Беларусі. У 1923 зноў у касцёле ў в. Фашчаўка. З вясны 1924 жыў у Мінску, быў добрым знаёмцам **Янкі Купалы**, часта гасцяваў у паэта. Да гэтага перыяду адносяцца многія лірычныя вершы, паэмы, вершаваныя драматургічныя творы С. Паводле некаторых звестак, у другой палове 1920-х служыў на Міншчыне, Мазыршчыне, у Койданаве, цяпер райцэнтр Дзяржынск, у Хойніках, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. Шырока выкарыстоўваў бел. мову ў душпастырскай дзейнасці. Пераследаваўся савецкімі ўладамі. 17.12.1929 змушаны публічна адмовіцца ад святарскага сану. Працаваў стыльрэдактарам у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Ажаніўся, гадаваў дзіця. Арыштаваны АДПУ 24.7.1930 (у адну ноч з літаратуразнаўцам **Адамам Бабарэкам**, вучоным **Гаўрылам Гарэцкім**, гісторыкам Тодарам *Забелам,* рэдактарам Канстанцінам *Ламакам* і іншымі) па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Асуджаны з шэрагам дзеячаў бел. культуры і грамадства 10.4.1931 да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі лагер НКВД Карэльскай АССР. Вызвалены ў 1934. Вярнуўся ў Мінск. Працаваў прарабам у трэсце «Белбудматэрыялы». Зноў арыштаваны 11.4.1937. Асуджаны 25.8.1937 (з шэрагам праваслаўных і рыма-каталіцкіх святароў, парафіянамі касцёла і прыхаджанамі царквы) тройкай НКВД як «член ПАВ» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны трыбуналам БВА 26.10.1962. Асабовая справа С. № 17935-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Маракоў, Рэпрэсаваныя…*

**САКАЛОЎСКІ Броніслаў (Баляслаў) Станіслававіч** [1902, в. Літвіца Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — ?], арганіст. З польскай сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Працаваў у касцёле Нараджэння НПМ у мяст. Кемелішкі, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны 23.3.1945. Абвінавачваўся ў «пасобніцтве нямецкім акупацыйным уладам». Вызвалены 11.11.1946 УМДБ Маладзечанскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа С. № п-6384 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**САКАЛОЎСКІ Эдвард Вацлававіч** [1918, Кнышын (*Knyszyn*), Беластоцкае ваяв., Польшча — ?], арганіст. З сям'і польскага рабочага. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Працаваў у касцёле Нараджэння НПМ у мяст. Браслаў аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны 24.2.1940. Асуджаны 30.12.1940 асобай нарадай за «антысавецкую агітацыю» і «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 18.11.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**САРГЕВІЧ Павел Пятровіч** [4.6.1902, Санкт-Пецярбург — 1.9.1967], святар. Вучыўся ў пачатковай школе пры касцёле св. Казіміра, з 1912 у гімназіі пры касцёле св. Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу, у таемнай духоўнай семінарыі ў Петраградзе (арганізаванай арцыбіскупам Я. *Цеплякам*) да яе закрыцця ў 1918. З 1922 у Вільні. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (24.4.1927). Служыў вікарыем у Вільні, захоўваючы прыналежнасць да Магілёўскай архідыяцэзіі. З 1927 вікарый касцёла Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў мяст. Крамяніца Ваўкавыскага дэканата, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. З 1928 у парафіі св. Вацлава ў Ваўкавыску, цяпер райцэнтр

Гродзенскай вобл. У чэрв. 1930 пераведзены вікарыем у фарны касцёл св. Францішка Ксаверыя ў Гродне, але ў жн. таго ж года прызначаны пробашчам парафіі св. Станіслава ў в. Высоцк, цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. З 1.5.1936 адміністратар парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Трычуўка (*Tryczówka*) Беластоцкага дэканата, Польшча. Стаў ахвярай правакацыі, калі пасля прыходу савецкіх войскаў да яго звярнуўся быццам польскі афіцэр з прапановай уступіць у падпольную арганізацыю. Арыштаваны НКВД 20/21.3.1940. Абвінавачваўся ў прыналежнасці да польскага антысавецкага падполля. Зняволены ў Беластоцкай турме, потым праз Мінск і Полацк этапаваны ў Сібірскі лагер НКВД. Вызвалены ў жн. 1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Працаваў у Дэлегатуры польскай амбасады ў Петрапаўлаўску, Расія. У 1942 пакінуў СССР з арміяй **У. Андэрса.** З 19.6.1942 в. а. капелана 7-й пяхотнай дывізіі, потым да канца вайны капелан Польскай Арміі. Адзначаны «Крыжам Заслугі з Мячамі», «Крыжам Монтэ-Касіна», а таксама прызначаны старшым капеланам. 6.9.1946 з II корпусам трапіў у Вялікабрытанію, быў душпастырам для польскіх эмігрантаў. Загінуў у аўтакатастрофе ў Лондане. Яго цела сваякі перавезлі на радзіму. Пахаваны ў бацькоўскай магіле на фарных могілках у Беластоку.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**САРОКА Станіслаў** [1909—1975], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Свіслач Ваўкавыскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Паводле некаторых звестак арыштаваны НКВД у 1944. Неўзабаве вызвалены. З 1945 пробашч касцёла

св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Ізабелін Ваўкавыскага р-на, парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Вялікія Эйсманты Лунненскага дэканата, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл., касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Адэльск, цяпер Гродзенскі р-н. Быў адным з аўтараў тэлеграмы ад Ваўкавыскага дэканата са спачуваннямі з прычыны смерці І. Сталіна.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**САЎКА Апалінарыя Якубаўна** [1884, в. Рудзевічы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. ці Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — ?], хатняя гаспадыня, актыўная парафіянка касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Ленінградзе. Арыштавана 9.10.1929 па справе «**Матулёніса** і інш.». Асуджана калегіяй АДПУ 8.8.1930 да 3 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**СВЁНТЭК Казімір Яновіч** [нар. 21.10.1914, мяст. Валга, Эстонія], рэлігійны дзеяч, кардынал. З польскай сям'і. У 1922 пасяліліся ў Баранавічах, дзе С. скончыў гімназію імя Т. Рэйтана. У 1933 паступіў у Вышэйшую духоўную семінарыю імя Тамаша Аквінскага ў Пінску. Прыняў сакрамэнт святарства з рук біскупа **К. Букрабы** (8.4.1939). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў мяст. Пружаны, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны 21.4.1941. Вызвалены з прыходам немцаў. Вярнуўся ў пружанскі касцёл. Зноў арыштаваны 17.12.1944. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны праз Аршанскую перасыльную турму ў Сібірскі лагер МДБ Кемераўскай вобл. У 1947 пераведзены ў Варкуцінскі, потым Інцінскі лагеры МДБ

Комі АССР. Вызвалены 16.6.1954. Была магчымасць выехаць у Польшчу, але С. застаўся ў Беларусі. З 1.12.1954 пробашч катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску Брэсцкай вобл. У 1981—86 кіраваў рэстаўрацыяй катэдральнага касцёла. У 1990 біскуп Тадэвуш Кандрусевіч прызначыў С. генеральным вікарыем Пінскай дыяцэзіі. З 13.4.1991 арцыбіскуп, мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, Апостальскі Адміністратар Пінскай дыяцэзіі. 26.11.1994 Папа **Ян Павел II** абвясціў С. кардыналам.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Невяроўскі А.* Юбілей кардынала // *Навіны*. 1999. 13 крас.; *Гардзіенка А.* Кардынал Казімір Сьвёнтэк // *Дэмакратычная апазыцыя; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*.

**СВІРШЧЭЎСКІ Браніслаў** [1881 — ?], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1906). З 1909 пробашч і дэкан парафіі св. Ганны ў мяст. Койданава Мінскага пав., цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл. Некаторы час служыў у касцёле Адшукання Св. Крыжа ў мяст. Узда, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Арыштаваны ў 1920. Вызвалены. Выехаў у Польшчу (1924). З 1926 прэфект у Мехаве Кельцкай дыяцэзіі, Польшча. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**СВЯТАПОЛК-МІРСКІ Антон** [1907—1942], святар, езуіт. З польскай сям'і. Уступіў у Таварыства Езуса. Прыняў сакрамэнт святарства (1938). Пасля 20.9.1941 выехаў у Беларусь. Увосень 1941 стаў на чале адноўленай езуіцкай семінарыі ў Полацку. Спрыяў адраджэнню каталіцызму, праводзіў душпастырскую працу на тэрыторыі да 70 км ад Полацка, абслугоўваў да 10 тыс. вернікаў. Штомесячна праязджаў да 300 км на падводах. Апорным пунктам душпастырства стаў касцёл Маці Божай Ружанцовай у Полацку. Арыштаваны немцамі і закатаваны.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**СВЯТАПОЛК-МІРСКІ Яўген** [1876, мяст. Мір Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 28.3.1918], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства. У 1902—04 вікарый касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Табольску, цяпер Цюменская вобл. У 1905—09 катэхет Гомельскай мужчынскай гімназіі, прагімназіі, тэхнічнага чыгуначнага вучылішча, старшыня Гомельскага рыма-каталіцкага парафіяльнага таварыства асветы і дабрачыннасці. У 1910—11 пробашч касцёла НПМ у Чэрыкаве, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., дэкан. У 1912 пробашч касцёла св. Парыжскай Маці Божай у Санкт-Пецярбургу, катэхет Пецярбургскай французскай гімназіі для дзяўчат. З 1913 пробашч катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Магілёве, магілёўскі дэкан. Арыштаваны 2(ці 8).3.1918. Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці, прыналежнасці да ПАВ і хаванні польскіх жаўнераў». 28.3.1918 рэвалюцыйным трыбуналам ЧК асуджаны да ВМП. Калі парафіяне, якія былі пад-

час прысуду ў зале, сталі бараніць святара, чырвонаармейцы пачалі страляць, паранілі і забілі дзвюх маладых жанчын і яшчэ некалькі чалавек. С.-М. і двух хлопцаў бальшавікі ў той жа дзень вывезлі за горад. Яны патрабавалі, каб святар сказаў, што Бога няма. На гэта С.-М. адказаў: «Можаце забіць цела, але не заб'яце душы». Пасля жорсткіх катаванняў святара расстралялі. На наступны дзень парафіяне знайшлі цела пастыра з мноствам агнястрэльных і нажавых ран, разбітай галавой і зламанымі рукамі. Улады забаранілі правесці хрысціянскі абрад пахавання, дазволіўшы толькі пахаваць цела на месцы забойства. Пасля прыходу ў горад польскіх войскаў цела святара было эксгумавана і з пашанаю пахавана на каталіцкіх могілках Магілёва.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *З асабістага архіва У.Васькова.*

**СЕМАШКЕВІЧ Ян Казіміравіч** [псеўданімы: Янка Быліна, Ядловец; крыптанімы: Я.Б.; J.B.; 1883, в. Лакцяны Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. — 18(ці 21).2.1956, мяст. Мар'янава Падляшскага ваяв., Польшча], святар, грамадскі дзеяч, паэт, драматург, перакладчык. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). З 1910 вікарый (?) касцёла Божага Цела ў в. Дварэц Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1912 у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Ілля Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. У 1915 адміністратар касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Граўжышкі Ашмянскага дэканата, цяпер

Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. У 1-ю сусветную вайну са святаром У. *Талочкам* прадстаўляў бел. каталіцкае духавенства ў Віленскім камітэце дапамогі пацярпелым ад вайны. З 1917 пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Лаварышкі Віленскага пав., цяпер Літва. Друкаваўся ў газ. «Гоман», іншых перыядычных выданнях Зах. Беларусі, у тым ліку ў рэлігійных («Kryniсa», «Chryścijanskaja Dumka»), сатырычных (час. «Авадзень» і «Маланка»), дзіцячым (час. «Пралескі», пад псеўд. Ядловец). З 1928 служыў у парафіі св. Ганны ў в. Дукшты Піярскія Троцкага пав., цяпер Літва. У 1933 (?) вікарый парафіі св. Юрыя ў мяст. Янаў (*Ianów*) Сакольскага пав. і дэканата, Польшча. З 1934 у касцёле св. Юзафа ў в. Падбярэзззе (*Podbrzezie)* Свянцянскага дэканата, цяпер г. Пабрадэ, Літва (?). З 1937 служыў у парафіі Перамянення Пана ў в. Ялоўка (*Jałowka*), Польшча. З 1946 рэктар і першы пробашч парафіі Мар’янава (*Marianowo*) Беластоцкай архідыяцэзіі.

Тв.: Na pryzbie. Wilnia, 1918 (2-е выд.: 1924); Wybar staršyni: Wiaskowaja trahikamedyja u 3-ch dziejach z časou carskich. Wilnia, 1926 (2-е выданне: Выбар старшыні. Вільня, 1938); Daroha kryža. Wilnia, 1930; Na pokuci: Bajki i roznyja wieršy. Wilnia, 1934.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Гарэцкі М.* Быліна Я. // Гарэцкі М. Гісторыя беларускай літаратуры. Мн., 1992; *БП*, т. 1; *ЭГБ*, т. 6—2; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**СЕНВАЙЦІС Юзаф** [1867—1932, Новасібірск, турма АДПУ], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1894). У 1896—1904 рэктар філіяльнага касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Грос-Ведэр, цяпер Латвія. У 1906—10 адміністратар

парафіі св. Юзафа ў в. Гарбачова-Абітокі (тагачасны паштовы адрас: ст. Неклач) Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Расонскі р-н Віцебскай вобл. У 1911—23 капелан капліцы Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Петрапаўлаўску Омскага дэканата, цяпер Казахстан. У 1925—28 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Златавусце Самарскага дэканата, парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Чалябінску Пермскага дэканата, Расія. Арыштаваны ў верас. 1931 у Чалябінску. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**СЕЧКА Стэфан Янавіч** [1905 ці 1909—20.1.1976], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). У 1936 прызначаны адміністратарам парафіі св. Вацлава ў в. Драздоўшчына Надвілейскага дэканата, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. З 20.5.1939 да 4.5.1940 у парафіі Спаслання Св. Духа ў мяст. Бярозаўка Лідскага дэканата, цяпер горад Лідскага р-на Гродзенскай вобл. Арыштаваны гестапа 29.6.1942. Вывезены ў Наваградак. Вызвалены 31.7.1942. Вярнуўся ў парафію. У 1944 з-за пагрозы новага арышту пераехаў у в. Ліпнішкі, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл., дзе служыў у касцёле св. Казіміра. Арыштаваны НКВД у пачатку крас. 1945. Вызвалены 9.5.1945. Адмовіўся выехаць у Польшчу. Працягваў служыць у парафіі Ліпнішкі. Праследаваўся савецкімі ўладамі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T.*

*Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**СЕЧКА Тадэвуш** [1902, Лодзь (*Łódź*), Польшча — чэрв. 1941], святар, доктар тэалогіі, вядомы гістарычнымі працамі пра Вострую Браму. Скончыў усеагульную школу, вучыўся ў гандлёвай навучальнай установе ў Лодзі, пасля ў гімназіі імя Караля Уладзіслава IV у Варшаве. У 1920 пайшоў добраахвотнікам у войска. З 15.7.1920 3,5 месяца служыў у артылерыі. Потым вярнуўся ў гімназію, якую скончыў у 1922. У 1929 скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся на ф-це тэалогіі ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (21.4.1929). 3.5.1929 прызначаны вікарыем парафіі св. Казіміра ў мяст. Новая Вілейка, цяпер Літва. 14.10.1929 пераведзены ў Вільню ў касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса, але, верагодна, не прыняў гэтую прапанову, таму што з 19.10.1929 служыў у парафіі св. Тэрэзы. З 5.9.1930 у касцёле св. Антонія Падуанскага ў мяст. Сакулка (*Sokółka*) аднайменнага дэканата, цяпер Польшча. У 1933 рэктар філіяльнага касцёла ў в. Плябань Вілейскага пав. і дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. 27.6.1934 абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Культ Вастрабрамскай НПМ у гістарычным развіцці». Пад канец 1934 прыняў прапанову працаваць у Францыі. Прызначаны сурэдактарам час. «Polak we Francji» і на душпастырскую працу, але неўзабаве вырашыў вярнуцца на радзіму. З 4.9.1936 прэфект касцёла Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 2.4.1937 адміністратар парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Лапеніца (Вялікая Лапеніца) таго ж пав. і дэканата, цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. З 29.3.1938 у парафіі св. Юрыя ў в. Весялуха Надвілейскага дэканата, існавала да 1977 у Мядзельскім р-не Мінскай вобл. З 15.4.1939 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Дэмбрава Лідскага пав.

Васілішскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны НКВД у кастр. 1939. Зняволены ў турме ў Шчучыне, потым у Лідзе, Мінску. Паводле некаторых звестак, расстраляны падчас этапавання вязняў мінскай турмы НКВД на Усход.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**СІВІЦКІ Казімір Антонавіч** [29.1.1884, в. Ячна Каменскай вол. Сакольскага пав. Гродзенскай. губ., цяпер Польшча — 26.10.1938, Сяміпалацінск Казахскай ССР], святар. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. З 1918 адміністратар парафіі НМП і св. Антонія Падуанскага ў Вялікіх Луках, капелан яе філіі касцёла Сэрца Пана Езуса ў Новасакольніках, цяпер Пскоўская вобл., Расія. З 1925 адміністратар касцёла св. Юзафа Абранніка ў Оршы, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл., парафіі св. Юрыя ў мяст. Дуброўна, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны 28.5.1927. Асуджаны 2.7.1927 асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. У ліп. 1930 пераведзены на востраў Анзер. У 1932 узяты ў лагеры пад варту. Абвінавачваўся па групавой справе каталіцкага духавенства «ў арганізацыі контррэвалюцыйнай групы, якая вяла антысавецкую агітацыю, тайна рабіла багаслоўскія, рэлігійныя абрады і здзяйсняла нелегальную сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару аб становішчы каталікаў у СССР». 27.5.1933 высланы на 3 гады ў Сяміпалацінск, пазней пераведзены ў Алма-Ацінскую вобл. Казахскай ССР. 4.9.1935 з С. узята падпіска аб нявыездзе. 25.11.1935 прыга-

вораны за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ. Зноў арыштаваны 11.6.1937. Асуджаны 26.10.1938 тройкай НКВД Усходне-Казахскай вобл. за «шпіянаж» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей.*

**СІДАРОВІЧ Браніслава Аляксандраўна** [3.9.1895, в. Індура Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі р-н — 1967], санітарка маскоўскай паліклінікі, актыўная парафіянка, спявала ў хоры касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Маскве. Арыштавана 12.3.1938. Абвінавачвалася ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджана асобай нарадай НКВД да 5 (?) гадоў ППЛ. Этапавана ў Сібірскі лагер НКВД (Марыінск). Вызвалена ў 1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Вярнулася ў Маскву. Зноў арыштавана ў 1950. Абвінавачвалася ў тым жа «злачынстве». Асуджана да 10 гадоў ППЛ. Этапавана ў Цемнікоўскі лагер МДБ Мардоўскай АССР. Пасля вызвалення выехала ў Серпухаў Маскоўскай вобл. Рэабілітавана (1958). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**СІМАНОВІЧ Марк** [10.10.1899, в. Акуліна Лепельскага (?) пав. Віцебскай губ., цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. (паводле інш. звестак, мяст. Капыль Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл.) — 1942], святар. Прыняў сакрамэнт

святарства (1923). З 1937 дырэктар Ніжэйшай духоўнай семінарыі ў Драгічыне (*Drohiczyn*) Бельска-Падляскага пав., Польшча, пазней пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у Слуцку Мінскай вобл. Напярэдадні прыходу немцаў выехаў у Клецк. Застаўся ў рэгіёне, выконваў душпастырскую працу. Увосень 1942, нягледзячы на папярэджанне пра небяспеку, прыехаў у Слуцк, каб адправіць набажэнства. Пасля імшы арыштаваны паліцэйскімі і расстраляны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Hładowski Władysław*. Wspomnienia. Drohiczyn, 2000; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**СІЧАК Пётр Янавіч** [31.12.1910, в. Січкі, цяпер Келецкае ваяв., Польша — 29.5.1975], святар, магістр тэалогіі. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя, 13.11.1939 атрымаў ступень магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (16.6.1940). Да студз. 1941 вікарый касцёла св. Юзафа і НПМ у в. Корве (*Korwie*) Кальварыйскага дэканата, цяпер Літва, да чэрв. 1941 служыў у парафіі св. Станіслава ў в. Ляцк Шчучынскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. У ліп.-жн. 1941 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Новы Двор, цяпер Шчучынскі р-н. З верас. 1941 да верас. 1942 у парафіі Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Хаваўся ад немцаў у парафіі Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва. З 1943 адзін з актыўных святароў (псеўд. «Ксёндз Пётр») Навагрудскай акругі АК. Капелан 5-га батальёна 77-га пяхотнага палка. У ліп. 1944 вярнуўся ў парафію Радунь. Праз месяц прызначаны пробашчам касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 14.1.1946.

Асуджаны 31.5.1946 за «ўдзел у польскай нацыяналістычнай арганізацыі АК» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў адзін з уральскіх лагераў (паводле іншых звестак — Комі АССР). Вызвалены ў 1948. Быў сярод 5 святароў, якія выехалі ў Польшчу з крас. па верас. 1948. З 1951 вікарый парафіі св. Якуба ў мяст. Пёрткаў Трыбунальскі (*Piortków Trybunalski*) Лодзінскай дыяцэзіі. З 1958 пробашч касцёла ў Навасольне (*Nowosolna*) каля Лодзі, з 1960 у парафіі Пажна (*Parzno*), з 1962 у касцёле ў мяст. Хабяліцы (*Chabelice*), з 1972 у парафіі Лезніцы Велькай (*Leźnica Wielka*), Польшча. Адзначаны «Срэбным Крыжам Заслугі з Мячамі». Рэабілітаваны 6.10.1995 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда. Асабовая справа С. № п-23082 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**СКАКОЎСКІ Юстын (Юзаф) Альфонсавіч** [1876—15.7.1943], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1901). З 1902 адміністратар касцёла Звеставання НПМ у мяст. Петрыкаў, цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. З 1905 пробашч парафіі Божага Цела ў мяст. Давыд-Гарадок, цяпер горад Столінскага р-на Брэсцкай вобл. З 1907 у касцёле св. Ганны ў мяст. Койданава, цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл., парафіі Апекі св. Юзафа ў в. Рубяжэвічы, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. З 1909 служыў у касцёле Нараджэння НПМ у Дрысе Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Верхнядзвінск Віцебскай вобл., дрыса-себежскі дэкан. У 1915—17 пробашч парафіі св. Казіміра ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. З 1936 рэктар касцёла Звеставання НПМ у Гродне, катэхет. Арыштаваны гестапа 14.7.1943 як закладнік. Забіты

з 5 святарамі і вялікай групай мясцовай інтэлігенцыі каля в. Навумавічы, цяпер Гродзенскі р-н.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Памятная книжка Витебской губернии; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**СКАРУПКА Ігнат-Ян** [19.7.1893, Варшава — 14.8.1920, Асова (*Ossowo*) каля Валоміна (*Wołomin*), Польшча], святар. Вучыўся ў гімназіі Хжаноўскага ў Варшаве. Скончыў Варшаўскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства з рук арцыбіскупа Я. *Цепляка* (26.1.1916, Петраград). Змушаны займацца хворай маці і сям'ёй, якая ў выніку эвакуацыі з Польшчы знаходзілася ў Петраградзе, спыніў навучанне ў духоўнай акадэміі і цалкам аддаў сябе грамадскай і душпастырскай працы сярод уцекачоў з Польшчы. У першай палове 1917 служыў у парафіі ў с. Багародскае каля Масквы. Паводле некаторых звестак, у верас. 1917 служыў у касцёле ў г. Клінцы Бранскай вобл., Расія. Яго дзейнасць прыцягнула ўвагу бальшавіцкіх уладаў. Пад пагрозай арышту 4.9.1918 апошнім транспартам выехаў у Варшаву. Катэхет і вікарый парафіі Перамянення Божага ў Лодзі (*Łódź*), Польшча. У ліп. 1919 вярнуўся ў Варшаву, дзе працаваў натарыусам і архівістам варшаўскай мітрапалітнай курыі. Служыў капеланам установы для беспрытульных дзяўчат супольнасці сясцёр сям'і Марыі ў Празе (прыгарад Варшавы), катэхетам у дзвюх мужчынскіх школах. Дзякуючы настойлівым намаганням атрымаў у ліп. 1920 згоду варшаўскага арцыбіскупа **А. Какоўскага** на службу капеланам франтавых аддзелаў. У хуткім часе стаў капітанам 236-га Добраахвотнага палка ветэранаў студзеньскага паўстання (1863). Мабілізаваны на фронт як капелан рэзерву. У першай лініі батальёна паручніка С. Матаровіча прымаў удзел у бітве за Варшаву. Адзначыўся самаахвярнай душпастырскай і ідэйнай працай. Загінуў за дзень да польскай перамогі ў бітве

пад Асовам (*Ossowo*). Пасмяротна прысвоена званне маёра і ўзнагароджаны Крыжам *«Virtuti Militari»*. Да 80-годдзя з дня смерці С. улады Мазовіі ўстанавілі яму помнік.

Кр.: *Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR.*

**СКОРКА (СКАРКО, СКУРКО) Антоні** [1888—1942], святар, доктар тэалогіі і філасофіі. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1918). З 1934 пробашч парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. У 1937 у касцёле св. Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны, цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 у парафіі ў мяст. Варапаева Надвілейскага дэканата, цяпер г. п. Пастаўскага р-на. Арыштаваны фашыстамі. Абвінавачаны ў польскай прапагандзе, выдалены з парафіі і «перададзены службе бяспекі для прыняцця далейшых мер». Закатаваны.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**СЛІВІНСКІ Адольф** [1910, в. Кліхі (?) — ліп. 1941], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Прызначаны вікарыем касцёла св. Казіміра ў мяст. Стоўбцы аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Паводле адных звестак, расстраляны немцамі ля касцёла. Паводле іншых, загінуў ад выпадковай кулі падчас перастрэлкі пры адступленні Чырвонай Арміі на Усход.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**СЛІВОЎСКІ Караль** [29.6.1855, каля Варшавы, Польшча — 5.1.1933, с. Седанка каля Уладзівастока, Расія], святар. Вучыўся ў Варшаве, Францыі, Германіі, у Інжынерным інстытуце ў Санкт-Пецярбургу. Скончыў духоўную семінарыю ў Сейнах (*Sejny*), Польшча, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (1883). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Сянно, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1890 адміністратар і дэкан касцёла Узвышэння Св. Крыжа і св. Казіміра ў Лепелі Віцебскай губ. З-за канфлікту са святарамі, якіх падтрымлівалі ўлады, пераведзены ў Казань, Расія, дзе служыў пробашчам, ваенным капеланам, катэхетам і дзе пабудаваў новы храм Узвышэння Св. Крыжа. З 1912 ва Уладзівастоку, Расія, дзе таксама пабудаваў новы храм (Нараджэння НПМ), а стары касцёл перабудаваў пад малую семінарыю. 2.2.1923 прызначаны на пасаду біскупа створанай Уладзівастоцкай дыяцэзіі. У канцы 1923 выгнаны бальшавікамі з Уладзівастока. Жыў у с. Седанка пад наглядам ГПУ, не маючы магчымасці выконваць святарскія абавязкі.

Кр.: *Литургический календарь; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**СЛОСКАН Баляслаў Бернардавіч** [19(31).8.1893, Тылтаголь (Андронава) Узулмуйжскай вол. Рэжыцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — 18.4.1981, Бельгія], рэлігійны і грамадскі дзеяч. З латышскай каталіцкай сям'і. Скончыў Рэжыцкае гарадское 3-класнае вучылішча (1907), аптэкарскія курсы ў Рызе (1911), Магілёўскую духоўную семінарыю ў Петраградзе (1917). Прыняў сакрамэнт святарства з рук арцыбіскупа Я. *Цепляка* (21.1.1917). Вучыўся ў Петраградскай духоўнай акадэміі да яе закрыцця ў 1918. У чэрв. 1919 прызначаны вікарыем касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Паралельна пробашч касцёлаў

Узвышэння Св. Крыжа ў Шлісельбургу, НПМ у Петразаводску, св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Кранштаце, рэктар капліцы ў пас. Вырыца Петраградскай губ. З сак. 1923 пробашч парафіі св. Станіслава, таксама абслугоўваў касцёл св. Баніфацыя. З 9.6.1924 пробашч парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Маскве. З верас. 1924 у касцёле св. Барбары ў Віцебску. З канца 1925 пробашч парафіі св. Кацярыны Александрыйскай у Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. 4.5.1926 у касцёле св. Людвіка ў Маскве тайна менаваны біскупам. 12(ці 13).8.1926 прызначаны Апостальскім Адміністратарам Мінскай дыяцэзіі і той часткі Магілёўскай архідыяцэзіі, якая знаходзілася ў межах БССР. 14.9.1926 у Віцебску публічна заявіў аб сваім прызначэнні. Арыштаваны АДПУ 17.9.1927 у Магілёве. Для далейшага следства перавезены ў мінскую турму АДПУ, потым у маскоўскую «Лубянку». 13.1.1928 асуджаны за «шпіянаж» да 3 гадоў ППЛ. 13.2.1928 этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., дзе цяжка захварэў. Пасля вызвалення 3.10.1930 вярнуўся ў Магілёў. Зноў арыштаваны 9.11.1930. Перавезены ў Мінскую турму АДПУ, потым у Маскву. Прыгавораны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Іркуцк, потым у Краснаярск, Енісейск. У снеж. 1932 вывезены ў Краснаярск, потым у Маскву. Вызвалены 22.1.1933 праз абмен палітвязнямі паміж Латвіяй і СССР. Жыў у Латвіі. Рэктар Рыжскай духоўнай каталіцкай семінарыі, выкладаў на тэалагічным ф-це Рыжскага ун-та. Падчас вайны знаходзіўся ў кляштары даміканцаў у Аглоне, Латвія, яму намінальна падпарадкоўваліся Мінская, Слуцкая і Барысаўская акругі. 22.9.1941 накіраваў рэйхскамісару Остланда прашэнне, у якім прасіў дазволу на паездку ў Мінскую і Магілёўскую вобл. Разгляд пытання быў адкладзены да вясны. 21.4.1942 накіраваў паўторную просьбу і атрымаў адмоўны адказ. Арыштаваны гестапа. Вывезены ў лагер у Шнайдэмюндзе. Вызвалены ў 1945. Жыў у Эйштэце, Лоры (?). У 1947 пераехаў у Брусель, Бельгія, дзе заснаваў семінарыю для латышоў. З 1951 у Лювене, Бельгія. Духоўна апекаваўся бел. студэнцкім асяродкам у каталіцкім ун-це. Дапамагаў бел.

кампазітару **Міколу Равенскаму**. У 1952—60 апостальскі візітатар беларусаў-католікаў у Зах. Еўропе. Аказваў матэрыяльную падтрымку бел. рэлігійным перыядычным выданням: «Źnič» (Рым), «Божым шляхам» (Парыж; Лондан) і інш.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Надсан А.* Даведнікі — не паэзія // *ARCHE*. 2004. № 2.

**СМЯЛОЎСКІ Станіслаў** [1883 — ?], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1907). З 1913 служыў у касцёле св. Тэрэзы ў Вільні. З 1918 капелан і катэхет пры касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у Слоніме Гродзенскай губ. Арыштаваны 2.1.1919. Вызвалены. З 1938 катэхет у Гродне. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*.

**СНІТКОЎСКІ Мечыслаў** [? — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства. Служыў у Пінскай дыяцэзіі. Капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны як капелан у верас. 1939 у Нясвіжы, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**СНЯГОЦКІ Стэфан** [1914—1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства

(1941). Прызначаны вікарыем фарнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Лідзе, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Арыштаваны гестапа ў пачатку ліп. 1942. Расстраляны з 9 іншымі святарамі ў ваколіцах Ліды (гл. арт.: *Ажароўскі* Юрый).

Кр.: *Krahel T.* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998, № 3 (98); *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны.*

**СОХАНЬ Юзаф** [1885—1942], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Брэсце Гродзенскай губ. У 1924—28 у касцёле Унебаўзяцця НПМ і св. Станіслава ў мяст. Нараў (*Narew*), Польшча. У 1938—39 пробашч парафіі св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Сноў, цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны фашыстамі 28.6.1942. Зняволены ў Нясвіжскай турме. Расстраляны.

Кр.: *Памятная книжка Гродненской губернии; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**СПЕРСКІ Баляслаў Адольфавіч** [5.4.1871, в. Канчаны Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. — 23.4.1951, Верхнеўральск, турма МДБ], святар. З польскай шляхецкай сям'і. Скончыў гімназію, Віленскую духоўную семінарыю, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1897). Прызначаны выкладчыкам у Віленскую духоўную семінарыю. З 1902 пробашч парафіі Адшукання Св. Крыжа ў в. Жырмуны Лідскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1906 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок таго ж дэканата, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл., пробашч парафіі св. Казіміра ў в. Ліпнішкі Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1918 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Брэсцкай

вобл. З 22.8.1920 па 28.3.1921 у парафіі Скотнікі (*Skotniki*) Сандамірскай дыяцэзіі, Польшча. З 1927 пробашч і дэкан фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 1933 адміністратар і катэхет парафіі св. Барталамея ў Вільні. З 1936 у парафіі Усіх Святых у Вільні. Падчас 2-й сусветнай вайны накіраваны ў Мінск. Дапамагаў яўрэям. Арыштаваны гестапа, вывезены ў Вільню. Вызвалены праз 5 дзён. Зноў арыштаваны гестапа 3.3.1942. Зняволены ў віленскай турме Лукішкі, потым інтэрніраваны ў Шалтупы. Пасля вяртання ў Вільню зноў служыў у касцёле Усіх Святых. У верас. 1944 выехаў на Магілёўшчыну, служыў у касцёлах Оршы, Магілёва і інш. Арыштаваны НКВД у 14.12.1946 у Вільні. Асуджаны ў жн. 1947 асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Бобрык Данской каля Сталінагорска (цяпер Новамаскоўск), потым пераведзены ва Уладзімірскі паліт. ізалятар МДБ. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Памятная книжка Виленской губернии; Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**СТАНКЕВІЧ Адам Вікенцевіч** [псеўданімы: А.Сакалінскі; Соколинский; крыптанімы: А.С.; А.Ст.; Ад.С.; Ад.Ст-іч; 24.12.1891(6.1.1892), в. Арляняты Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. — 29.12.1949, ГУЛАГ (Тайшэт Іркуцкай вобл.)], святар, гісторык, публіцыст, літаратуразнавец, асветнік, выдавец. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў народную школу пры касцёле св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Гальшаны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. (1908), гарадское вучылішча ў мяст. Ашмяны (1908), Віленскую духоўную семінарыю (1914), Магілёўскую духоўную акадэмію ў Петраградзе са ступенню кандыдата кананічнага права (1918). Прыняў сакрамэнт

святарства (28.12.1914). Адным з першых выкарыстоўваў бел. мову ў набажэнствах. Падтрымліваў сувязі з бел. культурна-асветнымі коламі, супрацоўнічаў з газ. «Наша Ніва», якая моцна паўплывала на яго самасвядомасць. З 1917 вікарый касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Дзісна, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл., парафіі св. Мікалая ў Вільні і інш. З 1918 катэхет школ у Вільні, таксама выкладаў рэлігію ў Віленскай беларускай гімназіі. У жн. 1919 — верас. 1922 рэдактар-выдавец газ. «Крыніца» («Беларуская крыніца»). У 1927 заснаваў і выдаваў час. «Хрысціянская думка». Адзін з заснавальнікаў Хрысціянска-Дэмакратычнай злучнасці (ХДЗ), пазней пераўтворанай у партыю Беларуская Хрысціянская дэмакратыя (БХД). Дэпутат польскага сейма 1922—28, нам. старшыні Беларускага пасольскага клуба (1922—30), Беларускага нацыянальнага камітэта (1921—38), Таварыства беларускай школы (1921—37), Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (1926—36), духоўны кіраўнік Беларускага студэнцкага саюза (1930—39), прэфект школ парафіі Св. Духа (1935—37). У 1938 высланы польскімі ўладамі з Вільні ў Слонім, капелан касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ. Восенню 1939 вярнуўся ў Вільню. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч касцёла св. Міхала, дырэктар Віленскай беларускай гімназіі, адзін з ініцыятараў адраджэння бел. школы. Пасля захопу Вільні савецкай арміяй узяты пад пільны нагляд НКВД. Арыштаваны НКВД 7.12.1944. Неўзабаве вызвалены. 8.12.1945 накіраваў савецкаму кіраўніцтву дакумент «Каталіцкая праблема ў БССР (Да ведама Урада СССР)», у якім даў глыбокі гістарычны аналіз узнятага пытання і выказаў прапановы адносна ўрэгулявання праблем католікаў у Беларусі. Звяртаў увагу на неабходнасць стварэння беларускай каталіцкай дыяцэзіі. 20.3.1947 паслаў савецкаму ўраду другі «Мемарандум», у якім прапаноўвалася пры садзейнічанні віленскага біскупа **Мечыславаса Рэйніса** часова прызначыць у БССР адміністратара, задачай якога было б «уладзіць каталіцкія справы ў БССР, узгадняючы іх з новымі ўмовамі, стварыць епархіі на чале з епіскапамі і

беларускую каталіцкую правінцыю». Але ў перспектыве, па меркаванні С., «адзіна правільнае вырашэнне каталіцкай справы ў БССР — гэта стварэнне самастойнай кананічнай беларускай адзінкі кіравання, незалежнай ні ад палякаў, ні ад літоўцаў», падпарадкаванай толькі Папу Рымскаму. Ні на адзін з «Мемарандумаў» савецкі ўрад не адрэагаваў. Адрэагавалі ў МДБ. Арыштаваны 13.4.1949. Асуджаны 31.8.1949 асобай нарадай МДБ СССР з навукоўцам **Андрэем Шынкевічам**[1] за «антысавецкую агітацыю» і «шпіянаж» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Азёрны лагер МДБ Іркуцкай вобл. (каля 20 000 зняволеных; начальнік — падпалкоўнік НКВД М. Філімонаў). Загінуў у зняволенні. Пахаваны 10.12.1949 на могілках Азёрнага лагера (магіла № 3—43) каля в. Шаўчэнкі Тайшэцкага р-на Іркуцкай вобл.

Тв.: Doktor Francišak Skaryna — pieršy drukar biełaruski (1525–1925). Wilnia, 1925; Biełaruskaja mowa u škołach Biełarusi XVI i XVII st. Wilnia, 1928; Rodnaja mowa u światyniach. Wilnia, 1929; Вітаўт Вялікі і Беларусы. Вільня, 1930; Franciš Bahuševič: Jaho žyćcio i tvorčaść: U tryccatyja uhodki (1900—1930). Wilnia, 1930; Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1935; Міхал Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песьня. Вільня, 1938; Biełaruski chryścijanski ruch. Wilnia, 1939; Хрысьціянства і Беларускі народ. Вільня, 1940.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis;* Ксёндз Адам Станкевіч: У 25-я ўгодкі свяшчэнства і беларускай нацыянальнай дзейнасці (10.1.1915—10.1.1940). Вільня, 1940; *Конан У.* Лідэр беларускага нацыянальнага адраджэння // *Наша вера.* 1998. № 3; *Литургический календарь*; *БП*, т. 5; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*; *ЭГБ*, т. 6—1; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

[1] Гл.: Маракоў, Рэпрэсаваныя…

**СТАНКЕВІЧ Марыя Мацвееўна** [1901, в. Туманаўка, цяпер Магілёўскі р-н — ?], старшыня касцёльнага камітэта ў Магілёве. З польскай сялянскай сям'і. Арыштавана 20.6.1934. Асуджана 28.12.1934 калегіяй АДПУ за «выдаванне звестак, якія не падлягалі распаўсюджванню», да 3 гадоў ссылкі. Вызвалена 4.10.1936. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа С. № 2801-сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СТАРК Адам** [1907, Зберск (*Zbiersk*), Польшча — 19(20?).12.1942], святар. Уступіў у Таварыства Езуса. Склаў законныя шлюбы (1924). Вывучаў тэалогію ў Кракаўскім і Люблінскім ун-тах. Прыняў сакрамэнт святарства (1936). У кастр. 1939 накіраваны ў Слонім. Арыштаваны НКВД у чэрв. 1941. Пасля вызвалення жыў у законным доме Сясцёр Маці Божай Беззаганнай у Слоніме. Дапамагаў яўрэям, якіх з пачаткам вайны размясцілі ў гета. Арыштаваны 18/19.12.1942. Раніцай 19.12.1942 з групай вязняў вывезены на расстрэл за два кіламетры ад горада. Меў магчымасць збегчы, але адмовіўся. Расстраляны з сёстрамі Мартай *Валоўскай* і Евай *Наішэўскай*. Інстытут *Yad Vashem* уганараваў яго тытулам «Праведнік народаў свету».

Кр.: *Sludzy Boży* z Prowincji Wielkopolsko-Mazowieckiej Towarzystwa Jezusowego. Warszawa, 2004.

**СТАШЭЛІС Станіслаў** [1898—2.7.1941], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1924). З 1927 служыў у касцёле Апекі НПМ у в. Даўкшышкі Ашмянскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. З 1932 у парафіі Нараджэння НПМ у в. Лебедзева Вілейскага пав. і дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. З 1936 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Сурвілішкі Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Забіты невядомымі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**СТРАСНЕЎСКІ Вінцэнт** [1909—10.3.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Служыў у касцёле Перамянення Пана (?) у в. Юрацішкі Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны фашыстамі летам 1942. Зняволены ў Лідскай турме. Расстраляны з 9 іншымі святарамі ў ваколіцы Ліды (гл. арт.: *Ажароўскі* Юрый).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Krahel T.* Rozstrzelani w Lidzie // *Czas Miłosierdzia.* 1998. № 3 (98); *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**СТРУМІЛА-ПЕТРАШКЕВІЧ Люцыян** [27.12.1892 ці 1894 — ліст. 1941], святар. Скончыў Люблінскі ун-т. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). У 1922 пробашч касцёла ў Любліне (*Lublin*), Польшча. З 1927 у касцёле св. Юрыя ў в. Паланэчка, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1931 в. а. пробашча касцёла св. Мучаніка Юрыя ў в. Сваятычы Баранавіцкага пав. Сталавіцкага дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны фашыстамі. Расстраляны.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**СТУДЗІНСКІ Вінцэнт** [10.1.1899, мяст. Млыны (*Młyny*) Магільнянскага (?) пав., Польшча — 13.7.1943], святар. Скончыў духоўную акадэмію. Прыняў сакрамэнт святарства (1933). Пасля арышту святара Л. *Струміліы-Петрашкевіча* служыў пробашчам парафіі св. Мучаніка Юрыя ў в. Сваятычы

Баранавіцкага пав. Сталавіцкага дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. 29.6.1942 арыштаваны беларускай паліцыяй. Пераведзены ў турму ў Баранавічах. Расстраляны літоўскім атрадам *Sonder Kommando*.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**СТЭМПЕЛЬ Карл (Герман)** [1910, Лодзь (*Łódź*), Польшча — 19.7.1943], францішканец, благаслаўлёны. Скончыў агульнаадукацыйную школу. У 1926 паступіў у Ніжэйшую духоўную семінарыю айцоў францішканцаў у Львове. У 1929 прыняты ў навіцыят ордэна францішканцаў канвентуальных. Склаў першыя (1930) і вечныя (1934, Кракаў) законныя шлюбы. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). Вучыўся ў Рыме. Пасля вяртання ў Польшчу прызначаны ў Радамск (*Radomsk*), потым у Вільню. Падчас 2-й сусветнай вайны служыў у парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Івянец, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл., касцёле св. Юрыя ў в. Пяршаі, цяпер той жа р-н. Падчас правядзення гітлераўцамі карнай акцыі добраахвотна далучыўся да групы сагнаных жыхароў парафіі. Расстраляны каля в. Баравікоўшчына (за 7 км ад Івянца). Беатыфікаваны Папам **Янам Паўлам II** 13.6.1999 у групе 108 Мучанікаў.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**СУВАЛА Мечыслаў** [21.11.1913, мяст. Грабавіца Стажэньска (*Grabowica Starzeńska*), Польшча — 6.10.1986, Варшава], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл., потым капелан АК у Налібоцкай пушчы. Адзін са святароў, якія актыўна дзейнічалі ў Наваградскай акрузе. Капелан 3-га батальёна 77-га палка

(псеўд. «Оро»). Арыштаваны немцамі ў маі 1944. Вывезены ў Ліду. Уцёк з іншымі вязнямі. Зноў арыштаваны падчас сустрэчы афіцэраў АК з савецкімі прадстаўнікамі. У чэрв. 1945 перавезены ў Асташкава. Вызвалены ў пачатку 1946. Выехаў у Польшчу. Да сярэдзіны 1980-х катэхет ліцэя св. Аўгусціна ў Варшаве.

Кр.: *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в годы второй мировой войны*.

**СУЛІК Юзаф Антонавіч** [10.7.1917, в. Старакаменна (*Starokamenna*), Польшча — 10.7.1941, Смаленск, Расія], салезіянін. Са шляхецкай шматдзетнай сям'і. З 25.7.1935 праходзіў навіцыят у мяст. Дварэц, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. У чэрв. 1938 скончыў трохгадовую мужчынскую сталярную школу. Працаваў у Дварцы па спецыяльнасці. 3.10.1939 прызваны ў Чырвоную Армію, у якой служыў тры месяцы ў Адэсе. У канцы студз. 1940 вярнуўся дадому. 3.5.1941 зноў прызваны ў армію. Паводле адных звестак загінуў у баі, паводле іншых — забіты савецкімі салдатамі за адмову змагацца з немцамі.

Кр.: *Żurek W. Salezjańscy męczennicy Wschodu.* Lublin, 2003.

**СУФРАНОВІЧ Каятан Каятанавіч** [1.11.1895, Вільня — 27.8.1970], святар. У 1909 скончыў народную школу, у 1913 гарадскую. З 1914 вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі, з-за вайны вучобу працягваў у Магілёўскай семінарыі ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія, дзе атрымаў пасвячэнне. Увосень 1918 вярнуўся ў Вільню. Прыняў сакрамэнт святарства (20.5.1920). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З-за хваробы на тыф бальшавікі яго не арыштоўвалі. З 1921 вікарый касцёла Яна Хрысціцеля ў в. Параф'янава Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Докшыцкі

р-н Віцебскай вобл., дзе служыў да 1925 з перапынкам з ліст. 1923 да вясны 1924, калі выконваў абавязкі пробашча парафіі св. Апостала Андрэя Баболі ў мяст. Крывічы, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. З 1925 пробашч парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Венславінента Ашмянскага дэканата, цяпер Літва. З 1928 у касцёле Божага Провіду ў в. Балінгрудак Свянцянскага пав. Кальварыйскага дэканата, цяпер Літва. З 1935 у парафіі НПМ у в. Жэлядзь Свянцянскага пав. Свірскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 7/8.4.1941 НКВД. Зняволены ў вілейскай турме, потым пераведзены ў разанскую турму, Расія. Абвінавачваўся ў «выхаванні польскай моладзі ў духу нянавісці да камунізму і стварэнні контррэвалюцыйнай арганізацыі». Вызвалены 12.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. З 22.12.1941 капелан 7-й пяхотнай дывізіі II корпуса арміі генерала **У. Андэрса.** У 1945 знаходзіўся ў Егіпце. З верас. 1947 у Велікабрытаніі. Рэзідэнт і пробашч у Мепале (*Mepal*, Кембрыдж), Нортвік Парку (*Northwick Park*, Стаф), Пенкросе (*Penhros*, Уэльс). Памёр у шпіталі ў Пэнлі (*Penley*, Дэнгбігс) пасля цяжкай працяглай хваробы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**СУХАРЭВІЧ Міхал Людвігавіч** [1906, Санкт-Пецярбург — 1.8.1961], святар. З польскай мяшчанскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем касцёла св. Станіслава ў мяст. Дамброва (*Dąbrowa*) аднайменнага дэканата, Польшча. У 1937 у парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Вільні. З 1938 пробашч касцёла Перамянення Пана ў в. Спас Вілейскага пав. і дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны капелан АК. Служыў у касцёле св. Дамініка ў мяст. Хатаевічы, цяпер в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай

вобл., і інш. Арыштаваны НКВД 14.5.1945. Асуджаны 12.6.1946 ваенным трыбуналам МУС тагачаснай Маладзечанскай вобл. за «антысавецкую агітацыю» да 4 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Больш за год зняволены ў Мінскай турме МДБ. Этапаваны ў Варкуцінскі лагер (каля 60 000 зняволеных) МДБ Комі АССР, куды прыбыў 24.10.1947. Вызвалены 4.5.1949. Прыехаў у в. Мосар Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл., дзе намаганнямі вернікаў атрымаў дазвол на душпастырскую дзейнасць у касцёле св. Ганны. Рэабілітаваны 31.3.1995.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Жертвы политического террора в СССР*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**СЯДЛЕЦКІ Януш Мар'янавіч** [1923, Вільня — ?], сакрысціянін. З сям'і службоўца. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Да арышту працаваў у касцёле ў Вільні. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны 5.11.1944. Асуджаны 25.7.1946 асобай нарадай за «ўдзел у польскай нацыяналістычнай арганізацыі АК» да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў адзін з лагераў Комі АССР. Вызвалены 22.9.1948. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.10.1994 пракуратурай Гродзенскай вобл. Асабовая справа С. № п-21470 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**СЯКЕРКА Уладзіслаў** [16.10.1909 — ?], ротмістр, капелан. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). З 1935 прэфект у Брэсце. Капелан 27-га палка ў Нясвіжы, цяпер райцэнтр Мінскай

вобл. Мабілізаваны як капелан у верас. 1939. Удзельнічаў у вераснёўскай вайсковай кампаніі. Арыштаваны немцамі. Этапаваны ў Яблонна (?). Вызвалены. У 1960-я (?) звярнуўся да Л. Брэжнева з просьбай аб дазволе пераехаць з Польшчы ў СССР, і яму дазволілі, хоць гэта было рэдкасцю, тым больш што С. не меў сваякоў у СССР. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*;

**СЯМАШКА Сігізмунд** [3.5.1888, мяст. Рось, цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. — 30.10.1963, Пэнлі (*Penley*), Вялікабрытанія], святар. Скончыў Маскоўскую гімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Служыў вікарыем у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл., потым у катэдральным касцёле Унебаўзяцця НПМ у Гомелі, парафіі ў Пінску. З 1914 вайсковы капелан касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Кастраме, Расія. З 1916 вікарый парафіі св. Сымона і Алены ў Мінску. Потым пробашч касцёла бернардзінцаў у мяст. Глуск Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., рэктар філіяльнага касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Анопаль Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н, капліцы ў мяст. Асіповічы, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З-за бальшавіцкага наступу пераехаў у Падляскую дыяцэзію. З 20.1.1920 да 5.10.1921 вікарый парафіі Сарнакі (*Sarnaki*), Польшча. Вярнуўся ў Мінскую дыяцэзію. З 1921 вікарый касцёла Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў в. Ракаў Мінскага пав. і губ., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Выехаў у Седлецкую дыяцэзію. З 8.2.1923 да 24.9.1923 вікарый парафіі Ласкажэў (*Łaskarzew*), Польшча. З 24.9.1923 да 1939 катэхет у Лукаве (*Łuków*), Польшча. У жн. 1939 выехаў у Вільню, дзе 15.6.1940 быў арыштаваны.

У чэрв. 1941 этапаваны ў Сцяпны лагер НКВД Казахскай ССР. Вызвалены ў студз. 1942 па амністыі для польскіх грамадзян. Капелан II корпусу арміі **У. Андэрса.** Служыў у Русапе, Паўднёвая Радэзія, капелан у Ныалі каля Момбасі. З верас. 1950 у Вялікабрытаніі.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**СЯМЁНАВА-ЗІМІНА Мальвіна Юзафаўна** [1896, в. Антонаўка Віцебскай губ. — ?], актыўная парафіянка касцёла св. Станіслава ў Ленінградзе. Арыштавана 8.5.1931 па справе «С. *Войны* і інш.». Вызвалена. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**СЯНКЕВІЧ Антоні Станіслававіч** [1891 — ?], святар. Скончыў духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1929). У 1929—36 служыў у філіяльным касцёле св. Губерта ў в. Бакшты, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1937 катэхет гімназіі ў Ваўкавыску, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны ў верас. 1939. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ТАКАРСКІ Ян Казіміравіч** [12.4.1900, в. Мехавіца (*Miechowica*) Дамброўскага пав. Кракаўскай губ., цяпер Польшча — 15.12.1974, Ракаў, Валожынскі р-н Мінскай вобл], святар. З сям'і каваля польскага паходжання. Скончыў сямігодку ў Ветрыхавіцах (*Wietrzychowicy*), Польшча. Уступіў у польскае войска, удзельнічаў у польска-савецкай вайне (1919). З 1925 вучыўся ў школе пры ордэне салезіянцаў у Дашэве (*Daszewo*), Асвенціме (*Oświęcim*), Польшча. Уступіў у навіцыят ордэна (1929). У 1930—32 вывучаў філасофію ў Кракаве (*Kraków*) і Маршалках (*Marszałki*), Польшча. У 1932—36 праходзіў педагагічную практыку пры ордэне ў Лютамерску (*Lutomiersk*), Польшча. У 1939 скончыў 3-гадовыя курсы тэалогіі пры ордэне салезіянцаў у Кракаве, у 1940 таемныя тэалагічныя курсы ў Вільні. Прыняў сакрамэнт святарства (16.3.1941). Прызначаны рэктарам капліцы ў мяст. Гарадзілава, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. (паводле іншых звестак, касцёла св. Юзафа ў мяст. Гарадзея Нясвіжскага пав. і дэканата, цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл.). Потым у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Дубрава таго ж р-на. З 1944 таксама абслугоўваў касцёл Маці Божай Ружанцовай і св. Дамініка ў в. Ракаў і касцёл св. Юрыя ў в. Пяршаі, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 16.6.1948. Асуджаны 8.10.1949 Маладзечанскім абл. судом за «антысавецкую агітацыю» да 25 (пазней заменены на 10) гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Мінеральны лагер МДБ Комі АССР (Асоблаг № 1; ст. Інта Пячорскай чыгункі). Таемна працягваў выконваць святарскія абавязкі. З-за хваробы вызвалены датэрмінова ў 1954. Вярнуўся ў Ракаў. Доўгі час не мог зарэгістравацца як «служыцель культу». Цэлебраваў св. імшу ў дамах вернікаў тайна. Пасля звароту да маскоўскага пракурора 9.3.1956 атрымаў дазвол на душпастырскую дзейнасць. Служыў у капліцы св. Ганны на Ракаўскіх могілках. Да 1959 абавязкі міністранта пры святары выконвала яго эканомка **Станкевіч Міхаліна**. У сваіх казаннях Т. не аднойчы крытыкаваў савецкую ўладу, за што

некалькі разоў пазбаўляўся права на душпастырскую працу. Рэабілітаваны 9.2.1993 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Т. № 35383-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 23; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; http://media.catholic.by; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Жертвы политического террора в СССР*; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ТАЛОЧКА Уладзіслаў** [псеўданім: Дрыгавіч; 6(18).2.1887, Гродна — 13.11.1942, Вільня], святар, гісторык, літаратурны крытык. З мяшчанскай сям'і. У 1896—1904 вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, з кастр. 1906 — у Віленскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). У 1909—14 вывучаў тэалогію і філасофію ў Каталіцкім ун-це ў Інсбруку, Аўстрыя. З 1915 служыў у касцёле св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста ў Вільні. З 1919 адміністратар парафіі св. Стэфана ў Вільні, кіраваў шпіталем пры мясцовым жаночым Камітэце Чырвонага Крыжа. Адным з першых пачаў выкарыстоўваць бел. мову ў набажэнствах. Супрацоўнічаў з літоўскімі культурнымі і рэлігійнымі выданнямі: «Draugija» (Коўна), «Vadovas» (Сейны). Публікаваў матэрыялы гістарычнай тэматыкі ў віленскім каталіцкім час. «Dwutygodnik Diecezjalny». Падтрымліваў выданне першай бел. каталіцкай газ. «Biełarus». У 1915 адзін з арганізатараў Віленскага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны і бел. дзіцячага прытулку «Золак». З 1916 катэхет першых бел. школ у Вільні і курсаў для непісьменных. Па пытаннях бел. культуры, гісторыі, рэлігіі шмат друкаваўся ў газ. «Homan» (1916—18). Удзельнік Беларускага з'езда Віленшчыны і Гродзеншчыны (25—27.1.1918). Уваходзіў у склад Літоўскай Тарыбы. З 1917 член нацыянальна-рэлігійнай арганізацыі «Хрысціянская дэмакратычная злучнасць», рэгулярна выступаў у яе друкаваным органе газ. «Krynica». Супрацоўнічаў з нямецкім, італьянскім, літоўскім, украінскім,

польскім друкам. За адстойванне ідэй экуменізму празваны «Усходнім агенцтвам». Адзін з вядучых аўтараў час. «Przegląd Wileński». З 1920-х праследаваўся польскімі свецкімі і духоўнымі ўладамі. 15.12.1938 загадам віленскага ваяводы выселены з Вільні. Жыў у Беластоку. На пачатку 2-й сусветнай вайны вярнуўся ў Вільню. Служыў у касцёле Унебаўзяцця НПМ і кляштары дамініканцаў у Аглоне, цяпер Латвія. Пахаваны на віленскіх могілках Роса.

Тв.: Багушэвіч і Арэшчыха // *Запісы БНТ*. Сш. 1. Вільня, 1938; *Беларуская думка XX ст.* Мн., 1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; ЭГБ*, т. 6—1; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ТАМАШЭЎСКІ Вітольд Адольфавіч** [1880, фальварак Трылетка Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер тэрыторыя Капыльскага (?) р-на Мінскай вобл. (фальварак не існуе) — пасля 1936], святар. З бел. шляхецкай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1904) і акадэмію (1906) у Санкт-Пецярбургу са ступенню кандыдата тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1904). У 1906 пробашч і катэхет парафіі св. Ганны ў в. Анопаль Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н. У 1907 вікарый катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. З 1909 адміністратар касцёла Маці Божай Міласэрнай у мяст. Беразіно Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл., дэкан Бярэзінскага дэканата. З 1912 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Ігумене Мінскай губ., цяпер райцэнтр Чэрвень Мінскай вобл. У 1917 пераведзены ў касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ у Пермі, Расія. З 1919 адміністратар парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Быхаве Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З сярэдзіны 1920-х таксама абслугоўваў філіяльны касцёл НПМ у в. Грыбавец, цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. У 1930-я зноў служыў у Беразіне. Цэлебраваў набажэнствы ў плябаніі (драўляны

касцёл з паловай мястэчка згарэў у 1914). Арыштаваны 22.6.1936. Перавезены ў мінскую турму НКВД. Асуджаны 28.9.1936 з парафіянамі **Аношкам Вацлавам Гвідонавічам** (н. у 1897) і яго братам **Аношкам Віктарам Гвідонавічам** (1904), **Бранавіцкім Юзафам Янавічам** (1907), **Гурэцкай Гэленай Адамаўнай** (1893), **Доўнарам Антонам Ігнатавічам** (1894), **Крыцкім Мечыславам Фёдаравічам** (1878), **Пятровіч Аленай Адамаўнай** (1911), **Пятровічам Іпалітам Юзафавічам** (1896), **Пятровічам Карлам Альфонсавічам** (1902), **Пятровічам Мікалаем Аляксандравічам** (1904), **Пятровічам Міхаілам Адамавічам** (1895), **Пятровічам Юльянам Васілевічам** (1883), **Сайкоўскім Казімірам Канстанцінавічам** (1899), **Тоўсцікам Аляксандрам Савічам** (1877) паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Верагодна, загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 19.12.1961 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Групавая справа Т. і інш. № 17574-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; http://www.berezino.net/Romancatholic.html*

**ТАМАШЭЎСКІ Міхал Юр'евіч** [6.4.1876 ці 1880 — 19.2.1934, Пінск], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1904 або 1906). Прызначаны вікарыем касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. У 1908 пробашч парафіі Божага Цела ў мяст. Давыд-Гарадок, цяпер горад Столінскага р-на Брэсцкай вобл. З 1909 капелан пры касцёле Унебаўзяцця НПМ у Курску, Расія. У 1912 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Прыдруйск Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Піедруя, Латвія. З 1913 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Антушы Рагачоўскага

пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. У 1914 у касцёле св. Казіміра ў Магілёве. З 1915 душпастыр парафіі св. Мікалая ў г. Луга Петраградскага дэканата, цяпер Ленінградская вобл., Расія. Пасля аднаўлення ў 1917 Мінскай дыяцэзіі працаваў на яе тэрыторыі. У 1919 рэктар капліцы ў фальварку Халяўшчына Мінскага пав., цяпер тэрыторыя Мінскага р-на (фальварак не існуе). З 1920 пробашч касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Мінску. Арыштаваны ў маі 1922 і асуджаны рэвалюцыйным трыбуналам БССР з А. *Лісоўскім*, Я. *Васілеўскім* і групай парафіян за супраціў канфіскацыі касцёльнай маёмасці. Старшыня трыбунала Мар'ян Стакоўскі і члены Ян Кеппе, Адам Славінскі, Ян Шашкевіч, абвінаваўцы Юліян Ляшчынскі і Станіслаў Пясткоўскі былі польскімі камуністамі. Працэс адбываўся на польскай мове. Асуджаны да 4 гадоў зняволення. Утрымліваўся ў маскоўскай турме «Бутыркі». Вызвалены 28.4.1924 праз абмен вязняў паміж Польшчай і СССР. Выехаў у Польшчу. З 1926 рэктар філіяльнага касцёла ў Орлі (*Orla*) парафіі Бельск Падляскі (*Bielsk Podlaski)* Пінскай дыяцэзіі. З 1928 член і сакратар Дыяцэзіяльнай рады, натарыус біскупскага суда ў Пінску. З 1929 у парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў мяст. Морач, цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; З асабістага архіва У.Васькова.*

**ТАМКОВІЧ Алаізі Паўлавіч** [1910, в. Асавок Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. — 6.12.2001], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў гімназію ва Уладзіміры-Валынскім, цяпер Украіна (1933), духоўную семінарыю і ун-т імя Стэфана Баторыя ў Вільні (1939). Прыняў сакрамэнт святарства (1939). Прызначаны вікарыем, потым пробашчам парафіі св. Станіслава ў

мяст. Дамброва (*Dąbrowa*) аднайменнага дэканата, цяпер Польшча. У крас. 1940 пераведзены ў касцёл Перамянення Пана ў в. Сідэрка (*Siderka*) таго ж дэканата. З другой паловы 1941 вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Адэльск, цяпер Гродзенскі р-н. З пачатку снеж. 1944 пробашч касцёла Маці Божай Ружанцовай у в. Пескі Ваўкавыскага дэканата і пав., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. З верас. 1946 пробашч парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў в. Макараўцы, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. З 1948 абслугоўваў і касцёл Звеставання НПМ у мяст. Вялікая Бераставіца Бераставіцкага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Арыштаваны 31.3.1951. Асуджаны 11.8.1951 асобай нарадай МДБ як «член антысавецкай арганізацыі» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Дубраўны лагер МДБ Молатаўскай (цяпер Пермскай) вобл. (п/с АМ 244/2-3). Вызвалены 11.8.1956. З 25.9.1956 зноў служыў у парафіі ў в. Макараўцы. З 1973 пробашч касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў райцэнтры Астравец Гродзенскай вобл. Штогод Т. вянчаў і хрысціў каля 400 чалавек. У 1976 на свята Божага Цела ў Астраўцы ў працэсіі вернікаў прынялі ўдзел каля тысячы дзяцей і моладзі. Рэабілітаваны 30.6.1993 пракуратурай Гродзенскай вобл. Асабовая справа Т. № п-18656 захоўваецца з фотаздымкам у архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 103; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS;* Rocznik informacyjny Grodzenskiej diecezij. 2005; *Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ТАМКОВІЧ Казімір Казіміравіч** [1910, в. Юзафова Віленскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — 3.4.1984], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў

сакрамэнт святарства (1938). У 1939 вікарый парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Тургелі, Літва. Падчас 2-й сусветнай вайны вікарый касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Опса Браслаўскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., капелан АК. Арыштаваны МДБ у 1948. Асуджаны ў 1949 за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ (пазней тэрмін зменшаны да 10 гадоў) і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны, верагодна, у Нарыльскі лагер МДБ Краснаярскага краю. Вызвалены датэрмінова ў 1955. Вярнуўся на радзіму. Атрымаў рэгістрацыю і служыў пробашчам касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Ваўкалата, цяпер вёска Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Рэабілітаваны.

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ТАППЕР Мікалай Пятровіч** [1913, в. Эйшышкі, цяпер Літва — 17.8.1945, Вільня, турма НКВД], святар. Скончыў Віленскую гімназію (1932), Віленскую духоўную семінарыю, тэалагічны ф-т ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1938). Прызначаны вікарыем і катэхетам парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Празарокі Глыбоцкага дэканата, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. З ліп. 1939 катэхет у Вільні. У 1940 у касцёле Унебаўзяцця НПМ у в. Мейшагола Кальварыйскага дэканата, цяпер Літва. З 1941 вікарый парафіі Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі Радуньскага дэканата, Літва. Паводле некаторых звестак, таксама абслугоўваў касцёла Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл., капелан АК. Арыштаваны МДБ 25.12.1944. Асуджаны 18.8.1945 ваенным трыбуналам Літоўскай ССР да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 5.12.1990.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski,*

*Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ТВАРОЎСКІ Антоні Людвігавіч** [1903, в. Бжэзніца (*Brzeźnica*), Польшча — 18/19.9.1939], святар. З польскай сялянскай сям'і. Вучыўся ў гімназіі ў Бельску Падляскім (*Bielsk Podlaski*), скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1929). Прызначаны вікарыем і прэфектам парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзятлава Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У 1930 пераведзены ў касцёл св. Вацлава ў мяст. Ваўкавыск, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У 1931 у парафіі Божага Провіду ў в. Кужніца (*Kuźnica*) Сакольскага дэканата, цяпер Польшча. У студз.-верас. 1932 служыў у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Забалаць Лідскага пав. Васілішскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл., касцёле Божага Цела і св. Мучаніка Юрыя ў в. Крамяніца, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл. З 9.9.1932 адміністратар парафіі Перамянення Пана ў в. Юрацішкі Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл., дзе пабудаваў касцёл, асвечаны 9.6.1938 (спалены падчас 2-й сусветнай вайны). Мабілізаваны як капелан у жн. 1939 у 77-ы Лідскі пяхотны полк. 18.9.1939 выехаў у Юрацішкі, але па дарозе (каля Ліпнішак, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл) схоплены бальшавіцкімі актывістамі і забіты са студэнтам Віленскай духоўнай семінарыі Марчыкам. Пахаваны ў Ліпнішках. 12.5.2000 перапахаваны ў Юрацішках.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ТРОЙГА Ян Янавіч** [12.12.1881, Раманаўская вол. Сакольскага пав. Гродзенскай губ. — 11.9.1932, ГУЛАГ], святар. Скончыў Гродзенскую гімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю (1906) і мітрапалітную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі (1908). Прыняў сакрамэнт святарства (1906). З 1908 прэфект школы ў Магілёве. У 1910 пераведзены на пасаду выкладчыка духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. У 1914 прызначаны адміністратарам Магілёўскай мітрапалітнай курыі ў Петраградзе. У 1916—17 катэхет жаночых гімназій (Аляксандраўскай, Кацярынінскай, Марыінскай і Лазарэвіча). Член Адміністрацыйнага Савета і Біскупскага суда, рэдактар выдання «Życie Kościelne. Pismo Dwutygodniowe Duchowieństwa Mohylewskiego i Mińskiego», ганаровы канонік Магілёўскай архідыяцэзіі. Арыштаваны ў сак. 1923. Асуджаны з арцыбіскупам Я. *Цеплякам* і 13 святарамі Петраграда на судовым працэсе ў Маскве 21—26.3.1923 па групавой справе каталіцкага духавенства да 3 гадоў турэмнага зняволення. Зняволены ў Сакольніцкім ізалятары Масквы. Вызвалены ў канцы 1924. Вярнуўся ў Ленінград, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Служыў пробашчам касцёла св. Станіслава, Унебаўзяцця НПМ. Зноў арыштаваны 1.2(ці 15.1).1927 са святарамі А. *Васілеўскім*[1],

---

[1] **Васілеўскі Антоні Міхайлавіч** [13.9.1868, Люблін (*Lublin*), Польшча — 1930, Шахрысабз, Узбекская ССР], святар. Да 7 гадоў жыў з бацькамі ў Варшаве, потым у Расіі. Скончыў гімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю, духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1889). Прызначаны пробашчам парафіі св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу, з верас. 1889 вікарый, з 1905 пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Маскве. Заснаваў парафіяльны прытулак для дзяцей з польскіх сем'яў. На працягу 19 гадоў катэхет у школах для польскіх чыгуначнікаў у Маскве. У 1911 пасля вобыску ў кватэры святара абвінавацілі ў тым, што «ў яго прытулку Меса служылася без дазволу, у парафіі знаходзіліся незарэгістраваныя манахі і манахіні, падчас богаслужэння не спяваліся малітвы за цара». Прытулак быў зачынены, а В. вызвалены ад пасады. З крас. па чэрв. 1912 вікарый катэдральнага касцёла ў Санкт-Пецярбургу, пасля капелан прытулку для дзяўчынак ордэна францішканак, катэхет навучальных устаноў. Ганаровы канонік. З 1918 пробашч новастворанай парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ, духоўнік нелегальнай семінарыі ў Санкт-

Д. *Івановым-Сталбінскім*, П. *Хомічам*. Прыгавораны калегіяй АДПУ да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., куды прыбыў 30.7.1927. У чэрв. 1929 пераведзены на востраў Анзер. У 1932 арыштаваны ў лагеры з шэрагам каталіцкіх святароў за «антысавецкую агітацыю сярод зняволеных» і інш. 5.7.1932 перавезены ў Ленінградскую турму. На допытах звар'яцеў. Памёр ад кровазліцця ў мозг. Пахаваны на Праабражэнскіх могілках пад прозвішчам Самохін Пётр Сямёнавіч.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей.*

**ТРУМП Аляксандр Францавіч** [1880, Сталовіцкая вол. Наваградскага пав. Мінскай губ. — ?], актыўны парафіянін. Працаваў слесарам на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» у Сталінградзе (Валгаградзе). Арыштаваны ў 1930 па групавой справе «нямецкіх католікаў». 18.3.1930 вызвалены пад падпіску аб нявыездзе. Далейшы лёс невядомы.

---

Пецярбургу. 29.4.1919 арыштаваны, неўзабаве вызвалены. У сак. 1923 зноў арыштаваны. Праходзіў па групавой справе каталіцкага духавенства на чале з Я. *Цеплякам*. 21—26.3.1923 на судовым пасяджэнні асуджаны да 3 гадоў зняволення. Этапаваны ў Сакольніцкую, потым у Лефортаўскую турму. Вызвалены 24.1.1925. Вярнуўся ў Ленінград. З лют. 1925 пробашч парафіі св. Баніфацыя, з крас. 1925 касцёла св. Кацярыны, з 1926 рэктар падпольнай духоўнай семінарыі. 13.1.1927 у чарговы раз арыштаваны. Абвінавачаны ў «стварэнні і кіраўніцтве нелегальным кляштарам і арганізацыі на сваёй кватэры духоўнай семінарыі». 18.6.1927 прыгавораны да 5 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 29.8.1927 зняволенне ў лагеры заменена на ссылку ў Сярэднюю Азію (Бек-Будзі). У кастр. 1929 пераведзены ў Шахрысабз Узбекскай ССР. 25.3.1930 Польскі Чырвоны Крыж атрымаў паведамленне аб яго смерці ў ссылцы.

*Кр.:* Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ТРУСКОЎСКІ Стэфан** [2.9.1896—1.3.1959], святар. Вучыўся падпольна ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Петраградзе. Тайна прыняў сакрамэнт святарства з рук арцыбіскупа Я. *Цепляка* (1921). Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. Арыштаваны ў 1922. Абвінавачваўся ў супраціве канфіскацыі касцёльнай маёмасці. Асуджаны да 5 гадоў ППЛ. Вывезены ў Бутырскую турму Масквы. Вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. 28.4.1924 выехаў з СССР. Служыў пробашчам касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Нягневічы Наваградскага пав. і дэканата, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. У 1928—31 вікарый і катэхет парафіі св. Міхала Арханёла ў Навагрудку, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Паралельна служыў у парафіі Божага Цела ў мяст. Нясвіж аднайменнага пав. і дэканата, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1931 в. а. пробашча парафіі Унебаўзяцця НПМ ў в. Любін Касцельны (*Lubin Koscielny*) Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Литургический календарь; Dzwonkowski R. Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR, 1917—1939; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ТРЫГУБОВІЧ Генрых Вікенцевіч** [1885, ст. Міханавічы Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — ?], актыўны парафіянін. З бел рабочай сям'і. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Да арышту сакрыстый катэдральнага касцёла Імя НПМ у Мінску. Арыштаваны 20.12.1944 у Мінску па адрасе: 1-ы Тарасаўскі зав., д. 16, кв. 1. Асуджаны 21.11.1945 асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Абанскі р-н Краснаярскага края. Вызвалены 20.12.1949. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны

17.11.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Т. № 29107-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

**ТУРУК Аляксандр Іванавіч** [?, в. Якімавічы Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. — лета 1943, в. Якімавічы], грамадскі і рэлігійны дзеяч. У 1930-я стварыў бел. хор у роднай вёсцы. Прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці грэка-каталіцкай парафіі ў пас. Альбярцін Слонімскага пав., цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл., быў рэгентам царкоўнага хору. Расстраляны з сям'ёй савецкімі партызанамі.

Кр.: *Ёрш С.* Што яны выраблялі! // *Газета Слонімская.* 1997. 1—7 жн.

**ТУЦІНАС Ян** [23.8.1897, в. Трумбацішкі, Літва — 22.6.1941], святар. Вучыўся ў гарадской школе ва Уцяне, Літва, якую не скончыў з-за пачатку 1-й сусветнай вайны. З-за набліжэння нямецкага войска выехаў у глыб Расіі. У Варонежы скончыў чатырохкласную гарадскую школу. З мая 1916 па 15.2.1918 у расійскім войску. 9.7.1918 вярнуўся на радзіму. У верас. 1919 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (11.8.1928). Прызначаны вікарыем парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Дзятлава аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. У 1929 пераведзены ў касцёл Унебаўзяцця Пана ў в. Эйшышкі, Літва. З 1931 пробашч парафіі св. Ліна ў в. Пеляса, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Пабудаваў там каменны касцёл (асвечаны 23.9.1935). У 1937 пераведзены ў Літву, служыў пробашчам касцёла ў в. Паламене. У чэрв. 1941 з касцёльнымі супрацоўнікамі забіты НКВД.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**УДАЛЬСКІ Антоні** [1889—1943], святар. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1913). З 1914 вікарый парафіі Адшукання Св. Крыжа (бернардзінцаў) у Гродне. З 1920 пробашч касцёла св. Юзафа і НПМ у мяст. Валожын, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. На працягу 10 гадоў быў таксама дэканам Вішнеўскага дэканата. У верас. 1941 пераехаў у парафію Вялікія Салечнікі. Забіты немцамі за дапамогу яўрэям найверагодней у верас. 1943.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis;Synodus archidioecesana vilnensis*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**УЛІНСКІ Францішак** [1873—13.7.1942, Баранавічы, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл.], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1896). Паводле некаторых звестак, у 1900-я вікарый касцёла Найсвяцейшай Тройцы і Унебаўзяцця НПМ у мяст. Слуцк, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1906—10 адміністратар касцёла св. Юрыя ў в. Пяршаі, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. У 1910—15 пробашч касцёла св. Казіміра ў в. Уселюб, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. З 1922 в. а. пробашча касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Навасады Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н. З 1928 пробашч парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст. Лагішын Пінскага пав. і дэканата, цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. З 1933 пробашч касцёла св. Станіслава ў мяст. Няміраў (*Niemirów*) Бельска-Падляскага пав. Драгічынскага дэканата, цяпер Польшча. Паводле некаторых звестак, таксама служыў адміністратарам касцёла ў в. Макееўшчына Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны немцамі 29.6.1942. Расстраляны. Пахаваны на праваслаўных могілках у Баранавічах.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Spis kościołów*

*i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**УРБАНОВІЧ Ян** [23.6.1895 — чэрв. 1943, Брэст], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1919). З 1923 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Кобрыне, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. У 1930-я працаваў у дыяцэзіяльнай курыі і ў біскупскім судзе ў Пінску. З 1938 пробашч касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Брэсце, брэсцкі дэкан. Арыштаваны фашыстамі за дапамогу яўрэям і партызанам. Расстраляны.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**УРУБЛЕЎСКІ Франц Вікенцевіч** [1904, мяст. Друя Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. — ?], арганіст. З бел. сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Да арышту працаваў у касцёле ў в. Новы Пагост, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 9.3.1940. Асуджаны 21.6.1941 асобай нарадай НКВД як «сацыяльна небяспечны элемент» да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў адзін з лагераў НКВД Омскай вобл. Вызвалены 30.8.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 6.11.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа В. № 22793-п захоўваецца ў архіве УКГБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

**УСАС Браніслаў-Мяфодый Матэвушавіч** [30.6.1885, Санкт-Пецярбург — 6.12.1977, Варшава], святар. Скончыў гімназію, 2 курсы Санкт-Пецярбургскага ун-та, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Супрацоўнічаў з час.

«Вера и жизнь», «Слово Истины». Прыняў сакрамэнт святарства (1917). У лют. 1917 накіраваны ў Мінск для дапамогі польскім бежанцам. Прафесар і аканом духоўнай семінарыі ў Мінску, рэктар дамініканскага касцёла св. Томаша Аквінскага, мінскі дэкан. У ліп. 1917 дэлегат з'езда бел. каталіцкага духавенства. Арыштаваны 5.5.1919 за «супраціў канфіскацыі царкоўнай маёмасці». Асуджаны да турэмнага зняволення да канца грамадзянскай вайны. Вывезены ў Смаленск, потым у Віцебск, Дзвінск Віцебскай губ., цяпер Даўгаўпілс, Літва, Навааляксандраўск Ковенскай губ., цяпер Літва. Вызвалены 9.7.1919 праз абмен вязнямі паміж РСФСР і Літвой. Выехаў у Літву, затым у Польшчу, пазней вярнуўся ў Мінск. 10.7.1920 зноў выязджаў у Польшчу і вярнуўся ў Мінск. У лют. 1922 удзельнічаў у тайнай перадачы каштоўнасцяў Кацярынінскага касцёла ў Петраградзе ў польскае консульства. У ліст. 1924 зноў арыштаваны. Асуджаны 15.4.1925 да 6 гадоў ППЛ. Вывезены да мяжы для абмену на двух савецкіх агентаў, але абмен не адбыўся: жандар, былы вязень сталінскіх лагераў, забіў агентаў. Падчас вяртання ў турму святару ўдалося ўцячы з Мінскага чыгуначнага вакзала і схавацца ў польскім консульстве. Гэтыя падзеі выклікалі міжнародны скандал, і У. быў прымушаны здацца савецкім уладам. Зняволены ў маскоўскай турме «Лубянка». 10.2.1926 вызвалены, выехаў у Польшчу. З 1927 пробашч касцёла св. Аляксандра ў Варшаве. У 1930 выехаў у Львоў, дзе стаў архіварыусам Грэка-каталіцкай Царквы. У 1935 вярнуўся ў Варшаву. Служыў капеланам у доме сясцёр Беззаганнага Зачацця НПМ, капеланам у інфекцыйнай бальніцы. З 1957 бясплатна працаваў у будаўнічым кааператыве. Свой багаты архіў перадаў Каталіцкаму ун-ту ў Любліне.

Кр.: *Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ФЁДАРАЎ Леанід Іванавіч** [4.11.1879, Санкт-Пецярбург — 7.3(ці 5).1935 (або 1934), Вятка, Расія], святар. З сям'і рускага рабочага. Скончыў класічную гімназію, Магілёўскую духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу (1902), Папскую езуіцкую калегію ў Анан'і (каля Рыма), Фрэйбургскі ун-т (Швейцарыя). З 1909 прафесар Львоўскай духоўнай семінарыі. Прыняў сакрамэнт святарства ўсходняга абраду (25.3.1911, Стамбул), законныя шлюбы з імем Лявонцій. З 1912 жыў у Босніі ў кляштары студытаў. У 1914 вярнуўся ў Санкт-Пецярбург (Петраград). Арыштаваны і высланы ў Табольск, цяпер Цюменскай вобл. Вызвалены ў 1916, вярнуўся ў Петраград. Служыў пробашчам касцёла Спаслання Святога Духа (1917—22), парафіі св. Кацярыны Александрыйскай, быў дэканам парафіі. У 1917 Мітрапалітам **Андрэем Шаптыцкім** прызначаны і ў лют. 1921 Папам Рымскім **Бенедыктам XV** зацверджаны экзархам Рускай Каталіцкай Царквы ўсходняга абраду. Арыштаваны 21.10.1922 за «супраціў канфіскацыі касцёльнай маёмасці», але праз некалькі гадзін вызвалены. Зноў арыштаваны ў лют. 1923. Праходзіў па групавой справе каталіцкага духавенства. На працэсе ў Маскве 21—25.3.1923 пастановай ваеннага трыбунала асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Зняволены ў Лефортаўскай і Сакольніцкай турмах Масквы. Вызвалены па амністыі ў крас. 1926 з забаронай жыць у буйных гарадах. Жыў у Калузе па адрасе: праспект Дарвіна, д. 3. У чарговы раз арыштаваны 10.2.1926 у Магілёве. Зняволены ў Лубянскай турме Масквы. Прыгавораны калегіяй АДПУ 18.9.1926 за тое, што «падчас богаслужэння казаў пропаведзь антысавецкага характару», да 3 гадоў ППЛ. 26.9.1926 этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., потым пераведзены ў Пінегу Архангельскай вобл., Котлас Комі АССР. Пасля сканчэння тэрміну 12.7.1929 пастановай калегіі АДПУ высланы на 3 гады ў Архангельскую вобл. У пачатку 1931 зноў арыштаваны і восенню 1931 высланы на 3 гады ў Котлас Комі АССР. Вызвалены ў канцы 1933 зноў з забаронай жыць у буйных гарадах. Пасяліўся ў г. Вятка, дзе і памёр. Рэабілітаваны пракуратурай Беларусі 22.5.1992. Асабовая справа ф. № 33953-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ*, *ІКР; БНДЦЭД*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ФЕДАРОВІЧ Браніслаў** [3.10.1901—19.9.1939], святар. Скончыў духоўную семінарыю ў Луцку, цяпер Валынская вобл., Украіна. Прыняў сакрамэнт святарства (1927). Прызначаны вікарыем касцёла ў в. Коржэц, цяпер Украіна. У 1931—32 пробашч парафіі ў мяст. Вялікая Глуша, цяпер Валынская вобл. У 1933 вікарый касцёла ў Любомлі, Украіна. У 1934 у Олацкім калегіяце. У 1935—36 у парафіі ў в. Вішэнкі, Украіна. З 23.5.1936 вікарый касцёла Нараджэння НПМ у мяст. Відзы, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 2.9.1936 вікарый парафіі св. Мучаніка Юрыя ў в. Варняны, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. 12.8.1937 прызначаны вікарыем касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Вільні. З 10.8.1938 адміністратар касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Скрундзі Дзятлаўскага дэканата, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. Забіты з арганістам каля Століна (цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл.) членамі мясцовай прасавецкай групоўкі.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ФІЛЕК Эразм (Якуб) Юзафавіч** [20.2.1907, в. Барвалд Срэдні (*Barwałd Średni*), Польшча — 23/24.5.1976], кармеліт. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў гімназію ў Вадовіцах (*Wadowice*), Польшча. Уступіў у ордэн кармелітаў босых (28.8.1925). Вывучаў філасофію і тэалогію ў Кракаве і

Вадавіцах. Прыняў сакрамэнт святарства (19.6.1932). Служыў у Віленскім кляштары кармелітаў босых (касцёл св. Тэрэзы). З 1938 законнік кляштара кармелітаў босых у мяст. Стары Мядзел, цяпер райцэнтр Мядзел Мінскай вобл. Арыштаваны 22.7.1949. Асуджаны 16.11.1949 за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Карагандзінскі лагер МДБ Казахскай ССР (ст. Новарудная), 8.12.1950 пераведзены ў Экібастуз Казахскай ССР. Вызвалены 1.5.1955. Вярнуўся ў Мядзел. У чэрв. 1956 з-за пагрозы арышту выехаў у Польшчу. З 1960 законнік кляштара ў Клюшкоўцах (*Kluszkowce*), Польшча. Рэабілітаваны 11.1.1993 Вярхоўным судом Беларусі. Асабовая справа Ф. № 35364-с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Praśkiewicz S. Wierni Chrystusowi i Kościołowi.*

**ФІЛІП Адольф Готлібавіч** [5.1.1885 ці 1886, маёнтак Забалацце Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. (паводле іншых звестак, с. Качубей каля Адэсы, Украіна) — 1937(?)], святар. З бел. мяшчанскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Прызначаны вікарыем парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Палтаве, цяпер Украіна. У 1911 пераведзены ў філіяльны касцёл Унебаўзяцця НПМ у мяст. Лунінец Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. У 1912—15 адміністратар касцёла св. Мікалая ў г. Луга, цяпер Ленінградская вобл., Расія. У 1923 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Асвея і філіяльнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў в. Замошша Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. З 1924 служыў у касцёле Маці Божай Ружанцовай у Полацку Віцебскай вобл., парафіі св. Юзафа

ў в. Гарбачова Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Расонскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 10.1.1927. Асуджаны 10.6.1927 (з вартаўніком касцёла Ю. *Цывінскім* і парафіянінам **Люцыянам Вянцковічам** (н. у 1883) асобай нарадай пры АДПУ за «шпіянаж і сувязь з польскімі разведорганамі» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Карэльскай АССР. Вызвалены ў студз. 1937. Служыў пробашчам касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. Зноў арыштаваны ў жн. 1937. Верагодна, асуджаны да ВМП і расстраляны. Рэабілітаваны 29.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ф. № 22051-п захоўваецца з фотаздымкам у архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ФРАНЦКЕВІЧ Юзаф Янавіч** [24.3.1912, в. Ельніца (*Jelnica*), Польшча — 13.5.1985, Глыбокае, райцэнтр Віцебскай вобл.], марыянін. З польскай сялянскай сям'і. У 1928 прыняты ў трэці гімназіяльны клас ніжэйшай семінарыі марыянаў у Скурцы (*Skórżec*), Польшча. Пасля заканчэння чацвёртага класа 14.8.1930 пачаў навіцыят у Расне. 15.8.1931 склаў першыя законныя шлюбы. Пасля вярнуўся ў Скурэц, каб закончыць пяты клас. 31.8.1932 прыняты ў шосты клас марыянскай гімназіі ў Бялянах (*Bielany*) пад Варшавай. Пасля заканчэння восьмага класа ў чэрв. 1935 здаў экзамен на сталасць. 15.8.1935 склаў вечныя законныя шлюбы. Скончыў гімназію (1935), вучыўся ў Варшаўскай (1935—38), Віленскай (1938—39), Каўнаскай (1939—41) духоўных семінарыях. Прыняў сакрамэнт святарства (26.1.1941). Прызначаны пробашчам парафіі св. Міхала Арханёла ў в. Нецеч Лідскага дэканата, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл., капелан АК.

З 24.8.1944 у касцёле Божага Цела ў в. Іказнь Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. У жн. 1949 перайшоў на нелегальнае становішча. Арыштаваны 18.10.1950 у в. Казакова Мёрскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 30.12.1950 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вывезены ў Аршанскую турму, дзе знаходзіўся ў камеры смяротнікаў. Увесну 1951 этапаваны ў адзін з лагераў Хабараўскага краю. З 16.7.1951 у лагеры Певек. Выжыў дзякуючы веданню лацінскай мовы і адпаведна прызначэнню кіраўніком клінічнай лабараторыі лагера. Патаемна рабіў богаслужэнні сярод зняволеных. Вызвалены 16.8.1956 датэрмінова са зняццем судзімасці. 10.4.1957 зарэгістраваны пробашчам касцёла св. Станіслава ў в. Далёкія, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 7.11.1959 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Глыбокім. Рэабілітаваны 8.5.1992 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Ф. № 22974-п з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 7, л. 30; *БНДЦЭД; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

**ФРАНЦУК Ян Станіслававіч** [1.6.1891, мяст. Ашмяны Віленскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — пасля 1948], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і мітрапалітную духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (1915). Прызначаны вікарыем касцёла св. Антонія Падуанскага ў Віцебску, паралельна катэхет каталіцкай польскай школы. Арыштаваны 4.5.1920. Асуджаны калегіяй асобага аддзела Зах. фронту 27.8.1920 як «удзельнік польскай шпіёнскай арганізацыі» да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Смаленскі паліт. ізалятар ЧК, потым у Маскву, Нова-Пяскоўскі лагер ЧК. Вызвалены ў лют. 1921 па

хадайніцтве Чырвонага Крыжа. Выехаў у Польшчу (1922). З 1925 катэхет школ у Варшаве. З 1948 адміністратар духоўнай семінарыі Варшаўскай дыяцэзіі. Рэабілітаваны пракуратурай Беларусі 15.2.1993. Асабовая справа Ф. № 22934-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР*; *БНДЦЭД; Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ХАДЫКА Станіслаў Юзафавіч** [1893, в. Такары Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. — 18.8.1978], святар. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую гімназію (1911), Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1918). Прызначаны вікарыем парафіі Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь аднайменнага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл., касцёла св. Апосталаў Філіпа і Якуба ў Вільні. Пасля 1920 в. а. адміністратара, з 1923 адміністратар касцёла Унебаўзяцця НПМ і св. Андрэя Баболі ў в. Казловічы Гродзенскай пар. і дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. З 1932 пробашч парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Гервяты Варнянскага дэканата, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны ўдзельнічаў у беларусізацыі Касцёла. Пасля вайны заставаўся ў Гервятах. Арыштаваны 12.10.1950. Асуджаны 4.1.1951 Маладзечанскім абл. судом за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены 13.5.1956. Вярнуўся на старое месца службы. Служыў тыдзень па-польску, тыдзень па-літоўску, бо ў Гервятах жылі і палякі, і літоўцы. У пасляваенныя гады на тэрыторыі БССР гэта быў апошні святар, які ведаў літоўскую мову. Рэабілітаваны 22.9.1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 91; *БНДЦЭД; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ХАЙНАЦКІ Стэфан (Марцін) Людвігавіч** [1.9.1915, Ракуў (*Raków*), Польшча — 18.10.1973], марыянін. Пасля заканчэння ў Аляксандраве Куяўскім (*Aleksandrów Kujawski*) гімназіі салезіянаў (1933) паступіў у духоўную семінарыю ва Улацлаўку (*Włocławek*), Польшча. Праз 2 гады пакінуў вучобу і яшчэ праз год уступіў у ордэн айцоў марыянаў. Склаў першыя законныя

шлюбы (8.9.1937). Працягваў вучобу на курсах філасофіі ў Варшаўскай духоўнай семінарыі. З кастр. 1938 студэнт ф-та тэалогіі ун-та імя Стэфана Баторыя ў Вільні. Пасля закрыцця ун-та літоўскімі ўладамі 15.12.1939 з групай марыянскіх клерыкаў выехаў для працягу вучобы ў Коўна (цяпер Каўнас, Літва). Арыштаваны 15.6.1941. Вывезены ў Старабельск, цяпер Смаленскай вобл., Расія. Пазней этапаваны ў Паўночна-Уральскі лагер НКВД Свярдлоўскай вобл. Вызвалены восенню 1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Служыў у ІІ корпусе арміі генерала **У. Андэрса.** Вызвалены з войска па просьбе біскупа **Ю. Гаўліны** для заканчэння тэалагічнай вучобы. Скончыў каталіцкі ун-т св. Юзафа ў Бейруце, прыняў сакрамэнт святарства (29.6.1944). З 1.11.1944 капелан юнацкіх школ польскага войска ў Паўдн. Палесціне. Пасля пераводу ваенных навучальных устаноў у Вялікабрытанію звольніўся з арміі. На працягу 1947 вучыўся ў Рыме. 8.6.1948 прызначаны пробашчам палякаў у Авелянедзе (Аргенціна). З 1952 у марыянскіх асяродках ЗША (Стокбрыдж, Дэтройт). З 1961 у Вялікабрытаніі. З 1971 зноў у ЗША, дзе служыў у Дэтройце, потым у Вашынгтоне. Увосень 1973 прыехаў у Польшчу як капелан пілігрымкі. Раптоўна памёр ад інфаркту.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ХАЛКО (ГАЛКО, ГАЛКА)** *(Hałko)* **Станіслаў** [24.12.1885, в. Міжаны Ашмянскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. — 1943, Асвенцім (*Oświęcim*), Польшча], святар. Скончыў рускую школу ў Вільні, паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (22.6.1908, Коўна). З восені 1908 ва ун-це ў Інсбруку, Аўстрыя. Праз год пераехаў у Фрыбург, Швейцарыя, дзе вывучаў гісторыю і напісаў доктарскую працу (надрукавана ў 1914). З 1913 дырэктар гімназіі пры фарным касцёле Унебаўзяцця НПМ у Беластоку (*Białystok*), Польшча. Пасля захопу горада

немцамі (жн. 1915) кіраўнік Таварыства дапамогі польскім школам. 29.11.1915 адчыніў Польскую рэальную гімназію і стаў яе першым дырэктарам. Арыштаваны немцамі 23.5.1916 за актыўную грамадскую дзейнасць. Зняволены ў беластоцкай турме. У ліп. 1916 вывезены ў лагер для ваеннапалонных у Бытаве (*Bytów*), потым у Цэлле-Шлёс (*Celle-Schloss*), Нямеччына, пазней у Чэрск. У ліст. 1918 вярнуўся ў Беласток, служыў у сваёй парафіі. Увесну 1919 выбраны паслом у Заканадаўчы сейм, дзе працаваў у адукацыйнай камісіі і камісіі замежных спраў. З 1922 працаваў у гімназіі. У ліст. 1939, з прыходам савецкіх войскаў, гімназію і ліцэй ліквідавалі, на іх месцы арганізавалі рускую школу. Х. выселілі з будынка школы. Хаваючыся ад НКВД, 27.12.1939 пераехаў у Варшаву, дзе пад прозвішчам С. Галіцкі працягнуў таемную адукацыйную дзейнасць. Працаваў у Галоўнай апякунскай радзе магістрата горада. Уваходзіў у падполле, друкаваўся ў яго прэсе. У жн. 1941 выехаў у Беласток, каб арганізаваць таемнае навучанне. Праз тыдзень вярнуўся ў Варшаву. Арыштаваны гестапа, змешчаны ў турме на Павяку. Вывезены спачатку ў канцэнтрацыйны лагер у Штутхофе (*Stutthof*), пасля ў Асвенцім. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ХВАЛЬКО Юзаф** [1.12.1906—29.7.1945], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны 1-м вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у Браньску (*Brańsk*) Бельска-Падляшскага пав. Браньскага дэканата, Польшча. Цікавіўся праблемамі царкоўнай уніі, удзельнічаў у 2-й канферэнцыі па царкоўнай уніі (верас. 1931, Пінск). Падтрымліваў бел. плынь у Касцёле. З 28.4.1939 мабілізаваны як капелан. Змагаўся за беларусізацыю Касцёла на этнічных бел. тэрыторыях. Забіты невядомымі ў Браньску (*Brańsk*), Польшча.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Garbińsky, Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ХВЕЦЬКА Люцыян Антонавіч** [22.11.1889, в. Малышоўка (?) Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Падляскае ваяв., Польшча — 28.4.1944, Стаўбцы, цяпер райцэнтр Мінскай вобл.], святар, рэдактар, выдавец, публіцыст, педагог. Скончыў Сакольскае гарадское вучылішча (1904). Здаў экзамен на аптэкарскага вучня ў экзаменацыйнай камісіі Санкт-Пецярбургскай навучальнай акругі. У 1907—14 вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. Працягнуў вучобу ў Мітрапалітальнай духоўнай акадэміі, якую скончыў у 1915 са ступенню магістра тэалогіі. Падчас вучобы ў акадэміі сябра бел. культурна-асветнага гуртка. Прыняў сакрамэнт святарства з рук біскупа Я. *Цепляка* (31.5.1915 ці 1914). Адзін з заснавальнікаў «Хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці». Ініцыятар выдання і першы рэдактар-выдавец бел. каталіцкай газ. «Krynica». Заснавальнік бел. выдавецкай каталіцкай суполкі. Да 1918 прафесар літургікі ў духоўнай семінарыі. Пасля закрыцця бальшавікамі семінарыі прызначаны адміністратарам Магілёўскай Мітрапалітальнай курыі і катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Петраградзе. У 1919—23 вікарый таго ж касцёла. Арыштаваны АДПУ па справе біскупа Я.*Цепляка* 5.12.1922. Асуджаны на працэсе 21—25.3.1923 да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Зняволены ў Маскоўскай турме ў Сакольніках. Вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. Выехаў у Польшчу (1.2.1925). Працаваў катэхетам у Шыманаве (*Szymanów*) каля Варшавы. З 1926 рэктар Місіянерскага інстытута ў Любліне. Паводле некаторых звестак, у 1932 пробашч філіяльнага (парафіі ў Ружанах) касцёла ў в. Шчытна Косаўскага пав. і дэканата, цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. У 1933—39 прафесар пастаральнай тэалогіі і выкладчык бел. мовы ў Пінскай семінарыі, скарбнік дыяцэзіяльнай курыі

і віцэ-старшыня дыяцэзіяльнай рады. Падчас 2-й сусветнай вайны служыў у касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Хатава Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. Збіты нямецкай паліцыяй. Памёр у шпіталі.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Źnič* (Рым). 1965. № 81; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*.

**ХМЕЛЯВЕЦ Люцыян Войцэхавіч** [12.5.1914, Мінск — чэрв. 2004], святар. Вучыўся ў пачатковай школе ў Мацяёвіцах (*Maciejowice*), у гімназіі ў Беластоку (*Białystok*), Польшча (да 1933). Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, тэалагічны ф-т ун-та імя Стэфана Баторыя (1939) са ступенню магістра багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (18.6.1939). Прызначаны вікарыем касцёла Яна Хрысціцеля ў в. Ваўкалата, цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. З крас. 1940 пробашч парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Канстанцінава, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. Падчас нямецкай акупацыі выратаваў ад расстрэлу 10 чалавек, выкупіў ад вывазу ў Германію 50 чалавек. Пасля вайны пераследаваўся мясцовымі савецкімі ўладамі. 4.4.1961 пазбаўлены дазволу на душпастырскую дзейнасць за «прымус дзяцей да споведзі і настройванне парафіян суседняга да парафіі ў в. Канстанцінава касцёла св. біскупа Мікалая ў мяст. Свір на змаганне за вяртанне будынка святыні», які выкарыстоўваўся пад збожжасховішча. Пры разглядзе справы ў судзе 12—19.4.1961 улады не змаглі даказаць віну Х. і былі вымушаны вярнуць дазвол на душпастырства, але з умовай, што святар зменіць парафію. Праз тры гады Х. атрымаў дазвол на служэнне ў парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ХОМА Эдвард-Антоні Міхайлавіч** [26.12.1889, Злочаў (*Złoczew*), Польшча — крас.-май 1940, Катынь], святар, магістр тэалогіі. Скончыў духоўную семінарыю і ф-т тэалогіі ва ун-це імя Яна Казіміра ў Львове, цяпер Украіна. Прыняў сакрамэнт святарства (1913). Служыў вікарыем касцёлаў у г. Балехаў, в. Язловец, потым адміністратар парафіі ў в. Буракоўка (?), Украіна. З 1917 капелан 105-га палявога шпіталя аўстрыйскага войска, пасля ў 100-м пяхотным палку, удзельнік абароны Львова. З ліп. 1919 да канца савецка-польскай вайны капелан 4-й польскай дывізіі. У міжваенны час вайсковы капелан 72-га пяхотнага палка 28-й польскай дывізіі ў званні маёра. З 1933 капелан касцёла св. Антонія Падуанскага ў Баранавічах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. З 1935 у Слоніме, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1936 у Радаме (*Radom*), Польшча. Адзначаны «Крыжам за заслугі ў вайсковай службе». У верас. 1939 трапіў у савецкі палон. Этапаваны ў лагер для польскіх афіцэраў у Старабельску, дзе знаходзіліся 20 вайсковых капеланаў розных веравызнанняў.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ХОМІЧ Павел Сямёнавіч** [17.10.1893, мяст. Ваўкавыск Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — 10.9.1941, Ленінград, турма НКВД], рэлігійны і грамадскі дзеяч. З сялянскай сям'і, бацька быў праваслаўным, а маці — каталічкай. 22.10.1905 прыняў каталіцкае веравызнанне. У 1907—10 вучыўся ў Ваўкавыскім гарадскім 4-класным вучылішчы. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю і Мітрапалітальную духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Падчас вучобы наведваў культурна-асветны гурток бел. студэнтаў-клерыкаў. Прыняў сакрамэнт святарства (1916). Прызначаны рэктарам капліцы ў пас. Вырыца, цяпер Ленінградская вобл., Расія. З 1920 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Пскове, касцёлаў у г. Дно, г. Востраў, г. Порхаў (Пархоў), цяпер

Пскоўская вобл., Расія. З 1923 пробашч касцёла св. Казіміра ў Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія, касцёла св. Аляксея ў Пецяргофе, рэктар капліцы Маці Божай Чанстахоўскай у Лігаве, цяпер Ленінградская вобл. У пачатку 1926 таксама абслугоўваў касцёл св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Кранштаце. Арыштаваны 2.6.1926. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. У чэрв. 1929 пераведзены на востраў Анзер, дзе 5.7.1932 узяты пад варту па справе каталіцкага духавенства. Абвінавачваўся як адзін з арганізатараў «контррэвалюцыйнай групы, якая вяла антысавецкую агітацыю, тайна здзяйсняла рэлігійныя абрады, наладжвала сувязь з воляй для перадачы за мяжу звестак шпіёнскага характару аб становішчы католікаў у СССР». Падчас допытаў захварэў псіхічна. 27.5.1933 прыгавораны да года ізалятара. 22.7.1933 вывезены ў турму АДПУ ў Ленінградзе на вул. Шпалернай, адкуль этапаваны ў адзін з лагераў ля Камсамольска-на-Амуры. Вызвалены ў 10.11.1936 з забаронай пражываць у 12 буйных гарадах СССР. Жыў у ваколіцах Кастрамы, потым у Калузе. У жн. 1939 нелегальна вярнуўся ў Ленінград, праводзіў тайныя богаслужэнні ў кватэрах вернікаў. З ліп. 1941 Апостальскі адміністратар. Зноў арыштаваны 15.7.1941. Прыгавораны трыбуналам Ленінградскай ВА 1.9.1941 за арганізацыю «падпольнай царквы» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ХРАБАНШЧ Ян Ігнатавіч** [20.10.1906, в. Якубова (*Jakubowo*), Польшча — 26.3.1942, Шахрысабз, Узбекістан], святар. З сялянскай сям'і. У 1927 скончыў гімназію ў Енджэюве (*Jędrzejów*), Польшча, потым Віленскую духоўную семінарыю.

Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (4.6.1933). Прызначаны вікарыем парафіі св. Міхала Арханёла ў мяст. Поразава Ваўкавыскага пав. і дэканата, цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. З 1936 у фарным касцёле св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 4.7.1936 адміністратар парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Капцёўка Гродзенскага пав. і дэканата, цяпер Гродзенскі р-н. Збудаваў капліцу і пачаў будаваць касцёл. З 28.4.1939 капелан рэзерву Польскага войска ў званні капітана Сувалкаўскай кавалерыйскай брыгады. Прымаў удзел у ваенных дзеяннях як капелан 2-га палка імя Юзафа Дзвярніцкага, потым у кавалерыйскай брыгадзе «Пліс». Адзначаны «Крыжам Мужных». Пасля ваеннай кампаніі вярнуўся ў сваю парафію, якая цяпер была на савецкай тэрыторыі. Абвінавачаны ў службе вайсковым капеланам, вымушаны ўцякаць, хаваўся ў Лапах (*Łapy*), Польшча, дзе арыштаваны НКВД у крас. 1940. Зняволены ў беластоцкай турме. У снеж. 1940 этапаваны ў адзін з лагераў ГУЛАГу каля Архангельска. Вызвалены ў ліп. 1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Прыбыў у Бузулук, Арэнбургская вобл., дзе ствараліся польскія дывізіі. Прызначаны капеланам 17-га пяхотнага палка Львоўскай пяхотнай брыгады. Пазней полк быў пераведзены ва Узбекістан. Памёр ад тыфу.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ХРОБАТ Юзэфа (Марыя-Канута)** [1896, в. Рачын (*Raczyn*), цяпер Польшча — 1.8.1943], законніца. У 1922 у Чанстахове ўступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. Склала першыя законныя шлюбы і прыняла імя Марыя-Канута ад Пана Езуса ў Гэтсеманіі (1925, Гродна). У 1931

склала вечныя шлюбы. Падчас 2-й сусветнай вайны жыла ў законным доме Хрыста Валадара ў Наваградку. Арыштавана гестапа 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі ў ваколіцах Наваградка.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЦАКУЛЬ Міхал Хрыстафоравіч** [23.10.1885, г. Рэвель, цяпер Талін, Эстонія — 8.1.1938], святар. З мяшчанскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1908). 20.1.1909 прызначаны вікарыем катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. З 1910 служыў у капліцы Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Рудня-Шлягіна Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. З 1.2.1912 зноў вікарый катэдральнага касцёла ў Гомелі. 26.10.1912 пераведзены пробашчам у Чыту, у касцёл св. Апосталаў Пятра і Паўла. З 1914 у Сімбірску. Служыў у касцёле Узвышэння Св. Крыжа, апекаваў бежанцаў з Польшчы. З 1919 адміністратар філіяльнага касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Маскве. Арыштаваны 26.3.1924. Вызвалены 3.4.1924. Справа спынена 6.12.1924. З 1925 пробашч і дэкан касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку, часова в. а. адміністратара парафіі ў Маскве. Зноў арыштаваны 14.2.1927. Вызвалены праз 3 гадзіны. У трэці раз арыштаваны 12(ці 20).2.1929. Абвінавачаны 12.3.1929 у «шпіянажы» і «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны не быў. Вызвалены 3.5.1929 пад падпіску аб нявыездзе. Чарговы раз арыштаваны ў Маскве 14.4.1931. Абвінавачаны ў тым, што «падчас ліквідацыі шпіёнскіх, контррэвалюцыйных і антысавецкіх нацыяналістычных польскіх груп з асяродку парафіян маскоўскіх касцёлаў Пятра і Паўла ў Мілюцінскім завулку і Беззаганнага Зачацця на вул. Грузінскай удзельнічаў у арганізацыі нелегальнай дапамогі арыштаваным; членам касцёльнага хору; групы нелегальнага кляштара; контррэвалюцыйнай групы тэрцыяраў; групы католікаў усходняга абраду і інш.» Прыгавораны 18.11.1931 да 3 гадоў высылкі з забаронай пражываць у 12 буйных гарадах СССР. Высланы ў Тамбоў. У студз. 1932 парафіяне касцёла Беззаганнага Зачацця ў Маскве звярнуліся да пасла Польшчы з просьбай умяшацца і садзейнічаць вызваленню Ц. У снежн. 1933 прыгавор аб высылцы адменены і Ц. атрымаў дазвол на пражыванне ў Маскве. Выконваў абавязкі пробашча парафій Беззаганнага Зачацця НПМ і св. Апосталаў Пятра і Паўла. Зноў арыштаваны 3.5.1937 за цэлебрацыю па просьбе пасла Польшчы

**Вацлава Гжыбоўскага** св. Імшы ў гонар нацыянальнага свята Польшчы. З Ц. арыштаваны арганіст касцёла. Пасля некалькіх месяцаў, праведзеных у маскоўскай турме Бутыркі, асуджаны да 10 гадоў ППЛ, пазней пастановай асобай нарады НКВД прыгавораны да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; З асабістага архіва У.Васькова.*

**ЦАРПЕНТА (ЦЯРПЕНТА) Іеранім Іеранімавіч** [8.3.1888, в. Крывічы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. — 18.1.1938, Краснаярск, турма НКВД], святар. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1914). З 1915 рэктар філіяльнага (парафіі ў Бабруйску Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл.) касцёла ў в. Шацілкі, цяпер Светлагорскі р-н Гомельскай вобл. З 1917 Мітрапалітам Э. *Ропам* прызначаны пробашчам касцёла Маці Божай Ружанцовай у Томску, Расія. У 1922 служыў у парафіі ў Барабінску, Расія. У 1923 адміністратар касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Спаскае, цяпер Томская вобл., Расія. З 1929 адміністратар парафій Енісейскага р-на і інш. Арыштаваны ў снеж. 1929 у Томску. Асуджаны да 6 месяцаў турэмнага зняволення. З мая 1930 служыў у касцёле Перамянення Пана ў Краснаярску і парафіі Унебаўзяцця НПМ у Іркуцку, Расія. Таксама абслугоўваў касцёл Маці Божай Ружанцовай у Томску, парафію ў Каменску, малітоўны дом у Ачынску і інш. З 1931 Апостальскі Адміністратар большай часткі Сібіры. Зноў арыштаваны 16.10.1931. Неўзабаве вызвалены. У чарговы раз арыштаваны 2.6.1935 з групай парафіянаў. Абвінавачваўся ў «арганізацыі контррэвалюцыйнай групы і ў шпіянажы на карысць Польшчы». 31.3.1936

пераведзены для далейшага следства ў Новасібірскую турму НКВД. 24.6.1936 пастановай ваеннага трыбунала Сібірскай ВА прыгавораны да 10 гадоў ППЛ. Зняволены ў Краснаярскай турме. У 1937 праходзіў па групавой справе Сібірскага цэнтра «ПАВ». Абвінавачваўся ў «паўстанцкай дзейнасці». 4.1.1938 асуджаны за «сувязь з польскім генштабам і Ватыканам» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей.*

**ЦЕПЛЯК Ян Гіяцынтавіч** [17.8.1857, Дамброва Гурніча (*Dąbrowa Górnicza*), Польшча — 17.2.1926], арцыбіскуп, доктар тэалогіі (1901). З сям'і польскага шахцёра. Скончыў Келецкую гімназію, Магілёўскую духоўную семінарыю (1878) і мітрапалітную духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу (1882). Прыняў сакрамэнт святарства (15.8.1881). Выкладаў у акадэміі, рэдагаваў рыма-каталіцкі каляндар. З 1900 канонік, капелан капліцы пры прытулку «Добры пастар». З 7.11.1908 тытулярны біскуп і суфраган магілёўскі. Старшыня Рымакаталіцкай духоўнай калегіі. Ажыццявіў візітацыю Магілёўскай дыяцэзіі, парафіі ў Сібіры, на Сахаліне і іншых рэгіёнаў Расіі. Візітацыя была прыпынена царскімі ўладамі ў 1910, а Ц. пазбаўлены выканаўчых функцый у духоўнай калегіі. У 1914—17 генеральны вікарый Магілёўскай архідыяцэзіі, адначасова Апостальскі Адміністратар Мінскай дыяцэзіі. Спрыяў заснаванню ў Петраградзе Таварыства хрысціянскіх рабочых. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 склаў мемарыял аб свабодзе Касцёла, стварыў новыя парафіі. З 29.4.1919 тытулярны арцыбіскуп. Пасля арышту ў 1919 Магілёўскага Мітрапаліта Эдварда *Ропа* кіраваў Магілёўскай архідыяцэзіяй. За абарону правоў Касцёла праследаваўся савецкімі ўладамі. Арыштаваны ў 1920 і ў 1922. Пераведзены ў Маскву 21—25.3.1923. Падчас судовага працэсу абвінавачаны

разам з 14 каталіцкімі святарамі ў супраціўленні дэкрэтам і распараджэнням савецкай улады ў адносінах да рэлігіі і Касцёла, у арганізацыі барацьбы з савецкай уладай. Асуджаны да ВМП, пазней прысуд заменены на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 9.4.1924 па просьбе Камуністычнай партыі Ірландыі. Дэпартаваны ў Латвію, адкуль выехаў у Польшчу. З 8.5.1924 жыў у Рыме. Па даручэнні папы **Пія XI** 25.10.1925 выехаў у ЗША для візітацыі польскіх парафій. Там атрымаў паведамленне аб прызначэнні на Віленскую Мітраполію, але напярэдадні прыняцця катэдры памёр. Пахаваны ў віленскім катэдральным касцёле.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; ЭГБ*, т. 6—2; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ЦЕРПКА Гэлена (Гвідона)** [1900, в. Грановец (*Granowiec*), цяпер Польшча — 1943], назарэтанка, благаслаўлёная. У 1927 у Львове ўступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. У 1930 склала першыя законныя шлюбы і прыняла імя Гвідона ад Божай Міласэрнасці. У 1936 у Гродне склала вечныя шлюбы. Падчас 2-й сусветнай вайны жыла ў кляштары Хрыста Валадара ў Наваградку. Арыштавана гестапа 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі ў ваколіцах Наваградка.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ЦІКОТА Андрэй Міхайлавіч** [2(ці 5).12.1891, в. Тупальшчызна Дубатоўскай вол. Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 13.2.1952, Усх. Сібір, ГУЛАГ], марыянін, місіянер, архімандрыт, генерал ордэна марыянаў, рэлігійны і грамадскі дзеяч, педагог. Вучыўся ў Ашмянскай гімназіі. У маі

1909 вытрымаў экзамен на званне аптэкарскага вучня. З верас. 1909 вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі. Падчас вучобы ўдзельнічаў у працы бел. культурна-асветнага гуртка. У ліку лепшых студэнтаў пасланы вучыцца за казённы кошт у Санкт-Пецярбург, дзе ў 1912 прыняты ў духоўную акадэмію, якую скончыў са ступенню магістра тэалогіі (1917). Прыняў сакрамэнт святарства (13.6.1914). Адзін з арганізатараў і ўдзельнік 1-га з'езда бел. каталіцкага духавенства (Мінск, 24—25.5.1917). Член Саюза ксяндзоў беларусаў. У 1917—18 служыў у касцёле св. Казіміра ў Маладзечне Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. У 1918 абраны членам Рады БНР. У верас. 1919 увайшоў у склад Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску. Прафесар Мінскай духоўнай семінарыі. Выступаў за шырокае ўвядзенне бел. мовы ў жыццё Касцёла. Арыштаваны ЧК у 1920. Неўзабаве вызвалены. Уступіў у навіцыят 1.9.1920 у Марыямпале, Латвія. 24.9.1921 склаў першыя законныя шлюбы. У пачатку 1920-х г. выехаў у ЗША, дзе збіраў грошы на будоўлю кляштара. У жн. 1923 вярнуўся спачатку ў мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., вікарыем, потым пробашчам касцёла Найсвяцейшай Тройцы. 20.9.1924 склаў вечныя законныя шлюбы. Арганізаваў пры кляштары школу, з 1930 — гімназія імя Стэфана Баторыя. З 18.5.1925 адначасова кіраваў кляштарам ордэна марыянаў і навіцыятам. Адчыніў пры гімназіі падрыхтоўчыя школьныя курсы, правёў электрыфікацыю мястэчка, арганізаваў касу ўзаемнай дапамогі для сялян. Прадстаўляў бел. грэка-католікаў на V Уніяцкім кангрэсе ў Велеградзе (Чэхаславакія, 20—24.7.1927). У 1933—39 двойчы абраны генералам ордэна марыянаў у Рыме. Праследаваўся польскімі свецкімі ўладамі. З 21.2 па 13.3.1937 наведаў законны дом у Харбіне, цяпер Кітай. У выніку 11.10.1937 адчынены навіцыят усходняга абраду. Пасля спынення кіравання ордэнам (1939) Ц. яшчэ нейкі час знаходзіўся ў Рыме. Калі ў 1946 стала вядома пра смерць Фабіяна *Абрантовіча*, Ц. прызначылі апостальскім адміністратарам для католікаў

усходняга абраду ў Маньчжурыі. Перайшоў з лацінскага абраду ва ўсходні і паехаў у Харбін. 22.12.1948 са святарамі Я. *Германовічам*, Т. *Падзявам*, **П. Партнягіным**[1]**, П. Халеілем**[2] арыштаваны кітайскімі ўладамі і 25.12.1948 перададзены МДБ СССР. Зняволены ў Чыцінскай турме. Абвінавачаны ў «арганізацыі тэрарыстычнай групы, шпіянажы на карысць Ватыкана, антысавецкай агітацыі». Пасля адмовы падчас следства супрацоўнічаць з МДБ катаваны. Асуджаны 28.9.1949 завочна ў Маскве тройкай НКВД да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. У ліст. 1949 праз Іркуцк этапаваны ў Ангарскі, потым у Тайшэцкі лагер НКВД. 19.1.1950 пераведзены ў лагпункт Чукша, потым да крас. 1951 у лагпункт Нова-Чунка Шылкінскага р-на, цяпер Чыцінскай вобл. У чэрв. 1951 вернуты ў Тайшэт. Патаемна адпраўляў св. Імшу, прымаў споведзі. У 1950 у цяжкім стане дастаўлены ў бальніцу лагернага аддзялення каля Тайшэта. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Stankiewicz A*. Rodnaja mowa u swiatyniach. Wilnia, 1929; *Stankievič A*. Biełaruski chryścijanski ruch. Vilnia, 1939; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; ЭГБ*, т. 6—2; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Bukowicz J. Świadkowie wiary.*

---

[1] **Партнягін Павел** [1903, Уладзівасток, Расія — 1977, Самарканд, Узбекістан], святар, верагодна, усходняга абраду. У 1927 удзельнічаў у трансгімалайскай экспедыцыі Н. К. Рэрыха ў Тыбет. Скончыў духоўную семінарыю, прыняў сакрамэнт святарства. З 1930-х святар у каталіцкай місіі ў Харбіне. 22.12.1948 арыштаваны кітайскімі ўладамі, перададзены МДБ СССР. Этапаваны ў Чыцінскую турму. Катаваны на допытах. У ліст. 1949 асуджаны да 25 (?) гадоў ППЛ. Этапаваны ў Азёрны лагер МДБ Іркуцкай вобл. Вызвалены ў 1956. Выкладаў у інстытуце каракулегадоўлі ў Самаркандзе. Кр.: Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.

[2] Біяграфічныя звесткі пра Паўла Халеіля не выяўлены.

**ЦІМАШКЕВІЧ Юліян Аляксандравіч** [7.1.1890, в. Бернішкі Прыдруйскай вол. Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер, Латвія — 26.6.1941], святар. У 1911 скончыў класічную гімназію М. Паўлоўскага ў Вільні. Вучыўся на юрыдычным ф-це ў Санкт-Пецярбургу. У 1915 здаў дзяржаўны экзамен пры Маскоўскім ун-це, атрымаў ступень кандыдата права. Служыў канцылярыстам, рахункаводам, гандлёвым рэферэнтам ва ўпраўленні Палескай чыгункі. Са студз. 1919 працаваў у Цэнтральным камісарыяце расійскіх дарог. Галоўны рэферэнт, нам. начальніка, начальнік тарыфа-перавознага аддзела Рыга-Арлоўскай чыгункі ў Арле, Расія. Арыштаваны за «антысавецкую агітацыю» ў канцы 1921. Зняволены ў Бутырскай турме Масквы. Вызвалены праз 6 тыдняў дзякуючы ўмяшальніцтву польскага і латышскага консульстваў. Падчас зняволення прыняў рашэнне стаць святаром. Пасля выхаду на волю паехаў у Санкт-Пецярбург, каб паступаць у духоўную семінарыю, але тая была зачынена. Уладкаваўся працаваць у тарыфа-перавозны аддзел упраўлення Паўн.-Зах. чыгункі. Падпольна скончыў Маскоўскую духоўную семінарыю. У нямецкай калоніі каля Адэсы прыняў сакрамэнт святарства (25.11.1925). Служыў вікарыем у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Маскве. Арыштаваны 23.6.1927. Абвінавачваўся ў «шпіянажы», «антысавецкай агітацыі» і «выкладанні Закона Божага непаўналетнім». Асуджаны калегіяй АДПУ 18.11.1927 да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны 2.12.1927 у Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР (1928). Прызначаны вікарыем касцёла св. Яна Хрысціцеля і св. Яна Евангеліста ў Вільні. Потым у парафіі Божага Провіду ў в. Кужніца (*Kuźnica*) Сакульскага дэканата, цяпер Польшча. У 1930—34 прафесар гісторыі Касцёла ў Місіянерскім ін-це ў Любліне (*Lublin*), Польшча. З 1934 пробашч парафіі НПМ у в. Батурына Вілейскага пав. і дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. У 1938 у касцёле св. Апостала Тадэвуша ў в. Вішнева Свірскага дэканата, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З кастр. 1940 дэкан Свірскага дэканата. Прызначаны пробашчам касцёла св. Біскупа Мікалая ў мяст.

Свір, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл., але пераехаць у іншую парафію не пагадзіўся. Арыштаваны НКВД 7.4.1941. Пасаджаны ў вілейскую турму. Абвінавачваўся ў правядзенні антысавецкай агітацыі. Паводле некаторых звестак, расстраляны пры этапаванні вязняў на Усход.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Литургический календарь; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЦІШАК Вальтэр Марцінавіч** [4.11.1904, Шынандоа (*Shenondoah*), штат Пенсільванія, ЗША — 1984, Нью-Ёрк], святар. З 1928 законнік ордэна езуітаў. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). У 1938 уступіў у навіцыят усх. місіі ордэна езуітаў, якая знаходзілася ў пас. Альбярцін Слонімскага пав., цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл. У верас. 1939 прыбыў у Львоў як нам. галоўнага вікарыя Сібіры атрымаць ад Мітрапаліта **А. Шаптыцкага** благаслаўленне сваёй таемнай місіі сярод рабочых, якіх вывозілі на Урал. У сак. 1940 з В. *Новікавым*, зарэгістраваўся як лясны рабочы Уладзімір Ліпінскі, 15.3.1940 выехаў з групай рабочых на Урал у трэст «Углебіржа» (Чусава Пермскага р-на), каб атрымаць савецкі пашпарт і па ім пазней выехаць у Сібір. Арыштаваны 23.6.1941. Абвінавачаны як «агент Ватыкана, перакінуты на савецкую тэрыторыю, які вёў антысавецкую працу з мэтай утварэння каталіцкіх арганізацый, што мелі заданне знішчыць савецкі лад». У зняволенні моцна пабіты, пра што пазней узгадваў: *«Калі следчаму не падабаўся мой адказ, то ён біў мяне ў твар так, што я падаў з крэсла на падлогу, два ці тры разы падчас майго месячнага знаходжання ў Пярмі вызываў некалькі наглядчыкаў, якія праводзілі мяне ў суседні пакой,*

*выкладзены дыванамі, забяспечаны сценамі з гукаізаляцыяй. Там білі мяне гумовымі палкамі па патыліцы да страты прытомнасці».* 26.8.1941 пераведзены ў Лубянскую турму Масквы. Асуджаны асобай нарадай НКВД 23.9.1941 за «шпіянаж», «антысавецкую прапаганду і падрыў савецкай улады» да 15 гадоў ППЛ. Зняволены ў Бутырскай турме Масквы. У 1945 высланы на Урал. У 1946 зноў арыштаваны і прыгавораны да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Нарыльскі лагер МДБ Краснаярскага краю (Дудзінка). З лют. 1947 працаваў на нарыльскім цагляным заводзе. Вызвалены 22.4.1955. Некалькі месяцаў патаемна абслугоўваў у Нарыльску мясцовых католікаў, за што 12.6.1956 высланы ў Краснаярск, потым у Абакан. У 1963 намаганнямі сваякоў вызвалены, вернуты ў ЗША праз абмен на двух шпіёнаў КДБ. Працаваў у Цэнтры Яна XXIII у Нью-Ёрку. Асабовая справа Ц. (на імя Ліпінскага Уладзіміра Валянцінавіча) № 617 знаходзіцца ў архіве Лубянкі.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЦІШКЕВІЧ Аляксандр** [1892—5.8.1942], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1922). З 1935 рэктар філіяльнага касцёла св. Антонія Падуанскага ў в. Пляшэвічы Нясвіжскага пав. і дэканата, цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл., капелан сясцёр-юзафітак у в. Грыбаўшчына таго ж пав., цяпер Нясвіжскі р-н. Арыштаваны немцамі 28.6.1942. Расстраляны ў в. Малева (5 км ад Нясвіжа).

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЦЫБУЛЕВІЧ Станіслаў Юзафавіч** [1862, в. Рудажайцы (Рубевайцы?) Цельшынскага пав. Ковенскай губ., цяпер Літва — 18.10.1937, Віцебск, турма НКВД], святар. З літоўскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1888). У 1894 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы і св. Антонія Падуанскага ў Себежы Віцебскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія. З 1896 душпастыр парафіі св. Антонія Падуанскага ў в. Губіна (Камень-Губін) Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. З 1903 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Непароты (тагачасны паштовы адрас: ст. Старое Сяло) Віцебскага пав., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. З 1908 адміністратар парафіі св. Казіміра і Рафала ў мяст. Бешанковічы Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. У 1920—1930-я пробашч касцёла св. Ганны ў мяст. Койданава, цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл., парафіі Святога Духа ў мяст. Ула, цяпер Бешанковіцкі р-н. Арыштаваны 12.8.1936. У сак. 1937 вызвалены без права выезду. Зноў арыштаваны 14.6.1937. Асуджаны 22.9.1937 з **Антонам Нячаем (Нечаем)**, верагодна, старастам касцёла, паводле пастановы калегіі НКВД як «кіраўнік контррэвалюцыйнай арганізацыі» і «за антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 2.4.1976 Віцебскім абл. судом. Асабовая справа Ц. № 13978-п захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis; БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЦЫБУЛЬСКІ Францішак** [1885—10.3.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакра-

мэнт святарства (1908). Прызначаны вікарыем парафіі Нараджэння НПМ у Барысаве, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1913 пробашч касцёла НПМ у в. Абольцы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. З 1918 у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Докшыцы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1930 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Радашковічы Вілейскага дэканата, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. З 1939 пробашч парафіі Нараджэння НПМ у в. Трабы Валожынскага пав. Вішнеўскага дэканата, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны немцамі летам 1942. Зняволены ў Лідскай турме. Расстраляны з 9 іншымі святарамі ў ваколіцах Ліды (гл. арт.: *Ажароўскі* Юрый).

Кр.: *Памятная книжка Минской губернии; Памятная книжка Могилевской губернии; Каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі*; *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ЦЫВІНСКІ Юзаф Янавіч** [1865, в. Замосце Віцебскай губ., цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], вартаўнік касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку Віцебскай вобл. З бел. сялянскай сям'і. Арыштаваны 14.1.1927. Абвінавачваўся (10.6.1927) у «сувязях з польскімі разведвальнымі органамі». Вызвалены з улікам тэрміну папярэдняга зняволення. Рэабілітаваны 29.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ц. № 22051-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**ЧАБАНОЎСКІ Мар'ян Кліменцевіч** [14.5.1907, в. Слабодка, цяпер Івана-Франкоўская вобл. (?), Украіна — 1.11.1972], святар. З сям'і польскага рабочага. 26.12.1923 уступіў у ордэн піяраў. 27.12.1924 склаў першыя, 27.8.1928 вечныя шлюбы. Скончыў гімназію (1928), духоўную семінарыю піяраў (1932?), філасофска-тэалагічныя курсы ў Кракаве (*Kraków*), Польшча. Прыняў сакрамэнт святарства (17.12.1932). З 1934 у калегіуме піяраў у Лідзе, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл., са снеж. 1935 яго рэктар, паралельна рэктар касцёла св. Юзафа Каласанца. Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны немцамі 29.6.1942. Вызвалены ў жн. 1942. З 1947 служыў у фарным касцёле Узвышэння Св. Крыжа ў Лідзе. Арыштаваны 12.2.1951. Асуджаны 5.6.1951 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Віны не прызнаў. Этапаваны ва Унжэнскі лагер МДБ Горкаўскай вобл. (каля 30 000 зняволеных). Вызвалены 9.11.1955 пастановай аб амністыі Вярхоўнага савета СССР. Вярнуўся ў Ліду. З 3.1.1956 служыў у касцёле Беззаганнага Зачацця ў Лідзе. Рэабілітаваны 30.10.1989 пракуратурай Гродзенскай вобл. Асабовая справа Ч. № п-10591 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 39; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЧАЕЎСКІ Ігнат Карлавіч** [1868—19.1.1922, Варшава], святар, сын адстаўнога унтэр-афіцэра. Скончыў павятовае вучылішча (1881) і Пятую гімназію ў Санкт-Пецярбургу (1885), паступіў у Магілёўскую духоўную семінарыю. Пасля заканчэння IV курса пераведзены ў Імператарскую духоўную акадэмію, якую скончыў у 1893. Пастановай акадэмічнай канферэнцыі прысвоена ступень кандыдата тэалогіі (8.6.1892) і магістра багаслоўя (5.7.1893). У святарства пасвечаны магілёўскім суфраганам біскупам Сымонам: на іпадыякана 14.6.1892,

на дыякана 23.8.1892, на святара 20.2.1893. Прызначаны на пасаду катэхета мужчынскай і жаночай прагімназій (1.8.1893) у Гомелі. Пераведзены 16.9.1893 катэхетам і вікарыем касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу, Расія. У 1894—97 пробашч і катэхет парафіі св. Ганны ў Екацярынбургу, Расія. З 1903 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Харкаве, цяпер Украіна. З 1905 пробашч касцёла св. Генрыха ў Хельсінкі, цяпер Фінляндыя. З 1911 адміністратар парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла у Маскве і Маскоўскі дэкан. З 1916 сакратар Мітрапалітальнай курыі ў Петраградзе, пазней катэхет мужчынскай гімназіі пры касцёле св. Кацярыны. У 1918 у парафіі св. Станіслава. Некаторы час служыў у парафіі св. Яна Хрысціцеля ў Ямбургу, цяпер Кінгісеп, Расія. Арыштаваны ў крас. 1920. Вызвалены праз 2 тыдні як цяжка хворы. Выехаў у Польшчу.

Кр.: *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; З асабістага архіва У.Васькова.*

**ЧАПЛОЎСКІ Павел** [1896—1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1924). Прызначаны вікарыем парафіі Унебаўзяцця НПМ у мяст. Жалудок, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1928 пробашч філіяльнага касцёла св. Юзафа ў в. Руда Яварская Дзятлаўскага дэканата, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. З 1929 у касцёле Хрыста Валадара ў в. Скрыбаўцы, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1934 пробашч касцёла св. Антонія Падуанскага ў в. Малая Бераставіца Бераставіцкага дэканата, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Жодзішкі Свірскага дэканата, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. У верас. 1941 арганізаваў у Жодзішках навучанне рэлігіі. Арыштаваны ў снеж. 1941. Загінуў пры невядомых абставінах.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ЧАРНЕЦКІ Мікалай** [14.12.1884, Семакавічы, Аўстра-Венгрыя, цяпер Украіна — 2.4.1959, Львоў], святар усх. абраду. Скончыў духоўную семінарыю ў Станіслававе (*Stanisławów*). Працягваў вучобу ў Калегіуме пашырэння веры ў Рыме. Атрымаў ступень доктара тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Пасля вяртання ў Станіславаў— прафесар дагматычнай тэалогіі, духоўнік грэка-каталіцкай семінарыі. У 1919 уступіў у ордэн айцоў рэдэмптарыстаў. Прыняў законныя шлюбы (1920). У 1926—27 праводзіў місіянерскую дзейнасць у Віленскай, Пінскай і Луцкай дыяцэзіях. 8.2.1931 у касцёле св. Альфонса ў Рыме ўзведзены ў сан біскупа і прызначаны Апостальскім Адміністратарам для неауніятаў усх.-візантыйскага абраду ў Луцкай, Люблінскай, Седлецкай, Пінскай і Віленскай дыяцэзіях. Быў ініцыятарам рэарганізацыі Папскай Усходняй семінарыі ў Дубне (1931—35). Удзельнічаў у Пінскіх уніяцкіх канферэнцыях (1930, 1931, 1932, 1933, 1935). Падчас 2-й сусветнай вайны — у Львове, выконваў функцыі Экзарха з паўнамоцтвам Апостальскага Адміністратара. Арыштаваны МДБ 11.4.1945. Праходзіў па групавой справе каталікаў. Асуджаны 3.3.1946 да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ. Вызвалены ў 1956. Вярнуўся ў Львоў. Беатыфікаваны Папам **Янам Паўлам II** з групай украінскіх пакутнікаў.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku.*

**ЧАРНЕЦКІ Ян Стэфанавіч** [30.5.1911, мяст. Старасельцы (*Starosielce*) Беластоцкага пав, Польшча — 26.2.1964], святар. З сям'і польскага рабочага. Скончыў Віленскую духоўную

семінарыю, тэалагічны ф-т ун-та імя Стэфана Баторыя са ступенню магістра багаслоўя. Прыняў сакрамэнт святарства (12.6.1938). Прызначаны вікарыем касцёла Звеставання НПМ у в. Вішнева, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. З 1.12.1938 служыў у парафіі св. Станіслава ў мяст. Дамброва (*Dąbrowa*) аднайменнага дэканата, Польшча. У верас.-кастр. 1939 у касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Шыдлавічы (Шыдлоўцы), цяпер в. Шылавічы Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. У крас. 1940 уцёк з-пад савецкай акупацыі і да канца ліп. 1941 служыў у парафіі Ялёнкі (*Jelonki*) Ломжынскай дыяцэзіі. Вярнуўся ў Шыдлавічы. З ліп. 1943 зноў служыў у Троіцкім касцёле. Арыштаваны МДБ 10.5.1951. Акрамя традыцыйных абвінавачанняў у «антысавецкай дзейнасці», Ч. прыпісалі «правядзенне богаслужэнняў у гонар польскай канстытуцыі», «эксплуатацыю чужой працы». Па сутнасці прад'яўленых яму абвінавачанняў (заклікі з амбона падчас гітлераўскай акупацыі да своечасовай здачы ўсіх відаў паставак для германскай арміі, антысавецкая агітацыя, захоўванне контррэвалюцыйнай літаратуры) Ч. сваёй віны не прызнаў. Асуджаны 9.11.1951 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. 2.2.1955 тэрмін пакарання зніжаны да 10 гадоў. Вызвалены ў 1955. Вярнуўся ў Шыдлавічы. 3.5.1959 выехаў у Польшчу. З кастр. 1959 у Вармінскай дыяцэзіі.

Рэабілітаваны 19.10.1992 прэзідыумам Вярхоўнага суда Беларусі. Асабовая справа Ч. № п-18877 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis. НАРБ, ІКБР*; *БНДЦЭД; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ЧАХОЎСКАЯ Люцыя Эдмундаўна** [1888, Магілёўская губ. — ?], парафіянка. З дваранскай сям'і. Атрымала вышэй-

шую адукацыю. Арыштавана 18.11.1923 у Маскве. Праходзіла па групавой справе «рускіх каталікаў». Асуджана за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ. Зняволена ў Кацярынінскай турме Ленінграда. У 1932 пераведзена ў Бутырскую турму Масквы. Вызвалена 15.9.1932 праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*.

**ЧУЦЕЙКА Францішак Юзафавіч** [1870, мяст. Дзятлава Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. — ?], ахоўнік касцёла ва Уладзікаўказе. Арыштаваны 2.12.1936. Асуджаны да 8 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЧЫЖЭЎСКІ Альфонс Леапольдавіч** [28.4.1897, Кельцы Келецкага пав., Польшча (паводле іншых звестак, в. Мажаі, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл.) — 16.11.1953, в. Краснае Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.], езуіт. З сям'і польскага службоўца. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. Уступіў у таварыства Езуса (28.4.1926, Альбярцін, Слонімскага пав., цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл.). У 1928—29 вытрымаў экзамен на сталасць у Пінску. Вывучаў філасофію і тэалогію ў Кракаве і Любліне. Прыняў сакрамэнт святарства (23.6.1935). У 1938—39 рэктар капліцы (пры касцёле св. Уладзіслава Венгерскага ў в. Суботнікі) у в. Жамыслаўль, цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. У 1939 працаваў у Любліне ў бібліятэцы калегіума імя А. Баболі, Польшча. Падчас 2-й сусветнай вайны пробашч касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Опса Браслаўскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1942 у парафіі Перамянення Пана ў в. Гаўя Лідскага дэканата, цяпер Лідскі р-н. Таксама абслугоўваў філіяльны касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў в. Кір'янаўцы таго ж дэканата і р-на.

Капелан АК. З 1944 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Бердаўка, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 31.10.1947. Асуджаны 2.3.1948 як «сацыяльна небяспечны элемент» да 10 гадоў ППЛ. 30.3.1948 тэрмін зніжаны да 6 гадоў. Этапаваны ў Карагандзінскі лагер МДБ Казахскай ССР. Вызвалены ў студз. 1953. Вярнуўся ў Беларусь смяротна хворым. Рэабілітаваны 21.2.1994 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда. Асабовая справа Ч. № п-20475 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЧЫРСКІ Франц Тамашавіч** [1882, в. Ярмолінцы, цяпер Хмяльніцкая вобл., Украіна — 29.11.1937, Гомель, турма НКВД], святар. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1905). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Валачыску, цяпер Цярнопальская вобл., Украіна. З 1907 адміністратар парафіі Пцічая, цяпер Ровенская вобл., Украіна. З 1910 душпастыр касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Арынін, цяпер Хмяльніцкая вобл., Украіна. З 1914 вікарый катэдральнага касцёла ў Жытоміры, Украіна. З 1917 зноў служыў у парафіі Арынін. У 1920-я г. пробашч касцёла ў роднай вёсцы. Арыштаваны 28.6.1922 конным атрадам ЧК. Падчас арышту чэкісты стралялі і білі вернікаў нагайкамі. На святароў налажылі кантрыбуцыю. З 1922 апекаваў касцёл св. Войцаха ў мяст. Фельштын, цяпер Гвардзейскае, у дэканаце Пласкіраў. Зноў арыштаваны (з 30 іншымі святарамі і парафіянамі Жытомірскай і Камянец-Падольскай дыяцэзій) 16.1.1930. Падчас следства знаходзіўся пад арыштам у Пласкіраве, Харкаве, Кіеве. Абвінавачваўся ў «дапамозе міжнароднай буржуазіі, падбухторванні іншаземнай дзяржавы да абвяшчэння вайны,

да збройнага ўмяшальніцтва ў справы СССР, шпіёнстве і антысавецкай прапагандзе». Прыгавораны да 7 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. З 10 іншымі святарамі этапаваны ў Котласкі лагер АДПУ Комі АССР, праз два тыдні накіраваны ў Яраслаўскі паліт. ізалятар. З 25.11.1930 у Салавецкім лагеры АДПУ-НКВД Архангельскай вобл. З верас. 1933 у лагпункце ў Кемі. Вызвалены ў 1935 (?). 27.1.1937 высланы ў Мцэнск Арлоўскай вобл., потым у Карачаў Бранскай вобл. У другой палове 1937 пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. Чарговы раз арыштаваны 6.11.1937. Асуджаны тройкай НКВД 22.11.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989.

Перад 2-й сусветнай вайной маці, сястра і брат святара жылі ў Валачыску.

Кр.: Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Гомеля. У 2 кнігах. Кніга 1-я. Мн., 1998; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; http://fides-ratio.chat.ru/solovki/s12/htm; З асабістага архіва У. Васькова.*

**ЧЭКАН Міхал Казіміравіч** [1882, в. Татарка Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — ?], святар. З сялянскай сям'і. Атрымаў хатнюю адукацыю. Быў старшынёй парафіяльнага савета катэдральнага касцёла св. Кацярыны Александрыйскай у Санкт-Пецярбургу, Расія. Арыштаваны 9.10.1929. Праходзіў па групавой справе каталіцкага духавенства і парафіянаў. Абвінавачваўся ва «ўдзеле ў контррэвалюцыйнай арганізацыі, распаўсюджванні антысавецкай літаратуры і дапамозе зняволеным». Асуджаны 13.9.1930 да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 7.9.1931 тэрмін скарочаны да 8 гадоў. Вызвалены 1.10.1936. Выехаў у Ленінградскую вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**ШАДУРСКАЯ Вільгельміна Феліцыянаўна** [1894, Полацк Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. — ?], парафіянка, сакратар парафіяльнага савета касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку. З польскай шляхецкай сям'і. Атрымала сярэднюю спецыяльную адукацыю. Арыштавана 3.11.1930. Асуджана 4.7.1931 калегіяй АДПУ як «член контррэвалюцыйнай шпіёнскай арганізацыі» да 5 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 14.8.1964 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. (усяго больш за 50 чалавек) № 12975-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Таксама гл. арт.: *Капуста* Пётр-Бернард Юзафавіч.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ШАЛКЕВІЧ Міхал Матэвушавіч** [18.9.1891, в. Дубовая (?) Сакульскага пав. Гродзенскай губ. — 15.2.1972], святар. З сялянскай сям'і. Скончыў 4-гадовую народную школу ў в. Адэльск, цяпер Гродзенскі р-н (1905), 2 класы Гродзенскай гімназіі, Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (4.8.1915, Санкт-Пецярбург). З-за наступу нямецкіх войскаў не змог вярнуцца ў Вільню і выехаў у Маскву для працы на біржы дапамогі палякам. З 19.12.1916 да 4.4.1917 вікарый касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у мяст. Дзісна Глыбоцкага дэканата Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл., парафіі св. Ганны ў в. Мосар, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. З 1917 у касцёле Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Удзела, цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. З 29.3.1922 пробашч касцёла Звеставання НПМ у в. Тракелі Лідскага дэканата, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. У 1934 за грамадскую дзейнасць атрымаў ад польскіх уладаў залаты «Крыж Заслугі». Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Лічыўся смелым і самаадданым капеланам. Арыштаваны МДБ 30.4.1949. Асуджаны 12.8.1949 да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Вызвалены 18.2.1955 як інвалід. 28.2.1955 вярнуўся ў сваю парафію. 26.3.1955 атрымаў рэгістрацыю. 25.6.1958 пазбаўлены права

выконваць святарскія абавязкі. Выехаў у Польшчу (17.2.1959). Рэзідэнт парафіі св. Мікалая у Эльблёнгу (*Elbląg*), капелан ваяводскага шпіталя, абслугоўваў капліцу ў Навакаве (*Nowaków*). У 1960 адміністратар касцёла ў Бянове (*Bianowa*) (?) 20.11.1965 узнагароджаны «Крыжам за мужнасць» і «Крыжам Арміі Краёвай». 27.1.1962 папа **Ян XXIII** надаў Ш. тытул свайго шамбелана. У 1971 пераехаў у Квідзын (*Kwidzyn*) да сястры. Памёр у клініцы Медыцынскай акадэміі ў Гданьску (*Gdańsk*). Пахаваны ў сямейным склепе ў Ольштыне (*Olsztyn*).

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ШАПЛЕВІЧ Станіслаў Мікалаевіч** [14.11.1902—8.8.1975, Баранавічы Брэсцкай вобл.], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). З 1934 в. а. пробашча парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Дарава Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Намаганнямі Ш. у 1937 у парафіі дабудаваны новы касцёл. Абслугоўваў таксама суседні касцёл у в. Макееўшчына Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. На пачатак 1939 капітан, капелан рэзерву. 28.4.1939 мабілізаваны. Падчас 2-й сусветнай вайны хаваўся ў Макееўшчыне, тайна адпраўляў св. Імшу для вайскоўцаў АК. Затрыманы савецкімі партызанамі, але вызвалены дзякуючы парафіянам. Арыштаваны ў канцы крас. 1949 у Баранавічах. Асуджаны 25.2.1950 асобай нарадай МДБ да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў Інцінскі (каля 20 000 зняволеных), пасля яго закрыцця ў 1948 у Мінеральны лагер МДБ Комі АССР, Сібірскі лагер МДБ Кемераўскай вобл., лагер на Данбасе. Вызвалены 30.7.1956. Вярнуўся на радзіму. Намаганнямі парафіян атрымаў дазвол на душпастырскую дзейнасць у Макееўшчыне. У 1960 за «ўдзел у набажэнствах дзяцей і моладзі» пазбаўлены рэгістрацыі.

Вымушаны служыць тайна па кватэрах давераных асобаў. Пераследаваўся КДБ.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS*.

**ШАЦІЛА Альбін Альбінавіч** [2.1.1887, в. Сёмкава Слабодка (?) Мінскай губ., цяпер тэрыторыя Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. (вёска не існуе) — 3.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], святар. З бел. сялянскай сям'і. У 1912—17 вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). У 1918—19 в. а. адміністратара, з 5.5.1920 адміністратар парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Чачэрск Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. Да ліст. 1922 адначасова рэктар філіяльнага касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў в. Жыровічы, цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. З 1924 адміністратар касцёла Звеставання НПМ у в. Фашчаўка, цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл., і інш. навакольных парафій, якія не мелі душпастыра. Выступаў з казаннямі на бел. мове. У верас. 1929 арыштаваны АДПУ. Некалькі месяцаў знаходзіўся ў зняволенні. Пасля служыў у касцёле св. Сымона і Алены ў Мінску. Зноў арыштаваны ў студз. 1932 у Мінску па адрасе: Нова-Маскоўскі зав., 7, кв. 4. Асуджаны 14.7.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць, антысавецкую агітацыю і шпіянаж» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі лагер АДПУ Карэльскай АССР. Узяты пад варту (верагодна, 27.9.1937) і тройкай НКВД Ленінградскай вобл. прыгавораны 9.10.1937 да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 26942-с; захоўваецца з фотаздымкам у архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БВА.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku*; *З асабістага архіва У. Васькова.*

**ШКАДЗІНСКІ Юзаф Аляксандравіч** [1889, мяст. Шчучын (*Szczuczyn*), цяпер Польшча — ?], арганіст. З бел. сям'і. Працаваў у касцёле ў мяст. Нядзвядна (*Niedźwiadna*), Польшча. Быў жанаты, меў дзевяць дзяцей. Арыштаваны 22.7.1940. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 21.6.1941 як «інфарматар памежных службаў буржуазнай Польшчы» да 8 гадоў ППЛ. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Гродзенскай вобл. 26.5.1989. Групавая справа Ш. і інш. № п-9423 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ШТЭЙН Чэслаў Казіміравіч** [1898, в. Неманайты, цяпер Літва — 18.8.1978], святар. З сям'і польскага службоўца. Скончыў 5 класаў гімназіі, Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1925). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця Пана ў мяст. Эйшышкі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва. З 1927 вікарый касцёла Усіх Святых у мяст. Свянцяны Віленскай архідыяцэзіі, цяпер Літва. З 1933 пробашч парафіі св. Апосталаў Сымона і Юды Тадэвуша ў мяст. Воранава Беняконскага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1936 адміністратар касцёла Маці Божай Ружанцовай у мяст. Радунь, цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 15.1.1945. Пад следствам знаходзіўся ў Гродзенскай турме НКВД. Асуджаны ваенным трыбуналам войскаў МУС Гродзенскай вобл. 14.11.1946 за «неданясенне

аб злачынстве» да 3 гадоў ППЛ. Вызвалены 15.1.1947. Зноў служыў у радуньскім касцёле. У 1961 са старшынём касцёльнага камітэта аштрафаваны адміністрацыйнай камісіяй райвыканкама за «парушэнне савецкага заканадаўства аб культах і ўстаноўку і выкарыстанне радыётэхнічных сродкаў». Рэабілітаваны 25.9.1992 Гродзенскім абл. судом. Асабовая справа Ш. № п-14938 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ, ІКБР*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ШУБЗДА Антоні Аляксандравіч** [1907—1972, мяст. Свір, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл.], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1935). Прызначаны вікарыем парафіі св. Станіслава ў в. Ляцк, цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 катэхет, пазней пробашч парафіі Нараджэння НПМ у мяст. Браслаў аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. Падчас нямецкай акупацыі быў капеланам АК. З чэрв. 1948 па 1955 пад пагрозай арышту МДБ хаваўся ў в. Агоні Браслаўскага р-на. Па некаторых звестках, КДБ знайшло і ненадоўга арыштавала Ш. З 19.3.1958 працаваў вікарыем у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Дзераўная, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. За ўдзел у працэсіі на могілкі 1.11.1960 у Ш. забралі рэгістрацыю да 1961, як і ў пробашча *С. Мілкоўскага*. Дзякуючы намаганням вернікаў атрымаў у 1960-я даведку на службу пробашчам у парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Канстанцінава, цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл.

Кр.: *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ШУКЕЛЬ Ігнат Вікенцевіч** [1877, в. Ціршава Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — 1935 (?)], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1903). Прызначаны адміністратарам парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Нежыне Гомельскага дэканата, цяпер Украіна. У 1908 пробашч касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў в. Загацце, цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. З 1912 пробашч касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Станькі Віцебскага пав., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. У 1930 адміністратар парафіі св. Антонія Падуанскага ў Віцебску. Арыштаваны 19.10.1930. Асуджаны 4.7.1931 паводле пастановы калегіі АДПУ як «кіраўнік контррэвалюцыйнай арганізацыі ПАВ» да ВМП (заменена на 10 гадоў ППЛ). Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. і Комі АССР. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 14.8.1964 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. (усяго каля 50 чалавек) № 12975-п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

12.2.1930 у в. Ціршава арыштаваны селянін-аднаасобнік **Шукель Амвросій Вікенцевіч** (н. у 1867 у в. Ціршава), брат Ігната Шукеля. 26.2.1930 асуджаны паводле пастановы калегіі АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.7.1992 пракуратурай БВА. Яго асабовая справа захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Литургический календарь.*

**ШУЛЬСКІС Францішак (Пранас) Юзафавіч** [1.9.1918, Мінск — 3.2.1999], марыянін. Са шматдзетнай мяшчанскай сям'і. Пасля заканчэння 1-й сусветнай вайны бацькі Ш. вярнуліся ў в. Чыжыску, Літва. У 1934 Ш. уступіў у ордэн.

14.8.1934 пачаў навіцыят у Марыямпалі, Літва. 15.8.1935 склаў першыя законныя шлюбы. У 1939 здаў экзамен на сталасць у марыямпальскай гімназіі. 15.8.1940 склаў вечныя законныя шлюбы ў Вілкаміры, цяпер Укмярге, Літва. У 1939—44 вывучаў філасофію і тэалогію ў Коўне. Прыняў сакрамэнт святарства (2.5.1943). Працаваў два гады вікарыем і катэхетам парафіі ў мяст. Марыямпаль. 26.6.1946 вяртаўся на грузавіку з Коўна ў Марыямпаль. Мужчына ў вайсковай форме вырашыў спыніць машыну, а калі гэта не атрымалася, пачаў страляць. Ш. быў паранены ў пазваночнік, што выклікала імгненны параліч ніжняй часткі цела. Паўгода лячыўся ў шпіталі ў Коўне, потым два гады ў кляштары ў Марыямпалі. Пасля выгнання адтуль марыянаў жыў у прыватных дамах парафіянаў. Пазней ордэн набыў дом у Марыямпалі, дзе стаў жыць Ш. і яго родныя сёстры. Адна з іх, Валерыя, прысвяціла сваё жыццё апецы над братам. У 1967—76 Ш. правінцыял, пасля радны. Кожны год наведваў усіх марыянаў у Літве, часам нават тых, хто пражываў ва Украіне. На жыццё зарабляў рамонтам гадзіннікаў.

Кр.: *Bukowicz J. Świadkowie wiary.* Marianie przesladowani pzez hitleryzm i komunizm. Warszawa, 2001.

**ШУСТАК Іпаліт (Уладзіслаў)** [1906, Лігота (*Ligota*), Польшча — 6.1.1989, Асізі (*Asyż*), Італія], францішканец. Прыняў першыя законныя шлюбы. З сак. 1940 у парафіі Маці Божай Вастрабрамскай у в. Язна, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл., служыў у сакрыстыі і арганістам. Арыштаваны НКВД 29.6.1941 з пробашчам касцёла. Этапаваны ў Табольск, Сібір. Вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян у 1941. У 1942 праз Новасібірск і Ташкент выехаў у Іран. Пасля вайны ў Італіі. У 1951—53 вывучаў філасофію ў Асізі, пасля ў францішканскім ун-це ў Рыме тэалогію. Прыняў сакрамэнт святарства (1957). Больш за 30 гадоў служыў у Італіі.

Кр.: *Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ШУТОВІЧ Віктар Іванавіч** [27.10.1890, в. Шутавічы Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. — 1.3.1960, Барысаў], святар, педагог, публіцыст. З бел. сялянскай сям'і. Вучыўся ў Ашмянскай гарадской школе, з 1909 — у Віленскай духоўнай семінарыі. Падчас вучобы далучыўся да бел. культурна-асветнага руху. Прыняў сакрамэнт святарства (16.6.1913, Вільня). Прадоўжыў вучобу за свой кошт у Магілёўскай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу, але пасля прыходу да ўлады бальшавікоў вымушаны спыніць яе. З канца 1917 служыў вікарыем парафіі св. Юзафа і НПМ у в. Барадзінічы Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Распаўсюджваў сярод вернікаў бел. рэлігійныя і свецкія выданні, перыёдыку. Служыў таксама ў касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў в. Новы Пагост, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл., парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Шаркаўшчыне, райцэнтр Віцебскай вобл., касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл., парафіі Божага Цела ў мяст. Іказнь, цяпер Браслаўскі р-н, і інш. З 1925 па дзейнасці Ш. некалькі разоў праводзілася следства. Нейкі час быў пазбаўлены права самастойна кіраваць парафіяй. З 1927 вікарый касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Тшцянэ (*Trzcianne*) Кнышынскага дэканата, Польшча. У 1929 выехаў у ЗША, дзе знаходзіўся да жн. 1932. Пасля вяртання прызначаны вікарыем касцёла св. Яна Хрысціцеля ў мяст. Харошч (*Choroszcz*) Беластоцкага дэканата, Польшча. Супрацоўнічаў з бел. свецкімі і рэлігійнымі перыядычнымі выданнямі. Напісаў драму «950 гадоў хрысціянства на Беларусі». Падчас 2-й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. 29.6.1944 пераехаў у Мінск, дзе служыў пробашчам катэдральнага касцёла Імя НПМ. Арыштаваны 26.1.1945 у Мінску па адрасе: вул.

Савецкая, д. 15. Абвінавачваўся ў тым, што, «выступаючы ў касцёле з пропаведзямі, узводзіў усемагчымыя паклёпы на Савецкую ўладу. Заклікаў вернікаў маліцца за нямецкую армію і хутчэйшую перамогу над СССР… меў цесную сувязь з беларускім нацыяналістам Адамам *Станкевічам*». Следчыя абвінавачвалі яго ў злачыннай сувязі з разведорганамі, антысавецкай нацыяналістычнай дзейнасці, удзеле ў крыжовым паходзе супраць СССР і г. д. З абвінавачаннямі святар не пагадзіўся. Асуджаны 27.6.1946 (з дыяканам Свята-Духавага сабора ў Мінску **Г. Л. Калядзюком**[1] і інш.) асобай нарадай МДБ за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ва Унжэнскі лагер НКВД Горкаўскай чыгункі (ст. Сухабязводная, п/с 242/2), потым пераведзены ў Паўночна-Пячорскі лагер МДБ Комі АССР (пас. Абезь). Аб вызваленні святара хадайнічалі парафіяне касцёла ў в. Барадзінічы, цяпер Браслаўскі р-н. 3.4.1947 яны напісалі ліст І. Сталіну: «На працягу шматгадовай службы святара мы не заўважылі ніякага шкодніцтва і ўмяшальніцтва ў іншыя справы, акрамя святарскай дзейнасці… Ведаючы яго дабрадзейнасць і сумленне, звяртаемся да тав. Сталіна і просім вызваліць Шутовіча Віктара Іванавіча». 25.10.1953 сястра святара Юзефа паслала ліст старшыні СМ СССР **Г. Малянкову**. Некалькі разоў у вышэйшыя інстанцыі з просьбай перагледзець яго справу звяртаўся і сам Ш. Але на ўсе звароты быў адказ: «Пакінуць без задавальнення». Вызвалены 20.3.1955. Неаднаразова звяртаўся ў савецкія інстанцыі, каб зняць судзімасць. 14.4.1959 пракуратура БССР адхіліла хадайніцтва Ш. аб няправільнасці яго асуджэння. Служыў на тэрыторыі ўсх. Беларусі без згоды ўладаў. Пераязджаў з мястэчка ў мястэчка па Магілёўскай, Віцебскай, Гомельскай абласцях, начаваў у вернікаў, якім патаемна ўдзяляў св. сакрамэнты. Апошнія гады жыў у Барысаве. 1.4.1956, на Вялікдзень, адправіў багаслужэнне ў капліцы на

[1] Гл.: *Маракоў Л.* Рэпрэсаваныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі. У 2 т. Т. 1. Мн., 2007.

барысаўскіх могілках пры вялікай колькасці вернікаў, але ўжо на наступны дзень, баючыся ажыўлення рэлігійнага жыцця, улады зачынілі капліцу. Незадаволеныя парафіяне пачалі скардзіцца ў розныя інстанцыі і дамагліся аднаўлення сваіх законных правоў. Пахаваны на мясцовых каталіцкіх могілках. Рэабілітаваны 30.3.1994 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа Ш. № 35734-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Маёвая чытанка. Вільня, 1940.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ШУТЦЭ Аляксандра Феліксаўна** [1905, у межах цяперашняй тэрыторыі Беларусі — ?], актыўная парафіянка касцёла Перамянення Пана ў Краснаярску, Расія. Арыштавана 16.6.1935 па справе «**Царпенты** і інш.». Абвінавачвалася ў «шпіянажы» і «антысавецкай арганізацыі». Асуджана 24.7.1936 да 4 гадоў ППЛ. Этапавана ў Краснаярскі лагер НКВД. У жн. 1936 — сак. 1937 у Краснаярскім шпіталі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ШЧАРБІЦКІ Фабіян Юзафавіч** [1888, Пінск Мінскай губ., цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. — 1940], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1910). Прызначаны вікарыем касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў Брэсце. З 1911 катэхет школ у Брэсце. Падчас 1-й сусветнай вайны вымушаны выехаць у Екацярынбург, дзе служыў пробашчам у касцёле св. Ганны. У 1918 вярнуўся ў Брэст. Працаваў катэхетам у гімназіі імя Р. Траўгута. З 1927 канонік Пінскай дыяцэзіі. З 1929 прэфект пінскай гімназіі і

школ. З 1938 в. а. пробашча, пробашч касцёла Унебаўзяцця НПМ у Пінску, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны ў студз. 1940 пры спробе нелегальнага пераходу дзяржаўнай мяжы. Пад следствам знаходзіўся ў пінскай, потым мінскай турмах НКВД. Паводле адных звестак, загінуў у сутарэннях НКВД, паводле іншых — этапаваны ў Старабельск і расстраляны ў Харкаве.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ШЫМАНКЕВІЧ Міхал Янавіч** [14.9.1911, в. Беля (*Biela*), Польшча — 13.6.1979, Сіты Роўд (*City Road*), Вялікабрытанія], святар. З сялянскай сям'і. З 1926 вучыўся ў гімназіі ў Плоньску (*Płońsk*), адкуль пераведзены ў мужчынскую гімназію імя Св. Станіслава Косткі пры дыяцэзіяльнай семінарыі ў Плоцку (*Płock*), Польшча. У 1932 паступіў у Плоцкую духоўную семінарыю, праз два гады перавёўся ў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (11.6.1938). Прызначаны вікарыем парафіі св. Яна Хрысціцеля ў в. Опса Браслаўскага дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Пасля пачатку вайны ў 1939 пераехаў у Літву. Увесну 1940 служыў у касцёле ў в. Кельме (*Kelme*), Літва. Арыштаваны НКВД 20.6.1941. Этапаваны праз Вільню, Мінск і Віцебск у Котласкі лагер НКВД Комі АССР. Таемна праводзіў душпастырскую дзейнасць. Вызвалены па амністыі для польскіх грамадзянаў у 1941. Стаў капеланам 7-й пяхотнай дывізіі арміі **У. Андэрса**, з якой выехаў у Іран і прайшоў баявы шлях II корпуса як капелан, пасля 5-га батальёна сапёраў 5-й пяхотнай дывізіі, потым 5-га палка зенітнай артылерыі. Адзначаны «Крыжам за Мужнасць» і «Срэбным Крыжам Заслугі з Мячамі». Пасля заканчэння вайны пераехаў з Італіі ў Вялікабрытанію. Капелан салдацкіх лагераў і вайсковых сем'яў у інтэрнатах у Харбуры

Кэмп (*Harbury Camp*) і Чэмплтане (*Champleton*), дзе стварыў польскую парафію і служыў пробашчам 28 гадоў.

Кр.: *Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ШЫМАНСКІ Стэфан-Казімір Юзафавіч** [4.8.1911—13.5.1981], святар. Скончыў гімназію ў Гданьску, Віленскую духоўную семінарыю, ун-т імя Стэфана Баторыя са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (11.6.1938). Прызначаны катэхетам парафіі Усіх Святых у мяст. Свянцяны аднайменнага дэканата Віленскай архідыяцэзіі, Літва. З 1939 пробашч касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Радашковічы, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. У 1949 Ш. сфармуляваў пазіцыю неўмяшальніцтва святароў у палітыку: «Мы не ўмешваемся ў сацыяльную перабудову грамадства, падуладнага дзяржаве, бо як усялякая ўлада ад Бога, і мы павінны ёй падпарадкоўвацца». Арыштаваны 30.4.1950. Асуджаны да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Сібірскі лагер МДБ. Вызвалены 30.11.1955. 3 гады спрабаваў атрымаць рэгістрацыю на душпастырскую дзейнасць, але безвынікова. 13.10.1958 выехаў у Польшчу. З 1.9.1959 вікарый катэдральнай парафіі і пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Гданьску (*Gdańsk*), Польшча. З 1.11.1965 адміністратар катэдральнага касцёла ў Гданьску.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ШЫМКОВІЧ Міхал Мікалаевіч** [1892—29.1.1968], святар. З рабочай сям'і. Скончыў школу, Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1918). Служыў вікарыем у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў мяст.

Заблудаў (*Zabłudów*) (1918—19), парафіі ў в. Кужніца (*Kuźnica*) (1919—22), Польшча, касцёле св. Вацлава ў Ваўкавыску (1923—26), цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1926 пробашч парафіі св. Альжбеты ў в. Падароск Ваўкавыскага дэканата, цяпер Ваўкавыскі р-н. Арыштаваны МДБ 22.8.1947. Зняволены ў Гродзенскай турме. Асуджаны 19.3.1948 як удзельнік антысавецкай арганізацыі да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў перасыльны лагер у Ваўкавыску, потым у адзін з лагераў ГУЛАГу. Вызвалены ў 1954. Вярнуўся ў Падароск, але не атрымаў дазволу на душпастырскую дзейнасць. З 1958 служыў у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Ізабелін Ваўкавыскага р-на. Рэабілітаваны 13.5.1998.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ШЫПІЛА Казімір** [1912—15.7.1943], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1937). У 1938 прызначаны вікарыем фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. Забіты з 5 святарамі і вялікай групай мясцовай інтэлігенцыі каля в. Навумавічы, цяпер Гродзенскі р-н.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ШЫШКО (ШЫШКА) Антоні Станіслававіч** [7.3.1892, в. Яцвеск Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. (паводле іншых звестак, в. Дудзічы, цяпер той жа р-н) — 6.3.1959, Замартэ (*Zamarte*), Польшча], святар. У 1911 паступіў у Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу, дзе 12.10.1914 прыняў дыяканаўскае

пасвячэнне. У пачатку 1-й сусветнай вайны вярнуўся дадому. Пазней працягваў вучобу ў Віленскай духоўнай семінарыі, якую скончыў у 1918. Прыняў сакрамэнт святарства (25.7.1918). Вучыўся на тэалагічным ф-це Варшаўскага ун-та. У 1921—24 у Папскім Грыгарыянскім ун-це (Рым), які скончыў са ступенню доктара кананічнага права. З 1925 служыў у парафіі Божага Цела ў мяст. Крошын Сталовіцкага дэканата, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1929 у касцёле ў Кляшчэлях (*Kleszczele*) Бельскага пав., Польшча. З 1934 у Пшэмыславе (*Przemysłów*), Польшча, не маючы касцёльнай пасады. Год дапамагаў пробашчу парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Сухаволя (*Suchowola*), Польшча. Прапанаваў выкарыстоўваць бел. мову ў выкладанні ў каталіцкіх семінарыях у Вільні, Пінску і ў душпастырскай дзейнасці ў бел. парафіях. Супрацоўнічаў з бел. штомесячнікам «Злучэнне». Арыштаваны 17.9.1939. Асуджаны да 10 гадоў ППЛ (потым тэрмін зменшаны да 2 гадоў). Этапаваны ў адзін з лагераў Архангельскай вобл. У верас. 1941 вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян. Застаўся ў СССР і з 28.2.1942 служыў як капелан «для цывільнай польскай грамадскасці». З 6.3.1942 капелан у Самаркандзе, Узбекскай ССР. Пакінуў СССР з польскай арміяй генерала **У. Андэрса.** Пасля 2-й сусветнай вайны жыў у Польшчы. У 1950-я вёў душпастырскую дзейнасць у парафіі Хэлм (*Hełm*), Польшча. Памёр у доме для святароў-пенсіянераў.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Garbińsky, Turonak, Białoruski ruch chrześcijański XX wieku; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ШЭЛЯГ Лявон Антонавіч** [29.8.1903, в. Пелішча Брэсцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Камянецкі р-н Брэсцкай вобл. —

20.2.1980, Польшча], марыянін. З сялянскай сям'і. З 1921 вучыўся ў Брэсце на курсах па падрыхтоўцы да здачы экзамену на сталасць. У 1923 папрасіўся ў кляштар марыянаў у мяст. Расна, цяпер тэрыторыя Камянецкага р-на (мяст. не існуе). З 7.9.1923 праходзіў навіцыят у Скурцы (*Skórżec*), Польшча. Склаў першыя законныя шлюбы (8.9.1924). Пераехаў у Бяляны (*Bielany*) пад Варшавай. Служыў у касцёле ў Варшаве. У лют. 1925 накіраваны на вучобу ў гімназію ў мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. Пасля сканчэння 7-га класа прызначаны выхавацелем у Бялянскім калегіуме. Склаў вечныя законныя шлюбы (8.9.1927). У 1928 вярнуўся да вучобы ў гімназіі. У чэрв. 1929 атрымаў атэстат аб сярэдняй адукацыі. Наступныя два гады зноў працаваў выхавацелем у Бялянскім калегіуме. З 1931 у Рыме два гады вывучаў філасофію ў Папскім ун-це *Angelicum*. Вярнуўся ў Бяляны. У 1933—37 вывучаў тэалогію ў Варшаўскай духоўнай семінарыі. У 1934—36 памочнік аканома. Атрымаў субдыяканат (6.6.1936), дыяканат (14.6.1936), прыняў сакрамэнт святарства (16.8.1936). Пасля год вывучаў тэалогію, застаючыся выхавацелем хлопчыкаў у калегіуме. З 1937 катэхет. З восені 1938 галоўны выхавацель і катэхет калегіума. З пачаткам 2-й сусветнай вайны, калі немцы перашкаджалі арганізацыі навучання ў Бялянах, удзельнічаў у арганізацыі таемнага навучання. Капелан АК, клапаціўся пра параненых. У пачатку 1945 пераехаў у марыянскі кляштар у Варшаве. З 19.2.1945 да канца верас. 1947 выхавацель малодшых марыянскіх клерыкаў, якія заканчвалі школу, аканом кляштара. Камуністычныя ўлады 29.1.1948 спрабавалі арыштаваць Ш. у Марымонце (*Marymont*), Польшча, але не заспелі дома. З таго часу ён на нелегальным становішчы пад псеўданімам Аляксандр Вайтовіч. Схоплены 22.1.1949 падчас правядзення св. Імшы ў доме дзіцяці ў Багданьцах (*Bogdańce*), Польшча. Змешчаны ў турму ў Макатове (*Mokotów*), Польшча. Абвінавачаны ў сувязях з АК і захоўванні зброі. Асуджаны 30.11.1950 да 12 гадоў ППЛ. 12.3.1951 пераведзены ў

турму ў Вронках (*Wronki*), Польшча. З-за хваробы тэрмін паменшаны да 8 гадоў, потым скасаваны. Вызвалены 17.6.1955. Ш. не дазвалялася займаць пасады і пражываць у Варшаве. Лячыўся, вымушаны пастаянна мяняць месца пражывання. Увосень 1955 прызначаны духоўным айцом марыянскіх клерыкаў, якіх выселілі 24.7.1954 у Гетшвалд (*Getrzwałd*). Таксама апекаваў клерыкаў, якія вучыліся ва Улацлаўку (*Włocławiek*), Польшча. Улетку 1957 пераехаў у Бяляны і працягваў ездзіць ва Улацлавек. Увесну 1958 пераехаў у Грудзёндз (*Grudziądz*). У 1960 увайшоў у раду правінцыі. 5.7.1963 генеральная капітула ў Рыме выбрала Ш. начальнікам польскай правінцыі. Пражываў у Бялянах. 15.12.1968 уключаны ў камісію Душпастырства польскай эміграцыі. Наведваў марыянскія асяродкі ў Амерыцы і Вялікабрытаніі. Пасля вяртання ў Польшчу ў жн. 1970 пражываў у Ратаеве (*Ratajewo*), дзе ў 1972 быў створаны ордэнскі дом, які Ш. узначаліў.

Кр.: *Bukowicz J. Świadkowie wiary.* Marianie przesladowani pzez hitleryzm i komunizm. Warszawa, 2001.

**ЭЙСМАНТ Станіслаў (Стэфан) Францыскавіч** [16.2.1887, мяст. Талачын Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — 16.7.1926, Варшава], святар. Скончыў гарадскую школу ў Мінску, гімназію пры касцёле св. Кацярыны Александрыйскай (1904), духоўную семінарыю і акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Прызначаны вікарыем касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Мінску. З 1914 вікарый і катэхет парафіі Унебаўзяцця НПМ у Мазыры Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гомельскай вобл. У 1916 вярнуўся ў Мінск. Падчас 1-й сусветнай вайны капелан 3-й царскай арміі. У 1918—23 вікарый касцёлаў св. Станіслава і св. Казіміра ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. У маі 1919 узначаліў дэлегацыю католікаў з Петраграда ў Крэмль, дамагаўся вызвалення арыштаванага 29.4.1919 біскупа Э. *Ропа*. У 1920 з-за пагрозы арышту паўгода хаваўся ў Петраградзе. У 1921 выязджаў служыць у касцёлы Гатчыны, Пецяргофа, Араніенбаўма, цяпер Ламаносаў, Расія. Арыштаваны 10.3.1923. Асуджаны 21—26.3.1923 з 14 петраградскімі святарамі на чале з арцыбіскупам Я. *Цеплякам* за ўдзел «у контррэвалюцыйнай арганізацыі, створанай *Цепляком* і *Будкевічам*» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. У зняволенні захварэў псіхічна. Вызвалены праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. У пачатку 1925 выехаў у Польшчу.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЭЙТМІНОВІЧ Леанард Іосіфавіч** [1908, Рыга — ?], арганіст. З сям'і польскага рабочага. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Да арышту працаваў у фарным касцёле св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 19.12.1944. Абвінавачваўся як «сацыяльна небяспечны элемент». Вызвалены і рэабілітаваны 21—23.10.1946. Далей-

шы лёс невядомы. Асабовая справа Э. № п-918 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*.

**ЭЛІЯШ (ЭЛЬЯШ) Станіслаў-Авідзій Францавіч** [14.7.1904, Камарна (*Komarno*), Аўстра-Венгрыя, цяпер Польшча — 27.6.1941, Мікалаева Шумілінскага р-на Віцебскай вобл.], святар. З сям'і лекара аўстрыйскай арміі, з-за чаго сям'я часта мяняла месца пражывання. У дзяцінстве жыў у Яраслаўлі і Львове, пасля ў радавым маёнтку маці каля Мінска. У пачатку 1-й сусветнай вайны ў Мінску і Маскве. У 1917 здаў экзамен ў 2-і клас дзяржаўнай рэальнай гімназіі ў Львове, цяпер Украіна. У наступным годзе, пасля смерці маці, пераехаў у Мелец (*Mielec*), Польшча, дзе паступіў у мясцовую класічную гімназію. Пяты клас скончыў у Ланцуце (*Łancut*), Польшча, шосты ў Львове. Пасля смерці бацькі ў 1920 паехаў да сваякоў маці пад Мінск, але, сутыкнуўшыся з бальшавікамі, вярнуўся ў Польшчу. У 1922 здаў экзамены на сталасць у 8-й дзяржаўнай гімназіі ў Львове. У 1922—23 вывучаў сельскую і лясную гаспадарку ў Львоўскай політэхнічнай акадэміі. Атрымаў дыплом сельскагаспадарчага інжынера. У 1926—28 асістэнт Эксперыментальнага інстытута ў Дублянах, Украіна. Прайшоў вайсковую службу і скончыў школу падхарунжых ва Уладзіміры-Валынскім, Украіна. Паступіў у Віленскую духоўную семінарыю, якую скончыў у 1934. Адначасова вывучаў тэалогію ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1934). Прызначаны прэфектам парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў мяст. Друя, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1936 пробашч парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у в. Ідолта Браслаўскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 1938 належаў да капеланскай Ганаровай Варты Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса. Пасля верас. 1939 наведваў навакольныя парафіі. Арыштаваны 11.6.1941 з пратэстанцкім прапаведнікам **Л. Дзекуцем-Малеем** (паводле іншай інфармацыі, 22/23.6.1941 з мёрскім

дэканам Ф. *Куксевічам*). Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Расстраляны падчас этапавання падследных на Усход. Рэабілітаваны 29.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Э. захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЮДЫЦКІ Віктар Віктаравіч** [25.2.1905, Бабруйск Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. — 4.2.1955, Лондан], святар. У 1914 паступіў у дзяржаўную гімназію ў Бабруйску. У 1917 перайшоў у толькі што створаную польскую школу. 7.7.1920 сям'я Ю. пераехала на Познаньшчыну, дзе жыла 14 месяцаў без сродкаў да існавання. Пасля сям'я пераехала ў Гродна і Ю. паступіў у 5 клас дзяржаўнай гімназіі. Пазней вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі і на ф-це тэалогіі ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (1932). 13.6.1932 прызначаны вікарыем касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Гальшаны Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. Неўзабаве перайшоў на працу вікарыя і катэхета ў парафію Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Слабодка Браслаўскага пав. і дэканата, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. З 1935 катэхет парафіі Перамянення Пана ў в. Германавічы Дзісенскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. У 1937 служыў у касцёле св. Міхала Арханёла ў мяст. Ашмяны, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1938 капелан вайсковага шпіталя ў Гродне. На 1.1.1939 капітан капелан рэзерву. Мабілізаваны 28.4.1939. З 15.9.1939 у Падляшскай кавалерыйскай брыгадзе (Польшча). Трапіў у палон у ліп. 1940. Этапаваны з інтэрнаванымі з Літвы ў Казельск-II, 2.7.1941 у Гразавец, Расія. Праводзіў таемную душпастырскую дзейнасць. Сузаснавальнік рыцарскага Марыйнага кола для зняволеных афіцэраў, апякун скульптуры Маці Божай Казельскай. Вызвалены. 1.9.1941 атрымаў прызначэнне на працу капелана 5-га артылерыйскага палка, які фарміраваўся ў Тацішчаве (Расія). З 28.8.1942 капелан Камендатуры эвакуацыйнай акругі № 1. З'ехаў з СССР у Іран. Служыў нам. пробашча, а з 14.6.1943 пробашчам 3-й дывізіі Карпацкіх стральцоў. 2.9.1943 прызначаны пробашчам 5-й крэсовай пяхотнай дывізіі. Меў званне падпалкоўніка. Прымаў удзел у італьянскай кампаніі, бітвах пад Монтэ-Касіна, Балонняй і Анконай. Пазней пробашч польскай дывізіі ў Вялікабрытаніі. З 1950 пробашч парафіі Бромптан

Араторы (*Brompton Oratory*) у Лондане. Рэктар Інстытута і Рэлігійна-Рыцарскага Кола Марыянскай Пераможнай НПМ. Дапамагаў удовам і сіротам салдат 5-й крэсовай пяхотнай дывізіі. 10.4.1946 адзначаны ордэнам *Virtuti Militari* 5-га класа. Двойчы ўзнагароджаны «Крыжам Мужных», тройчы «Залатым крыжам заслугі з мячамі», «Памятным крыжам Монтэ-Касіна», а таксама італьянскім *Croce al Valor Militare*. Пасмяротна адзнаны «Срэбным крыжам *Virtuti Militari*», «Залатым крыжам Палявога біскупа Польскай арміі».

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu*; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЮЗВІК Юзаф Францавіч** [1873—24.8.1948, Варшава], святар. Скончыў школу ў Кіеве, Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (12.12.1910). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Дарава Баранавіцкага пав. і дэканата, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Пад ціскам уладаў пераведзены ў парафію Унебаўзяцця НПМ у Іркуцку, у 1916 у касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ у Кастраме, Расія, дзе арыштаваны і адпраўлены як «здраднік радзімы» ў Яраслаўскую турму. Вызвалены ў 1917. Вярнуўся ў Кастраму. З 1923 адміністратар касцёлаў св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Архангельску, Узвышэння Св. Крыжа ў Волагдзе, Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Рыбінску, НПМ у Туле, Узвышэння Св. Крыжа ў Яраслаўлі. Арыштаваны АДПУ ў 1928 у Маскве. Зняволены ў Бутырскай турме. Абвінавачваўся ў «шпіянажы на карысць Польшчы, Францыі і Італіі». У крас. 1929 асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. 5.7.1932 арыштаваны па групавой справе каталіцкіх святароў. Вывезены ў Бутырскую турму. 15.9.1932 вызвалены

праз абмен палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. Выехаў у Польшчу. Служыў у Варшаўскай архідыяцэзіі, катэхетам у в. Гузава, у парафіі Віскіткі (*Wiskitki*), Польшча. З 1.7.1939 капелан шпіталя Дзіцяці Езуса ў Варшаве.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь.*

**ЮЗВЯК Элеанора (Даніэла)** [1892, в. Паяздова, цяпер Польшча — 1.8.1943], назарэтанка, благаслаўлёная. З польскай сялянскай сям'і. У 1920 у Варшаве ўступіла ў Супольнасць Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. У 1923 у Гродне склала першыя законныя шлюбы, прыняла імя Даніэла ад Езуса і Беззаганнай Маці. Падчас 2-й сусветнай вайны жыла ў законным доме Хрыста Валадара ў Наваградку. Арыштавана немцамі 31.7.1943. Расстраляна з іншымі сёстрамі назарэтанкамі.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ЮНГ Эдвард Аляксандравіч** [26.8.1912, в. Рудкі (*Rudki*), Польшча — чэрв. 1941], святар. У 1933 скончыў гімназію А. Чартарыйскага ў Пулавах (*Puławy*), Польшча. Паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся на ф-це тэалогіі Віленскага ун-та імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (16.6.1940). Служыў у касцёле Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Рудзішкі, цяпер Літва (паводле іншых звестак, у парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў в. Жодзішкі, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.). Перад Вялікаднем 1941 пераведзены вікарыем касцёла св. Яна Апостала і Евы ў мяст. Кнышын (*Knyszyn*), Польшча. 24.6.1941 па дарозе да парафіян затрыманы савецкім патрулём. Нягледзячы на сведчанні парафіян, не вызвалены. Забіты на дарозе на Беласток.

Кр.: *Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЮРШАН Казімір Міхайлавіч** [1886, мяст. Бабінавічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. — 1974, Чыкага, ЗША], святар. З каталіцкай мяшчанскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1909). Прызначаны вікарыем парафіі св. Міхала Арханёла ў Навагрудку Мінскай губ., цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1912 адміністратар касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў Бабінавічах. Арыштаваны 31.1.1926. Асуджаны 18.6.1926 асобай нарадай пры АДПУ за «сувязь з латвійскімі разведвальнымі органамі» да 3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Пасля сканчэння тэрміну высланы ў Краснаярскі край. Зноў арыштаваны і 20.8.1933 перавезены ў Бутырскую турму Масквы. Вызвалены 19.10.1933 з 9 іншымі святарамі праз абмен вязнямі паміж Літвой і СССР. У 1938 жыў на тэрыторыі дыяцэзіі Панявежыс у мяст. Анталептэ, Літва. У 1944 выехаў у Германію, быў капеланам літоўскіх эмігрантаў. З 1945 у ЗША. Рэабілітаваны 31.7.1992 пракуратурай БВА. Асабовая справа Ю. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Литургический календарь; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЮРЭВІЧ Баляслаў Казіміравіч** [1887, Гарбачова-Абітокі Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Расонскі р-н Віцебскай вобл. — 3.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], святар, службовец.

З 1908 чыноўнік Паўн.-Зах. чыгункі. У сярэдзіне 1920-х скончыў падпольную духоўную семінарыю арцыбіскупа Я. *Цепляка* ў Ленінградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. Прыняў сакрамэнт святарства з рук біскупа Ціраспаля **А. Зэра** (крас. 1926). Служыў вікарыем касцёлаў Найсвяцейшага Сэрца Езуса ў Паргалава, Унебаўзяцця НПМ, св. Аляксея, Звеставання НПМ і св. Францішка ў Ленінградзе. Арыштаваны 15.8.1929. Асуджаны за «шпіянаж» і «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл., куды прыбыў 6.10.1930. Арыштаваны 5.7.1932 у лагеры па справе каталіцкага духавенства. Следства хадайнічала аб неабходнасці ўтрымання Ю. асобна ад іншых вязняў. У 1937 пераведзены на турэмны рэжым. Прыгавораны 9.10.1937 тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЮЦКЕВІЧ Ян Антонавіч** [23.6.1885, Мінск — пасля 1933, Комі АССР], касцёльны актывіст, бацька Ванды Янаўны *Юцкевіч*[1]. З польскай мяшчанскай сям'і. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. У 1920—1930-я старшы машыніст Мінскай электрастанцыі. Быў жанаты, меў восем дачок і сына. Актыўны ўдзельнік касцёльнага камітэта парафіі Найсвяцейшай Тройцы (св. Роха) на вул. Залатая Горка ў Мінску. Арыштаваны 18(ці 21).3.1933 у касцёле. Асуджаны 10.5.1933 за «антысавецкую агітацыю» і «шпіянаж на карысць буржуазнай Польшчы» да

[1] **Юцкевіч Ванда Янаўна** [4.10.1918, Мінск — 30.6.2005, Мінск], член касцёльнага камітэта. Скончыла польскую школу ў Мінску, тэхнікум сувязі. З 1936 на інваліднасці, мела пяць дзяцей. Актыўна змагалася за вяртанне кальварыйскага, Чырвонага, катэдральнага касцёлаў у Мінску, пісала звароты да ўладаў, дзяжурыла ў культавых будынках. Пры вяртанні катэдральнага касцёла (дзе размяшчаўся Дом фізкультуры) была некалькі разоў збіта спартсменамі, якія не хацелі вызваляць будынак.

3 гадоў ППЛ. Этапаваны ў адзін з лагераў АДПУ Комі АССР. Далейшы лёс невядомы.

З Ю. па адной справе (№ 19335-с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) праходзілі, асуджаны, рэабілітаваны (14.9.1965 Вярхоўным судом БССР) бацька пяці дзяцей, шавец-саматужнік **Быліна Адам Францавіч** (н. у 1886), сяляне-аднаасобнікі: бацька чатырох дзяцей **Доўнар-Запольскі Язэп Адамавіч** (1886), **Кулікоўскі Канстанцін Феліцыянавіч** (1872), бацька чатырох дзяцей **Куніцкі Аляксандр Аляксандравіч** (1880), цясляр **Рабчынскі Апалінарый Апалінар'евіч** (1873), рабочая **Трэгубовіч Францішка Уладзіславаўна** (1894), яе браты, бацька дваіх дзяцей, шавец **Трэгубовіч Язэп Уладзіслававіч** (1891) і маляр **Трэгубовіч Браніслаў Уладзіслававіч** (1885), яго жонка, хатняя гаспадыня **Трэгубовіч Ціна Лявонцеўна** (1892), сталяр-саматужнік **Шунейка Язэп Рыгоравіч** (1867). Далейшы іх лёс таксама невядомы.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ЮШКО Ганна Віктараўна** [1885, мяст. Пуньцэ Рэжыцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія — ?], актыўная парафіянка касцёла св. Казіміра ў Ленінградзе. Арыштавана 8.5.1931. Праходзіла па «справе С. *Войны* і інш.». У 1931 вызвалена. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЯГЕЛЬНІЦКІ Сігізмунд-Ян-Тадэвуш (Пшэмыслаў) Францавіч** [8.11.1913, в. Манастырыска, цяпер Украіна — пасля 1974], францішканец. З польскай сялянскай сям'і. Пасля 6 гадоў вучобы ў прыватнай гімназіі ў Калушы, Украіна, працягваў адукацыю ў 3-й дзяржаўнай гімназіі імя Стэфана Баторыя ў Львове. 5.10.1933 уступіў у ордэн айцоў францішканцаў канвентуальных і прыняў імя Пшэмыслаў. Склаў першыя (6.10.1934) і вечныя (1.11.1938) законныя шлюбы. Прыняў сакрамэнт святарства (16.8.1939). Служыў адміністратарам касцёла Маці Божай Вастрабрамскай у в. Язна, цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 25.6.1941. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі паражэнчага характару». Этапаваны ў адзін з лагераў Омскай вобл. Вызвалены пастановай УНКВД Омскай вобл. 9.12.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Служыў капеланам капліцы Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў Петрапаўлаўску Казахскай ССР. Увесну 1942 з польскай арміяй пакінуў СССР. Трапіў у Тэгеран, потым Ірак, Ліван. У мэтах апекі над палякамі выехаў у 1943 у Мексіку, дзе служыў да лют. 1944. Пазней працаваў у Паўн. Афрыцы. Пасля вайны жыў у Вялікабрытаніі, дзе некалькі гадоў быў магістрам навіцыяту францішканскіх клерыкаў. У 1967—68 пробашч парафіі Вальверхэмптан (*Wolverhampton*). З 1970 у Доме марыянаў у Лондане (*London*). Рэабілітаваны. Асабовая справа Я. № 6234-п з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЯЖДЖЭЎСКІ Ян** [7.1.1903, в. Веле (*Wiele*), Польшча — 16.3.1985, Пэтэрбора (*Peterborough*), Вялікабрытанія], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную

семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (6.6.1932). Прызначаны вікарыем касцёла Унебаўзяцця НПМ у в. Налібакі, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. З 1937 в. а. адміністратара парафіі на хут. Рубрын Лунінецкага дэканата, цяпер Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл. Потым капелан батальёна ў мяст. Давыд-Гарадок, цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл., таксама служыў у касцёле Божага Цела. Арыштаваны ў верас. 1939. Этапаваны ў адзін з Сібірскіх лагераў ГУЛАГа. Вызвалены па амністыі для польскіх грамадзян, верагодна, восенню 1941. Служыў капеланам у II корпусе арміі генерала **У. Андэрса.** З 1943 капелан лагераў польскага цывільнага насельніцтва ў Іране, Палесціне (да 1947). З 29.9.1949 у Вялікабрытаніі. Пробашч у часовых парафіях у Корнуоле (*Kornwalia*), Дэване (*Dewon*), Брыстолі (*Brystol*). З канца 1956 у Сібсан Кэмп (*Sibson Camp*), Вандсфардзе (*Wandsford*). З кастр. 1968 на пенсіі.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЯЗЕВІЧ Вацлаў Феліксавіч** [24.11.1907, в. Стайкі Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. — 15.7.1978, Люблін (*Lublin*), Польшча], законнік. 12.8.1924 прыняў першыя законныя шлюбы ў Калішы (*Kalisz*), Польшча. З 1925 выкладаў лацінскую і грэцкую мовы ў калегіі езуітаў у пас. Альбярцін Слонімскага пав., цяпер у межах Слоніма, райцэнтра Гродзенскай вобл. З 1933 катэхет малой семінарыі ў Лэнчыцы (*Łęczyca*), Польшча. Скончыў тэалагічныя курсы езуіцкага калегіума імя А. Баболі ў Любліне (1938). Прыняў сакрамэнт святарства (24.6.1937). Жыў у законным доме імя А. Баболі. З 1939 у езуіцкім калегіуме ў Пінску, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Арыштаваны ў 1940. Неўзабаве вызвалены. Служыў пробашчам касцёла Звеставання НПМ у в. Гарадзец, цяпер Кобрынскі р-н

Брэсцкай вобл., парафіі Унебаўзяцця НПМ у Пружанах, цяпер райцэнтр Брэсцкай вобл. Падчас 2-й сусветнай вайны дапамагаў хавацца яўрэям. Арыштаваны МДБ 2.8.1948 у Нясвіжы, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Асуджаны да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Азёрны лагер МДБ Іркуцкай вобл. (Тайшэт). З 1958 пераведзены ў Цемнікоўскі лагер МДБ Мардоўскай ССР. Вызвалены 24.3.1959. Дэпартаваны праз Брэст у Польшчу. Працаваў у Лодзі (*Łódz*) (1959—60), Быдгашчы (*Bydgoszcz*) (1960—67), Варшаве (*Warszawa*) (1970—71), Торуні (*Toruń*) (1971—72), Любліне (*Lublin*) (1972—78).

Кр.: *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЯЗЕРСКІ Ян** [1911—1943], святар. Скончыў Пінскую духоўную семінарыю. Прыняў сакрамэнт святарства (1938). Служыў у касцёле св. Міхала Арханёла ў Навагрудку, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. Потым пробашч парафіі св. Ганны ў в. Гарадзішча, цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны гестапа ў Баранавічах. Расстраляны каля в. Калдычэва Баранавіцкага р-на.

Кр.: *Spis kościołów i duchowieństwa diecezji pińskiej*; *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ЯЛБЖЫКОЎСКІ Рамуальд Янавіч** [7.2.1876, мяст. Лянтовы Дуб (*Łętowie Dąb*) каля Ломжы (*Łomża*), Польшча — 19.4(ці 6).1955], святар. Скончыў духоўную семінарыю ў г. Сейны (*Sejny*), Польшча, і духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу са ступенню магістра тэалогіі (1902). Прыняў сакрамэнт святарства (9.3.1901). Прызначаны вікарыем парафіі Вонсаш (*Wąsosz*), Польшча. Потым капелан Сейненскага біскупа. У 1902—08 выкладаў у Сейненскай семінарыі. З 1910 канонік

капітулы Сейненскай дыяцэзіі. У 1914—15 знаходзіўся ў Магілёве. З 1916 працаваў у Мінску, ствараў камітэты дапамогі бежанцам-палякам. У 1917—18 у Сейненскай дыяцэзіі, генеральны вікарый парафій яе ўсх. часткі. Выдаваў час. «Tygodnik Katolicki» («Каталіцкі штотыднёвік»). У 1918—26 біскуп-суфраган Сейненскай дыяцэзіі. Арыштаваны ў жн. 1920 у Ломжы. Вызвалены пры наступленні Войска Польскага 20.8.1920. Прызначаны 14.12.1925 ардынарыем нядаўна створанай Ломжынскай дыяцэзіі. 24.6.1926 пераведзены ў Вільню. Арцыбіскуп і Мітрапаліт Віленскі. Зноў арыштаваны ў кастр. 1939. Абвінавачваўся ў «антысавецкай дзейнасці». Вызвалены ў сак. 1941 па хадайніцтве Ватыкана. Прызначаны Апостальскім Адміністратарам у дыяцэзіях Літвы, Беларусі, Латвіі і ўсх. раёнаў Польшчы. Падчас 2-й сусветнай вайны Я. надзяліў дэканаў паўнамоцтвамі генеральных вікарыяў, абавязаў святароў не пакідаць свае парафіі і не рабіць ніякіх зменаў без узгаднення з касцёльнымі ўладамі. 22.3.1942 вымушаны пакінуць Вільню і ў суправаджэнні свайго канцлера адправіцца ў кляштар у Марыямпалі. У Вільню вярнуўся ў жн. 1944, працягваў кіраўніцтва архідыяцэзіяй. З пачаткам акцыі т. зв. рэпатрыяцыі савецкая ўлада змушала арцыбіскупа і польскі клер пакінуць межы СССР і выехаць у Польшчу. Я. адмовіўся, а пробашчам загадаў не пакідаць душпастырскіх пастоў, пакуль у іх застаюцца вернікі. Выключэнне рабіў для тых святароў, якім пагражалі рэпрэсіі, а таксама для маладзейшых, каб уберагчы іх ад рэпрэсій. Арыштаваны НКВД 23.1.1945. У чэрв. 1945 дэпартаваны ў Польшчу. Застаўся ў Беластоку, аднавіў дзейнасць духоўнай семінарыі, пераведзенай з Вільні.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Литургический календарь; ЭГБ*, т. 6—2; *Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990.*

**ЯНКОЎСКІ Чэслаў Францавіч** [28.11.1906, в. Мокры Ляс (*Mokry Las*) Мазавецкага пав. Варшаўскай губ., цяпер Польшча — 22.10.1982, в. Мінойты, Лідскі р-н Гродзенскай вобл.], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў гімназію ў г. Астралэнка (*Ostrołęka*, Польшча) (1925), Віленскую духоўную семінарыю. Адначасова вучыўся ва ун-це імя Стэфана Баторыя. Прыняў сакрамэнт святарства (12.6.1932). Праз 2 гады службы вікарыем касцёла св. Яна Хрысціцеля ў в. Камаі Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. захварэў на сухоты і з сак. 1934 лячыўся ў Закапанэ (*Zakopane*), Польшча. Са жн. 1935 адміністратар касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Андрэя Баболі ў в. Мінойты Лідскага дэканата. 24.12.1940 атрымаў ад савецкіх уладаў загад пакінуць плябанію на працягу 24 гадзін. Жыў за 4 км ад касцёла ў в. Паддубна ў парафіяніна **Юзафа Змітровіча**. Арыштаваны НКВД у канцы чэрв. 1941 з М. *Маеўскім*. Вызвалены немцамі. Падчас акупацыі хаваў святароў **Аляксандра Зянкевіча** з Наваградка і **Антона Варпяхоўскага** з Раготна. Ратаваў моладзь ад вывазу ў Германію (выдаваў адпаведныя дакументы), хаваў ад вывазу касцёльныя званы. Арыштаваны 15.8.1950 (14.8.1949) у в. Паддубна. Змешчаны ў гродзенскай турме. Абвінавачаны ў варожым стаўленні да савецкай улады і ў кантактах з АК — аддзелам **Чэслава Заянчкоўскага**, для якога ў Дакудаве адпраўляў набажэнствы і спавядаў партызан. Першы суд прызнаў святара невінаватым, але не вызваліў. Асуджаны 8.10.1951 за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Оршу, адтуль у лагер Ерцава каля Варкуты, пасля ў лагер ва Углічы за Масквой. Вызвалены датэрмінова са зняццем судзімасці ў сак. 1956. Рэабілітаваны 2.3.1956 трыбуналам БВА. 17.11.1956 зарэгістраваны на старым месцы службы. Асабовая справа Я. № п-8849 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; НАРБ*, ф. 952, в. 3, с. 2, л. 114; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego re-*

*presjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Беларуси в 1945—1990; Krahel T. Duchowni archidiecezji wileńskiej represjonowani w latach okupacji sowieckiej (1939—1941).*

**ЯНОВІЧ Казімір Францавіч** [1891 — ?], святар. Арыштаваны ў 1930. Зняволены ў Мінскай унутранай турме АДПУ. Этапаваны ў адзін з лагераў ГУЛАГу. Вызвалены ў 1934. Служыў пробашчам парафіі Маці Божай Ружанцовай у Полацку, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЯНОЎСКІ Севярын** [1895—24.11.1966], святар. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, Варшаўскі ун-т са ступенню доктара тэалогіі. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). З 1922 вікарый парафіі ў мяст. Астравец, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1928 вікарый фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. З 1929 пробашч парафіі св. Паўла ў в. Бяла-Вака Троцкага дэканата, цяпер Літва. З 1939 абслугоўваў касцёл Перамянення Пана ў в. Вавёрка, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 18.9.1949. Асуджаны Гродзенскім абл. судом 20.4.1950 за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. 22.9.1954 тэрмін паменшаны да 10 гадоў. Вызвалены ў кастр. 1955 датэрмінова пастановай Вярхоўнага Савета СССР. 9.5.1956 атрымаў рэгістрацыю на старым месцы службы. У 1958 выехаў у Польшчу.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis; НАРБ,* ф. 952, в. 3, с. 2, л. 114; *Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS.*

**ЯНТКЕВІЧ Галіна (Роза) Фадзееўна** [1897, Віцебск — ?], законніца, настаўніца. З сям'і польскага службоўца. Скончыла Вышэйшыя жаночыя курсы. Прыняла першыя законныя шлюбы з імем Роза. Арыштавана 26.11.1923 у Маскве па «справе рускіх католікаў». Асуджана 19.5.1924 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППЛ. Зняволена ў Іркуцкай турме. Пасля сканчэння тэрміну (1927) прыгаворана да 3 гадоў ссылкі. Вызвалена ў 1930 з забаронай жыць у 6 буйных гарадах СССР. Жыла ў Малаяраслаўцы Калужскай вобл. Зноў арыштавана 1.2.1935 па групавой справе каталіцкага духавенства. У перыяд 16—19.11.1935 вызвалена пастановай спецкалегіі Варонежскага абл. суда. Далейшы лёс невядомы.

15.5.1920 у Омску арыштаваны інжынер тэхнічнага аддзела (?) **Янткевіч Фадзей Мікалаевіч** (н. у 1861 у Варшаве), бацька Галіны-Розы Янткевіч. Асуджаны Омскай губ. ЧК за службу Калчаку да зняволення ў лагеры. Праз некаторы час вызвалены па амністыі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Омскай вобл. 26.4.1993.

3.6.1920 у Омску арыштаваны выкладчык замежных моваў **Янткевіч Генрых Фадзеевіч** (н. у 1896 на ст. Корсаўка Віцебскай губ.), сын Фадзея Янткевіча і брат Галіны-Розы Янткевіч. Асуджаны Омскай губ. ЧК за службу Калчаку да зняволення ў лагеры. Праз некаторы час вызвалены па амністыі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Омскай вобл. 26.4.1993.

Кр.: *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР; Жертвы политического террора в СССР.*

**ЯНУКОВІЧ Пётр Янавіч** [18.10.1863, в. Дзянісава Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — 27.8.1937, Мінск, турма НКВД], святар. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў народную школу, 4 класы Віленскай гімназіі (1886), Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1891, Коўна,

цяпер Каўнас, Літва). Да мая 1892 заставаўся без пасады з-за перашкодаў з боку ўладаў. Пасля накіраваны ў дапамогу пробашчу касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Ноўгарадзе, Расія. Наведваў католікаў, якія пражывалі на тэрыторыі Ноўгарадскай губ. У ліп. 1892 прызначаны вікарыем парафіі Унебаўзяцця НПМ у Люцыне Віцебскай губ., цяпер Латвія. 5.3.1893 прымусова высланы ўладамі ў кляштар дамініканцаў у Аглоне, Латвія, за тое, што сядзеў у судзе падчас прысягі праваслаўнага духавенства. Праз год зноў прызначаны вікарыем парафіі ў Ноўгарадзе. З мая 1897 пробашч касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Камень Мінскага дэканата, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Адклікаены з парафіі з-за даносаў на яго адміністрацыйным уладам і паліцыі. З сак. 1902 да жн. 1904 капелан філіяльнага (парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў Казані) касцёла Беззаганнага Зачацця НПМ у Пензе, Расія. Адначасова працаваў катэхетам у мясцовых школах. У жн. 1904 падчас руска-японскай вайны прызначаны ваенным капеланам у Маньчжурыю і Усурыйскі край. У снеж. 1905 пераведзены адміністратарам касцёла св. Юрыя ў мяст. Дуброўна Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1908 да крас. 1911 пробашч парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Быхаве Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., дэкан Рагачоўска-Быхаўскага дэканата. Двойчы асуджаны павятовым судом у Быхаве, раз на 4 дні хатняга арышту, за раздачу брашур у абарону каталіцкай веры. Пазней служыў у касцёле Божага Цела ў мяст. Нясвіж Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. З 1.10.1912 адміністратар парафіі Звеставання НПМ у Санкт-Пецярбургу, касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў пас. Паргалава, цяпер Ленінградская вобл., Расія. У 1916—20 пробашч парафіі св. Аляксея ў Петраградзе. З 9.9.1919 на працягу 5 дзён зняволены. Арыштаваны 10.5.1920. Абвінавачваўся ў «захаванні ў сутарэннях касцёла мёртвых целаў палякаў у металічных трунах з мэтай вывазу іх у Польшчу». 14.9.1920 асуджаны на год зняволення, ад якога

вызвалены па амністыі. 1.2.1921 прызначаны адміністратарам касцёла св. Францішка ў Петраградзе, цяпер Санкт-Пецярбург, Расія. За непадпісанне навязанай уладамі дамовы з урадам на выкарыстанне адзяржаўленых касцёлаў і за ўдзел у сходах святароў, скліканых арцыбіскупам Э. *Ропам* і арцыбіскупам Я. *Цеплякам* для абмеркавання новай сітуацыі для касцёла, выкліканы 3.3.1923 з Я. *Цеплякам* і інш. з Петраграда ў Маскву і 9.3.1923 арыштаваны разам з імі. На групавым працэсе ў Маскве абвінавачаны ў «дапамозе *Цепляку* і *Будкевічу* ў іх злачынствах, адмове выканання законаў і агітацыі супраць савецкай улады». Асуджаны 25.3.1923 да 3 гадоў турмы і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Зняволены ў Бутырскай, потым Лефортаўскай турме Масквы. Вызвалены. Зноў служыў у парафіі касцёла Звеставання НПМ у Петраградзе. З 1926 пробашч касцёла Звеставання НПМ у в. Фашчаўка Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. У 1932 у касцёле св. Кацярыны Александрыйскай у Ленінградзе, у капліцы Найсвяцейшага Сэрца НПМ. У канцы 1933 — пачатку 1934 у парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Шклове, цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны 9.6.1937. Асуджаны 25.8.1937 (з шэрагам праваслаўных і рыма-каталіцкіх святароў, старастам і парафіянамі касцёла і прыхаджанамі царквы) паводле пастановы калегіі НКВД за «шпіянаж» да ВМП. Расстраляны са святаром К. *Андрэкусам* і інш. Рэабілітаваны 22.3.1989 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа Я. і інш. № 9711 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR; Литургический календарь*; *Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. Мн., 2007.

**ЯНУШКЕВІЧ Клімент Антонавіч** [1870 — ?], святар. Верагодна, служыў у Мінскай дыяцэзіі. Арыштаваны ў 1928 (?). Этапаваны ў Салавецкі лагер АДПУ Архангельскай вобл. Знаходзіўся там да 11.9.1934. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР*.

**ЯРАШЭВІЧ Альбін Мацвеевіч** [1879, в. Ясянова Даліна (*Jasionowa Dolina*) Сакульскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 18.7.1946], святар. З польскай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1900), Фрыбургскі ун-т у Швейцарыі са ступенню магістра багаслоўя (1914). Прыняў сакрамэнт святарства (1901). З 1903 пробашч парафіі Беззаганнага Зачацця НПМ у Калінуўцы (*Kalinówka*) Кнышынскага дэканата, Польшча. У 1905 пераведзены ў касцёл у мяст. Страбля (*Strabla*) каля Бельска-Падляскага (*Bielsk Podlaski*). У 1908—09 пробашч парафіі Звеставання НПМ у в. Альковічы Вілейскага дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З 1915 пробашч касцёла св. Міхала Арханёла ў в. Лужкі Дзісенскага пав. Глыбоцкага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. З 1919 прафесар Віленскай духоўнай семінарыі. З 1927 пробашч і дэкан касцёла св. Вацлава ў Ваўкавыску аднайменнага дэканата, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл. З 1937 пробашч фарнага касцёла св. Францішка Ксаверыя ў Гродне, гродзенскі дэкан, ганаровы канонік. У жн. 1941 заснаваў Грамадскі камітэт дапамогі ахвярам вайны, дзейнасць якога была забаронена нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў кастр. 1941. Двойчы — у кастр. 1942 і 23.9.1943 — арыштаваны гестапа. Першы раз тры тыдні ўтрымліваўся ў гродзенскай турме як закладнік, другі раз змешчаны пад варту ў беластоцкую турму і вызвалены 9.11.1943. У трэці раз арыштаваны 20.7.1945 супрацоўнікамі НКВД. Пад следствам знаходзіўся ў гродзенскай турме МДБ. Абвінавачаны ў «правядзенні антысавецкай агітацыі

і стварэнні Грамадскага камітэта дапамогі ахвярам вайны». Асуджаны 24.12.1945 ваенным трыбуналам войскаў НКВД да 8 гадоў ППЛ і 3 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 25.9.1992 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда. Асабовая справа Я. № п-14934 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродненскай вобл.

Кр.: *Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis; Synodus archidioecesana vilnensis*; *НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992; ЭГБ*, т. 6—2; *Dzwonkowski, Leksykon duchowieństwa polskiego represjowanego w ZSRS; Ярмусик, Католический Костел в Белоруссии в годы второй мировой войны*.

**ЯРАШЭВІЧ Станіслаў Антонавіч** [5(17).5.1889, в. Селішча Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. — 10.3.1938, Мінск, турма НКВД], святар. З бел. ці польскай сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1912). Прызначаны вікарыем касцёла Маці Божай Ружанцовай у Полацку Віцебскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл. З 1915 пробашч парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Шклове Магілёўскага пав., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1922 адміністратар парафіі НПМ у Чэрыкаве Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., таксама абслугоўваў філіяльны касцёл Унебаўзяцця НПМ у в. Вародзькаў Чэрыкаўскага пав., цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл., парафію Нараджэння НПМ у в. Радамля Чавусаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл., касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ у Крычаве, дэкан Чэрыкава-Чавускага дэканата. З 1930 пробашч касцёла св. Сымона і Алены ў Мінску. Паводле некаторых звестак, наведваў і парафію св. Дамініка ў в. Хатаевічы, цяпер в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай вобл. Арыштаваны 13.9.1933. Абвінавачваўся ў «шпіянажы на карысць Польшчы», але справа была спынена і Я. вызвалены. Служыў

у касцёле Нараджэння НПМ у Барысаве, цяпер райцэнтр Мінскай вобл. Зноў арыштаваны 14.11.1937 у Барысаве па адрасе: вул. Савецкая, д. 2. Асуджаны 3.1.1938 тройкай НКВД за «шпіянаж на карысць Польшчы» і як «член ПАВ» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 18415-с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 31.3.1934 паводле пастановы калегіі АДПУ, па другой (№ 24356-с) 28.4.1989.

Кр.: *Памятная книжка Витебской губернии; Памятная книжка Могилевской губернии; Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Hlebowicz, Katolicyzm w państwie sowieckim 1944—1992*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР.*

**ЯРМАЛОВІЧ Антоні Янавіч** [9.1.1892, Орша Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл.— 3.11.1937, ст. Мядзведжая Гара (Сандармох), каля Мядзведжагорска Карэльскай АССР], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Петраградзе. Прыняў сакрамэнт святарства (1917). Прызначаны вікарыем у Мінск. Арыштаваны ў крас. 1919 як закладнік. Вызвалены дзякуючы хадайніцтву польскіх уладаў. Зноў арыштаваны ў студз. 1921 у Магілёве. Пасля вызвалення адміністратар касцёла св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Шклове Магілёўскага пав., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. З 1924 пробашч парафій Найсвяцейшай Тройцы ў Себежы, св. Юрыя ў Невелі, Сэрца Пана Езуса ў Новасакольніках (1925), НПМ і св. Антонія Падуанскага ў Вялікіх Луках (1925—30) Пскоўскай вобл., Расія. З 1930 у касцёле св. Апосталаў Пятра і Паўла ў Ноўгарадзе, Расія. Чарговы раз арыштаваны 29.10.1933 у Ленінградзе. Абвінавачаны ў «правядзенні антысавецкай агітацыі» і «шпіянажы на карысць Польшчы». Асуджаны калегіяй АДПУ да 10 гадоў ППЛ. Этапаваны ў Салавецкі лагер НКВД Архангельскай вобл. Потым пераведзены ў Беламорска-Балтыйскі лагер АДПУ Архангельскай вобл. (ст. Кузема). Прыгавораны 29.10.1937 лагернай тройкай да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Elenchus cleri et ecclesiarum archidioeceseos Mohiloviensis*; *Осипова, Гонения на Католическую Церковь в СССР*; *Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Литургический календарь; Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЯРОШКА Адольф** [25.2.1902 — ?], святар. Прыняў сакрамэнт святарства (1931). З 1932 катэхет і вікарый парафіі Перамянення Пана ў в. Германавічы Дзісенскага пав. Мёрскага дэканата, цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. З 1935 вікарый касцёла Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Карыцін (*Korycin*), Польшча. З 1938 вікарый касцёла св. Агнешкі ў в. Гоняндз (*Goniądz*) Беластоцкага пав. Кнышынскага дэканата, цяпер Польшча. На 1.1.1939 капітан, капелан рэзерву. Мабілізаваны 28.4.1939 як капелан у Ваўкавыску. Арыштаваны. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЯСІНСКІ Ксаверы** [1868 — ?], святар. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу. Прыняў сакрамэнт святарства (1888). У 1908—17 адміністратар парафіі св. Апосталаў Пятра і Паўла ў в. Свержань Мінскага пав., цяпер Новы Свержань Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл., касцёла св. Ганны ў мяст. Койданава Мінскага пав., цяпер райцэнтр Дзяржынск Мінскай вобл., парафіі Узвышэння Св. Крыжа ў мяст. Рунданы (Рундэны), Латвія. Магчыма, арыштаваны пасля 1918. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Peszkowski, Zdrojewski, Katoliccy duchowni w golgocie Wschodu.*

**ЯСІЦКІ Уладзіслаў** [1905 — кастр. 1942], святар. Уступіў у закон кармелітаў (1921). Прыняў сакрамэнт святарства (1928). Служыў пробашчам касцёла Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса ў в. Ілля Віленскага дэканата, цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны і зняволены фашыстамі ў Вілейскай турме. Расстраляны.

Кр.: *Losy Kościoła Katolickiego na Białorusi w latach 1917—1953.*

**ЯЧЭЙКА Антоні Ігнатавіч** [11.3.1873, в. Каралішчавічы Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — 27.8.1937, Мінск, турма НКВД], святар. З бел. сялянскай сям'і. Скончыў рэальнае вучылішча ў Мінску (1892), духоўную семінарыю ў Санкт-Пецярбургу (1896). Прыняў сакрамэнт святарства (снеж. 1896). З лют. 1897 вікарый катэдральнага касцёла Унебаўзяцця НПМ у Гомелі. З 24.9.1911 в. а. пробашча касцёла, з 12.12.1911 адміністратар касцёла св. Барбары ў Віцебску. 10.11.1912 прызначаны на пасаду гомельскага дэкана і 6.12.1912 змяніў Х. *Пржамоцкага*. У 1914—15 зноў служыў у гомельскім касцёле і ў парафіі Унебаўзяцця НПМ у в. Антушы, цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. З 1919 у парафіі Сноўск, цяпер Шчорс Чарнігаўскай вобл., Украіна. У сярэдзіне 1922 вызвалены з пасады гомельскага дэкана. З 2.10.1922 в. а. пробашча парафіі Апекі Маці Божай у в. Каралішчавічы, цяпер Мінскі р-н. Падчас арышту пробашч касцёла езуітаў св. Яна Караля ў в. Блонь, цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 7.6.1937 у в. Зарэчча Блоньскага сельсавета. Асуджаны (з шэрагам праваслаўных і рыма-каталіцкіх святароў, старастам і актыўнымі парафіянамі касцёла і прыхаджанамі царквы) 25.8.1937 паводле пастановы калегіі НКВД як «член ПАВ і за шпіянаж на карысць Польшчы» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.4.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа Я. № 24547-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Гл. таксама арт.: *Андрэкус* Канстанцін Антонавіч.

Кр.: *Памятная книжка Могилевской губернии; БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Dzwonkowski, Losy duchowieństwa katolickiego w ZSSR*; *Чаплинский, Осипова, Мартиролог Католической Церкви в СССР; Книга памяти расстрелянных и погибших в тюрьмах, лагерях и ссылках католических священнослужителей*; *З асабістага архіва У.Васькова; Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. Мн., 2007.

# Святыні Беларусі, што згадваюцца ў даведніку, і святары, якія ў іх служылі

## А

**Абольцы,** в. Талачынскага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл НПМ (с. 24, 170, 436);
святары[1]:
Жаўрыд Андрэй (да 1902),
Грацыс (1910-я),
Урублеўскі Баляслаў (да 1912),
*Цыбульскі* Францішак[2] (1913—17),
*Астрамовіч* Аляксандр Сцяпанавіч (1917—1920?),
1923 — без святара,
*Жаўнятовіч* Уладзіслаў Іпалітавіч (1926—27).

**Агароднікі** (Вашкевічы**)**, в. Лідскага р-на Гродзенскай вобл.,
філіяльны касцёл (парафіі Маці Божай Ружанцовай у в. Ельня) св. Яўхіма і Ганны (с. 8, 183, 300);
рэктары:
*Здановіч* Эдвард Лукашавіч (1927—35),
Зон Аляксандр-Эміліус (1935—36),
Папёл Лукаш (1937—38?),
*Адамскі* Фелікс (1938—39),
*Навачык* Войцэх Барталамеевіч (1938—50).

**Адамавічы,** в. Гродзенскага р-на,
касцёл Унебаўзяцця НПМ (с. 21, 300);

[1] Дэканы, пробашчы, адміністратары, капеланы, рэктары, вікарыі.
[2] Курсівам выдзелены прозвішчы персаналіяў, чые біяграфіі прыведзены ў даведніку, ці маюцца звесткі, што яны былі рэпрэсаваны.

святары:
*Навасадка* Юзаф Вінцэнтавіч (1933—39),
*Арлоўскі* Казімір (1939—50, 1955—87).

**Адэльск**, в. Гродзенскага р-на,
касцёл Унебаўзяцця НПМ (с. 19, 49, 367, 401);
святары:
Эйнер Ігнат (1903),
Варатынец Зянон (1909—17?),
Сакалоўскі Адольф (з 1918),
Пузырэўскі Марцін (1925—40?),
Клейна (Кляйно) Эдвард (1935—37?),
*Тамковіч* Алаізі Паўлавіч (1941—44),
*Сарока* Станіслаў (у другой палове 1940-х),
*Арановіч* Міхал Міхайлавіч (1953),
*Барташэвіч* Пётр Я. (1955—63).

**Азёры,** в. Гродзенскага р-на,
касцёл Унебаўзяцця НПМ (згарэў падчас 2-й сусветнай вайны) (с. 240);
святары:
Турлай Вацлаў (да 1916),
*Куксевіч* Францішак Янавіч (1916—36),
Гаўрыхоўскі Баляслаў (1937—39).

**Акалова,** в. Лагойскага р-на Мінскай вобл,
касцёл св. Міхала Арханёла (с. 124);
святары:
Гурко Юзаф Юзафавіч,
Іваноўскі Вячаслаў Аляксандравіч (да 1906),
Сымановіч Антоні (1906—08),
Мацкевіч Юры (1909—15?),
Аброцкі Уладзіслаў Юзафавіч (1916—18?),
*Глябовіч* Генрык (1941).

**Акцябр** (да 1964 **Старчыцы**), мяст. Салігорскага р-на Мінскай вобл.,
касцёл НПМ (існаваў да 1939) (с. 145);
святары:
Пярэкшліс Францішак (да 1911),
*Далецкі* Міхал (1911—18).

**Акцябр (Хатаевічы)**, в. Лагойскага р-на Мінскай вобл.,
касцёл св. Дамініка (с. 100, 124, 392, 479);
святары:
Гурко Юзаф Юзафавіч,
Пацэвіч Вацлаў (1909—12),
Аброцкі Уладзіслаў Юзафавіч (1913—15),
Мацкевіч Юры (з 1915),
*Ярашэвіч* Станіслаў Антонавіч (?) (паміж 1930 і 1933),
*Глябовіч* Генрык (1941),
*Сухарэвіч* Міхал Людвігавіч (1942—45);
арганіст:
*Вярбіцкі* Мікалай Мікалаевіч (да 1933).

**Альковічы,** в. Вілейскага р-на Мінскай вобл.,
касцёл Звеставання НПМ (с. 177, 261, 478);
святары:
*Ярашэвіч* Альбін Мацвеевіч (1908—09, 1914),
Петрыкоўскі Мечыслаў (да 1915?),
*Жэмла* Антоні (1925—31),
Пачкоўскі Уладзіслаў (1932—35),
Важны Юзаф (1935—38),
*Любецкі* Аляксандр Юзафавіч (1938—42).

**Альпень,** в. Столінскага р-на Брэсцкай вобл.,
грэка-каталіцкі касцёл св. Юзафа (с. 90);
святары:
Аношка Вацлаў (1926—35),
Фядзюк Януар (1936—37),

Жыдава Аўгусцін (1937—38),
*Вашчынскі* Пётр (1939—40?).

**Анжадава** (Анжадаў), в. Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і св. Анёлаў Ахоўнікаў (с. 79);
святары:
Азевіч Генрык (з 1917),
Жук Міхал (1928—37),
*Валадкевіч* Каспар Восіпавіч (1937—49).

**Анопаль,** в. Мінскага р-на,
касцёл св. Ганны (разабраны ў 1907) (с. 398);
святар:
*Тамашэўскі* Вітольд Адольфавіч (1906);

філіяльны касцёл Маці Божай Ружанцовай (пабудаваны ў 1908; зачынены і разабраны ў 1930-я) (с. 24, 256, 394);
рэктары:
*Астрамовіч* Аляксандр Сцяпанавіч (1913—15),
Кірыловіч Юзаф (1915—18?),
*Сямашка* Сігізмунд (паміж 1917 і 1920),
*Лісоўскі* Адам Юзафавіч (1919—21).

**Антушы,** в. Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.,
касцёл Унебаўзяцця НПМ (зруйнаваны ў 1990-я) (с. 64, 217, 259, 297, 358, 399, 482);
святары:
*Бузыцкі* Міхал Ігнатавіч (1901—09),
Боўтуць Аляксандр (1910—11),
*Каўчыньскі* Тэлесфар (1911—1912?),
*Тамашэўскі* Міхал Юр'евіч (1913—14),
*Ячэйка* Антоні Ігнатавіч (1914—15),
Матусевіч Юльян (1914—15),
*Рыла* Тэадор Людвікавіч (1916—17),

*Мустэйкіс* Казімір (1917—28?),
*Лупіновіч* Карл-Аляксандр Карлавіч (1920—21),
Валынец Баляславў (1921—29).

Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Калінкевіч, Пятроўскі, Сянкевіч.

**Асава**, в. Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Юрыя (с. 38);
святары:
Бурба Ян (з 1911),
Шымкунас Юзаф (1924—31),
Ганусоўскі Сікстус (1932—40?),
*Банькоўскі* Антоні Андрэевіч (1958—89).

**Асавая,** в. Столінскага р-на Брэсцкай вобл.,
касцёл Унебаўзяцця НПМ (с. 58, 357, 358);
святары:
Іваноўскі Станіслаў Аляксандравіч,
Кухарскі Ян Пятровіч (1900-я),
*Бірнік* Павел Бернардавіч (1915),
Барыс (Борыс) Ісідар (з 1916),
Янкоўскі Антон Казіміравіч (1927—28),
Яблонскі Баляслаў (1929—32),
*Рыла* Тэадор Людвікавіч (1931—32),
Пятранік Эміліян (1933—39),
*Рыжко* Станіслаў Уладзіслававіч (паміж 1939 і 1945).

**Асвея,** мяст. Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл Найсвяцейшай Тройцы (знішчаны ў 1937) (с. 151, 413);
святары:
Табора Сігізмунд (1897—1911),
Сямашка Дыянісій (1901),
*Дзядуль* Нікадзім Андрэевіч (1912—17),
Алехна Юзаф,

*Філіп* Адольф Готлібавіч (1923),
Меджыс Павел (1923—26).

Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Кімбрыс Станіслаў, Окала-Кулак Леапольд Сямёнавіч, Стацкевіч Фелікс.

**Асіповічы**, райцэнтр Магілёўскай вобл.
капліца (с. 394);
рэктар:
*Сямашка* Сігізмунд (паміж 1917 і 1920).

**Астравец,** райцэнтр Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Космы і Дам'яна (с. 260);
святары:
Абалевіч Павел (1915—19?),
Нямыцкі Пётр (19—39?),
Прэйсер Антоні (1936),
Адамовіч Ян Вікенцевіч (1937—42);

касцёл Узвышэння Св. Крыжа (с. 401, 474);
святар:
*Тамковіч* Алаізі Паўлавіч (з 1973).

Служылі ў Астраўцы, але невядома, у якім касцёле:
*Яноўскі* Севярын (1922—28),
*Інгялевіч* Юзаф Міхайлавіч (з 1958).

**Астрагляды (Астраглядавічы),** в. Брагінскага р-на Гомельскай вобл.,
касцёл Унебаўзяцця НПМ (с. 253);
святары:
Руткоўскі (1880-я),
Іваноўскі Станіслаў Аляксандравіч (да 1902),
Ярмаловіч Каміл (1902—03),
*Лаўрыновіч* Юльян (1903—25?).

**Астрамечава,** в. Брэсцкага р-на,
капліца (с. 159);
рэктары:
*Драздовіч* Ігнаці Юльянавіч (1932—37),
Ляшчынскі Баляслаў (1937—38),
Андрысяк Ксаверы (1939).

**Ахрэмаўцы (Бяльмонт),** в. Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл Узвышэння Св. Крыжа (с. 66, 152);
святары:
*Дзядуль* Нікадзім Андрэевіч (1927—30?),
*Буйноўскі* Вінцэнт (1930—46?).

**Ашмяны,** райцэнтр Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Міхала Арханёла (с. 119, 127, 176, 227, 270, 298, 306, 463);
святары:
*Нарушыс* Ян Ігнатавіч (1893),
Жаро (Жэра) Юзаф (1910-я),
Баброўскі Ксаверы (1910-я),
*Крапіўніцкі* Юзаф Казіміравіч (1910—11),
Гурскі Чэслаў-Вітальд (1912—18?),
Мікульскі Станіслаў (1915),
Пятровіч Францішак (1915),
Герасімовіч Генрык (з 1919),
*Голяк* Валяр'ян Антонавіч (1928—1939),
*Жэйдзіс* Сігізмунд Мартынавіч (1928),
*Гжэгорскі* Уладзіслаў Міхайлавіч (1928—29),
*Мяноўскі* Ян Пятровіч (1929—31).
*Юдыцкі* Віктар Віктаравіч (1937),
Высядлоўскі Станіслаў (1937),
*Маліноўскі* Юзаф (н. у 1906) (1937—39).

## Б

**Бабінавічы,** в. Лёзненскага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл Найсвяцейшай Тройцы (зруйнаваны пасля 2-й сусветнай вайны) (с. 134, 313, 466);
святары:
Мількевіч Нупрэй,
*Ожал* Антоні Вікенцевіч (1894—1900),
*Грашыс* Вінцэнт Вінцэнтавіч (1900—02),
Талюшыс Казімір (1902—07),
Валовіч Антоні (?) (1908—09),
Курляндскі Станіслаў (1910—11),
*Юршан* Казімір Міхайлавіч (1912—26).

**Баболева,** фальварак (?) у 20 км ад Мёраў, цяперашняе месцазнаходжанне ўстанавіць не ўдалося;
касцёл св. Андрэя Баболі (с. 126),
святары:
*Гой* Ян (1931),
Пяркоўскі Ян (1932—39).

**Бабоўня,** в. Капыльскага р-на Мінскай вобл.,
філіяльны касцёл (с.339);
святар:
*Пяткевіч* Юзаф Станіслававіч (1922—23).

**Бабровічы,** в. Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.,
грэка-каталіцкі касцёл св. Яна Евангеліста і св. Параскевы (с. 323);
святар:
*Пачопка* Баляслаў Антонавіч (1926—40).

**Бабруйск,** райцэнтр Магілёўскай вобл.,
касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ (с. 46, 98, 99, 172, 252, 297, 334, 350, 358);

святары:
Красоўскі Ян Вікенцевіч (1902—13),
Сухвалка Адам (1903—04),
Брэчка Ян (1905—07),
*Ройша* Альбін (1907—09),
*Ворслаў* Ян Юзафавіч (1909—11),
Сянкевіч Ян Дамінікавіч (1911—13),
Пацэвіч Вацлаў (1912—16?),
*Латарэвіч* Вінцэнт (паміж 1916 і 1919),
*Пучкар-Хмялеўскі* Адам Янавіч (1916—20),
*Рыла* Тэадор Людвікавіч (1922),
*Жаўрыд* Ян Раймундавіч (1922—28),
*Мустэйкіс* Казімір (1929—30),
*Выляжынскі* Францыск Францыскавіч (1930—34, 1941—42?),
*Барвіцкі* Чэслаў Войцэхавіч (1944),
*Грасевіч* Юзаф Юзафавіч (1944).
Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Аляхновіч, Ключынскі Вінцэнт.

**Бабруйшчына,** в. Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл св. Антонія Падуанскага (с. 157, 242, 315);
святары:
*Драгель* Генрык Уладзіслававіч (1917—22),
Борык Міхал (1927—32),
Вянцкевіч Пётр (1932—35),
*Кулікоўскі* Чэслаў Юзафавіч (1936—39),
*Павелец* Ян Юзафавіч (1941).

**Бакшты,** в. Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл.,
філіяльны касцёл св. Губерта (с. 160, 328, 395);
святары:
*Прамянецкі* Мечыслаў Казіміравіч (да 1928),
*Сянкевіч* Антоні Станіслававіч (1929—36),
Яскольскі Баляслаў (1937),
*Дубраўка* Нікадзім Янавіч (1938—39).

**Барадзінічы,** в. Браслаўскага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл св. Юзафа і НПМ (с. 9, 153, 157, 194, 254, 279, 451, 452);
святары:
*Акрэйць* Мечыслаў (1912—14),
Жук Міхал (з 1914),
*Драгель* Генрык Уладзіслававіч (1915—17),
*Шутовіч* Віктар Іванавіч (з 1917),
Мажэйка Станіслаў (1927—29),
*Інгялевіч* Юзаф Міхайлавіч (1929—35),
Важняк Юзаф (1937—39),
*Лаўцэвіч* Лявон (1944—50);
катэхеты:
*Дзям'ян* Юзаф (1932),
*Масевіч* Раман (1935—37).

**Баранавічы,** райцэнтр Брэсцкай вобл.,
касцёл Узвышэння Св. Крыжа (с. 51, 121, 205, 230, 326, 341, 352);
святары:
Жаландкоўскі Люцыян (1923—33),
Бохуш Казімір (1927—30),
Завадскі Эдвард (1933—35),
*Барысюк* Ян Казіміравіч (1933—42),
*Піваварскі* Францішак (1935—39),
*Краўчык* Вацлаў (1937—41),
*Рагоўскі* Станіслаў (1950-я),
*Росяк* Ежы (Юры) Францыскавіч (з 1979);
арганіст:
*Канікевіч* Леанард Любінавіч (1940-я);
стараста:
*Гібоўскі* Андрэй Іванавіч (1930-я — 1944);

касцёл св. Антонія Падуанскага (знішчаны) (с. 12, 94, 175, 264, 422);
святары:
Францкевіч,

*Война* Стэфан Мікалаевіч (1911—14),
*Маеўскі* Міхал Эразмавіч (1920—23),
Валасек Франц (1928),
*Хома* Эдвард-Антоні Міхайлавіч (1933—34),
*Александровіч* Антоні Леапольдавіч (1930—39),
*Жураўскі* Караль (1939—40).

**Баруны,** в. Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Апосталаў Пятра і Паўла і кляштар базыльян (с. 47, 214);
святары:
Харашуча Ян (1918—20?),
Пятроўскі Міхал (1919—21?),
*Бароўка* Юльян Баніфацавіч (1922—28?),
Славінскі Ян (1928—1939),
*Карпінскі* Фелікс Янавіч (да 1944).

**Барысаў,** райцэнтр Мінскай вобл.,
касцёл Нараджэння НПМ (першапачатковая назва — касцёл Унебаўзяцця НПМ ) (с. 69, 97, 135, 168, 216, 231, 436, 480);
святары:
Гзоўскі Нупрэй,
Лукашэвіч Ян Юзафавіч (да 1901),
Гурко Юзаф Юзафавіч (1902—18?),
*Гронскі* Юліян Міхайлавіч (1903—05),
*Цыбульскі* Францішак (1909—10),
Грыб Пётр (1910—11),
Клінт Мечыслаў (1911—12),
Лянтоўскі Аляксандр (1912—13),
*Ворслаў* Юзаф (1913—14),
Горыс Ісідар (1915),
*Жамойтук* Язэп-Станіслаў (1915—18),
*Було* Ян Георгіевіч (да 1922),
*Каспяровіч* Фелікс Браніслававіч (1923—27?),
*Крывіцкі* Адольф Валяр'янавіч (1923—33),

*Ярашэвіч* Станіслаў Антонавіч (1933—37).

**Батурына,** в. Вілейскага р-на Мінскай вобл.,
касцёл НПМ[1] (спалены падчас 2-й сусветнай вайны) (с. 66, 432);
святары:
1928 — без святара,
*Буйноўскі* Вінцэнт (1929),
Лукша Клеменс (1929—31),
Важняк Юзаф (1932—33),
*Цімашкевіч* Юліян Аляксандравіч (1934—38),
Валукевіч Станіслаў (1938—39).

**Бездзеж,** в. Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.,
касцёл Найсвяцейшай Тройцы (с. 357);
святары:
Судзевіч Сямён (1920),
Ляшчынскі Баляслаў (1926—32?),
Каморскі Альфрэд (1933—35?),
Тамашэўскі Ян (1936—1940?),
*Рыжко* Станіслаў Уладзіслававіч (1941—45).

**Белагруда,** в. Лідскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Міхала Арханёла (с. 113, 226, 235);
святары:
*Крынскі* Ян Антонавіч (з 1892),
Стэфановіч Людвік (1910—20),
*Корнь* Баляслаў (1921—23?),
*Гародка* Стэфан Антонавіч (1924—52, 1956—61).

**Беліца,** в. Лідскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Мучаніка Юрыя (с. 34, 143, 270);

[1] Да 1920 — касцёл св. Мікалая.

святары:
*Маліноўскі* Юзаф (н. у 1890) (з 1918),
Янсевіч Макар (1927—32),
Кахутніцкі Антоні (1933—35),
Ярзелоўскі Юзаф (1936),
*Дабравольскі* Стэфан (1937—43?).

**Беніца,** в. Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.,
касцёл Найсвяцейшай Тройцы (с. 28, 60);
святары:
*Аўгусціновіч* Аляксандр Казіміравіч (1918—24?),
Прышмант Тэафіл (1925—29),
*Борсук* Вінцэнт Міхайлавіч (1930),
Смарчэўскі Браніслаў (1936),
Попел Лукаш (1937—39).

**Беняконі,** в. Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Яна Хрысціцеля (с. 110, 186, 272);
святары:
Ужумецкі Мед. (1910-я),
Страгас Ян (1912—24?),
Дубэціс Юзаф (1925—37),
*Зубялевіч* Апалінары (1935—36),
*Маньтужык* Антоні (1935—36),
*Гайлюш* Дамінік Ксавер'евіч (1937—51?).

**Беразіно,** райцэнтр Мінскай вобл.,
касцёл Маці Божай Міласэрнай (Кармелітанскай) (згарэў у 1914) (с. 398);
святары:
Мяцэвіч Юзаф (1902—09),
*Тамашэўскі* Вітольд Адольфавіч (1909—11, 1930-я),
Туз Станіслаў (1912—14).
Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Дадэрка, Дзенісевіч Стэфан, Малевіч Вінцэнт, Пянткоўскі, Рава Павел, Ясінскі Даніэль.

**Бердаўка,** в. Лідскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл Найсвяцейшай Тройцы (с. 442);
святар:
*Чыжэўскі* Альфонс Леапольдавіч (1944—47).

**Бешанковічы,** райцэнтр Віцебскай вобл.,
касцёл св. Казіміра і Рафала (знішчаны пасля 1935) (с. 41, 112, 435);
святары:
Багдановіч Мікалай (1880?—1900),
Валіневіч Якаў (1901—06?),
Нікіфароўскі Юзаф Васілевіч (1907—08),
Фашчэўскі Ян Антонавіч (да 1908),
*Цыбулевіч* Станіслаў Юзафавіч (1908—19),
*Барадзюля* Язэп Язэпавіч (1919—26);
арганіст:
*Гаранскі* Фелікс Міхайлавіч (1900—1920-я).
Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Карповіч, Кярноўскі Рамуальд, Фіялкоўскі Антоні.

**Блонь,** в. Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.,
касцёл езуітаў св. Яна Караля (с. 56, 99, 147, 287, 482);
святары:
*Бернатовіч* Ігнаці,
Шабуня Карл Антонавіч (1902—05),
Вайтэкунас Мацвей (1906—18?),
*Мацыеўскі* Ян Янавіч (1922—29),
*Выляжынскі* Францыск Францыскавіч (1933),
*Ячэйка* Антоні Ігнатавіч (да 1937).
Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Іваноўскі, Паўлоўскі, Тамашэўскі Т., Янушкевіч.

**Бобр,** мяст. Крупскага р-на Мінскай вобл.,
касцёл НПМ (с. 232, 289);
святары:
*Круль* Юзаф Адамавіч (да 1898),

Пухальскі Аляксандр (да 1912),
*Мачук* Антоні (1913—30?).

Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Гінтаўт Аляксандр, Масальскі, Падбярэзкі, Пятроўскі Францішак, Радзівон Ян Антонавіч, Станеўскі.

**Браслаў,** райцэнтр Віцебскай вобл.
касцёл Нараджэння НПМ (с. 9, 93, 95, 270, 275, 294, 366, 448–449);
святары:
*Акрэйць* Мечыслаў (1907—12, 1933—42),
*Мончка* Уладзіслаў Ігнатавіч (1930),
*Война-Аранскі* Пётр (1932—33),
*Маліноўскі* Юзаф (н. у 1906) (1935—37),
*Шубзда* Антоні Аляксандравіч (1938—48?),
*Марсэнгер* Юзаф Фердынандавіч (1943),
*Вільчынскі* Чэслаў (1967—86?);
арганіст:
*Сакалоўскі* Эдвард Вацлававіч (канец 1930-х — 1940).

**Брэст,** абл. цэнтр,
касцёл катэдральны Узвышэння Св. Крыжа (с. 111, 146, 191, 352, 384, 409, 453);
святары:
*Сохань* Юзаф (з 1909),
*Шчарбіцкі* Фабіян Юзафавіч (1910—14?),
Верабей Ігнат (1919—28),
Шот Ян (1919—31),
Мацкевіч Леапольд (1926—28),
Ліпецкі Тамаш (1927—34),
Тарасевіч Нікадзім (1928),
Букраба Казімір (1928—32),
Малецкі Браніслаў (1929—30),
Мацеяк Юзаф (1933—34),
Копій Станіслаў (1933—34),
Грэсяк Тадэвуш (1933—36),

*Івіцкі* Вітольд Браніслававіч (1934—36),
Яжэўскі Чэслаў (1936—39),
*Даміняк* Юзаф (1936—38?),
Лазоўскі Вацлаў (1936—38),
Жаландкоўскі Люцыян (1937—38),
Зелянеўскі Аляксандр (1937—38),
Грабельны Уладзіслаў (1938—39),
*Урбановіч* Ян (1938—43?),
*Гарадзенскі* Юзаф Міхайлавіч (1939—42),
*Росяк* Ежы (Юры) Францыскавіч (1943—47?);

касцёл Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса (с. 249, 361);
святары:
Гула Пётр (1933—34),
Жаландкоўскі Люцыян (1933—38),
*Сабутка* Станіслаў (з 1935),
Вянцкевіч Ян (1938—39),
Заяц Юзаф (1938—39),
*Лазар* Станіслаў Мацвеевіч (1947, 1964—?),

капліца па вул. Светлай (с. 250, 336);
капелан:
*Лазар* Станіслаў Мацвеевіч (1955—59).

Служылі ў Брэсце, але невядома ў якіх касцёлах:
*Радзюк* Антоні (1913—15),
*Варанецкі* Міхал Віктаравіч (канец 1940-х),
*Вяржбіцкі* Ян Дзмітрыевіч (1930-я),
*Вайтыняк* Чэслаў Валянцінавіч (1932),
*Сякерка* Уладзіслаў (з 1935 і не пазней як да 1939),
*Лазар* Станіслаў Мацвеевіч (1938—43);
Грыбоўскі Антоні (н. у 1906; 1940-я).

**Будслаў,** мяст. Мядзельскага р-на Мінскай вобл.,
касцёл Унебаўзяцця НПМ (с. 162);
святары:
Пагумірскі (Пагамірскі) Людвік (з 1909),

Вярэнік Станіслаў (1927—1936),
Ганусевіч Аляксандр (з 1936),
*Дулінец* Антоні (1954—66?).

**Быхаў,** райцэнтр Магілёўскай вобл.,
касцёл Беззаганнага Зачацця НПМ (с. 231, 330, 348, 398, 476);
святары:
*Пржамоцкі* (Пржэмоцкі) Хрызагон Цярэнцевіч (1899—19032),
Мацкевіч Леапольд (да 1908),
*Януковіч* Пётр Янавіч (1908—11),
*Рацэвіч-Рочыс* Антоні Антонавіч (1912—13),
*Крукоўскі* Ян Вікенцевіч (1913),
Святаполк-Мірскі Леў Львовіч (1914),
1915 — без святара,
*Тамашэўскі* Вітольд Адольфавіч (1919—28?).
Паводле некаторых звестак, у касцёле таксама служылі: Валушынскі, Даўкант Канстанцін, Дмахоўскі Казімір, Сестранцэвіч (арцыбіскуп), Скрэтускі, Солтык Каятан, Тавянскі Фелікс.

**Быцень,** в. Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.,
філіяльны касцёл св. Юзафа (с. 116, 153);
святары:
Кругельскі Станіслаў (1928),
*Гельмер* Баляслаў Янавіч (1929—34),
*Дзям'ян* Юзаф (1934—39).

**Бярозаўка,** горад Лідскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл Спаслання Св. Духа (закрыты ў 1953 і зруйнаваны) (с. 373);
святары:
Байкевіч Пётр (1924—1934),
Дзічканец Антоні (1935—39),
*Сечка* Стэфан Янавіч (1939—40, 1942—44).

# В

**Вавёрка,** в. Лідскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл Перамянення Пана (с. 60, 474);
святары:
Маліноўскі Іпаліт (да 1915?),
Пясчук Францішак (1915—28),
Лапата Мечыслаў (з 1918),
*Борсук* Вінцэнт Міхайлавіч (1925—26),
*Яноўскі* Севярын (1939—49, 1956—58),
Ракіцкі Яраслаў (1930—39).

**Валожын,** райцэнтр Мінскай вобл.,
касцёл св. Юзафа і НПМ (с. 24, 179, 218, 279, 408);
святары:
*Астрамовіч* Аляксандр Сцяпанавіч (другая палова 1910-х),
*Масевіч* Раман (1920),
*Удальскі* Антоні (1919—39),
*Заблудоўскі* Баляслаў Янавич (1933),
*Качкоўскі* Лявон Ігнатавіч (1934—35).

**Валынцы (Валынец),** в. Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл св. Юрыя (узарваны падчас 2-й сусветнай вайны) (с. 103, 313);
святары:
Яркевіч (служыў 18 гадоў),
Мэркель Вячаслаў (да 1902),
Войцік (Войтык) Станіслаў Юзафавіч (1903—05),
Шаблоўскі,
*Ожал* Антоні Вікенцевіч (1906—19),
*Вярсоцкі* Ян Янавіч (1920—27).

**Варапаева,** мяст. Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.,
касцёл (с. 56, 380);
святары:
Будзілас Норберт (1934—35),

Пачкоўскі Уладзіслаў (1936—37),
*Скорка* (Скарко, Скурко) Антоні (1938—42);
арганіст:
*Берніковіч* Іван Альбертавіч (?) (да 1940).

**Варняны,** в. Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Мучаніка Юрыя (с. 245, 412);
святары:
Шалкоўскі Юзаф (1909—20),
Нянеўскі Антоні (1920—29),
Пілтыцкі Уладзіслаў (1927—28),
Міронэчык Эдвард (1929—30?),
Сялевіч Ян-Уладзіслаў (1930—39),
Колб-Сялецкі Юльян (1931),
*Федаровіч* Браніслаў (1936—37),
Бараноўскі Адам (1939),
*Курпіс-Гарбоўскі* Уладзіслаў Вікенцевіч (?) (1944—50).

**Вародзькаў,** в. Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл.,
філіяльны касцёл Унебаўзяцця НПМ (спалены ў верас. 1943) (с. 214–215, 479);
святары:
Эйтутовіч (Эйтушовіч) Казімір (1896—1905),
*Карповіч* Павел Ксавер'евіч (1902—05),
Спасоўскі Юры (1906—07),
Кушалеўскі Вікенці Іванавіч (1908),
1909 — без святара,
Святліцкі Вікенці (1914),
*Ярашэвіч* Станіслаў Антонавіч (1922—28?).

**Васілішкі**, в. Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.,
касцёл св. Яна Хрысціцеля (с. 79),
святары:
Сакалоўскі Францішак (1910-я),
Цыўнайціс Мацвей (1910-я),

Маліноўскі Іпаліт (з 1918),
Гайдукевіч Юзаф (з 1918),
